
Андрэй
Макаёнак

АНДРЭЙ
МАКАЁНАК

ЗБОР
ТВОРАЎ

Андрэй Макаёнак



ЗБОР
ТВОРАЎ
У ПЯЦІ
ТАМАХ

Рэдакцыйная калегія:

АЎСЯННІКАЎ Г. С.
БЫКАЎ В. У.
ДЗЯЛЕЦ М. І.
ЛАЎШУК С. С.
МАКАЁНАК Л. І.
МАКАЁНАК С. А.
ШАМЯКІН І. П.

Андрэй Макаёнак



ТОМ
ЧАЦВЁРТЫ

•

П'ЕСЫ
ПЕРАКЛАДЫ

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1989

ББК 84Бел7
М 15

Укладанне і каментарыі
С. С. Лаўшука

В четвертый том Собрания сочинений Андрея Макаенка вошли одноактовые пьесы, драма в четырех действиях «Всходы счастья», а также переводы.

М $\frac{4702120203—130}{М302(03)—89}$ 96—89

ISBN 5-340-00301-9

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1989

П'есы

ДОБРА, КАЛІ ДОБРА КАНЧАЕЦЦА

КАМЕДЫЯ Ў АДНОЙ ДЗЕІ

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ:

Дзед Макар — калгаснік, 60 год.

Бабка Агапа — яго жонка, такога ж узросту.

Фрося — іх дачка, 20 год.

Павел — жаніх Фросі, 23-х год.

Дуняша — сяброўка Фросі.

Кацця — медсястра са шпіталя.

Дзея адбываецца на кватэры ў дзеда Макара. Пакой прыбраны небагата, але чыста: стол, некалькі крэслаў, канапа. З пакоя два выхады: адзін у кухню, другі — у сумежны пакой. Час дзеі — першая восень пасля перамогі. Вечарэе.

Дзед Макар на лаўцы крышыць сякерай махорку. Бабка Агапа лузае фасоль.

Бабка Агапа *(з крыўдаю, сярдзіта)*. Гэта ж трэба так! Ці ж спадзяваўся хто, што ён можа так зрабіць? Хлапец як хлапец быў... Думала дачку аддаць, а ён — во табе што! На ўсю вёску зганьбіў дзяўчыну.

Дзед Макар. Чым гэта ён яе зганьбіў?

Бабка Агапа. Як гэта чым? Абяцаў жаніцца, хадзіў, віляў хвастом, круціўся каля яе... Нават калі на фронт адпраўлялі, дык ён пры ўсім народзе сказаў *(перадражнівае)*: «Не сумуй, Фрося, не журыся,— прыеду з фронту, тады вяселле адгуляем. Чакай, абавязкова вярнуся» і нават, бессаромныя яго вочы, пры людзях пацалаваў дзеўку. А цяпер?

Дзед Макар. Дачка ў матку ўдалася. І ты ж да пацалункаў вельмі ласая была.

Бабка Агапа. Дык не яна яго, а ён яе. А цяпер, бач — ажаніўся. Франтуху знайшоў. Гарадская, мабыць... З медалём яму спатрэбілася... Фросяй грэбуе? А, нягоднік! Не так крыўдна было б, каб Фрося абы-якая была. А то ж дзеўка — кроў з малаком, работніца, прыгажуня, весялуха. Для ўсіх дзяўчат прыклад не толькі ў вёсцы, але і ў раёне. Лепшай звеннявой лічыцца. А ён гэтак зрабіў.

Дзед Макар. Не турбуйся, старая, хопіць яшчэ і для Фросі хлапцоў.

Бабка Агапа. А яна ж сумавала, чакала яго, нягодніка... Бывала, пісьма не дачакаецца. Убачыць паш-

тальёна — насустрач бяжыць, пісьма пытае. А прыйдзе пісьмо, дык колькі радасці, аж танцуе.

Дзед Макар. Ну і датанцавалася...

Бабка Агапа. А як працавала. «Гэта ж,— кажа,— я, мамуся, Чырвонай Арміі дапамагаю, каб хутчэй вайну закончылі і дамоў прыйшлі». Гаворыць пра ўсіх, а думае толькі пра Паўла.

Дзед Макар. Ты не блытай, старая! Зусім не значыць, што калі яна добра працавала, дык Павел абавязкова павінен на ёй жаніцца.

Убягае Дуняша.

Дуняша. А дзе Фрося? З райкома яшчэ не прыехала? Бабуня, вы чулі, Пашка Архіпаў прыехаў, паранены, кульгае, з клюшкай ходзіць. І ажаніўся там. Жонка ваенная.

Бабка Агапа *(стрымана)*. А нам што? Прыехаў, і добра. Ажаніўся — на здароўе. Хай дзетак плодзіць... А нам мала клопату.

Дуняша. Як гэта?.. Ай, шкада, што Фросі няма. Вось як прыйдзе, як даведаецца... *(Выбягае.)*

Бабка Агапа. Во, бачыш? Ужо колькі гоману... Во знясlавіў дзеўку! Гэта ж не хлопцы, а сабакі...

Дзед Макар. Не грымі, старая, бо дождж наклічаш. Ідзі лепш вячэру вары. Пагамоняць, пагамоняць ды і перастануць. *(Бабка Агапа прыбірае смецце. Дзед Макар, закурыўшы, падыходзіць да акна.)* Здаецца, Фрося прыехала. *(Да акна падыходзіць і Агапа.)*

Бабка Агапа. Не ведае яшчэ, дачушка мая, бач — вясёлая. *(Уздыхае.)* А колькі яшчэ слёз будзе...

Убягае Фрося.

Фрося *(узбуджаная, радасная)*. Ой, тата, што там было. Каб ты бачыў, што там толькі было! Народу колькі з'ехалася! Злёт стаханаўцаў — ці жартачкі гэта! А як упрыгожана ўсё?! Як на вялікае свята. Сакратар райкома партыі адкрывае злёт... І каго, ты думаеш, выбіраюць у прэзідыум? Мяне! Не верыш? Чэснае камсамольскае! А на кожным стуле газета, глядзі, вось і партрэт тут *(паказвае газету)*. Потым даклад, выступленні. А наш калгас на першым месцы ў раёне. А потым прэміі. І мне першай сакратар райкома партыі ўручыў гадзіннік. Вось — глядзі... *(Спачатку сама слухае, потым паказвае бацьку.)* А калі

ўсё скончылася, сакратар райкома камсамола абяцаў паслаць на курсы...

Б а б к а А г а п а *(праз слёзы)*. Дачушка мая, стараніца... *(Прыгарнуўшы да сябе, гладзіць яе па галаве.)*

Ф р о с я. Чаго ж ты, мамуся?

Д з е д М а к а р. Што ты, не ведаеш яе? Ёй жа заплакаць, што кошцы мяўкнуць.

Б а б к а А г а п а. Дачушка мая, ты яшчэ нічога не чула?

Ф р о с я. А што?

Д з е д М а к а р. Павел твой прыехаў...

Ф р о с я *(радасна)*. Пашка?! Праўда?

Д з е д М а к а р. З жонкай.

Ф р о с я. Што? Як з жонкай? З чыёй?

Б а б к а А г а п а. Але ж, дачушка, ажаніўся, басурман, прывёз жонку.

Ф р о с я. А як жа я?.. *(Плача, бабка Агапа саджае яе на канапу.)*

Б а б к а А г а п а. Не плач, дачушка, не плач! Што ў цябе, куча дзяцей, ці што? Ці пра цябе дрэнная слава ідзе? Не плач...

Д з е д М а к а р. Чаго равеш, дурненькая? Яшчэ лепш, што так атрымалася. Паедзеш вучыцца — чалавекам будзеш. А то выйшла б замуж, дзеці пайшлі б. Гэта заўсёды паспееш. Кінь плакаць, кажу. Ну!

Ф р о с я выбягае ў другі пакой.

Б а б к а А г а п а. Ах ты, басурман, што нарабіў. Як цяпер дзеўцы быць?.. *(Выходзіць.)*

З'яўляецца Д у н я ш а.

Д у н я ш а. А дзе Фрося? Яна ж прыехала!

Д з е д М а к а р *(прымае непарэзаны табак і сякеру)*. Малайчына гэты Павел, на месяц работы бабскім языкам задаў. Фрося! Пошта прыйшла! *(Выходзіць. З другога пакоя з'яўляецца Фрося.)*

Д у н я ш а *(косым поглядам праводзіць дзеда Макара)*. Фросечка, ты ўжо чула?

Ф р о с я *(абыякава)*. Чула, а што?

Д у н я ш а. Як што? Ой, Фрося, я цябе не пазнаю! Я ж бачу, табе не ўсё роўна, што ён ажаніўся. Ты ж яго чакала...

Ф р о с я. Ну і што? Чакала. Кожны чалавек вольны. Спадабалася другая — не прывяжаш.

Д у н я ш а. Яно-то так... ды крыўдна.

Ф р о с я. А чаго крыўдзіцца?

Д у н я ш а. Як так, чаго крыўдзіцца? Ты ж яго кахала? *(Фрося заплакала.)* Фросечка! Чаго ж ты? Ну і клопат вялікі... падумаеш. Плюнь і разатры, быццам і не ведала яго.

Ф р о с я. Як не ведала... *(Праз слёзы.)* Я ж кахала яго... чакала... і цяпер таксама кахаю. А ты — «плюнь»... Мне не верыцца... Здаецца — гэта сон... *(З жарам.)* Дуняша! Скажы, што гэта няпраўда, што гэта плёткі! *(Дуняша адмоўна ківае галавою.)* Як быццам хтосьці вырваў кавалак сэрца...

Д у н я ш а *(шкадуючы)*. Не, Фросечка, гэта праўда... Ажаніўся. Але ты не гаруй, не шкадуй. Каб добры быў, то не ажаніўся б. Відаць, заўсёды быў сабакам.

Ф р о с я. Няпраўда. Ён і зараз добры!.. Чалавек так хутка не мяняецца... Каб дрэнны быў, я яго і тады не пакахала б.

Д у н я ш а. Ой, Фрося, ты, мабыць, памылілася ў ім.

Ф р о с я. Не... Тады я не памылялася. А цяпер... цяпер я нічога не ведаю... Ты яго бачыла? Які ён, раскажы.

Д у н я ш а. Бачыла. Ішоў з ёю. Крыху кульгае. Два ордэны і медаль... Ніколькі не змяніўся, толькі больш нахабны стаў. Калі сустрэлася, дык ён: «О, кажа, Дуняша, усё прыгажэеш! Як справы, пытае». А мне не церпіцца — хто ж яна? Я і кажу: што ж, кажу, не знаёміш, можа, жонка? А ён: знаёмцеся, гэта, кажа, Фросіна сяброўка, а гэта — жонка Каця. І яшчэ смяецца, нахабнік. Не чакалі, што жанаты прыеду, пытае. А я яму і адказваю: падумаеш, ты ў нас і з галавы не выходзіў. Мы таксама, кажу, дарэмна часу не трацілі. І Фрося? — пытае. А Фрося што, кажу, горш за цябе? Вось гэтага, кажа, я не чакаў. І мы, кажу, не чакалі. А яна-а-а смяецца. Я завярнулася і пайшла.

Ф р о с я. А яна... прыгожая?

Д у н я ш а. Ну, як табе сказаць?.. Як усе. *(Паўза.)* Фрося! Ну, а як там у раёне? Што там было?

Ф р о с я. Там усё добра. Наш калгас першае месца ў раёне заняў.

Д у н я ш а. Першае месца? А звяно наша?

Ф р о с я. І звяно таксама першае. Вось прэміравалі. *(Паказвае гадзіннік.)*

Д у н я ш а. Фрося! Дык чаго ж маўчыш? Чаго ж ты нос павесіла? Га? Плюнь ты на яго! Пакажы гадзіннік. *(Фрося здымае з рукі гадзіннік, паказвае. Дуняша раз-*

глядае, слухае, потым раптоўна.) Фрося! А ведаеш, што я прыдумала. Я зараз пабягу да дзяўчат, сабяром камсамольскі сход, і ты раскажаш пра ўсё, а потым — танцы. А? Калі Павел прыйдзе, я ўстану і скажу: жанатым сюды ўваход забаронен! Просім! *(Артыстычны жэст на выхад.)*

Ф р о с я. Гэта не па-камсамольску, ды і не дапаможаш гэтым.

Д у н я ш а. Ну, дык мы скажам, як толькі ён прыйдзе: «На гэтым танцы заканчваем!» Моў, прабачце!

Ф р о с я. Не, гэта...

Д у н я ш а. Ведаю, таксама не па-камсамольску, а ён па-камсамольску зрабіў? Як хочаш, а я пабегла. Так і зробім!

Д у н я ш а выйшла. Уваходзіць б а б к а А г а п а з гарлачом і стаканам у руках.

Б а б к а А г а п а. Вазьмі, дачушка, выпі стакан малака, пакуль вячэраць. Ты ж прагаладалася з дарогі. А мо зусім увесь дзень галодная была?

Ф р о с я. Не, мама, не хачу.

Уваходзіць д з е д М а к а р.

Б а б к а А г а п а. Кінь ты пра яго думаць. Во падсілкуйся лепш. Знайдзіце з дзеўкамі музыку ды танцы. Весялей трымайся пры людзях, каб ніхто і не заўважыў, што сумуеш.

Д з е д М а к а р. Ты сама падай прыклад. Цікавей будзе.

Б а б к а А г а п а. Ідзі ты, назола... Хоць бы выйшаў куды, дык не, мазоліць вочы. *(Заўважыла ў акно Паўла.)* Глядзі ты, я ж кажу, бессаромныя яго вочы, яшчэ і ў хату прэцца... га?.. ды з жонкай... Я ж яго, распуснага, так размалюю памялом, што ён забудзе, у якім баку свой дом. Я яго зараз...

Ф р о с я падбягае да акна, потым выбягае ў сумежны пакой.

Д з е д М а к а р. Ты глядзі, старая, не дуры. Не твайго розуму гэта справа. Ідзі лепш чарку рыхтуй.

Б а б к а А г а п а. Каму гэта?

Д з е д М а к а р. Ды хоць бы і мне.

Б а б к а А г а п а. Спяшаюся, аж падаю. А смалы ён не хоча? *(Выходзіць.)*

Д з е д М а к а р. Во старая раззлавалася, быццам на мазоль хто наступіў.

Уваходзяць П а в е л і К а ц я. Павел кульгае.

П а в е л. Добры, вечар, бацька!

Д з е д М а к а р. Здароў, здароў, зямляк! *(Вітаюцца.)*

П а в е л. Чаго гэта старая так раззлавалася, што нават на прывітанне не адказала?

Д з е д М а к а р. У хаце чаркі няма для госця, вось яна і злуе.

П а в е л. Не, відаць, дапёк яе чымсьці дзед?

Д з е д М а к а р. Мо я, а мо і хто другі.

П а в е л. Хто ж другі? Ведаю, Фрося гэтага не зробіць. А дзе ж Фрося?

На парозе з'яўляецца Ф р о с я, хвалюецца.

П а в е л. Фрося, Фросечка, здаровенька!

Ф р о с я *(нявятліва)*. Дзень добры.

П а в е л. Знаёмцеся. *(Каця і Фрося паціскаюць рукі. Фрося дапытліва ўглядаецца ў Кацін твар.)*

Ф р о с я. Фрося.

К а ц я. Каця.

Ф р о с я. Што ж вы стаіце? Сядайце! *(Падае крэсла.)*

П а в е л. Чаму ж гэта ты такая нявятлівая? Хіба не чакала?

Ф р о с я. Чакала, але не ўсяго, чаго дачакалася?

Д з е д М а к а р *(да Паўла)*. У мяне да цябе невялікая справа ёсць, пойдзем пагамонім. *(Выходзяць.)*

П а в е л. Зараз іду. *(Да Фросі.)* Кажаш, чакала, але не кульгавага, так? *(Выходзіць. Фрося ўсхапілася.)*

Ф р о с я. Ты! *(Павольна садзіцца, закрывае твар рукамі. Паўза. Каця ўважліва і здзіўлена глядзіць на Фросю. Фрося павольна павярнула галаву і глядзіць на Кацю.)*

К а ц я. Што вы, не любіце яго?.. І раней не любілі?

Ф р о с я. Я?.. А вам што да гэтага?

К а ц я. Мне нічога. Я проста так. Толькі ён мне шмат чаго расказваў пра вас. Хваліў: вельмі добрая дзяўчына... вельмі рада будзе, калі прыеду. І ён добры хлопец, дужа добры.

Ф р о с я. А чаму вы мне гэта расказваеце?

К а ц я. Як чаму? Вы ж былі добрымі сябрамі... А чаму вы на мяне злуецеся?

Ф р о с я. Не, я на вас зусім не злуюся... *(Паўза, Фрося ўважліва глядзіць на Кацю.)* Раскажыце мне лепш, як вы з Паўлам пазнаёміліся і... ну, усё-ўсё.

К а ц я. Што расказаць... Працую я ў шпіталі, там і пазнаёміліся... Калі прывезлі яго ў шпіталь, амаль ніхто не думаў, што выжыве... Не тое каб дужа цяжкае раненне, а

шмат крыві страціў. Доктар кажа: «Калі не зрабіць пераліванне — не вытрымае». А ў нас на той час, як назло, не было кансерваванай крыві. А мая група падышла. Я і дала яму сваю кроў. А раней баялася. І ў шпіталі працавала, бачыла, як гэта робяць, а баялася. Так... Калі яму зрабілі пераліванне, ён крыху ачуняў. На другі дзень пасля ранішняга абходу доктар кажа: «Трэба аперацыю рабіць: непрыгожая рана, баюся, каб заражэння не было». А ён як пачуў пра аперацыю — збялеў, баяўся, што будуць адразаць нагу. І так просіць доктара, так просіць, каб не рэзалі.

«Нельга мне,— кажа,— таварыш доктар, ніяк нельга без нагі. Вельмі прашу, што хочаце рабіце, толькі не рэжце». А доктар яму: «Супакойцеся, супакойцеся,— кажа,— рэзаць не будзем. Крыху пачысцім, і ўсё». І пайшоў. А Павел падазваў мяне і кажа: «Ну каму я патрэбен тады? Што я рабіць буду?»

Ф р о с я *(парывіста)*. Хоць бы і без нагі прыйшоў, я б яго...

К а ц я. Я яго супакойваю, што ніхто рэзаць не збіраецца, і няпраўда, кажу, што ты нікому не патрэбен. Не ў п'янцы ты нагу страціў, а на фронце. Тады ён просіць мяне: «Калі,— кажа,— паложаць на стол і дадуць наркоз, ты глядзі, не давай рэзаць, нізашто не давай! Пакляніся,— кажа,— што выканаеш маю просьбу, самым дарагім». Я паклялася. Калі доктар пачаў рабіць аперацыю, я і пытаю: «Будзеце ампутаваць?» А ён: «Што вы, ён жа яшчэ нежанаты. Пачакайце, яшчэ так «Лявоніху» будзе выбіваць, што не адна загледзіцца». Мне і на сэрцы лягчэй стала. А Павел пад наркозам як разбушаваўся. Спачатку крычыць: «Фрося! Фрося! Сюды плыві, Фрося, я тут. Аддайце,— крычыць,— Фросю, пусціце яе!» Доўга нянчыліся мы з ім, пакуль вылечылі. Начамі прыходзілася сядзець каля яго. Дужа неспакойны. Хай дзякуе доктару — вельмі добры быў. Як свайго сына глядзеў.

Паўза.

Ф р о с я. Вы — замужам? Ужо пажаніліся?
К а ц я *(проста)*. Замужам. Ужо каля года.
Ф р о с я. Як каля года?
К а ц я. Амаль дзевяць месяцаў.
Ф р о с я. Так даўно?.. І я нічога не ведала?..
К а ц я. А скуль жа вы будзеце ведаць?

Ф р о с я. Ён жа мне яшчэ тады часта пісьмы пісаў, але аб гэтым — ні слова.

К а ц я. Хто?

Ф р о с я. Ды хто ж — Павел.

К а ц я. Мы тады яшчэ з Паўлам не былі знаёмы.

Ф р о с я. Незнаёмыя і пажаніліся? Цікава! Як жа гэта здарылася?

К а ц я. Нічога не разумею!

Ф р о с я. Я таксама нічога не разумею.

К а ц я *(спахапілася)*. Дык ты думаеш, што я за Паўла замуж выйшла?

Ф р о с я. А хіба не так?

К а ц я. І таму ты так няветліва яго сустрэла?

Фрося са здзіўленнем глядзіць на яе.

К а ц я *(падбягае да яе, смеючыся, глядзіць ёй у вочы)*. Фросечка! Якая ж ты дурненькая! Павел жа твой! У мяне свой муж — Валодзя. Я сюды з Паўлам прыехала толькі таму, што мяне са шпіталя паслалі суправаджаць раненых. Павел запрасіў мяне, каб я на вашым вяселлі пагуляла.

Ф р о с я *(быццам прачнулася)*. Значыць... значыць, няпраўда? Не ажаніўся?

К а ц я. Ну, вядома, не!

Ф р о с я *(ад радасці некалькі разоў горача цалуе Кацю)*. Дарагая мая... а я, дурніца, думала... а я думала... Што я толькі думала!..

К а ц я. А ён так цябе кахае, так кахае!..

Ф р о с я. Ён так і казаў?

К а ц я. Усю дарогу ён толькі пра гэта і гаварыў. Ён, калі яшчэ ў нашым шпіталі ляжаў, часта мне апавядаў пра цябе. Нават пісьмы чытаў, а аднойчы пасля аперацыі ён усю ноч не спаў — рана балела. Мы з ім доўга гаварылі... Гаварылі пра цябе, пра вашу вёску, як вучыўся, як пачаў з табой сустракацца, як кахаў... «Няма лепшай дзяўчыны, чым Фрося,— гаварыў ён часта,— калі я пра яе гавару ці думаю, то і рана не так баліць. Калі б не было Фросі, калі б я яе не так кахаў, мабыць, і не выжыў бы. А так хочацца жыць. Тым больш што нашы да Берліна падыходзяць».

Ф р о с я. Ну, ну, расказвай, усё расказвай.

К а ц я. Што ж расказваць... Здаецца, усё. Скажу адно — вельмі кахае ён цябе. Спадзяваўся, што ты рада будзеш, калі прыедзе... А ты гэтак яго сустрэла. А ён, на-

пэўна, думае, ты яго так сустрэла таму, што ён крыху кульгае.

Ф р о с я. Ды не! Я ж думала... Ой, дурніца, што я толькі думала пра Пашку!.. І я не вінавата. Я толькі прыехала з раёна, а мне як абухом адразу: «Пашка прыехаў, і жанаты, а жонка ваенная». Я б не паверыла, каб хто другі сказаў, а то Дуняша, сяброўка мая...

За сцэнай чуваць гучны смех Паўла, затым голас дзеда Макара: «Я казаў, старая, тут чаркай не абыдзешся, літру цягні».

Ф р о с я. Бач, там таксама разабраліся нарэшце.

К а ц я. Каб я ведала, што так будзе, нізашто не паехала б суправаджаць. Хай бы хто другі.

Ф р о с я. Што ты, што ты! Ой, як добра атрымалася!

Уваходзіць П а в е л, затым паказваецца Д у н я ш а.

Ф р о с я *(радасна)*. Пашка! *(Падбягае да яго і цалуе.)*

Д у н я ш а *(у здзіўленні)*. Фро-ося! *(Фрося паказвае ёй язык і зноў цалуе, затым яе цалуе Пашка.)*

П а ш к а. Памірыліся з «жонкай»? *(Усе смяюцца.)*

Уваходзіць д з е д М а к а р.

Д з е д М а к а р. Я ж кажу, ласая да пацалункаў. Ну хто каму ўступіў? Старая! Давай сюды гарэлку! Цяпер не скажаш, што п'ю без прычыны. Прычына ўважлівая — па закону належыць. Скупая мая старая — ніколі не дасць выпіць, апрача свята.

Б а б к а А г а п а *(уваходзіць і нясе бутэльку і шклянку)*. Ды табе толькі патурай, ты і жонку прап'еш. Гэта ж во схавала на ўсякі выпадак. Сядайце, чаго ж вы стаіце? Сядай, Паўлуша, у цябе нага баліць.

Д з е д М а к а р. Цікава — як хутка ў жанчын характар мяняецца.

Б а б к а А г а п а. Добра, што ў вас не мяняецца.

Заслона.

ПЕРАД СУСТРЭЧАЙ

КАМЕДЫЯ
Ў АДНОЙ ДЗЕІ

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ:

Пракапчук — старшыня калгаса, 40 год.
Вярбіцкі — аграном, ён жа карэспандэнт, 25—27 год.
Марыйка — дзяўчына, 20 год.
Луша — памочнік рахункавода, 19 год.
Гаўрыла — малады калгаснік, каваль, 23—24 гады.

Пакой старшыні калгаса. Пісьмовы стол, некалькі крэслаў. Над сталом Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета аб прысваенні звання Героя Сацыялістычнай Працы і ўзнагароджанні ордэнамі за высокія ўраджаі. Паабапал Указа прыгожыя вянкі, а ў куце — сноп добрага жыта — усё гэта памяць аб дажынках.
За сталом Пракапчук чытае кнігу.

Пракапчук *(адсунуў кнігу ўбок, закурвае)*. Так-так... Добрая кніга, ды цяжкаватая. Такія словы, што не кожны вымавіць. Выдумаюць жа... Не могуць прасцей напісаць, ці што? *(Круціць галавой і зноў чытае.)*

Уваходзіць Луша.

Луша. Сямён Макаравіч! Там госць нейкі прыехаў, вас пытае.

Пракапчук. А ты б сказала, што я зараз заняты, вучуся. Колькі разоў казаў: у часы вучобы не перашкаджаць мне.

Луша. Я яму і сказала: старшыня зараз тэорыяй займаецца, агратэхніку вывучае. А ён: «Цікава, цікава» і ў блакнот нешта запісаў.

Пракапчук. У блакнот... А што за ён, якой катэгорыі?

Луша. Думаю, што першай. Карэспандэнт ад газеты. Патрэбны чалавек, думаю.

Пракапчук. Ага, правільна думаеш. Ну, што ж, запрашай сюды яго. Хай піша. Хай усе ведаюць, што такое мой калгас «Зара камуны». Кліч!

Луша хоча ісці.

Чакай. А ты ідзі, скажы рахункаводу, ды лічбы ў парадак прывядзіце, зразумела?

Л у ш а. Як не зразумець, Сямён Макаравіч. Яны ў нас заўсёды як на парадзе. *(Выходзіць.)*

П р а к а п ч у к. Дзіва што... сядзелі б вы ў мяне ў канцылярыі. *(Занадта ўважліва чытае.)*

Заходзіць к а р э с п а н д э н т.

К а р э с п а н д э н т. Добры дзень! Прабачце, я, здаецца, перашкодзіў вам.

П р а к а п ч у к. Нічога. Выбачаю. *(Вітаюцца.)* Не вы першы, не вы апошні. Пракапчук.

К а р э с п а н д э н т. Вярбіцкі. Не ведаю, як вам прадставіцца. Я да гэтага часу працаваў карэспандэнтам абласной газеты, а зараз вось прыехаў да вас прыгледзецца. Праўда, рэдактар прасіў, каб я для газеты за адным заходам напісаў добры артыкул пра ваш калгас, як вы за ўраджай ваюеце.

П р а к а п ч у к. Ды вось, ваюем... бачылі, колькі шпакоўніц наставілі. Усіх птушак думаем пераняць.

К а р э с п а н д э н т *(усміхаецца)*. Жартуеце.

П р а к а п ч у к. Чаму жартуем. Мы ўсур'ёз. Птушкі, яны таксама ўраджай падымаюць.

К а р э с п а н д э н т. Яно разумеецца... Супроць шкоднікаў, саранчы...

П р а к а п ч у к. Галоўнае не ў тым. Галоўнае — птушыны памёт нарыхтоўваем.

К а р э с п а н д э н т *(смяецца)*. А вы, бачу я, чалавек востры на язык, як той Эзоп.

П р а к а п ч у к. А гэта што ён за аграном такі?

К а р э с п а н д э н т *(усміхаецца)*. Гэта не аграном, а вялікі паэт старажытнасці — байкі пісаў.

П р а к а п ч у к. Ну, а я вас байкамі частаваць не думаю.

К а р э с п а н д э н т. Аднак на птушыны памёт не злосце. У сельскай гаспадарцы крыху разбіраюся.

П р а к а п ч у к *(прыкідваючыся)*. Ці ж я што якое...

К а р э с п а н д э н т. Бачу, бачу: бывае, вядома, і так, што спрабуе каторы вучыць гаспадарыць, а сам грэчкі ад канюшыны не можа адрозніць.

П р а к а п ч у к *(жвава)*. От, што праўда, то праўда.

К а р э с п а н д э н т. У адным калгасе мне расказалі такі выпадак. Прыехаў да іх упаўнаважаны з раёна паскорваць сяўбу. З ячменем там адставалі. Ну, падняў усё на ногі. Усе выехалі ў поле. І раптам гэты ўпаўнаважаны бачыць, што адзін брыгадзір з поля ідзе. Ён і напусціўся

на брыгадзіра. «Ты куды?» — пытае. «Ды я па стальвагі, баранаваць трэба». Упаўнаважаны і давай яго распякаць: «З ячменем трэба канчаць, а стальвагі потым будзеце баранаваць». *(Пракапчук смяецца.)*

Пракапчук. Бач ты яго, а?.. Стальвагі баранаваць!.. А? За год не прыдумаў бы такога.

Карэспандэнт. Ну, а я стальвагі баранаваць не збіраюся. Шчыра прызнацца, дык я прыехаў цікавіцца вашымі гаспадарчымі справамі не столькі па службовым абавязку, колькі з чыста асабістых меркаванняў. Тым больш што я рашыў змяніць сваю пасаду і пайсці працаваць па прафесіі. Так што мне не столькі матэрыял для газеты патрэбен, колькі задаволіць асабістую цікаўнасць.

Пракапчук. Што? Можа, думаеце падацца на сельскую гаспадарку? Вопыт жадаеце пераняць?

Карэспандэнт. Вы недалёка да ісціны. Але аб гэтым пазней больш дакладна даведаецеся. А павучаць вас пакуль што не думаю.

Пракапчук. Ды я што, я не супроць, калі мяне хто і павучыць. Усяго не ведаем. А вы ўсё-такі па свеце ездзіце, больш чаго бачыце, а павучыцца добраму не грэх. Вось і... кніжачкі чытаем...

Карэспандэнт *(паглядзеўшы на кнігу)*. Карысная рэч.

Пракапчук. Карысная-то карысная, ды слоў мудроных многа. Такія, што язык не паварочваецца выгаварыць. Вучоныя занадта. Навыкавырвалі заграбічных слоў, ды яшчэ такіх, што і там, відаць, іх мала калі вымаўляюць.

Карэспандэнт. А вы напішыце свае заўвагі.

Пракапчук. Куды мне пісаць супроць прафесараў. Не мая гэта спецыяльнасць. Вось вы і напішыце за нас.

Карэспандэнт *(робіць заўвагу ў блакноце)*. Вам бы не лішне свайго агранома ў калгасе мець.

Пракапчук. Эге-ге, калі б мне ды свайго агранома... Прызнацца, я, можа, і не ламаў бы столькі галавы над гэтай кніжкай.

Карэспандэнт. А гэта не дрэнна, што вы за навуку ўзяліся.

Пракапчук. Цяпер без навукі ніяк нельга... Цяпер за яе ўсе бяруцца. У нас адна брыгада ў мінулым годзе рэкордны ўраджай сабрала. Дык вось я і падумаў: а хіба нельга з усяго поля такі ўраджай браць?.. І рашыў: можна! Можна, толькі трэба ведаць — як. Без навукі, вядома, не абыдзешся. Вось і... чытаем...

К а р э с п а н д э н т. А як жа вашы брыгадзіры працавалі? Няўжо без агранома абыходзіліся? Усё-такі каб ордэн Леніна атрымаць, мала старання, трэба і веды мець.

П р а к а п ч у к. А вы ведаеце нашых брыгадзіраў? Яны, браце, такія, што хоць дзе дарогу працярэбяць. Асабліва Тамара наша. Чулі пра Тамару Тарасюк?

К а р э с п а н д э н т. Як жа, ведаю крыху, чуў.

П р а к а п ч у к. З ёй мы і агранома здабудзем сабе. Я ўжо ёй заданне даў. Нібы заданне.

К а р э с п а н д э н т. Як гэта заданне?

П р а к а п ч у к. А вось так. Калі хоча замуж, то хай агранома шукае.

К а р э с п а н д э н т *(іранічна)*. Можа, і пастанову адпаведную праўленне вынесла?

П р а к а п ч у к. Я, вядома, і сам разумею, што гэта такая справа, дзе ніякай уладай не прымусіш, але ўсё-такі... добра было б, каб агранома ўзяць да яе ў прымы, а значыць — і для калгаса. Фантазія такая ёсць.

К а р э с п а н д э н т. А калі да яе пасватаецца не аграном? Напрыклад, я.

П р а к а п ч у к. За такую дзяўчыну можна хоць каго высватаць. То чаму не агранома? Нам аграном пазарэз трэба ў калгасе.

К а р э с п а н д э н т *(хітравата)*. Вось дык супадзенне. Цікава, цікава. *(Убок.)* Ох і разыграю я цябе. *(Уголас.)* А я ўсё ж думаю пасватацца і спадзяюся, што яна дасць згоду.

П р а к а п ч у к. Хто, Тамара? Ну, таварыш, не жартуй. *(Рашуча.)* Не адпусцім!

К а р э с п а н д э н т. А тады і пасмяёмся над вамі.

П р а к а п ч у к. Не будзе гэтага! Я ўжо наконт гэтага вуха востра трымаю. Яна сама мне па сакрэту прызналася, што пазнаёмілася ўжо з добрым аграномам.

К а р э с п а н д э н т. І кахае яго?

П р а к а п ч у к. А без кахання якое ж замуства.

К а р э с п а н д э н т. Як бы мне пабачыць вашых брыгадзіраў? Я хацеў бы пагаварыць з імі.

П р а к а п ч у к. Гэта не так лёгка.

К а р э с п а н д э н т. Што так?

П р а к а п ч у к. Яны зараз далёка... У Маскве, ордэны атрымліваюць.

К а р э с п а н д э н т. Дык яны яшчэ не прыехалі?

П р а к а п ч у к. Вось чакаем з дня на дзень.

Карэспандэнт. Як жа так? Мы ж дамовіліся... Сёння якое ў нас чысло?

Пракапчук. Зрання было трынаццатае, нешчаслівае. А з кім гэта вы дамовіліся?

Карэспандэнт. Ды з імі. Думаў апісаць, як калгас сустракае сваіх герояў. Вы ж, відаць, рыхтуецеся.

Пракапчук. Вядома, рыхтуемся. Нічога, калі дзянёк і перачакаеце ў нас, сумаваць не будзеце. *(Паўза.)*

Карэспандэнт. Та-ак... А як жа ў вас справа ў гэтым годзе?

Пракапчук. Бяда, і толькі.

Карэспандэнт. Ну-у? У чым жа справа?

Звоніць тэлефон. Пракапчук здымае трубку.

Пракапчук. Ну, слухаю, слухаю, пакінь тарабаніць. Ну, «Зара камуны», каго вам трэба? Старшыня калгаса... Якую распіску?.. Тэлеграму?.. Ніякіх тэлеграм ніхто мне не даваў... Вельмі тэрміновая?.. Маланка?.. Можа, пярун?.. Ну, ну... Ага... Добра, добра... Я спытаю свайго паштальёна... Распіску?.. Добра, добра, вышлем. Усяго добрага. *(Да карэспандэнта.)* А справа ў тым, што пасля таго, як двух брыгадзіраў узнагародзілі, увесь калгас так заварушыўся, што мне толькі... паспявай.

Карэспандэнт. Дык якая ж тут бяда?

Пракапчук. Яно і не бяда калгасу, а на карысць, бо кожны хоча, каб яго ўчастак лепшым быў. А мне-то як? Мяне скубе кожны. І ўгнаенне дастань, і цягло размяркуй, ды каб пароўну, ды каб без крыўды. Таго выстарайся, гэта знайдзі. І, ведаеце, на горла становяцца — давай, і ўсё тут, з калена ламі, а дай. І кожны хоча, каб першаму яму перапала.

Карэспандэнт. І правільна, са старшыні ўвесь спрос. Гэта не бяда. *(Запісвае ў блакнот.)*

Пракапчук. Яно, вядома, і не бяда, а ў мяне *(ляпае сябе па галаве)* ад гэтых турбот галава лысай стала.

Карэспандэнт. А як жа вы хацелі без турбот? Справа патрабуе, каб усе калёсікі круціліся, і старшыня ў тым ліку. А скардзіцца няма на што. *(Запісвае.)*

Пракапчук. А я не скарджуся... *(Схамянуўся.)* Запісваеце? Не-не-не-не! Гэта ж я толькі так, па прывычцы. Ніякіх скарг. А то вы яшчэ напішаце... Калгас як калгас, прагрымеў, праславіўся, і вы раптам з маіх жа слоў размалюеце мяне, як плаксу, што самому брыдка стане. Не-не-не-не! *(Карэспандэнт запісвае.)* Пачакайце! Я ж кажу,

па прывычцы гэта. А тое што мне прыходзіцца хутчэй круціцца, дык жа недарма я ў кішэні пячатку нашу.

Карэспандэнт. Вы не турбуйцеся. Я не для газеты запісваю, а для памяці. А там пабачым, што для газеты, а што так.

Пракапчук. Я думаю, што лепш будзе, калі вы гаспадарку нашу паглядзіце. Там вы больш цікавага для сваёй ґазеты знойдзеце. А потым зойдзем у канцылярыю, для параўнання лічбы не лішне паглядзець.

Карэспандэнт. Згодзен, пойдзем.

Пракапчук складае свае кнігі ў стол; заходзіць Марыйка.

Марыйка. Добры дзень.

Пракапчук. Добры дзень.

Карэспандэнт. Добры дзень.

Пракапчук. А потым з камсамолам нашым пагутарыце. Гэта наш сакратар камсамольскі. Знаёмцеся. *(Марыйка працягвае руку.)*

Марыйка. Марыя Го... Ой, а я вас адразу пазнала... *(Карэспандэнт даў знак маўчаць.)*

Карэспандэнт. Як вы маглі мяне пазнаць, калі мы толькі ўпершыню сустракаемся? І такое прозвішча я таксама ўпершыню чую — Марыя Го.

Марыйка. Марыя Горліна.

Карэспандэнт. А я — Антон Вярбіцкі.

Марыйка. Я вас пазнала па той фотакартачцы, што вы падарылі... *(Да Пракапчука.)* Што, яны ўжо прыехалі, Міхась і Тамара?

Пракапчук. Не, яны яшчэ не прыехалі. Ніяк не дачакаешся свайго Міхася?

Марыйка *(засаромелася)*. Ён і ваш такі, як мой.

Пракапчук. Ведаю, ведаю. Ад мяне не ўтоіш. Прыедзе, прыедзе, не турбуйся, нідзе не дзенецца. *(Да карэспандэнта.)* Ну, пойдзем.

Карэспандэнт *(да Марыйкі)*. Мы яшчэ пагутарым.

Выходзяць. Заходзіць Гаўрыла і зачыняе на зашчапку дзверы.

Марыйка. Гэта яшчэ што?

Гаўрыла. Гэта каб ты не ўцякла. *(Хоча гаварыць ласкава, але грубы, басавіты голас і цвёрды намер выказаць накіпеўшае надае яго голасу дзёрзкае, грубаватае адценне.)* Я хачу пагаварыць з табой.

Марыйка. Адшчапі дзверы!

Г а ў р ы л а. Не бойся. Не з'ем жа я цябе, не ўкушу. Што я воўк які, ці што?

М а р ы й к а. А хто цябе ведае. Адчыні дзверы, інакш і гаварыць не стану.

Г а ў р ы л а. Калі ўжо ты не хочаш пагаварыць са мной, дык выслухай, што я табе скажу.

М а р ы й к а. Адчыні дзверы! Сілай сваёй не выхваляйся. Гэтым не дапаможаш. Падумаеш, баксёр. І слухаць не буду.

Г а ў р ы л а. Усё роўна і цябе не выпушчу і сам не пайду, пакуль не скажу, што надумаў... Таму што болей не магу так.

М а р ы й к а. Нічога мне не трэба гаварыць.

Г а ў р ы л а. Не, ты паслухай, што табе — цяжка? Я нікога яшчэ не прасіў так.

М а р ы й к а. І не трэба. Я і так ведаю, што ты будзеш гаварыць.

Г а ў р ы л а. А адкуль ты ведаеш?

М а р ы й к а. Уся вёска аб гэтым ведае. Ты ж бабцы Агапцы сказаў раней, чым мне.

Г а ў р ы л а. Дык жа я сказаў, што цябе кахаю, а не яе.

М а р ы й к а. А бабка Агапка — цётцы Аўдоцці, а тая — Хвядосі, а Хвядося — на агульным сходзе.

Г а ў р ы л а. Яна пра мяне нічога не сказала на агульным сходзе.

М а р ы й к а. А пра каго яна гаварыла?

Г а ў р ы л а. Дык гэта ж пра рэвізійную камісію: што яна ходзіць за праўленнем, бачыць непаладкі і нічога не гаворыць.

М а р ы й к а. І дабавіла: «Як Гаўрыла за Марыйкай».

Г а ў р ы л а. Дык жа ты не дазваляла мне сказаць. Я пачну гаварыць, а ты ўцякаеш. *(Пакрыўджана.)* Нібы я не чалавек.

М а р ы й к а. Чаму не чалавек?

Г а ў р ы л а. Дык я ўжо надумаў сёння абавязкова сказаць. Сказаць, і ўсё, а там — што будзе.

М а р ы й к а. Можаш гаварыць, але ўсё гэта дарэмна.

Г а ў р ы л а. А чаму дарэмна?

М а р ы й к а *(строга)*. Адчыні дзверы, а то прыедзе Міхась з Масквы, дык...

Г а ў р ы л а. А што ён за такі заступнік? Брат ён табе ці сват?

М а р ы й к а. Тады пабачыш — хто!

Гаўрыла спахмурнеў. Паўза.

Г а ў р ы л а *(ціха)*. Не выходзь за яго замуж, Марыйка.

М а р ы й к а. Гэта чаму?

Г а ў р ы л а. Я цябе прашу: пачакай.

М а р ы й к а. Вось раскажу Лушы, яна табе пакажа, як прасіць!

Г а ў р ы л а. А што мне Луша?

М а р ы й к а. А што мне ты? Міхась жа хлопец як хлопец, уважлівы, разумны, з людзьмі працаваць умее, ордэн за ўраджай атрымаў, а ты. *(Лагодна.)* А ты, Гаўрыла, цямця-лямця.

Г а ў р ы л а *(апусціў галаву)*. Налета я таксама атрымаю. Слова даю.

М а р ы й к а. Калі ты ордэн атрымаеш, дык Міхась героем будзе.

Г а ў р ы л а. Я таксама... буду...

М а р ы й к а. Героем? Ха-ха-ха... Ну, які з цябе герой.

Нехта стукае ў дзверы.

М а р ы й к а. Адчыняй дзверы, нахабнік!

Гаўрыла адчыняе дзверы, заходзіць П р а к а п ч у к.

П р а к а п ч у к. Гэта што за жарты? Табе што, рабіць няма чаго? То ідзі ды хоць пажарныя бочкі вадой напалівай. Туляешся ты тут нешта. Плугі вунь трэба да сяўбы рыхтаваць, бароны рамантаваць... У кузню ідзі, лайдак!

Г а ў р ы л а. Інвентар ужо даўно адрамантаваны, хоць заўтра выязджай на поле.

М а р ы й к а. У яго ж толькі бокс у галаве і сядзіць.

Г а ў р ы л а. Бокс таксама карысная справа.

П р а к а п ч у к. То ідзі займайся сваім боксам. А сяўба пачнецца — часу не будзе. Баксёр...

Г а ў р ы л а. Які ні баксёр, але ў калгасе чэмпіён. Сёння вечар самадзейнасці, пабачыце, які баксёр.

П р а к а п ч у к. Вось асаромішся вечарам перад карэспандэнтам, распіша на ўсю вобласць, як няўмеку.

Г а ў р ы л а. А ён бокс разумее?

П р а к а п ч у к. Вядома, разумее.

Г а ў р ы л а. Дык, можа, я з ім і паспрабую вечарам.

П р а к а п ч у к. Ты яшчэ што прыдумай! *(Да Марыйкі.)* Марыйка! Дык па якой гэта фотакартачцы ты пазнала гэтага госця нашага?

М а р ы й к а. А ён не сказаў? Гэта ж жаніх Тамары нашай. Ён і фатаграфію падарыў. Яны яшчэ пазнаёміліся ў мінулым годзе, калі мы на нараду ездзілі. А перад ад'ез-

дам у Маскву дамовіліся пажаніцца. Вось ён і прыехаў, а Тамара недзе затрымалася.

Гэта навіна ашаламіла Пракапчука.

Пракапчук. Ага! Дык вось ты што-о! Вось які ты карэспандэнт! Добра ж, добра, даражэнькі! Я ж цябе ажаню. А! І вочы замазвае... *(Іранічна.)* Брыгады яго цікавяць, «ураджай», «новыя людзі», «арганізацыя», «планы на будучае». Самага патрэбнага мне чалавека задумаў з калгаса звезці. *(Грозна.)* Не дам дзяўчыну абы-куды! Мне аграном патрэбен! Карэспан-дэнт!..

Марыйка. І зусім ён не карэспандэнт, Сямён Макаравіч.

Пракапчук. Я пра яго больш і слухаць не хачу! Хай хоць чорт лысы будзе. *(Сярдзіта.)* Па вачах бачу, што чмут. *(Іранічна.)* Жані-іх. Дзяўчына стала ў людзі выходзіць, ёй разгон трэба, поле калгаснае, а ён звезці задумаў. У яго пакойчыку фікусы-пікусы паліваць. Жа-ані-іх!.. Я цябе зараз ажаню!

Гаўрыла. Сямён Макаравіч, давайце я яго ажаню.

Пракапчук. Ідзі ты адсюль! Не круціся перад носам; і без цябе хапае...

Гаўрыла *(выходзячы)*. Чэснае слова, адпала б у яго ахвота жаніцца. Магу дапамагчы.

Пракапчук. Ідзі, ідзі! *(Гаўрыла пайшоў.)* *(Да Марыйкі.)* Ідзі пакліч яго сюды. *(Марыйка выходзіць.)* «Прыгледзецца прыехаў»... Я табе прыгледжуся!..

Заходзіць Луша з газетамі і тэлеграмай.

Луша. Сямён Макаравіч, тут вам толькі што тэлеграму прынеслі. Праўда, паштальён сказаў, што забыўся вам аддаць і тры дні ў сумцы насіў.

Пракапчук. Якая там тэлеграма?

Луша. З Масквы, маланка. Быццам бы Міхась і Тамара пажапіліся, ці што?

Пракапчук. Ну-у? Давай, давай. *(Чытае.)* Хм... *(Здзівіўся.)* Чорт іх ведае... Ды не можа быць. *(Да Лушы.)* Ды Міхась жа з Марыйкай нешта такое думаў... *(Паціскае плячыма.)* Ты нічога не ведаеш?

Луша. Я і сама цяпер нічога не ведаю.

Пракапчук *(яму, як відаць, прыйшла ў галаву думка)*. Э, ды якраз дарэчы. Добра, добра.

Луша разглядала газету і раптам аж падскочыла.

Л у ш а. Сямён Макаравіч! Глядзіце, глядзіце!

П р а к а п ч у к. Што там яшчэ?

Л у ш а. Ды вось у «Правде» Тамара, Міхась... Партрэты. Вось паглядзіце.

П р а к а п ч у к *(чытае)*. «Мастера высоких урожаев, бригадиры колхоза «Заря коммуны» Тамара Тарасюк и Михаил Задорный, награжденные орденами». Ай да малайцы нашы! Вось гэта голас!.. У «Правде»... *(Разглядае газету.)* О-о-о! Ай ды пара! Ну што тыя артысты, люба паглядзець. А ён звезці дзяўчыну задумаў. Перад ёй цяпер дарога вунь якая. Ну, чакай... дзе ён, гэты жаніх? Дай газету...

Заходзяць М а р ы й к а і к а р э с п а н д э н т.

П р а к а п ч у к. Вы хіба пагулялі б дзе, Марыйка, Луша! Ідзіце дзяўчатам пакажыце газету. Мне трэба з чалавекам пагаварыць па сакрэту.

М а р ы й к а. Калі ласка.

Л у ш а *(выходзячы)*. Марыйка, ты бачыла газету? *(Выйшлі.)*

П р а к а п ч у к *(крыху замінаецца)*. Ведаеце што, таварыш карэспандэнт, ці як там... Я люблю папросту гаварыць, без хітрыкаў. Я, канешне, прашу прабачэння, але, як кажуць, супроць факта не папрэш. Вось яно і выходзіць так, што... Кожнаму коніку свой хамут; ці як мой дзед вучыў: не ў свае сані не садзіся, бо прыйдзецца злезці не там, дзе хочаш, а там, дзе скажуць. Ведаеце, хоць і непрыемна, ды...

К а р э с п а н д э н т. Вы сказалі, што любіце папросту, без хітрыкаў, а пачалі неяк з выкрунтасамі. Вы не па загуменні, а па вуліцы вядзіце, напрасцяк, яно бліжэй будзе.

П р а к а п ч у к. Ну, калі бліжэй, дык можна і напрасцяк. Вы ж да нас прыехалі не толькі як карэспандэнт, а і... і як быццам бы і жанішок. Так ці не?

К а р э с п а н д э н т. Хай сабе і так. А адкуль вы гэта ведаеце?

П р а к а п ч у к. А такая ўжо наша гаспадарская справа.

К а р э с п а н д э н т. Ну, ну, дык у чым справа?

П р а к а п ч у к. Вы ж па Тамару нашу прыехалі? Так?

К а р э с п а н д э н т. Інфармацыя правільная.

П р а к а п ч у к. Вось і атрымліваецца не інфармацыя, а пертурбацыя. Яно, можа, і к лепшаму. Яе дарожка адна, а ваша — другая. Ёй — поле, шыр, раздолле, ураджай, а

вам — справа іншая. Бачылі ў «Правде» партрэт. Гэта, папершае.

Карэспандэнт. А па-другое,— вам патрэбен аграном, а не якісьці карэспандэнт.

Пракапчук. Дый то праўда.

Карэспандэнт *(у тон яму)*. Ну, гэта яшчэ не бяда.

Пракапчук. Хай, на-вашаму, не бяда. Але яна, відаць, сама так зразумела і прыслала нам тэлеграму. Вось пацікаўцеся. *(Чытае.)* «З Масквы. Маланка. Старшыні калгаса «Зара камуны» Пракапчуку, кропка. Выязджаем дадому, кропка. Рыхтуйце багатае вяселле, кропка. Тамара і Міхась і кропка». Кропка!

Карэспандэнт. Не можа быць! Пакажыце!

Пракапчук. Усё можа быць. Напісана разборчыва. «І кропка». Як ні круці — кропка.

Карэспандэнт. Гэта ашуканства.

Пракапчук *(пакрыўджана)*. Ну, таварыш, я не хлопчык, і ад ашуканства мне карысці няма. А пра тэлеграму самі чулі, як па тэлефоне пыталі. Вось уручылі, за што і распісаўся.

Карэспандэнт. Гэта нейкая недарэчнасць.

Пракапчук. Якая ж тут недарэчнасць. Яны адзін аднаго ведаюць. Ён — чалавек нішто сабе, таксама ордэн атрымаў. Ну і там, у Маскве, відаць, дамовіліся. Гасцініца, нумарок, умовы!

Карэспандэнт. Дрэнна вы яе ведаеце, яна не магла так зрабіць.

Пракапчук. Я-то яе добра ведаю, дзеўка з галавою, а вось вы — прамахнуліся.

Карэспандэнт. Не, не веру! Хачу сваімі вачыма ўбачыць. Буду чакаць.

Пракапчук. Гэта ўжо справа асабістая. Толькі я вам раю... лепей паехаць паціху, каб ніхто і не ведаў.

Карэспандэнт. Не, буду чакаць.

Пракапчук. З мора пагоды?

Карэспандэнт. Што будзе — пагода дык пагода, а навальніца дык навальніца.

Пракапчук *(сярдзіта)*. Калі ласка! Чакайце! Вось вам маё крэсла.

Падае крэсла і сам выходзіць.

Карэспандэнт *(разважае)*. Чорт яго ведае, што тут творыцца... Сапраўды няшчаслівае чысло... Каб Тама-

ра ды так зрабіла?.. Ды не, не можа быць... Можа, ён сам гэтую штучку з тэлеграмай прыдумаў? Дык не — званілі... Трэба яму адкрыцца, што я да яго аграномам прыехаў.

Заходзіць Гаўрыла, падыходзіць да стала і перад носам карэспандэнта кладзе баксёрскія пальчаткі. Той нічога не разумее.

Гаўрыла. Ну, бярыце.

Карэспандэнт. А нашто яны мне.

Гаўрыла. А без пальчатак які ж бокс?

Карэспандэнт. Біцца? Я ніякага намеру не маю.

Гаўрыла. Затое я маю.

Карэспандэнт. Біцца?

Гаўрыла. Не, нашто біцца. Так. Толькі абы страху нагнаць.

Карэспандэнт *(смяецца)*. Ну, ты ўжо страху нагнаў. А за што ж мы будзем біцца? Ці не старшыня вам загадаў?

Гаўрыла. А чаму ён будзе загадваць? Я сам.

Карэспандэнт. Але ж усё-такі, за што ж вы сабраліся біць мяне?

Гаўрыла. Каб ведалі, што ў нас ёсць на ўсе рукі майстры.

Карэспандэнт. Я і так ведаю!

Гаўрыла. Ды вы не палохайцеся, я асцярожна буду. Мы толькі патрэніруемся да вечара.

Карэспандэнт. Я не спалохаўся, але да бокса ахвоты не маю.

Гаўрыла. Я ведаю, на што вы маеце ахвоту.

Карэспандэнт. Толькі не біцца. Я, напрыклад, прыехаў да Тамары. Тут я вашых інтарэсаў не зачапіў?

Гаўрыла. Гы-ы... Інтарэсы... яна пташка нішто сабе, ды высока сядзіць; не мне даставаць яе і не вам.

Карэспандэнт. Пташка, кажаш... Та-ак... *(Паўза.)* А як ты думаеш, можа гэта пташка слова даць, а праз тыдзень забыць пра яго?

Гаўрыла. Хто? Тамара? Не-е! Яна не такая.

Карэспандэнт. Вось і я гэтак жа думаў... Дык вось... Выйшла замуж і тэлеграму прыслала.

Гаўрыла. Хто? Тамара? За каго?

Карэспандэнт. За Міхася.

Гаўрыла. За якога Міхася? Нашага?

Карэспандэнт. Кажуць, за вашага.

Гаўрыла. Няпраўда!

Карэспандэнт. Вось і тэлеграма. *(Паказвае Гаўрылу, той чытае.)*

Гаўрыла. Няпраўда! А Марыйка куды?

Карэспандэнт. Якая Марыйка?

Гаўрыла *(крычыць)*. Як, якая Марыйка? Яго Марыйка! Яна чакае яго, яна ж верыць яму!

Карэспандэнт. І я веру ёй...

Гаўрыла. Няпраўда! Не мог ён такой дзяўчыне маніць. Марыйка ж любіць яго. Дзе вы ўзялі гэтую тэлеграму?

Карэспандэнт. Старшыня даў.

Гаўрыла. Старшыня? А можа, старшыня... *(Нешта думае.)*

Карэспандэнт. Можа, і старшыня.

Гаўрыла. Мы зараз дазнаемся. *(Хоча ісці, спыніўся, падыходзіць да карэспандэнта, пытае.)* Скажы, а ты кахаеш яе?

Карэспандэнт. Ты не памыліўся.

Гаўрыла. Ага! *(Памкнуўся да выхаду, ды зноў спыніўся.)* А скажы... а ты што... Ну, прафесія якая?

Карэспандэнт. Па прафесіі я аграном.

Гаўрыла *(здзівіўся)*. Ну-у. Тады мы зразу даведаемся. Тут памочнік рахункавода — свая дзяўчына, па мне сохне. Яна, відаць, усё ведае.

Карэспандэнт. Ну?..

Гаўрыла. Вось і ну. А ты думаеш, што Гаўрылу дзяўчаты не любяць. Ого-го! Яшчэ як! *(Спяшаецца.)* Дык я зараз дазнаюся. Толькі ты не сумнявайся. Тамара не магла так зрабіць. *(Выбягае, у дзвярах сустракаецца з Пракапчуком.)*

Пракапчук. Куды цябе нячыстая нясе?

Карэспандэнт. Гэта я яму страху нагнаў. Дарма што ён баксёр. А вось наконт тэлеграмкі, дык нешта незразумела. Можа...

Пракапчук. Нічога не можа. І ні да якіх тэлеграм я дачынення не маю, і не мая справа імі займацца. Мае справы — калгас, гаспадарка, а жаніхацца мне з вамі няма калі. Вось і ўсё. *(Збірае кніжкі і хоча ісці.)*

Звоніць тэлефон. Пракапчук здымае трубку.

Так, так!.. «Зара камуны». Я старшыня. Ну, давайце... Хто гэта? А-а-а. Добры дзень, таварыш дырэктар!.. Нічога, дзякую. Хто, хто?.. Ніякага агранома ў мяне няма... Да мяне ў калгас? Не, не прыходзіў... Ніякага Вярбіцкага не было.

Карэспандэнт. А я? А я хто?

Пракапчук *(да Вярбіцкага)*. Аграном? *(Адкашліваецца ў трубку.)* А-а-а... Вярбіцкі ёсць... Дык ён сапраўды аграном?.. А-а... *(Круціць галавой.)* Вы ж карэспандэнт... Што? Раней працаваў... А цяпер у нас будзе?.. Дык чаму ж вы раней не званілі? А... Тамара?.. А дзе яна?.. У вас былі?.. Прыехалі?..

Убягае Луша.

Луша *(захлёбваецца)*. Сямён Макаравіч! Прыехалі! Яны прыехалі! Тамара, Міхась! *(Пракапчук і Вярбіцкі разгубіліся, паглядаюць адзін на другога.)*

Пракапчук *(у тэлефон)*. Прыехалі ўжо! Бывайце! *(Да Лушы.)* А тэлеграма? Што за вяселле?

Луша. Мы не так зразумелі! Гэта ж Міхась і Марыйка жэняцца, а Тамара...

Пракапчук. Ясна! А Тамара з аграномам. Усё-такі так, як я казаў! Здабудзем сабе агранома, і здабылі.

Вярбіцкі. Дык, можа, памірымся?

Пракапчук. Не толькі памірымся,— сватам буду.

Паціскаюць адзін другому рукі.

Заслона.

ПЕРШАЕ ПЫТАННЕ

П'ЕСА
У АДНОЙ ДЗЕІ

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ:

Алена Сяргееўна — піянерважатая.
Алёша — сакратар камсамольскага камітэта, вучань 9 класа.
Лёня — вучань 7 класа.
Косця — вучань 8 класа.
Тома — вучаніца 7 класа.
Вова — ганарлівы, высакамерны хлопчык, вучань 7 класа.

Піянерскі пакой у школе. На пярэдняй сцяне партрэты Леніна і Сталіна, акаймаваныя вянкамі з жывых кветак. З аднаго боку плакат: «Калі я ведаю, што ведаю мала, я даб'юся таго, каб ведаць больш» (Ленін); з другога боку таксама плакат: «Каб будаваць, трэба ведаць, а каб ведаць, трэба вучыцца» (Сталін). Унізе пад партрэтамі фотамантаж «Быць такімі, як яны!». Там фатаграфіі Зоі Касмадзям'янскай, Лізы Чайкінай, Алега Кашавога, Аляксандра Ісачанкі і іншых герояў Айчыннай вайны — камсамольцаў. Пасярод пакоя стол, пакрыты чырвоным абрусам, некалькі крэслаў. У кутку піянерскі горн, сцяг. Заходзяць Вова і Тома з кветкамі ў руках. Ад гэтых прыгожых кветак па ўсім пакоі разыходзіцца прыемны пах. Тома мяняе кветкі ў шклянках, што стаялі на стале.

Тома. Вова, схадзі прынясі свежай вадзічкі, а то ў гэтай яны хутка завянуць.

Вова *(азірнуўся вакол, як бы шукае каго.)* Гэта значыць я?

Тома. Ну, а хто ж?

Вова *(знімае шапку)*. Па ваду схадзіць не цяжка, толькі шапка мая прамакае, не данясу...

Тома. Ай, які ты някемлівы! Вось графін, вазьмі, ён не прамакае.

Вова неахвотна бярэ графін і лянiва выходзіць. Тома любоўна прыладжвае ў вянкі каля партрэтаў Леніна і Сталіна па вялізнай чырвонай кветцы вяргіні. Напявае: «Эту песню не задушишь, не убьёшь...» Заходзіць Вова з вадой.

Вова. Калі ласка...

Тома. Дзякую!

Вова. Няма за што. *(Тома налівае ваду ў шклянкі.)*

Тома. Вова, а ты скажы, ты не хвалюешся?

Вова. Вядома, не хвалююся.

Тома. Ні-ні! Нікольki?

В о в а. А чаго мне хвалявацца?

Т о м а. Дзіўны ты хлопец. А я — так хвалявалася, так хвалявалася, калі мяне прымалі, што... Ты не ўяўляеш сабе.

В о в а *(з пагардай.)* Дзяўчаты зроду такія. На нервы яны слабаватыя...

Т о м а. А пры чым тут нервы?

В о в а. Як пры чым? Трэба быць спакойным, упэўненым. А дзяўчаты...

Т о м а. А якая розніца паміж дзяўчатамі і хлопцамі? У камсамоле розніцы няма.

В о в а. Ну, розніца ёсць. А што, па-твойму, для забавы прыдумалі ў граматыцы мужчынскі род і жаночы? Ці спецыяльна для таго, каб мы памылкі рабілі ў дыктоўках? Значыць, ёсць розніца.

Т о м а. Не, гэта ў цябе натура такая абыякавая. А я вось хвалююся. Не мяне, а цябе будуць прымаць у камсамол, але я ўсё роўна хвалююся.

В о в а. Думаеш, не прымуць, і таму...

Т о м а. Не. Калі б я думала, што цябе не прымуць, то не давала б рэкамендацыі.

В о в а. Ну дык чаго ж хвалявацца?

Т о м а. Значыць, ты яшчэ не зразумеў, якая гэта падзея ў тваім жыцці.

Заходзіць А л е н а С я р г е е ў н а. Вітаюцца.

А л е н а С я р г е е ў н а. Томачка, як заўсёды, са свежымі кветкамі. *(Нюхае.)* Ах, як яны цудоўна пахнуць! Ды гэта ж палявыя кветкі... Дзе ты іх нарвала?

В о в а. Гэта мы на татавай машыне за горад ездзілі.

А л е н а С я р г е е ў н а. Томачка! Схадзі да дырэктара школы, спытай, можа, ён будзе прысутнічаць на паседжанні камітэта.

Т о м а. Добра. *(Выходзіць.)*

А л е н а С я р г е е ў н а. Ты Лёню адведаў?

В о в а. Сёння хацеў, дык жа паседжанне камсамольскага камітэта.

А л е н а С я р г е е ў н а. А ўчора, а заўчора?

В о в а. Усё неяк часу не было. З бацькам на рыбу ездзілі. Ды яго ўжо хутка выпішуць з бальніцы. Маці яго яшчэ ў панядзелак гаварыла.

А л е н а С я р г е е ў н а. Бачыш, які ты сябра? Ён дык знаходзіў час дапамагаць табе рыхтавацца да пераэкзаменоўкі.

Вова. А паміж намі сапраўднай дружбы ўсё-такі няма...

Алена Сяргееўна. Чаму?

Вова. Ён заўсёды да чаго-небудзь прыдзіраецца, што б я ні зрабіў.

Алена Сяргееўна. А калі ты робіш не тое, што трэба?

Вова. Чаму не тое? Проста не так, як яму хочацца...

Алена Сяргееўна. Дружбу трэба правяраць на чым-небудзь важным, а не на дробязях. Вось ён усё лета патраціў на цябе, каб падрыхтаваць да пераэкзаменоўкі. А гэта мог зрабіць толькі сапраўдны сябра.

Вова. А калі ён сапраўдны сябра, то чаму не захацеў даць рэкамендацыю ў камсамол?

Алена Сяргееўна. А ён што, зусім табе адмовіў?

Вова *(замяўся.)* Ён сказаў, што я... што мне... Адным словам, пакуль што не даў.

Алена Сяргееўна. Цікава. Можа, таму, што пераэкзаменоўка была?

Вова. Не... Я і сам не разумею, чаго ён хоча. Прыйдзецца яшчэ раз запытаць.

Уваходзіць Алёша. Вітаюцца.

Алёша. Чулі апошнюю спартыўную навіну?

Алена Сяргееўна. Футбол?

Алёша. Так. *(Расчаравана.)* Мінскае «Дынама» прайграла.

Вова. Дык якая ж тут навіна! От, калі б яны выйгралі, гэта сапраўды б навіна была.

Алёша *(яму не спадабалася рэпліка Вовы)*. Трэба быць патрыётам, малады чалавек. Аднак што за дысцыпліна? Дзе ж члены камітэта? Якая гадзіна зараз?

Вова *(рад выпадку паказаць, што ў яго ёсць гадзіннік)*. Роўна шэсць.

Алёша. Ну вось, а іх нікога няма. Я ўжо думаў, што спазніўся. Так спяшаўся, што нават паперы не захапіў для пратакола.

Алена Сяргееўна. Тома ўжо тут. Ты ды я — тры. Няма толькі Лёні ды Косці. Лёня хворы, у бальніцы, а Косця...

Алёша. Як хворы? Я толькі што сустрэў яго. Ён зараз прыйдзе.

Алена Сяргееўна. Дык пойдзем, я табе дам паперы.

Пры выхадзе сустракаецца з Лёнем.

Толькі што ўспаміналі, а ён і тут. Прывітанне, Лёня! Як здароўе?

Лёня. Добры дзень, Алена Сяргееўна! Дзякую, ачуняў.

Алена Сяргееўна. Ну, ну, а то мы ўжо засумавалі без цябе. Вы тут пачакайце, мы зараз прыйдзем і пачнём паседжанне. Дарэчы, спытай свайго сябра (*ківае ў бок Вовы*), чаму ён такі няўважлівы.

Выходзяць.

Лёня. Ну, як ты здаў пераэкзаменоўку?

Вова. Добра. (*Кароткая паўза.*) А ты як?.. Цяпер... здароў?..

Лёня. Як бачыш.

Вова. Ты, можа, на мяне пакрыўдзіўся?

Лёня. За што?

Вова. Ну... што я не...

Лёня. Не адведаў. Дык я ж цябе добра ведаю. Нічога тут дзіўнага няма. (*Паўза.*)

Вова. А я думаў, ты пакрыўдзішся. Ну, а скажы, нарэшце, ты мне дасі рэкамендацыю ў камсамол?

Лёня. Рэкамендацыю? (*Падумаў.*) Не, не дам.

Вова. Ну, вось. А Алена Сяргееўна лічыць, што ты мой сябра. Якая ж тады ў нас дружба? Сам камсамолец, а мне рэкамендацыю даць не хочаш... Сябра называецца...

Лёня. Можаш называць гэта як хочаш, толькі рэкамендацыю я табе не дам. Я яшчэ не ўпэўнены, што ты апраўдаеш званне камсамольца.

Вова. Значыць, ты лічыш сябе лепшым за мяне?

Лёня. Я гэтага не кажу, але...

Вова. Ты не турбуйся. Мне твая рэкамендацыя не вельмі патрэбна. Я цябе спытаў толькі так, каб праверыць. Рэкамендацыі ў мяне ўжо ёсць, і без тваёй абыдуся.

Заходзяць Алёша, Алена Сяргееўна і Косця.

Алена Сяргееўна. Вы што, паспелі пасварыцца ўжо? Надзьмуліся, як сычы.

Лёня. Зусім не. Гэта вам здаецца.

Вова. Маленькая праверачка была.

А л ё ш а *(займае месца за сталом)*. Можна пачынаць. Косця, садзіся, пішы пратакол.

А л е н а С я р г е е ў н а. Пачакаем Тому. Яна пайшла паклікаць дырэктара школы.

А л ё ш а *(глянуў у акно)*. Яна ўжо ідзе, толькі адна.

Заходзіць Т о м а.

А л е н а С я р г е е ў н а. Ну, што, прыйдзе?

Т о м а. Паўла Фёдаравіча няма. Яго ў райком партыі выклікалі.

А л ё ш а. Тады, каб не марнаваць часу, пачнём самі.

А л е н а С я р г е е ў н а. Пачынай.

А л ё ш а. Першае пытанне — прыём у камсамол. Паступіла заява ад таварыша Струсевіча Вовы. *(Чытае.)* «Прашу прыняць мяне ў члены ВЛКСМ. Абавязваюся чэсна і добрасумленна выконваць праграму і статут ВЛКСМ і тыя абавязкі, якія будуць ускладзены на мяне камсамольскай арганізацыяй». Рэкамендацыі ёсць: Генелінай Томы і мая. Якія будуць пытанні?

Т о м а. Няхай раскажа аўтабіяграфію.

А л ё ш а. Давай раскажы, Вова.

В о в а *(іранічна ўсміхаецца)*. Вы ж мяне ведаеце, што мне яшчэ расказваць?

К о с ц я. Для парадку ўсё-такі трэба расказаць.

В о в а. Хіба толькі для парадку... Нарадзіўся я ў 1936 годзе. Бацька мой, як вам вядома, галоўным інжынерам на заводзе працуе. У часе вайны быў на фронце, мае пяць узнагарод. Завод атрымаў пераходны Чырвоны сцяг... Бацьку выбралі дэпутатам абласнога савета...

А л е н а С я р г е е ў н а. Ты пра сябе, а не пра бацьку расказвай.

В о в а. А я што? Я вучыўся. Кожны год пераходзіў з класа ў клас, і ўсё... Толькі ў гэтым годзе была адна пераэкзаменоўка, але я ўжо разлічыўся. Вось і ўсё.

А л ё ш а. Яшчэ пытанні будуць?

К о с ц я. Якія даручэнні выконваў? Удзел у грамадскай рабоце.

В о в а. Ну, які ўдзел?.. Даручэнняў не давалі... Некалі, праўда, удзельнічаў у драмгуртку, але... Усе нейкія п'ескі нецікавыя, дык я вырашыў — лепш у тэатр ездзіць ці ў цырк. Ды і наогул у драмгуртку нікога таленавітага не было. А так... Не было з кім іграць.

А л е н а С я р г е е ў н а. Вось гэта ўжо няпраўда.

Вова. Няхай сабе няпраўда. Але чым з такімі іграць, то лепш збоку паглядзець, як другія іграюць.

Тома. Вова, ты думай, што гаворыш!

Алёша. Яшчэ пытанні будуць?

Тома. Якія там пытанні, ёсць прапанова прыняць.

Лёня. Пачакайце. У мяне ёсць пару пытанняў.

Алёша. Давай, Лёня.

Лёня. Няхай Вова скажа, хто яму чысціць... бацінкі. Толькі чэсна.

Вова *(разгубіўся)*. Пры чым тут бацінкі?..

Лёня. А ты ўсё-такі скажы.

Вова. М-м-мама... чысціць.

Алёша *(здзіўлена)*. Хто, хто?

Вова. Я ўжо сказаў... маці.

Косця *(сур'ёзна)*. Гэта, таварышы, яўная эксплуатацыя.

Алена Сяргееўна. Чаму маці, а не сам?

Вова. Вельмі проста. Кожны павінен што-небудзь рабіць. Тата на заводзе працуе, я вучуся, а маці займаецца хатнімі справамі.

Тома *(абурана)*. Што ты гаворыш, Вова?

Вова. Я ж яе не прымушаю. Яна сама...

Лёня. Яшчэ б... Не хапала толькі, каб ты яе прымушаў.

Вова. І чаго ты да мяне чапляешся заўсёды?

Лёня. Дазвольце мне сказаць.

Алёша. Пытанні яшчэ будуць? *(Усе маўчаць.)* Слова мае Лёня.

Лёня. Ніколі я не чапляюся. Яшчэ адно пытанне. Тыя, хто давалі Вову рэкамендацыю, ці былі хоць раз у яго дома, ці ведаюць, як ён паводзіць сябе ў сям'і?

Алёша. Я — не.

Тома *(крыху збянтэжана)*. Я — таксама.

Лёня. А я быў і ведаю. У доме ён, акрамя бацькі, нікога не паважае, лічыць, што ўсе павінны быць у яго на паслугах. Маці сваёй ён не слухае, часта агрызаецца, прытым вельмі груба. Па ваду схадзіць ці дровы прынесці ў хату — не яго справа. Нават бацінкі свае пачысціць — таксама не яго справа. А да сваёй малодшай сястры ён ставіцца зусім зняважліва. Колькі разоў я раіў яму: Вова, так нельга, так непрыстойна. Але дзе там! Ён нават і слухаць не хоча, лічыць гэта за прыдзіркі. А я лічу, што гэтым самым ён не заслужыў, каб мы яго прынялі ў камсамол. Мне непрыемна гэта гаварыць, як-ніяк, а мы былі сябрамі... можа, пасля

гэтага ён не захоча і сустракацца са мной, але я павінен быў сказаць гэта, бо жадаю яму дабра, хачу, каб ён выправіўся... *(Сеў. Паўза. Вова апусціў вочы.)*

Косця. Я падтрымліваю прапанову Лёні. *(Тома глядзіць на Алену Сяргееўну, то на Алёшу, то на Вову.)*

Алена Сяргееўна. Ну, а Тома што думае?

Тома *(вельмі хвалюецца)*. Я... бяру назад сваю рэкамендацыю, калі гэта так... калі гэта праўда.

Алёша. Я... Я хацеў бы ведаць, што скажа сам Вова.

Вова *(апусціўшы галаву, ціха)*. Я прашу... я абяцаю...

Алёша *(да Вовы)*. Лёня гаварыў праўду? *(Вова яшчэ ніжэй схіліў галаву. Маўчыць.)* Ну, што ж маўчыш? *(Паўза.)* Я прапаную так: вынесці гэтае пытанне на абмеркаванне камсамольскага сходу. А за гэты час даручыць Косці і... і мне праверыць усё гэта. Наведацца дамоў да Вовы...

Вова *(ціха)*. На сход не трэба.

Алена Сяргееўна. Не, Вова, трэба. Гэта карысна будзе і для сябе і для іншых. А на Лёню крыўдзіцца нельга. Ён зрабіў па-камсамольску, чэсна, як сапраўдны сябра... Мы табе дарогу ў камсамол не закрываем, і калі ты зразумееш свае памылкі і выправіш, прымем цябе ў сваю сям'ю.

Лёня. Безумоўна, выправіць! Я веру ў гэта.

Алёша. Другіх прапаноў не будзе?

Косця. Відаць, не.

Алёша. Тады пераходзім да другога пытання...

Вова ўстае і павольна выходзіць з пакоя.

Заслона.

АКСЕНІНА ЦЯЛУШКА

АДНААКТОВАЯ П'ЕСА

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ:

Макар — калгаснік.
Аксеня — яго жонка.
Кандрат — іх сусед.

Усё адбываецца ў хаце Макара Сцяпанавіча, на чыстай палавіне. Па тым, як прыбрана хата, відаць, што Аксеня — сціплая і акуратная гаспадыня, а хата — поўны кораб.

З двара заходзіць Аксеня — жанчына гадоў сарака пяці, статная, здаровая, калі раззлуецца, дык, напэўна, здужае добрага мужчыну. Не скінуўшы кажушка, садзіцца на крэсла.

Аксеня. Куды ж яна магла прапасці? Як жа гэта я недагледзела?! Такая цялушачка, ай-яй-я-яй! І пойла, відаць, астыла ўжо. Я ж і малачака і семя наварыла... *(Пайшла, паглядзела пойла і, выціраючы рукі, вяртаецца.)* Сама, здаецца, піла б, а яна... ну нібы скрозь зямлю правалілася, нібы хто... *(Адумалася.)* Можа, пазайздросціла чыё-небудзь вока, цялушачка ж такая, быццам лялька. Можа, і залыгаў які-небудзь злыдзень... Ад самага рання бегаю па вуліцы, як дурная, пытаюся, а яно вось што. Як жа гэта я раней не дадумалася? І сляды ад хлява былі, а цяпер снегам зацерушыла, затапталі, ездзячы. Ну, вядома, укралі — сляды ж былі. А я меркавала, што гэта мой разявень хадзіў. Ды як жа падумаць пра крадзеж, калі ўжо гадоў пяць нічога не было ў нашай вёсцы. І той нечага варты, на досвітку як сышоў, дык да вечара вачэй не паказвае. Ну ж я яму пакажу! Можа, у міліцыю заявіць? *(Зашпіліўшы на ўсе гузікі кажушок і паправіўшы хустку, рашуча накіроўваецца да дзвярэй, але пры выхадзе сустракаецца з Макарам. Ён, як заўсёды, вясёлы.)*

Макар. Куды ж ты, Ксеня? Пакарміла б хаця, а то ў жываце нібы статак галодных цялят. *(Скідае кажушок.)*

Аксеня. Не распранайся, зараз пойдзем шукаць... Цялушачка прапала.

Макар. Цэла будзе твая цялушачка... пабегае і прыбяжыць сама, як прагаладаецца.

А к с е н я. Як жа не прападзе, як жа цэла будзе, калі прапала ўжо, калі яе ўкралі.

М а к а р. Кінь ты мне галаву дурыць! Не да таго мне. Выдумала — укралі. Хто на яе пакваліцца? Які дурань будзе красці цялё тваё неразумнае? Хоць бы людзей пасаромелася гаварыць такое.

А к с е н я. Ну во, бачыш! Во ён які! Збрыдзе на ферму і прападае там цэлы дзень. Каб і хату за вуглы сцягнулі, ты і вусам не павядзеш. Гаспадар называецца! Прападай яно ўсё. Табе не трэба, і мне таксама. Я не па два кавалкі ем.

М а к а р *(лагодна)*. Ну, Ксеня, Ксеня! Пакінь, супакойся. Знойдзем тваю цялушку, не хвалюйся.

А к с е н я. Як жа «не хвалюйся». Цэлы месяц гадавала, песціла. Ад сябе малачко адрывала, а яе не крыўдзіла. Думаю, выгадую, кароўка будзе. Старая ж, хіба толькі па мяса: колькі яна таго малака дае! Тая цялушачка расла, сэрцу міла было паглядзець. І раптам — хай прападзе? Хай прападае, а?! Як жа не хвалявацца?!

М а к а р. О, каб ты так за калгаснае дабро душой хварэла, даўно б мы мільянерамі былі. А то за сваё ўсё...

А к с е н я. Ты ж за мяне хварэеш. І жонку і хату сваю праменяў на ферму, прападаеш там днямі і начамі. І тут жа трэба некаму глядзець.

М а к а р. Ксеня, ягадка мая, ды не будзь жа ты такая сярдзітая. Ты б хоць запытала, як там у мяне на ферме, што там добрага, што там благога, цьфу, цьфу...

А к с е н я. Што з табой гаварыць!..

М а к а р. Ну добра, ты не гавары, ты хоць паслухай толькі, якую штуку выкінула Манашка наша...

А к с е н я. Якая манашка?

М а к а р. Ды на ферме ў нас карова-ялаўка. Разумееш, усе каровы пацяліліся, а яна — ялаўка. Другі год не целіцца, хоць ты плач. А тут зводку ў раён патрабуюць. І што ты думаеш, усе ўжо думалі на мяса яе збыць, а яна бац і... ацялілася. Сёння на золаку пабудзіў старшыню, каб у зводку ўключыў. Цяпер хай вязе ў раён, хай ведаюць, што на ферме Макара Сцяпанавіча ад ста сарака кароў прыплоду роўна сто сорак цялят. Ты разумееш, якая радасць. Я гатоў быў пацалаваць тую Манашку.

А к с е н я. Ты мяне ўжо гады два не цалаваў.

М а к а р. А Манашку пацалаваў бы, каб... Разумееш, не хапала аднаго цялёнка, каб на Усесаюзную выстаўку, хоць сам целіся...

А к с е н я *(адумалася).* Дык ты мне гэтым зубы загавараеш! Апранайся зараз жа, пойдзем цялушку шукаць. Чуеш? *(Зняўшы кажух з вешалкі, сілай апранае Макара.)*

М а к а р. Ды ну цябе, нікуды я не пайду. Прыбяжыць твая цялушка сама, халера яе не возьме.

А к с е н я. Ды што ты мелеш, што ты мелеш! Каб магла, дык да гэтага часу прыбегла б. Шукаць трэба.

М а к а р. Слухай, Аксеня. А можа, яна за вёску выскачыла? Калі ў двор чый-небудзь забрыла, дык знойдзецца, а то, чаго добрага, выскачыла ў хмызняк, а там... Ты ж чула, надоечы ваўкі сабаку сцягнулі. Во гады! Вельмі можа такое здарыцца, што яе воўк...

А к с е н я. Цьфу, цьфу! Каб такую цялушачку ды ваўкі з'елі?! Ну не! Я іх тады...

М а к а р. На хвост солі ім насыплеш.

А к с е н я. Пайшлі! *(Падштурхвае яго да дзвярэй, але дзверы расчыняюцца, і ў хату ўваходзіць Кандрат.)*

К а н д р а т. Добры вечар вам у хату! Ці не па цялушку сабраліся?

А к с е н я. Ага! *(Радасна.)* Ты, можа, бачыў дзе?

К а н д р а т. А як жа, бачыў.

А к с е н я. Дзякуй богу.

К а н д р а т. Значыцца, вы яе закантрактавалі?

М а к а р. Дзе там, яна ж супраць. Хоча выгадаваць сабе маладую кароўку. *(Распранаецца.)* Паспрабуй ты яе ўгаварыць. Яна ж роту салдат перакрычыць.

А к с е н я. І праўда, Кандратка, тая ж ужо зусім старэнькая.

К а н д р а т. Значыцца, ты без яе згоды завёў...

М а к а р *(спалохаўся, што Кандрат выдае яго з вушамі).* Ты пачакай, пачакай, Кандрат Міхайлавіч...

К а н д р а т. Ды ты што? Жонкі баішся?

М а к а р *(перапыняе).* Ды маўчы ты, не гавары! Мы зараз самі пагамонім. Пойдзем адсюль. *(Хоча вывесці Кандрата з хаты.)*

А к с е н я *(да Кандрата лагодненька.)* Не, не, ты гавары, Кандратка, ты гавары. *(Макару грозна.)* А ты сядзь і памаўчы.

К а н д р а т. Канешне, маўчаць не буду. Што яна, крадзеная, ці што?

А к с е н я. Дык скажы, Кандратка, куды ж ён завёў цялушачку?

К а н д р а т. А ты быццам не ведаеш? На калгасную ферму.

А к с е н я. Ага-а! Дык ву-унь які воўк цялушачку звалок!

К а н д р а т. Гляджу гэта я, на досвітку Макар цялушку павёў на ферму. Думаю, калі закантрактаваў, дык чаму ж упоцемку вядзе, употай. А ён во табе што!..

М а к а р. Эх ты, Кандрат, Кандрат! Што ты нарабіў? Яна ж мяне, цяпер... бацюхны!.. *(Апранае кажушок.)* Уцякай, Макар, з хаты! Ты ж, Кандрат, нічагусенькі не разумееш. *(Аксеня распранаецца.)*

К а н д р а т. А што? Можа, не так што?

М а к а р. Ты ж бачыш, якая яна. Гэта ж я цішком хацеў завесці цялушку на ферму. Манашка ў нас не ацялілася — халасцячка, ялаўка. Цяляці не хапае да поўнага плана, разумееш ты ці не? А ты! Эх ты! Сапсаваў мне ўсю справу. Тут, брат, задума даўняя ў мяне. Манашка — ялаўка. Значыць, хацелася план кантрактацыі хоць на адно цяля перавыканаць, каб адно на адно нацягнуць. Дык жа яна супраць, не ўгаворыш па-добраму. А тут зводку ў раён трэба было паслаць. Сорамна ж перад людзьмі. А ты такую свінню мне падклаў!..

К а н д р а т. Даруй мне, Макар Сцяпанавіч, дальбог, не хацеў. Я нават і не падумаў, што гэта цялушка табе абернецца свіннёй.

А к с е н я *(злосліва)*. Ну, што? Не стрэліла? Асечка!

Прадчуваючы, што жонка зараз пачне сварку, Макар сам пайшоў у атаку.

М а к а р *(грозна)*. Праз тваю сквапнасць людзі пра мяне чорт ведае што падумаюць!

А к с е н я *(спакойна, але з'едліва)*. Макар, галубок мой, ты на каго крычыш, а? На каго ж ты крычыш?

М а к а р *(усё ў тым жа тоне)*. Я гаспадар у хаце! Што хачу, тое і рабіць буду. Хопіць з табой цацкацца! Даволі мной тут камандаваць! Я гаспадар!

А к с е н я *(усё так жа спакойна.)* Мака-ар! Які ж ты гаспадар? Гаспадар жа ў двор цягне, да сябе грабе, а ты ад сябе, з двара валачэш. Гэта ж курыца так робіць, а не гаспадар.

М а к а р. Для цябе гаспадарка — твая цялу-у-шачка... *(Макар аж прысеў, паказваючы, якая гэта дробязь — цялушачка)*, а для мяне калгас — гаспадарка, ферма — гаспадарка, сто сорак кароў і сто сорак цялят — гаспадарка.

А к с е н я. Дык ты ўжо і карову туды зацягні.

М а к а р. Патрэбна там твая гэта балалайка старая. Можа, цябе зацягнуць?

Аксеня. Мака-ар! Ты, відаць, хочаш мяне раззлаваць...

Макар. Скваппасць твая, несвядомасць твая ўпоперак горла мне стала. Не цялушачка мне трэба, не курынае гняздо. План трэба выканаць, каб гады праз два ферма была на 200, на 300 галоў, каб малака і масла хапала ўсім колькі хочаш. Разумееш ты ці не?

Аксеня. Дык ці ты адной нашай цялушачкай накорміш?

Макар. Не адна, а сто саракавая. Ад ста сарака кароў сто сорак цялятак! Ты ведаеш, што гэта значыць? На Усесаюзную выстаўку пашлюць! Старшыня абяцаў!

Кандрат. За гэта людзям залатыя медалі, а то і ордэны даюць.

Аксеня. Ой, Макарка, ну чаго ж ты крычыш? Ты сядзь ды па-добраму пагавары.

Макар. Не хачу я з табой сядзець! Несвядомая ты!

Аксеня. Ну не злуйся. Можа, я і згаджуся з табой, толькі не зараз, а налета. Дык і праўда, можа, табе і медаль залаты дадуць?

Кандрат. Указаў не чытаеце, Аксеня Піліпаўна. Законаў не ведаеце.

Макар. На, прачытай. *(Дастае з этажэркі брашуру.)* А калі сама не разбярэшся, дык людзей папрасі.

Аксеня *(ласкава)*. Ды ты сам раскажы. Сядзь поручкі для добрай гаворкі. *(Ласкава бярэ яго за плечы і саджае побач. Макар паглядзеў недаверліва, але загаварыў ласкава. Кандрат тым часам закурвае.)*

Макар. Ксеня! Ну, падумай ты сама. Ну, навошта нам гэта цялушка. Нам на дваіх і гэтай кароўкі хопіць. Ці нам багата малака трэба. Дзяцей жа ты больш не родзіш...

Аксеня *(нібы яе ўкалолі)*. Што-о? Калі так... Хацела згадзіцца, а цяпер забяру цялушку, забяру з фермы цялушку!

Макар. Не, не забярэш. *(Падміргнуў Кандрату.)*

Аксеня. Забяру, усё роўна забяру!

Макар. А я кажу — не забярэш. Не маеш права.

Аксеня. Як гэта не маю? Мая цялушка.

Кандрат. Цяпер яна калгасная. Дакументамі аформлена, як закантрактаваная. І ў зводку ўключылі, а зводку ў раён завезлі. Так што ўсё гладка зроблена. *(Аксеня разгубілася.)*

Аксеня. Што ж ты са мной робіш, кара ты божая на маю галаву?!

Макар *(спакойна і лагодна)*. Так што, Ксеня, ты супакойся, не хвалюйся. Нічога цяпер ты не зробіш. Калі я што раблю, дык раз і назаўсёды.

Кандрат. Няўжо ты не хочаш, каб твой муж ордэн атрымаў? Ці медаль на выстаўцы.

Аксеня *(не давяраючы)*. Не дурыце мне галавы. Ніхто яму не дасць ні ордэна, ні медаля.

Кандрат. Дарэмна ты так. Наш старшыня не кідае слоў на вецер.

Аксеня. Ну, калі б пэўна ведала, што дадуць, дык *(уздыхнула)*... Ай, не тлуміце мне галавы. Не шукайце дурную. За адну цялушку — ордэн? Ды ты падумай! Колькі ахвотнікаў набярэцца?! І ордэнаў не накуеш, не наплешчаш.

Кандрат. То Макару не за адну, а за сто саракавую. Не хапала адной да камплекта. Усё праўленне галаву ламала. А ты супраць. Падумай! У мужа ордэн здзіраеш.

Аксеня. Ой, Кандрат! Дурыш ты мне галаву. Калі ўжо так, то... *(скрозь слёзы)* хай цялушачка будзе на ферме.

Макар. Вось якая ты. А ты без усякіх умоў аддай цялушку, не чакаючы ўзнагароды. Як дазнаюцца, што ў мяне такая жонка, і не дадуць.

Аксеня. Не можа быць.

Макар. Усё можа быць. Сумлення ў цябе мала і свядомасці. І калі я — твой муж — не перайначыў тваю натуру, значыць, неварты я ні ордэна, ні медаля, хоць бы і сто сот цялят выгадаваў.

Аксеня. А табе, калі чэсна гаварыць, за тваю адданасць такую трэба было б даць калі не ордэн, то медаль.

Макар. А я не даў бы... Не дадуць. Ды я і сам не хачу. Ты па свядомасці дай згоду.

Аксеня. Ну добра! Ну чаго ты хочаш? Я ж па свядомасці згодна аддаць... Шкада ордэна. Цялушку я і яшчэ выгадую, а медаль табе... не купіш. *(Макар і Кандрат смяюцца.)*

Макар. Каторы дзесятак год жывём разам, а так хутка згадзілася першы раз. На залаты медаль клюнула.

Заслона.

Люты, 1951 г.

ЖЫЦЦЁ ПАТРАБУЕ

БУДНІ САКРАТАРА РАЙКОМА

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ:

Сяргей Пятровіч — сакратар райкома.
Вася — шафёр.
Церах — брыгадзір калгаса «Чырвоны маяк».
Надзя — яго дачка.
Паліна — тэхнічны сакратар райкома.

Кабінет сакратара райкома партыі. Два сталы, састаўленыя літарай Т, накрыты чырвоным сукном. На стале пісьмовы прыбор і два невялікія бюсты Леніна і Сталіна. У кутку радыёпрыёмнік. Сяргей Пятровіч размаўляе па тэлефоне. Цераз адчыненае акно чуваць, як Вася стукае інструментамі (ладзіць машыну), насвістваючы «Тальяначку».

Сяргей Пятровіч *(па тэлефоне)*. Няма чаго з хворай галавы... Я кажу: валіць віну на народ — значыць паказваць сябе нікуды не вартым кіраўніком... Во-во... Разумееш? А нясеш бязглуздзіцу... Хто гэта недаацэньвае завод?.. А я думаю, што не калгаснікі, а ты недаацэньваеш. Дрэнны з цябе арганізатар, і толькі... Ну, вядома, смерць прычыну заўсёды знойдзе. Пры правільнай арганізацыі працы і малацьбу змог бы закончыць і завод паставіць... Я з гэтага бачу адно — кіраўнік з цябе нікуды не варты... Можа, і крыўдна, але справядліва. Меней мітусні трэба. Ну?.. Добра, дазваляю... Сёння я ў вас буду, там дамовімся. Бывай! *(Паклаў трубку, уздыхнуў.)* Та-ак!.. Справы!.. *(Жвава падняўся з крэсла і падышоў да акна.)* Вася! Як там машына?

За сцэнай голас Васі: «Акумулятар падводзіць!»

Сяргей Пятровіч. Я думаю, што ты болей падводзіш.

Голас Васі. Ён ужо ўсе кішкі мне пераеў, ну яго к чорту.

Сяргей Пятровіч. Добра, добра, без чарцей. Каб праз паўгадзіны машына была. Да Водрынкі 30 кіламетраў, і да вечара трэба паспець. Чуеш?

Голас Васі. Чую, чую, Сяргей Пятровіч.

Сяргей Пятровіч. Жвавей варушыцца трэба. А то, я бачу, ты дурыць пачаў.

Голас Васі. Ну што вы, Сяргей Пятровіч, гэта ж не я, а машына.

Заходзіць Паліна.

Паліна. Сяргей Пятровіч, вазьміце трубку, з абкома звоняць.

Сяргей Пятровіч. Хто?

Паліна. Здаецца, сакратар.

Сяргей Пятровіч *(здымае трубку)*. Пераключыце абком на мой тэлефон. Ало! Я вас слухаю... Так... Нічога, дзякую. Пастаўкі? Засталіся толькі дробязі... Не, не! Гэта справа бліжэйшых трох-чатырох дзён... Адстаюць далёкія калгасы... Мы ўжо зрабілі, мабілізавалі на дапамогу свабодны транспарт... Дзевяць аўтамашын... З абмалотам затрымкі таксама не павінна быць... Не, не, і не будзе... Заводы?.. *(Убок.)* Даліся мне гэтыя заводы. *(У трубку.)* «Чырвоны маяк» усю справу тармозіць... А справа ў тым, што недаацэньваюць людзі... Старшыня калгаса там... Я?! *(Апраўдваецца.)* Я разумею важнасць завода, ды... Некаторыя лічаць, што рана яшчэ цагляныя вёскі будаваць... Я так не думаю... Так! Слухаю... Разумею... ёсць... добра... Зраблю... Я сёння ж туды еду... Ды нам бы занарадзілі з паўдзесятка аўтамашын, праз транспарт затрымка... Добра... З сябе я таксама віны не здымаю... Добра... Зраблю... Усяго добрага! *(Кладзе трубку і выцірае хустачкай лоб.)* Ну ўжо гэта Водрынка, уелася яна мне ў косці. *(Да Паліны.)* Я зараз паеду, а вы к вечару збярыце весткі з пунктаў «Заготзбожжа» аб паступленні за сённяшні дзень.

Паліна. Вы ж толькі што прыехалі з раёна, і зноў ехаць? Ці пабылі вы хоць дома?

Сяргей Пятровіч. Зразумелі, што трэба зрабіць?

Паліна. Добра, зраблю. *(Топчацца на месцы, штосьці хоча сказаць. Сяргей Пятровіч заўважыў гэта.)*

Сяргей Пятровіч. Ну, што там у вас яшчэ?

Паліна. Усё-такі, Сяргей Пятровіч, не трэба Надзю адпускаць з райкома.

Сяргей Пятровіч. Чаму так?

Паліна. Не ўпраўлюся я адна. Я і тэхсакратар, і фінансы на маім абавязку, а цяпер і за кур'ера прыйдзецца. Вось усе работнікі раз'ехаліся, і каля тэлефона трэба ж некаму сядзець.

Сяргей Пятровіч. Нічога, нічога. Зараз у калгасе людзі больш патрэбны, чым каля тэлефона.

Паліна. Гэта, канешне, не мая справа. Толькі і кур'ерам... я не ўпраўлюся.

Сяргей Пятровіч. А калі не ваша справа, дык... Нічога, управіцеся. Менш будзеце ў люстэрка заглядаць.

Заходзіць Надзя, нясмела.

Ну што, развітацца прыйшла?

Паліна выйшла.

Надзя. Развітацца, таварыш сакратар.

Сяргей Пятровіч. Ты ўсё-такі рашыла ў калгас ісці?

Надзя. Думаю, Сяргей Пятровіч, што так лепей. Прызнацца, дык мне проста сорамна сядзець тут. Ну, што гэта за работа такая? Якому-небудзь дзядку рухаваму, дык яна пасуе. Не маё гэта месца... Такая гарачая пара — жніво, а мне тут сядзець?.. Сорамна, Сяргей Пятровіч, перад сяброўкамі, дый рукі свярбяць без работы. А вы тут сабе якога дзядуню знайдзіце, ён і кур'ерам будзе, і на сонцы грэцца каля райкома, а мне... не, ужо...

Сяргей Пятровіч *(падыходзіць да Надзі, палажыўшы на плячо руку)*. Ну што ж, правільна робіш. У калгасе там у цябе больш важныя справы будуць. Толькі давай дамовімся — як былы работнік райкома, каб не падвяла там.

Надзя. Буду старацца, Сяргей Пятровіч.

Сяргей Пятровіч. А з цябе выйдзе добры брыгадзір... праз нейкі час.

Надзя *(засаромелася)*. Дзе ўжо мне... Не даверацъ...

Сяргей Пятровіч. Даверацъ! Як быламу работніку райкома.

Надзя *(апусціўшы галаву)*. Не... *(Паўза.)*

Сяргей Пятровіч. Чаму не?

Надзя. Дрэнна вы майго бацьку ведаеце. Ён жа мяне сюды адправіў. «У калгасе, кажа, і без цябе ўправімся». Хацеў, каб з мяне служачая выйшла.

Сяргей Пятровіч *(усміхаецца)*. А твой бацька здатны на хітрыкі. Ды ў вашай Водрынцы наогул усе, як кажуць, самі з вусамі.

Надзя. Ну дык, Сяргей Пятровіч, можа, што было не так, калі працавала ў вас, дык прабачце.

Сяргей Пятровіч. Нічога, нічога. Усё добра было.

Н а д з я *(нясмела працягвае руку).* Бывайце.

С я р г е й П я т р о в і ч. Бывай, бывай! Толькі чакай, чаго ж ты спяшаешся? Ты можаш з намі ехаць. Я якраз у Водрынку.

Н а д з я. Не, гэта не скора.

С я р г е й П я т р о в і ч. Як не скора, я зараз.

Н а д з я. Не! Ён наўмысна будзе каля машыны калупацца да вечара.

С я р г е й П я т р о в і ч. Чаму наўмысна?

Н а д з я *(засаромелася).* Не хоча ён, каб я ў калгас ішла... вось і машына ў яго няспраўная.

С я р г е й П я т р о в і ч *(дагадваецца).* Ага-а! Дык вось у чым справа. Дык мы зараз.

Н а д з я. Не, не трэба, я пайду. Бывайце. *(Выходзіць.)*

С я р г е й П я т р о в і ч. Прыйдзецца і яго следам адпускаць. Такая ўжо логіка жыцця. *(Падыходзіць да акна і кліча.)* Ану, Васіль, зайдзі сюды. *(Садзіцца за стол, піша. Звоніць тэлефон. Сяргей Пятровіч здымае трубку.)* Я слухаю... Так, так... Вы карацей... Правільна, школы павінны быць адрамантаваны... А ад каго гэта залежыць!.. А я думаю, што ад вас, ад загадчыка райана. Трэба менш у кабінетах сядзець, а больш бываць у школах і там на месцы дапамагаць у арганізацыі... А што ж вы думалі, старшыням калгасаў толькі школы ў галаве? Зараз і ў іх таксама пара гарачая — жніво, хлебаздача... Гэта справа іншая; калі ёсць прынцыповыя пытанні, можна сабрацца і вырашыць. Не, зараз не магу... Ужо сабраўся ехаць... Вы запрасіце загадчыка райфінаддзела і намесніка па будаўніцтве і гадзін у 10 вечара да мяне... Не позна... Не, тое, што можна сёння зрабіць, на заўтра адкладваць не трэба. А заўтра і за справу. Вось так... Усяго добрага. *(У той час калі Сяргей Пятровіч размаўляў па тэлефоне, у кабінет зайшоў Вася і стаў, чакаючы, каля дзвярэй.)*

В а с я. Вы мяне клікалі, Сяргей Пятровіч?

С я р г е й П я т р о в і ч *(строга).* Машына гатова?

В а с я. Гатова.

С я р г е й П я т р о в і ч *(строга).* Ты што гэта, Васіль, для жартаў час знайшоў?

В а с я. Чэснае слова, гатова, Сяргей Пятровіч.

С я р г е й П я т р о в і ч. Яна ж і дагэтуль была спраўнай. Чаму хлусіў? *(Дражніць.)* «Акумулятар падводзіць»...

В а с я *(у голасе просьба).* Сяргей Пятровіч, вы ўжо прабачце. Не хачу я, каб на развітанне мы пасварыліся. Усё-такі я ж з вамі тры гады ездзіў і, здаецца, не падводзіў.

Сяргей Пятровіч. Як гэта на развітанне?

Вася. Буду прасіць вас, адпусціце і мяне ўжо.

Сяргей Пятровіч. Вунь яно што-о... Куды гэта?

Вася. Пайду да сябе ў калгас працаваць.

Сяргей Пятровіч. А чаму гэта так раптоўна захацелася табе ў калгас?

Вася. Ды ўжо так... адпусціце.

Сяргей Пятровіч. Не, нічога не выйдзе, не адпушчу. Не бачу прычыны.

Вася. Зараз у калгасе людзі больш патрэбны... *(Сяргей Пятровіч смяецца.)* Самі ж гаварылі...

Сяргей Пятровіч. Дрэнны з цябе дыпламат. А чаму ж ты ўчора не прасіўся? Ты не хітруй, а проста скажы — кахаеш яе? *(Вася апусціў галаву.)* Баішся прызнацца?

Вася *(сарамліва)*. Кахаю, Сяргей Пятровіч.

Сяргей Пятровіч. А чаму ж ты ўпоперак дарогі ёй становішся? Яна якраз разумна зрабіла, што ў калгас пайшла.

Вася. Я толькі таму, што... там жа ніводнай машыны няма...

Сяргей Пятровіч. Яна па рабоце засумавала. Маладая, здаровая, у яе энергіі столькі, што горы варочаць можна, а тут ёй работы мала. А там — за кок-сагыз возьмецца... і ёй карысць, і дзяржаве, і табе ж таксама. Калгас багацей стане, машыну купіць. Замест таго каб падтрымаць яе, дык ты... Эх, ты!

Вася *(пакрыўджана)*. Ну во, і я вінаваты!.. Сяргей Пятровіч, вы думаеце, што я такі ўжо беларучка? Можа, я і сам даўно хацеў пайсці туды, на поле, можа, і ў мяне рукі даўно сумуюць па такой фізічнай працы... Дык жа я не хацеў вас пакідаць... Вы не думайце, што я падхалімнічаю...

Сяргей Пятровіч. Не, не, не думаю.

Вася. Я баяўся, што вы пра мяне дрэнна падумаеце. Скажаце: лятун, выгаднейшага месца шукае, дзе болей зарабіць можна. А ў мяне гэтага нават і ў думках няма... Я проста прывык да вас і...

Сяргей Пятровіч. Што «і...»? А ты б прыйшоў да мяне і параіўся: так і так, а то ўпёрся, як казёл, і дзяўчыну не пускаеш.

Адчыняюцца дзверы; чуваць галасы; Паліна: «Я ж кажу, пачакайце, ён зараз заняты». Церах: «Я таксама заняты, і мне няма калі чакаць. Я прыйшоў не з пустога ў парожняе пераліваць».

Уваходзіць Церах.

Ц е р а х. Ну і дзяўчына, што тая квактуха... Здарова, Пятровіч. *(Вітаецца з сакратаром і Васем.)* Што гэта вы яго распякаеце? Нешта ён стаіць нібы мыла з'еўшы.

С я р г е й П я т р о в і ч. Псавацца пачаў.

Ц е р а х. Толькі гэта ўжо, таварыш сакратар, непарадкі. Да чаго ж мы так дакоцімся?

С я р г е й П я т р о в і ч. Вось гэта голас! З месца ў кар'ер. Ну-ну, у чым справа?

Ц е р а х. А ў тым вось і справа, што ніякай справы і няма. Бязладдзе, і толькі. Столькі работы цяпер навалілася, што толькі паспявай завіхацца,— тут табе і жні, тут табе і снапы вазі, тут табе і малаці, і дзяржаве здавай. Ды ўжо і за азімае пара брацца, а там і бульбу капаць не за гарамі, дый фермы на зіму трэба рыхтаваць, а тут табе на, завод гэты некаму спатрэбіўся. Ці ж у такі час за цагельню брацца?

С я р г е й П я т р о в і ч. Дык у чым тут непарадак, я не разумею?

Ц е р а х. Як жа ў чым? Падумаць толькі, па дзесяць чалавек з брыгады зняць у такі час, ды якіх? Самых патрэбных на ўборцы.

С я р г е й П я т р о в і ч. Гэта ўжо непарадак, калі самых патрэбных.

Ц е р а х. Ды горш таго. Каб жа хоць гэтым людзям там парадак далі, а то ж па паўдня лынды б'юць. Там жа дырэктар завода безгаловы. Ён самому сабе парадку даць не можа, а тут пяцьдзесят чалавек!

С я р г е й П я т р о в і ч. І ўсё-такі я не зразумеў цябе.

Ц е р а х. Дык чаго ж тут не зразумець? Каму гэты завод спатрэбіўся зараз?

С я р г е й П я т р о в і ч. А-а-а!.. Вось у чым справа!.. Мне спатрэбіўся. Вось думаю ў сваёй кватэры ў кожным кутку па печы паставіць, а потым думаю цагляную дарожку выслаць ад райкома да кватэры.

Ц е р а х. Тут, Пятровіч, не да жартаў.

С я р г е й П я т р о в і ч. Правільна. Дык як ты думаеш, мне завод патрэбен ці вам, калгасу?

Ц е р а х. Яно, канешне, дык жа няўпраўка. Мала таго што людзей не хапае, дык жа і транспарт. Вось я збожжа прывёз здаваць. Тры тоны. Значыць, 12 коней запражы, ды 6 чалавек трэба. Каб хоць машына была свая.

С я р г е й П я т р о в і ч. А я думаю, што справа ў дрэннай арганізацыі.

Ц е р а х. Яно, можа, і так... *(Больш спакойна і раз-*

важліва.) Толькі, Пятровіч, і сілы ў нас малавата. Ураджай сёлета нішто сабе. Трэба ж і яму парадак даць.

Сяргей Пятровіч. Прыбаўлю вам сілы. Сёння Надзя твая адпрасілася ў калгас, а цяпер прыйдзецца і Васіля адпускаць.

Церах. На сваім такі паставіла?

Сяргей Пятровіч. А ты што, супроць?

Церах. Ды думаў, можа, папрацуе тут дзеўка каля вас і ў людзі выйдзе.

Сяргей Пятровіч. Там цяпер хутчэй можна ў людзі выбіцца. Дзяўчына такая, што працы не баіцца.

Церах. Ды ўжо ж... Ат, хай як сама хоча. *(Паглядзеў на Васіля.)* А з гэтага што за карысць у калгасе.

Сяргей Пятровіч. Чаму так? Хлопец нядрэнны. І мне здаецца, што ён збіраецца тваім зяцем стаць.

Церах. Зяць-то зяць, ды што з яго ўзяць. На зямлі ён не прывык працаваць, а машыны пакуль няма ў нас.

Сяргей Пятровіч. Будзе і машына, а да зямлі хай прывыкае.

Церах. Не-е! Не тое. Зямля любіць, каб да яе рукі прылажылі, ды не абы-як, а з любоўю. А ён што? Ён шафёр...

Сяргей Пятровіч *(да Васі)*. Та-ак... Ідзі, Васіль, выводзь машыну! *(Вася выйшаў.)* Дык ты лічыш, што не час цяпер цагельняй займацца?

Церах. Ну падумай сам, Пятровіч, цяпер жа, як кажуць, сем работ і ўсе ўгалоп.

Сяргей Пятровіч. Я ўсё-такі не разумею цябе. Цяжка ўпраўляцца так, каб аднachасова і завод закончыць, ці зусім нельга?

Церах. Вельмі цяжка, Пятровіч.

Сяргей Пятровіч. Ну дык гэта яшчэ не бяда. Сапраўдныя бальшавікі, партыйныя і беспартыйныя, цяжкасцей не баяцца. Што цяжка, я згодзен... Цяжка будаваць камунізм, але мы яго пабудуем. І гэты ваш завод будзе вырабляць тыя цаглінкі, з якіх мы будзем класці сцены камунізма. Ты спрабаваў калі-небудзь уявіць сабе Водрынку вашу, якой яна будзе пры камунізме?

Церах. А што я, прарок які, ці што?

Сяргей Пятровіч. А трэба быць прарокам. Ты прывык глядзець на яе сённяшнім днём, а трэба заглядаць і ў заўтрашні. Уяві сабе светлыя, моцныя, прыгожыя цагляныя дамы, з чарапічнымі дахамі, школу, клуб, свіран... канюшню, кароўнік. Роўныя, залітыя асфальтам вуліцы,

электрычнасць... Не захірэлая вёска Водрынка, а невялічкі прыгожы гарадок Водрынка, увесь у садах. Няўжо табе не хочацца пажыць хоць пад старасць у такой вёсцы?

Церах. Чаму не хочацца?.. Дык жа, Пятровіч, падумай сам, каб такую вёску пабудаваць *(мнагазначна)*, капіта-лы якія патрэбны!

Сяргей Пятровіч. Ну і што? Самы галоўны, самы каштоўны капітал у нас ёсць! Людзі! Тыя самыя людзі, якія пабудуюць гэты завод і тыя светлыя цагляныя дамы для сябе. Ёсць у нас такія людзі?

Церах. Я не аб тым...

Сяргей Пятровіч. Я цябе разумею. Ты думаеш, што цагляную вёску пабудаваць вельмі дорага каштаваць будзе?

Церах. Вось у тым і справа.

Сяргей Пятровіч. Зусім не, дарагі мой Церах! Зусім не так! Ты скажы, за апошнія трыццаць год колькі разоў гарэла ваша Водрынка?

Церах. А хто яе ведае. Не лічыў.

Сяргей Пятровіч. А ўсё-такі хоць прыблізна.

Церах *(падумаў, уздыхнуў)*. Многа... *(Паўза.)* Многа разоў гарэла... Бадай што кожная хата...

Сяргей Пятровіч. Значыць, у вас няма ніводнай хаты, якая б прастаяла больш трыццаці год?

Церах. Бадай што няма.

Сяргей Пятровіч. А калі б ваша Водрынка была каменнай?

Церах. Камень дрэву не раўня. Камень, ён вечны.

Сяргей Пятровіч. Во, во! Вечны! Колькі можа прастаяць цагляны будынак?

Церах. Думаю, што гадоў, відаць, а-а... *(Пытае.)* Гадоў дзвесце прастаіць, а?

Сяргей Пятровіч. Прыблізна так. А цяпер падумай і прыкінь. Няўжо ты думаеш, што даражэй пабудаваць цагляны дом на сто пяцьдзесят — дзвесце год, чым шэсцьсем разоў драўляную хаціну? *(Церах маўчыць.)* Ну, што? Не згодзен?

Церах. Ды яно... як не згадзіцца...

Сяргей Пятровіч. Нарэшце трэба зразумець, што пры камунізме вёска павінна стаяць на каменным фундаменце, а не на драўляным, бо ён гніе. Новае заўсёды трэба будаваць на моцным фундаменце. Інакш нельга.

Церах *(ён ужо здаецца)*. Праўда твая, Пятровіч, нельга.

Сяргей Пятровіч. Нарэшце і другая выгада... За колькі кіламетраў ад вас лес?

Церах. Кіламетраў восем.

Сяргей Пятровіч. Ага... а цяпер надумай. Каб пабудаваць хату, лес трэба вазіць аж за восем кіламетраў. Для гэтага і людзі патрэбны, і транспарт. А маючы свой завод, вам не патрэбна ездзіць за трыдзевяць зямель. Будаўнічы матэрыял пад бокам будзе. І да таго ж гэты матэрыял значна танней, чым лес, які трэба выкупіць, выразаць, вывезці, абчасаць, а праз які дзесятак год ён згніе. Вось і падлічы, што дарага, а што танна.

Паўза.

Церах *(задуменна)*. Та-ак... задаў ты мне задачу...

Сяргей Пятровіч. Дык жа не ад бога трэба чакаць, а ўласнымі рукамі здабыць.

Церах. Я ж не супроць гэтага, Пятровіч. Яно, вядома, справа такая, што пара ўжо зажыць на ступеньку вышэй... Можа, я гэта таксама даўно ўжо ў душы нашу... Дык жа... Ды...

Сяргей Пятровіч. Ты хочаш сказаць — цяжкасці?

Церах. Хай сабе! Мы цяжкасці гэтыя адкінем... Здужаем як-небудзь... Дык жа парадку ў нас няма з гэтым заводам. Людзей ужо вызначылі, дык жа зноў — парадак гэтым людзям трэба даваць,— вось што я кажу.

Сяргей Пятровіч. Арганізацыя працы кульгае? Так?

Церах. Хай сабе арганізацыя.

Сяргей Пятровіч. Ну, гэта можна паправіць, калі толькі арганізацыя.

Церах. Ды ізноў жа, Пятровіч, транспарт.

Заходзіць Вася.

Вася. Машына на хаду, Сяргей Пятровіч.

Сяргей Пятровіч. Дык вось што, канчаем нашу размову. *(Цвёрда.)* Завод будаваць будзеце! А што там дырэктар безгаловы, дык я думаю... Бярыся ты, Церах, за гэту справу, ды каб па-гаспадарску! Зразумеў?

Церах *(разгубіўся)*. Як жа я?.. а... брыгадзірства?

Сяргей Пятровіч. Заменім. А завод праз месяц павінен быць закончан. Жыццё патрабуе гэтага. Людзей у нас хопіць. Правільна толькі трэба расставіць. А з транспартам... *(Паўза. Да Васіля.)* Вось што, Васіль, забірай

райкомаўскую палутарку, і на месяц цябе камандзірую да іх на дапамогу. Толькі глядзі, каб там «акумулятар не падводзіў», бо прыеду,— заробіш на арэхі. Зразумеў?

Вася. Слова даю, Сяргей Пятровіч!

Сяргей Пятровіч *(да Цераха).* Ну, як, Церах? Згоду даеш? Можна табе даверыць гэтую справу?

Церах. Дзякую! Пастараюся ўжо...

Сяргей Пятровіч. Ну, давай руку, жадаю поспехаў.

Церах. Вось табе і маеш. Ішоў з адным намерам, а выйшаў во як... *(Паўза.)* Та-ак... Думаць трэба, думаць... Дзякуй табе, Пятровіч, вучыш ты нас, як на свеце жыць трэба.

Сяргей Пятровіч. За тое і хлебам кормяць. Ну, не будзем затрымлівацца. *(Да Васі.)* Ты забірай машыну і разам з цесцем адпраўляйся, я загляну ў «Заготзбожжа», а адтуль да вас, там яшчэ пагутарым з людзьмі на месцы і канчаткова вырашым на сходзе.

Васіль. Ды як жа вы самі паедзеце?

Сяргей Пятровіч. Ты ж навучыў мяне вадзіць машыну.

Церах. Ну, што ты рот разявіў? Сказана: партыйны чалавек. Усё сам умее, калі трэба.

Заслона.

КРЫМІНАЛЬНАЯ СПРАВА

АДНААКТОВАЯ П'ЕСА

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ:

Містэр Хартлі — следчы. Прыкідваецца хітрым сышчыкам.

Сміт Хол — дворнік. Ён, наадварот, прыкідваецца прастаком.

Службовы кабінет Хартлі. Пісьмовы стол, цяжкае крэсла з высокай спінкай — для следчага і крыху далей ад стала звычайнае крэсла — для падследчых. Перад допытам Хартлі знаёміцца з даносам на Сміта Хола.

Хартлі. Та-ак... О-го-го! *(Падыходзіць да дзвярэй.)* Прывесці Сміта Хола. *(Садзіцца ў крэсла і з напускной важнасцю і падазронасцю рыхтуецца сустрэць злачынца.)*

Уваходзіць дворнік Сміт Хол.

Хол *(пачціва)*. Добры дзень, містэр...

Хартлі *(вытрымаўшы паўзу)*. Добры дзень, старына, цудоўны дзень. Сядайце. *(Пагрозліва.)* Та-ак, вось вы які... Сядайце! Папярэджваю, нам усё вядома, гаварыце толькі праўду. Імя, прозвішча?

Хол. Вам жа ўсё вядома...

Хартлі. Ну!

Хол. Сміт Хол.

Хартлі. Так. *(Запісвае.)* Узрост, сям'я?

Хол. Шэсцьдзесят тры гады. І сям'я ёсць. Жонка, дачка замужам, два сыны і...

Хартлі. І?..

Хол. І аднаго сына няма.

Хартлі. Што гэта значыць?

Хол. Забілі ў Карэі.

Хартлі. Ага... Ясна. Месца работы?

Хол. Слуга прэзідэнта.

Хартлі. Што-што-што?..

Хол. Мы ўсе слугі прэзідэнта. І я, і вы...

Хартлі. Вам не да жартаў, старына. Вы ж працуеце дворнікам у мэра горада. Нам усё вядома. Дзе працуюць другія два сыны?

Х о л. Яны беспрацоўныя.

Х а р т л і *(насцярожыўся).* А-га. Ясна. Вось дзе прычына.

Х о л. Я нічога не разумею.

Х а р т л і. Місіс Грэхем, асабісты сакратар мэра, прасіла вас дапамагчы клеіць канверты?

Х о л. Так, містэр Хартлі, я дапамагаў.

Х а р т л і. Якія маркі вы клеілі?

Х о л. Розныя.

Х а р т л і. А новыя?

Х о л. Гэта якія?

Х а р т л і. З прэзідэнтам.

Х о л. Пападаліся і такія.

Х а р т л і. Ну і што?

Х о л. Не клеяцца.

Х а р т л і. А вы паплявалі?

Х о л. Пляваў.

Х а р т л і. Ну і што?

Х о л. Не клеяцца.

Х а р т л і. Вы не на той бок плявалі.

Х о л. Што вы, містэр Хартлі, я і на той бок пляваў, і на... *(адумаўся.)* Э-э, не-не-не, містэр Хартлі, вы мяне не лавіце на слове.

Х а р т л і. Вы не прыкідвайцеся. Нам усё вядома. Ад нас нічога не ўтоіш. Вам, шаноўны Сміт Хол, пагражае турма, катарга, электрычнае крэсла.

Х о л. За што столькі кары адразу, містэр Хартлі?

Х а р т л і. Вы неаднаразова публічна абражалі самога прэзідэнта.

Х о л. Хто? Я?

Х а р т л і. Так, вы.

Х о л. Містэр Хартлі, ды ў нашым горадзе ніхто так не клапоціцца аб нашым прэзідэнце, аб яго чыстаце, як я.

Х а р т л і. Ага, усё ясна. Вы чырвоны. Вы лічыце, што наш прэзідэнт брудны?

Х о л. Быў брудны, а цяпер не.

Х а р т л і. Так і запішам: «прэзідэнт брудны»...

Х о л. Не прэзідэнт, а... істукан... ну, балван гэты... як яго? Бюст.

Х а р т л і. Ага... Запішам: «прэзідэнт — істукан, балван».

Х о л. Ды не тое я сказаў.

Х а р т л і. Якраз тое, што мне трэба. *(Запісвае.)* Далейшае нам вядома, так што раю вам шчыра прызнацца.

Вы кожную раніцу на вуліцы, публічна, перад вокнамі мэра горада сцёбалі венікам па твары пашага прэзідэнта. Так? Папярэджваю, нам усё вядома.

Х о л. Так, але ж які гэта прэзідэнт?

Х а р т л і *(перапыняе)*. Чакайце, чакайце. Запішам... Вы хоць і чырвоны, але цудоўны чалавек. З вамі лёгка працаваць, лёгка рабіць кар'еру. Вы хацелі дадаць, што не прызнаеце яго за прэзідэнта?

Х о л. Не, не. Што вы!

Х а р т л і. Тады скажыце, вы добраахвотна гэта рабілі ці пад прымусам? Можа, вас падгаварыў хто, плаціў за гэта?

Х о л. А як жа. Мне плоцяць за гэта. Але я з ахвотай, з прыемнасцю рабіў... Гэта ж не цяжка — венічкам пасцёбаць...

Х а р т л і. Цікава, цікава. Назавіце, калі ласка, вашых хаўруснікаў. Хто вас падгаварыў, хто вам плаціў?

Х о л. Мэр загадаў.

Х а р т л і. Што-о? Майце на ўвазе, Сміт Хол, за паклёп вы будзеце адказваць.

Х о л. Містэр Хартлі, я чэсны грамадзянін. Мне шэсцьдзесят тры гады.

Х а р т л і. «Чэсны». Раскажыце, як гэта было.

Х о л. Аднойчы на галаву прэзідэнту сеў верабей. Гэта заўважыў мэр. Ён паклікаў мяне і сказаў: «Старына Хол, бачыш тую скульптуру, бюст? Гэта наш прэзідэнт. І непрыстойна, калі на яго галаву садзіцца ўсякая дрэнь. Прагані вераб'я і наогул пільнуй». І я стаў пільнаваць. Сядзе каторы, я праганю. Але ж вы ведаеце, вы ўсё ведаеце, вераб'і ў горадзе занадта ўжо смелыя. Махай не махай на яго, крычы не крычы, а ён сядзіць. Я паспрабаваў кідаць палкай, але мэр горада сказаў, каб я гэтага не рабіў, бо людзі падумаюць, што я не ў вераб'я кідаю, а ў прэзідэнта. І то праўда, людзі ўсё могуць падумаць. Вось, думаю, гора на маю галаву з гэтым прэзідэнтам. А калі я ганяў гэтых вераб'ёў, дык прыкмеціў. Прыляціць, паганец, пасядзіць крыху і паляціць, але на галаве ў прэзідэнта, не тут кажучы, што-небудзь ды пакіне. Верабей і разумець не хоча — прэзідэнт гэта ці проста галушка з гліны. А нам з мэрам непрыемна. Мэр падумаў, падумаў і загадаў мне кожную раніцу абмятаць гэтага істукана... не, не, не істукана, а бюст гэты, скульптуру.

Х а р т л і. Абмятаць, а мне пішуць, што ты не абмятаў, а тыцкаў пад нос венікам, біў.

Х о л. Чэснае слова, абмятаў. Ну, можа, перастараўся...

Х а р т л і. «Перастараўся»... А не хлусня ўсё гэта?

Х о л. Чыстая праўда. Вам жа ўсё вядома.

Х а р т л і. Так-так. Нам усё вядома. *(Па ўсім відаць, што стары Хол паставіў яго ў тупік.)* Ах, шкада... А я спадзяваўся...

Х о л. А вам вядома, містэр Хартлі, хто на мяне данос напісаў?

Х а р т л і. Нам усё вядома.

Х о л. Дык вось ён — сам нелаяльны грамадзянін.

Х а р т л і. Гэта чаму?

Х о л. Ён думаў, што вы не зусім разумны.

Х а р т л і. Што-о?

Х о л. Так-так. Ён хацеў вас абдурыць.

Х а р т л і. Як абдурыць?

Х о л. Ён хацеў, каб вы, лаяльны амерыканец, пасадзілі ў турму ці на электрычнае крэсла мяне, таксама лаяльнага амерыканца. А сам бы потым смяяўся з нас. Данос пісалі нячыстыя рукі.

Х а р т л і. А што вы думаеце...

Х о л. Я ўпэўнены ў гэтым.

Х а р т л і. Значыць, вы не ставілі сабе мэтай зняважыць, абразіць прэзідэнта?

Х о л. О, не! За што? Можа, за тое, што мой сын загінуў у Карэі? Дык жа мне за гэта пад старасць далі нарэшце работу, каб не падохнуць з голаду. Ды я за гэта гатоў не толькі прэзідэнта, а і ўсіх сенатараў, кангрэсменаў і мэраў чысціць венікам...

Х а р т л і *(насцярожыўся)*. Цікава, а чаму венікам? А?

Х о л. І я ж кажу мэру, што венікам крыху няёмка. Прасіў у яго грошы, каб шчотку якую-небудзь ці хоць анучу купіць.

Х а р т л і. А ён што?

Х о л. Сказаў, што няма грошай. Вайна, сказаў мэр, патрабуе вялікай эканоміі не толькі на шчотках і анучах, але і на зарплаце. Той жа дзень і зарплату мне зменшыў. Я падумаў і згадзіўся. Вайна — гэта такая прорва, што яе нічым не заткнеш. Асабліва ў Азіі. Колькі ні пруць, а ўсё марна. Вось чаму венікам, сказаў мэр.

Х а р т л і. Хто з вас хоча мяне абдурыць?

Х о л. Вядома, той, хто напісаў данос. Яму не падабаецца, што я чышчу нашага прэзідэнта. Ён хоча, каб гэтага містэра зусім занясло пылам і брудам, а на галаву яму садзіліся не толькі вераб'і, а і вароны. Каб потым пальцам

паказваць і смяяцца з прэзідэнта. О, я ведаю такіх. Вы праверце яго, дапытайце яго. Ён сам нелаяльны, а на другіх даносіць.

Х а р т л і. Вы, старына, чорт вазьмі, лагічна разважаеце. Пакуль што веру вам. А з тым я разбяруся. І ўсё-такі шкада вас пускаць. Для карысці следства вас прыйдзецца пасадзіць.

Х о л. За што, містэр Хартлі? Сваім венікам я ахоўваю чэсць нашага прэзідэнта. Пакуль я сядзець буду, дык на маё месца прыйдуць...

Х а р т л і. Мяне гэта не датычыцца. *(Падышоў да дзвярэй.)* Палісмэн, забраць!

Х о л. Датычыцца і вас. Прыйдуць другія і не з венікам, а з мётламі і выметуць!

Заслона.

Снежань, 1951 г.

НА ШЫРОКІЯ ПРАСТОРЫ

СЦЭНЫ

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ:

Галіна — практыкантка, студэнтка журфака.

Іван Буеў — літсупрацоўнік рэдакцыі газеты.

Меерцовіч — загадчык аддзела крытыкі і бібліяграфіі.

Марына Сцяпанаўна — прыбіральшчыца.

СЦЭНА ПЕРШАЯ

Адзін з пакояў рэдакцыі газеты. У пакоі сядзіць **Галіна**. Яна чытае кнігу, відаць, з вялікай цікавасцю, з захапленнем. Заходзіць **Марына Сцяпанаўна**, ставіць на стол графін з вадой. Паглядзела на Галіну, паківала галавой і выцірае мокрай анучкай стол.

Марына Сцяпанаўна. Вось я ўжо бачу, што кніжка цікавая; відаць, нешта добрае напісаў чалавек... хоць яшчэ і не чытала сама. *(Галіна, не падымаючы галавы, вымавіла: «ымгу»...)* Пяты ўжо год я працую ў нашай рэдакцыі, дык ужо прыкмеціла, як яно і што. Бывае так, што выйдзе новая кніга, пра яе пагамоняць дзень-другі і перастануць... і зноў па-старому — там пра камандзіроўкі, пра новыя рэкорды ці пра ганарары. А бывае і так, вось як з гэтай кніжкай,— цэлы тыдзень толькі пра яе і гамонка... у які кабінет ні зойдзеш, дык адны чытаюць, другія спрачаюцца, а гэты, як яго... Ну, з аддзела прапаганды... а каб ён здароў быў... Ды Бруцько гэты. Дык ён знойдзе смешную мясціну, прачытае хлопцам, а потым так рагоча, што аж на трэцім паверсе чутно. І так ужо цэлы тыдзень.

Яна яўна хоча пагаварыць з Галінай.

Я вам не перашкаджаю? *(Галіна перастае чытаць і любоўна гладзіць кнігу.)*

Галіна. Не, не, калі ласка.

Марына Сцяпанаўна. Вось я і кажу: відаць, цікавая кніжка.

Галіна. Вельмі, вельмі, цёця Марыля.

Марына Сцяпанаўна. А хто ж гэты аўтар?

Галіна. Антон Глыба.

Марына Сцяпанаўна. Нешта не ведаю такога, першы раз чую.

Г а л і н а. А гэта яго першая кніга.

М а р ы н а С ц я п а н а ў н а. Бач-ка ты! Першую кнігу і так цікава напісаў? Відаць, разумны чалавек. А хто ён такі?

Г а л і н а. Звычайны вясковы настаўнік і нават зусім яшчэ малады.

М а р ы н а С ц я п а н а ў н а. Во табе! Вось дык малайчына. Як жа яму патрафіла так?

Г а л і н а. Жыццё добра ведае. У калгасе жыве, пра калгас і піша. І добра піша. Вось прачытала, а здаецца, я там сама жыла і ўсё бачыла.

М а р ы н а С ц я п а н а ў н а. Дык тады ўжо і мне трэба будзе пачытаць.

Г а л і н а. Абавязкова пачытайце, вельмі, вельмі цікавая рэч.

Марына Сцяпанаўна разглядае вокладку кнігі, перагарнула некалькі лістоў.

М а р ы н а С ц я п а н а ў н а *(чытае)*. «На шырокія прасторы»... Як гэта «на шырокія прасторы»? Аб чым гэта?

Г а л і н а. На шырокія прасторы жыцця. Вось гэта слова «жыцця» так і просіцца само, каб яго далучылі да назвы. Не ведаю, чаму ён так не зрабіў.

М а р ы н а С ц я п а н а ў н а. А пра што ён тут піша?

Г а л і н а. Пра двух старшынь калгасаў. Калгасы суседзі, але адзін з іх перадавы, мільянер, а другі адстаючы. Не зусім адстаючы, але справы там не зусім ладныя. І вось у гэтым калгасе старшынёй працуе толькі што дэмабілізаваны з арміі афіцэр. Такая гарачая галава, упарты, настойлівы, любіць камандаваць. Ну, вядомая рэч, прывык у арміі... І вось ён рашыў, ва што б там ні стала, перагнаць свайго суседа, дабіцца лепшага ўраджаю... І ў яго дзяўчына ёсць... Такая прыгожая, добрая, а кахае яго, проста дзіўна, як яна яго кахае, як нікога на свеце, але яна ніяк не асмеліцца адкрыць гэта яму.

М а р ы н а С ц я п а н а ў н а. А сам ён не здагадваецца?

Г а л і н а. Вось у тым-то і справа: ён і сам ёй сімпатызіруе, ды...

М а р ы н а С ц я п а н а ў н а. Дык чаму ж гэта ён?

Г а л і н а. Чаму? *(Задумалася.)*

М а р ы н а С ц я п а н а ў н а. Не, не, пачакай. Не трэба расказваць, а то потым нецікава чытаць.

Заходзіць М е е р ц о в і ч.

М е е р ц о в і ч. Добрай раніцы!

Г а л і н а. Добрай раніцы, Арон Ісакавіч!

М а р ы н а С ц я п а н а ў н а. Добрай раніцы!

М е е р ц о в і ч. Як адчуваеце сябе? Як здароўе?

Г а л і н а. Дзякую! Добра. Як заўсёды.

М е е р ц о в і ч. Добра? Ну, добра, добра. Ніхто не званіў, ніхто не заходзіў?

Г а л і н а. Пры мне, здаецца, ніхто.

М е е р ц о в і ч. Добра, калі ніхто, добра. *(Заўважыў кнігу.)* Чым гэта вы захапляецеся? *(Разглядае кнігу.)* «На шырокія прасторы»? Та-ак... так-так... Ну, і як вы лічыце? Падабаецца?

Г а л і н а. Ведаеце, цудоўная рэч! Чытаю з вялікім задавальненнем.

М е е р ц о в і ч. Так-так... Захапляецеся, значыць? *(Павучальна.)* А не трэба! Не трэба захапляцца. Тым больш што вы збіраецеся стаць, так сказаць, крытыкам. Крытыку захапляцца нельга, можна прагледзець недахопы твора, а ў выніку можаце даць твору суб'ектыўна-тэндэнцыйную ацэнку. Крытык павінен быць сугуба аб'ектыўным, цвярозым. Крытыка — гэта не каханне. Тут больш розум патрэбен, логіка, чым пачуццё. Захапляцца непатрэбна.

Г а л і н а. Хочаш не хочаш, а захапляе. Цікава напісана. Вы чыталі яе?

М е е р ц о в і ч *(ухмыляецца)*. Пакуль што не. Ды і не думаю, што ёсць у гэтым патрэба. Шкада траціць час. Ведаеце добрую нашу прымаўку, хоць яна і не падобна па нашую, хутчэй амерыканская: час — грошы.

Г а л і н а. Думаю, што вы не пашкадавалі б. Дарэчы, прымаўка гэта англійская.

М е е р ц о в і ч *(ухмыляецца)*. Вы так думаеце? А я наадварот. Між іншым, у вас ёсць староннік вашай думкі — наш новаспечаны *(іранічна)* Бялінскі — Іван Буеў. Ён не менш вас захапляецца гэтай кніжачкай. Нават больш. Учора ён прынёс мне сваю рэцэнзію на гэтыя «На шырокія прасторы». Так расхваліў яе, быццам гэта шэдэўр сусветнай літаратуры.

Г а л і н а. А ў яго не дрэнны густ.

М е е р ц о в і ч. У мяне іншая думка аб яго гусце. Ён здольны так захапляцца, што кожны новы твор гатоў за-

лічыць у класіку. Дарэчы, прачытаў вашу рэцэнзію. Нават не адзін, а з вашым, так сказаць, вядучым тэатральным крытыкам.

Г а л і н а. Дзякую. І як вы лічыце? Што ён сказаў?

М е е р ц о в і ч. Для пачатку не дрэнна, не дрэнна. Стыль ваш вельмі спадабаўся. *(Галіна задаволена.)* Але... у крытыцы гэта «але» самае неабходнае слова. Дык вось, але толькі стыль. Многія думкі трэба кардынальна замяніць. Зараз, адну хвілінку, мы разгледзім вашу рэцэнзію. *(Заходзіць у свой кабінет.)*

Г а л і н а *(уздыхнуўшы)*. Зноў не так...

М а р ы н а С ц я п а н а ў н а. А вы духам не падайце. Сёння не так, то заўтра будзе так... Пісаць — справа нялёгкая...

М е е р ц о в і ч *(са свайго кабінета)*. Марына Сцяпанаўна! А вы сёння зноў дрэнна выцерлі стол. Хадзіце сюды!

М а р ы н а С ц я п а н а ў н а. Бач, у мяне таксама зноў не так, але я духам не падаю. *(Заходзіць у кабінет Меерцовіча.)*

Г а л і н а *(усміхаецца)*. Прыйдзецца пазычыць у вас аптымізму.

З кабінета выходзіць М е е р ц о в і ч з рукапісам рэцэнзіі.

М е е р ц о в і ч. Па-першае, адна агульная заўвага. Патрэбна з большай павагай адносіцца да класікі. Хоць гэта можа выглядаць, як пакланенне перад Еўропай, аднак старых майстроў трэба паважаць. *(Цёпла.)* Яны заслужылі гэтага. Рэцэнзію вашу на спектакль «Дзень цудоўных падманаў» вы назвалі «Не зусім цудоўныя падманы», а гэта ўжо гучыць зняважліва ў дачыненні да п'есы. Другое, вы не зусім дарэчы зрабілі вывад. *(Чытае.)* «Ці не лепей было б тэатру замест гэтай малакаштоўнай, безыдэйнай п'есы паказаць савецкаму гледачу сучасную савецкую п'есу пра савецкіх людзей, іх жыццё, іх барацьбу за пабудову камунізма». Па-мойму, савецкі глядач не павінен адмаўляцца ад здабыткаў класічнай драматургіі. Не лішне іншы раз пазабавіцца лёгкімі камедыямі ці то Шэрыдана, Мальера, Кальдэрона, ці то п'есамі вялікіх Шэкспіра, Шылера, Лопэ дэ Вэга. У нас жа яшчэ сваіх па сутнасці ні адной добрай п'есы няма.

Г а л і н а. Але ж яны нічога не напісалі пра нас, пра нашу сучаснасць, пра камунізм.

М е е р ц о в і ч. Яны пісалі пра агульначалавечае, пра вочнае, а значыць, і пра нас. *(Сур'ёзна.)* А вам яшчэ ранавата павучаць тэатр, рэжысёраў, якія маюць ужо ганаровыя званні... Хай гэта вас не крыўдзіць... Пакуль што ў нас, так сказаць, вялікіх драматургаў няма, то прыходзіцца карыстацца тым, што падарылі свету старыя велікаиы.

Галіна яўна нездаволена. Звоніць тэлефон. Меерцовіч слухае.

М е е р ц о в і ч. Так, я слухаю... А-а! *(Лагодна.)* Добры дзень, добры дзень... Дзякую... Аб чым?.. Ах, «На шырокія прасторы»? А што вы маеце на ўвазе?.. Калі ласка, калі ласка... З прыемнасцю... Змесцім у нашай газеце... На маю думку? На маю думку-у... *(Не ведае, што сказаць.)* Бачыце... Гэта кніга... Як вы сказалі?.. *(Ажыўлена.)* Уласна кажучы, вы выказалі якраз тое, што думаў я. Так. Што, што?.. Ёсць нейкая рэцэнзія. Ды тут наш адзін літсупрацоўнік напісаў. А? Ды ён яе так расхваліў, што куды там. Як? Ну, вядома, перавага будзе за вамі. Добра, добра. Дык мы будзем разлічваць на вашу рэцэнзію. Што? Адну хвілінку, зараз спытаю... *(Да Галіны.)* Вы не ведаеце, сёння выдавецтва будзе выплачваць ганарар?

Г а л і н а. Не чула.

М е е р ц о в і ч *(па тэлефоне)*. Пакуль што чутак такіх няма. Калі што якое будзе, я вам пазваню. Калі ласка, калі ласка... Усяго добрага. *(Паклаў трубку. Да Галіны.)* Дык вось што, вы яшчэ раз перапрацуйце вашу рэцэнзію. А за галоўны прынцып сабе вазьміце... так сказаць... кожную з'яву ў літаратуры і мастацтве трэба ацэньваць з пункту гледжання сусветнай літаратуры, сусветнага мастацтва. Трэба падняцца вышэй над нашай надзённічынай, траскатнёй, параўноўваць усякую рэч з творамі вялікіх мастакоў, тады вы заўсёды знойдзеце за што крытыкаваць. Не забывайце такіх імён, як Шэкспір, Шылер, Лесінг, Бальзак, Стэндаль і т. д.

Галіна маўчыць.

М е е р ц о в і ч *(зрабіўшы паўзу, глядзіць на яе, усміхаецца)*. Вы духам не падайце. У маладой гаспадыні, як кажуць, першы блін заўсёды комам. За месяц практыкі я вам абяцаю дапамагчы... *(Паўза.)* Для таго каб пісаць крытычныя артыкулы, трэба мець вялікую эрудыцыю, мець тонкі мастацкі густ.

Г а л і н а. І добра ведаць жыццё.

Меерцовіч. Гэта, вядома, не лішне, але ведаць жыццё больш патрэбна пісьменніку, чым крытыку. *(Паўза.)* Галоўнае не траціць веру ў свае сілы. *(Пайшоў у свой кабінет.)*

З кабінета выходзіць Марына Сцяпанаўна і спыняецца каля Галіны, вельмі засмучанай сваёй няўдачай.

Марына Сцяпанаўна. А чаго ж вы засумавалі, мілая мая. Не адразу гэта ўсё даецца. Ну, раз няўдача, другі, а на трэці, глядзіш — і добра выйдзе. Ты ж яшчэ маладая, у цябе ўсё наперадзе. Вось бывае так, што які-небудзь маладзенькі паэт прышле цэлую кнігу вершыкаў, штук, мабыць, дваццаць, а тут як пачнуць іх разбіраць ды разглядаць, дык да друку і застанецца якіх чатыры-пяць, а ў астатніх абавязкова знойдуць што-небудзь: то рыфма, то рытма не такая, і яшчэ што.

Галіна. А тут справа іншая, цёця Марыля. У мяне і рыфма і рытма, як вы кажаце, такая, ды я думаю адно, а ён хоча, каб я пісала другое, зусім другое, чым я думаю.

Марына Сцяпанаўна. Э-э, так нельга,— думаць адно, а пісаць другое. Гэта ўжо як быццам бы і падман выходзіць.

Галіна *(быццам сама з сабой разважае)*. Тры разы прагледзела спектакль, а ўражанне адно і тое ж. Ну, няхай я адна памылялася б, дык жа я назірала за людзьмі, за гледачамі... Яны таксама ўспрымаюць пастаноўку з непрыемнасцю... Чаму ён вымушае мяне хваліць спектакль? *(Паціскае плячыма.)* Нічога не разумею.

Марына Сцяпанаўна. А ты яго не слухай тады. Схадзі куды вышэй ды парайся з кім-небудзь. Ці на ім і свет клінам сышоўся?

Заходзіць Іван Буеў.

Буеў. Добры дзень, практыкантка! Добры дзень, Марына Сцяпанаўна! *(Да Галіны.)* Ну, як справы, як поспехі?

Марына Сцяпанаўна выходзіць.

Галіна. Добры дзень! Ах, лепей і не пытайце. *(Махнула рукой.)*

Буеў. Ну, што так?

Галіна. Нічога ў мяне не выходзіць... Ніяк яму не ўгадзіць.

Буеў. А гэтага і не патрэбна рабіць. Журналіст па-

вінен быць па-бальшавіцку прынцыповым. Тым больш крытык. Ён тут?

Г а л і н а. Тут. Вы да яго? Я зараз скажу яму. *(Галіна адчыняе дзверы ў кабінет Меерцовіча.)* Арон Ісакавіч, да вас таварыш Буеў.

Г о л а с М е е р ц о в і ч а. Адну хвілінку, я зараз.

Б у е ў *(заўважыўшы кнігу «На шырокія прасторы»)*. Вы прачыталі яе? Ну, як, падабаецца?

Г а л і н а. Мне вельмі, а яму не, хоць яшчэ і не чытаў яе.

Б у е ў *(смяецца)*. Як жа гэта? Не чытаў і не падабаецца?

Г а л і н а *(ціха)*. Аўтар яшчэ афіцыйна не залічаны ў класікі.

З кабінета выходзіць М е е р ц о в і ч.

М е е р ц о в і ч. Добры дзень, таварыш Буеў. *(Вітаецца за руку.)*

Б у е ў. Добры дзень. Я да вас...

М е е р ц о в і ч. Прадчуваю, па якім пытанні. Вас цікавіць лёс вашай рэцэнзіі на кнігу «На шырокія прасторы»? Так?

Б у е ў. Вы ўгадалі.

М е е р ц о в і ч. Ну, што ж, прачытаў, прачытаў. І ведаеце...

Б у е ў. Спадабалася, але... *(Робіць націск на «але».)*

М е е р ц о в і ч. На гэты раз без «але». Проста — не спадабалася. Будзем гаварыць як мужчына з мужчынам. Рэцэнзія кепская.

Б у е ў. Та-ак... У чым справа?

М е е р ц о в і ч. Зараз, адну хвілінку... *(Ідзе ў свой кабінет і прыносіць рукапіс Буева.)* Вось давайце разбяром вашу рэцэнзію, так сказаць, па костачках. Возьмем самы пачатак. Вы тут столькі накурылі фіміяму аўтару, нібы ён класік. У той час як імя яго яшчэ ніхто нідзе ніколі не чуў.

Б у е ў. А я ў сваёй рэцэнзіі і ставіў мэту — зрабіць так, каб аб ім пачулі. Напісаўшы такую аповесць, ён заслужыў таго, каб пра яго ведалі.

М е е р ц о в і ч *(іранічна)*. О-о! Вы адкрылі новага класіка, Бальзака, Дзікенса, Мапасана.

Б у е ў. Бальзак тут ні пры чым. Мы паважаем і Бальзака, і Дзікенса, і Мапасана, але нельга прыкрывацца імі для таго, каб зневажаць савецкую літаратуру, савецкіх

пісьменнікаў, каб зводзіць на нішто тыя заслугі, якія наша літаратура мае перад народам. Я думаю, што не памылюся, калі скажу, што нашы пісьменнікі ў разуменні ўсебаковых падзей жыцця далёка перагналі старыкоў-класікаў.

Меерцовіч. О-о! Ну, дарагі мой, і хапіў жа ты!

Буеў. Нічога не хапіў. Я гатоў спрачацца, што вось гэты твор палітычна больш спелы, чым любы твор Мапасана. І зараз ён нам прыносіць больш карысці, чым твор зноў жа хаця б і Мапасана.

Меерцовіч. Ну, гэта ваша думка, і можаце яе прытрымлівацца. Я думаю інакш... «Палітычна, палітычна»... Літаратура на тое і літаратура, а не палітыка.

Буеў. Як не палітыка? А што, па-вашаму, камерцыя?

Меерцовіч. На гэту тэму мы можам другі раз падыскусіраваць, а не зараз... Далей, вы пераказваеце змест твора, і з гэтага пераказу відаць, што нічога ў гэтым творы асабліва цікавага няма. Ну, што ж тут асаблівага. Чалавек піша пра самыя звычайныя рэчы, пра якія можна ў кожнай газеце прачытаць. Калгасы, спаборніцтва, сходы, адстаючыя і перадавыя, нейкае няўдалае каханне... А літаратура дзе?

Буеў. Аб чым тады літаратура павінна пісаць.

Меерцовіч. Хвілінку. Дзе ж шырокі бальзакаўскі размах, дзе ж тут псіхалагізм хаця б Дастаеўскага? Дзе ж тут анатомія, аналіз вобраза? Няма. Далей вы тут прыводзіце такія вытрымкі, за якія не хваліць аўтара трэба, а крытыкаваць, крытыкаваць і крытыкаваць. Вось хаця б пра старшыню калгаса Максіма: «Амаль усю ноч Максім не спаў — варочаўся з боку на бок, уздыхаў, некалькі раз уставаў з ложка, закурваў, босым, у адной бялізне хадзіў па цёмным пакоі, зноў лажыўся, але сон яго не браў. Настрой быў такі, нібы на душы кошкі скраблі». А з-за чаго? Толькі з-за таго, што трактар сапсаваўся ды дождж пайшоў? Ды гэта ж проста смешна. Што ён за чалавек? Дзе ж яго ўпэўненасць, аптымізм, уласцівы савецкаму чалавеку? Сёння сапсаваўся трактар, заўтра адрамантуюць. Спі спакойна, адпачывай, набірайся сілы... А ён усю ноч не спіць. Ды гэта ж смех. Што ён, вар'ят ці лунацік, што ён бегае па пачах у адной бялізне?

Буеў. Які ж тут смех, калі ў савецкага чалавека душа баліць за тое, што прападае дзень, што ён не зрабіў за дзень таго, што было намечана?

Меерцовіч. Абсурд. Далей. «Нібы на душы кошкі скраблі». Ды гэта ж містыка! «Душа», а затым і бога сюды

цягні, чарцей, рай, пекла. Ды гэта ж... Я проста не ведаю, што і сказаць.

Буеў *(з абурэннем)*. Ды гэта ж чысцейшы фармалізм.. Гэта ж не крытыка, а вышукванне блох у старой бялізне.

Меерцовіч. Можа, вы мяне павучыце, як крытыкаваць?

Буеў. Я вучыць вас не збіраюся. Без мяне ёсць каму вучыць.

Меерцовіч. Яшчэ б... Хто вы такі?

Буеў. Звычайны грамадзянін, Іван Буеў.

Меерцовіч. Толькі што Іван Буеў. Калі вы мне далі рэцэнзію, то, калі ласка, выслухайце мае заўвагі... Я ўсё-такі загадчык аддзела крытыкі. *(Буеў маўчыць.)* Вам, вядома, непрыемна, калі вас крытыкуюць, але трэба памятаць — крытыка добрая рэч — яна вучыць і выпраўляе чалавека. Далей. Я паўтару свой тэзіс, які толькі што выказаў нашай студэнтцы. Вось гэтую вашу хвалёную аповесць «На шырокія прасторы» з якім творам сусветнай літаратуры вы параўналі? Свайго аўтара з кім вы супаставілі? А для таго, каб ацаніць сучасны твор па заслугах, неабходна, паўтараю, неабходна параўноўваць, супастаўляць з лепшымі ўзорамі сусветнай літаратуры, з творамі Бальзака, Стэндаля, Драйзера, ну... Дастаеўскага, Талстога.

Буеў. Я і не ставіў сабе за мэту такое параўнанне і проста лічу немагчымым такое параўнанне савецкага твора з творамі буржуазнай літаратуры. Урэшце, гэта не даследаванне, а рэцэнзія. І я ставіў за мэту параўнаць твор з жыццём, з нашай рэчаіснасцю. І бачу, што ў гэтым творы ярка намалявана самае сапраўднае, жывое жыццё, жывыя нашы людзі, тыя справы, якія яны робяць, іх думкі, надзеі, мары.

Меерцовіч. О-о! Траскуча!

Галіна. А я таварыша Буева падтрымліваю.

Меерцовіч *(з апломбам)*. Дарагія мае, вы глыбока памыляецеся. Вы парушаеце элементарную логіку. Параўноўваць можна толькі такія рэчы, якія можна параўноўваць. Аловак з алоўкам, акно з акном, крэсла з крэслам можна параўнаць. Так і твор з творам. А твор з жыццём? Гэта ўсё роўна што параўнаць такія паняцці, як... каханне з лапцем.

Буеў. Ну, ведаеце, тады мне з вамі няма аб чым гутарыць.

М е е р ц о в і ч. Справа ваша.

Б у е ў. Я лічу, што літаратура існуе для таго, каб адлюстроўваць наша жыццё, нашы будні, нашых людзей, нашу барацьбу, нашы поспехі, і ацэньваць твор трэба толькі па тым, як адлюстроўвае ён усё гэта.

М е е р ц о в і ч. Хаця вы, магчыма, правы... Наогул у нашай сучаснай літаратуры яшчэ няма чаго параўноўваць з класікамі. І гэты ваш так званы твор, вядома, нельга параўноўваць, ён недастойны таго. Гэта можа абразіць вялікія імёны. І таму я лічу проста недарэчным змяшчэнне вашай рэцэнзіі ў нашай газеце. Бо я адказваю за яе як загадчык аддзела крытыкі.

Б у е ў. Што ж, давайце сюды маю рэцэнзію. Але памятайце добрую народную прымаўку: «Да пары гляк ваду носіць». Вы ж бессаромны чалавек! Вы ж нават не чыталі гэтай кнігі, а ўжо крытыкуеце яе, разносіце, знішчаеце. Гэта ж машэнства, нават больш — злачынства. І ўсё гэта ад таго, што вы не любіце, ненавідзіце нашу рэчаіснасць, і наша жыццё, і нашу літаратуру. У вас няма пачуцця гонару за свой народ, за сваю радзіму. Вы проста касмапаліт. І гэты ваш касмапалітызм вынікае са сляпога пакланення перад буржуазнай заходнееўрапейскай культурай, вынікае з няведання нашага жыцця і тых вялікіх спраў, якія твораць нашы савецкія людзі.

М е е р ц о в і ч *(устае, дрыжыць ад злосці)*. Таварыш Буеў! Вы забываецеся, што гаворыце, якое сур'ёзнае абвінавачванне вы кінулі мне!

Б у е ў. Не, не забываюся. Я магу яго паўтарыць вам. І я прынцыпова стаўлю пытанне. Вось гэту маю рэцэнзію мы абмяркуем сёння ж на партыйным сходзе. Усё тое, што я вам сказаў, я скажу там. Прашу і вас паўтарыць тое ж, што было сказана вамі тут. *(Хоча ісці.)* Замест таго каб вывадзіць нашу літаратуру на шырокія прасторы, вы знішчаеце яе. Далей такой зняважы да лепшых твораў савецкай літаратуры цярпець немагчыма! *(Рэзка павярнуўся і пайшоў.)*

М е е р ц о в і ч. Ён лічыць сваю рэцэнзію лепшым творам савецкай літаратуры. *(Усміхаецца.)*

Г а л і н а. Ён не аб рэцэнзіі сказаў, а пра аповесць.

СЦЭНА ДРУГАЯ

Той жа пакой. 12 гадзін ночы, у пакоі сядзіць Марына Сцяпанаўна і чытае кнігу.

Марына Сцяпанаўна. А такі праўда цікавая кніжка. Во табе і малады... *(Чытае. Звоніць тэлефон. Марына Сцяпанаўна здымае трубку, слухае.)* Так, я слухаю... Так, крытыка... Арона Ісакавіча? Няма яго... На сходзе... Паклікаць? Яму ўжо не да таго... А тое, што да касматалітавых запісаўся, дык яго там распякаюць... Вось вам і ну... Чаго ж тут добрага? *(Кладзе трубку.)* Добрага тут нічога няма.

Заходзіць Галіна.

Марына Сцяпанаўна. Ну, што, закончыўся сход?

Галіна. Закончыўся.

Марына Сцяпанаўна. Ну, як там у вас, калі не сакрэт.

Галіна. Які ж сакрэт? Сход адкрыты. Відаць, новы загадчык аддзела ў нас будзе.

Марына Сцяпанаўна. Ну-у?

Заходзіць Меерцовіч.

Меерцовіч *(быццам некаму пагражае)*. Та-ак... так-так-так... Не думаў я, што вы будзеце так рэзка супроць мяне выступаць.

Галіна. А за гэта, Арон Ісакавіч, крыўдзіцца нельга. Я ж не крыўдзілася, калі вы мяне крытыкавалі.

Меерцовіч. Я ж не на сходзе, а тут, у кабінеце.

Галіна. А гэта прынцыповага значэння не мае.

Марына Сцяпанаўна *(да Меерцовіча)*. І нашошта было вам крытыку наводзіць на добрую рэч. *(Меерцовіч глядзіць на яе з пагардай.)* Калі народу падабаецца, то не трэба на ражон лезці.

Меерцовіч. З вамі, здаецца, не размаўляюць?

Марына Сцяпанаўна *(пакрыўджана)*. І дрэнна робіце, што з намі не размаўляеце. Простым чалавекам не грэбуйце, ён таксама тое-сёе кумекае ў вашай справе.

Канец.

УЗЫХОДЫ ШЧАСЦЯ

ДРАМА
У ШАСЦІ КАРЦІНАХ

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ:

Дабратворскі Аляксей Іванавіч — малады аграном, гадоў 25—26.

Азохаў Фёдар Паўлавіч — старшыня калгаса «Рух», гадоў 40.

Кузьма — радавы калгаснік, гадоў 60 з хвосцікам.

Іван — яго сын, дэмабілізаваны з арміі, гады 24.

Зося Тамашова — нявеста Івана, дзяўчына гадоў 19.

Галя Цвярдова — сяброўка Зосі, сакратар камсамольскай арганізацыі, гадоў 19.

Вася — вясёлы хлопец, марыць стаць паэтам, каля 19 год.

Феня — закаханая ў Васю дзяўчына, гадоў 18, звеннявая.

Захар — калгасны конюх, гадоў пад 60.

Якаў Ягоравіч — настаўнік, больш 50 год.

Рахункавод калгаса «Рух».

Пракоп — брыгадзір 4-й брыгады, гадоў 45.

Маланння — брыгадзір, удава, гадоў 35.

Крыніцын — сакратар райкома.

Пупко Сяргей Пятровіч — у 1-й дзеі — загадчык райза, пасля — раймеліяратар, пад 50 год.

Жанна (сапраўднае імя Ганна) — тэхсакратар Пупко, маладая сімпатычная асоба 20 год.

КАРЦІНА ПЕРШАЯ

Час дзеі — зіма 1947 года.

Кабінет загадчыка райза Сяргея Пятровіча Пупко. Пісьмовы стол, некалькі крэслаў і дыван. На стале чарнільны прыбор і стос нараскіданых папер і паперачак. Каля кафельнай печкі стаіць Жанна — сімпатычная маладая асоба. На рупэ вісіць адкрыты рыдыкюль.

Жанна глядзіцца ў люстэрка, асцярожна папраўляе намаляваныя бровы і вычурную прычоску, какетнічае перад люстрам. Без папярэджання ўваходзіць Сяргей Пятровіч Пупко.

Пупко. Добрага рання, Жанначка. Чапурыцеся? Нуну, а то хлопцы любіць не будуць... Ніхто не званіў?

Жанна. Добрага рання. Не, Сяргей Пятровіч, ніхто не званіў.

Пупко. А пошта была?

Жанна. Ёсць. Вось яна. *(Падае некалькі канвертаў.)*

Пупко. Добра, добра. *(Здымае шапку, хацеў зняць і паліто, ды раздумаў. Садзіцца за стол, разрывае канверты, прабягае вачыма лісты і кідае іх у тую ж хаатычную кучу папер на стале.)* Зноў зводкі?

Ох, гэтыя мне зводкі... Аднаму дай, другому дай, чорту лысаму дай... Колькі нарыхтаваў, колькі вывез, колькі торфу, колькі гною, колькі фекалію? А працаваць няма калі. Што мне рабіць з імі, дай хоць ты мне раду, Жанначка?

Жанна. А вы іх не пасылайце, і ўсё.

Пупко. Не, нельга так,— заклююць... Паклічце да мяне... як яго... ну, аграномa новага...

Жанна. Дабратворскага?

Пупко. Ага, ага.

Жанна выходзіць.

Пупко *(адзін)*. Трэба хоць стол разгрузіць. *(Пераглядае паперкі і піша на іх кароткія рэзалюцыі. Звоніць*

тэлефон. Пупко скоса глянуў на яго, махнуў рукой і працягвае чыркаць паперкі. Тэлефон зноў звоніць. Пупко нехвотна бярэ тэлефонную трубку.) Так. Я слухаю... з Гомелем? *(Іранічна.)* Толькі гэтага і чакаў. *(Незадаволена.)* Настаў дзень, пачалі тарабаніць. Не паспеў і за стол сесці... Да! Я слухаю! Пупко слухае!.. Адкуль гэта?.. А-а-а... *(Ветліва.)* Добры дзень, добры дзень, таварыш Стручкоў! Як, як? А ў мяне ўжо дзе-ень. Я ўжо напрацавацца паспеў... А?.. Як?.. Я вас дрэнна чую... Так, так... *(Убок.)* Зноў зводкі! Чаго не ўключылі? Курынага памёту? Дык тут і графы такой няма... Што, што? Зразумела, нарыхтоўваем... Колькі?.. Зараз скажу... *(Пакапаўся ў паперках на стале і нічога не знайшоў.)* Сто дзесяць цэнтнераў... Як мала? А другія раёны болей?.. Ага... так, так... *(Круціць галавой.)* Адну хвілінку, таварыш Стручкоў. Я памыліўся. Не сто дзесяць цэнтнераў, а сто дзесяць тон. Так, так. У нас тут у тонах, а я сказаў цэнтнер... Ага... Добра, добра! Усяго добрага! *(Вешае трубку.)*

Уваходзіць Аляксей Дабратворскі.

Дабратворскі. Добры дзень!

Пупко. Здароў, здароў! Як гэта мы, браце, у абласную зводку курыны памёт не ўключылі?

Дабратворскі. Па іх форме гэта не прадугледжана.

Пупко. Памылка, браце, памылка. Трэба ўключаць. А ў нас такія даныя ёсць?

Дабратворскі. Ёсць!

Пупко. Колькі там нарыхтавалі?

Дабратворскі. Пяцьдзесят шэсць тон.

Пупко *(здзіўлена)*. Ну-у?!

Дабратворскі. Не так ужо і многа.

Пупко. У тым-та і справа, што не многа. Я перадаў зараз па тэлефоне на 110 тон. Ты ўжо не забудзь, у наступнай зводцы прадугледзь мой аванс.

Дабратворскі *(жартоўна)*. А што, калі куры падвядуць?

Пупко *(сур'ёзна)*. Не падвядуць, не маюць права. Ну, як там у нас з планам веснавога севу? Скора закончыце?

Дабратворскі. Сёння канчаем. Яшчэ чатыром калгасам не давялі.

Пупко. Трэба канчаць, трэба канчаць, браце. Ну, а

як у нас з насенным фондам? Ёсць змены, не? Прыбавілася крыху?

Дабратворскі. Трохі прыбавілася. Зернявых у сярэднім па раёне хапае на восемдзесят працэнтаў да плана. Цяжкае становішча ў чатырох калгасах: «Рух» — на 60 %, «Далёкі Усход» — на 63 працэнты, «Бярозавы Гай» — на 64 працэнты і «Дняпровец» — на 67 %.

Пупко. Так, так...*(Запісвае ў блакнот.)* Кажаш, у сярэднім па 80 працэнтаў па раёне.

Дабратворскі. Але... Гэта прыкладна так: селі за стол у рэстаране трое і ім падалі тры талеркі. Адзін з'еў дзве талеркі, другі адну, а трэці ніводнай. А ў сярэднім усе трое паабедалі.

Пупко. Ты ўсё жартуеш.

Дабратворскі. Не, не жартую. Я хачу гэтым сказаць, што нам нельга арыентавацца на сярэднюю лічбу.

Пупко. А колькі калгасаў цяпер поўнасцю забяспечваюцца насеннем?

Дабратворскі. З сямідзесяці аднаго — сорак два.

Пупко. Охо-охо-хо!.. Цяжкавата шапка Манамаха. Ці ўдасца нам выцягнуць сёлетнюю вясну? Ох, вайна, вайна!.. *(Цяжка ўздыхае.)*

Дабратворскі. Вайна ж даўно скончылася, Сяргей Пятровіч.

Пупко. Скончылася, ды не зусім. Толькі гарматы не страляюць. Яшчэ доўга яна будзе адрыгацца, браце.

Дабратворскі. А ў вас яна вельмі часта адрыгаецца.

Пупко. Не толькі ў нас, браце, а ўсюды яно так. Якое гэта ў нас сёння чысло?

Дабратворскі. Чатырнаццатае лютага.

Пупко. Охо-хо-хо!.. *(Для яго і гэта нечаканасць.)* Дык ты ўжо, браце, патурбуйся, каб на пятнаццатае зводачку падрыхтаваць. Ды не забудзься крыху авансіраваць, а то, чорт яго ведае, увесь час наш раён у хвасце плянецца і з ачысткай насення, і вывазкай угнаення, і рамонт інвентара... Авансіруй, браце, авансіруй. Усё-такі нейкім стымулам будзе для нас.

Дабратворскі. Я асабіста прынцыпова супроць гэтага авансіравання.

Пупко. Нічога, браце, не папішаш. Мне асабіста гэта таксама не па сэрцы, ды што ж зробіш. Ты вось колькі ў нас працуеш? Тры месяцы? А я ўжо стары воўк. На гэтай справе ўсе зубы з'еў. Трэба прыспасабляцца.

Дабратворскі *(з жарам)*. А я не магу прыспасабляцца да гэтага. Гэта не па карысць, а па шкоду нашай агульнай справе. І я саўдзельнікам гэтага быць не жадаю!.. І вам не раю.

Пупко *(здзіўлена глядзіць на Дабратворскага)*. Ну што ты, што ты так раззлаваўся? *(Спалоханы твар паволь на расплываецца ва ўхмылку.)* Хе-хе-хе!.. Які ж ты, браце, гарачы! Ну, ды гэта пройдзе... маладосць усё... жыццёвая нявопытнасць... Было і ў мяне гэта, ды вось прайшло.

Дабратворскі. А шкада. Вы ўжо прабачце за праўду. Так мяне армія навучыла.

Пупко. Нічога, я ж разумею... маладосць усё... узрост такі.

Дабратворскі. Можа быць... па-вашаму. *(Кароткая паўза.)* Сяргей Пятровіч! Я даўно збіраюся звярнуцца да вас з просьбай, ды ўсё зручнага выпадку не знаходзіў, а сёння думаю не адкладваць. Вы ўжо прабачце, што я перабіў вас.

Пупко. Калі ласка, калі ласка. Уважу і просьбу. Мы ж свае людзі, трэба дружна жыць.

Дабратворскі. Я прашу вызваліць мяне ад маёй пасады, гэта не па мне.

Пупко *(здзіўлена)*. Як, як? Я не зразумеў.

Дабратворскі. Не жадаю я і не магу тут працаваць. Не маё гэта месца, і таму прашу вызваліць. Я тут нічога добрага не даю, і мяне гэта не задавальняе...

Пупко. Жартуеш ты нейк незвычайна. Ха-ха-хо!

Дабратворскі. Я не жартую, а сур'ёзна.

Пупко. Сур'ёзна?

Дабратворскі. Сур'ёзна.

Пупко. Ну і дзівак!

Дабратворскі. І не дзівак!

Пупко. Дык чаго ж гэта табе захацелася так раптам? Што ж гэта за прычына такая-разсякая?

Дабратворскі. Прычына простая — я не задаволен.

Пупко. Ага-а, матэрыяльныя ўмовы дрэнныя? Дык чаго ж ты маўчаў да гэтых пор? Мы б таго-сяго падкінулі з калгасаў па пудзіку, па два.

Дабратворскі. Зусім не ў гэтым справа. Тут умовы ні пры чым.

Пупко. А што? Дадому захацелася?

Дабратворскі. Зусім не! У мяне ўсюды дом... пасля вайны.

П у п к о. Як гэта?

Д а б р а т в о р с к і. Дом згарэў, а маці... адны м словам, куды я, за мной і ўвесь дом мой...

П у п к о. Разумею, разумею, браце... Ну ды нічога, браце, не папішаш. Вайна... *(Суцяшае.)* Вайна яна такая штука, што... Разумею... Яно, канешне, і сумна тут у мястэчку і развеяцца няма дзе. Яно б у горадзе лепей... там кіно, там парк ці яшчэ куды і народу болей, а тут што ў гняздзе якім цесным. Ды, браце, спецыяльнасць наша такая — аграном, і месца наша ў вёсцы. Нічога не зробіш. Трэба мірыцца. Нездарма ж нас дзяржава вучыла. Адукацыю дала. Разумею, ды...

Д а б р а т в о р с к і. Вы прабачце, Сяргей Пятровіч. Нічога вы не разумееце. Вы толькі здагадваецеся. У тым-та і справа, што нездарма дзяржава вучыла. На якога д'ябла я вучыўся 15 гадоў, атрымаў спецыяльную адукацыю агранома? Каб цэлымі днямі тут, у канцылярыі, корпацца ў гэтых паперках, ад якіх такая ж карысць, як ад казла — ні воўны, ні малака. Не пудзікі для мяне трэба, не дом, не танцавальныя пляцоўкі. Не гэта мяне задаволіць. Праца, праца па сэрцы, дзе б я адчуваў сябе ў сваёй талерцы. Я не паніч! І я не баюся чарнавой працы. Не зводачкі аб угнаенні я хачу бачыць, а ўгнаенне, сваімі вачыма, на полі, не праз таблічкі я хачу ацэньваць ураджайнасць, а там, на полі, дзе я прыклаў свае рукі. Вось пашліце мяне ў калгас «Рух», ён самы адстаючы ў раёне, а я ўпэўнены, што праз адзін год ён можа стаць адным з лепшых.

П у п к о. Ну, браце, ты ўжо тут загінаеш. Гэтаму калгасу трэба мінімум тры гады, ды справа не ў тым. Мы яшчэ не маем такой колькасці спецыялістаў, каб распыляць іх па асобных калгасах. У нас райза паўгода было не ўкамплектавана спецыялістамі. Хопіць, нагараваўся я. Не адпушчу, браце, і не прасі.

Д а б р а т в о р с к і. Не адпусціце, пайду ў райком партыі, там зразумеюць мяне. Скажу, што не для таго я вучыўся, каб у паперках корпацца, зводачкамі агароджвацца, ды і тыя напалову ліпавыя.

П у п к о. Тэ-тэ-тэ-тэ... ах, ах, ах, ах... Які ты... Трэба, браце, памятаць народную пагаворку: «Смецце з хаты не выносіць».

Д а б р а т в о р с к і. Ну і тут працаваць я не буду. Праз два гады ў мяне выветрыцца тут усё, што даў мне інстытут. *(Выходзіць.)*

П у п к о. Ай, хлопча, хлопча. Не хоча расці, а з яго тэмпераментам можна. Ну, ды нічога, абатрэцца.

Уваходзіць Ж а н н а.

Ж а н н а. Сяргей Пятровіч, там да вас старшыня калгаса.

П у п к о. Хай заходзіць.

Ж а н н а. Сяргей Пятровіч, у мяне да вас просьба.

П у п к о. Што-о? І ў вас просьба? Можа, таксама зволіцца?

Ж а н н а *(спалохана)*. Не, што вы!..

П у п к о. Ну, ну, якая ж просьба?

Ж а н н а. Сяргей Пятровіч, можа б, вы сказалі гэтаму старшыні, каб пару вазоў дроў прывёз, а то замярзаю. А яму што там дзве падводы з калгаса адправіць.

П у п к о. А-а! Добра, добра. Скажу. Аднак і мяне жонка лае за дровы. Добра, добра. Кліч яго сюды! Толькі, чакай! Мне здаецца, Жанначка, што вы нейкую сілу маеце, каб уздзейнічаць на Дабратворскага.

Ж а н н а. Чаму вы так думаеце?

П у п к о. Э-эт, чаму, чаму... Ён малады, вы маладая, ды к таму яшчэ красуня такая.

Ж а н н а *(вельмі задаволена кампліментам)*. Ну што вы, Сяргей Пятровіч.

П у п к о. Ды чаго ўжо скромнічаць. Знаю я сілу вашага брата, вам толькі захацець. Дык справа вось у чым. Яму чамусьці задумалася зволіцца ў нас з работы. Хоча пайсці працаваць у калгас. Ды яшчэ ў які, у «Рух».

Ж а н н а. Ён, можа, пажартаваў?

П у п к о. Спачатку і я так падумаў, ды... ты ж ведаеш, які ён упорлівы. А мне не хочацца яго адпускаць, усё-ткі ён не дрэнны работнік у апараце. *(Звоніць тэлефон. Бярэ трубку.) Я слухаю...* З Гомелем?... *(Вешае трубку.)* Я пераключу на ваш тэлефон. Калі з вобласці будуць званіць, дык скажыце, што я на раён паехаў. Надакучылі яны мне...

Ж а н н а. А калі свае?

П у п к о. Тады мне скажаце. Дык я ўжо буду спадзявацца на вас, адгаварыце яго. У вас усе даныя ёсць для таго, каб яго пераканаць...

Ж а н н а *(задаволена)*. Добра, Сяргей Пятровіч. *(Упэўнена і з хітрыкай.)* Нікуды ён не паедзе. Дык вы ўжо пра дровы не забудзеце.

Ж а н н а выходзіць. Пупко прымае начальніцкі выгляд. Заходзіць **А з о х а ў**.

А з о х а ў. Можна?

П у п к о. Калі ласка!

А з о х а ў. Дзень добры, таварыш Пупко!

П у п к о. Здарова, здарова, гаспадар, сядай. Ну, што скажаш?

А з о х а ў. Ды я ўсё па той жа справе, таварыш Пупко. Колькі часу мне абяцалі трыер, і да гэтых пор не магу атрымаць. Трэба было б насенную пшаніцу прапусціць хоць разок, а тут хоць плач.

П у п к о. Не мая віна, пане-браце... вобласць... вобласць... Не прывезлі яшчэ машын. Заводы не спраўляюцца. Вайна, браце, сказваецца.

А з о х а ў. Дакуль жа вайна? Тут скора пшанічку сеяць трэба, а праз што я яе прапушчу? Праз штаны, ці што?

П у п к о. Ат-тэ-тэ-тэ... Які ты!.. Пачакаць трэба. Прывязуць, нідзе не дзенуцца. У кішэню не схаваю.

А з о х а ў. Дакуль жа чакаць? Да мая месяца?

П у п к о. Ну, няма! Не стану ж я табе раджаць.

А з о х а ў. Яно б та і не лішне было б, каб вы сталі раджаць трыеры ды веялкі.

П у п к о *(сярдуе)*. Ну ты ўжо праз меру...

А з о х а ў. Вы прабачце, я пажартаваў. *(Адчувае сябе ніякавата.)* Дык, значыць, трыера няма і не будзе?

П у п к о. Як гэта не будзе? Хто табе сказаў? Будзе, толькі калі, я не магу сказаць; як бачыш, не ад мяне гэта залежыць. Ты вось што... арганізуй вазоў пяць дроў для райза.

А з о х а ў *(нерашуча)*. Як вам сказаць?.. Вы ж яшчэ за той раз не разлічыліся...

П у п к о. Ай-яй-яй, які ты! Разлічымся, разлічымся...

А з о х а ў. Ды і коні зараз вельмі заняты. Гной возім на поле, торф... а коней, самі ведаеце, колькі, на гэткі калгас яшчэ тры разы па столькі трэба.

П у п к о. Нічога, нічога, калі па дзянёк адарвеш пяць падвод... Вобласць нам абяцала коней падкінуць, тады я табе на аднаго болей вызначу. Ну, дык дамовіліся? А то жонка за гэтыя дровы з хаты гоніць.

А з о х а ў. Дык вы ўжо, Сяргей Пятровіч, часцей турбуйце вобласць, па тэлефоне хоць, каб хутчэй трыер далі.

У пярэднім пакоі звоніць тэлефон.

П у п к о. Я ім ужо так надакучыў гэтым тэлефонам, што яны хаваюцца ад мяне, калі я званю... Ну, ды добра, добра, я пастараюся.

Азохаў. Ну, то ўсяго добрага.

Пупко. Да пабачэння... Толькі ты ўжо не забудзься пра дровы, калі ласка.

Азохаў выходзіць. У пярэднім пакоі звоніць тэлефон. Уваходзіць Жанна.

Жанна. Сяргей Пятровіч, зноў з вобласці вас пытаюць.

Пупко. Скажыце, што мяне няма, паехаў па раёне.

Жанна. Ну як, дровы прывязуць? Паабяцаў?

Пупко. Вядома, вядома.

Уваходзіць Дабратворскі.

Пупко. Во, во, во, во, ты мне якраз і патрэбен. Ледзь не прамаргаў... Ты ж ведаеш, што паслязаўтра ў нас нарада звеннявых?

Дабратворскі. Ведаю.

Пупко. То-та ж... Дык ты падрыхтуй мне даклад, каб там было сёе-тое... Адным словам, ты сам ведаеш што. І заадно разбярыся ў гэтых паперках. Я тут напісаў, каму што.

Дабратворскі. Добра. А вы і на гэтай вось напішыце. *(Падае паперку.)*

Пупко *(чытае)*. Заява... Так, так... Не-е! Не, не, не... Пачакай крыху, пачакай. Мы яшчэ пагаворым аб гэтым, падумаем. Можа, ты перадумаеш і будзем працаваць разам, заадно...

Дабратворскі. Перадумваць я не буду. Не звольніце вы, дык у крайнім выпадку райком дапаможа.

Пупко. Ай-яй-яй, які ты гарачы!.. Пачакай крыху, туды ты заўсёды паспееш, а тут, браце, без агранома няма як. *(Звяртае паперку Дабратворскаму.)* Ну, я паехаў. Жанначка, я спадзяюся на цябе!

Выходзіць. Жанна многазначна ўсміхаецца.

Жанна. Пакажы, што гэта за паперка? *(Чытае.)* І ты на самай справе цвёрда рашыў ехаць у калгас?

Дабратворскі. Так, Жанначка, цвёрда. Я ж табе не раз аб гэтым гаварыў.

Жанна. Я думала, што ты жартуеш, арыгінальнічаеш.

Дабратворскі. Якое ж тут арыгінальнічанне?

Жанна. Ну, рамантызм.

Дабратворскі. І зусім не рамантызм.

Ж а н н а. Ну, як жа?.. Малады аграном, з вышэйшай адукацыяй едзе працаваць у калгас, непасрэдна на полі. Прытым у самы адстаючы калгас. Дабіваецца нябачанага ўраджаю. У калгас прыязджаюць фотарэпарцёры, карэспандэнты... У газетах з'яўляюцца вялізныя артыкулы, фатаграфія... слава... вельмі пахвальна!..

Д а б р а т в о р с к і. Ты мяне крыўдзіш, Жанна. Я не за славай і не за пахвалой туды еду.

Ж а н н а. А за чым тады?

Д а б р а т в о р с к і. Я еду на сваё месца, дзе я павінен быць. Гэта мой доўг, абавязак. Як ты не хочаш разумець простай справы. На любым заводзе абавязкова павінны быць спецыялісты — інжынеры і тэхнікі, у кожнай лабараторыі павінны быць спецыялісты, у школе, у бальніцы — таксама спецыялісты — настаўнікі, урачы. Інакш і не мысліма. А чаму ў калгасе — у буйной сацыялістычнай гаспадарцы неабавязкова павінен быць спецыяліст? Чаму? У калгасе больш, чым дзе б там ні было, на заводзе, фабрыцы, на будаўніцтве, патрэбны спецыялісты, калі мы хочам падняць нашу сельскую гаспадарку. Дык якога чорта я буду сядзець тут, калі я патрэбен там, і больш, чым тут? Досыць на зямлі працаваць дзедаўскім спосабам!

Ж а н н а. Я ж кажу: ты захапляешся рамантызмам. Чаму абавязкова ты павінен ехаць у калгас, тым больш што цябе ніхто не пасылае туды?

Д а б р а т в о р с к і. А чаму я не павінен ехаць?

Ж а н н а. Чаму?.. Ты мне скажы, Аляксей, толькі праўду, ты сур'ёзна гаварыў, ад шчырага сэрца ну... аб нашых узаемаадносінах?

Д а б р а т в о р с к і. Аб тым, што я цябе кахаю?

Ж а н н а. Так...

Д а б р а т в о р с к і. Я раней гаварыў і зараз кажу, што я цябе кахаю, Жанначка.

Ж а н н а. Тады чаго ж ты не звяртаеш увагі на тое, што я не згодна, каб ты ехаў у калгас?

Д а б р а т в о р с к і. Але я спадзяюся, што ты будзеш згодна.

Ж а н н а. Дарэмна спадзяешся.

Д а б р а т в о р с к і. Значыць, ты мяне не кахаеш...

Ж а н н а. Не гэта значыць!.. Значыць, я не жадаю, каб ты, і тым больш я, ехалі ў вёску, у глуш, дзе ніколі не паглядзіш кіно, дзе кніжку добрую не зможаш прачытаць, дзе палова людзей пакуль што жыве ў зямлянках, дзе не будзе з кім нават пагаварыць.

Д а б р а т в о р с к і. Чаму ты так з пагардай адносішся да вёскі?

Ж а н н а. Таму, што яно сапраўды так, і асабліва зараз, пасля вайны, калі ўсё разбурана.

Д а б р а т в о р с к і. Тым больш я павінен ехаць туды.

Ж а н н а. Калі ласка. Але я не паеду і табе не раю.

Д а б р а т в о р с к і. Ты не ведаеш вёскі і таму так дрэнна думаеш пра яе. Зараз вёска мала чым адрознівасцца ад мястэчка. А ты вось жывеш у мястэчку і нядрэнна сябе адчуваеш.

Ж а н н а. Нядрэнна? Ты думаеш, я б паехала сюды з горада, каб там не так цяжка было пражыць?

Д а б р а т в о р с к і. Але чаму ж ты не хочаш зразумець: пакуль калгасы не стануць як трэба на ногі, то і ў горадзе жыццё не палепшыцца. А для таго, каб паставіць калгасы, трэба, каб мы, спецыялісты, аграномы, узяліся за працу там, непасрэдна на полі... Ад нас жа гэта залежыць.

Ж а н н а. Я разумею гэта.

Д а б р а т в о р с к і. Тады чаму ты супроць таго, каб я ехаў у вёску?

Ж а н н а. Ды проста так. Я хачу даведацца: паслухаеш ты мяне ці не, кахаеш мяне ці не.

Д а б р а т в о р с к і. Гэта недарэчнасць нейкая, а не праверка. Ці на гэтым правяраюць?

Ж а н н а *(капрызна)*. Так, на гэтым правяраюць. Я супроць таго, каб ехаць у вёску таму, што ведаю, упэўнена, што ты праз год, праз паўгода... зачарсцвееш там, агрубееш, абрасцеш, адстанеш ад жыцця ў той глушы, сярод тых людзей. Зляціць з цябе гэта інтэлігентнасць нібы з адуванчыка ўбранне. Запамятай гэта. Яшчэ ўспомніш!

Д а б р а т в о р с к і. Няпраўда! Не ведаеш ты вёскі! Паклёп! Ты яшчэ і зараз на вёску глядзіш праз гогалеўскія «Мёртвыя душы». Не тая яна цяпер. Я таксама з вёскі і ведаю, што там людзі не горшыя за мяне з табой, а нават і лепшыя ёсць. А інтэлігентнасць не вялікая важнасць у жыцці. Я еду туды працаваць, а не манікюр насіць.

Ж а н н а. Ты як сабе хочаш, а я адзін раз жыву і хачу пражыць як можна лепш.

Д а б р а т в о р с к і *(глядзіць на яе, нібы яго хто знянацку ўдарыў)*. Жанна! Што ты гаворыш? Тады ў нас розныя погляд на жыццё. Не для таго мы жывём, каб паглядзець кіно, каб пашаркаць падэшвамі пад джаз, каб

пафарсіць у модным гарнітуры. Не за тое я ваяваў, і не для гэтага мяне вучылі. А што я зрабіў добрага для людзей, што я даў народу, я, сын жабрака, за тое, што вывелі мяне ў людзі, за тое, што атрымаў адукацыю, аграномам стаў?! Што ты гаворыш, Жанна?! Якую ты бязглуздзіцу нясеш? Ты баішся вёскі таму, што цябе там будуць зваць не Жаннай, а Ганнай.

Ж а н н а. Які ж ты ўсё-такі некультурны!.. Ты нават з дзяўчынай ветліва размаўляць не ўмееш. Аказваецца, інтэлігентнасць твая толькі знешняя. Вось яна ўжо праяўляецца — вёска. *(Выходзіць.)*

Д а б р а т в о р с к і *(правёў вачыма яе за дзверы. Ён усхваляваны. Падышоў да стала, нервова пастукаў пальцамі)*. Што яна сказала?.. Няўжо гэта яна, сапраўдная?.. «Я жыву толькі адзін раз і хачу пражыць як можна лепш...» Так мог сказаць Пупко. Няўжо я памыляўся?.. Так, я яе не ведаю. Я захапляўся яе веданнем літаратуры, музыкі, здзіўляўся яе густу... Вось яе густ! А пра галоўнае ў жыцці не гаварыў. Вось дзе памылка.

Як шкада дарэмна растрачаных добрых слоў...

Хацеў пайсці, ды ўспомніў пра паперкі на стале. Забірае іх і выходзіць.

Заслона.

КАРЦІНА ДРУГАЯ

Канцылярыя праўлення калгаса «Рух». Няўтульны выгляд у пакоі ствараюць стары стол, нічым не пакрыты, дзве лаўкі грубай работы і два акны, напалову забітыя дошкамі. На сцяне нейкі плакат часоў вайны, рог якога адклеіўся і, абвісшы, закрывае палову гэтага плаката. За сталом сядзіць р а х у н к а в о д. Ён спіць, абапёршыся на стол. Час перадвячэрні. На сцяне цікаюць ходзікі. Гіра апусцілася амаль да падлогі. Заходзіць д з я д з ь к а К у з ь м а. Паглядзеў на рахункавода, паскроб патыліцу, уздыхнуў.

К у з ь м а *(ці то да рахункавода звяртаецца, ці то да гадзінніка)*. Няма каму падцягнуць.

Р а х у н к а в о д *(прачнуўся)*. Чаго?..

К у з ь м а. Кажу: гіру няма каму падцягнуць, гаспадара няма.

Р а х у н к а в о д. А-а... задрамаў крыху.

Паўза.

К у з ь м а. Усе мы неяк дрэмлем. Гэта ж паглядзіш,

дык у суседніх калгасах і людзі неяк па-другому шавеляцца і... Вяспу чуюць, рыхтуюцца. Гною на поле павазілі чорт ведае колькі, у кузнях стукаюць, ляпаюць, той туды едзе, той адтуль вязе, насенне чысцяць... А ў нас дык нібы ў бары глухім дзе... і чаго мы чакаем?.. Не, нельга так. *(Падыходзіць да гадзінніка, падцягвае гіру, і ходзікі зацікалі весялей.)* Да вайны, бывала, у гэткую пару і плугі адрамантаваны, і цягі падрыхтаваны, і насенне ачышчана, і палова гною ўжо на полі ляжала. А цяпер дык... *(Плюе.)*

Рахункавод. Да вайны другая справа была.

Кузьма. А ў людзей і цяпер другая справа.

Рахункавод. Ці маем мы зараз тое, што да вайны мелі. Адной жывёлы толькі было тры фермы. Коней толькі 213 галоў, ды машын сваіх колькі было, ды МТС дапамагала, а зараз 54 кані. Апрацуй-ка імі 500 гектараў. І галоўнае яшчэ не ў тым...

Заходзіць Захар.

Людзей колькі не стала, ды яшчэ якіх людзей. За адзін дзень толькі расстралялі немцы трыццаць аднаго чалавека, ды заарыштавалі колькі... і загінулі немаведама дзе. *(Уздыхае.)* А на фронце...

Захар. Іх ужо не вернеш. На тое і вайна, каб людзям бяду чыніць.

Кузьма. Нездарма ж яны загінулі, а за тое, каб тым, хто жывым застаўся, жылося лепей. Нават лепей, чым да вайны, яны ж за гэта загінулі.

Рахункавод. І будзем лепей жыць. Вось як закончым пяцігодку, так і зажывём лепей.

Кузьма. Не-е! Калі ў нас у калгасе справы будуць так ісці, то і праз тры пяцігодкі мы не зажывём лепш... Пяцігодка... Што ты мяне збіраешся частаваць праз пяцігодку? Можа, мне ўсяго засталося жыць пяцігодку. А мне хочацца сёння жыць добра, заўтра жыць добра. Пяцігодка... Як той казаў: пакуль сонца ўзыдзе, дык раса вочы выесць. Пяцігодка... Гэта ж у людзей пяцігодка, а наша дзе? Ты яе складаў, я не бачыў! На якую ж пяцігодку ты спадзяешся? *(Рахункавод маўчыць.)* А-а-а! То-та ж... Мы сваю пяцігодку павінны мець на ўвазе, каб у гэтым годзе атрымаць на працадні не горш, чым у людзей.

Захар. Во-во! Яно самае... Гэта ж паглядзіш навокал, дык людзі кілаграмамі атрымліваюць на працадзень,

а ў нас дык 400 грамаў. Сорам прызнацца. Кузьма праўду кажа: мы ж таксама добра жыць хочам.

Рахункавод. А хто ж вам не дае?

Кузьма. Як гэта хто не дае?! Кіраваць трэба калгасам, а не храпці тут за сталом!

Рахункавод. Чаго ж ты злуешся на мяне?

Кузьма. Як жа не злаваць? Вось ты сядзіш тут, і канцылярыі і табе што ні дзень, то працадзень ды яшчэ з паловаю. А мне ў шэсцьдзесят гадоў на працадзень трэба добра папацець. Ды, акрамя таго, у цябе з жонкай на двaіх паўгектара прысядзібнага ўчастка, а ў мяне на сем душ трыццаць сотак. Дык табе нябось і можна мірыцца з гэтымі чатырыста грамамі на працадзень, а мне ніяк нельга мірыцца.

Захар. Во, во! Яно самае. Ён такі, братка, праўду кажа. На працадзень у нас уся надзея.

Кузьма. І мне трэба, каб працадзень гэты каштаваў кілаграмы, а не грамы.

Рахункавод. Вось у тым-та і справа. Як жа зрабіць, каб ён каштаваў, калі коней мала, жывёлы мала, значыць, і гною мала, а зямля знясілела, ды і рабочых рук не хапае.

Кузьма. Зноў жа кажу: кіраваць трэба калгасам.

Рахункавод. Дык жа кіруем.

Кузьма. Кіруеце, ды не так, як трэба. Не па дарозе, а ўзбок дарогі — па раллі.

Рахункавод. Вы самі выбіралі старшынёй Азохава.

Кузьма *(уздыхае)*. Выбіралі, ды крыху памыліліся.

Рахункавод. Цябе хацелі выбраць, чаго ж ты адмовіўся?

Кузьма. «Адмовіўся»... Каб крыху маладзейшы быў ды пісьменны, дык не адмовіўся б.

Захар. Яно-то... Як яго... і не зусім памыліліся. Азохаў да вайны нядрэнны быў старшыня. Праўду я кажу, Кузьма? Нядрэнны гаспадар.

Кузьма. На гэта і спадзяваліся.

Захар. Во, во... Яно самае... Усё-ткі на вайне быў чалавек, заслужаны, ордэны мае, медалі. Думалі, зноў павярне калгас на добры шлях, а ён неяк не так... Зусім чалавек апусціў рукі, ходзіць, нібы штосьці шукае.

Кузьма. Працуе нібы не для сябе, а для кагосьці.

Захар. Во, во, яно самае.

Рахункавод. Вось вы кажаце, чалавек рукі апусціў. А чаму? Чаму? Вы не паглядзелі яму ў душу, а гэтага чалавека шкадаваць трэба. Чалавек ваяваў, і не абы-як ваяваў — незадарма ордэнаў начаплялі. Думаў, прыйдзе дамоў... А прыйшоў — дому няма... ні жонкі, ні дзяцей. Усю сям'ю загубілі немцы. Вось і ходзіць — нібы штосьці шукае.

Паўза.

Кузьма. Шкадаваць, кажаш... Я, канешне, разумею, што сям'ю страціць гэта не так сабе... Можа, і пашкадаваць трэба... ды ўсё роўна гэтым не паможаш, не вернеш іх, не знойдзеш. А агульныя справы ад гэтага цярпець не павінны. Усё-ткі гэта калгас, сто шэсцьдзесят двароў. Парадак трэба даваць.

Рахункавод. Цяжка цяпер парадак даваць. Сто шэсцьдзесят двароў. А што ў гэтых дварах засталося пасля немцаў. Ні плугоў, ні хамутоў, ні калёс, ні скаціны. Гэта ж добра, што дзяржава трохі дапамагла,— хоць коней дала, а то садзіся ды Лазара зацягвай. Адкуль што возьмеш? І ў кішэні ні граша, ні шастака, і ў засеках мышы падохлі з галадухі. Ды і самім хоць лажыся ды памірай.

Кузьма. Але не памерлі?

Рахункавод. Дык гэта ж дзякуй — дзяржава пазыку дала і крэдыт адпусціла.

Кузьма. Дык жа нельга штогод дзяржаве ў кішэню лазіць, пара і самім за розум брацца. Вось мы не зрабілі так, як нам раіў з райкома сакратар, як яго...

Рахункавод. Крыніцын.

Кузьма. Ага, Крыніцын. А ён разумны чалавек і добрую параду даў. Каб селі ды распланавалі, што ды як. Колькі коней у лес, колькі па гной, колькі туды, колькі сюды. Ды каму што рабіць, ды колькі затраціць дзён, што пабудаваць, дзе ўзяць. Распланавалі б усё да дробязей, яно б і відно было, што і як. А то, як ён казаў,— працуем усляпую. Хапаемся за тое, хапаемся за сёе і нічога да канца не даводзім. Сваю пяцігодку трэба складаць.

Рахункавод. Ён жа абяцаў нам чалавека прыслаць у дапамогу.

Захар. А ён калі абяцаў, то і зробіць. У яго слова вернае.

Кузьма. «Абяцаў, абяцаў»... Усё чакаем, пакуль з Масквы да нас прыедуць ды пакажуць нам. Нібы ў саміх у

галаве пакулле. Ды я каб грамаце разумеў, то сам бы размеркаваў, што і як.

З а х а р. Яно-то, я кумекаю, лепш было б, каб які спец прыехаў. Як ні кажы...

К у з ь м а. Яно не лішне... Сюды каб добрага камуніста прыслалі і не на тыдзень, другі, а каб папрацаваў у нас год-два, як пры калектывізацыі. Во тады ў нас справа хутка пайшла б на лад.

Уваходзяць Г а л я і З о с я.

Г а л я. Дзядзька Кузьма, вы тут сядзіце, а вас дома госць чакае.

К у з ь м а. Які госць?

Г а л я. Ды сын жа ваш, Іван, прыехаў, дэмабілізаваўся.

К у з ь м а. Няўжо?! *(Усхвалявана.)* Вось дык штука... а... Ну, браткі, дык я тады пайшоў... Нарэшце... Дык вы ўжо, калі так, прыходзьце на чарку. Даўно чакаў. І гарэлка ўжо пракісла. *(Выходзіць.)*

З а х а р. Во, яшчэ адзін... Прыходзяць хлопцы. Аднаго майго няма... і не будзе.

Р а х у н к а в о д. Ды ці толькі ваш?

З а х а р. А ў мяне ён адзін быў. Пайду і я пагляджу на Івана. Разам з маім пайшоў на службу. *(Выходзіць.)*

Р а х у н к а в о д *(замыкае ў шафу паперкі, якія ляжалі на стале. Да Зосі)*. А ты, Зоська, чаму не ідзеш паглядзець на свайго Івана?

З о с я. Што вы, дзядзька, які ён мой?

Р а х у н к а в о д. А чаго ж ты расчырванелася? А-а-а!.. То-та ж... Ведаю, ведаю, бачу.

Г а л я. Саромеецца ісці.

Р а х у н к а в о д. Чаго ж саромецца? Ці правінілася?

Г а л я. Не, дзядзька, яна ні ў чым не правінілася.

Р а х у н к а в о д. Нябось чакала, а зараз баіцца ўбачыцца. Схаджу і я, можа, і мне якая чарка перападзе.

Г а л я. Дзе там чарка! Дзядзька Кузьма цэлую батарэю паўлітэрак нарыхтаваў.

Р а х у н к а в о д выходзіць. Як толькі рахункавод выйшаў, Зося кідаецца да Галі і цалуе яе.

З о с я. Уй, Галачка, якая радасць!! Ванюшка прыехаў! Проста не верыцца. Які ён? Ты яго бачыла?

Г а л я. А чаго ж ты баішся пайсці?

З о с я. Я не баюся, а сорамна.

Г а л я. Чаго? Во, дурненькая.

З о с я. Ой, Галя, ты нічога не ведаеш.

Г а л я. А што?

З о с я. Там народу колькі зараз, а я прыйду...

Г а л я. Ну дык што?

З о с я. Ну, што я яму скажу, што ён мне скажа? Ды яшчэ пры людзях, як мы сустрэнемся?

Г а л я. А што тут такое? Сустрэнецеся як звычайныя знаёмыя.

З о с я. Што ты, Галачка! Ты нічога не ведаеш. Я ж яму такія пісьмы пісала, як толькі яго не называла...

Г а л я. А ён?

З о с я. І ён таксама... Уй, як хораша! А ты кажаш, як звычайныя знаёмыя.

Г а л я. Дык гэта ж пры людзях.

З о с я. Не, не, што ты. Сапсаваць сустрэчу? А ты з ім гаварыла? Што ён казаў?

Г а л я. Гаварыла. Пытаў пра цябе. Запрашаў зайсці разам з табой.

З о с я. Сходзім заўтра? А?

Г а л я. Чаму заўтра, а не сёння?

З о с я. Не, не, не, Галачка! Заўтра. *(Зноў парывіста цалуе.)*

Уваходзіць Ф е н я.

Ф е н я. Зося! Што ты попусту пацалункі траціш? Цяпер табе ёсць каго цалаваць. Ты лепш для Івана прыберажы.

З о с я. Хопіць і для яго.

Ф е н я. А чаму ж ты тут сядзіш, а не ля Івана?

З о с я. А чаго я туды пайду? Трэба будзе, сам прыйдзе.

Ф е н я. Такое тады тваё каханне.

З о с я. А я і не думала яго кахаць.

Ф е н я. Не адказвайся. Усё роўна ведаю. А я б не ўтрымала. Я вось кожны дзень бачу свайго Васю, і то як толькі сустрэнуся, дык аж трапечацца ўсё.

З о с я. А ён нешта і не глядзіць у твой бок.

Г а л я. Такі ён і мой, як твой.

Ф е н я. Каб жа ты яму меней галаву круціла, а то і сама не гам і другому не дам.

Г а л я. А можа, і гам. *(Смяецца доўга і ад душы, заражаецца смехам і Зося.)*

У гэты час заходзіць В а с я.

Г а л я. Вось і Вася на лёгкі ўспамін.

В а с я. Як пачую гэты галасок — сэрца вяне. Добры дзянёк! Маё вам!..

Ф е н я. Добры дзень!

Г а л я. Колькі разоў на дні ты вітаешся?

В а с я. Прызнак асобай павагі да вашай асобы.

Г а л я *(жартоўна)*. Вельмі прыемна ведаць.

В а с я. А-а! Зосенька! Дазвольце ўрачыста віншаваць Вас. Збылася Ваша мара.

З о с я. Вельмі ўдзячна за добрае слова.

Г а л я. Як жа ты абышоў выпадак выпіць чарку?

В а с я. Другая мара засланіла розум.

Г а л я. О-о! Цікава ведаць, што ж гэта за мара.

В а с я. Усе чаркі міру я памяняў бы на адзін твой пацалунак.

Г а л я *(жартоўна траціць прытомнасць)*. Ой, вады мне!

В а с я. О, неба! Дапамажы! Яна мне не верыць. Павер, грамадзянскі доўг прымусіў мяне з'явіцца сюды. Мы ж дамовіліся сёння насценгазету выпусціць.

Г а л я. Які ты акуратны стаў.

В а с я. Гэта ўжо твая заслуга як сакратара камсамольскай арганізацыі. Адчуваецца правільнае выхаванне.

З о с я. Вася робіць першыя крокі і падае надзеі называцца актывістам.

Г а л я. І то ўжо для яго плюс.

В а с я. О-о! Вася з плюсам гэта ўжо не проста Вася. Але скажы мне, Галя, чаму да мяне ты адносішся з непавагай?

Г а л я. Не заслужыў павагі.

В а с я. Ну чым так? Калі б я ды што-небудзь якое, дык я ж ніколі, нікому, нічога, ніякага, а калі што якое, дык што тут такое.

Г а л я. Калі б у цябе язык меней малоў.

В а с я. О, язык мой — вораг мой! Не звяртай увагі на яго. Ты ж павінна сэрцам пачуць, што я да цябе ўсёй душой імкнуся, а ты — і ні ценю надзеі. Скажы чаму?

Г а л я. Па-першае, таму, што пры старонніх пра такія рэчы не пытаюць, а па-другое, таму, што не жадаю другім асобам упоперак дарогі станавіцца.

В а с я. Але ж ты мне ўпоперак сэрца стала.

Г а л я. Гэта яшчэ не вялікая бяда.

З о с я. Хто табе паверыць? Ты гаворыш, а ў словах душы не адчуваецца.

Г а л я. І як не сорам, на кожных растаньках аб гэтым трызвоніць.

В а с я. Не разумееш ты маёй натуры. *(Дэкламуе.)*

Нічуць не сорам мне прызнацца
пры людзях — я цябе люблю!
Скажы, чаму не хочаш знацца,
адвергла ты любоў маю?

Ф е н я не вытрымлівае і са слязамі выбягае.

Г а л я *(злосна)*. Чаму? Калі ты пры ёй яшчэ будзеш гаварыць такія рэчы, то я табе ўсе валасы павыдзіраю.

В а с я. «О, во гневе ты прекрасна!»

Г а л я. Ах ты, завоблачная душа, вершаплёт ты гэтакі! Ты не бачыш, што дзяўчына да смерці закахалася ў цябе? Дык ты яшчэ здзекуешся з яе?

В а с я. Я зачараван тваім гневам.

Г а л я. Я табе вось пакажу! *(Наступае на Васю, а ён адступае вакол стала.)* Бяздушнае стварэнне, памылка прыроды!

В а с я *(пераходзіць у наступленне)*. Хто? Я? Памылка прыроды? Я не сцярплю такой абразы! Ты ведаеш, што я сканструіраван па апошнім слове тэхнікі. Можа, я шэдэўр гэтай вытворчасці.

Г а л я *(зноў наступае)*. Зазнайка ты, вось хто! Дурніца гэта Феня, што цябе кахае. За што? За тое, што ты лодыр, абібок, лянцяй. Колькі ты працадзён маеш? Што ты добрае зрабіў у калгасе? Ходзіш па начах ды зоркі лічыш, сабак турбуеш, вераб'ёў са стрэх ганяеш ды вершыкамі забаўляешся пра неба ды зоркі? А каму яны патрэбны? Каму ад іх карысць? Я ж кажу — дурная Феня. За што цябе кахаць?

В а с я. Галя-а! Ты робіш велізарнейшую памылку! Ты недаацэньваеш паэзіі.

Г а л я. Паэзія! Ха-ха-ха! Курам на смех твая паэзія! Ха-ха-ха-ха!

В а с я. Я пакрыўджан да глыбіні душы.

Г а л я. Падумаеш? Ты б напісаў вершык у насценгазету пра сябе, пра тое, як ты працуеш у калгасе, а то: «Адвергла ты любоў маю!» Якая дрэнь! Вось мы камсамольскім сходам забаронім такія вершыкі пісаць, пакуль мінімум працадзён не выпрацуеш.

В а с я. Га-а-ля! І ты не баішся ўвайсці ў гісторыю? Паспрабуй забараніць.

З о с я. І забаронім!

Г а л я. Забаронім. Вось папрацуеш, тады не будзеш збіраць усякую дрэнь, а пра калгас будзеш пісаць, пра ўраджай, пра нашага конюха.

В а с я. Для гэтага патрэбна асобае натхненне.

Г а л я. Якое табе натхненне?

В а с я. Ды вось хоць бы і... *(Падыходзіць да Галі зусім блізка і знянацку цалуе яе.)*

Г а л я *(б'е Васю па твары)*. Хуліган! Нягоднік!

В а с я *(уцякае ад яе)*. Сто мільёнаў чарак! Галачка!

Г а л я. Я цябе адвучу! *(Гоніцца за ім, Вася ўцякае.)* Пакаснік!

В а с я пасылае паветраны пацалунак і выбягае за дзверы.

З о с я. Ну і сарвігалава!

Г а л я. Нахабнік! Ні сораму, ні сумлення! Вертапрах!

З о с я. Але ж ты яго і адчытала!

Г а л я. Я яшчэ яго не так адчытаю! Размалюю так, што крывёю абмыецца за гэткія штучкі.

В а с я *(прыадчыніўшы дзверы)*. Галачка! Дык за што гэткая суровасць?

Г а л я. Вон, нягоднік! І бачыць цябе не жадаю! *(Замахваецца на яго папаўшым пад руку венікам, і Вася знікае.)* Абібок! Ходзіць, лынды б'е, дык што яму ў галаву ўзбрыдзе? Заўтра ж на камсамольскім сходзе мазгі трэба ўкруціць.

В а с я *(зноў прыадчыняе дзверы)*. Галачка! Будзь ласкава! Пацалунак быў ад шчырага сэрца. *(Галя намерваецца ўдарыць венікам, але Вася своечасова знікае за дзвярыма.)*

З о с я. Перац, а не хлопец.

Г а л я *(ціха)*. Але я выб'ю гэту яго саманадзейнасць.

В а с я *(за дзвярыма)*. Галачка, давай мірымся. Я гатоў прасіць выбачэння, абы ты не злавалася!

Г а л я *(хітравата падміргвае Зосі)*. Я табе міруся!

Адчыняюцца дзверы. У гэты час Галя замахваецца венікам і раптам спалохана адступае. У дзвярах з'яўляецца Д а б р а т в о р с к і.

Г а л я. Уй!.. Прабачце! Прабачце!

Д а б р а т в о р с к і. Дрэннае прадзнаменаванне, калі так сустракаюць.

Г а л я. Прабачце... прабачце... Я не на вас...

Д а б р а т в о р с к і. Так і быць. На першы раз выбачаю. Добры вечар!

Г а л я і З о с я. Добры вечар!

Дабратворскі. Дык з кім гэта вы ваюеце?

Зося. Ды тут з адным...

Галя. Перашкаджаў насценгазету пісаць...

Дабратворскі. Насценгазету? *(Разглядае на стале насценгазету.)* Добрая рэч... А чаму ж у вас карыкатур няма?

Зося. Не ўмеем маляваць...

Дабратворскі. Ну, у гэтым я вам дапамагу. Я крыху ўмею.

Галя. Вы?

Дабратворскі. Я. А што вы здзівіліся?

Галя. Ды... я...

Зося. А вы што? Да нас упаўнаважаным?

Дабратворскі. Не зусім так. Вінават, мы ж яшчэ і не пазнаёміліся.

Зося. Ды мы вас і так ведаем!

Галя. Хто гэта мы? Я вось не ведаю.

Дабратворскі *(падае руку Галі і Зосі)*. Дабратворскі Аляксей Іванавіч.

Галя. Галя Цвярдова.

Зося. Зося Тамашова.

Дабратворскі. А скуль вы ведаеце мяне?

Зося. На нарадзе звеннявых у раёне была. Вы аграномам у райза працуеце?

Дабратворскі. Працаваў.

Зося. А зараз?

Дабратворскі. А зараз прыйшоў да вас працаваць. Прымеце мяне ў свой калгас?

Зося. Назаўсёды?

Дабратворскі. Ну, вядома, не на тыдзень.

Галя. А вы сапраўдны аграном?

Дабратворскі. Цікавае пытанне.


Заслона.

КАРЦІНА ТРЭЦЯЯ


Кватэра настаўніка Якава Ягоравіча, дзе жыве і Дабратворскі. Вечарам сюды сабраліся Дабратворскі, Іван, Вася, Галя, Зося.

Дабратворскі *(з натхненнем)*. А якою наша вёска можа стаць! Толькі трэба папрацаваць, добра папрацаваць, закасаўшы рукавы, з душой і дружна.

Андрэй Макаёнак.
1979 год.



На адкрыцці помніка Янку Купалу
ў Араў-парку ў Нью-Йорку.
1973 год.



І в а н. Такою, як да вайны была.

Д а б р а т в о р с к і. Да вайны? Не ведаю, якой яна да вайны была, але думаю, што можа стаць лепшай, чым да вайны.

Г а л я. Гэта вы не ведаеце, якой яна была... Такою, што куды б ні паехаў, а хочацца хутчэй назад, дадому. Весела! Прыгожа! Ух, як добра!

Д а б р а т в о р с к і. Вось я сабе добра ўяўляю, якою яна павінна стаць... *(Марыць услых.)* І стане!.. Вуліцы роўныя, шырокія, чыстыя, зялёныя, кругом абсаджаныя бэзам, чаромухай, акацыяй, вішнямі, каштанамі. Адны адцвітаюць, другія зацвітаюць. Хаты з прыгожымі палісаднікамі тонуць у зелені і кветках. А выйдзеш вечарам на вуліцу — зіхацяць электрычныя лямпачкі... Смех, гоман, песні, гармонік залівaецца... Гэта мы ідзём, дзяўчаты нашы, хлопцы... Куды? У свой клуб... А ў цэнтры вёскі вялізная белая будыніна... не, не белая, а блакітная, прыгожая, як у казцы... Што гэта? Гэта наш клуб. Кіно там ці танцы?.. А знекуль з вышыні на ўсю вёску гучыць музыка, такая, што душа перапаўняецца ад шчасця... Гэта для нас пяе Масква... Гэта радыё збліжае нас з Масквой. *(Робіць паўзу. Астатнія замоўклі ад захаплення.)* А там, за вёскай, сад... вялізны сад гектараў на трыццаць... Цвіце... Павее вецер, і адтуль такі прыемны водар, што дыхаць хочацца на поўныя грудзі, хочацца абняць усю зямлю. А выйдзеш у поле — не жыта, а лес, не колас, а сноп!.. Глянеш наўкола — не расце, а зямлю рве... і лён, і бульба, і пшаніца. Гэта мы зрабілі, гэта звяно Галі, звяно Зосі... Гэта моладзь, камсамольцы. Кожным каласком даражаць... Паглядзіш на сваю працу — стопудовы ўраджай!.. Дзе там стопудовы... Сто пяцьдзесят!

Дабратворскі замоўк, і астатнія некаторы час маўчаць, захопленыя яго марай.

Г а л я *(якая ўвесь час слухала Дабратворскага, паядаючы яго вачыма)*. Як хораша!

В а с я. Гэта ж верш! І вы не пішаце вершы? Так толькі вершам можна расказаць. Пра такую вёску толькі вершы пісаць!

Д а б р а т в о р с к і. Не толькі вершы, а і песні.

В а с я. Не, не! толькі вершы!.. *(Дэкламуе.)*

Пад зорным небам сад цвіце,
І вішні белыя ля хаты.

Пяюць на вуліцы дзяўчаты,
Смяюцца хлопцы дзе-нідзе!..

Ляціць па вёсцы песня звонка —
Аб шчасці моладасць пяе,
А гарманіст сваёю хромкай
Дзяўчатам жару паддае.

Іван. Ну, брат, сапраўды хораша. У мяне нават на сэрцы засвярбела.

Зося. І ў мяне.

Іван. Ведаеш, брат, я яшчэ калі ў Сталінградзе ваяваў, вось так жа марыў. Не, думаю, чорт цябе забяры, дай толькі цябе прыкончыць, а там ужо яшчэ лепш адбудуем і гарады і вёскі.

Дабратворскі. Пара прыйшла. Час брацца за справу.

Галя. Возьмемся, а, хлопцы, Зося?! Толькі вы гэтулькі нагаварылі, што немаведама з чаго пачынаць...

Дабратворскі. З чаго пачынаць? Пачынаць трэба з нас саміх. Захацець трэба, так захацець, каб ніякія цяжкасці не палохалі нас. *(Усе маўчаць, чакаюць, што ён далей скажа.)* Самім захацець і падняць усё жывое ў калгасе, ад малога да старога. Сумеем падняць, узрушыць?

Галя. Дваццаць камсамольцаў...

Іван. Ды два камуністы...

Галя. Гэта ўжо трыццаць.

Вася. Як трыццаць?

Галя. А вось так і трыццаць, і калі не зможам узрушыць, тады якія мы камсамольцы?

Дабратворскі. Правільна. Павінны ўзрушыць! Аб'явіць самую сапраўдную вайну за...

Вася *(перабівае)*. З кім вайну?

Дабратворскі. З стыхійнасцю, заспакоенасцю ў нашай вёсцы, з чатырохсотграмовым працаднём! За стопудовы ўраджай з кожнага гектара!

Вася. Цяжка...

Дабратворскі. А хто сказаў, што лёгка. Цяжка, вядома, цяжка, але можна! Можна! Больш чым упэўнен, што можна!

Галя *(да Васі)*. Ты ўсё цяжкасцей баішся. Я думаю, што вершыкі пісаць лягчэй, чым гной нарываць. Працы нечага баяцца.

Вася. Памыляешся, Галя, добры верш напісаць у тысячу разоў цяжэй, чым нават гной нарываць.

Галя. Дык гэта ж добры верш, а такія, як ты пішаш, вельмі лёгка можна.

Вася. Паспрабуй... Аднойчы Пушкіну таксама сказалі...

Галя *(перабівае)*. Ты Пушкіна не чапай. Ён табе не таварыш. Далёка табе да яго.

Дабратворскі. Ну што вы, Галя, на яго нападаеце? Так і да лаянкі недалёка.

Іван. Нічога. Калі адзін другога любіць, дык пры людзях заўсёды нібы і лаюцца, а як...

Галя. Замнога ты ведаеш!

Дабратворскі *(нібы не адразу зразумеў апошнія словы)*. Ну, ды справа не ў тым. Я ўпэўнен, што Вася ад нас таксама не адстане. *(Да Васі.)* Так ці не?

Вася. Ну вядома ж, я не супроць. Я толькі кажу, што крыху цяжкавата.

Дабратворскі. Не крыху, а сапраўды цяжка. Але ж мы бальшавікі. І ўсякія цяжкасці можам пераадолець. Як Сталін сказаў — «няма такіх крэпасцей, якіх бы бальшавікі не ўзялі».

Іван. Я думаю, што мы можам зрабіць. У вёсцы дваццаць чалавек камсамольцаў, гэта вялікая сіла. Ды можна ўпаўне спадзявацца на дэмабілізаваных: франтавікі — хлопцы што трэба. Нам толькі распачаць трэба, а там заварушацца ўсе.

Дабратворскі. А чаму ж гэта Зося не выказвае свайго пагляду? Ці, можа, супроць?

Зося. Што вы?.. Калі б вы што-небудзь гаварылі не так, тады я сказала б што.

Галя. Зося супроць? Гэта вы яе не ведаеце. Яна ў нас заўсёды маўклівая. А да працы яна, будзьце ўпэўнены, мала хто можа з ёй паспрачацца. На Зосю можаце спадзявацца, як на сябе.

Вася. Што праўда, то праўда. У яе рукі красамоўныя. Ужо калі абдыме, дык абдыме так, што і язык высалапіш.

Іван. Што, на сабе пераканаўся?

Вася. Што ты, што ты! Я яшчэ не збіраюся канчаць жыццё самагубствам. *(Смяюцца.)*

Дабратворскі. Не бянтэжце дзяўчыну. Не вымушайце чырванець. Значыць, мы прынцыпова дамовіліся!

Вася. Цяпер трэба абгаварыць усё на праўленні.

Галя. Перш на камсамольскім сходзе.

І в а н. Раней трэба ўсё падлічыць. Што ды як. Што мы маем, і адкуль што ўзяць, падрабязна распланаваць усё, дзе і што рабіць, каго куды прымацаваць, хто за што адказваць будзе.

Д а б р а т в о р с к і. Гэта мы зробім, і падлічым, і распрацуем, не адкладваючы ў доўгую скрынку. Давайце дамовімся... Заўтра ж збярэмся ў праўленні і запросім старшыню калгаса да сябе.

Г а л я. Але мне не церпіцца. З чаго ж мы пачынаць будзем?

Д а б р а т в о р с к і. Пачынаць? Трэба з усяго пачынаць. А галоўная задача — падымаць ураджай. Уласна кажучы, мы ўжо пачалі, як кажуць — замахнуліся. У гэтым годзе мы будзем мець сваю парніковую гаспадарку. Гэта наша першае пачынанне. І мы павінны зрабіць так, каб гэтае пачынанне дало добры эфект. Нам трэба будзе падабраць лепшых камсамольцаў на парніковую гаспадарку. Праз пару дзён падрыхтоўчыя работы закончым.

З о с я. Я вазьмуся за парнікі.

Д а б р а т в о р с к і. Адна не справішся.

З о с я. Я падбяру сабе бабулек такіх, што справімся.

Д а б р а т в о р с к і. Гэта б добра было... Моладзь нам трэба будзе і на другое. У нас вялікі недахоп цягла. На адных конях далёка не выедзем. Дарэчы сказаць, я яшчэ не ведаю, што ў нас за коні.

Г а л я. Коні ў нас вельмі добрыя, але малавата.

В а с я. Коні што трэба.

Г а л я. А каб вы ведалі, які ў нас конюх — дзядзька Захар,— не чалавек, а золата.

В а с я. Яго любімая пагаворка — «конь — ён таксама чалавек, толькі яго разумець трэба».

Г а л я. Ён за сабой меней глядзіць, чым за сваімі коньмі. Вось зайдзі зараз на канюшню, і ён там будзе. Ходзіць паміж стойлаў і размаўляе з коньмі.

І в а н. А спытай у яго пра каросту, дык што ён скажа? *(Перадражнівае.)* «Каро-оста? Не, гэта не зразумелае слова для маіх коней, чужаземнае, як яго... японскае». *(Смяюцца.)*

Д а б р а т в о р с к і. Ну, то добра, калі так хваліце коней. Але нам усё-ткі прыйдзецца выкарыстоўваць і кароў як цяглавую сілу. І пачынаць трэба нам самім... Прыклад паказаць. Сваіх кароў першымі трэба будзе запра-

гаць. *(Усе маўчаць.)* Інакш нічога не выйдзе... Не вывезем гною, ураджай не павялічым.

Іван. Яно-то так, ды... Новае гэта ў нас... Жанчыны будуць супроць.

Дабратворскі *(падумаўшы)*. Колькі ў нас яшчэ ў зямлянках жывуць?

Галя. Яшчэ... дзевяць сем'яў. Трыццаць шэсць адбудаваліся і сям'і чатыры ўжо лес вывезлі.

Дабратворскі. Можа, мы з гэтага і пачнём. Папросім іх, каб на сваіх каровах дапамаглі лес вывезці для хат, а мы, камсамольцы, прыклад пакажам. Выйдзе так?

Іван. Калі трэба, то трэба! Нам толькі пачаць. Гэтым мы прывучым кароў да працы і дапаможам людзям вылезці з зямлянак. Створым з дзядоў будаўнічую брыгаду і арганізуем перасяленне. А мы тым часам выкінем па саннай дарозе ўвесь гной на поле. Створым звенні высокага ўраджаю, і Галя возьмецца першай. Так?

Галя. Вазьмуся!

Дабратворскі. Ды так, каб не меней як сто пудоў з гектара. Ды такіх звенняў штук шэсць па калгас. А? Выйдзе?

Зося. З вашай дапамогай можа і выйсці.

Галя. Чаму ж не выйдзе?

Дабратворскі. Канешне, выйдзе, чорт забяры! Я ўжо душу палажу на гэта. Выйдзе! Галоўнае толькі — верыць у свае сілы.

Вася. Калі палкаводзец упэўнены ў перамозе, то армія яго смела ідзе ў бой.

Іван. Разумныя словы і ў свой час сказаны.

Дабратворскі *(да Васі)*. У мяне ёсць істотная папраўка да твайго афарызма. Каб бой выйграць, мала таго, каб палкаводзец быў упэўнены ў перамозе. Галоўнае — калі дух арміі адпавядае баявой задачы — вось тады можна з упэўненасцю сказаць, што бой будзе выйграны.

Іван. Але і палкаводзец павінен быць на ўзроўні сваіх задач.

Дабратворскі. Вядома.

Галя *(да Дабратворскага)*. На сваё войска, таварыш палкаводзец, можаце палажыцца. Маральны настрой высокі. Смела можна весці ў бой за ўраджай.

Дабратворскі. Гэта яшчэ не войска, а ўдарная група.

Галя. Нічога, мы правядзём мабілізацыю.

Дабратворскі. Вось таму я і кажу, што нам абавязкова трэба дапамагчы адбудаваць хаты тым, хто жыве ў зямлянках. Гэта дапаможа нашай мабілізацыі.

Іван. Добрая думка. І я пастараюся сагітаваць свайго бацьку, каб ён узяўся скалаціць брыгаду будаўнікоў.

Зося. Твайго бацьку і агітаваць не трэба.

Дабратворскі. Тым лепш. Адным словам — дамовіліся. Прынцыпова дагаварыліся. Галоўнае ёсць,— па вачах бачу, што мы возьмемся і зробім многае за гэты год. Уласна кажучы, я вельмі рады за вас, за тое, што ў мяне такія сябры, на якіх можна спадзявацца. Я думаю, што не памыліўся.

Галя. Пастараемся на справе даказаць.

Іван. Ды ўжо ж... як-небудзь... У гразь тварам не ўдарым.

Дабратворскі. А ведаеце, я даўно ўжо пра гэта марыў... Да вайны яшчэ, калі ў інстытуце вучыўся і нават калі на фронце быў... Закончу інстытут і абавязкова ў калгас, згуртую хлопцаў, дзяўчат, у мяне ўся надзея на моладзь, душу аддам, а калгас зробім узорным. Наладзім усю гаспадарку па апошнім слове навукі і тэхнікі. Апрацуем палі як мага лепей, наладзім севазварот, засадзім сад, ягаднік, развядзём парніковую гаспадарку, рыбную. Зробім калгас мільянерам. І вёску ўсю перакроім нанова, каб была ўся ў зелені, у кветках, не вёска, а райскі сад. Адбудуем цагляны клуб, школу, праўленне, яслі, кароўнікі, канюшні, гумно. Паставім сваю электрастанцыю, свой радыёвузел. Адным словам, адбудуем самае сапраўднае шчасце, за якое ваявалі, за якое многа хто такіх, як мы, загінулі на вайне.

Галя. Вось аб гэтым я таксама марыла. Калі б усё гэта зрабіць, то наша вёска мала чым адрознівалася б ад горада.

Іван. Яно б так і было ўжо, каб не перашкодзіў Гітлер.

Дабратворскі. Нічога. Цяпер нам ніхто не перашкодзіць. Усё наша яшчэ наперадзе, і сваю будучыню мы адбудуем так, як мы аб ёй марылі. А наша будучыня павінна быць прыгожай. Яна ў нашых руках. Так ці не?

Вася. Святая ісціна. Аб гэтым яшчэ Аляксей Максімавіч Горкі казаў: «Будучыня належыць моладзі».

Галя. А Пушкін па гэтаму поваду нічога не сказаў?

Вася. Не ведаю, але павінен быў сказаць.

Зося. Вася, а чаму ты сам чаго-небудзь не ска-

жаш? Каб і твае словы вось так пераказвалі. Ты ж таксама нейкі паэт.

Вася. Я яшчэ скажу свае словы, а вось ты ці скажаш?

Зося. Я ўжо сказала. Я бяруся за парнікі — вось мае і ўсе словы. І к Першаму мая будзем мець гуркі.

Іван. Вось гэта круглае слова! *(Смяюцца.)*

Дабратворскі *(заўважыўшы Якава Ягоравіча, які ўжо даўно стаіць ля дзвярэй)*. Прабачце, Якаў Ягоравіч, мы, можа, перашкаджаем вам рыхтавацца да заняткаў.

Якаў Ягоравіч. Не, не, не! Калі ласка, нічога не перашкаджаеце.

Галя. Наш Якаў Ягоравіч такі добры, што калі б і сапраўды перашкаджалі, то нічога не скажа.

Якаў Ягоравіч. Вось тут ты ўжо крыху маніш. Мала я цябе, страказу, у школе ганяў, калі перашкаджала? І асабліва вось гэтага непаседу. Ох і баламуціў мне клас. *(Паказвае на Васю.)*

Іван. І цяпер спакою не даём.

Якаў Ягоравіч. Не, не. Наадварот. Нават прасіць буду — прыходзьце часцей да мяне. Вельмі рад буду. Вы ўжо прабачце, але я падслухаў усю вашу размову. І, ведаеце, шчыра кажу,— зайздрасць бярэ. Вы не ведаеце, дарагія мае, з якой прыемнасцю слухаў я тое, аб чым вы толькі што гаварылі. Ад усяго сэрца радуюся я, гледзячы на вас... І веру вам. Веру ў вашы сілы, веру ў тое, што ўсе вашы намеры здзейсняцца.

Дабратворскі. Дзякуй і за гэта, Якаў Ягоравіч.

Якаў Ягоравіч. Не, не. Тут дзякуй ні пры чым. Вас трэба дзякаваць... У вас такія высакародныя, добрыя намеры, і вы так горача іх абмяркоўвалі, што нават я, стары вясковы інтэлігент, таксама задумаўся: чым жа мне вам дапамагчы. Гэта ж мае выхаванцы, мае дзеці. Вось ад таго і радасна мне.

Дабратворскі. Няма вышэй пахвалы, Якаў Ягоравіч, чым пахвала свайго старога, добрага настаўніка. Але нас яшчэ няма за што хваліць. Мы яшчэ нічога добрага не зрабілі, акрамя намеру.

Якаў Ягоравіч. Я ўпэўнены, што вы зробіце. Добры намер — гэта ўжо палова справы. А важней за ўсё гэта тое, што я спадзяюся на вас. Вось гэтак жа я спадзяваўся на вас, мае смелыя, мае адважныя, яшчэ ў 1942 годзе, калі немцы былі аж на Волзе. Я верыў, што вы, наша моладзь з вялікай і вольнай душой, з такім разма-

хам высакародных намераў не можаце не выгнаць з Радзімы немцаў. Я верыў таму, што ведаю сваю моладзь больш нават, чым сябе. Вось і зараз я спадзяюся, што вы сваё жыццё зробіце вельмі прыгожым. Для вас яшчэ наперадзе жыццё вельмі многа шчасця нарыхтавала. Вам застаецца толькі адшукаць яго. А шукаць яго трэба ва ўпартай працы. Вось вы марыце... А гэта магчымасць марыць куплена крывёю залатых людзей. Марыць аб прыгожым жыцці — гэта характэрная асаблівасць нашага часу. Марыць і дабівацца ажыццяўлення сваёй мары. Гляджу я на вас, і зайздрасць бярэ. Э-эх, вярнуць бы мне сваю маладосць!

Г а л я. А ў маладосці, Якаў Ягоравіч, вы ж таксама марылі.

Я к а ў Я г о р а в і ч. А як жа?! Марыў, але не так. Я тады многа чаго не разумеў — таго галоўнага, што вы так добра разумееце,— жыццё сваё палепшыць можна толькі гуртам, калектывам.

І в а н. А як жа інакш, Якаў Ягоравіч?

Я к а ў Я г о р а в і ч. А ў мой час мала хто гэта разумеў. Лічылі, што кожны сам сабе будуе шчасце. І я так некалі лічыў. Вось і атрымлівалася, што я ўсю маладосць марыў пра кусок хлеба, марыў аб тым, як бы паступіць у школу, як бы атрымаць хоць якую-небудзь адукацыю, выбіцца ў людзі.

Д а б р а т в о р с к і. Не тое што ў нас — вучыся дзе хочаш.

Я к а ў Я г о р а в і ч. А колькі перашкод стаяла на шляху да гэтай, зусім беднай мары, асабліва для вясковых юнакоў. Вось зараз у нашай вёсцы не знойдзеш амаль ніводнага непісьменнага. А тады гэта ж была нязбытная мара, сон. Дзе там?!. Нават і не марылі аб гэтым.

В а с я. А мы вось марым. Яно так і будзе. У кожнай вёсцы будзе інстытут, свой МХАТ! І недалёка той час...

Г а л я. Вася, прачніся!.. Ты сніш нешта недарэчнае.

В а с я. Чаму недарэчнае? Не верыце, што гэта будзе?

І в а н. Свой інстытут, свой МХАТ?

В а с я. Ну, вядома!

Г а л я. Дзе ж гэта ты набярэшся гэтулькі прафесараў, ды Качалавых, Масквіных, Тарасавых?

Д а б р а т в о р с к і. Ну, гэта ўжо гіпербала, канешне. Крыху загібаеш.

В а с я. Ну вось... А вы, Якаў Ягоравіч, гаварылі, што яны ўмеюць прыгожа марыць.

Якаў Ягоравіч. Марыць трэба не толькі прыгожа, але і рэальна.

Вася. А я таксама пра рэальную рэч кажу... Для таго, каб у кожнай вёсцы быў інстытут, МХАТ, не патрэбна будаваць вялізных памяшканняў, аўдыторый, сцэн, залаў. Не патрэбна мець прафесараў і артыстаў больш, чым іх ёсць. Я змяшчу інстытут і МХАТ вось у гэткую скрыначку... *(усе смяюцца)* у радыёпрыёмнікі! *(Усе змоўклі.)* Чым не рэальна? Напрыклад: на хвалі дваццаць пяць і трыццаць тры сотых метра штодзённа ад шасці да адзінаццаці гадзін вечара працуе літаратурны факультэт Маскоўскага інстытута філасофіі і літаратуры. І я маю магчымасць праслухаць поўны курс лекцый лепшых прафесараў. А Дабратворскі, напрыклад, жадае вучыцца ў Ціміразеўскай акадэміі, а Галя на якім-небудзь гістарычным факультэце. Вось гэтак і МХАТ можа быць. Толькі радыёпрыёмнікі трэба мець.

Якаў Ягоравіч. А Вася сапраўды выказаў разумную і рэальную думку.

Галя. Ды гэта ж не проста Вася, а Вася-Калумб: адкрыў новую Амерыку. Вася, табе плюс!

Зося. Не проста Вася, а Вася з плюсам.

Дабратворскі. Сапраўды Калумб. Для пачатку трэба купіць радыёпрыёмнік. На днях паеду ў раён, абавязкова пастараюся дабыць радыёпрыёмнік. А затым уступім ва Усесаюзны радыёкамітэт з хадайніцтвам аб адкрыцці інстытутаў.

Якаў Ягоравіч. Шчаслівыя вы людзі... У часы маёй маладосці калі б хто выказаў такую думку — інстытут у вёсцы, яго б палічылі за вар'ята. А зараз гэта самая рэальная рэч, і недалёкая. Гледзячы на вас, я і сам маладзейшым станаўлюся. Правільна! Вельмі правільна! Марце! Прыгожа марце, захапляюча! Смела пасягайце на вялікае ў жыцці, і вы свайго даб'ецеся! На вашу долю выпала такое шчасце. Правільна, марце! Савецкія людзі павінны ўмець прыгожа марыць. Але памятайце, што вашы помыслы былі агульнанароднымі помысламі. Памятайце і другое — марыць лёгка, а каб дасягнуць сваёй мэты, патрабуюцца вялікія намаганні, цярпенне і напорыстасць у працы. Не бойцеся цяжкасцей, не адступайце перад імі. Вось вы рашылі перабудаваць сваю вёску. Вельмі добры і высакародны намер. Смела бярыцеся за справу! За вамі з ахвотай пойдуць усе калгаснікі. І памятайце, калі ска-

залі сваё слова, то не адступайце ад яго, не пасуйце, каб не было сорамна пасля, каб вам людзі верылі.

Іван. Камуністы сваё слова заўсёды стрымаюць.

Якаў Ягоравіч. Дык вось будзьце дастойнымі камуністамі.

Дабратворскі. Чуеце, што кажа наш настаўнік?

Галя. Не толькі чуем, але і слухаемся.

Дабратворскі. Ну, дык возьмемся за справу?

Іван. Вядома.

Галя. Канешне!

Вася. Заўсёды гатовы!

Дабратворскі. Мы, як піянеры.

Якаў Ягоравіч. Піянеры аднаўлення нашай вёскі. Бярыцеся! І я са сваімі піянерамі і школьнікамі дапамагу вам. Я абяцаю вам сабраць у вёсцы да апошняга грама попелу, курынага памёту. А вясной дапамагу садзіць сад, азеляніць вёску. І пры ўборцы не падкачаем. А я ўжо сваё слова стрымаю, можаце спадзявацца.

Дабратворскі. Будзем спадзявацца не толькі на вашу падтрымку і дапамогу, але і на ваш аўтарытэт у вёсцы.

Якаў Ягоравіч. Калі ласка, калі ласка. Я заўсёды з вамі.

Галя *(паглядзеўшы на гадзіннік)*. Ой! Ужо дванаццаць гадзін! Як хутка вечар праляцеў!

Іван. Ну, сябры, пара і сумленне мець. Да паўночы людзям спакою не даём. Пара і чэсць ведаць.

Галя. Дык дамовіліся? Заўтра збяромся ў праўленні.

Вася. На гістарычную нараду, каб начарціць грандыёзны план перабудовы вёскі.

Галя, Вася, Зося і Іван збіраюцца выходзіць.

Іван. Выбачайце, Якаў Ягоравіч, за турботы.

Якаў Ягоравіч. Нічога, нічога, заходзьце, калі ласка, часцей. І мне весялей будзе. Вось пастараемся з Аляксеем, купім прыёмнік, Маскву слухаць будзем.

Галя. Добрай ночы!

Вася. Прыемнага адпачынку!

Якаў Ягоравіч. Усяго добрага, усяго добрага!

Галя, Іван, Зося, Вася выходзяць.

Дабратворскі. А добрыя хлопцы?!

Якаў Ягоравіч. І хлопцы добрыя і дзяўчаты нядрэнныя.

Дабратворскі. На іх можна спадзявацца.

Якаў Ягоравіч. Трэба спадзявацца. Бачыш, з якім настроем яны пайшлі. Галоўнае — падтрымаць гэты настрой. А лепшым сродкам для гэтага — першыя перамогі на шляху да мэты. Хай сабе самыя маленькія, але перамогі. Нішто так не ўсяляе ўпэўненасць у сваіх сілах, як першыя поспехі. Ты гэта памятай, Аляксей.

Дабратворскі. Што ж, паспрабуем дабіцца першых поспехаў.

Заслона.

КАРЦІНА ЧАЦВЕРТАЯ

Месца дзеі — канцылярыя праўлення калгаса. На пасяджэнні праўлення калгаса ўдзельнічаюць Азохаў, рахункавод, Кузьма, Захар, Галя, Іван, Дабратворскі, Пракоп. Ходзікі паказваюць палову другой гадзіны ночы. Абмеркаванне плана аднаўлення калгаса і пастановы лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) заканчваецца бурнымі спрэчкамі.

Рахункавод. Як сабе хочаце, а з вялікага грому ды малы дождж бывае.

Кузьма. Канечне, калі так грымець, як ты, насўшыся бульбы і седзячы вось тут на крэсле.

Захар. Дык ад гэтага грому ні дажджу, ні пагоды.

Кузьма. Адзін смурод толькі.

Усе дружна смяюцца.

Азохаў *(спыняе шум)*. Таварышы! Таварышы! Што за гармідар?! Гэта ўжо не спрэчкі, а сварка. Як на кірмашы. Трэба ж і парадак ведаць. Пара канчаць. Ужо другія пеўні спяваюць, а мы ніяк не дагаворымся. Дакуль жа крычаць будзем?

Кузьма. Чаго ж ён у пузыр лезе, чаго ён супроць?

Рахункавод. Таму, што такі аб'ём работ нам не па сіле. А пісаць планы ды не выконваць іх, дык гэта пустая справа.

Кузьма. Як гэта, не выконваць?

Захар. Во, во! Чаму не выконваць?

Рахункавод. А таму, што гэта нам не па сіле!

Кузьма. Ну, у мяне цярпенне ўжо лопаецца. Хай бы хто казаў, ён, ці не ён, ці вось яны. А чаму табе не пад

сілу? У канцылярыі сядзець ды костачкамі шчоўкаць не пад сілу? А? Працаваць жа мы будзем, выконваць мы будзем? *(Маладыя апладзіруюць. Галасы: «Правільна!»)*

Рахункавод. Яшчэ рана пляскаць.

Азохаў. Ну, хопіць, таварышы! Я стаўлю на галасаванне.

Пракоп. Пачакайце галасаваць. Усё-ткі над гэтым трэба падумаць.

Азохаў. Дык колькі ж можна думаць?

Пракоп. А гэта ні з сяго ні з таго не робіцца.

Азохаў. Ну выказвай сваю думку... *(Усе сціхаюць.)*

Пракоп. Канечне, яно трэба, каб зямля не пуставала, трэба засяваць, на тое яна за намі і замацавана. Я, напрыклад, згодзен, што нам патрэбны і канюшня цагляная, і кароўнікі, і гумно, і канцы канцоў ляктрычнасць — гэта мы гады за тры зробім. Я згодзен, што і сад мы зможам пасадзіць восенню. Правільна, сад нам во як трэба, гэта — грошы нашы. За гэта аграном наш вэн як праў.

Іван. А за што не праў?

Пракоп. Яно, канешне, усякую справу кожны сам па-свойму разумее. А гэта справа агульная, і адолець яе трэба ўсім кагалам. А для гэтага трэба, каб і разумелі яе ўсе аднолькава.

Кузьма. Ты карацей!

Пракоп. Куды ўжо карацей? Там дзе коратка, там і рвецца. А коратка ў нас з цяглавай сілай. З гэтай сілай мы не адолеем даваенных абшараў. Вось у гэтым я і падтрымліваю рахункавода. Даваенную пасяўную плошчу ў гэтым годзе мы не асілім. Няма коней! Цягла няма, і што прыбавіцца іх да вясны, нечага і спадзявацца.

Іван. Цяжкасцей не трэба баяцца!

Захар. Во, во! Ваўкоў баяцца — у лес не хадзіць!

Азохаў. А што ты прапаноўваеш?

Пракоп. Я думаю, што лепей нам засеяць той план, што ў райза давялі. Зробім хоць гэта, і то добра. Як кажуць: цішэй едзеш — далей будзеш.

Дабратворскі. Дазвольце!

Азохаў. Гавары.

Дабратворскі. Я ў корні не згодзен з гэтай гаворкай і з вашымі довадамі, таварыш брыгадзір. Няправільна! Вы не ўлічваеце палову нашых магчымасцей і не ўлічваеце галоўнага. Мы толькі што прачыталі пастанову лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б). Там ясна сказана. Партыя зараз ад нас патрабуе выкарыстаць усё, усе

нашы магчымасці і асвоіць даваенную пасяўную плошчу. Гэта наша баявая задача! План, даведзены нам райза, не можа быць для нас граніцай. Гэта план — мінімум. У нас ёсць шмат магчымасцей асвоіць значна большую плошчу. Я ўжо аб іх гаварыў, але іх у спрэчках абходзяць і рахункавод і брыгадзір. Яшчэ раз напамінаю. Першае: паколькі партыя зараз асаблівую ўвагу звярнула на сельскую гаспадарку, то трэба чакаць, што мы ў гэтым годзе атрымаем значную колькасць сельскагаспадарчых машын — і трактароў, і сеялак, і жняярак, і малатарак.

Рахункавод. На гэта яшчэ нельга спадзявацца.

Кузьма. А на каго ж тады спадзявацца, калі не на партыю. На цябе, ці што?

Рахункавод. Я пра партыю нічога не кажу. Гарады нашы разбураны, заводы ды фабрыкі. Хто ж нам дасць гэтыя машыны?

Дабратворскі. Таксама няправільна! Ніхто не скажа, што наша армія ў час вайны адчувала недахоп у машынах, танках, гарматах, самалётах. Значыць, былі заводы, якія забяспечвалі армію. А зараз гэтыя заводы выпускаюць не танкі, самалёты і гарматы, а трактары, камбайны, сеялкі. Яны працуюць не для вайны, а для нас, для калгасаў. Значыць, ёсць у нас дзе і каму выпускаць машыны. На нашу прамысловасць можна спадзявацца так, як і на нашу партыю. *(Усе маўчаць.)* Другая магчымасць — выкарыстаць кароў як цяглавую сілу. Вось аб гэтым і трэба пагаварыць.

Рахункавод. Ну, з каровамі ў нас нічога не выйдзе.

Дабратворскі. Чаму не выйдзе?

Пракоп. Таму, што бабы такі гвалт падымуць за кароў, што і сам не рад будзеш.

Іван. Але ж на хаты лес возім на каровах, і бабы гвалту не падымаюць.

Рахункавод. Дык гэта сабе.

Кузьма. А гэта каму?

Пракоп. Вось паспрабуйце з імі пагаварыць. Яны табе і ў роце падрапаюць.

Малання. Што ты на баб ківаеш? Ты пра сябе скажы. Што ты думаеш, што бабы дурней за цябе, не зразумеюць?

Пракоп. Не ўсе ж бабы такія, як ты.

Малання. І не ўсе бабы такія, як ты! *(Смех.)*

Захар. Во, во! Так, так яму!

Маланння. Ты, мусіць, сам не хочаш сваю карову запрагаць, а ківаеш на баб. А я скажу прама — калі ты, ды ўсе праўленцы, ды сам старшыня першымі прыклад пакажуць, дык і другія запрагуць кароў. Я за сваю брыгаду ручаюся. Сваіх баб сагітую і табе нос падатру.

Захар. Спадніцай.

Рахункавод. Не пераскочыўшы, не кажы гоп.

Маланння. Мне і скакаць не трэба.

Пракоп. Гэта яшчэ пабачым, хто каму падатрэ. Можа, і штанамі прыйдзецца падціраць.

Галя. У нас дваццаць камсамольцаў, якія першымі запрагуць кароў.

Дабратворскі. Вось і цягло знойдзецца.

Азохаў. Дык што, галасаваць будзем? Я думаю ў рашэнні так запісаць: план, што аграном напісаў, зацвердзіць, а членам праўлення, брыгадзірам і ўсяму актыву ў першую чаргу прывучыць сваіх кароў да працы. Галасую: хто за такую прапанову — прашу падняць рукі. *(Усе галасуюць. Рахункавод і брыгадзір неахвотна паднімаюць рукі.)* Аднагалосна.

Рахункавод. Баюся, што нічога ў нас не выйдзе.

Дабратворскі. Вы баяліся, што з парнікамі ў нас нічога не выйдзе. Але ж выйшла?!

Рахункавод. Гэта яшчэ пабачым.

Дабратворскі. Давайце так дамовімся: на Першае мая ваша паўлітра, а мае агурочкі на закуску. Так?

Кузьма. Пашкадуе.

Азохаў. Ну, таварышы, пара разыходзіцца.

Некаторыя выходзяць, некаторыя на дарогу закурваюць.

Рахункавод. Баюся, што не выйдзе ў нас парадку. Рана на вялікі кавалак паквапіліся.

Кузьма. Ты хоць бы ў сябе парадак навёў, а то не канцылярыя, а канюшня.

Захар. Кузьма! Ты крыўдзіш маіх коней!

Дабратворскі. Трэба будзе камсамолу ўзяць шэфства. Чуеш, Галя?

Іван. Парадак наводзіць трэба з галавы.

Кузьма. Ну, пойдзем, Захар, дадому. Заўтра рана ў лес трэба будзе ехаць.

Захар. Не, братка, ты ўжо ідзі. Я яшчэ на канюшню зайду. Трэба, як яго... паглядзець, як яно...

Кузьма. Ну, дык я пайшоў.

Усе выходзяць, застаюцца Азохаў, Дабратворскі, Іван, Галя, Захар.

Д а б р а т в о р с к і. Ну, дзядзька Захар, цяпер на вас уся падзея.

З а х а р. Як гэта?

Д а б р а т в о р с к і. На вашых коней. Трэба, каб на вясну ўсе коні выйшлі цягучымі. Нагрузка будзе не малой.

З а х а р. Коні пакуль што на мяне не крыўдзяцца. Ды трэба, братка, памятаць, што плугі ды бароны не коні будуць цягаць.

Д а б р а т в о р с к і. А хто?

І в а н. Дзядзька Захар на кароў спадзяецца.

З а х а р. Не, не, не! Авёс будзе цягаць плугі ды бароны. Пра гэта ўжо хай старшыня думае.

А з о х а ў. Гэта другая справа.

Д а б р а т в о р с к і. Гэта таксама не другая справа. Каня трэба будзе падтрымліваць аўсом. Энзэ неабходна.

З а х а р. Во, во... Конь, братка, ён таксама тварэц нашага шчасця. Няма каня — няма шчасця. Мець добрага каня — значыць быць багатым. Не праўду я кажу? Во, во... Яго шанаваць трэба, ну, ды добрай ночы, я пайшоў.

А з о х а ў. Пойдзем разам.

Выходзяць А з о х а ў і З а х а р.

Д а б р а т в о р с к і. Цяпер закасвайце рукавы. Працы будзе ўдосталь.

Г а л я. Мы працы не баімся.

Д а б р а т в о р с к і. Чарговая наша баявая задача — распрапагандзіраваць наш план сярод калгаснікаў. *(Да Галі.)* Заўтра збірай камсамольскі сход.

Г а л я. Добра.

Д а б р а т в о р с к і *(да Галі)*. Дазвольце сёння быць вашым кавалерам? Правяду вас да самай хаты.

І в а н. Толькі сёння?

Д а б р а т в о р с к і. Чаму ты за другіх пытаеш? Праўда, Галя?

Г а л я. І так і гэтак праўда.

Заслона.

КАРЦІНА ПЯТАЯ

Дзея адбываецца на полі ў разгар пасяўной кампаніі. Злева направа праходзіць дарога. У глыбіні сцэны крыху правей стаіць разгалістая груша, а крыху лявей ляжыць разварочаны, заржа-

велы нямецкі танк, які нагадвае пра ндаўпюю ваенную навальніцу. Ад дарогі далёка, аж да самага лесу зелянее прыгожая рунь. З левага боку то прыбліжаецца, то аддаляецца роўны рокат трактара. Недзе ў полі перэклікаюцца звонкімі песнямі дзяўчаты. Вясна.

Злева выбягае Галя.

Галя. Вася! Вася! Адну хвілінку. Пачакай! Ідзі сюды.

Уваходзіць Вася, босы, з пугай у руцэ. Штаны падкасаны амаль да каленяў.

Вася. Слухаю, мая прынцэса. Служыць вам я заўсёды рад.

Галя. Ды кінь ты... Вася, золатка, вельмі прашу, адвязі гэты воз на мой участак, крыху не хапіла.

Вася. Я ж адзін воз завёз...

Галя. І яшчэ адзін, не хапіла.

Вася. Там вязуць два вазы на твой участак.

Галя. Ведаю, ды не хопіць. Калі б ты свой адвёз — якраз бы хапіла, цюцелька ў цюцельку.

Вася. Феня ўбачыць, лаяцца будзе. Я і так адзін воз украў ад яе.

Галя. Не будзе лаяцца, яна ж цябе любіць.

Вася. А ты?

Галя. Калі адвязеш мне, і я буду. *(Вася глядзіць на яе: верыць ёй ці не верыць.)*

Вася *(рашуча)*. Не! Працаваць у адным звяне, а старацца для другога? Не! *(Хоча ісці.)*

Галя *(вельмі ласкава)*. Вася, золатка! Ну!..

Вася спыняецца.

Вася. Пацалуй!

Галя. Ну, што ты!

Вася. А-а-а!.. *(Хоча ісці.)*

Галя. Сярод белага дня, на полі, пры людзях? Ну, што ты, Вася!

Вася. А вечарам пацалуеш?

Галя *(сарамліва)*. Пацалую.

Вася. Эх, так таму і быць, вязу!

Для мілой не пашкадую,
Нават гною воз аддам,
Раз сказала пацалую,
Вінаватым буду сам.
(Выходзіць.)

Г а л я *(усміхаецца).* Пацалую... калі курыца заіржэ... Малайчына, завярнуў. Значыць, сёння закончым.

Здалёку чуваць голас Фені: «Стой! Стой! Куды павёз? Назад, кажу!» Голас Васі: «Тпрру, Пегас! Стой! Быць грому».

Г а л я. Высачыла... падыме гвалт.

За сцэнай галасы. Феня: «Куды вязеш? Не, болей цярпець не буду! Хопіць! Дык ты толькі лічышся ў маім звяне, а спаборнічаць дапамагаеш камусьці?! Здраднік!»

В а с я. Фенечка, душачка! Якая ж тут здрада! Гэта ж дапамога адстаючым, брацкая дапамога.

Ф е н я. Адстаючым? Яна сёння хоча закончыць, а нам яшчэ два дні трэба.

В а с я. Фенечка, ну чаго ж ты злуеш? Ну, папрасіла яна... Усё-ткі яна сакратар наш.

Ф е н я. А-ах! Папрасіла?! Сакратар?! Дзе яна?

Уваходзіць **Ф е н я**, а за ёю і **В а с я**.

Ф е н я. Дык гэта так спаборнічаюць? Рада, што ён каля цябе ўецца, дык ты гной ад мяне перакрадаеш? Дык ты гэтак хочаш ордэн заслужыць? Гэта па-камсамольску? Абы на тваім участку ўраджай быў, а на другіх хоць і трава не расці?!

Г а л я. Феня! Пачакай!..

Ф е н я. Што Феня, што пачакай?!

Г а л я. Ды паслухай ты...

Ф е н я. І слухаць не жадаю. Мала таго што табе аграном болей пасабляе, дык ты яшчэ і гной красці?

Г а л я. Ды паслухай ты!.. Я проста пазычыць хацела возік гною...

Ф е н я. Пазычыць? Зыкі яшчэ не лятаюць. Старшыні буду скардзіцца, калі ты так робіш!

В а с я. Фенечка, душачка! Ды супакойся ты. Я табе яшчэ тры прывязу, лішніх.

Ф е н я. Не трэба мне лішніх. Па закону трэба. *(Да Галі.)* Для майго звяна брыгадзір каня даў, а ты пад свой бок цягнеш?

В а с я. Фенечка! Будзь ласкава! Ды зразумей ты. Яна ж не для сябе, а для агульнай справы, для калгаса.

Ф е н я. А я што, пад спадніцу сабе бяру?

В а с я. Фенечка, душачка... *(Далікатна бярэ яе за плечы, яна і сціхае.)* Супакойся.

Уваходзяць **З о с я** і **Д а б р а т в о р с к і**.

Дабратворскі. Што гэта за скандал у вас?

Феня. А што ж яны...

Галя *(перабівае)*. Ніякага скандалу няма. Было маленькае непаразуменне ды...

Феня. Ага! Добрае непаразуменне! Дык гэта непаразуменне? Брыгадзір для майго звяна...

Вася *(перабівае)*. Фенечка! Ай, Феня! Ну мы ж дамовіліся. Поўны парадак, таварыш аграном.

Дабратворскі. Ну, калі памірыліся, то пачастуй іх, Зося, ураджаем са сваіх парнікоў.

Зося з газетнага кулька падае ўсім па агурку.

Галя. Ой, Зоська! Ах ты, нягодніца, і ты дагэтуль маўчала?

Зося. Сюрпрыз.

Дабратворскі. Гэта першы наш сур'ёзны поспех, сябры!

Вася. І багата іх нарасло?

Дабратворскі. К Першаму мая машыну адправім у горад.

Вася. Ну-у! Сцеражыся цяпер, кожны вечар буду лазіць.

Зося. Хочаш быць інвалідам, лезь.

Дабратворскі. Яна сваё слова стрымала. К Першаму мая парнікі даюць гуркі. Цяпер справа за вамі, стрымаць сваё слова.

Галя. Не адстанем і мы.

Дабратворскі. Гэта пакуль што словы, быў на вашым участку, пшаніца не зусім добра заскароджана, трэба яшчэ ў адзін след прайсціся.

Галя. Ды мы ж ужо...

Дабратворскі. Не, не, не! Яшчэ адзін след трэба.

Феня. А на маім участку як?

Дабратворскі. Зараз пойдзем, паглядзім.

Феня. А то вы на яе ўчастак штосьці часцей заглядаеце.

Дабратворскі *(пачырванеў)*. Ну што вы, Феня... *(Кароткая паўза. Для Васі гэта навіна.)* Пойдзем на ваш участак.

Выходзяць Дабратворскі, Феня і Вася.

Зося. Дык гэта праўда, Галя?

Галя *(задуменна)*. Калі б гэта праўда была!..

Зося. А што?

Г а л я *(круціць галавою, уздыхае).* Зоська... Не ведаю, што і сказаць...

З о с я. Э-э-э... Дык ты і ад мяне скры-ыва-аеш? Значыць, нешта нейкае ёсць!

Г а л я. Зосечка! Баюся прызнацца.

З о с я. Усё зразумела! Значыць, кахаеш.

Г а л я. Т-с-с! Не крычы!

З о с я. Чаго ты баішся?

Г а л я. Я не баюся, ды... Зося, скажы, а ён добры, вельмі добры і разумны, і... Ну... Я не ўмею пра гэта расказаць...

З о с я. Я разумею.

Г а л я. Ну?

З о с я. Не зусім добры і не зусім разумны.

Галя здзіўлена глядзіць на Зосю.

Так, так. Калі ён не заўважыў, што ты яго кахаеш, то ён ужо не разумны. А калі заўважыў і нічога не сказаў, то, канечне, не добры.

Г а л я. Ты не жартуй. Я сур'ёзна.

З о с я. Я не жартую.

Г а л я. Я табе скажу. Толькі табе... Толькі ты дай чэснае камсамольскае, што ты ніколі, нікому...

З о с я. Нічога, ніякага...

Г а л я. Зося!

З о с я. Ну, ну, я слухаю.

Г а л я. ...не раскажаш.

З о с я. Нават Івану.

Г а л я. Не, не, не! Яны ж з Іванам сябруюць.

З о с я. Чэснае камсамольскае!

Г а л я *(уздыхнула).* Так, я яго кахаю. Так яго кахаю, што, здаецца, усё адгэтуль вырвала б і нават сэрца, каб змясціць сюды яго, усяго, да кропелькі, каб ён быў мой, толькі мой, увесь да кропелькі. Мне нават сорамна табе аб гэтым гаварыць.

З о с я. Нічога, нічога, ты гавары, на сэрцы лягчэй стане.

Г а л я. Я ўжо сказала.

З о с я. Я не ведала, што ты такая прагная.

Г а л я. Я?.. Так, я вельмі прагная.

З о с я. Трэба ж, каб хоць крыху яго засталося і для нас, для калгаса.

Г а л я. Не, не крыху. Хай увесь, увесь для калгаса, толькі разам са мной.

З о с я. І даўно гэта з табой здарылася?

Г а л я *(хвіліну памаўчала)*. З таго вечара, калі мы былі ў Якава Ягоравіча, калі мы марылі пра нашу вёску.

З о с я. І ты да гэтых пор нічога мне не сказала? А яшчэ сяброўка! *(Галя маўчыць.)* Гэта ўсё твая ганарлівасць. Глядзі, а то вылезе яна ў цябе бокам. І ты з ім яшчэ не гаварыла?

Г а л я. Што ты, Зося! Ён нічога аб гэтым не ведае і ведаць не павінен.

З о с я. Як гэта не павінен?

Г а л я. Не, не, не, не!

З о с я. Чаму так?

Г а л я. Калі ён мяне пакахае, тады я яму сама скажу, усё скажу, лепш чым табе... А калі не пакахае... то... хай і не ведае. Так будзе лепей.

З о с я. Якім ён дурнем будзе, калі цябе не пакахае! Не, ён павінен цябе пакахаць.

Г а л я. Чаму ты так думаеш?

З о с я. Калі б я была хлопцам, я б абавязкова толькі цябе пакахала.

Г а л я *(цалуе Зосю)*. Якая ты добрая. Ведаеш, Зося, мне здаецца, што лепшага хлопца, чым ён, і ва ўсім свеце няма.

З о с я. Калі любіш, дык яно заўсёды так.

Г а л я. Другі раз сама сябе пытаю: за што я яго так люблю? І сама не ведаю, за што, і сама не скажу, за што. За ўсё! Усё ў ім толькі добрае.

З о с я. Калі любіш, дык яно заўсёды так.

Г а л я. Мне здаецца, што ён ходзіць і думае: што ж гэта я добрае яшчэ не зрабіў для людзей? Тое, што мог зрабіць, а не зрабіў?.. Ён толькі і жыве гэтым. Ты вось глядзі, як прыехаў ён да нас, усё па-новаму пайшло ў калгасе.

З о с я. Можа, ты яго за гэта і пакахала?

Г а л я. Можа, і за гэта... ды не толькі за гэта.

З о с я. Няўжо ён нічога не адчувае, не заўважае?

Г а л я. Не, Зоська. Калі я з ім сустракаюся, каб не падаць віду, не выдаць, наўмысля раблюся нібы злой, сярдзітай.

З о с я. Ну, а ён?

Г а л я. Ён? Таксама афіцыяльны. Толькі бывае, калі пачне марыць, услых, тады я адчуваю сябе зусім побач з

ім, і глядзіць на мяне вельмі ласкава. А потым зноў робіцца нейкім афіцыяльным, чужым.

Паўза.

Зося. Не ведаю, што табе параіць. Толькі трэба штосьці рабіць.

Паўза.

Галя. Што ж мы стаім? Загаварыліся... рабіць жа трэба.

Зося. Ужо абедзенны перапынак.

Галя. Не, не! Рабіць!

Пры выхадзе сустракаюцца з дзядзькам Захарам. Ён вітаецца яшчэ з-за сцэны.

Захар. Добры дзянёк, дзяўчаткі. Палуднаваць сабраліся?

Галя і Зося. Добры дзень, дзядзька Захар!

Галя. Мне ўжо сорамна з вамі сустракацца, дзядзька Захар.

Захар. Чаму так?

Галя. Ды ўсё неяк так атрымліваецца — калі толькі з вамі не сустрэнемся, дык вы першым вітаецеся.

Захар. Э-э... Хе-хе-хе... Родненькая. Яно... гэта... як яго... разумець трэба, дочка. Я хачу, каб ад мяне ўсім прыемна было, і старому і маладому. Чалавек для таго і жыве, каб людзям прыемнае рабіць. А чым не прыемна пажадаць чалавеку добрага здароўя? Яно... як яго... Я і сам па сабе ведаю,— калі і мне хто добрае слова скажа, дык на душы весялей і радасней. Яно і людзі дружней, калі адзін другога вітаюць. Тады, як яго... і калектыў атрымліваецца. Хе-хе... А я думаў, што чым-небудзь правінілася. Ну, ну, ідзіце, дзяўчаткі, палуднаваць.

Галя і Зося выходзяць. Захар, паглядаючы ім услед, усміхаецца. Потым садзіцца пад грушай і закурвае.

Захар *(заўважыўшы падыходзячага настаўніка)*. А-а-а! Якаў Ягоравіч! Добры дзянёк вам!

Уваходзіць Якаў Ягоравіч з клункам пад пахай.

Якаў Ягоравіч. Добры дзень, Захар. Адпачываем?

Захар. Ды вось прысеў закурыць. Сядайце.

Якаў Ягоравіч. Мне трэба б было Дабратворскага знайсці.

Захар. Агранома нашага? Ды ён скора сам тут будзе.

Якаў Ягоравіч *(прысаджваецца)*. Які дрэнны хлопец!

Захар. Хто, аграном?

Якаў Ягоравіч. Як устане зранку, як пойдзе, дык без абеду, не еўшы, да позняга вечара не прыходзіць дадому. Саромеецца ён, ці што...

Захар. Ды яму такі і некалі. Пакуль усё поле абшастае, аббегае ўсе брыгады ды дагледзіць сам, павучыць ды падкажа, а то і заставіць перарабіць,— вось дзень і пройдзе неўзаметку. У чалавека душа баліць за справу.

Якаў Ягоравіч. Але ж нельга быць штодня без абеду. Гэта ўжо занадта.

Захар. Нічога, ён малады, вытрымае.

Якаў Ягоравіч. І на маладога мала падобен. Да дзяўчат нікуды не ходзіць. Сядзіць вечарамі дома, то чытае, то штосьці піша.

Захар. Э-э... абатрэцца. Яно, як яго... Пакуль прывыкне да нашых дзяўчат. *(Паўза.)* Ды вось ён і сам ідзе, і шукаць не трэба.

Якаў Ягоравіч. А-а, ідзі-ка, ідзі сюды!

Уваходзяць Дабратворскі з Іванам.

Дабратворскі. І вы да нас на поле, Якаў Ягоравіч?

Якаў Ягоравіч. Ды вось распусціў сваіх птушанят са школы і выйшаў сюды паглядзець, як тут у вас.

Дабратворскі. Паглядзіце, паглядзіце, Якаў Ягоравіч, можа, заўвагі якія будуць.

Якаў Ягоравіч. Заўвага ўжо ёсць. Ты што ж гэта, малады чалавек, цэлы тыдзень на абед не прыходзіш?

Дабратворскі. Апетыту штосьці няма.

Якаў Ягоравіч. Не гадзіцца так, не гадзіцца. На вось перакусі, ды болей каб так не рабіў. Прыходзіць трэба на абед. А мы вось па полі пройдзем, паглядзім. *(Перадае клунак.)*

Дабратворскі. Ну, што вы, Якаў Ягоравіч!

Якаў Ягоравіч. Ну, ну, ну!.. Пойдзем, Захар.

Якаў Ягоравіч і Захар выходзяць.

Іван. Глядзі, як ён цябе любіць.

Дабратворскі. Якаў Ягоравіч — гэта не чалавек, а крыніца дабраты. *(Разварачвае пакунак.)* О-о! Ды тут, брат, цэлая пасха. Памажы ліквідаваць, Іван.

Іван. Не, дзякую, я ўжо разам з цесцем перахваціў.

Дабратворскі. Калі ты ўжо канчаткова парадніўся? Вяселле скора спраўляць думаеш?

Іван. Закончым сяўбу, і думаю справіць.

Дабратворскі. Давай, давай. Эх, і пагуляем, Іван!

Іван. Дакуль жа ты манахам будзеш хадзіць? Няўжо табе ніводная дзяўчына наша не падабаецца? Ці, можа, дзе-небудзь у другім баку занозу маеш? *(Дабратворскі ўсміхаецца.)*

Дабратворскі. Не, не ўгадаў.

Іван. Што, нідзе нікога няма? Не веру.

Дабратворскі. Я, брат, сёння заўвагу атрымаў. Ад Фені. «Ты,— кажа,— часцей заглядаеш на ўчастак Галі».

Іван. А заўвага справядлівая?

Дабратворскі. Як табе сказаць?.. Мне здавалася, што для другіх гэта непрыкметна.

Іван. Для другіх? А для сябе?

Дабратворскі. Прызнаюся — грэшны.

Іван. Ну што ж, дзяўчына добрая, жадаю шчасця, шчыра...

Дабратворскі. Не, нічога, відаць, не будзе.

Іван. Што так?

Дабратворскі. Была і другая заўвага. Вася катэгарычна заявіў: «Раўнівы, як Атэла, не станавіцеся поперак дарогі, суровай бойцеся адплаты!» *(Іван смяецца.)*

Іван. І ты, канешне, уступіў яму дарогу? Дзівак! У каханні ўсе эгаісты, і таму трэба памятаць: «Калі шчасце ляжыць на шляху, то не праходзьце міма».

Дабратворскі. Гэта правіла я бяру пад сумненне.

Іван. А дарэмна. Глядзі, хлопча, праваронііш.

Дабратворскі. Маё ад мяне не ўцячэ.

Іван. Усяк бывае. Хаця Галя глядзіць на Васеў флірт, як на жарт.

Дабратворскі. Затое Вася мае вельмі сур'ёзныя намеры. Сёння сам прызнаўся. Відаць, хацеў папярэдзіць мяне.

Іван. Што табе Вася, ты лепш праведай, якія намеры ў Галі.

Дабратворскі. Няма ўпэўненасці ў поспеху. Не вязе мне ў любоўных справах.

Іван. Скуль ты гэта ўзяў?

Дабратворскі. Прыходзілася... І ведаеш, горш за ўсякую абразу, крыўду — гэта расчараванне чалавекам, якога любіў ад шчырага сэрца, да забыцця, якога богатварыў, слепа богатварыў... *(Уздыхнуў.)* Вельмі непрыемная штука расчараванне... Доўгі час пасля адчуваеш сябе: нібы плюнулі табе ў твар дэманстратыўна, пры людзях, нізашто... Да болю крыўдна і... Гэтую хваробу мне давялося перанесці.

Іван. І што гэта за асоба была?

У глыбіні сцэны з'яўляецца Азохаў. Зняўшы шапку, ён стаіць моўчкі, засмучоны.

Дабратворскі. Знешне вельмі сімпатычная асоба. А па зместу аказалася «культуртрэгерам» мяшчанства, закаранелага, эгаістычнага мяшчанства, паразітычнага мяшчанства. Э-э, ды ну яе к чорту, няма пра што гаварыць. Вось табе пашанцавала — вельмі добрая дзяўчына Зося. Ведаеш, яна яшчэ бярэцца са сваімі бабулькамі апрацаваць гектар бульбы так, каб не меней трох тысяч пудоў ураджай зняць.

Іван *(задаволена)*. Хай бярэцца. У парніках зараз, уласна кажучы, няма чаго рабіць.

Дабратворскі. Трэба толькі мінеральных угнаенняў падвезці са станцыі.

Іван. Пад бульбу? Гэта ўжо я дапамагу.

Дабратворскі *(заўважыўшы Азохава, ціха)*. Я даўно ўжо прыкмячаю, нешта старшыня наш часценька прыходзіць сюды і падоўгу стаіць засмучоны, нібы на могільніку. Ты ведаеш, што за прычына?

Іван. Сказаць па праўдзе, хто яго ведае.

Паўза. Абодва моўчкі назіраюць за Азохавым.

Ну, я пайду. Пагамані з ім сам.

Іван выходзіць, Дабратворскі падыходзіць да Азохава.

Дабратворскі. Чым так засмучоны, Фёдар Паўлавіч? На гэтыя ўсходы гледзячы, радавацца трэба, а вы сумуеце. *(Азохаў маўчыць.)* Ці здарылася што?

Азохаў *(крыху памаўчаўшы)*. Здарылася... Вось на гэтым полі, каля гэтай грушы расстралялі нашых... Трыццаць восем чалавек. *(Уздыхае.)* Вось гэта поле паліта іх крывёю. Эх, дзеткі мае, дзеткі... Не магу я, братка, глядзець на гэта поле. Усю сям'ю я тут страціў — дваіх дзяцей і жонку. Як прыйду сюды, і рукі апускаюцца, і работа

з рук валіцца, і нішто мяне тады не цікавіць, нічога не хочацца... *(Цяжка ўздыхае, амаль стогне.)* Дзеткі мае мілыя, мучанікі нявінныя, за што ён вас, гадзюка, загубіў?.. За што?! Палову жыцця свайго я тут страціў, а ты кажаш, радавацца... Застануся адзін, як пень... абгарэлы.

Дабратворскі. Як жа гэта здарылася?

Азохаў. Не ведаеш, як немцы робяць? Мяне тут не было, але людзі добрыя расказалі. Нямецкі грузавік на міне падарваўся, вось яны акружылі вёску, і трыццаць восем чалавек як не было.

Дабратворскі. Разумею тваю трагедыю. Няшчасце непаправімае. Вось гэтак жа і я застаўся без родзічаў, і маю маці загубілі.

Азохаў. Ды ці толькі тваю?

Дабратворскі. А хіба яшчэ дзе былі такія жорсткія расправы?

Азохаў *(здзіўлена глядзіць на Дабратворскага)*. Зямля стогне ад нявінных ахвяр, мне да гэтых пор сніцца Майданак, а ты пытаеш, ці было яшчэ дзе. Ты што, з неба зваліўся? Нічога не чуў, не бачыў? Ты — франтавік.

Дабратворскі. Не, Фёдар Паўлавіч, не з неба зваліўся. І чуў, і сваімі вачыма бачыў і цалкам спаленыя вёскі, і зруйнаваныя гарады. Бачыў і ямы, перапоўненыя сотнямі трупаў. Бачыў загубленых дзяцей і Майданак таксама бачыў. Я сам быў сведкам гэтага нябачанага народнага гора, вялікай трагедыі, дзе і наша ўласная трагедыя толькі маленькая кропля ў моры... І чуў, і бачыў, і ведаю, што вайна ўнесла мільёны людзей, дзесяткам мільёнаў прычыніла цяжкія страты. Толькі вось не чуў я і не бачыў, каб застаўшыяся ў жывых гэтак падалі духам, апускалі рукі. Ты агляніся наўкола, прыглядзіся! Такіх жа, як мы, страціўшых дарагіх і блізкіх, мільёны. Яны не падаюць духам, не апускаюць рукі. А што ты думаеш, ім не шкада гэтых ахвяр? Шкада, але яны не слязамі сябе ўцяшаюць, гэтым сябе не суцешыць! Гэтыя мільёны будуюць велізарнейшы помнік гэтым ахвярам. Пабудаваць шчасце для будучага пакалення — гэта і будзе помнік для загінуўшых. Яны таксама загінулі за гэта шчасце. Прыглядзіся, як з кожным днём расце гэты помнік — растуць калгасы, растуць пасевы, руіны пакрываюцца заводамі і фабрыкамі, як бурліць жыццё! Як на гэтых руінах і папялішчах вырастае наша шчасце! Паглядзі на ўсходы шчасця! Мы засталіся ў жывых, каб жыць за тых, хто загінуў,— за маці маю, за тваіх дзяцей. Трэба жыць, а не

гнуцца ад гора, якое ўжо мінула, ад няшчасця, якога ўжо не перайначыш.

Паўза.

Азохаў. Помнік, кажаш...

Дабратворскі. Помнік, які будзе сімвалам таго, што болей ніколі не будзе такой вайны, такіх ахвяр. *(Паўза.)* Дабіцца, каб на гэтым полі, дзе загінулі твае дзеці, каласілася жыта стопудовага ўраджаю ці насадзіць сад у памяць загінуўшых. Вось у чым трэба шукаць суцяшэння, а не ў слязах і смутку.

Азохаў *(шчыра)*. Дзякую табе, Аляксей! Вялікае дзякуй.

Дабратворскі. За што дзякаваць? Вось што, Фёдар Паўлавіч, нам трэба неадкладна прымаць меры ў чацвёртай брыгадзе.

Азохаў. Хвароба яго ведае, гэта не брыгадзір, а падзёншчык.

Дабратворскі. Ужо каторы дзень зрывае нам графік сяўбы.

Азохаў. І калгаснікі скардзяцца, што ён рэдка бывае на полі. І што ён сабе думае.

Дабратворскі. Думае даказаць, што ён правільна папярэджваў нас.

Азохаў. Аб чым?

Дабратворскі. Што асвоіць даваенную пасяўную плошчу нам не пад сілу.

Азохаў. А што ты думаеш, з яго гэта можа стаць.

Дабратворскі. Нездарма ж ён гэтак адстае з сяўбой.

Азохаў. Можа, каб праўленне склікаць?

Дабратворскі. Абавязкова.

За сцэнай чуваць галасы. Вася: «Дзядзька Захар, я ж толькі што хацеў распрэгчы яго, ды на хвілінку адвярнуўся, а вы...» Захар: «Я цябе навучу, як за коньмі глядзець! Хадзем да старшыні».
З'яўляюцца Захар і Вася.

Вася. Ды я ж на адну хвілінку адвярнуўся, дзядзька Захар...

Азохаў. У чым справа?

Захар. Так дзела не поідзе, таварыш старшыня. Я не дазволю, каб такія, як ён, на конях працавалі! Куды ж гэта гадзіцца? А? Конь паўдня гной вазіў, аж змакрэў, у абед адпачыць яму палагаецца, а ён што? Як ездзіў, так і паставіў у калёсах, нераспрэжанага. Нават церассядзель-

нік не адпусціў, а сам, як кныр, па полі бегае за дзяўчатамі. *(Да Васі.)* Куды гэта гадзіцца, я цябе пытаю?!

Вася. Ды я толькі на хвілінку...

Захар. Табе, галубчыку, штаны скінуць ды адсцёбаць церассядзельнікам, тады б ты ведаў, як з канём абыходзіцца.

Азохаў. Што ты сабе думаеш, Вася? *(Вася маўчыць.)*

Захар. Я гляджу, чаго гэта коні яго баяцца, як ваўка. А яно во дзе сакрэт! Э-эх, ты-ы! Табе на бярозавым кіі ездзіць, а не на конях.

Азохаў *(да Васі)*. Ну што ты маўчыш?

Вася. Ды я толькі на адну хвілінку...

Захар. Во, бачыш, яму хоць кол на галаве чашы, а ён сваё.

Дабратворскі. Нельга забываць, што ты камсамолец, Вася, і што канём трэба даражыць. А за дзяўчатамі будзеш бегаць вечарам.

Вася. Не беспакойцеся, я не за Галяй.

Дабратворскі. Трэба быць сур'ёзным, Вася!

Захар. Ххе! Сказаў! «Сур'ёзным»! Ды яму сур'ёзнасць так ідзе, як маёй кабыле бюстгальтар.

Вася. Як вам барада! *(Выбягае.)*

Захар. Бач, во ён табе! Чакай ад яго дабра! Я ўжо так скажу: калі чалавек да каня дрэнна адносіцца, то і людзям ад яго нельга дабра чакаць. Конь — ён таксама нібы чалавек. Яго толькі, як яго, разумець трэба. Ён, браце, вельмі чулую душу мае, і калі яго хто крыўдзіць, то і чалавека такому пакрыўдзіць не за грэх. Гэта я ўжо, як яго, добра ведаю. Так што калі хочаш ведаць, што гэта за чалавек, то паглядзі, як ён да каня адносіцца... Во, во.

Чуваць гудок аўтамашыны.

Азохаў. Хто гэта да нас?

Дабратворскі. Машына, здаецца, райкомаўская.

Азохаў. Сам сакратар.

Захар. Во, а што б ён сказаў мне, каб убачыў, як гэты вертапрах з канём абыходзіцца.

Уваходзіць сакратар райкома Крыніцын.

Крыніцын. Здарова, гаспадары!

Захар. Добры дзень, таварыш сакратар!

Вітаюцца.

Азохаў. Адкуль гэта вы едзеце па палявой дарозе?

Крыніцын. Праехаў па вашым полі. Цікавіўся, як вы сееце.

Азохаў. Ну і за што лаяць будзеце?

Крыніцын. А я што, сварлівая свякруха, ці што?

Азохаў. Я не к таму. Ужо прывык, калі ні прыедзеце, дык што-небудзь знойдзеце, што не так. *(Смех.)*

Захар. Добры гаспадар заўсёды прыкмеціць, дзе які непарадак.

Азохаў. На гэты раз лаяцца не будзем.

Захар. Ну і слава богу.

Крыніцын *(да Дабратворскага)*. Ну, як жывеш, таварыш Дабратворскі? Жаніць скора будзем?

Захар. Ды ў яго яшчэ жанілка... гм... гм... прабачце.

Смех.

Ён у нас малайчына — непаладкаў таксама не любіць.

Крыніцын. Гэта добра, калі непаладкаў не любіць. Парнікі вашы мне спадабаліся. Колькі думаеце прыбытку ад іх мець?

Дабратворскі. Па праўдзе сказаць — не займаўся гэтай арыфметыкай.

Крыніцын. Дрэнна, дрэнна. У гаспадарцы арыфметыкай неабходна займацца. Я думаю, тысяч сорак будзеце мець.

Дабратворскі. Каля гэтага будзе.

Крыніцын *(да Азохава)*. А чаму ж вы не жадаеце купляць другую аўтамашыну? Думаеце, яна ў вас лішняя будзе?

Азохаў. Ды яно, таварыш сакратар, не лішняя, толькі мы з той машынай у доўг залезлі. Грошай няма.

Крыніцын. Як гэта — грошай няма? Вось жа вам сорак тысяч.

Дабратворскі. Як гэта — адмаўляемся? Хто сказаў? Абавязкова возьмем. Хоць дзве давайце. У нас з цяглом такое становішча, што машыны да зарэзу патрэбны.

Крыніцын. А мне з сельскагаспадарчага аддзела сказалі, што Азохаў адмовіўся ад машыны. Можа, ад касілак і жняярак таксама адмовішся?

Азохаў. Ад гэтага не адмовімся.

Крыніцын. Неадкладна адпраўляйце людзей, хай забіраюць аўтамашыну, касілкі і жняяркі. Марудзіць нельга. Зараз партыя і ўрад аказваюць вялікую дапамогу калгасам, самім толькі не трэба варонiць.

З а х а р. Дык, старшыня, трэба браць. А то, як яго, баяліся асіліць зямлю даваенную, а яно, бач, і здужаем пакрысе.

К р ы н і ц ы н. Баяліся, кажаш?

З а х а р. Во, во, таварыш сакратар, баяліся. Каб вось наш парцеец *(паказвае на Дабратворскага)* не настояў, дык і не ўзяліся, пабаяліся б.

К р ы н і ц ы н. І правільна зрабіў. На тое ён і «парцеец», каб добрае адстаяць.

Д а б р а т в о р с к і. Тады не хацелі браць за ўсю плошчу таму, што, моў, тэхнікі няма і цягла не хапае, а зараз тэхніку даюць, і таксама не хочам браць.

А з о х а ў. Рахункавод мяне з панталыку збіў.

Д а б р а т в о р с к і. Гэты рахункавод тады крычаў, што тэхнікі нам дзяржава не дасць — «заводаў няма, фабрык няма», а зараз адмаўляецца браць.

К р ы н і ц ы н. Заводаў няма? Так могуць гаварыць сляпыя і тупыя людзі, якія не хочуць бачыць далей уласнага носа. Хапіла ж у нас тэхнікі, каб перамагчы тэхніку ўсёй Еўропы ў гэтай вайне? Можна быць упэўненым, што хопіць у нас заводаў і фабрык, каб забяспечыць тэхнікай і гаспадарку. Да вайны ў вас была электрастанцыя?

А з о х а ў. Не, не было яшчэ.

К р ы н і ц ы н. А зараз вы маглі б мець сваю электрастанцыю, калі б не з такой пагардай адносіліся да тэхнікі. Для нашага раёна даюць некалькі калгасных электрастанцый, і мы меркавалі даць адну вашаму калгасу, ды бачу, што ў вас нічога не выйдзе.

Д а б р а т в о р с к і. Як нічога не выйдзе?

К р ы н і ц ы н. Бачу, што не любяць у вас тэхніку.

З а х а р. Што вы, таварыш сакратар, можа, наш рахункавод і жонкі сваёй не любіць, дык думаеце, што ўсе нашы жонкі крыўдзяцца на сваіх мужыкоў? Э-э, не, не, не!

К р ы н і ц ы н. Дык маеце намер і электрастанцыю ўзяць?

Д а б р а т в о р с к і. Таварыш сакратар, моладзь наша аб гэтым марыць. Калі я скажу, што раён нам вызначыць электрастанцыю — затанцуюць ад радасці.

К р ы н і ц ы н *(усміхаецца)*. Ну што, скажыце, што вызначым. Толькі трэба сяўбу раней закончыць. Для электрастанцыі вам трэба падумаць пра паліва.

З а х а р. У нас лес зусім пад бокам.

К р ы н і ц ы н. На лес не разлічвайце. Вайна і так шмат яго загубіла. Пра торф думаць трэба.

А з о х а ў. Знойдзем і торф.

К р ы н і ц ы н. Я наўмысля праязджаў міма балота, якое перад вайной вы пачалі асушваць. Работы там не так ужо і многа, толькі па-баявому ўзяцца трэба. Камсамол трэба падняць.

Д а б р а т в о р с к і. На гэта ўжо я даю слова камуніста.

К р ы н і ц ы н. Што ж, слову камуніста трэба верыць.

З а х а р. Ды яно, як яго, і я дапамагу. Я ў гэтым балоце да вайны трохі капаў канавы і загароджваў іх, калі немцы падыходзілі.

К р ы н і ц ы н. Так таму і быць. Паспееце своечасова закончыць сяўбу, атрымаеце электрастанцыю ў першую чаргу.

А з о х а ў. Калі на тое пайшло, то мы пастараемся закончыць так... да Дня Перамогі.

К р ы н і ц ы н. Але глядзіце, каб не было другой крайнасці — пагоніцеся за гектарамі і страціце пуды. Трэба сеяць гектары, а мець на ўвазе пуды.

А з о х а ў. А для чаго тады ў нас аграном?

З а х а р. Ды яно-та так. На працадні не гектары атрымліваць будзем, а пуды.

К р ы н і ц ы н. У нас Пупко захапляўся гектарамі, пакуль з работы не знялі.

Д а б р а т в о р с к і. Знялі? Я гэта прадбачыў.

К р ы н і ц ы н. За ачкаўцірацельства. Не сур'ёзны чалавек для загадчыка сельгасаддзела. Праўда, раскусілі мы пазнавата.

Д а б р а т в о р с к і. А дзе ж ён зараз?

К р ы н і ц ы н. Раймеліяратарам, па спецыяльнасці.

Д а б р а т в о р с к і. На свой хлеб, значыць?

К р ы н і ц ы н. Давайце праедзем на вашы новабудоўлі. Я там бачыў, як дзяды тапарамі ляпаюць, але не спыніўся. Паглядзім, можа, і другім прыйдзецца параіць.

Выходзяць направа. У гэты час злева з'яўляюцца К у з ь м а, М а л а н н я, б р ы г а д з і р П р а к о п.

К у з ь м а. Не, не, пачакайце, пачакайце! Мы вас шукалі. *(Крыніцын, Азохаў, Дабратворскі, Захар спыняюцца.)* Вось тут усё начальства. Хай рассудзіць, можна так болей цярпець ці не? Можна брыгадзіру такія штучкі вычвараць ці не?! Можна дазваляць, каб ён *(тыкае пальцам на Пракопа)* па галовах у нас ездзіў?!

К р ы н і ц ы н. Ну, ну, выкладай, што здарылася?

М а л а н н я. За гэта ўдовы і мне, і ўсім праўленцам, і старшыні вочы выкалюць.

К у з ь м а. Ты пачакай! Я ўжо выкладу! Як можна цярпець такое?! Усе, ад малога да старога, ад цямна і да цямна ў полі працуюць. Удовы з малымі дзецьмі выйшлі на працу. У нітку выцягваюцца, каб калгаснае пасеяць. А ён што робіць? *(Да Пракопа.)* А ты што робіш, я цябе пытаю! А?!

М а л а н н я. Кароў сваіх аддала на полі працаваць, шклянку малака ад дзяцей адрываем, каб калгасам на ногі стаць, а...

К у з ь м а *(перабівае)*. Ды цыц ты! А ён што, запрог парку коней ды свой пляц варочае. Яму на калгаснае наплюваць, хоць трава не расці. Яму абы пляц засеяць, а на калгаснае глядзіць, як падзёншчык. Яму працадзень ідзе. А што на працадзень атрымаем, не яго справа, яму абы пляц. А мне працадзень трэба, не пляц! Вось што! Я даклаў, а вы начальства — бярыце яго і наказвайце! А не накажаце, дык я ў другія дзверы стукаць буду.

К р ы н і ц ы н. Не, мы наказваць не будзем.

К у з ь м а. Як гэта — не будзем?

М а л а н н я. Чаму не будзеце?

К р ы н і ц ы н. Вы яго ставілі брыгадзірам, вы і спытайце ў яго. Збярыце праўленне, агульны сход і абгаварыце паводзіны такога брыгадзіра. Спытайце калгаснікаў, можа, яны знойдуць неабходным аштрафаваць яго, а можа, зусім прагнаць яго з брыгадзіраў. Калі ўбачыце, што перашкаджае вам, блытаецца між ног, то я вам раю: пустазелле — з поля вон. Самі гаспадары, самі і рашайце.

К у з ь м а. Дык жа душа баліць, таварыш начальнік. Толькі пачалі на дарогу ўзыходзіць пасля вайны, а ён у шкоду лезе. Як жа можна цярпець? Дык жа жыць хочацца па-людску!

К р ы н і ц ы н. Я вам і кажу *(да Азохава)*, хто перашкаджае па правільнай дарозе ісці — ламайце рогі.

Заслона.

КАРЦІНА ШОСТАЯ

Дзея адбываецца ў праўленні калгаса. Выгляд пакоя змяніўся да непазнавальнасці, відаць, тут папрацавалі камсамольцы. У пакоі два сталы і некалькі табурэтак. Каля аднаго стала на сцяне надпіс: «Рахункавод», каля другога — «Старшыня». На сцяне лозунг:

«Шырэй разгорнем сцяг сацыялістычнага спаборніцтва за павышэнне ўраджайнасці сацыялістычных палёў!» [...] Яшчэ ніжэй, з аднаго боку — «Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб прысваенні звання Героя Сацыялістычнай Працы і ўзнагароджанні ордэнамі за дасягненні ў атрыманні высокіх ураджаяў», з другога боку — добра афармленая насценгазета.

Час дзеі 8 мая.

На сцэне песімістычна настроены Вася.

Вася. Завяла лісце, і асыпаліся пялёсткі
Надзеі-кветкі, што расціў у сэрцы...
(Спявае.) Куды, куды, куды вы цягу далі,
Вясны маёй залатыя дні?..
Бязлітасна падсеклі корні,
Надзея-кветка засыхае...
Ад ран, ад крыўды і ад болю
Ў грудзях сардэчка замірае...
І ран нічым не загаіць,
І боль нічым не загасіць...
(Спявае.) Что день грядущий мне готовит,
Мой взор его напрасно ловит...
Каханне без надзеі, што... што сяўба без гною...
Так, пасеяў я сваё каханне, ды гною пад яго не паложыў.

Цьфу!! Ну і параўнанне! І ў галаве ў мяне нічога культурнага не расце, а толькі зёлкі — культывацыя патрэбна...
(Спявае.) Но нельзя рябине к дубу перебраться,
Значит...

Уваходзіць Іван.

Іван. Ты чаго тут, Вася, лямантуеш?

Вася. «Мне смутна ад таго, што весела табе».

Іван. Ну што ты, Вася!

Вася *(жартоўна)*. Я — Вася і з некалькімі плюсамі, і ўсё-ткі Галя мяне не любіць. Хацеў паконччыць самагубствам, ды раздумаў. Усе вялікія паэты цярпелі крыху болей. Буду цярпець і я. Нельга так рана губіць такі талент.

Іван. Ну, вядома, Вася! Хіба зараз гэтым займаюцца? Ты адкладзі гэту аперацыю хоць на якое-небудзь стагоддзе. Паслязаўтра пачынаем будаваць электрастанцыю. Усім калгасам выходзім на балота. Заўтра святкуем Дзень Перамогі. Нават дзве перамогі. Па-першае — Дзень Перамогі і, па-другое — закончылі сяўбу. А ваша звяно на пасяўной заняло другое месца. Гэта таксама для цябе свята.

Андрэй Макаёнак з артыстамі БДТ імя Янкі Купалы.
1970-я гады.



Андрэй Макаёнак і Юрый Збанацкі.
1977 год.



В а с я. Гэта не маё звяно, а звяно Фені.

І в а н. Дык і ты ў гэтым звяне.

В а с я. У тым жа і справа, што і я ў гэтым звяне... крыху грашыў.

І в а н. Нічога, ты свае грахі асазнаў і выправіў.

В а с я. Так і быць. Адкладаю на стагоддзе.

І в а н. Цяпер я бачу, што з цябе выйдзе геніяльны паэт.

Смяюцца.

І в а н. Смех смехам, а падаць духам непрыгожа. Бадзёрасць — самая сімпатычная якасць маладога чалавека.

В а с я. Я і сам разумею, ды ніяк не магу прымірыцца... Як сказаў адзін вялікі паэт *(паказвае на сябе)*:

Каб на свеце добра жыць,
Трэба аптымістам быць —
Нос не вешаць, слёз не ліць
І ад дробязей не ныць.
Слава бадзёрым!
Слава вясёлым!
Смерць песімістам
І... камарам!

І в а н. Во, во, яно самае! Ну, я пайду. Я ж адказны за ўрачысты вечар, прысвечаны Дню Перамогі. Ты вершык пра электрычнасць падрыхтаваў?

В а с я. Ёсць!

Патушыце ўсе капцілкі,
Электрычнасць запаліць!

І в а н. На сцэну выпускаем першым.

В а с я. Толькі дзядзьку Захара на заднюю лаўку пасадзіце, а то пугай сцёбне. Ён на мяне вельмі злы за каня.

І в а н. Не, яму ганаровае месца. Ты не бойся.

І в а н выходзіць.

В а с я *(дэкламуе)*.

Патушыце ўсе капцілкі,
Электрычнасць запаліць!
Вёска! Выкінь карасінкі,—
Па правадах святло бяжыць!
То святло святога шчасця,
Што пусціла ўжо расткі,
Што паспелі зноў закласці
Пасля цяжкае вайны.

Уваходзіць **Ж а н н а.**

Ж а н н а. Добры дзень!

В а с я. Добры дзень!

Ж а н н а. Пупко яшчэ не вярнуўся?

В а с я. Не, яны яшчэ балота аглядаюць.

Ж а н н а. Я думала, вы размаўляеце з кім, а вы дэкламуеце. Верш?

В а с я. Верш. Самі пішам, самі і дэкламуем.

Ж а н н а. Нават пішаце самі?

В а с я. А што тут дзіўнага?

Ж а н н а. А пра што вы пішаце?

В а с я. Пра ўсё, што ў жыцці бывае.

Ж а н н а. І пра каханне?

В а с я. Здараецца і пра гэта.

Ж а н н а. Вы прачытайце што-небудзь.

В а с я. Настрою няма, ды і... мы яшчэ мала знаёмы, каб пра каханне вершы чытаць.

Ж а н н а. Вы не саромцеся. Вось мы і пазнаёмімся.

В а с я. Я не з сарамлівых, ды не прыходзіць на памяць.

Ж а н н а. Ну што-небудзь.

В а с я. Прысаджвайцеся.

Ж а н н а. Дзякую.

В а с я. Што-небудзь можна. *(Дэкламуе.)*

Для мілой не пашкадую,
Нават... гною воз аддам,
Раз сказала: «Пацалую»...
Спадабалась гэта вам?

Ж а н н а *(смяецца)*. Вельмі. А сур'ёзнае што пішаце?

В а с я. Сур'ёзнае? Не. Адзін відны крытык сказаў, што сур'ёзнасць мне так ідзе, як...

Ж а н н а. Ну...

В а с я. Як вам барада. *(Жанна смяецца.)*

Ж а н н а. Вам трэба вучыцца.

В а с я. Святая ісціна.

Ж а н н а. Літаратуру вы чытаеце?

В а с я. Не чытаю, а паглынаю.

Ж а н н а. А дзе вы дастаеце?

В а с я. У-у-у!.. Дабратворскі прывёз два мяшкі і торбу. І раіць завочна вучыцца.

Ж а н н а. А як вам падабаецца Дабратворскі?

В а с я. Зусім добры хлопец, толькі да чужых дзяўчат ласы.

Ж а н н а. Ну-у?

В а с я. Вось вам і ну.

Ж а н н а. І мае поспех?

В а с я. Як Ракасоўскі на фронце. А вы яго ведаеце?

Ж а н н а *(хмура)*. Ведаю... працавалі разам у сельгасаддзеле.

В а с я. Дык вы як старая знаёмая зрабіце яму заўвагу.

Ж а н н а. Дзеля вас? Зраблю. Дзе гэта яны затрымаліся так доўга?

В а с я. Хто?

Ж а н н а. Маё начальства.

В а с я. А-а, Пупенка.

Ж а н н а *(смяецца)*. Не Пупенка, а Пупко.

В а с я. Розніца не вялікая. Пакуль жа там агледзяць балота, ды прымераюцца, ды яшчэ паспрачаюцца. Дабратворскі таксама там, а ў яго апетыты вялікія — калі ўжо рабіць, дык усё адразу. А вы што спяшаецеся?

Ж а н н а. Не вельмі, ды...

В а с я. А я хацеў запрасіць вас на вечар.

Ж а н н а. Дзякую. Калі маеце час, выйдзем на вуліцу.

В а с я. Калі ласка, надвор'е добрае для прагулкі.

Ж а н н а. І вуліцы ў вас прыгожыя. Пасадку зрабілі.

В а с я. Гады праз два разрасцецца, уся ў зелені будзе.

Ж а н н а. Самая прыгожая вёска будзе.

В а с я. Гэта ўсё Дабратворскі.

Выходзяць. Убягае Г а л я і цягне за сабою З о с ю.

Г а л я. Зоська, нягодніца, я цябе тры гадзіны шукала, Зоська!

З о с я. Ну што ты, што з табою сёння?

Г а л я. Ой, Зося, я сама не ведаю, што са мной. Зося! *(Паўза.)* Аляксей...

З о с я. Ну што Аляксей?

Г а л я. Нічога ты не разумееш.

З о с я. Ну, вядома, нічога не разумею. Ты мне скажы, што гэта за дзяўчына з Васем пайшла?

Г а л я. Што ты ў мяне пытаеш? Ты лепш ведаеш!

З о с я. Ну, што?

Г а л я. Ты спытай — любіць мяне Аляксей ці не?

З о с я. А скуль я ведаю.

Г а л я. Дык я ведаю, вось глядзі. *(Дае паперку.)*

З о с я. А я даўно ведала, што ён гэта зробіць.

Г а л я. Нічога ты не ведала. І я не ведала, і ты не ведала, і ніхто не ведаў.

З о с я. А вось і ведала. Я ж табе казала, што дурнем будзе, калі цябе не пакахае.

Г а л я. Зоська! Якая ты разумніца! *(Цалуе яе.)* А што я яму скажу, як скажу?

З о с я. А ты нічога не кажы. Ты толькі міргай вачыма ды галавою ківай, ён і зразумее ўсё.

Г а л я *(паглядзеўшы ў акно)*. Ой, Зоська, яны!.. Прыехалі...

З о с я. Хто?

Г а л я. «Хто, хто»... Уй, куды мне, Зоська?

З о с я *(паглядзела ў акно)*. Пад стол хавайся. «Куды, куды»... А ты вось тут і сядзі, а я паклічу яго.

Г а л я. Зося, ты здурэла.

З о с я. Ну, якая ты, я проста не разумею, і хочацца і колецца...

Г а л я. Ну, што я яму скажу? Як я скажу?

З о с я. А памятаеш, як ты мне на полі гаварыла. Вось так і яму скажы.

Г а л я *(заплюшчыла вочы нібы ад страху)*. У-уй! Я так не сумею.

З о с я. А што тут умець?

Г а л я. Якая ты лёгкая. Ой, ідуць, уцякайма.

З о с я. Не, не пушчу! Во, дурненькая. Ты супакойся, не хвалюйся.

Г а л я. Ты паглядзі *(бярэ яе руку і прыкладае да сэрца)*, глядзі, як стукае.

З о с я. Гэта нічога.

Г а л я. Не, пусці, я лепш вечарам.

З о с я. Не, нічога не выйдзе. Адклад не ідзе ў лад.

Уваходзіць Д а б р а т в о р с к і.

З о с я *(мнагазначна)*. Ну, я пайду.

З о с я выходзіць. І Дабратворскі і Галя разгубіліся. Паўза.

Г а л я. Вы ўжо прыехалі?

Д а б р а т в о р с к і. Прыехалі... *(Паўза.)* Галя, вы прачыталі маю запіску?

Г а л я *(схіліла галаву)*. Прачытала.

Д а б р а т в о р с к і. Ну і...

Нечакана заходзяць Ж а н н а і В а с я.

Ж а н н а. Я, здаецца, перашкодзіла вам? Прабачце. Аляксей, на цябе скардзяцца людзі. Я хацела пагаварыць з табой.

Д а б р а т в о р с к і. Калі ласка.

Ж а н н а *(з замінкаю)*. Але мне трэба адзін на адзін.

Д а б р а т в о р с к і. Галя нам не перашкодзіць. Мы з

ёй вельмі добрыя сябры. *(Жанна дапытліва, амаль строга глядзіць на Галю.)*

Г а л я. Не, я выйду, калі ласка...

Д а б р а т в о р с к і. Я вельмі прашу вас, Галя, далёка не адлучацца, мы яшчэ павінны скончыць нашу размову.

Г а л я выходзіць, а за ёю і В а с я.

Ж а н н а. Хто гэта такая?

Д а б р а т в о р с к і. Дзяўчына.

Ж а н н а. Бачу сама, што дзяўчына, але што гэта за дзяўчына?

Д а б р а т в о р с к і. Вельмі добрая дзяўчына. Галя. Ну, што табе яшчэ сказаць пра яе?.. Сакратар камсамольскай арганізацыі.

Ж а н н а. Можа, твая сімпатыя?

Д а б р а т в о р с к і *(усміхаецца)*. Яна занадта сімпатычная, каб ёй не сімпатызаваць.

Ж а н н а. Ну, што ж, добра... вельмі добра. *(Няложкая паўза.)* Толькі я не ведала, што ты здольны так хутка забываць свае словы.

Д а б р а т в о р с к і. Наадварот, я здольны вельмі доўга памятаць і свае і чужыя словы.

Ж а н н а. Не прыкмячаю. Ты зусім нядаўна гаварыў, што... моцнае каханне — характэрная асаблівасць нашых людзей, нашага часу.

Д а б р а т в о р с к і. Калі ў аснове кахання не ляжаць эгаістычныя інтарэсы.

Ж а н н а. Не памятаю гэтага дапаўнення.

Д а б р а т в о р с к і. Што ж, можа, я гэтага не разумеў. Жыццё ўносіць папраўкі.

Ж а н н а. Значыць, я дарэмна верыла тваім словам? Ты мяне не кахаў?

Д а б р а т в о р с к і. Гэта яшчэ як сказаць... Але кожнаму чалавеку ўласціва памыляцца.

Ж а н н а. Але не падманваць.

Д а б р а т в о р с к і. Я не падманваў, але надта позна ўбачыў, што ў нас нічога агульнага няма.

Ж а н н а. Дзякую за шчырасць. *(Паўза.)*

Д а б р а т в о р с к і. Вы сказалі, што на мяне хтосьці крыўдзіцца...

Ж а н н а. Вы? Разумею... Застаецца толькі пажадаць вам усяго добрага. Гэтага трэба было чакаць... Так, на вас крыўдзяцца. Вы адбіваеце чужых дзяўчат.

Дабратворскі. Якая непрыгожая фраза. Ды справа не ў тым, да крымінальнай адказнасці мяне за гэта прыцягваць не будуць.

Жанна. Парыруеце цудоўна.

Дабратворскі. ...таму, што ні ў адным кодэксе не запісана, што правы ўласнасці распаўсюджваюцца і на дзяўчат.

Жанна *(жартоўна)*. А як ты думаеш, мяне могуць прыцягнуць да крымінальнай адказнасці,— жонка Пупко не дазваляе яму ездзіць на раён разам са мною — раўнуе.

Дабратворскі. На жаль, не. Эх, Жанна, Жанна!..

Жанна. Што? Між намі нічога не можа быць.

Заходзяць Пупко, Азохаў, Якаў Ягоравіч, Іван.

Пупко. А-а! Во дзе вы, во дзе яны, галубкі, буркуюць. Моладзь, моладзь!.. Мы вам не перашкодзілі? Ну, як табе тут падабаецца, Жанначка?

Жанна. Як вам сказаць, Сяргей Пятровіч...

Пупко. Малайчына Дабратворскі, далібог, малайчына. Ты ведаеш, як яны цябе паважаюць? А? Проста зайздросна.

Азохаў. Ёсць за што, Сяргей Пятровіч.

Дабратворскі. А вы не заўважылі, Сяргей Пятровіч, як яны сябе паважаюць?

Пупко. Э... э...

Дабратворскі. Так, так, Сяргей Пятровіч. Вы на балоце выказалі сумненне, што не паспеем асушыць балота да ўборачнай. А я ведаю, што яны ўмеюць за сябе пастаяць, таму, што паважаюць сябе.

Пупко. Табе відней. Але прызнаюся, даражэнькі, не спадзяваўся я, што ты так завернеш справу тут.

Якаў Ягоравіч. З нашым народам справу можна яшчэ не так завярнуць.

За сцэнай чуваць песня: «Чаму ж нам не пець, чаму не гудзець...»

Пупко. Не, не, не, вы мне не кажыце, усё-ткі трэба ўмець. У мінулым годзе вы веснавую сяўбу заканчвалі ў чэрвені, а сёлета да 8 мая. А людзі адны і тыя.

Азохаў. Але ў мінулым годзе тэхнікі было менш. Сёлета мы на трыццаць працэнтаў болей пасеялі, дык жа і трактары папрацавалі не так, як у мінулым, ды дзве аўтамашыны маем.

Іван. Ды і людзі папрацавалі як трэба.

Якаў Ягоравіч. Я вам скажу адзін сакрэт. Калі народ бачыць, што тваё сэрца б'ецца ва унісон з сэрцам

народа, калі табе павераць, то народ пойдзе за табой, нават на любыя цяжкасці.

І в а н. Гэта ўжо не сакрэт, асабліва для франтавікоў, Якаў Ягоравіч.

Уваходзяць падвыпіўшыя К у з ь м а і З а х а р. Гэта яны спяваюць «Чаму ж нам не пець...».

Д а б р а т в о р с к і. О, дзядзька Кузьма ўжо авансам чарку перакуліў.

К у з ь м а. Не, брэшаш, не авансам, а па закону.

А з о х а ў. Як жа па закону? Свята толькі заўтра будзе.

К у з ь м а. А чаму і не сёння? А ў мяне, братка, і сёння свята.

І в а н. Бацька мой спяшаецца жыць.

К у з ь м а. А чаго мне спяшацца. А вось скажыце, хто першым свой план выканаў, вы ці я? *(Да Захара.)* Скажы, Захар!

З а х а р. Ды яно, як яго...

К у з ь м а. Я?

З а х а р. Во, во... што праўда, то праўда.

К у з ь м а. Ага? А хто павінен першым свята сустрэць? Скажы ім, Захар! А-а-а!! А-а!.. То-та! Сёння ў мяне пяць удоў наваселле спраўляюць. А хто ім хаты пабудаваў? Я ці не я?

А з о х а ў. Правільна, Кузьма, правільна, ты са сваёй брыгадай.

К у з ь м а. Во-о-о! Я са сваёй брыгадай. Дык авансам я чыкалдыкнуў чарку ці па закону?

Д а б р а т в о р с к і. Не-е-е, я ўжо ведаю, дзядзька Кузьма не па закону піць не будзе.

З а х а р. Во-во, братка, яно самае...

К у з ь м а. Во-о-о! Мы з Захарам і на вашу працу паглядзелі. Яшчэ зрання на поле пайшлі.

З а х а р. Паглядзелі ўжо, ах, а-ах, паглядзелі.

К у з ь м а. Во-о! Усходы паглядзелі.

Д а б р а т в о р с к і. Ну і як ўсходы?

З а х а р. У-у-у!..

К у з ь м а *(да Захара)*. Што у-у-у?! Добрыя ўсходы. Маладых хваліць нельга — сапсуюцца.

Д а б р а т в о р с к і. Правільна. Звычайныя ўсходы.

К у з ь м а *(папраўляе)*. Добрыя.

З а х а р. Э-э, не, не, не, даражэнькі. Праўду трэба сказаць. Я ўжо бачу, ведаю, век пражыў. Не проста звычайныя ўсходы, нават не проста добрыя, а... а... як яго... сі-

ла! Сі-іла-а-а! Глядзіш, дык душа радуецца. Даўно нашы палі не бачылі такіх усходаў. Гэта, братка, як яго... Усходы багатага жыцця.

Якаў Ягоравіч. Усходы шчасця.

Захар. Во-во... Усходы шчасця нашага.

Кузьма. Во-о! Чаму ж нам не піць! Як кажуць: пі і еж, пакуль рот свеж, а як у роце завяне, дык і муха не загляне.

Захар. А скажы, старшыня, коні мае добра выцягнулі вясну?

Азохаў. Ну, што і гаварыць.

Іван. Коні класічныя.

Захар. Хай сабе класічныя... А скажы, як яго... Хто конюх, я ці, як яго, ці не я?

Кузьма. Ну ты, ты. Конюх, ды не конь.

Захар. А-а! То-та!

Кузьма *(цягне Захара)*. Хадзем, дружа, Малання яшчэ запрашала на наваселле. Хай наша чарка не прападае. Хадзем!

Абняўшыся, выходзяць, спяваючы «Чаму ж нам не пець...».

Пупко. Цікавыя старыя.

Дабратворскі. Добрыя старыя.

Азохаў. Ужо калі працаваць, дык працаваць. А калі з чаркай сустрэнуцца, таксама не размінуцца. Пойдзем і мы, усё-ткі яны праўду кажуць.

Якаў Ягоравіч. Зайздрасць узяла.

Усе выходзяць, апрача Дабратворскага.

Іван *(выходзячы)*. Ну а ты, Аляксей?

Дабратворскі. Я зараз прыйду.

Іван выходзіць. Аляксей чакае Галю. Падыходзіць да акна.

Дзе ж Галя?.. Няўжо не прыйдзе?.. *(Паўза.)* Няўжо ўсе мае надзеі дарэмныя?.. *(Ціха кліча.)* Галачка! *(Паўза.)* Спявае:

Гляджу я на неба   Чаму я не сокал,
І думку гадаю,   Чаму не лятаю...

У той час калі ён спявае, ціха заходзіць Галя.

Дабратворскі. Не можа быць! Я веру — маё шчасце прыйдзе! Галачка, ты прыйдзеш. *(Паўза.)* Калі любіць, то прыйдзе.

Галя *(хвалюецца)*. Я... прыйшла!

Заслона.

Пераклады

Д. Зорын

ВЕЧНАЯ КРЫНІЦА

НАРОДНАЯ ДРАМА
Ў ЧАТЫРОХ АКТАХ

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ:

Ленін У. І.
Марцін Крутаяраў — 30—35 год. Па мянушцы «Дастань-верабейку».
Васіліса — яго жонка, 30 год.
Волечка — іх дачка, 12—13 год.
Гарасыч (Гарасім Гарасімавіч) — удавец, пад 40 год.
Плакун Пётр Іванавіч — 55—60 год, дзядзька Васілісы, цесць Гарасыча.
Марфа Плаксіха — яго жонка.
Камолаў — губпрадкамісар.
Мікітка — вясковы каваль.
Сенька-Рэшка — бядняк.
Дар'я — удава, беднячка.
Панфёр — заможны селянін.
Варвара — яго суседка, пляткарка.
Захар — серадняк.
Анісся — яго жонка, сяброўка Варвары.
Сазонава — павятовы ўпаўнаважаны.
Партработнікі, сяляне, сялянкі.

Дзея адбываецца ў цэнтральнай паласе Расіі ў 1922 годзе.

АКТ ПЕРШЫ

На беразе возера, край рускай вёскі, справа хата Марціна, злева зруб з ганкам — дабудоўваецца хата Гарасыча, сядзібы раздзелены плятнём; супраць зруба бярвенні; воддаль цень ад крылляў ветранога млына; аднекуль даносіцца песня.

Свяці, свяці, сонейка,
Сонейка для нас.
Любае, харошае,
Ты адно ў нас...

На возеры жанчыны палошчуць бялізну. З шумам налятае зярністы косы дождж. Жанчыны з піскам і смехам разбягаюцца, а з акна хаты Марціна вылазіць разутая Волечка *і з захапленнем скача пад дожджыкам.*

Дождждык, дождждык, перастань,
Я паеду ў Арыстань,
Богу маліцца,
Хрысту пакланіцца.
Мы ў бога сіроты,
Адчынялі вароты
Ключыкам-замочкам,
Шоўкавым платочкам.

Чуецца разнабойны хор дзіцячых галасоў, якія недзе вітаюць дождждык той жа песняй. Хаваючыся ад дажджу, Ленін *з ружжом і сумкай забягае пад карніз брамкі.*

Ленін. У-ух! Вось наляцеў! Сонечны! Р-рускі.

Волечка *(да Леніна)*. Пойдзем, пабегаем!

Ленін. Дзякуй. Я ўжо набегаўся...

Волечка. Ты ўмееш пець «Ключык»?

Ленін. Умею... *(Прыдумвае.)* Дождждык, дождждык, прыпусці, памажы мне падрасці...

Волечка. Падрасці? Вось і не так!

Ленін. А ў нас так.

Волечка. Не, відаць, ты, дзядзя, толькі што сам прыдумаў. А складна! Што складна, то складна! *(Скача.)*

Дожджык, дожджык, прыпусці, памажы мне падрасці! Дзядзька, а як цябе завуць?

Ленін. Дзядзя Валодзя. А цябе?

Волечка. Нагулачкай!

Ленін. Як?

Волечка. Нагулачкай. Не разумееш?

Ленін. Не разумею.

Волечка. І я не разумею! Толькі мамка і татка мяне завуць Волечка, а ўсе — Нагулачка, Нагулачка. І вадзіцца са мной не хочуць. Кажуць, што татка і мамка да вяселля пажаніліся. А я тут пры чым? Праўда, дзядзька Валодзя? Дзіўна! Будзеш са мной вадзіцца?

Ленін. Буду!

Волечка. Будзеш?

Ленін. Буду.

Волечка. Ты, відаць, ідэйны?..

Ленін. Ідэйны.

Волечка. Мой татка таксама ідэйны. Ён заўсёды гаворыць, я ідэйны і за бедных... *(Пагладзіла ствол стрэльбы.)* А ў цябе не было страшнага здарэння на паляванні?

Ленін. Не. А што?

Волечка. А ў нас было. Адзін раз лебедзі ляцелі, ланцужком, у вырай, а наш адзін дзядзька Панфёр як стрэльне — і забіў адну лябёдку. А лебедзь адбіўся ад усіх птушак, і кружыцца, і кружыцца вось тут... *(Паказвае на неба.)* І дзень кружыцца, і ноч кружыцца, і яшчэ дзень, і яшчэ ноч! А пасля склаў крыллі вось так і каменем проста на дарогу. Пер'е белае-белае з крывёю так і паляцела... Людзі прыбеглі, а ён ляжыць і вочы закрыў; відаць, яму вадзіцца не было з кім... А цётка Варвара ўзяла, засмажыла і на базар завязла. Ты не ведаеш цётку Варвару?

Ленін. Не, не ведаю цётку Варвару...

Дожджык перастаў. Уся вуліца заліта сонцам.

Ну, бывай, Волечка... Дожджык перастаў.

Волечка. Пачакай, дык я не пайду з табой на паляванне? А-а, ведаю... А яшчэ гаварыў — я ідэйны, вадзіцца з табой будзем...

Ленін. Ну, Волечка... Мяне там чакаюць другія паляўнічыя... Я табе прынясу жывую лысуху...

Волечка. Нашто мне лысуха. У мяне вунь гусяняты ёсць, мамка мне загадала пільнаваць іх на возеры...

Калі хочаш ведаць, я наша возера *(паказвае на далонь)* вось так ведаю... І падкрадвацца ўмею...

Крычаць гусі, кружыцца цень каршуна.

Глядзі — каршун! Каршун!

Ленін. Ідзі, крыкні на яго, ён і паляціць!

Волечка. Які ты хітры! А ты без мяне пойдзеш! *(Залазіць на пляцень.)* Кыш, кыш!

Ленін *(заўважыў каршуна і сочыць за яго палётам, азартна).* Чакай, чакай! Не пужай, не пужай... *(Заганяе патрон у ствол.)* Тут, брат, патрэбна тактыка, тактыка патрэбна.

Крадзецца каля плятня. З захапленнем ідзе за ім і Волечка. Вуліца некаторы час пустая. Чуецца стрэл. Рэха гудка і доўга коціцца над возерам і заціхае недзе далёка ў чаратах. На выстрал адзін за другім прыходзяць на возера сяляне. У акне зруба асцярожна паказваецца Гарасыч і, заўважыўшы сялян, знікае.

Панфёр *(углядаючыся).* Нейкі новы стралок з'явіўся.

Захар. Меткі.

Сенька. Бачыў я, як ён за жураўлямі краўся... Яны яго прыкмецілі, пераляцелі на той бок возера, а ён за імі. Ды па купінах, ды па балоце, ды паўзком... А жураўлі і так і сяк... Мыюцца, крылацяцца, курлычуць. А ён ужо тут як тут. Гляджу, з гэтага боку,— прыцэліўся, так і прыліп да стрэльбы. А то, гляджу, адвёў стрэльбу. Ну, думаю, што-небудзь не так. Яшчэ бярэ прыцэл, прыцэліўся і зноў адвёў, адпачыў, навёў сур'ёзна так,— у мяне вочы анямелі — а ён як засмяецца! Так і пакацілася па возеры. А жураўлі ад здзіўлення, пэўна, пераглянуліся, падняліся, далі круг і паляцелі...

Панфёр. Сям'ю, відаць, разарваць не хацеў. Гэта ў паляўнічых бывае.

Сенька. Дзіўны стралок. Больш па полі ходзіць. Падымецца на курган ды ўсё ўдалячынь глядзіць, і быццам аб нечым сумуе...

Анісся. А можа, у яго хто за морам жыве...

Дар'я. А можа, у яго хто без вестак прапаў...

Захар. Мерае зямлю нагамі. Змерае і запіша.

Сенька. З намерам чалавек.

Варвара. Не к дабру гэта...

Плакун. Э-э, ужо загалдзелі! Ці мала к нам маскоўскіх паляўнічых прыязджае. Селькор гэта з «Красного па-

харя» палявацць прыехаў. Сам ляснічы гаварыў. У яго спыніўся.

Даносяцца моцныя дзіцячыя галасы: «Марцін-дастаньверабейку» ідзе!» «Верабейка, верабейка!» Усе прыслухоўваюцца. Плакун вельмі ўстрывожаны і маўклівы.

(Паглядзеў за вугал зруба, хаваючы непрыязнасць.) Марцін сюды ідзе...

Захар *(уздыхнуўшы)*. Прыйшоў салдат і запіў...

Панфёр *(шэптам)*. Зап'еш... Нехта нават на споведзі пакаяўся...

Сенька *(спалоханы)*. Пра Васілісу... і... *(кіўнуў на зруб)* Гарасыча?..

Панфёр. Так. Нехта грэх таіў, а перад смерцю прызнаўся... Сёння бацюшка ў казані... у прытчах... з амбона...

Анісся. Свят, свят...

Паўза.

Захар *(у разгубленасці)*. Ну і справы ў Марціна... Няўжо да храма дайшло?..

Варвара. Божа, не верыш? Тады вось запытай у таварыша Плакуна, ён жа ім радня... і праведны... святы... А не, дык я сама ў яго запытаю, калі табе сорамна... *(Павярнуўшыся да Плакуна.)* Дзядзька Пятро, а праўда, што твая пляменніца пры суполцы з Гараськам, скруцілася з ім?

Плакун моўчкі адыходзіць ад яе, садзіцца на прызбу.

Дар'я. Што гэта ты, Варвара! *(Засаромеўшыся, адыходзіць.)*

Варвара *(ёй услед)*. Спачуваеш? Таксама ўсё складчыну для супольнага ворыва шукаеш, удовачка...

Сенька *(з горыччу ў голасе)*. Таварыш Плакун, чаго ж ты маўчыш?

Плакун *(памаўчаўшы)*. Э-э, міл-чалавек, не чужая мне Васіліска, ды што зробіш, не ўдалася, відаць! *(Падышоў да яго.)* Усё шукаеце, Сямён Ягоравіч, усё хочаце дастаць, а вераб'я ж на самай справе хіба дастанеш? Пырх-х... і няма... *(Памаўчаўшы.)* Што за людзі... Савецкая ўлада ім зямлю дала, як бацьку роднага — нэп увяла, а ім усё мала, ты ім даходны кааператыўчык ладкуй, а ім усё не хапае...

Зноў адыходзіць да заваліны. Усе сумеліся. Доўга маўчыць.

Варвара. Проста смехата! А асабліва з рыжага. *(Да зруба.)* Нашто яму складчына — без яе зажыў нябла-га. А праўду сказаць, чалавек ён неспакойны... удавец... Бач, нашкодзіў, са зруба баіцца выйсці... А то, бывала, усё гаварыў: «Безвыходнае становішча суседкі ўлічваю»... А яна апусціць вочы і кажа: «Мой каняка ды ў Гарасыча двое, вось вам і суполка. А то куды б я дзелася пры сваёй долі салдацкай...» *(Павярнулася на стук брамкі, шэптам.)* Вось яна сама, глядзіце!

З брамкі босая, з вёдрамі на каромысле, з'яўляецца **Васіліса**. Апусціўшы галаву, праходзіць да возера.

(Ёй услед.) Усё, што затанула, усплыло на ваду, і краса не памагла...

Анісся *(не слухаючы яе)*. Сорам які... Хоць з сяла бяжы... У мяне дзеўкі растуць...

Панфёр. Вось да чаго суполка даводзіць.

Плакун *(замкнута, ціха)*. То-та і яно...

Панфёр. Ад суполкі да камуны рукой падаць... *(Пахлопаў сябе па шыі.)* Паспрабавалі шчасця... Сяк-так вылезлі, а яны... *(Недагаворвае.)* Трэба ратаваць сялянства.

Плакун. То-та і яно...

Захар *(не слухаючы іх, засмучаны)*. Не ў час, відаць, вярнуўся Марцін...

Варвара. А што яму? Ён мужык перадавы... У іх усе будуць спаць пад адной коўдрай... А то, глядзі, з самім Гараськам складзецца і ў абдымках араць паедуць.

Сенька *(ускіпеўшы)*. Варвара, Марцін не дасць спуску!

Варвара. А што, не праўда? Хіба не ходзіць ён па сяле, не падбівае кожнага? А Захар ужо і запісаўся да яго. Праўду кажу, Захар Іванавіч?

Усе здзівіліся і павярнуліся да Захара.

Анісся *(пляснуўшы рукамі)*. Бацюхны, куды запісаўся?!

Галасы. Куды, навошта? Ты ж у дастатку жывеш?

Анісся. Ты глядзі на яго — нат я не ведаю! *(Скрозь злыя слёзы.)* Куды запісаўся, ірад?

Захар збянтэжана доўга маўчыць.

(Бярэцца рукі ў бокі.) Я пытаю, антыхрыст, згубіцель дзяцей сваіх,— куды запісаўся?

З а х а р. Пачакай ты, не кіпяціся... *(Да ўсіх.)* Пагаманілі, памеркавалі мы з ім учора... Захацелася мне пад азіміну стары дубнячок пакарчаваць ды аблогі прырэзаць... Так як-небудзь супольна, агулам... арцельна... у адзіночку не возьмеш...

А н і с с я *(перапыняе).* Ай, горачка, у нас дзеўкі на выданні, а ён туды, і сораму не баіцца!

В а р в а р а. Пачакай, яшчэ да тваіх цялушак дабяруцца...

П а н ф ё р *(перабівае).* Спазнілася, ужо зноў выдумляюць — усіх нашых курэй і кароў на адзін двор, а малачко па распісачках!

П л а к у н. То-та і яно...

Анісся, уражаная, нейкі час стаіць з адкрытым ротам. Першай апамяталася Варвара.

В а р в а р а. Божа, нізашто! Касцьмі лягу!

А н і с с я *(падступае да Захара).* Ах, ты... Ах, ты... *(Не знаходзіць слоў.)*

З а х а р. Не вішчы ты, пачакай. Учора пагаманілі, а сёння сам бачу... *(Рашуча.)* Сёння яго агітацыю я і слухаць не буду! Няхай спачатку сваю Васілісу ад распусты суніме, а пасля і ў важакі лезе! *(Аніссі.)* Пойдзем, баба!

Непадалёку, у суправаджэнні дзіцячых галасоў, чуецца голас Марціна: «Расступіся, машкара балотная! Я вам пакажу верабейку!!!»

Г а л а с ы. Вось ён! Верабейка! Верабейка!

Усе знікаюць хто куды. Толькі Сенька разгубіўся і застаўся каля бярвенняў.

М а р ц і н *(з'яўляецца ў чырвонай непадпяразанай кашулі).* І тут ні душы! *(Парываецца за імі.)* Браткі!!! Захар!

Пастаяўшы, грузна апускаецца на бервяно. Каля яго асцярожна садзіцца Сенька. Адчуваючы сябе няёмка, яны доўга маўчаць.

С е н ь к а. Выпіў, мабыць, Марцін Рыгоравіч?

М а р ц і н *(яшчэ памаўчаўшы).* Аб камуне сумую, Сеня...

С е н ь к а. Зноў аб камуне?..

М а р ц і н. Я такі чалавек, Сеня. Няма мне дарогі назад. Я ўвесь там, у камунізме... Тут мне ўсё чужое...

С е н ь к а. Камуны ўжо даўно няма, а ты...

Марцін. А з я таго часу, Сеня, як паехаў у павет дабівацца зямлі для камуны, а вы расцягалі яе, з таго часу я і кідаюся па свеце, як уджалены звер. Дзе я толькі не пабыў, калі ўзялі мяне зноў у прадатрад. І ў Сібіры жалезныя масты навешваў, і ў пясках з басмачамі ваяваў... І нідзе не мог заглушыць тугу сваю непазбыўную аб камуне маёй... Вы думалі, развалілі камуну, дык і канец усяму. Не, не дам я вам спакою...

Сенька *(думае пра сваё)*. Не ўдалася нам тады камуна... Не хочуць мужыкі жыць «по равенству и братству».

Марцін. І ты не хочаш?

Сенька. Яно ж як не хацець пры маёй беднасці... Хоць бы арцельку пакуль, ды... *(Змоўк.)*

Марцін. Дагаварвай.

Сенька *(асцярожна)*. Марцін... а можа, спачатку ў сваёй сям'і разбярэшся?..

Марцін спахмурнеў і крута апусціў галаву, доўга маўчыць.

Марцін. Так...

Сенька. Павагі да цябе... праз бабу. Ад цябе ж шарахаюцца... Ці не бачыш?.. Усё сяло кіпіць... Якая ж тут камуна, арцель... *(З горыччу.)* Смяюцца... «Што яму,— гавораць,— Васіліса... Таго і глядзі, з самім Гараськам абнімецца і ў поле паедзе...» Крыўдна...

Марцін рыўком падымаецца, нервова праходзіць каля бярвенняў і, нібы не ведаючы куды сябе дзець, зноў садзіцца.

Даруй мне, Марцін, што я ўмешваюся... Патрэбны ты нашаму брату чалавек...

Марцін. Так... *(Яшчэ падумаўшы.)* Доўга Васіліса ў салдатках была... Устаяла... Другія салдаткі на чужым полі спіну гнулі, а Васіліса сама суполку прыдумала... Вось яна якая...

Сенька. Магчыма, магчыма, Марцін, толькі вунь нават поп казаў у царкве... *(Памаўчаў і нечакана для самога сябе.)* Не лаві верабейку...

Марцін *(коратка)*. Што?.. *(Нечакана ўскочыў, закрыў твар рукамі. Рвануўся за Сенькам, які адскочыў.)* Сенька... Сволач... Язык, язык вырву! *(Спыняецца і, нібы спалохаўшыся, няёмка чапляецца за пляцень.)* Дык... вось яна якая...

Сенька *(адбягаючы)*. Зламаўся чалавек! От бяда якая! *(Са страхам знікае.)*

М а р ц і н. Вось яна якая!

Паўза.

Абарвалася... Лютуе... Страшна мне... страшна... Колькі разоў я начамі стаяў каля плятня... перасіліць хацеў...

З поўнымі вёдрамі на каромысле з'яўляецца В а с і л і с а. Заўважыўшы яго, спыняецца.

В а с і л і с а *(памаўчаўшы)*. Марцін... з арцеллю... не выходзіць?

М а р ц і н *(віхрам паварочваецца да яе)*. Я да людзей падступіцца не магу праз цябе і Гараську!

Каромыслы з вёдрамі паволі спаўзаюць з яе плеч.

В а с і л і с а. Не вінавата!

М а р ц і н. Як мне вырвацца з такой ганьбы?

В а с і л і с а. Не вінавата я, Марцін, не вінавата!

М а р ц і н. А-а... ты з ім нават на полі начавала!

В а с і л і с а. Божа мой, што мне рабіць? *(Яму.)* Сумесна працавала, даводзілася і ў полі начаваць, а не вінавата...

М а р ц і н. Не, не, Васіліса... *(Памаўчаўшы, раптам усумніўся ў сваім падазрэнні.)* Страшна мне...

В а с і л і с а. І мне страшна, любы...

Паўза.

М а р ц і н. Без твайго слова мне адарвацца ад цябе... Апошні раз прашу — прызнайся! Дай мне свабоду, і я — прэч з вачэй, а вы жывіце... *(Горача.)* Васіліска... Васіліска... За ўсё... За ўсё маё... Успомні, як нёс я цябе на руках з поля, калі мы працавалі ў Панфёра. Ты стамілася, а я нёс.

В а с і л і с а. Я тады не стамілася, а маленькай прыкінулася... я хацела, каб ты нёс... А ты ўспомні, як мая мама не пускала за цябе замуж, у тваю беднату, а я праз агароды сама да цябе прыйшла да вяселля...

Марцін адвярнуўся, некаторы час моўчкі стаіць і глядзіць за возера.

М а р ц і н. Ты нават учора падгаварвалася ехаць з ім у поле.

В а с і л і с а *(мімаволі)*. А цяпер жа ты і сам будзеш з ім ездзіць, любы, калі...

М а р ц і н *(ускіпеўшы)*. Я? Я з ім?!

Васіліса. А куды ж нам дзецца з адной кульгавай клячай, калі ў цябе з арцеллю не выйдзе... Не зноў жа ў батракі.

Марцін. Няшчасце!

У роспачы штурхае яе, яна павалілася, зарыдаўшы, абдымае зямлю; ён кідаецца прэч.

І адарвацца ад яе не магу! *(Да зруба.)* Моцна ж ты залез у душу ёй, ціхоня! Не век жа табе сядзець у зрубе!

Васіліса *(горка галосіць)*. Ой, гора маё, горачка...

Убягаюць **Плаксіха** і **Плакун**.

Плаксіха *(нахіляецца да Васілісы)*. Васіліска, дачанька! Божа, прызналася б ты, ці што, акаяннаму.

Васіліса. Я-як? Прызнацца? *(Здзіўленая і перапуджаная, ускочыла на ногі.)* Прызнацца, хоць нічога і не было?!

Плаксіха. І сазнайся! Ну і што! Бог з ім!

Васіліса *(са страхам адмахваецца ад яе)*. Што вы, што вы, цётачка?..

Плакун. Цётка добра раіць. Гэта ўсё, што табе засталося, Васіліса. Што тут мучыцца...

Васіліса *(замітусілася паміж імі)*. Дзядзечка! Цётачка мая родная! Што ж гэта? На што вы мяне падбіваеце? Ці крыжа на вас няма?..

Плаксіха. Ёсць крыж, толькі цябе шкода, што ж у цябе за жыццё?

Плакун. А будзе яшчэ горш. Сама ведаеш — агоньчалавек,— накінецца на каго-небудзь і... сам не свой хадзіць...

Васіліса *(у замяшанні)*. Што мне рабіць, родныя мае? *(Некаторы час маўчыць.)* Прызнаюся, хоць і не было! *(Кідаецца за Марцінам, крычыць.)* Марцін! *(Хутка паварочваецца.)* Не магу! Ён пойдзе... пакіне.

Плаксіха. І няхай ідзе ад грэху! Відаць, доля твая!..

Плакун. Нічога з ім не здарыцца,— пойдзе, і ўсё... У горадзе яму зручней... Камісарам ці кандуктарам ўладкуецца. А там, глядзі, і ты да яго паляціш...

Васіліса. Насумавалася я без яго, памучылася...

Плаксіха *(раптам грозным жэстам да варот)*. Ды табе не сёння заўтра вароты дзёгцем вымажуць!

Васіліса, глянуўшы на вароты, са страху ўскрыкнула.

А што тады з ім будзе?

П л а к у н. Усіх загубіць! Яго пашкадуй, Васіліса! Праломіць каму-небудзь галаву і загудзіць у Сібір!

П л а к у н і П л а к с і х а *(адначасова)*. Яго ратуй! Аб ім падумай! Аб ім!

В а с і л і с а яшчэ горш заліваецца слязамі і, знясіленая, накіроўваецца ў сваю хату.

П л а к с і х а *(узяла вёдры)*. Пойдзем, пойдзем, я табе па гаспадарцы памагу. Нікому ўжо ты цяпер не дакажаш. Прымі на сябе віну, і няхай ідзе куды вочы глядзяць. Пражывём і без яго. Інакш грэху не мінуць. *(Уводзіць Васілісу ў двор.)*

Плакун з трывогай затрымліваецца каля брамкі.

П л а к у н. Вось кара сышла на сяло.

У акне зруба зноў асцярожна паказваецца галава Гарасыча.

(Яму.) Даездзіўся ў поле з салдаткай! А я ж казаў табе,— не лезь, не лезь у гэту суполку! Вось і кукуй цяпер у сваім зрубе, як асуджаны... *(Падае кавалак бервяна, Гарасыч абыякава бярэ.)* А чаго не хапала — і гаспадарку завёў добрую і павагу займеў...

Г а р а с ы ч. Хацелася каб лепей, па-суседску, арцельна...

П л а к у н *(успыхнуў)*. Не скрытнічай перада мной! Змалку заляцаешся! Любіш жа яе?! Любіш?!!

Гарасыч цяжка ўздыхнуў, адварочваецца.

А-а, то-та!

Г а р а с ы ч. Без яе я ўсё роўна як сірата... *(Больш для самога сябе.)* Ці зразумее калі-небудзь...

Паўза.

П л а к у н *(раптам прынік да акна, азіраецца)*. Разумею... Столькі гадоў удаўцом... а ў цябе гаспадарка... матка старая, сынок малы... Тваёй суполцы нават цяжка не паспачуваць,— даруй, божа... Але... вы не вольныя. *(Памаўчаўшы, з сілай.)* Разорыць ён цябе, дашчэнту разорыць!

Паўза.

Г а р а с ы ч *(знешне спакойны)*. Я і сам ведаю — нам з ім цяпер не жыццё ўдвух...

За вуглом чуецца голас Марціна: «І адарвацца адсюль не магу!»

Плакун *(адскочыў і замітусіўся)*. Вось ён,— ізноў сюды! Хавайся, калі пастаяць за сябе кішка тонка! Нібы вецер шугануў... Так і кружыць над тваёй галавой... *(Адбягае да брамкі.)*

Яшчэ больш узрушаны, з'яўляецца Марцін, убачыў Гарасыча.

Марцін. От, ты-та мне і трэба! *(Выйшаў на сярэдзіну і шырока расставіў ногі.)* Выходзь, Гарас!

Гарасыч нейкі час маўчыць, набівае люльку.

Гарасыч. Яно, канечне, рана ці позна выйсці трэба. Ад цябе мне ніякага ходу, Марцін... Як ты прыехаў, усё з рук валіцца... Выйду на двор — за плятнём стаіш, засну — усё роўна перад вачыма... Дабром не паладзім...

Марцін. А якім гэта дабром ты збіраешся са мной паладзіць? Ці не хочаш ты, каб я табе Васілісу ўступіў, а сам перабраўся на другі канец?

Гарасыч. Пра Васілісу... хай сама... А рассяліцца нам... што ж, Марцін, калі па другому не выходзіць... у мяне гаспадарка, а ты чалавек вольны...

Плакун *(здалёк)*. То-та і яно...

Нібы задыхнуўшыся ад крыўды, Марцін нейкі час маўчыць.

Марцін. Я рэспубліку бараніў, а ты абжываўся, і я ж павінен.

Гарасыч. А што зробіш, Марцін, калі так жыццё склалася...

Марцін. Ану выйдзі... ты сама бяда майго жыцця...

Гарасыч *(успыхнуў)*. Я выйду! Усё прахам ідзе, адзін канец! *(І зноў знешне спакойны.)* Мне якраз бервяно абчасаць трэба...

З тапаром выходзіць да бярвенняў, Марцін хутка праходзіць да зруба, адразае яму дарогу назад.

Марцін. Цяпер я з табой не расстануся...

Плакун *(не прыбліжаецца)*. Што вы задумалі! Марцін! Марцін! Ну, пагулялі яны без цябе, ну, парадаваліся, дык што з таго? Ты перадавы, зразумець павінен... *(Сам сабе.)* Спета твая песенька! *(Хаваецца за браму.)*

Марцін і Гарасыч павольна ідуць адзін на аднаго.

Марцін. За ўсё з табой разлічуся...

Гарасыч. Не паддамся... не паддамся... Адзін канец... *(Раптам узмахнуў тапаром і ўторкнуў яго ў бервя-*

но.) Не магу пабіць чалавека! На тапор! Канчай! *(Выстаўляе грудзі.)* Канчай, душа неўгамонная! Двум не жыць!

Марцін ад нечаканасці падаўся назад, Гарасыч, пастаяўшы, вымае з кішэні люльку.

А-а можа, курнём, па старой дружбе?.. Курнём?..

Марцін. Ты яшчэ смяяцца?! *(Выхапіў тапор, хапае яго за грудзі.)* Смяяцца?

Са двара выбягаюць Плакун, Плаксіха і Васіліса, закрычаўшы, адступаюць да брамкі.

Колькі ты над маёй дружбай смяяўся, ціхоня! Цябе толькі ў суполку прынялі, а ты і тут напаскудзіў, уласнік! І цяпер жыццё засланяеш!.. Ты... ты...

На шум прыходзяць ад возера Ленін і Волечка. У Волечкі ў руках забіты каршун.

Ленін *(убачыўшы Марціна з тапаром)*. Што такое?!

Плаксіха *(кідаецца да яго)*. Не падыходзьце, не падыходзьце, загубіць можа!

Марцін *(трасе за грудзі Гарасыча)*. Праўда мне трэба, праўда...

Ленін *(падбягае ззаду, выхоплівае тапор)*. Звар'яцелі, баценька!

Марцін не паварочваецца за тапаром. Ашаломлены, застывае на месцы. Гарасыч адыходзіць, падносіць люльку да рота.

(Перадае тапор Плакуну.) Схавайце далей гэтага спрадвечнага «міравога суддзю».)

Плакун шматзначна пакруціў у руках тапор, кідае яго ў зруб.

Гарасыч *(Леніну)*. Аганьку не знойдзецца?

Ленін. Ды ідзіце ж! *(Падштурхоўвае яго да ганка.)*

Гарасыч узыходзіць на ганак і зачыняе за сабой дзверы. Марцін вяла памкнуўся за ім, але спыняецца і грузна садзіцца на бервяно, апускае галаву. Волечка кінула каршуна і падсела каля яго, але ён не звяртае на яе ўвагі. Між тым Плаксіха, нібы толькі што апамяталася, нечакана немым голасам кліча на дапамогу: «Каравул, ратуйце, памажыце!»

Убягаюць некалькі сялян, сярод іх Варвара і Анісся. «Што здарылася? Дзе? Каго?»

Плакун *(паказвае на Марціна)*. У Марціна зараз тапор адабралі!

Галасы. Бацюхны! Вось вам і супалка!

Панфёр. Я і кажу — трэба ратаваць сялянства!

Варвара. Божа, у супольным сямействе за тапары схапіліся! Анісся, пойдзем, пойдзем па сяле!

Анісся. Жыць не даюць!

Анісся і Варвара пабеглі. З трывожным гоманам разыходзяцца і другія сяляне. Ленін глядзіць ім услед.

Плаксіха. Ух, да чаго ж я напалохалася!.. (*Васілісе хутка.*) Ты чуеш, скажы! Цяпер за нас возьмецца.

Васіліса (*туліцца да варот*). Сказаць?..

Ленін (*Плакуну*). Што тут робіцца?

Плакун. Ды вунь, Васіліса, пляменніца мая, салдаткай была, прыдумала суполку з зяцем маім Гарасычам. Намер нібы неблагі, а хто цяпер паверыць ёй, што грэху не было? Я сам першы плюну ў вочы таму, хто паверыць!

Ленін. Так, намер неблагі, для салдаткі...

Плакун. Вось і пакутую са сваячкамі... У мяне там сёння базарны дзень, а я вось тут, з імі...

Волечка (*лашчыцца*). Татачка, родненькі...

Марцін (*заспакоіўся*). Дзіцятка, ясачка... Калі б ты разумела... (*Памаўчаў яшчэ, да Леніна.*) Такая справа... Хацеў праўду выпытаць...

Ленін. Пагарачыўся, бацэнька, пагарачыўся.

Марцін (*падымаецца*). Якое пагарачыўся, таварыш! Не толькі ў сям'ю, яны ў душу залезуць: кладуся спаць салдатам рэвалюцыі, а прачнуцца баюся батраком. На катарысці звар'яцелі! Не разумеюць, не спачуваюць... Сярод сваіх людзей хаджу і чалавека не бачу. Няма чалавека! Звярэю! Дзе, хто скажа мне праўду? (*Заўважыў Васілісу.*) Нават ад роднай жонкі не даб'юся...

Васіліса (*перабівае*). Марцін!

Марцін (*адмахваецца ад яе*). Не-е, чужая! Апошнім чалавекам зрабіла!

Плаксіха (*Васілісе*). Скажы, Васіліса! Чуеш!

Васіліса (*у адчаі, рашаецца*). Марцін?!

Вызваляецца ад падбегшай Волечкі, зрабіла крок насустрач мужу, але язык не паварочваецца.

Я... ты...

Плаксіха. Не маўчы, дурная!

Васіліса (*кідаецца да Плаксіхі на грудзі*). Хросная, няма сіл...

П л а к с і х а *(адштурхнула Васілісу)*. Цьфу, размазня! Як хочаш сама! Не шкадуеш ты яго! *(Выходзіць.)*

В а с і л і с а, згорбленая, нібы пастарэўшая, хістаючыся, выходзіць за брамку.

М а р ц і н *(назірае за ёй)*. Звар'яцець можна!

Л е н і н. Не, тут трэба разабрацца. Ці не пляце хто павуціну вакол вас?

П л а к у н *(баючыся выдаць свой страх)*. Хто тут можа плесці павуціну? Любы, родны... Спрадвеку — жыццё сялянскае...

М а р ц і н. Адыдзі, дзядзька, не рассыпай сваю мудрасць!

Плакун задзірліва стаіць на месцы.

Я прашу прабачэння, таварыш. Вы не ведаеце нашага жыцця... Дарэмна. У тупіку я... Няма мне выхаду... Усё...

Л е н і н *(хутка)*. Ну, калі ўжо вы ўбачылі тупік... значыць, у вас ёсць выхад! Трэба агледзецца...

М а р ц і н. Агледзецца... Выхад...

П л а к у н *(Леніну)*. Недарэчы ўмяшаліся, грамадзянін паляўнічы. Чалавек па краі ідзе... Ды і якое ўжо тут... *(Пакасіўся на Марціна, мелькам.)* Хіба што ў горад яму падацца, ці што...

М а р ц і н. Ніколі не думаў, што можа быць са мной такое...

Л е н і н. А вы падумайце!..

М а р ц і н. Не-е, не трэба... вось так жа яшчэ ў семнаццатым напаткаў аднаго пад Піцерам... Душу распаліў... Чалавекам сябе адчуў... Сорам і ганьбу сваёй батрацкай долі ўбачыў... Быццам на крылах вярнуўся ў падмаскоўе, поўны радасці бітвы... увесь павет так узбударажыў... Атрад вадзіў, панскую зямлю дзяліў, камуну нават стварыў, вы разумееце — камуну! Дружбы хацеў мужыкам... савецкую ўладу на сваіх руках, як святое дзіця, у сяло прынёс... А яны што са мной зрабілі... Хаджу, клічу... лес цёмны... Я ў іх недалужны... Вераб'я лаўлю... Піць пачаў... А вы кажаце...

П л а к у н. Я і кажу, засталося табе ў горад, ці што, падацца...

М а р ц і н *(з горыччу)*. Сям'ю апаганілі! З-за былога сябрука Васілісу абняць не магу!.. А ўсё гэты крутню заварыў *(ківае ў бок Плакуна)*, святоша!

Плакун кідаецца ўбок, потым нечакана з задзірыстасцю падбягае да яго.

П л а к у н. Дык, па-твойму, я ўгаворваў яе, ці што, ездзіць з ім у поле?

М а р ц і н *(ледзь стрымліваецца)*. Ты... ты не ўгаворваў, ты ўсё божым угоднікам прыкідваўся і рай абяцаў, а цяпер гэты гандлёвы круцень выдумаў, карыслівасцю душы апаганіў, і сумленне людзі страцілі.

Плакун разгубіўся, нейкі час маўчыць, не ведае, што сказаць.

П л а к у н. Чакай... чакай... Ах, вось як! На самае святое ў нашым жыцці замахнуўся? Я так і ведаў...

Л е н і н *(з вялікай цікавасцю)*. А што такое «круцень»?

М а р ц і н. Значыць, у абаротах таварыства зберажоныя грошы сялянскія круцяцца...

П л а к у н. І далей, прыбытак сялянам прыносіць!.. А ты верабейку ловіш... ды яшчэ пры чужым чалавеку нясеш усялякае... Божага ўгодніка прыплёў... *(З пагрозай.)* Ну, Марцін... ты, аказваецца, сур'ёзна незадаволены... Савецкая ўлада гандаль разгортвае, а ты ганіш гэта пачынанне. Людзі стараюцца, а для цябе ўсе мужыкі — карыслівцы і бессаромныя...

Л е н і н *(больш для сябе)*. Н-да... Цікава...

М а р ц і н *(уважліва паглядзеў на Плакуна)*. Ты баішся мяне.

Паўза.

П л а к у н. Я? Цябе?.. Чаму баюся? *(Успыхнуў.)* «Баішся»! «Святоша». Быццам у яго нешта за душой, а я пасынак, ці я не гаспадар у савецкай улады!.. *(З пагрозай паківаў у бок сяла.)* Ты чуеш, што на базары робіцца?

Усе прыслухоўваюцца. З цэнтра сяла чуюцца ўзбуджаныя галасы, выразна даносяцца словы: «Верабейка»... «жыць мяшаюць!» Марцін задумваецца. Ленін не спускае з яго вачэй.

М а р ц і н *(нечакана)*. Я сам зараз пайду туды...

П л а к у н. Пасля тапара? На базар? На млын, дзе ўсе сабраліся? Ведаеш, Марцін... *(Падняў рукі.)* Бог сведка — усё што мог зрабіў... *(Пагрозліва.)* Ідзі... там для цябе нават сходачку могуць склікаць... Давядзецца!.. *(Рашуча выходзіць)*.

М а р ц і н *(яму ўслед)*. І там яшчэ паглядзім! *(Да Леніна.)* Вы, пэўна, таксама лічыце, што я толькі вераб'ёў даставальнік *(Ускліканў.)* Разварушу! Разварушу ўсё! Я пайду да іх на базар, на млын, у двары! Я патрэбую вяр-

нуць маёмасць камуны! Калі ёсць у мяне выхад, дык толькі гэты. Я напралом да іх пайду, проста ў пекла ўласнасці... *(Выходзіць.)*

Ленін *(здзіўлена)*. Вось гэта салдацішча, баценька ты мой... Сапраўды, па самым краі ідзе... Не, тут трэба разабрацца да канца... *(Задумваецца.)*

З брамкі зноў з'яўляецца Васіліса, зажурылася, неадрыўна глядзіць услед Марціну. Ад возера прыбягае Камолаў.

Камолаў *(запыхаўшыся)*. Уладзімір Ільіч! З ног збіліся... Шукаем вас, а вы тут... І ў такім акружэнні...

Ленін. А што, гэта вас шакіруе, пан бальшавік?!

Камолаў *(сумеўшыся)*. Што вы, Уладзімір Ільіч... А пры чым тут «пан»?

Ленін. А пры тым, што гэта і ёсць жыццё народа, вечная крыніца ідэй, якіх у вас заўсёды не хапае!

Камолаў *(насупіўся)*. Я меў на ўвазе... Тут за тапары ўхапіліся... Нейкая сямейная сварка...

Ленін. Не ведаю... З вывадамі не спяшаюся. А калі б і так,— што ж тут недатыкальнага?

Волечка *(Камолаву)*. А ты, відаць, не ідэйны! Ты на казу дзядзькі Гарасыча падобны... І не сорамна?..

З цэнтра сяла зноў чуецца трывожны гул галасоў. Ленін прыслухоўваецца.

Ленін *(заспяшаўся)*. Я туды! Ну, Волечка *(падае руку)*, да пабачэння... *(Васілісе.)* Бывайце!

Васіліса *(думае пра сваё)*. Бывай, родны...

Ленін. Заўтра прыйду...

Волечка. Ты не прыйдзеш?!

Ленін. Абавязкова прыйду... А як жа паляванне? Мы ж дамовіліся?

Волечка. Дамовіліся? А калі ты без мяне на паляванне пойдзеш? Пакінь стрэльбу!

Ленін *(рассмяяўся)*. Ах ты якая хітрая! Стрэльбу табе я не дам. Калі хочаш, сама раненька прыйдзі да ляснічага. Прыйдзеш?

Волечка. Прыйду!

Ленін. Ну і цудоўна. *(Намерыўся ісці, раптам, павярнуўшыся да Васілісы.)* Што гэта яны на вас?..

Васіліса *(уздрыгнула)*. Не вінавата!

Ленін *(сумеўшыся)*. Я не аб тым...

Васіліса. Разам працавалі, а не вінавата!

Ленін *(успыхнуўшы)*. Га́няць! Суполку, арцельнасць

га́няць! Невераемна! Чуюць, дзе іх магіла... *(Задумаўся.)* Н-да... Арцельнасць... *(Нечакана да Волечкі.)* Тут і твой інтарэс *(да Васілісы)*, і ваш, і мой... І наш агульны... *(Камолаву.)* Так, іменна кааперацыя!

Камолаў *(адскочыў)*. Што кааперацыя, Уладзімір Ільіч?

Ленін. Я разумею,— вы зноў скажаце, што яна выдумана утапістамі, што яна меншавіцкая, эсэраўская! Няхай, а нам хто забароніць ствараць такую кааперацыю, якая нам патрэбна? Куды захочам, туды і павернем. Мы тысячы год шукаем адзінства — асабістага і грамадскага. А вось тут якраз яно і ёсць. А што гэта такое? Гэта тое, без чаго не можа нарадзіцца і расці наш свабодны камуністычны чалавек. Гэта ўсё, што нам трэба. Настаў час! Павернем! Хутка. Бадай, заўтра! *(Хутка ідзе ў цэнтр сяла.)*

Камолаў. Надзвычайна! *(Даганяе яго.)* Уладзімір Ільіч, я здзіўлены і не зусім разумею дыялектыку такога шырокага планавання кааперацыі ў перыяд, калі мы ўсур'ёз паглыбляем нэп, але я нічога не гаварыў пра кааперацыю! Чэснае слова, не гаварыў!

Ленін *(на хаду, засмяяўся)*. Не гаварыў? Калі не гаварыў, дык гаварылі такія ж, як вы, аўтары надуманых вывадаў! *(Павярнуўся да Камолава.)* Так, дазвольце, а што вы тут робіце, Камолаў? Я ў адпачынку, а вы?

Камолаў. Я... я з вамі... Вы ж у нашай губерні... І... у мяне тут важныя прадуктовыя пытанні...

Ленін. Світа мне не трэба! Абыдуся без апекі. Займіцеся сваімі справамі. Жадаю поспеху. *(Раптам з запалам.)* Так павернем! *(Знікае.)*

Камолаў *(разводзіць рукамі)*. Прыехаў адпачыць, а тут... Як яго аберагчы?.. От задача! *(Пайшоў на возера.)*

Васіліса прытуліла да сябе Волечку, уся ўвага яе накіравана туды, адкуль з новай сілай чуваць грозныя галасы.

Заслона.

АКТ ДРУГІ

Базарная плошча: злева грыміць кузня, побач вароты паравога млына, чуецца гул галасоў і цяжкае пыханне рухавіка; справа на пярэднім плане вылучаецца багата аздоблены разьбой ганак

з шыльдай «Кооперативная многолавка», на ёй намаляваны дзве рукі, якія паціскаюць адна другую; на калоне ганка намаляваны плакат. «Вносите сбережения в оборот своего кооператива, приобретайте доходные квитанции крутеня! — это прибыльно и надежно!» Супраць магазіна кветнік і вялікі куст каліны з буйнымі гронкамі; каля куста столік і лаўка; за магазінам рады базару, але іх не відаць. Час ад часу на плошчу з базару паказваюцца самыя нечаканыя фігуры гандляроў, якія прадаюць усялякія тавары: ад гузікаў, хамутоў і атласа да таямнічага кораня. Чуюцца заклікі і прымаўкі прадаўцоў.

На лаўцы сядзіць Ленін, палажыўшы блакнот на калена, піша, часам прыслухоўваецца.

З млына, заглушаючы шум базару, чуюцца словы: «Сораму ў іх няма! Як жа тут працаваць, калі спакою не даюць!»

Па плошчы, паміж кузняй і млыном, сноўдаюцца сяляне і сялянкі — нясуць хто мех з мукой, хто лямех, хто — пакупку.

У цэнтры плошчы Варвара і Анісся.

Варвара *(залівaецца ад смеху)*. Мужыкі! Бабы! Ці чулі, што ў супольным сямействе творыцца! Пацеха! Ха-ха-ха-ха! Калі ў вас ёсць дзеўкі ці хлопцы — пасылайце хутчэй да Васілісы,— яна бясплатна навучыць і нават пакажа, як цяпер па-новаму жыць! Перадавая свабода, і ніякага сораму! Ха-ха-ха-ха! Хо-хо-хо!

Анісся. Што робіцца, што робіцца, любыя мае... Жыццё рушаць!

Іх хутка абкружаюць абураныя сяляне, сярод іх Панфёр і Захар.

Панфёр. Трэба ратаваць сялянства!

Захар. Яе праўда, у мяне дзеўкі на выданні!

З магазіна на голас выходзіць пануры і змрочны Плакун. Усе павярнуліся да яго.

Галасы. Дзядзька Пятро, што ж гэта вытвараецца ў нашым сяле? Што ні дзень, дык навіна: не камуна — дык суполка, не суполка — дык яшчэ што-небудзь душы муторыць! А ўсё Верабейчык! Галоўнае — Верабейчык. Так і баламуціць, так і калоціць сяло! А ты, дзядзька Пятро, нібы патураеш сваім сваякам... Што ж мы без бога, ці што, жывём!..

Плакун *(паспешліва)*. Правільна. Без бога нельга. Хто-небудзь ды павінен...

Галасы. Трэба нешта рабіць! Што мы — управы не знойдзем на гэтых баламутаў! Годзе патураць ім!

Плакун. Бяда, дый годзе! А я што магу? *(Памаўчаў.)* Тут... тут неяк трэба ўсім вобчаствам... *(Яшчэ па-*

маўчаў.) Сёння ўпаўнаважаны з павета прыедзе... парамся ўсёй грамадой... калі згодны...

Галасы. Даўно б так! Нацярпеліся! Трэба ратаваць сялянства!

Абураюцца, сяляне разыходзяцца хто куды: Панфёр і Захар ідуць на млын. Плакун азіраецца і заўважыў Леніна.

Плакун *(да яго)*. От, кара нябесная! Па вуліцы новы эканамічны год ступае ў залатым ззянні, а ў нас такая смута! І гэтым не дагадзіў, хоць і начэй не сплю, для вобчаства стараюся, і той вярзе на мяне ўсялякае! А вы вот... Усяго тут наслухаецеся і мала якія чуткі ў Маскву павязеце! *(Засмучаны, садзіцца побач з Леніным.)*

Анісся *(на тым жа месцы)*. Што робіцца, што робіцца... Заступіся, божа, за маіх дзевак... *(Раптам падыходзіць да Плакуна, хрысціцца.)* Блаславі, дзядзька Пятро, святым словам...

Плакун, збянтэжаны, аж падскочыў.

Плакун *(рэзка адхіляе яе)*. Хай цябе поп словам блаславіць, а я цяпер «красным» таварам ды заможным жыццём вас павінен блаславіць! А ты прыстаеш!

Анісся, разгубленая, азіраецца і падыходзіць.
Паўза.

Ленін. Цяжкавата, відаць, вам, грамадзянін Плакун?

Плакун. Ды ўжо ж не лёгка...

Ленін. Вы кажаце, салдат на вас вярзе, а вы ж нібы і праўда ў іх... за святога ўгодніка?.. А?

Плакун. Не мая віна, паважаны грамадзянін.

Ленін. А чыя ж?

Плакун. Сам народ мяне святым прызнаў. Я з германскай з трыма Георгіеўскімі крыжамі вярнуўся цэлы і здаровы, добраахвотнікам быў — гаварылі, мяне куля не брала. З навакольных сёл прыходзілі на пакланенне. У рэвалюцыю даверылі пячатку ў старасты забіраць. І вот пакутую... *(Памаўчаўшы.)* А можа, я і праўда святы? Як вы думаеце?

Ленін *(усміхаецца)*. Гэта вы-та святы... А праўда, што вы бралі плату за тое, што чужыя грахі замольвалі?

Плакун *(закашляўся)*. Плату? Крый божа! Не плату, а міласціну браў...

Ленін. Я разумею, маліцца за другіх час трэба, а час для гаспадара — грошы...

П л а к у н *(згаджаецца)*. То-та і яно,— якая ж карысць мне за так маліцца? Хоць каму давялося б... Самі ж прызналі... а як жа...

Л е н і н *(засмяяўся)*. А вы што бралі за сваё маленне? Просвіркай ці жыўнасцю?

П л а к у н *(зноў закашляўся)*. Жыўнасць — яно, канечне, зручней, у вобчам... Просвірка,— што ж, з'еў і забыўся. А парсючок ці ягнятка бегае па двары і ўвесь час напамінае, аб кім больш маліцца. А то нешта забывацца стаў...

Л е н і н *(зноў засмяяўся)*. Што ж, вы і прадвяшчаць маглі?

П л а к у н. Ну, вядома...

Л е н і н. А з чаго вы бралі?

П л а к у н. А як уздумаецца. Раз мяне прызнавалі святым, дык я думаў, маімі вуснамі «глаголіць усявышні»... Я ўсё сны і праявы бачыў...

Л е н і н. А калі шчыра, без падману?!

П л а к у н *(ажывіўся)*. Шчыра?

Л е н і н. Так.

П л а к у н *(памаўчаў, хутка)*. Усё падман. Толькі падман. Для заспакаення душ людскіх, на дабро ўсім!

Л е н і н. Вось бачыце, які вы святы!

П л а к у н. Яно так, я і сам не ведаю, як гэта я стаў вядомым... *(Паспешліва.)* А можа, яно не ад нас ідзе?

Л е н і н. А ад каго ж?

П л а к у н. Жыццё, асабліва пасля вайны, усё-такі шматпакутнае. У аднаго бацька загінуў, у другога сын без вестак прапаў, трэці дарогу ў жыцці згубіў... Кожны шукае ўцяшэння. От і з'яўляецца перад імі направіцель жыцця... У нашай мясцовасці ён з'явіўся, выходзіць, у маім вобразе. *(Паспешліва.)* Можа, думаю, людзям трэба святы? Што вы скажаце? Ну, святы ці там асаблівы вышэйшы чалавек, як бы чалавек, надзелены богам не так, як другія, і трапяткім шанаваннем акружаны...

Л е н і н. Звышчалавек, значыць? Акружаны людзьмі трапяткімі і запалоханымі. Акружаны трапяткім шанаваннем. Акружаны людзьмі, якія трымцяць ад страху перад гэтым разумнікам?

П л а к у н. Трошкі не так. Акружаны благагавейным трапятаннем.

Л е н і н. Ён усё ведае, ніколі не памыляецца, а людзі вакол яго грашаць і каюцца, каюцца і грашаць...

П л а к у н. Ісцінна так, ісцінна так!

Л е н і н. Свае мыслі ён вяшчуе як найвышэйшы закон: сказаў — пакараў, сказаў — памілаваў! А пасмее крытыкаваць хто яго абмежаванне — аддаецца анафеме, як Іуда і Каін...

П л а к у н. А як жа, яшчэ ў святым пісанні сказана: «Не рече хулы на вышнего твоего!»

Л е н і н. Карацей кажучы — ён поўны гаспадар над людзьмі, што хоча, тое і робіць з імі, як і ўсякі гаспадар са сваёй скацінай. Дык вось, у нас быў такі разумнік, і мы яго скінулі.

П л а к у н. Каго?

Л е н і н. Цара! Ён па-зверску знішчаў рэвалюцыянераў, душыў усё смелае і таленавітае, а тыя, што благагавелі, называлі яго «збавіцелем»: ён быў катам для народа, а яго называлі бацюшкам, ды яшчэ міласэрным! *(Памаўчаўшы.)* Вы зразумелі мяне?

П л а к у н *(таксама памаўчаўшы)*. От цемната наша мужычая, бач, як гэта можна павярнуць... А выходзіць, не вельмі ўжо... *(раптам весела, з хітрасцю.)* А ў камуністаў, даруйце, пэўна, ёсць і свае празарліўцы? Хіба не?

Л е н і н. Хто, напрыклад?

П л а к у н. Ленін... Калінін Міхайла Іваныч, а?

Л е н і н *(падняўся і тут жа зноў сеў)*. Э-э, не, братка,— сіла Калініна якраз у тым і заключаецца, што ён па службе стаіць вышэй другіх, паколькі яго выбралі на пэўны тэрмін, а па прыродзе ён не лічыць сябе вышэй другіх... Па прыродзе ён звычайны працоўны чалавек, толькі лепей за іншых ведае жыццё народа і як старшыня ВЦВК правільна кіруе краінай на карысць народа. Ніякай тайны са сваёй дзяржаўнай работы не робіць, усё вырашае не за зачыненымі дзвярамі, а адкрыта. Адсюль народная любоў да нашага Калініча. Камуніст, які ўявіў сябе над народам, становіцца небяспечным і перастае быць камуністам. Такіх маньякаў і авантурыстаў, па-мойму, трэба выкрываць і бязлітасна ўбіраць з дарогі. Кім бы яны ні былі, чым бы ні прыкрываліся...

П л а к у н. Не, не, усё-такі нехта ж павінен быць... Трэба!.. Ды, папраўдзе, ёсць нешта для простага розуму не даступнае... Адзін чалавек — ні богу свечка ні бабе качарга, а другі на самога бога падобны... Нельга такое адмаўляць...

Л е н і н *(засмяяўся)*. Дазвольце... Ваша знатнасць закончылася? Ці яшчэ не?

П л а к у н. Ды якая там была знатнасць... Мяне палічылі, кажу, святым, а я і паверыў... Было і прайшло... Цяпер другое... Цяпер такое прасвятленне ў мяне на карысць вобчаству, дзе там святому ўцяшэнню, аж сам дзіўлюся, міл-чалавек! *(Таямніча ківае на магазін.)* Там кожнаму будзе...

Л е н і н *(з вялікай цікавасцю)*. Матэрыяльна зацікавіў?

П л а к у н. Не буду маніць — усімі душамі завалодаў!

Л е н і н. Вось як! А чым гандлюеце?

П л а к у н. Ад сапраўднага марозаўскага паркалю да парыжскага блакітнага атласу!

На млыне нарастае шум.

Калі ласка, пацікаўцеся, а я схаджу ў млын, чуеце, ізноў там нешта здарылася! *(Пабег у млын.)*

Ленін нешта запісвае. З-за кузні засмучаны і занепакоены асцярожна паказваецца **Г а р а с ы ч.** Ён некага шукае.

Г а р а с ы ч *(заўважае Леніна)*. Вось ён... той, гарадскі...

Л е н і н *(не заўважае Гарасыча)*. Пацікаўлюся. *(Пайшоў у магазін.)*

Гарасыч ідзе следам. Падымаецца на ганак, але, заўважыўшы Васілісу, здзіўлены, спыняецца: «Васіліса!» Бяжыць за дальні вугал кузні. У чорнай хустцы з'яўляецца **В а с і л і с а.** З трывогай прыслухоўваецца да галасоў у млыне, спыняецца каля другой сцяны кузні. Гарасыч, абышоўшы кузню, падыходзіць да яе ззаду.

Г а р а с ы ч *(ціха)*. Васёна...

Васіліса спалохана паварочваецца да яго.

Дарэмна прыйшла сюды...

В а с і л і с а. За Марціна баюся... Адыдзі, Гарас...

Г а р а с ы ч *(раптам горача, хутка)*. Ды ты толькі паглядзі на сяло, усе будуюцца, багацеюць! А ён на ражон лезе за камуну! Ды каму яна трэба!

В а с і л і с а. Якая ўжо там камуна, хаця б арцель...

Г а р а с ы ч. Загубіць ён тваё дарагое жыццё! Пашкадуй мяне!

В а с і л і с а *(спалохана)*. Адыдзі, Гарас, адыдзі!

Г а р а с ы ч *(не слухае)*. Яшчэ дзявочыя ўборы носіш, а ты ў атласах хадзіць павінна! Суполкай будзем праца-

ваць, новы дом табе паставім, радасць у жыцці пазнаеш! А людзі пакрычаць, пакрычаць ды перастануць! Дай мне шчасця, Васіліса!

Васіліса. Дзякуй табе за суполку, а таму не бываць! Я кахаю Марціна! Ідзі! Закрычу!

Гарасыч. Не адступлюся ад цябе!

Васіліса *(аж затрымцела)*. Закрычу!!!

Гарасыч адскочыў, знікае за вуглом. Разгарачаная, залiваецца ад смеху, ізноў паказваецца Варвара. З ёй і Анісся.

Варвара. А галоўнае, кума, не бойся! *(У акно кузні.)* Эй, нячыстыя,— чулі? Ужо чулі? Пацеха!

Заўважылі Васілісу. Здзіўленыя, нейкі час маўчаць.

Анісся. Сама!

Варвара. Памыямі абліць яе, сцерву!

Васіліса, закрыўшы твар рукамі, адходзіць. Яны моўчкі глядзяць ёй услед.

А, дастукаліся... А ведаеш, кума, табе магу такое сказаць, што нават і ты не чула!.. *(Ціха.)* У Верабейкі нелады яшчэ і за савецкай уладай!..

Анісся. Бацюхны! А, а не брэшаш? Ён жа парцейны...

Варвара. Мне не верыш,— памерці трэба? Сам дзядзька Плакун гаварыў: розныя парцейныя бываюць — адны за камуну, другія за вольны гандаль і за Леніна.

Анісся. А і праўда ж... Ага... *(Убачылі Марціна.)* Глядзі, з кнігай... Проста пісар...

Хутка падыходзіць Марцін з папкай. Анісся стала «рукі ў бокі».

Варвара. Гаспадар пісарам, ці што, наняўся?

Марцін *(разгарнуў кнігу)*. Племянны жарабец Буян у цябе?

Анісся і Варвара насцярожыліся.

Варвара *(памаўчаўшы)*. У... у мяне... Ён мне дастаўся...

Марцін *(Аніссі)*. А конная малатарня ў вас?

Анісся *(мімаволі)*. Ай... А табе што? Яна нам на тры двары выпала...

Марцін. Гэта непадзельная ўласнасць камуны... *(Склаў папку, хутка пайшоў у двор млына.)*

Анісся. Ой... што гэта ён?..

Варвара. Не разумею... Няўжо дабро камуны ўлічвае?.. І кніга ў яго яшчэ тая!.. У пісара, пэўна, узяў...

Анісся *(з трывогай)*. Вось табе і нелады... Я ж кажу, парцейны ён...

Варвара. Няўжо назад... у камунію... Божа! Я ўсё жыццё хацела, каб мяне Гарас замуж узяў,— не ўзяў! З бервяном жыву! Я ўсё жыццё думала на ўласным рысорным хаду ездзіць... І вось у мяне Буян ёсць... Дык каб я цяпер, ай, божачка, бяжым, кума, бяжым! Дзе Панфёр, Захар, дзядзька Плакун!!!

Анісся. Бацюхны!

Кідаюцца па базары: «Улічваюць — усё начыста перапісваюць». З боку базару выбягае перапалоханы гандляр: «Каго ўлічваюць?! Якая камуна?! А вольны гандаль як жа?» Тут жа хавае тканіну за пазуху, знікае. З млына ў той жа час чуюцца словы: «Які ўлік?» — «Па якому праву?» — «Не дазволім!» Адтуль выбягае Плакун. З магазіна яму насустрач — гэтак жа ўсхваляваная Плаксіха.

Плакун *(кіўнуўшы на млын)*. На што адважыўся?.. Не верыцца! Так і кліча, так і кліча на сябе бяду...

Плаксіха. А што, калі праўда адбяруць млын і... *(Кіўнула на магазін.)* Нашы капіталы ў абароце...

Плакун. Рукі кароткія! Сёння пакончым... Супроць савецкага ўстоя пайшоў! Не адыходзь з магазіна!

З-за кузні з'яўляецца Гарасыч.

Гарасыч. Цвікоў нідзе не знайду...

Плаксіха *(ціха)*. Якія табе цвікі,— не чуеш?.. Улічвае! А ў цябе бярвенні для хаты... пасля камуны... *(Ідзе ў магазін.)* Пойдзем у краму, знайду цвікі.

Гарасыч, яшчэ больш занепакоены, ідзе з ёй у магазін. З кузні, на шум млына, выходзяць Мікіта і Сенька. Да іх далучаецца вельмі ўсхваляваная Дар'я.

Сенька *(трывожна)*. Глядзі, базар разбегся!

Мікітка *(ім, ціха)*. Не ў час пачаў Марцін... Куды тут да камуны, нам бы арцель, пакуль...

Яшчэ больш узбуджаныя ўбягаюць Варвара і Анісся з крыкамі: «Высвятляе, цяпер ужо ўсё да нітачкі перапісвае».— «А дзе ж нашы мужыкі? Бяжым на млын!» Насустрач ім з шумам, нібы пад напорам, насцеж расчыняюцца вароты млына. З гоманам выходзяць Марцін і ўзрушаныя, запыленыя мукой сяляне, сярод якіх Плакун, Панфёр, Захар. «Ты замучыў нас!» — «Даволі!» — «Нацярпеліся!» — «Вон адсюль!» — «Вон!»

Марцін. Ну, нібы на розных мовах гаворым!

Мікітка і Сенька адводзяць Марціна да кузні, аб нечым трывожна гавораць. З магазіна выходзіць Ленін, а за ім Гарасыч. Гарасыч заўважыў Марціна, спыніўся.

Ленін *(бярэ яго за локаць)*. Нічога... нічога... Вас па бацьку, здаецца, Гарасімавіч?

Гарасыч. Так. Ці мае ён законнае права ўлічваць, калі народ супраць? Гаспадарка ў мяне, таварыш... а тут спакою няма...

Ленін зноў падыходзіць да лавы. З ім садзіцца і Гарасыч. Прыходзіць з партфелем павятовы ўпаўнаважаны Сазонава.

Сазонава. Старшыня!

Плакун. А-а, камісарша! Даўно чакаў! *(Кіўнуў на столік.)* Калі ласка, прысядзьце! *(Марціну.)* Цяпер крыўдуй на сябе! *(Рэзка павярнуўся да млына.)* Мужыкі, грамадзяне! Хадзіце сюды!

Сазонава *(да Леніна)*. Пасуньцеся, таварыш.

Ленін *(адсоўваецца)*. Калі ласка.

Сазонава *(раскладае партфель на стале)*. Вы тутэйшы?

Ленін. Тутэйшы. А вы хто?

Сазонава. Няўжо не бачыце? Упаўнаважаны.

Ленін. Па якіх справах?

Сазонава. З установкай на каап і дзяржнядоімкі. Ясна?

Ленін. Каап і дзярж... Ясна!

Сазонава *(Плакуну)*. Старшыня, дакладвай, што табе перашкаджае, ці ёсць нядоімшчыкі, ды карацей! Мне яшчэ трыццаць сёл абскакаць!

Плакун урачыста падыходзіць да стала.

Плакун. Рады б далажыць паспяховасць, ды што зробіш, няўстойлівыя ёсць! *(Рэзка паказвае на Марціна, які стаіць воддаль.)* Вось ад каго нам спакою няма, ён жыць не дае!

Усе з шумам паварочваюцца да яго.

Марцін *(з запалам)*. Так, так, я віноўнік вашых турбот, таму што не магу спакойна прайсці міма вашага бессаромнага ўласніцкага жыцця!

Галасы *(выбухам)*. Як ты смееш? Чаго ты прычапіўся да нас! Міліцыю сюды! Міліцыю!

З а х а р *(у агульным хоры)*. Звязаць яго!!!

Марцін нечакана кінуўся да яго, спыніўся перад ім. Усе змоўклі.

М а р ц і н. Каго вязаць?! Нашто міліцыю?! *(Памаўчаўшы.)* За нажыткі свае спалохаўся? Эх ты, дзіця!

З а х а р *(выставіў вялікую лапатападобную бараду і адступіў)*. Я д-дзіця?..

М а р ц і н. А хто ты, калі не дзіця? Яго мамка на рукі бярэ, пялёнкі хоча перамяніць, а ён крычыць, а ён заходзіцца, слова не дае сказаць — уа-а, у-а, не хачу, міліцыю сюды, міліцыю... А на каго міліцыю? Каго звязаць? Свайго былога камандзіра? Камунара? *(Абвёў беглым позіркам злосна насцярожаных сялян.)* Паглядзіце на сябе! Бач, прытаіліся... А раптам трахане маю скарбонку... А раптам зачэпіць маё зберажэнне! На нажыве звар'яцелі! Прыехаў дамоў, а тут гляжу на вас і нікога не пазнаю... Быццам незнаёмыя мне... нібы няправільныя... За што... ваявалі, кроў пралівалі? Няўжо за вашы скарбонкі і рукі заграбушчыя! Не-е, трэба рубіць старое пад самы корань!

Л е н і н. Н-да...

П а н ф ё р. Браткі, ды да якіх жа пор ён будзе заглядаць у нашы кішэні!

З а х а р. Даволі яго слухаць! Трэба канчаць з ім!

П л а к у н. Пачакайце вы! *(Злосна да Марціна.)* Помні — ты гаворыш сваё апошняе слова... Якое яно — скажы!

Усе чакаюць, што скажа Марцін.

М а р ц і н *(памаўчаўшы)*. Звязіце асноўную маёмасць камуны. Па статуце яна недзялімая. Вось маё апошняе слова.

Паўза.

П л а к у н *(са страхам)*. Па-па статуце... *(Знайшоўся.)* Статут сход прынімаў, сход і скасаваў!

Г а л а с ы. Правільна! Скасавалі!

М а р ц і н. Статут нельга сходам адмяніць, ён зацверджаны ў губвыканкоме! Была камуна, ёсць і будзе! З вамі не згаваруся, у Маскву паеду!

С а з о н а в а *(пры поўнай цішыні)*. Не разумею, аб чым ён гаворыць?

А н і с с я *(разгублена)*. Вось табе раз... Няўжо і праўда вяртацца... у камунію?

П л а к у н *(хутка)*. Гэта ад вас будзе залежыць! Мы сапраўды накапленнем і аднаўленнем заклапочаны, а ён

ізноў са сваёй камунай стаў над душой... бог сведка — рады няма... Выхад ёсць толькі адзін...

Панфёр *(з натоўпу)*. Трэба ратаваць сялянства...

Плакун *(смялей)*. Праз немагчымасць пражывання з ім у адным сяле... *(З рашучасцю.)* Адлучыць яго ад вобчаства! Або давайце звозіць маёмасць...

На міг зноў наступіла маўчанне. Гарасыч, спалоханы, ускочыў на ногі і потым зноў сеў. Мікітка ўвесь падаецца ўперад. Дар'я ўсклікнула.

Вы ўпікаеце мяне за патуранне сваякам... цяпер рашайце!

Галасы *(выбухам)*. Правільна! Адлучыць! Выселіць! Даўно пара! Правільна, таварыш Плакун! Ён шкодзіць нам! Супроць народа пайшоў! Вон з сяла! Давай прыгавор! Галасуй! Галасуй!

Марцін *(здзіўлены і разгублены да Мікіткі)*. Ты толькі паглядзі на іх...

Мікітка *(выходзіць наперад)*. Стойце, чакайце... *(Да Плакуна.)* Што гэта ты? Ачмурэў? Відаць, тонкая твая святая праўда, калі ты свайго супрацiўніка выжыць хочаш... Такое ўчыняць пры савецкай уладзе... Спрэчкі спрэчкамі, а такога яшчэ не бывала. Бач, які святы... Ды што гэта такое?!

Плакун *(падбег да яго)*. А ты як сакратар камячэйкі ведаеш, што яго двор нават не ўвесь праднaлог заплаціў? Ці ваша камячэйка гэта геройствам лічыць?

Мікітка мімаволі сумеўся.

А-а, то-та! *(Вяртаецца на сваё месца.)*

Галасы. Галасуй! Галасуй! Канчай з ім!

Сазонава. Ах, вось у чым справа,— ён, аказваецца, нядоімшчык! Ай-яй-яй...

Варвара *(у агульным хоры)*. А самагонку ж перадавым людзям трэба купляць за што-небудзь? Як вы думаеце?

Дар'я *(ціха)*. А можа, яму плаціць няма чым...

Ленін *(Плакуну)*. А хіба ў вас пры каапературыве фонду ўзаемадапамогі няма?

Плакун *(з пафасам)*. Адгаласнулі! У другіх ёсць, а мы наперад пайшлі. Залатыя рублі ў нас на іншую справу знадобіліся: залатымі рублямі рашылі фундамент камунізму выкласці.

Ленін. Фонд узаемадапамогі ў цяжкую хвіліну ча-

лавека на ногі ставіць, да серадняка падцягвае... рана яшчэ адмяняць яго.

Д а р ' я. Ды каму не давялося, асабліва калі пры ўдоўяй долі...

С а з о н а в а. А я аб тым не ведала! Я катэгарычна стаўлю пытанне!

П л а к у н *(рэзка)*. Не ведала! Трэба знаць! *(Да Леніна.)* Любы, дарагі, а мы, можа, новае царствіе пачынаем... Я ўжо казаў вам! Мы, можа, з працэнтамі знаёмы!

Усе заціхлі, прыслухоўваюцца.

Л е н і н. Што ж гэта за «царствіе»? Цікава.

П л а к у н. Як жа не цікава! Мы і рахункавода займелі. А як пачалося, перш чым рашыць з Марцінам, раскажу. Калі ў савецкай улады камунізм не атрымаўся і пачалася новая эканамічная,— у мужыкоў грошыкі завяліся. А каб яны бабам панчохі не пацыралі, я падгаварыў пусціць іх у абарот — няхай круцяцца! А каб зацікаўленасць была — кожнаму долю прыдумаў... працэнцікі.

Л е н і н *(сам сабе)*. А гэта ж Форд... Сапраўдны Форд!

Г а л а с ы *(горача)*. Даходнае жыццё пачалося, толькі гэты Верабейка шкодзіць! Зберажэнні круцяцца — вось у чым сэнс.

З а х а р. Прыбыткі вабяць...

М а р ц і н *(сам сабе)*. Вось чым ён абкруціў вас!

А н і с с я *(радасна)*. Са скуры лезеш — барышы вабяць!

Г а р а с ы ч *(туліцца да Леніна)*. Чаго там! Нічога не шкада для вобчага кручэння!

П л а к с і х а *(не падумаўшы)*. Я, можа, тры тысячы залатых аддала на гэта!

Л е н і н *(торапка)*. А?!

П л а к у н *(рэзка)*. Баба! Твая справа — ідзі, варажы, а не, дык за косы напомню!

Г а р а с ы ч *(усё больш ажыўляецца)*. А галоўнае, тут справа палюбоўная,— кручэнь!

П л а к у н. А за што ж мяне сялянская газетка так хваліла? За гэта самае. Калі і вы часам чыркнеце, дык і пішыце: гаспадарлівасць, кемлівасць, без адукацыі чалавек, з-пад сахі выкруціўся, ні ў каго граматы не пазычаў,— сваім розумам і сэрцам мужычым, шматпакутным шлях для сялянства новы адкрыў; я, карыстаючыся прагнасцю, тым самым вызваляю чалавека ад прагнасці! Таму што немагчыма адразу скочыць у раўнапраўе. Ніхто не перас-

тупіць гнілога рва, ніхто не міне абходнай дарогі. Не такія, як Марцін, ламалі сабе галаву. Інакш і быць не можа: толькі дзіця праз дзевяць месяцаў нараджаецца, а чалавеку трэба стагоддзі, вечнасць...

Л е н і н *(сам сабе)*. Дамарошчаны фордаўскі сацыялізм. Дзе там Форду? У гэтага ж філасофія!

П л а к у н. А што такое наш круцень? Нікому крыўды!

Г а р а с ы ч. Ды што ж — тут кожны сам сабе кум каралю!

Л е н і н *(успыхнуў)*. Добра! Які ў вас прыбытак?

П л а к у н. Двухгрывенны на руб!

Л е н і н. Ого! Колькі ў вас у абароце? Здаецца, тры тысячы?

П л а к у н. Гэта ў нас тайнасць, таварыш!

Л е н і н. Дапусцім, тры тысячы? Н-да... Тры тысячы, кажаце? Цікава! А ў вас, Гарасім Гарасімавіч, колькі?

Г а р а с ы ч. Каб не зблхаць, соценька круціцца...

Л е н і н. Сотня і тры тысячы пры дваццаці працэнтах гадавых? Што гэта значыць? Гэта значыць вы, Гарасім Гарасімавіч, на сваю сотню атрымаеце дваццаць рублёў, а ваш старшыня шэсцьсот. Быццам бы так выходзіць? А?

Ажыўленне. Адны здзіўлены, другія ўражаны, трэція напалоханы.

Г а л а с ы. Вось гэта да-а... Прываліла таварышу Плакуну... Няўжо і праўда ў яго такі капітал круціцца?! Дык як жа гэта атрымліваецца... Хіба ён не для вобчай выгады стараецца?

Г а р а с ы ч *(хаваючы трывогу)*. Што ж благога — у другі год і я ўнясу больш... Пацягаемся!

Л е н і н. Не паспееце! У наступны год на свае сто дваццаць рублёў вы атрымаеце дваццаць чатыры рублі, а ён, даверапы старшыня, ужо семсот дваццаць. Па-мойму, так! Падлічыце!

Г а л а с ы. Сем соценных! Дык хто ж яго дагоніць, пры такіх капіталах! От табе і святы!.. На бога, як кажуць, спадзявайся, а сам не зявай...

З а х а р. А я думаў, багацей за ўсіх буду... Не-е, так не пройдзе... Які ж гэта ўзаемны круцень атрымліваецца?

Л е н і н *(хутка)*. А такі — праз некалькі гадкоў, таго і глядзі, уся ваша гаспадарка — жывёла і двары будуць ужо не вашы! *(Іранічна.)* Круцень, кажаце, «тайнасць»?.. Зручна яму тайнасць!

П л а к у н. Дазвольце, грамадзяне! Што ж я, па-вашаму, бяздушны які?

Г а р а с ы ч. Браткі!.. Оспадзі Ісусе... А круцень жа, і праўда, таго... Кожны ўпотайкі хацеў багацей за ўсіх быць, а на справе гэта дваяка аказалася... Рабунак нібы... Куды мы залезлі? *(Ускочыў.)* Гэта ж хоць гвалт крычы! Караул!

На яго месца побач з Леніным садзіцца Марцін. Ён не зводзіць вачэй з Леніна.

М а р ц і н. Вось гэта дык круцень з працэнтамі...

М і к і т к а *(Плакуну)*. Куды завёў? Ды што такое! *(Зрывае плакат з калоны.)*

П л а к у н *(забегаў ля Леніна)*. Любы, дарагі, кінь народ баламуціць! Данясенне пашлю! *(Да ўсіх.)* Ну, што ўсхадзіліся? Ці да гэтага грамадзяніна не было вядома, што ў некага больш круціцца, у некага менш! Па справядлівасці! Я ж таксама чалавек!

З а х а р. Вядома, ды мы цябе, дзядзька Пятро, святым угоднікам лічылі! А ў цябе вунь якія капіталы... Не пабоску!

Г а л а с ы. Ашуканства! Для сябе стараўся! Каму ж цяпер верыць? Прасвятая дзева!..

С а з о н а в а. Ціха! Па парадку! Я не даю слова. І табе не даю! Цьфу ты! Ну і спякота! *(Гвалт яшчэ павялічыўся.)* *(З віскам.)* Сціхніце! Кіньце сварку!

П л а к у н *(пагражае)*. Вы, грамадзянін, не ведаеце нашай сялянскай гаротнасці! Лепей не прыдумаць!

Л е н і н *(хутка)*. А мне вось таварышы скажуць! *(Да ўсіх.)* Таварышы сяляне, што такое нядоля?

Усе змоўклі.

Г а р а с ы ч *(з адчаем)*. Ды дзе ўжо там, за што ні возьмешся — там і нядоля! На золаку ўстанеш — адной рукой арэш, другой — лапці пляцеш, а ў галаве гнілыя калоды варочаеш — ні два, ні паўтара! А тут яшчэ... *(Да Плакуна.)* Шарамыжнік ты, баця! Ашуканец! А я цябе змагаром за народ лічыў!

Л е н і н. Добра сказаў, маляўніча. Вось гэта і ёсць у глыбокім сэнсе ваш тупік, безвыходная нядоля аднаасобніка! Толькі раздзяленне працы прывядзе сялянства да небывалай прадукцыйнасці! *(З запалам.)* У сотні, у тысячы, у мільёны разоў эканомней будзе ваша праца. Адзін

арэ, другі лапці пляце. Ну, не, тады не будзе лапцей, і ў паміне не будзе!..

Плакун *(перапыняе)*. Гэта наконт камуніі пад'ехалі? Наконт справядлівага размеркавання на едакоў? Мужыкі! Чуеце! Ха-ха-ха!

Усе змоўклі, насцярожыліся, а Плакун раптам знік у магазіне і зараз жа вяртаецца на ганак з партрэтам Леніна.

Мужыкі! Грамадзяне! Апошняе слова кажу! Страшнае слова! *(Выстаўляе партрэт перад сабой і паказвае на Леніна.)* Гэты чалавек супроць Леніна!

Усе адхіснуліся ўбок.

Усім вядома, Ленін да зацікаўленасці вядзе, а гэты ў камунію!

Захар. Оспадзі Ісусе!

Анісся. Свят, свят!

Мікітка *(выступае)*. Вось што, грамадзяне! У нашым сяле нельга супроць Леніна. Я, каваль Мікітка, чулі?

Гарасыч *(выбягае ўперад і прыглядаецца то да партрэта, то да Леніна)*. А гэта ж... гэта... здаецца... гэта... гэта... *(раптам з захапленнем і здзіўленнем)* і ёсць Ленін! Вось вам Хрыстос, Ленін! Наш Ільіч! Эх вы, «круцені»!

Дар'я *(успляснула рукамі)*. Ох!..

Усе рушылі да Леніна, усе знімаюць шапкі. Плакун спыняецца на ганку, падае на калені.

Гарасыч *(радуецца)*. Сярод нас Ленін! Сярод нас ходзіць Ленін, і нікому няўцям...

Галасы. «Глядзіце, Ільіч».— «Ленін! Ленін!» — «Сярод нас Ленін».— «Ленін з намі».— «Я адразу яго пазнаў».— «А я яшчэ раней падумаў, ды мяне круцень з панталыку збіў!»

Марцін *(разводзіць рукамі)*. Уладзімір Ільіч, а? Уладзімір Ільіч!

Гарасыч *(адступае)*. А з гэтым круценем мы сапраўды далі маху, але і наконт камуны, Уладзімір Ільіч, яшчэ справа цёмная. Салодкае языком пазнаеш, руно вобмацкам...

Плакун. Не вінаваты, не вінаваты, таварыш Ленін,— тайнасць у нас статутам устаноўлена...

Ленін. Разумею, шукаеце цёпленькае месцейка для эксплуатататара ў сацыялізме?! За партрэцік Леніна хава-

ецеся? Пад нашай шыльдай сваё «царствіе»? Вось вам і царствіе!

Плакун, адступаючы, знікае ў магазіне.

(Павярнуўся да Гарасыча.) А з вамі, Гарасім Гарасімавіч, я згодзен: гаспадар без разліку — кепскі гаспадар. Не трэба нам такога гаспадара!

Гарасыч падбягае да Леніна.

Гарасыч. А багацець можна?

Ленін задумваецца. Заклаўшы рукі за спіну, павольна праходзіць па сцэне. Усе сяляне з цікавасцю сочаць за кожным яго рухам. Гарасыч чакае.

Ленін *(успыхнуў)*. Можна! Абавязкова — багацець! Толькі не за кошт чужой працы *(засмяяўся)* — не раю...

Гарасыч. Значыць, усё ж такі можна?!

Ленін *(не слухаючы яго, да Марціна)*. А з вамі, баценька, я не згодзен! Вы палохаеце сваёй камунай, у той час калі трэба нашага добрага гаспадара зацікавіць камунізмам! Так, не згодзен!

Марцін *(уражаны)*. Як?.. Уладзімір Ільіч... *(Раптам ускіпеў і ў бок сялян.)* Я шчасця ім хачу?

Ленін *(хутка)*. А яны не хочуць?

Марцін. Не хочуць!

Ленін. Ды хто ж, баценька, шчасця не хоча! Адны нябожчыкі шчасця не хочуць!..

Марцін паволі апускаецца на лаўку. Ленін не зводзіць з яго вачэй.

Марцін. Дзе ўжо мне... Гімназій не канчаў...

Сазонава. Не разумею — будзе яго двор плаціць нядоімку ці не будзе?

Ленін. Хто вы па спецыяльнасці?

Сазонава *(заззяла)*. Сама я капялюшніца. У капялюшнай справе я проста тэнар. Паколькі я пралетарскага паходжання, мяне паставілі на адказную пасаду і пасылаюць упаўнаважаным.

Ленін. А рабіць прыгожыя капялюшыкі таксама адказная пасада. Ясна?

Сазонава. Ясна.

Ленін *(Марціну)*. Наскокам, загонам хочаце ў камунізм загнаць. Жыццё паказала, што мы памыліліся, і мы адступілі! А вы чаму не хочаце адступіць? Якія ў вас

даныя? Статут камуны скасаваны жыццём? Лепей, бацелька, пачынаць з маленькага, ды лепш!

М а р ц і н *(падняўся)*. Добра, Уладзімір Ільіч, няхай няма камуны, ладна, хай няма... Тады ў нас арцель можа быць... І нават... ужо ёсць арцель!

Г а л а с ы. Якая арцель?.. Што ён пляце!..

М а р ц і н. Мікітка, скажы ім...

М і к і т к а, С е н ь к а і Д а р' я *(адначасова, нібы толькі таго і чакалі)*. Ёсць арцель... маленькая пакуль, але ёсць!.. А зямлі для нашай арцелі давядзецца ад агульнай прырэзаць... раз камуны не хочаце...

Паўза.

В а р в а р а. Божа, яшчэ не лепш!

М і к і т к а. Нам без арцелі ніяк нельга. Мы даўно дамовіліся,— калі не выйдзе з камунай, паедзем на поле ўсёй ячэйкай, арцельна. Адным словам, заўтра ў поле выязджаць, а зямля членаў арцелі параскідана на асобных надзелах. *(Праводзіць рукой па горле.)* Вось так, Уладзімір Ільіч, трэба арцелі асобны нарэз зямлі...

Сяляне ўражаны, злосна насцярожыліся. Нейкі час маўчаць.

В а р в а р а. Ну, да чаго неспакойныя людзі гэтыя ячэечнікі — жыцця ад іх няма!

Г а л а с ы. Жывіце, як усе жывуць, тады і зямельны нарэз не трэба! Не дамо! Не будзем для вас свае ўзараныя палосы кроіць! Не будзем!

Г а р а с ы ч *(выступіў наперад)*. Яно, канечне, Уладзімір Ільіч, добрай зямлі ў нас мала, а дрэнную яны не возьмуць.

М а р ц і н. Вось тут і паспрабуй... Выходзіць, Уладзімір Ільіч, проста ў вочы скажу — не толькі я, але і ўлада вінавата...

Л е н і н. А гэта яшчэ чаму? У губернскі выканком пісалі?

Марцін, апусціўшы галаву, садзіцца.

М і к і т к а. Даўно ўжо пісалі... Адтуль пераслалі на вырашэнне зямельнага таварыства...

Г а р а с ы ч. Яны-та пісалі, ды савецкая ўлада не можа для некалькіх двароў супраць большасці народа пайсці... У нас у падмаскоўі кожны вяршок улічаны... Не абяздольце, Уладзімір Ільіч...

Г а л а с ы. Не абяздольце...

Д а р ' я. Ім што? А ў мяне трое на лаўках бегаюць... *(Заплакала.)* Добра было ў камуне... Калі ўжо і галадалі, дык усе...

Л е н і н. Цікава... Вось загвоздачка! Як жа быць?

Заслона.

АКТ ТРЭЦІ

З аднаго боку — зялёны курган, з другога — цвіце вялікі куст чартапалоху. Далей ідзе поле, падзеленае папалам, справа за курганом ралля, злева — аблога, зарослая травой. Міма кургана і чартапалоху праходзіць міжпалосіца. На ёй ляжыць тоўстае трухлявае бервяно. Відаць задок воза, бочка з вадой і слуп з дошчачкай — «Стан арцелі».

Блішчыць на сонцы раса, высока ў небе спявае жаўранак. З-за кургана чуецца песня і голас паганятых: «Эй, пайшлі, пайшлі!»

М і к і т к а *(за курганом)*. Стой! Тпру-у!

Выходзіць М і к і т к а, потым С е н ь к а. Падыходзяць да бочкі, чэрпаюць ваду каўшом, п'юць.

Ну і зарасло ж тваё поле пырнікам, Сенька...

С е н ь к а. Былое маё...

М і к і т к а. Проста з ног коні валяцца, ды і самі. Так і звініць пад бараной...

С е н ь к а. Як жа яно не зарасце, калі сахой араў...

М і к і т к а. Гэта не папрок... Ці паспеем сёння забаранаваць і засеяць хоць тваю палоску... Заўтра маю трэба... перасохне... *(Схамянуўся.)* Фу ты! Зноў «тваё», «маё»... *(Раздражнёна.)* Вот будзем цяпер поўзаць з палоскі на палоску паміж аднаасобных надзелаў. Якая гэта праца! *(Падымаецца на курган, з-пад далоні з трывогай углядаецца ў бок аблогі.)* Знайшоў яго Марцін ці не... нешта не відно... *(Сыходзіць да воза.)* Няўжо ўсё-такі Уладзімір Ільіч не дапаможа нам адваяваць асобны нарэз? А?

С е н ь к а *(асцярожна)*. Не адны мы ў савецкай улады... каго пакрыўдзіш... *(Памаўчаў.)* Мікітка, ці адолеем?..

М і к і т к а *(уважліва паглядзеў на яго)*. Адолеем. Галоўнае, апроч нарэзу коней бы нам спраўнейшых, ды

набольш, а рук у нас хопіць. *(Паказвае на курган.)* Арцельнасць — яна, братка, сілу людзям дае небывалую. Паглядзі на дзевак... Як стараюцца, як поле расчэсваюць!.. Ды чым? Граблямі... Гэтак людзі толькі градкі лашчаць, а не поле пад азімыя... Пад'елі яны сёння ці не, а расчэсваюць і спяваюць, спіны не разгінаючы, расчэсваюць і спяваюць... Проста дзіва!

Сенька. А ўсё Васіліса. І ўродзіцца такое добрае сэрца ў чалавека... Так і вабіць цябе да яе, так і вабіць.

Мікітка *(спахмурнеў)*. Праз яе-та і не ідуць да нас гаспадары з добрымі коньмі. І не прыйдуць, пакуль яна ў арцелі... Хоць жылы надарві.

Сенька *(зажурыўся)*. Не ідуць — не толькі яе віна... А ўсё ж трэба нешта рабіць... Няўжо Васілісай прыйдзецца ахвяраваць? Ці, можа, так абыдзецца...

Мікітка. Не, не абыдзецца. Галоўны ўстой кранулі. Мужыкі ўзбунтаваліся супраць Васілісы. Не могуць дараваць ёй.

Сенька. Вот кара!

У святочнай хустцы з ахапкам выбаранак прыходзіць Васіліса. Кінула на аблогу пустазелле і зноў ідзе на раллю.

Мікітка. Як у вас там, Васіліса Лукінішна?

Васіліса *(затрымаўшыся)*. А скажыце, Мікіта Іванавіч, калі што не так...

Мікіта. Ды не, усё робіце ладна. Коней бы нам... Не ідуць да нас з коньмі... А той-сёй, можа, і хацеў бы пайсці, ды... *(Адыходзіць.)*

Сенька. Нібы і добра ўсё, Васіліса... І дзеўкі каля цябе, як пчолы, а... *(Недагаворвае, адыходзіць.)*

Васіліса *(адна)*. Пра мяне думаюць...

Таксама ідзе на раллю за курган. Азіраючыся, з-за чартапалоху, з пугай паказваецца Варвара. З другога боку міжпалосся з трывогай выглядваюць, а потым паказваюцца Анісся і Захар з сажнем. Захар хутка ўзыходзіць на курган, з неспакоем углядаецца ў бок аблогі.

Анісся. Столькі хваляванняў, кума, столькі хваляванняў цераз гэтых ячэечнікаў!

Варвара. Адна пацеха з вас! Не хочаш, ды скажаш,— вось паскачыце цяпер... *(Паказала навокал.)* Бач — усё сяло зыркае сюды са сваіх загонаў... А то ўчора ўсім вам дзядзька Пятро не даспадобы быў...

Анісся. Не дзядзька Плакун, кума, а круцень. Круцень, кума, усё ж такі нязвыклая штуковіна, рызыкоўная...

Варвара. А калі зямлю адцяпаюць — гэта не рызыка...

Захар. Цішэй вы! *(Шэптам.)* Вунь... роў пераехалі ўжо...

Анісся *(трывожна)*. Верабейка з ім?

Захар. Цэлае ранне лавіў — пераняў усё ж такі...

Анісся. А што, калі таварыш Ленін вырашыць не так...

Захар *(збягае з кургана)*. Ільіч не павінен бы пайсці супраць нашага анцірэсу...

Анісся. Ой, а што, калі... найвышэйшая ўлада... паскардзішся.

Варвара. Пабачыце, яшчэ не раз успомнім дзядзьку Плакуна...

Захар. Ды не ныйце — з учарашняга дня ўсю душу выматалі! Без вас аж страх бярэ!.. *(Заўважыў, што падыходзіць Ленін.)* Вось яны...

Хутка выходзіць. Па краі аблогі паволі ідуць **Ленін**, **Марцін** і **Волечка**. Ленін ідзе, схіліўшыся, задумаўшыся, рукі назад, часам жмурыцца, падымае твар к сонцу. Марцін, як і раней, у чырвонай касаваротцы, але цяпер ён падпяразаны блакітным поясам з кутасамі. Твар Марціна чыста паголены, у руках сажань. Волечка босая, праз плячо стрэльба.

Ленін. Ваш паравы млын трэба паказаць абавязкова вопытнаму інжынеру. Ці не можна ўжо цяпер даць сялянам электрычнасць... Н-да... цікава... а якую зямлю вам яны прапануюць?

Марцін *(паспешліва)*. Суглінак, Уладзімір Ільіч...

Ленін. Д-да... а інжынера можна выклікаць з Масквы... *(Спыняецца каля раллі.)* А што гэта вы цяпер робіце?

Марцін. Барануем палоску яшчэ аднаасобна ўзараную. Засеем гэту, пераедзем на другую. Так будзем пераязджаць... Цяжка нам будзе, Уладзімір Ільіч, без нарэзу...

Ленін. Н-да...

Волечка *(паказвае на курган)*. А вунь Іванкава магілка.

Марцін. Кажуць, што тут пахаваны Іванка... Асілак нейкі...

Ленін. Падобны на вас?

Марцін. Насміхаецеся, Уладзімір Ільіч... Які я асілак. Я ростам не выйшаў, а той, кажуць, неба падпіраў, змея загубіў: ведаеце, змей той на захад ляцеў, хацеў сонца соннае злавіць... Сонца ратаваў, а сам памёр дзіўна:

спатыкнуўся вось аб такое бервяно, а ён жа доўгі быў,— упаў і разбіўся.

Л е н і н *(радасна засмяяўся)*. Так, ён жа высокі быў! Між тым «аб такое бервяно» і вы можаце сябе пакалечыць. Дык вось,— новую гаспадарку трэба будаваць упарта, дзелавіта і без удзелу міраедаў...

М а р ц і н *(раптам нечакана падняў руку з сажнем)*. Э-эх! Мне б на каня ды тапор у рукі! *(Схамянуўся)*. Даруйце...

Л е н і н. Э-э, вось вы і зноў разбойнік... Чуркін... так і выпірае з вас гэтая тапорная рэвалюцыя! *(Успыхнуў.)* На кані, бацэнька, заваяваць можна, але кіраваць народам, а тым больш будаваць, гарцуючы на кані,— нельга! *(Памаўчаўшы.)* Уявіце сабе, што вы недзе падняліся да кіраўніцтва, і ўмацаваліся, і пачалі махаць тапаром над народам... Ведаеце, што гэта будзе пры самых добрых намерах? Там ад савецкай улады і следу не застанецца. *(Нахіліўся на воз, з трывогай глядзіць удалячынь.)* Так у вас многа яшчэ гэтага віхру... Загвоздачка... Вось вам і загвоздачка...

М а р ц і н. Аб дзяржаве клапачуся...

Л е н і н *(хутка павярнуўся)*. Так... *(Павольна праходзіць па мяжы, заклаўшы рукі за спіну.)*

М а р ц і н. Плакун... да, хіба ён адзін завёўся... колькі іх, пад рознай маркай прысмакталіся к нашай працавой казне... таго і глядзі, беспрацоўным рабацягам зробяць...

Ленін задумаўся, напявае рэвалюцыйную песню. З-за кургана падглядвае Г а р а с ы ч. Паслізнуўся ў новых лапцях, ледзь не ўпаў і аказаўся каля Леніна, але прыкінуўся, што не заўважае яго, не разгубіўся.

Г а р а с ы ч. Кыз-кыз-кыз! Куды яна прапала?.. *(Нібы толькі што заўважыў Леніна.)* Уладзімір Ільіч! Памагай бог, Уладзімір Ільіч! *(Кланяецца.)*

Л е н і н. Добры дзень, Гарасім Гарасімавіч! *(Падае руку.)*

Марцін і Волечка збянтэжана адыходзяць. В а с і л і с а з граблямі ідзе ад раллі, але, убачыўшы Гарасыча, спалохана спыняецца і ідзе назад, нікім не заўважаная.

Г а р а с ы ч. Тут у мяне каза некуды збегла... Не бачылі выпадкам, Уладзімір Ільіч? Такая, бачок белы, задок шэры і на лобе плямачка...

Л е н і н *(спагадліва)*. Не, нешта не заўважаў...

Г а р а с ы ч. Вось бесшабашная! *(Кліча.)* Кзю-кзю-кзю!

Л е н і н. Ну дык як, Гарасім Гарасімавіч, салодкае языком, кажаце, пазнаеш?

Г а р а с ы ч *(паспешліва)*. А як жа! *(Закурыў люльку і косіцца на Марціна.)* А наогул, калі разабрацца, гуляючы, з надзеяй жывём! Хлеб пасля адмены прадразвёрсткі завёўся...

Л е н і н. Да новага хопіць?

Г а р а с ы ч. Ну! Нават адбавіць можна... хаця яно... канечне... другі і пашкадуе...

М а р ц і н *(сам сабе)*. Хітруе...

Л е н і н *(Гарасычу)*. Праднялог, выходзіць, лепш за прадразвёрстку?

Г а р а с ы ч. Слоў няма, Уладзімір Ільіч! Прадразвёрстка — што мятла бяздушная, а праднялог — інтарэс ёсць: ары, сей — сабе выгадна і савецкай улады стол вясельны, нібы для нявесты! Наш інтарэс нельга забываць... Без інтарэсу ўсё прахам пойдзе... Не вылезем з беднаты...

Л е н і н. Правільна! Вот між тым... *(Шукае вачыма Марціна.)* Марцін Рыгоравіч, дзе ж вы?

М а р ц і н *(стаіць адвярнуўшыся)*. Я палын разглядаю... Парода нейкая дробная.

В о л е ч к а. А горкая...

Л е н і н *(усміхаючыся)*. Вось табе раз!

М а р ц і н. Я, можа, пайду?..

Л е н і н. Не, вы мне трэба.

Г а р а с ы ч *(сам сабе, злосна)*. Пагаварыць не дае, Верабейка няшчасны... *(Уголас.)* Я казу шукаю... А ваапчэ, кажу, з надзеяй жывём...

Л е н і н. Прыемна ведаць. Да пабачэння, Гарасім Гарасімавіч!

Г а р а с ы ч. Да пабачэння, Уладзімір Ільіч! *(Выходзіць.)* Кыз-кыз-кыз!

Л е н і н *(Марціну)*. Вось у кім цяпер галоўнае. Салодкае языком пазнаецца. Давядзіце, што гэта не так! Гарасыч гаворыць дакладна. Соладка будзе — прыму, горка — не хачу. Горка — галаву зламаю, соладка — у пояс пакланюся. Ён без разліку не пойдзе, гэта нам трэба зразумець. А значыць, пайсці яму на ўступку. А «ваабчэ» ён шукае казу, ён хоча прыйсці. Толькі спачатку ён хоча пакаштаваць: яму прыклад трэба, і мы павінны паказаць яму гэты прыклад. Вы прасілі растлумачыць вам нашу ідэю? Вось гэта і ёсць у даным выпадку: крок назад, два наперад.

Аснова нашай палітыкі — прыклад, прыклад і яшчэ раз прыклад. Прыклад, бацечька, як плуг зямлю, жыццё перараворвае і ўкладвае па-новаму. *(Памаўчаўшы.)* Ну! *(Смяецца.)* Бывае, што падштурхнуць не шкодзіць!

Марцін усхвалявана ходзіць. Ленін сочыць за ім.

Марцін. Якое слова... Прыклад... Разумею, Уладзімір Ільіч, толькі цяпер, здаецца, разумею.

Волечка падышла да слупка з дошкай, задумалася, а потым да слоў «Стан арцелі» вуглем, вялікімі друкаванымі літарамі прыпісвае слова — «прыклад». Ніхто не заўважае гэтага.

Яно кліча адважыцца на вялікі пачын... на вялікі...

Ленін. Так, яно выяўляе думу савецкай улады... *(Падышоў к Марціну.)* Гарасыч — разумны...

Волечка. Дзядзька Гарасыч? Ён добры... *(Заўважае бліснуўшы позірк Марціна.)* Таксама хітры!

Ленін *(рашуча)*. Ён гаспадар!

Марцін адступіў назад к бервяну і амаль не паваліўся, сеў на бервяно.

(Засмяяўся.) Вось бачыце, вы можаце ўпасці іменна цераз гэтае бервяно!

Марцін *(схапіўся за галаву)*. Не, Уладзімір Ільіч, не, я, Уладзімір Ільіч, усё магу, а на гэта сіл няма... Васіліса...

Ленін *(перапыняе)*. Га́няць вашу Васілісу? Вось бясплоднае палена ніхто не кратае, а палкай кідаюць у тое дрэва, на якім спеюць свежыя плады!

Паказваецца Васіліса з граблямі ў руках, падыходзіць да бочкі з вадой.

Васіліса *(кланяецца)*. Добры дзень, дарагі наш Уладзімір Ільіч!

Ленін. А-а, добры дзень, Васіліса Лукінішна! *(Падыходзіць да яе.)* Як працуецца?

Васіліса. Праца — радасць. *(Нечакана задумваецца пра сваё.)* Калі б толькі праца... *(Глядзіць удалячынь.)* Нічога... не я, відаць, першая, не я апошняя. Цяпер і ў другім сяле не прападзеш...

Ленін. Я разумею, вакол нас савецкая ўлада. І ўсё ж трэба змагацца за сваё шчасце.

Васіліса *(памаўчаўшы)*. Як жа можна супроць усіх?..

Ленін. А калі трэба — і супроць усіх! *(Крыху памаўчаўшы.)* Вы, здаецца, граблямі барапуеце? Пагляджу, калі дазволіце...

Васіліса. Калі ласка, Уладзімір Ільіч...

Ленін і Васіліса ідуць на раллю. Волечка таксама зрабіла два крокі за імі, але, зірнуўшы на Марціна, спынілася. Марцін па-ранейшаму сядзіць, абхапіўшы рукамі галаву.

Волечка *(падсела і лашчыцца)*. Татачка, родненькі!.. Што ты... Ну?..

Марцін *(не слухае яе)*. Нам не сёння заўтра вароты дзёгцем вымажуць, а я, выходзіць, да яго на паклон...

Волечка. Татачка, а мы давай зловім мазальшчыка!

З другога боку кургана выбягаюць Сенька і Мікітка.

Сенька і Мікітка *(адначасова)*. Ну як? Што Ільіч думае пра нашу зямлю?..

Марцін. Не ведаю. Дый ці да зямлі тут... Віхор я яшчэ... Разбойнік...

Волечка. Што ты, татачка... ты харошы!

Сенька *(спалохана)*. Оспадзі Ісусе... Што ж мы цяпер будзем рабіць?..

Мікітка. То-та ж цябе губпрадкамісар у сельсавет выклікаў... *(Глянуўшы на мяжу.)* Вось ён, сам на дрожках!

Мікітка і Сенька хутка адыходзяць к бочцы, чэрпаюць ваду. Выціраючы твар насоўкай, уваходзіць Камолаў.

Камолаў *(азіраючыся)*. Ён тут?

Марцін *(не ўстае і не падымае галавы)*. На полі.

Камолаў. Не, гэта нецярпіма! *(Сядае.)* Правадыр міжнароднага пралетарыята ад такіх спраў вырваўся на два-тры дні адпачыць, а ты... Карацей кажучы, я ўпаўнаважаны губкомам аберагчы таварыша Леніна ад розных дамаганняў. Папярэджваю... і... наогул раіў бы табе, як камуністу, рашуча перабудавацца ў плане ўстановак.

Марцін *(падняў галаву)*. А? Што? Леніна адабраць у нас?

Паўза.

Камолаў. Ну, гэта... гэта ты кінь...

Волечка. Бач, які! Дзядзя Валодзя яшчэ і вадзіцца з табой не хоча.

К а м о л а ў *(раздражнена)*. Ну і Ленін з-за вас не будзе нэп адмяняць!

Л е н і н *(нечакана, хутка выходзіць з-за кургана)*. Не будзе і не можа, але Ленін ніколі не адракаўся ад камунізму!!!

Камолаў ускочыў на ногі. Падняўся і Марцін. Волечка падбегла да Леніна, нібы баронячы яго ад некага.

К а м о л а ў *(ледзь вымаўляе)*. Д-добры дзень, Уладзімір Ільіч!

Л е н і н. Добры дзень, дыялектык! У вас у губкоме любяць малоць языкамі пра дыялектыку гістарычнага працэсу,— а зразумець не могуць, што некалькі тысяч арцелей і камун, астраўкамі рассеяных па акіяне аднаасобніцкай Расіі, наперакор нэпу, існуюць і нават, як бачыце, новыя нараджаюцца. І сэнс гэтай супярэчнасці якраз і заключаецца ў тым, што, іменна дзякуючы арцелям і камунам ва ўмовах нэпа, унутры самога нэпа павінен вынспець і ўжо спее і накапляецца бяспрыкладны вопыт новага ладу! А гэта і ёсць, калі хочаце, аб'ектыўны закон нашага развіцця! Расія нэпаўская будзе Расіяй сацыялістычнай.

Усе ўражаны. Ленін, абняўшы Волечку, усхвалявана праходзіць па міжпалосіцы. Марцін пастаяў і кінуўся да арцельцаў, усклікнуў: «Вось яно!.. Вось!»

К а м о л а ў. Уф-ф... Быццам гара з плеч... Неверагемна... Вось ён дзе, камандны пункт раўнавагі... І так проста.

Л е н і н *(не слухае іх, паказвае на арцельцаў)*. Таварышы рашылі жыць па-новаму, а большасць, спасылаючыся на розныя меркаванні, ім гаворыць: «Жывіце, як усе жывуць». Як нам быць? Забараніць ім жыць па-новаму?

К а м о л а ў *(шчыра хвалюючыся)*. Уладзімір Ільіч... Мы... Вы не ўяўляеце... Нават сумна рабілася... Выбачайце... Не кожнаму можна за цякучкай убачыць патаемны ход нашай рэвалюцыі. Мы толькі паслухмяныя салдаты. А што тычыцца асобнага нарэзу для арцелі...

Л е н і н *(перапыняе)*. Так, новае нарадзілася, хай старое пацісне́цца! Арцелі трэба неадкладна нарэзаць зямлі! *(Жэст за курган.)* Паглядзіце, як яны зямлю апрацоўваюць! Гэта подзвіг перакананых людзей!

М а р ц і н *(усклікнуў)*. Вось яно!.. Ёсць у нас зямля!

С е н ь к а, М і к і т к а і В о л е ч к а *(адначасова)*. Зямля, зямля...

М а р ц і н *(ім)*. Бяжыце, узрадуйце нашых.

С е н ь к а і М і к і т к а пабеглі.

(Павярнуўшыся да Леніна.) Эх, Уладзімір Ільіч, да гэтай зямлі ды далі б нам трохі цягла і машын на льготных умовах, вядома... Тады б мы паказалі прыклад!

Л е н і н *(весела)*. Ого! Вось гэта па-дзелавому! Падумаем, але пры адной умове — не замыкацца ад серадняка! З адной беднатой справу не пасунеш! *(Павярнуўся да Камолава.)* Зараз жа вам трэба паехаць у губком і перадаць, што я рашуча настойваю перагледзець пастанову аб зямлі. Майце на ўвазе — заўтра праверу.

К а м о л а ў *(кідаецца з месца)*. Еду! Гарачы будзе разгаворчык! *(На хаду Марціну, інтымна.)* Ну, дружа, мы з табой на кані! Мне, так сказаць, з пункту гледжання губпрадкома нават зручней мець справу з адным старшынёй арцелі, чым з масай аднаасобнікаў. Вы не думаеце!.. *(Выходзіць.)*

В о л е ч к а *(яму ўслед, ціха)*. Ме-ке-ке!

М а р ц і н *(строга)*. Волька! Усё маленькай прыкідваешся! *(Заўважыў новы надпіс на дошчачцы.)* А хто ж гэта размаляваў так?

В о л е ч к а. Я! Прыклад — гэта значыць самы лепшы!

Л е н і н. Цудоўна! Лепш не прыдумаеш! *(Абдымае Волечку.)* Ах ты мой верабейка! Лёгка з вамі гаварыць, прыемна. Адчуваеш, што семя кладзецца ў добрую зямлю, слова не ў пустую галаву. Эх! Расія, што чакае цябе? Я люблю сваю зямлю, Марцін Рыгоравіч! Так бы і абняў, як маці родную! Не абдымеш! Шырачэзная, багатырская!

М а р ц і н. Вы ўжо абнялі яе, Уладзімір Ільіч!

Л е н і н. Так, а мы яшчэ нарэз хацелі змераць?..

М а р ц і н. Няма каморніка.

Л е н і н. Нічога, я за каморніка.

М а р ц і н *(паказвае на курган)*. З Іванкавага кургана ўсё відаць.

Ленін лёгка ўзбег на курган. Яго пераганяе Волечка. Марцін падымаецца паволі. Як толькі яны падняліся на курган, свіст і крыкі аратых чуюцца асабліва ясна: «Эй, пайшлі, пайшлі!» Бліжэй усіх чуецца голас Сенькі: «Но, Сіўка!»

Л е н і н. Сахой арэ? У яго плуга няма?

М а р ц і н. Плуг ёсць у яго, конь адзін.

Л е н і н. Шкада...

М а р ц і н. Гэта ж наш Сенька-Рэшка — мяжу заворвае. І не чалавек гэта, а няўдача нейкая. Калі жаніцца насабраўся, порткі перад самым вяселлем укралі; калі нарэшце жаніўся,— баба дзесяць гадоў не хацела радзіць. Не ведаю, чаму так не шанцуе чалавеку.

Л е н і н. Харошы ён, напэўна, гэты Сенька-Рэшка? Падатлівы?

М а р ц і н. Так.

Л е н і н. Вось таму і не шанцуе!

М а р ц і н *(з запалам)*. Уладзімір Ільіч! Няўжо я не дастану гэтага самага «верабейку»?

В о л е ч к а. А я ведаю, як дастаць!

Абодва са здзіўленнем глядзяць на яе.

Збудаваць шпакоўню — ён сам прыляціць!

Л е н і н. Ах ты мой верабейка! Так і свеціцца заўтрашнім днём! *(Марціну.)* Вось іменна збудаваць! А вы кажаце — «дражняць».

М а р ц і н. Празвалі.

Л е н і н. Ну, мяне, баценька, таксама празвалі.

В о л е ч к а. «Дастань-верабейкам?»

Л е н і н *(весела)*. Амаль так. Мяне некаторыя празвалі фантазёрам. А ведаеце, за што? А за тое, што я хачу вунь таго селяніна з клячы перасадзіць на аўтамашыну, а Сеньку-Рэшку на трактар. Ім здаецца, што ў нашых умовах — нязбыўная мара. Дзівакі! Ды калі б нам зараз сто тысяч трактароў, мы рушылі б з такой хуткасцю, якая капіталістам і не снілася. Яны здзіўляюцца, як гэта мы, сёрбаючы лапцем боршч, думаем свет перабудаваць, а не бачаць, што апроч лапця і сахі ў нас ёсць рускі рэвалюцыйны размах плюс моцная дзелавая хватка. Ухопімся — ужо не выпусцім. Рэвалюцыю выцягнулі? Выцягнулі, як ніхто. У якасці трафея, перад намі,— вось яна — неабсяжная зямля. І яшчэ больш шырокая свабода, свая ўлада. І ў нас будзе сто тысяч трактароў, у нас будзе больш, у сто разоў больш! Або мы загінем і назаўсёды застанёмся ў хвасце, або мы, не шкадуючы сіл, за дзесяць — дваццаць гадоў павінны прабегчы ўсю вялізную адлегласць, якая аддзяляе нас ад перадавога капіталізму, і перагнаць яго. І мы яго перагонім. Як піць даць перагонім. І капіталізм тады — Міцкам звалі! Спаборніцтва з намі яны не вытрымаюць! Ану-ка, дайце мне сажань!

М а р ц і н *(перадае сажань, з хваляваннем).* А адкуль мерць будзем, Уладзімір Ільіч?

Л е н і н *(задумаўшыся).* Адкуль... Прыйдзецца сялян пазваць...

М а р ц і н. Волечка, бяжы кліч.

Л е н і н *(паспешліва).* Чакайце! *(Углядаецца ўдалячынь.)* А што, калі зусім не чапаць сялянскую зямлю... *(Памаўчаў і раптам рэзка, нібы разразаючы нешта, узмахнуў рукою.)* А разануць вось па гэтай?

М а р ц і н *(здзіўлена).* Аблогу?! Што вы, Уладзімір Ільіч? Гэта дзяржаўны фонд. Сена для арміі косяць.

Л е н і н *(не слухаючы).* У губпрадкоме і другіх высокіх інстанцыях, канечне, гвалт падымуць... Н-да... А скажыце, хіба разумна ў Падмаскоўі трымаць такую зямлю пад сенажаць, нават і для Чырвонай Арміі?.. Хіба няма ў нас для гэтага зямель у Сібіры ці заліўных лугоў на поўначы?

М а р ц і н. Канечне, Уладзімір Ільіч, не па-гаспадарску гэта. Я даўно думаў, ды не пасмеў загаварыць аб гэтым.

Л е н і н *(памаўчаўшы).* Усю адказнасць бяру на сябе! Заўтра ж абмяркуем на Саўнаркоме,— упэўнены, што ніхто пярэчыць не будзе! Не, ужо каб зацікавіць серадняка, дык трэба рашуча і без аглядкі! Будзем мераць адсюль і да самага берага! Да самага! Пойдзем!

Хутка ідзе на той бок кургана. Волечка ідзе разам з ім. Марцін нібы анямеў, нейкі час стаіць моўчкі на кургане.

М а р ц і н. Якое багацце прываліла!.. *(Падняў рукі.)* Ну, цяпер паглядзім: хто каго!

Стан нейкі час пустуе. З-за кургана чуваць усхваляваныя галасы арцельцаў: «Ды не можа быць!», «Няўжо?». Чуецца голас Гарасыча: «Кыз-кыз-кыз»... Да бочкі выходзіць М і к і т к а.

М і к і т к а. Вось гэта нарэз!

Г а р а с ы ч *(падыходзячы).* Ну, куды яна прапала!.. *(Да Мікіткі.)* А што гэта вы мераеце?

М і к і т к а. Што такое,— ці ты яшчэ не ведаеш? Нарэз для арцелі!

Г а р а с ы ч. Праз усю казённую аблогу?

М і к і т к а. Да самага берага!

Г а р а с ы ч. Ух ты! Лепшую зямлю захапілі... Разбагацееш тут!

М і к і т к а. А як жа? І ў нас павінна быць зацікаўле-

насць... *(Таямніча.)* Яшчэ коні і машыны абяцаў. Вось як, братка!

Гарасыч *(раззлаваўся)*. Вось зброддлівая! Ну, калі злаўлю — зарэжу, акаянную! *(Адыходзіць, не спускаючы вачэй з нарэзу.)* Кыз-кыз-кыз!..

Мікітка. Заела. Вось гэта зацікавіў Уладзімір Ільіч!

Па міжпалосіцы чуваць галасы незадаволеных сялян.

І яны сюды збягаюцца.

Панфёр. Што гэта вы аблогу прыразаеце?

Мікітка. Ды вунь,— да самага берага!!!

Галасы. Стойце! Спыніце! Не давайце ім!

Панфёр *(у агульным хоры)*. Трэба ратаваць сялянства!

Анісся *(падыходзіць)*. Давайце Леніну прашэнне напішам! Увесь народ супроць!

Мікітка. Адмовім...

Захар. Па якому праву?

Мікітка. Сам Ільіч сказаў, і ў нас павінна быць зацікаўленасць.

Паўза.

Захар *(чухае патыліцу)*. Калі так памеркаваць, яно, канечне, па справядлівасці... І для іх ёсць нарэз, і нашу зямлю не зачапілі... Праўда, мы тут выпасамі карысталіся пасля ўкосу...

Галасы. У тым жа і справа! А цяпер паспрабуй пакарыстайся ў Верабейкі! Знайшлі справядлівасць!

Варвара. Успомніце, кажу, не раз успомніце дзядзьку Плакуна... *(Засмяялася.)* Смехата! Добрыя гаспадары не бяруцца за аблогу, а гэтыя... Жылы надарвуць, і ўсё!

Гарасыч *(здалёк)*. Кыз-кыз-кыз...

Варвара. Глядзіце, а Гарас так і круціцца каля Васіліскі. *(Павярнуўшыся да раллі.)* Што гэта? Верабейка на сабе барануе! Лямкі цераз плячо і прэ! Божа!

Усе сяляне са страхам паглядзелі на раллю і з выкрыкамі: «Бацюхны!» — «Чур мне!» — «Божа!» — хутка разыходзяцца.

Пачакайце, яшчэ не тое будзе! Ха-ха-ха! Супольнікі пакажуць прыклад камунізму! *(Знікае.)*

Зноў прыходзіць Гарас і кліча: «Кыз-кыз-кыз...» Ён кружыць каля раллі, азіраецца і мацае зямлю.

С е н ь к а *(блізка за курганом)*. Стой! Тпру-ру! Адпачніце, родныя, сеяць будзем!

Г а р а с ы ч, пачуўшы яго, хутка знікае. Прыходзяць С е н ь к а, М і к і т а і В а с і л і с а. Ва ўсіх урачысты настрой. Раскрываюць полаг на возе, рыхтуюць насенне, насыпаюць у лубкі.

Значыць, пачынаем! Аж не верыцца...

М і к і т к а. Пачнём з былой тваёй аднаасобніцкай паласы...

В а с і л і с а. Дай нам бог!..

С е н ь к а *(заўважыў Марціна)*. Вунь перамяніўся нават пасля гэтага баранавання на сабе...

М а р ц і н *(цяжка абапёрся на воз)*. Так... *(Перадыхнуў.)* Падумаць толькі — ізноў пачынаем!

З другога боку кургана паказваюцца Л е н і н і В о л е ч к а.

Л е н і н. Кіньце гэтыя жарты, бацenька. Нават ад радасці не трэба на сабе барану цягаць. Вось вам план нарэзу!

М а р ц і н *(бярэ паперу)*. Дзякуй, Уладзімір Ільіч... *(Падымае лубок з насеннем.)* У нас да вас яшчэ просьба...

Л е н і н. Слухаю...

М а р ц і н *(хвалюецца)*. Па звычаі старэйшы ў сям'і першым пачынае сеяць...

Л е н і н *(таксама хвалюецца)*. Разумею... разумею... Паспрабую... *(Бярэ ад Марціна лубок з насеннем.)* У Сібіры, у сяле Шушанскім, мне даводзілася... Не вельмі ўжо сучасная тэхніка, але нічога, будуць мець і сапраўдную.

В о л е ч к а. Сеяць?..

С е н ь к а. Зямля ў самы раз для азімых...

В о л е ч к а *(усхвалявана скача)*. Сеяць, сеяць, рассяваць!..

Ленін з лубком выходзіць на край раллі.

М а р ц і н, В а с і л і с а і М і к і т к а *(амаль адначасова)*. У добры час!

С е н ь к а. Госпадзі, блаславі!

Л е н і н сее, паступова аддаляецца за курган. С е н ь к а ідзе за ім.

В о л е ч к а *(радуецца, скача)*.

Сеем, сеем, рассяваем,
Ураджая заклікаем.
Ты ўзыдзі, узыдзі, узыдзі
Вышэй мяне, гусцей травы,

Урадзі ды ўрадзі
Каравай-пірагі,
Каравай-пірагі,
Каб багаты мы былі!
Сеем, сеем, рассяваем,
Як нявесту сустракаем,
Сустракаем і вянчаем
Зямлю з ураджаем.

Услед за Леніным і Сенькам Волечка паступова аддаляецца па раллі за курган. Марцін, Мікітка і Васіліса радасна глядзяць ім услед.

Васіліса. Якая радасць, любыя мае...

Мікітка. Дзе яна толькі прымаўку падхапіла... *(Памаўчаўшы.)* Эх-х, калі б нам яшчэ Гарасыча сюды... Умелец!

Марцін уздрыгнуў, рэзка павярнуўся і са страхам, варожа глядзіць на яго. Васіліса, апусціўшы галаву, адыходзіць да воза. Здалёк чуецца настойлівы кліч Гарасыча: «Кыз-кыз-кыз!»

Заслона.

АКТ ЧАЦВЁРТЫ

Дзея адбываецца там жа. Позняя восень, дзе была ралля — ярка зеляненюць азімыя. Бліжняя частка поля нядаўна ўзарана, а далей, улева, як і раней — аблога. На кургане чырвоны сцяжок. На слупку новая дошчачка: «Участак арцелі «Прыклад». Злева відаць павець, пад ёй розны інвентар і бочка з вадой.

Як і раней, чуваць галасы аратых. На міжпалосіцы спаткаліся Варвара і Анісся.

Варвара. Чула? Васіліса з Верабейкам ужо лапці ўрозь.

Анісся. Няўжо праўда?

Варвара. Не сысці мне з гэтага месца!

Анісся. А не... *(Недагаворвае.)*

Варвара. Мне не верыш?! Пацеха! Гарас жа адкрыта сысціся хоча!..

Анісся. З кім?

Варвара. Як з кім? З Васілісай-красуняй!..

А н і с с я. Бацюхны! А як жа Верабейка?

В а р в а р а. З арцелі выжываюць. Хто-небудзь, кажуць, адзін павінен застацца... Там такое творыцца,— не дай бог! Пакуль старое поле баранавалі, яшчэ цярпелі, а як залезлі ў гэтую аблогу, дык і вылезці не могуць. Абяцалі ім коней, а іх да гэтага часу і заваду няма. Адным словам, гамон гэтай арцелі. А што з цёткай Плаксіхай робіцца, пры смерці ходзіць,— асабліва за зяцька Гарасыча ўбіваецца. На вечны пост зарок дала... Вось яна.

З посахам паяўляецца П л а к с і х а. Усім сваім відам яна цяпер нагадвае ігуменню ці прарочыцу.

П л а к с і х а. Ад прычасця іду. Канец мой прыходзіць...

А н і с с я *(са слязамі)*. Што робіцца... Грэшнікі бессаромныя. *(Кланяецца.)* Блаславі, цётачка... Памаліся за маіх дзевак!

П л а к с і х а. Бог блаславіць... а пра дзевак... скарыся; усяму скарыся, галубіца. На ўсё воля боская. Не прагані, калі ён прыйдзе табе кляймо ставіць. А ён прыйдзе... *(Рэзкі жэст да мяжы.)* Паглядзіце на любага зяцька Гараську,— нячысцік ужо ўсяліўся ў яго! Бачыце, бачыце, як корчыць яго...

А н і с с я *(са страхам азіраецца, да Варвары)*. Хадзем...

Выходзяць. Плаксіха накіроўваецца на поле. З другога боку ўваходзіць П л а к у н з пугай.

П л а к у н. Ты куды, Марфа?

П л а к с і х а. Васілісу праведаць...

П л а к у н. Няма часу на адведкі. Для іх смертны час настае. Апошнія канякі ад натугі абязножылі... *(Паказвае на курган.)* І самі ў баразне ад ветру хістаюцца. Трэба нам зрабіць, каб другім непанадна было і каб сам Ленін ад іх адвярнуўся!

П л а к с і х а *(спалохана)*. Што гэта ты?!

П л а к у н. Ленін харош, калі ён за нас, пойдзем...

Выходзяць. Яшчэ больш збянтэжаны, схуднелы, зараслы рыжай барадой, паяўляецца Г а р а с ы ч. Падыходзіць да свежай раллі.

Г а р а с ы ч *(узяў ком скібы і кінуў яго на зямлю)*. Зямлю псуюць! Якую зямлю!

З-за кургана выбягае В о л е ч к а з маленькімі граблямі.

Волечка. Што ты раскрычаўся, дзядзька Пятро! Быў бы ў арцелі, тады б і крычаў!

Гарасыч *(пастаяў, падыходзіць да Волечкі)*. Чыстая маць... *(Праводзіць рукой па яе галаве.)* Такой Васёна была...

Волечка. Дзядзька Гарасыч, з табой, відаць, ніхто не водзіцца? Так? А ты прасіся ў арцель, у нас весела!

Гарасыч *(ударыў шапкай аб зямлю)*. А можа, я і хачу ўступіць! *(Нібы жартуючы з ёй.)* Давай руку!

Волечка *(успыхнула)*. На!

Гарасыч *(б'е)*. Уступаю!

Волечка *(б'е)*. Прымаю!

Гарасыч *(вырывае руку)*. Не, чакай, у мяне ўгавор, коней і кароў я пакіну Міколку, а да вас уступаю, як і вы,— чыстым пралетарам,— з адной любімай скацінкай...

Волечка. Гэта што ме-ке-ке крычыць? *(Памаўчаўшы.)* Трымай руку! *(Б'е.)* Надбаўляй цану, дзядзька Гарасыч!

Змрочны, паяўляецца на курган Марцін з чысцікам.

Марцін. Волька! Ці не арцеллю ты так заўзята гандлюеш?

Волечка *(разгубілася)*. Я... мы... мы жартавалі...

Гарасыч *(задзірліва)*. А па-твойму, інакш?! Па-твойму, цяп-ляп, і ў клетку Гарасыча, вольнага гаспадара?!

На яго крык збягаюцца арцельцы.

Марцін. Каму ты трэба! Цэлы месяц, як груган, кружышся вакол нас, перад усім сялом на вачах. Прэч адсюль! Я не ручаюся за сябе...

Гарасыч *(аж падскочыў)*. Не баюся! Цяпер ты мне не ўказ! Мяне сам Ільіч разумным гаспадаром велічае, а ты па сямейнай прычыне ў пятлю гоніш! Васіліса Васілісай, мы тут з табой адзін на адзін, а справа справай! Нібы ў святой вадзе выкупаў мяне Уладзімір Ільіч. Я не хачу жыццё марна пражыць! Не агледзеўшыся, у вір галавой не буду кідацца! Я разабрацца хачу! *(Да арцельцаў.)* Браткі! Ды што гэта, па сямейнай прычыне?!

Марцін. Прэч.

Гарасыч *(адступіўся)*. Браткі! Не для вас адных такі нарэз далі! Думаць не магу! Спакой страціў! На гэтай зямлі не толькі хлеб, я сад пасадзіў бы, ды такі, што самому Адаму ў раі не сніласся! *(Кідаецца да Сенькі.)* Сеня!

Сенька адварочваецца ад яго.

Мікітка! Мікіта Іванавіч!

Мікітка адхіляе яго.

Разабрацца хачу... *(Насустрач Васілісе.)* Васіліса!

Васіліса з жахам адступіла.

Вось табе на... *(Адступае.)* Са сваякамі нелады... Усё сяло адвярнулася.. Адзін... Злітуйцеся... *(Паўза.)* Злітуйцеся... Я скардзіцца буду... Я Ільічу раскажу... *(Адступае, знікае.)*

Доўгае нялоўкае маўчанне.

Д а р ' я *(уздыхнула)*. Ох-хо-хо-хо...

С е н ь к а *(памаўчаўшы)*. У тым і справа... Далей не вытрымаем... Коні надарваліся...

Д а р ' я *(не стараецца глядзець на Васілісу)*. А з ім і другія сераднячкі пацягнуліся б... ды як жа яго прымеш...

М і к і т к а. Усё ясна, цераз каго і чаму... Ды што такое,— хіба незразумела?

В а с і л і с а *(уздрыгнула)*. Пра мяне думаюць! Я замінаю...

В а р в а р а *(за курганом, нікім не заўважаная)*. А, а, прыпякло...

Марцін рыўком садзіцца на бервяно.

М а р ц і н. Змовіліся? Бяжыце, даганяйце!

С е н ь к а *(кідаецца ўслед)*. Я мігам! А галоўнае, Гарас зямлю разумее!

М а р ц і н *(яму ўслед)*. А я з арцелі прэч!

Сенька спыняецца.

М і к і т к а. Ільіч вельмі раіў аб серадняках, а тут праз сямейныя нелады арцель у небяспецы... *(Ва ўпор, Марціну.)* Што ты на гэта скажаш, Марцін?

Марцін падняўся з бервяна, маўчыць, усе чакаюць.

М а р ц і н *(знешне спакойны)*. Волечка! Бяжы ў сяло, цікуй дзядзьку паштальёна. Павінна ж быць дэпеша ад камісара Камолава аб конях. Упэўнен, будзе!..

В о л е ч к а *(зрываецца з месца)*. Адной нагой тут, другой там!

М а р ц і н. Ды захапі з сабой стрэльбу Уладзіміра Ільіча,— у каморцы яна. Вечарам схаджу на паляванне

для варыва... *(Раптам да Мікіткі.)* А гонар у нас з табой ёсць? Што на сяле скажуць, калі да мяне і Васілісы яго далучыць?

Д а р ' я. Ужо гавораць,— у арцельцаў хутка сабачае вяселле будзе!

Паўза.

В а с і л і с а *(пра сабе)*. Бяжы куды вочы глядзяць... *(Выступіла, услых.)* Я...

Д а р ' я *(падхапіла)*. Яно вядома, што грэху таіць!

С е н ь к а *(падхапіў)*. Яно б так, ды толькі куды ты дзенешся?..

В а с і л і с а. У другое сяло ці яшчэ куды... Толькі б вам лягчэй было!..

С е н ь к а. Святая ты, Васіліса!

М а р ц і н *(спалохана)*. Гэта што яшчэ? Не, ды што вы прыдумалі?!

В а с і л і с а *(кланяецца)*. Не памінайце ліхам...

М а р ц і н *(да Васілісы)*. Не пушчу!!!

В а с і л і с а *(адхіляе яго)*. Не трымай мяне, Марцін... Не застануся... Нікому ўжо цяпер я не дакажу, хоць і не вінаватая... Адно будуць гаварыць... Замінаю... Не застануся... Бывайце... *(Пайшла па міжпалосіцы ў бок кургана.)*

Марцін кідаецца за ёй.

М і к і т к а *(яму ўслед)*. Марцін! На цябе народ глядзіць!

Марцін спыняецца. Не павярнуўшыся, спыняецца і Васіліса. Усе з трывогаю глядзяць на яе.

В а с і л і с а *(нібы пераконваючы сябе)*. Не застануся... не застануся...

Д а р ' я *(скрозь слёзы)*. Што ўжо... ідзі... будзь храбрай. Спаткаецеся, калі ўсё ўціхамірыцца...

М і к і т к а. Калі ўціхамірыцца... вернешся...

М а р ц і н. Таварышы, што вы робіце!..

В а с і л і с а *(паўтарае)*. Не застануся... не застануся...

С е н ь к а. Пра Волечку падумай...

В а с і л і с а *(схамянулася)*. Волечка! *(Павярнулася, абвяла позіркам усіх і, не ўбачыўшы Волечкі, хутка ідзе.)*

В а р в а р а *(тут жа ёй насустрач, з-за кургана не сваім голасам)*. Ха-ха-ха-ха! Глядзіце, глядзіце,— арцельшчыкі сваю распусніцу выганяюць!

Васіліса на міг зноў спыняецца.

А н і с с я. Спадніцу ёй на галаву завязаць і пусціць па свеце! Даўно б мужыкам расправіцца з ёй!

В а р в а р а *(узбегла на курган).* Сабак на яе нацкаваць! *(Бяжыць з кургана.)* Ату яе, ату!

Свіст, смех, брэшуць сабакі.

М а р ц і н *(выхапіў з воза тапор).* Пасяку гадаў!

М і к і т к а *(падскочыў да яго).* Ірады, толькі і чакаюць твайго бунту! Арцель загубіш!

Марцін спалохана паварочваецца да яго.

Д а р ' я *(замітусілася, кідаецца).* Сенька, Мікітка, правядзіце яе! Ці не бачыце, што робіцца!

Сенька і Мікітка бягуць да Васілісы. Васіліса рантам зрывае з сябе хустку, віхрам павярнулася ім насустрач. Твар яе нельга пазнаць, так ён змяніўся.

В а с і л і с а. Нікуды я не пайду!!

Усе адхіснуліся.

В а р в а р а. Глядзіце, глядзіце,— вярнулася! Аж у галаве закружылася!

В а с і л і с а. Я думала, яны супакояцца, а яны яшчэ горш! Ну і хай смяюцца, хай улюлюкаюць, а я насуперак! Не помню дня, калі б я не пакутавала, ад крыўды слязой не залівалася. За знявагу ў пояс кланялася. А бяда ўсё ад варот не ішла. А ці ж я не была ціхай... ці ж я не саступала дарогу малому і старому ў сваёй беспрасветнай батрацкай долі... Хопіць! Пакорлівасць, відаць, не карміліца, а лямка на бабскай шыі! Да чаго дайшла... Сабакамі цкуюць... Сабакамі... *(Плача.)* Хопіць! Даволі!.. Больш цярпець не буду! Сам таварыш Ленін мне сказаў: «Змагайся!» І я буду змагацца! Першы раз падымаю галаву! Я прыгожая! *(З выклікам.)* Дзівуйцеся! Прыгожая! Я не баюся, што спадніцу завяжуць на галаву і пусцяць па свеце!

С е н ь к а. Оспадзі Ісусе... Ашалела...

В а с і л і с а. Што, спужаліся? Арцельцы. «Прыклад». Яны рэвалюцыю паказваюць... Яны пачын лепшага жыцця пачынаюць... Паршывыя авечкі вы, а не прыкладаўцы. Свіней вам пасвіць, а не прыклад паказваць. Бабылі вы пакорныя!

Агульны гоман.

А што, другая Васіліса? Загаварыла? Спадніцу завяжуць!

Хай! Не сорамна, а пра вас слава пойдзе. Не мяне цкуюць сабакамі, а вас! Ату іх, няшчасных, ату!

Мікітка. Васіліса!!!

Васіліса. Што, не праўда? Ці не тваю дачку-салдатку да чорнай пятлі давялі? Ды якую дачку... А ты вывеў на сходку Варвару-паклёпніцу ды вырваў ёй язык?

Марцін. Не ў сваім розуме! Супакойся, Васіліска, супакойся! Не пайшла, і добра...

Васіліса. А ты як бараніў сваю Васілісу? За партыйны гонар свой спалохаўся? Проста красная дзевіца, а не мужык! Эй, Варвара! Дай яму спадніцу! Спадніцу яму! Спадніцу! *(Плача.)*

Марцін *(кідаецца да Васілісы)*. Васіліска! Пакутніца! Не дадумаўся я... даруй мне...

Васіліса. Не падыходзь! Табе гонар, а ім пацеха!

Дар'я. Так-та яно, так, Васіліса, намучыліся мы ўсе, а народ бунтуе,— на споведзі нехта сказаў пра цябе!..

Васіліса. А з таго часу і заскакалі вакол мяне паклёпнікі. Вось і кружыцца з тых пор над маёй галавой змей стогаловы,— люты нагавор! Усіх пераплёў, па руках і нагах звязаў,— ну, хай лютуе! Я вырвалася!

Анісся *(выглядае)*. Ух, яна якая... У ціхім балоце чэрці водзяцца...

Васіліса. Вырвалася! Заставайцеся харошымі ды пакорнымі. У мяне свая арцель будзе! Таварышы, у каго сэрца смелае,— пераходзь да мяне! Хто на мой бок?.. Нікога няма? Спалохаліся?!

Гарасыч *(прабіваецца цераз натоўп)*. Як гэта — нікога? Як нікога? *(Перайшоў на бок Васілісы і тупнуў нагой.)* Я!

Васіліса *(падалася назад)*. Ты?!

Гарасыч. Мы з табой новую арцель створым!

Варвара *(з натоўпу)*. Гусцее Васіліскіна каша!

Наступае цішыня. Марцін, затаіўшы дыханне, са страхам і здзіўленнем глядзіць на Гарасыча і Васілісу.

Васіліса. Адыдзі, Гарас. Дарэмнай мукай сваёй ты толькі людзей збіваеш. Я даўно табе сказала,— паважаю цябе як чалавека і добрага гаспадара, а таму ніколі не бываць...

Гарасыч. Эх, бабачка!.. Не зразумела ты ўсё-такі...

Апусціў галаву, адыходзіць.

Васіліса. Забудзь усё гэта, мне лягчэй будзе... Я ўсё-такі кахаю Марціна...

Марцін (*выдыхнуў*). Дзякуй...

З натоўпу. Глядзіце, глядзіце, сама цётка Плаксіха ідзе!

Варвара. А-а, цётка! Вось дарэчы! (*Да Васілісы.*) Спачатку глянь у вочы роднай хроснай, няхай спачатку яна плюне табе ў бессаромныя вочы, а потым ужо ўсёй грамадой мы пацешымся!

З натоўпу. Нагулачка вядзе цётку!

Натоўп расступіўся. Уваходзіць Плаксіха з дзягцяркай і памазком у руках. За Плаксіхай са стрэльбай Волечка. Усе ўражаны.

Анісся (*ускрыкнула*). Бацюхны!!!

Волечка (*Плаксісе*). Стой! Павярніся тварам да ўсіх! Павярніся! Сорамна, бабуся! А мазаць нам вароты не сорамна? Табе кажу, ведзьма касматая! Ну! Лічу да трох: адзін раз, два раз...

Плаксіха павольна паварочваецца тварам да ўсіх. Народ, ахнуўшы, адступіў.

Волечка (*не адрываецца ад стрэльбы.*) Ма... Та... Я прыкінулася, быццам сплю, а сама не сплю...

Варвара. Застрэліць, вырадак! (*Кідаецца да Волечкі.*)

Волечка (*наводзіць на яе стрэльбу.*) І ў цябе пальну, цётка Варвара! Адступіцеся! Я вам ужо не маленькая і не дурнічка! Раз!

Варвара адскоквае. Плаксіха хацела выхапіць стрэльбу ў Волечкі.

Назад, бабка! Расказвай, навошта хацела вароты мазаць?..

Плаксіха. Нячысцік падбіў...

Волечка. Раз... два... (*Ляпае затворам.*)

Плаксіха. Усё раскажу! Адвядзі стрэльбу!

Волечка. Гавары!

Плаксіха (*выпрасталася*). Я... Усё я... «Во имя отца светого» сялянскае жыццё ратую... Хай усе ведаюць,— бог апраўдае.

Васіліса. А на споведзі нагаварыла таксама ў імя бога?

Плаксіха (*памаўчаўшы*). Саграшыла...

Анісся (*ускрыкнула з жахам*). Клятвапарушальніца!..

Мікітка. Якое ліхадзейства...

Анісся (*з тым жа жахам*). Душагубка! (*Павярну-*

ася да Васілісы, уголас.) Васіліса, пакутніца нявінная, даруй ці праклянi... у мяне дзеўкі растуць... *(Валіцца ў ногі Васілісы.)*

В а с і л і с а. Устань, Анісся, не віню цябе.

А н і с с я, зарыдаўшы, выходзіць.

М а р ц і н *(да Волечкі)*. Верабейка ты мой... Якое шчасце ты нам прынесла...

В о л е ч к а. Пачакай! Я вартавы!

М а р ц і н. Кінь яе! Цяпер не ўцячэ!

П л а к с і х а *(адыходзіць і забірае дзягцярку)*. Авось спатрэбіцца! *(Ідзе проста на народ, усе з апаскай расступаюцца.)* Цяпер ужо не слязамі, а крывёю абмыю крыўду сваю...

Г а л а с ы *(ёй услед)*. Яшчэ пагражае! Пад суд яе! І самога Плакуна туды ж! Плакуна!

З-за кургана нечакана з клункам за плячыма выбягае П л а к у н. Усе мімаволі падаюцца назад.

П л а к у н. Хто мяне клікаў? Я тут! Баба-дурніца за сваё адказчык, а я нават дапамагчы магу! Новы старшыня мне толькі што вярнуў з каапeратыва мае грошы! *(Дастае з-за пазухі скураны кашалёк і суе яго то аднаму, то другому арцельцу.)* Калі ласка! Колькі вам? Вашы коні ледзь ногі цягаюць? Голымі рукамі аблогу калупаеце? Не выходзіць?.. Калі ласка! Я хацеў краму адкрыць, а цяпер зразумеў, што не грошы, а пасада — трон цяперашняга жыцця! Пакуль ёсць пасада, і для мяне ёсць месца на планідзе сацыялізма. Іду ў горад, шукаць пасаду... А можа, арцельку якую... саматужную скалачу...

М а р ц і н. Што табе трэба ў нас?!

П л а к у н *(з выклікам)*. Куды вы ўшчымляецеся! Не аблогу ўздымаеце, а магілу для ідэй «братства и равенства» капаеце! Голымі рукамі і баранаваннем на сабе — прыклад светлага жыцця паказваеце!

Г а р а с ы ч *(горача)*. Выбірайцеся, пакуль цэлы! Мы тут свой лёс вырашаем.

П л а к у н. Ну, вырашайце, рашайце, а я прыеду паплакаць на вашай магілцы... *(З рогатам выбягае.)* Ха-ха-ха!

М а р ц і н *(кінуўся за ім)*. Ах, ты!

В а с і л і с а *(яму)*. Марцін!

Марцін сумеўся, спыняецца.

Марцін. Ну, пачакай... Дабрадзей... К сацыялізму прымазваецца. Ну, ды ў горадзе без яго такіх многа... Быў хапала, хапалам і застаўся...

Доўгая паўза. Аднаасобнікі моўчкі разыходзяцца на свае палоскі.

Мікітка *(аглядваецца на іх)*. Не зрывайся, Марцін...

Марцін. Ясна... *(Стараецца адцягнуць увагу.)* Я вось не нарадуюся на нашу Волечку... *(Падышоў да Васілісы.)* Васіліска, ты яшчэ ніколі не была для мяне такой дарагой...

Васіліса *(прыпала да яго грудзей, памаўчаўшы)*. Любы... цяпер усё будзе добра... толькі вер, як самому сабе...

Сенька *(адварочваецца ад іх)*. Малайчына, Волечка! Век не забудзем...

З усіх бакоў чуюцца радасныя галасы арцельцаў, кожны стараецца прылашчыць Волечку. «Сапраўдны арцелец!» — «Сябе ў крыўду не дасць!» — «На лад пойдуць справы ў нас!» Засмучаны, адзінокі стаіць Гарасыч.

Марцін *(падышоўшы да Гарасыча)*. Ну, цяпер і я магу табе сказаць, Гарас, тваё каханне каханнем, а справа справай. *(Хоча абняць яго.)* Насумаваўся я па табе, чорт рыжы!

Гарасыч *(адхіляе яго)*. А ты пачакай абдымацца. Яшчэ не ўсё скончылася.

Усе насцярожыліся.

Я чалавек з інтарэсам. *(Паварочваецца да аблогі.)* Клад ляжыць... Скарб... у адзіночку не возьмеш... *(Памаўчаў.)* А што, калі спачатку папрацаваць вялікай складчынай?

Марцін. Не будзем мы нарэз дзяліць... Яго для арцельнай справы далі.

Гарасыч. А калі з вашай арцеллю без гаспадаркі застанешся і дзецца не будзе куды? Ты чуў пра такую загвоздачку?..

Марцін. Такога не здарыцца... Сама дзяржава нам дапаможа... Коней і машын дае... *(Да Волечкі.)* Дзядзьку паштальёна бачыла?..

Волечка. Ай, а я забыла! *(Асцярожна.)* Пісьма... пісьма няма!

Марцін. Як жа гэта няма... павінна быць.

Волечка. Праўда, татачка! Дзядзька, што на казу падобны, на млын прыехаў, а пісьма няма...

Марцін *(радасна)*. Губпрадкамісар Камолаў! Ды што ж ты маўчала! Мы яго і чакаем! *(Да ўсіх.)* Чулі? Калі ўжо сам з'явіўся, не з пустымі рукамі. Ды вунь ён на сваіх дрожках!

Галасы. Ну, хвала богу! Зажывём цяпер! Радасць на радасць!

Марцін ідзе насустрач Камолаву.

Камолаў *(падыходзіць)*. Добры дзень, таварышы!

Галасы. Добры дзень, добры дзень! Рады бачыць, таварыш камісар!

Камолаў *(заўважыў Гарасыча)*. А, любімец Ільіча... *(Марціну.)* Вось што... гм... *(Мелькам зірнуў на натоўп арцельцаў, змаўкае.)*

Васіліса *(зразумеўшы яго позірк)*. Таварышы, пойдзем грабліць...

Усе, апрача Марціна, Камолава і Гарасыча, выходзяць.

Марцін *(Гарасычу)*. Аставайся... Я хачу, каб ты сам усё бачыў і сам аб усім мог меркаваць... *(Камолаву.)* Сядайце, таварыш Камолаў...

Камолаў *(садзіцца на бервяно)*. Садзіцца няма калі,— аб'язджаю саўгасы, каапгасы, млыны... Улічваю свае рэсурсы. Прыходзіцца.

Марцін *(нецярпліва)*. Ну, а нам што?..

Камолаў. Як абяцаў,— дзесяць коней...

Марцін *(ускочыў)*. Дзе яны?

Камолаў. Сёння к вечару прыгоняць з Разанскагаваенгаса...

Марцін *(узбег на курган)*. Сенька, Мікітка, Васіліса! Дзесяць коней! Да вечара будуць!

За курганом радасны шум.

Камолаў. Гэта, канечпе, кропля ў моры для такога парэзу... Але... самі разумееце... і гэта ўжо з кроўю прыйшлося адрываць...

Марцін і Гарасыч *(адначасова)*. Разумеем, разумеем...

Камолаў. Днямі запаражу вам дзве сеялкі і малатарню...

Марцін. Дзякуем, таварыш Камолаў...

Гарасыч. А гэта ўжо нештачка... У мяне сеялка, ды гэтыя вось, ужо і тры...

Камолаў *(падымаецца)*. Ну, а цяпер вернемся да асноўнага пытання.

Гарасыч. Якога?

Камолаў. Да дзяржаўнага, таварыш... *(Запнуўся.)*

Гарасыч. Сын Іваноў.

Камолаў. Да дзяржаўнага, таварыш Іваноў. Вы цяпер людзі, так сказаць, дзяржаўныя... Не тое што аднаасобнікі... З вамі размова карацей... *(Ціха, Марціну.)* Таварыш беспартыйны?

Марцін. Так, але...

Камолаў. Спадзяюся, спачуваючы... наш... *(Уголас.)* Адным словам, вам на ўсю плошчу арцелі запланавана сеяць авёс і проса.

Марцін і Гарасыч *(адначасова)*. Чаму? Як запланавана?

Камолаў. Гэтага патрабуюць інтарэсы губерні і камунізму. Я лічу, далейшых тлумачэнняў не патрабуецца...

Марцін і Гарасыч пераглянуліся, нейкі час маўчаць.

Гарасыч. На гэтай зямлі сеяць авёс і проса нявыгадна, таварыш камісар...

Камолаў. Што значыць «нявыгадна»? Трэба.

Гарасыч. А ў мяне, выбачайце, канечне, таварыш камісар,— другі план быў... Я вось тут хадзіў вакол нарэзу і вачэй не мог адвесці, на ўсё забыўся... сон страціў... І што ж я ўбачыў? Вунь там, на ўзгорку, наш падмаскоўны лянок просіцца... проста крычыць: пасейце мяне, дзівакі, пасейце! Я вам дам нітачку танчэй шоўку... Правей, на прыпёку, вішнёвы сад... А ніжэй — пшанічка-матухна, у рост чалавека, колас да коласа... Жыта, зялёны гарошак... Ля берага — капустка, моркаўка, укропчык, гурок і ўсякая сталовая прыкраса... А вось тут усе сорак дзесяцін бульбачка!

Камолаў. Не разумею, пра што вы гаворыце...

Гарасыч *(не слухаючы)*. Гэта бульбачка корміць у нас сто свіней з парасяткамі і дзвесце халмагорак... Тут вам і масельца маскоўскаму пралетарыю,— тут жа ўсяго сто вёрст,— і сальца, і зялёны шурум-бурумчык... І сабе выгадна, і пралетарскаму класу стол царскі!

Марцін *(з захапленнем слухае)*. Малайчына, Гарасыч! У мяне таксама ёсць план, але твой лепшы! Аж дух заняло...

Камолаў. Пра што вы гаворыце... мне патрэбен авёс і проса... Я вам іх і планую.

Гарасыч. А вы купіце на рынку.

Камолаў. Мне ўжо як-небудзь лепей ведаць, таварыш, што мне рабіць. *(Да Марціна.)* Я не магу залежаць ад кан'юнктуры прыватнага сектара...

Марцін. Не, тут нейкае непаразуменне, таварыш Камолаў... Чэснае слова...

Камолаў. Ніякага непаразумення. Губвыканком вынес рашэнне *(азіраецца)* стварыць гарантыйны фонд губпрадкома. І я яго ствару. *(Дастае з партфеля карандаш і паперу.)* Адным словам, на, трымай. *(Падае карандаш і на партфелі, як на падносе, паперу.)* Падпісвай хутчэй і не прыкідвайся наіўным...

Марцін *(аўтаматычна ўзяў карандаш і разгублена глядзіць на паперу)*. Што гэта?

Камолаў. Абавязацельства. Ды падай гэта арцельнай масе на высокім узроўні, як ганаровае дзяржаўнае мерапрыемства! І каб ні аднаго пуда не расплылося па засеках. Як толькі змалоціце, зараз жа на элеватар.

Марцін не падпісвае, не разумеючы, са страхам глядзіць на Камолава. Гарасыч падняўся, адступаецца. Затым ізноў падбягае да Камолава.

Гарасыч. Як гэта, дазвольце, а што ж вы для арцелі пакідаеце?

Камолаў. На едакоў арцелі хопіць нормы ўжо засеяных азімых. Ну, а калі не хопіць, дапаможам з губфонду.

Гарасыч. Дазвольце, гэта ж ізноў як бы прадразвёрстка, мяцёлачка бяздушная? А-а, як жа, даруйце, наконт вольнага гандлю? Адмяняецца? Змычку далоў!

Камолаў. Ну, гэта ўжо асноўнай ідэі датычыцца. І наогул, не крыўдуй, Іваноў, але нам там як-небудзь больш вядома, як будаваць камунізм. А коратка скажу, гандаль гандлем, мы ўступілі прыватніцкім настроям серадняка,— але ж вы цяпер ужо і не прыватнікі, вы-та ўжо свядомыя...

Гарасыч *(з жахам)*. Зразумела... *(Нізка кланяецца.)* Бывайце здаровенькі, грамадзянін камісар... Дзякуй вам за вашы тлумачэнні...

Камолаў *(між іншым)*. Усяго добрага. *(Павярнуўся да Марціна.)*

Гарасыч *(падышоў да раллі, уражаны)*. Хвала бо-

гу, я яшчэ вольны... не, трэба ўцякаць адсюль, пакуль не позна! Уцякаць!

Усхваляваныя, падыходзяць да яго Васіліса, Дар'я і іншыя. Наперабой ціха пытаюць: «Што здарылася?» — «У чым справа?» Гарасыч нікому не адказвае, стаіць маўклівы і варожы.

Камолаў *(Марціну)*. Падпісвай, Крутаяраў. Карандаш хімічны. Ды не затрымлівай мяне!

Марцін *(адпіхвае ад сябе партфель)*. Не падпішу... не! *(Апусціў галаву, усхваляваны, машынальна вырваў з берваяна тапор, праходзіць па міжпалосіцы.)* Не падпішу...

Камолаў. Ты што гэта, Крутаяраў? Сабатаж губкомаўскіх установак?

Марцін *(узмахнуў тапаром і па самае тапарышча загнаў яго ў бервяно)*. Вунь яны пайшлі, адна з дзягцяркай, другі з мяшком грошай, яны ворагі, а ты што робіш? Я не згодзен з такой устаноўкай! Можаце выключаць мяне з партыі, але я сёння ж напішу скаргу Леніну!

Камолаў. Не гарачыся, Крутаяраў. Ка мне ж і прышлюць тваю скаргу... Ды і не да цябе цяпер Уладзіміру Ільічу... *(Памаўчаўшы.)* У яго са здароўем сур'ёзныя непрыемнасці...

Марцін *(спалохана падбягае да яго)*. Што?

Камолаў *(памаўчаўшы)*. Так. Сур'ёзна... Можа здарыцца, што нам без яго давядзецца... Дактары апасаюцца...

Марцін *(пастаяў і раптам кідаецца то ў адзін, то ў другі бок)*. Сенька! Мікітка! Васіліса! Сірацею.

Васіліса *(кідаецца да яго)*. Што ты, Марцін! Я з табой, таварышы з табой! *(Павярнуўшыся да Камолава.)* Што вам трэба ад яго, грамадзянін камісар, скажыце нам усім!

Камолаў *(не звяртае на яе ўвагі)*. Не панікуй, Крутаяраў, і не бунтуй народ!.. Каму трэба такая арцель?..

Цяжкая паўза.

Галасы. Ах, вось як, арцель яму наша не трэба?!
Арцель хоча разарыць?!

Марцін *(арцельцам)*. Не бойцеся. Я зараз жа еду ў Цэнтральны Камітэт партыі. *(Павярнуўся да Камолава і рэзка ўзмахнуў рукой.)* Выбірайцеся адсюль, ці я цябе закіну вунь у той роў! Бачыш, рукі дрыжаць.

Камолаў *(адступаючы)*. Рукі дрыжаць? Прадстаўніка савецкай улады забіваць? Я прадработнік, адзін не езджу... *(Крычыць.)* Міліцыянер! Міліцыянер!

Сенька *(падбег да Марціна).* Што ты нарабіў?!

Волечка *(выбягае з-за кургана).* Татачка, прыехалі!

Чуваць шум аўтамабільнага матора.

Сенька. Вунь прыехалі!

Васіліса *(загароджвае Марціна).* Не дам! Арцельцы! Станем усе як адзін за сваю волю! Ленін з намі!

На кургане з'яўляецца Ленін, затым партработнік.

Камолаў. Міліцыянер! *(Заўважыўшы Леніна, здзіўлены, асекся.)* Міліц...

Волечка *(узбегла на курган).* Дзядзя Валодзя, я мазальшчыка злавіла!

Ленін. Злавіла? Малайчына! Я так і ведаў! *(Да ўсіх.)* Прагульваўся, вось і заглянуў на знаёмыя мясціны...

Галасы. Ленін! Ільіч зноў прыехаў!

Сенька *(разводзіць рукамі).* Не верыцца!

Васіліса. У такую хвіліну!

Ленін *(сходзіць з кургана).* А, і дыялектык зноў тут.

Гарасыч. Уладзімір Ільіч, выходзіць, вы з імі ў згодзе? А мой інтарэс забылі? *(Раптам падскочыў.)* Я жыццё Расіі спыню,— калі без майго інтарэсу!

Ленін абводзіць усіх хуткім дапытлівым позіркам.

Камолаў *(памаўчаўшы).* Мяне тут ледзь у роў не скінулі.

Ленін. І скінуць! Усіх скінуць, хто таго заслужыў! Вы, як відаць, абрушылі на галовы нашых арцельцаў свае рашэнні зверху, у той час калі трэба, каб яны самі рашалі.

Камолаў. У мяне ж вострае дзяржпытанне...

Ленін. Прадуктовае? Для баязліўца ўсе дзяржаўныя пытанні вострыя, таму што ён стараецца рашыць іх пры зачыненых дзвярах.

Камолаў. Справа не ў баязлівасці, Уладзімір Ільіч, а ў тым, што мы падыходзім з пункту гледжання сусветнага камунізму, а яны з асабістых інтарэсаў...

Ленін *(успыхнуў).* Хто гэта «мы»?! Адкуль у вас столькі гэтага «комчванства»?! Вось начытаюцца рознай архісвінскай ерасі і ўяўляюць сябе прыказчыкамі ад камунізму! *(Памаўчаўшы.)* Камуніст, які забывае сённяшні інтарэс мас, забягае, зарываецца занадта наперад,— ды гэта ж пудзіла, [illegible] не камуніст! Што вы тут натварылі?

Гарасыч *(стаіць наводшыбе, суровы і злы)*. Ён прывёз арцелі прадразвёрстку, вы, кажа, цяпер свядомыя і без зацікаўленасці абыдзецеся...

Марцін. Мы для нашай дзяржавы самога жыцця не пашкадуем, а ён... *(Камолаву.)* Пакажыце Уладзіміру Ільічу «Абавязацельства».

Ленін. Пакажыце.

Камолаў пакорпаўся ў партфелі, падае Леніну дакумент. Ленін са здзіўленнем, амаль са страхам, чытае яго.

Камолаў. Як бачыце, Уладзімір Ільіч, я ім запланаваў авёс і проса і абавязваў гэта выканаць... Гэта неабходна...

Ленін *(прачытаў дакумент, памаўчаўшы)*. Абалваніць хочаце нашых наватараў?

Камолаў *(адступаючы)*. Што вы, Уладзімір Ільіч?.. Я не адзін год у партыі... Я п-пратэстую!..

Ленін. А на якой падставе вы ставіце арцельшчыкаў у горшыя ўмовы ў параўнанні з умовамі аднаасобнікаў? Які ж гэта сацыялізм, калі людзі пры сацыялізме будуць марыць аб аднаасобным жыцці? Вы пры сваім розуме? Дзе перавага калектыўнай гаспадаркі? Дзе асабістая зацікаўленасць членаў арцелі? Ды без асабістай матэрыяльнай зацікаўленасці з месца не скранецеся і ўсё развaліце! Толькі безнадзейны бюракрат мыслі, каб лягчэй кіраваць, можа прыдумаць такое, каб заглушыць ініцыятыву мас і паставіць іх па ранжыру,— калі ўжо нэп — дык кулацкі, калі сацыялізм — дык дэспатычны! Куды хачу, туды і варачу! А ці ведаеце вы, што гэта нічога агульнага не мае з дыктатурай пралетарыяту, сагрэтай класавым саюзам рабочых і сялян!

Камолаў. Я п-пратэстую! Можа, крыху і перагнуў, але нашто ж вы гэта... тут... перад усімі... перад...

Ленін *(здзіўлены, памаўчаўшы)*. Выбачайце, Ваша Бюракратычная Вялікасць! *(Прайшоўся і правёў па галаве далоняй, ціха, амаль з сумам.)* Пакіньце мяне, Камолаў... Вы дэспат па натуры... Я буду прасіць ЦК пазбавіць вас права займаць кіраўнічыя пасады і перавесці да станка...

Камолаў *(адступаючы)*. Уладзімір Ільіч... Пратэстую... Ды што вы... Як жа гэта?.. Як жа гэта магло здарыцца... *(Адступае назад і знікае.)*

Ленін яшчэ раз прайшоўся, паволі апускаецца на бервяно. Устрывожаныя арцельцы абкружаюць яго.

Марцін. Што з вамі, Уладзімір Ільіч? Вам не добра?

Ленін *(стомлена)*. Не, не, нічога... *(Задумаўся.)* Адкуль гэта ў яго?.. Сын гарадскога рымара... мешчанін... *(Паказвае Марціну ў бок пайшоўшага Камолава.)* Вось вам урок... За вамі таксама іншы раз заўважалася... імкненне навязаць свае погляды... будаваць сацыялізм па каманде. Калі хочаце быць камуністамі, ні на хвіліну не забывайце нашу першую запаведзь *(раздзельна)* САВЕТ. *(Памаўчаўшы.)* Павучыцца б вам... *(Да ўсіх.)* А што, калі праз некаторы час пашлём Марціна Рыгоравіча вучыцца, каго старшынёй выберам?

Мікітка. А каго ж, Васілісу Лукінішну!

Ленін. Ого! *(Да Васілісы.)* Здолееш?

Васіліса *(сумелася)*. Я... я вучыцца буду...

Волечка. Мы з мамкай разам — вучыцца!..

Ленін. Правільна. Усім трэба вучыцца, і ў прыватнасці Гарасіму Гарасімавічу.

Гарасыч. А мне навошта?

Ленін. Вы вось добры гаспадар, а вароты вашага двара адчыняюцца на ветраны бок.

Гарасыч. Заўважыў!

Уваходзіць партработнік.

Партработнік *(на хаду, усхвалявана)*. Уладзімір Ільіч, вам тэлеграма ад таварыша Калініна з Петраграда.

Ленін. Чытайце! Чытайце хутчэй!

Партработнік. Трактар гатоў.

Ленін *(хутка падняўся на ногі, радасна)*. Зрабілі? Здолелі?!

Партработнік *(Марціну)*. Па асабістай просьбе Уладзіміра Ільіча пуцілаўцы зрабілі для вас першы трактар...

Галасы. Трактар! Машына!

Гарасыч *(уражаны)*. Вось гэта пралетарскі клас...

Марцін *(скрозь слёзы)*. Уладзімір Ільіч, ды я ж у маторах разумею — у Чырвонай гвардыі на браневіку служыў!

Ленін *(партработніку)*. Перадайце пуцілаўцам маё шчырае сардэчнае дзякуй. Хаця не, пачакайце! Я сам з імі сёння буду гаварыць па прамым провадзе. А вы, калі ласка, падрыхтуйце. *(Павярнуўся да ўсіх.)* Скончылася аднаконная Расія! З трактарным плугам цябе, рэвалюцыя!

Паўза.

(Гарасычу, весела кіўнуў на ўсіх.) Ну, дык як, Гарасім Гарасімавіч, разам?

Г а р а с ы ч *(падумаў і рашуча)*. Рызыкну!

Г а л а с ы *(радасна)*. Разам, разам!

Л е н і н *(Васілісе)*. А вы што скажаце, Васіліса Лукінішна?

В а с і л і с а. Цяпер ужо ўсё відаць, Уладзімір Ільіч... Вось узаром мы сваю зямлю ад краю і да краю, здымем з яе стары кажух, абмыем яе твар дажджамі, прыедзеце вы зноў да нас, таварыш Ленін, падымемся мы ўсе, пасля многіх нягод і бед, вось на гэты курган і засмяёмся. А перад намі, у паласатым шаўковым ўборы, жывая калышацца зямля...

Л е н і н *(з захапленнем)*. Вось яна, наша зямля! Якое шчасце змагацца за гэтую зямлю! Усім шчасцям — шчасце! *(Партработніку.)* А вы кажаце, я перагружаюся.

М а р ц і н. Вам яшчэ гару, гару несці, Уладзімір Ільіч...

Л е н і н. Ну, гэтую гару мы цяпер ужо ўсе разам нясём! І ў тым маё шчасце... Няма гарантыі, што народ яшчэ не напаткаюць бядоты і пакуты... Так, няма гарантыі... Але ў краіне цяпер ужо знойдуцца сілы, каб вытрымаць любыя выпрабаванні. Кожнага скінем, хто замахнецца на гонар і волю працоўнага чалавека. І ў гэтым, баценька, наша шчасце! Я аддам гэтаму шчасцю ўсё маё жыццё, да апошняй іскры ў маёй свядомасці, гэта значыць, я нават памру ад шчасця. Выходзіць — я дажыў да шчасця!

Заслона.

Н. Думбадзе, Г. Лордкіпанідзе

Я, БАБУСЯ, ІЛІКО І ЛАРЫВОН

ЛІРЫЧНАЯ КАМЕДЫЯ У ДЗВЮХ ДЗЕЯХ

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ:

Зурыко.
Бабуся.
Іліко.
Ларывон.
Мэры.

У ЭПІЗОДАХ:

Сельскі ўрач.
Георг Вашакідзе — агітатар.
Настаўнік.
Рамул.
Амбако.
Тоўсты пасажыр.
Пасажыр з кнігай.
Бландзін.
Першы пасажыр.
Другі пасажыр.
Дзяўчына.
Праваднік.
Вучні — у школе.
Пасажыры — у поездзе.

ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

ПРАЛОГ

Павольна раскрываецца заслона. Перад намі панарама сельскага двара ў Грузіі. Каля плятня сядзіць хлапец. Ён звяртаецца да залы.

Зурыко. Добры вечар! Добры вечар, людзі добрыя! Мяне завуць Зурыко. Зурыко Вашаламідзе. Я жыву ў Грузіі, у далёкім горным сяле. Гэта мой калгас, маё роднае сяло. За нашым сялом быстрая горная рэчка працякае. Цераз рэчку масток перакінуты. І што цікава! Кожную вясну рэчка з берагоў выходзіць і мост зносіць у мора. А калгаснікі яго ізноў будуюць. Кожную вясну, колькі сябе памятаю, адно і тое ж. *(Чуваць звон.)* Гэта звон майго сяла. Ён звоніць кожную раніцу — апавяшчае, што хутка пачнуцца заняткі ў школе. А калі звоніць вечарам — то так і знай — або пажар, або агульны сход калгаснікаў.

Маё сяло... Маё сяло — самае прыгожае, самае вясёлае на ўсю Грузію. Колькі ёсць на свеце сёл, а сваё я люблю больш за ўсіх. Таму што нідзе не можа быць такога сяла, дзе б жылі Я, Бабуся, Іліко і Ларывон. У гэтай хаце мы жывём, а ў гэтых — насупраць — Іліко і Ларывон. Як кажуць, акно ў акно жывём. Яны абодва за мяне гатовы душу аддаць. І я іх таксама вельмі люблю. Бабуся мая — Вольга — мудрая жанчына. Вечна дзяўбе адно і тое ж — «Вучыся, кажа, Зурыкела!» (Зурыкела — гэта я. Мяне так бабуся, Іліко і Ларывон называюць.) «Вучыся, а то, кажа, астанешся дурнем!» Зараз вы самі ўбачыце, як гэта бывае. Што вам яшчэ пра сябе расказаць? Я нарадзіўся і вырас у гэтым сяле. У мяне адны штаны і па дзве пераэкзаменоўкі на кожную восень. Мая бабуся часты госць у нашай школе. Можна смела сказаць, што дзесяцігодку мы канчаем разам. Я думаю, што гэта — не першы і не апошні выпадак у гісторыі чалавецтва.

КАРЦІНА ПЕРШАЯ

Пакой Зурыко.
Зурыко ходзіць з кніжкай. Бабуся ўвіхаецца каля гаспадаркі.

Зурыко *(зубрыць па падручніку.)* «Подлежащее обычно выражается именем существительным или местоимением в именительном падеже. Например...»

Бабуся. Ну, вывучыў нарэшце?

Зурыко. Не, не вывучыў нарэшце. «Подлежащее обычно выражается именем...»

Бабуся. Усе дзеці як дзеці — раз прачытаюць і знаюць. А ён што? Ён проста вучыцца не хоча,— вось што. Ах, не хоча?! Ну і хай расце ёлупам, каб ён згарэў!

Зурыко. Ох-ме, бабуся... *(Лёг на тахту.)*

Бабуся. Што мне, штодня ў школу хадзіць, а? Ты выстаўляеш на пасмешышча старую жанчыну — сваю бабусю, перад усім светам ганьбіш.

Зурыко. «Подлежащее обычно выражается именем существительным».

Бабуся. Каменем ты вісіш на маёй шыі, каб табе ні разу ў жыцці не ўбачыць сонца!..

Зурыко. «...именем существительным или местоимением в именительном падеже...»

Бабуся. «В именительном падеже»? Я кажу, каменем ты вісіш у мяне на шыі «в винительном падеже...».

Зурыко. «Например...»

Бабуся. «Например», каб у цябе вочы павылазілі...

Зурыко. «Утро было прекрасным...»

Бабуся. Каб у тое «прекрасное утро» дзеці твае адзін другому хаўтуры спраўлялі...

Зурыко. «Солнце сияло...»

Бабуся. Каб гэта сонца пабачыла, як святы бог справядлівы цябе за валасы ў брацкую магілу валачэ, і каб табе на тым свеце так мучыцца...

Зурыко. Як ты са мной усё жыццё мучышся!

Бабуся. Во, во, во, во! Як я ўсё жыццё з табою пакутую. І каб усемагутны божа язык у цябе адабраў. *(Выходзячы.)* Паршывец, лайдак ты няшчасны, каб ты памёр на руках у сваёй бабусі. *(Выходзіць.)*

Зурыко. Між іншым, ва ўсёй Грузіі, а можа, і ў цэлым свеце не знайсці жанчыну, якая ўмела б праклінаць лепей за маю бабусю. Але я вам скажу па сакрэту: я ніколечкі не баюся яе праклёнаў. Дый сама яна аднойчы

прагаварылася: калі язык мой кляне цябе, сынок, сэрца — бласлаўляе.

Бабуся. Ну, што, вывучыў, нарэшце, няшчасны?

Зурыко. Не, не вывучыў яшчэ, нарэшце!

Бабуся. Няўжо так трудна навучыцца па-руску? Уся Расія па-руску гаворыць. А твой дзед. Усяго толькі сем гадоў у Сібіры на катарзе пражыў. Дык начальнік пошты Іван нашто ўжо рускі, але і ён так не гаварыў па-руску, як твой дзед.

Зурыко. Не можа такога быць! Ха-ха-ха...

Бабуся. Во-во, смейся, смейся. Цэлых дзве гадзіны запар твой дзед гаварыў з Іванам па-руску. Гаворыць, а сам рукамі махае, быццам на барабане грае. Цэлых дзве гадзіны слухаў Іван твайго дзеда, рот разявіўшы, а потым развёў рукамі і кажа: «Нічога не разумею... Такой,— кажа,— рускай мовы ніколі ў жыцці не чуў».

Зурыко. Не магу паверыць!

Бабуся. Ізноў смяешся? Каб табе ў жыцці шчасця не бачыць! І ў каго ты ўдаўся? Гора ты маё! Ну, скажы, хто з нашага роду быў невукам? Скажы, хто?

Зурыко *(ускіпеў)*. Што табе трэба ад мяне? Скажы мне, што?

Бабуся. Ах, што мне трэба? Ты не ведаеш?

Зурыко. Не! Не ведаю!

Бабуся. Смерць... твая мне трэба! Вось што. Не хочаш вучыцца, тупіца, хоць па гаспадарцы памагай. Ідзі зараз жа казу перавяжы ў другое месца, а то я табе нос расплюшчу ў ляпёшку.

Зурыко. Мне няма часу валаводзіцца з тваёй казой смярдзючай.

Бабуся. А малако, што ты п'еш ад гэтай казы,— таксама смярдзючае! Каб яно табе ў горле засела, акаянны! Ідзі!

Зурыко. Не пайду!

Бабуся. Ідзі, кажу,— а то горай будзе.

Зурыко. Заўтра ў школе ты за мяне ўрок раскажаш?

Бабуся. Калі так, не толькі заўтра, а цэлы тыдзень у школу хадзіць не будзеш.

Зурыко. Вэ! А чаму?

Бабуся. Сам ведаеш чаму. Ад твайго вучэння ўсё роўна толку няма, а кукуруза пустазеллем зарасла, палоць трэба.

Зурыко. Э-э-э! Яшчэ чаго не хапала!

Бабуся. Заўтра ў поле пойдзем. *(Паўза.)* Ану, раз-

дзявайся, лезь у пасцель. Зараз Іліко папрашу — хай доктара прывядзе. Без спраўкі не абыдзешся. Лажыся, кажу табе, каб табе ўсё жыццё ў дзіравай труне ляжаць! Чуеш ці не? Не дай бог на нагах цябе ўбачыць доктар. Каму я сказала, лажыся!

Бабуся выходзіць. Чуваць яе крык: «Іліко! Іліко!»

Зурыко *(адзін)*. Не так ужо я і рвуся ў школу, каб спрачацца з бабусяй. Пакаруся. *(Кладзецца на ложак, павязвае галаву ручнікам.)*

Голас Ларывона. Зурыкела! Зурыко!

Зурыко. Заходзь, заходзь, Ларывон. Можа, яшчэ застанеш мяне жывым.

Ларывон *(уваходзіць)*. Што з табой? Чаму ты абвязаў галаву, як Алі-Паша?

Зурыко. Доктара чакаю. Спраўка трэба.

Ларывон. Навошта табе спраўка, няшчасны?

Зурыко. Пустазелле заглушыла нашу кукурузу. Ратаваць трэба. Заўтра з бабусяй у поле пойдзем.

Ларывон. Школу нельга прапускаць. Я памагу бабусі пакапанічыць ваш участак. А будзеш паводзіць сябе як след — у наступны выхадны на паляванне вазьму. Я сёння за рэчкай быў. На калгасным полі ўсё соевае лісце пагрызлі зайцы. Сляды ёсць.

Зурыко. Ты і мінулы раз гаварыў. А след аказаўся не заячы, а казліны.

Ларывон. На гэты раз — заячы! Я памёт бачыў.

Зурыко. Добра. Толькі баюся, каб гэты заячы памёт не ператварыўся ў каровіну ляпёшку.

Ларывон. Сапляк ты! У цябе яшчэ малако на губах не абсохла, а ты вучыш мяне!.. Зурыкела, толькі глядзі, Іліко ні слова, а то ізноў якую-небудзь кавярзу падстроіць.

Зурыко. Што ты, Ларывон! *(Смяецца.)* Я ж памятаю, што мы той раз нарабілі...

Ларывон. Ну, ты...

Уваходзіць бабуся.

Бабуся. Лажыся, лажыся, Зурыкела! Ану, хутчэй! Іліко доктара прывёў.

Зурыко прыкінуўся паўмёртвым. Уваходзіць Іліко, за ім сельскі ўрач.

Іліко. Доктар ідзе!

У р а ч. Дзень добры! *(Садзіцца.)* Ну, што з табой, Зурыкела?

З у р ы к о. Паміраю, доктар!

У р а ч. Што ў цябе баліць?

Б а б у с я. Усё-ўсё ў яго баліць.

Л а р ы в о н. Нешта апошнім часам слабасць я ў яго заўважаю...

У р а ч. Што іменна заўважаеш?

Л а р ы в о н. Іменна? Апетыт ён страціў. Учора да мяне зайшоў і кавалачка ў рот не ўзяў, акрамя адной кукурузнай ляпёшкі і трох місак лобіо.

У р а ч. Што ты кажаш?

Л а р ы в о н. Клянуся табой! Раней, бывала, ён і галоўку сыру яшчэ з'ядаў, а тут упёрся: «не хачу, і не хачу!.. Дома, кажа, абедаў».

У р а ч. Зурыкела! Гэта ўсё праўда?

З у р ы к о. Так, доктар, як убачу ежу, мяне муціць пачынае.

У р а ч. І ты б зараз адмовіўся ад смажанай курачкі з часночнай падлівай, ці ад маладога падсмажанага сыру, ці ад халоднай парасяцінкі, ці ад стронгі ў арэхавым соусе? А яшчэ смачней — малады барашак на верцяле!..

Зурыко жаласліва стогне.

Б а б у с я. Жаласці ён, пракляты, к хлопцу не мае. Бедны, аж заходзіцца.

У р а ч. Дзе яшчэ ў яго баліць?

Л а р ы в о н. Чыхае ён.

У р а ч. Чыхае? Скажы, а!

З у р ы к о. А-а...

У р а ч. Якая ў яго мача?

Л а р ы в о н. Іліко, якая ў яго мача?

І л і к о. Нешта не падабаецца мне яго апошняя мача.

У р а ч. А раней якая была ў яго мача?

І л і к о. Самая раскошная.

У р а ч. На што яшчэ жаліцца?

І л і к о. У яго вось тут... не ўсё... *(Пастукаў пальцам у лоб.)* Толькі на гэта ўжо мы болей не жалімся.

У р а ч. Так! Падніміце хворага. Зурыкела, глядзі сюды. Уверх. Уніз. Так! *(Паказаў пяць пальцаў.)* Колькі тут?

З у р ы к о. Сем.

У р а ч. Правільна.

Б а б у с я. Вуй-ме...

У р а ч. Блізкіх сваякоў пазнаеш?

Л а р ы в о н. Не заўсёды.

У р а ч. Добра. Ідзі сюды, Ларывон. *(Паказаў на Ларывона.)* Хто гэты чалавек?

З у р ы к о. Бабуся.

Б а б у с я. Вай...

У р а ч. Так. *(Паказвае на Іліко.)* А гэта хто?

Зурыко круціць галавой.

І л і к о. Зурыко! Сынок! Мяне не пазнаеш? Я ж твой Іліко. Дзядзя Іліко! Не пазнае!

Зурыко круціць галавой.

Б а б у с я. Вай-ме... Вай-ме...

У р а ч. Усё ясна. Чым лячылі хворага?

Б а б у с я. Націрала чачай, сынок.

У р а ч. Прынясіце сюды гэтую самую чачу.

Бабуся прыносіць бутэльку.

Дайце мне, калі ласка, чайную шклянку. Ларывон, налівай! *(Прыгубіў шклянку.)* Становішча гэтага дзіцёнка вельмі сур'ёзнае. Магчыма, да раніцы не дажыве. Трэба неадкладна завезці яго ў бальніцу і тэрмінова зрабіць аперацыю.

З у р ы к о *(перастае стагнаць і прыпаднімаецца)*. Якую аперацыю, доктар?!

У р а ч. Трэпанацыю чэрапа.

З у р ы к о. Што? Што?

У р а ч. Будзем разразаць тваю чарапную каробку. Згодны?

Б а б у с я. Вуй-ме. Разразаць чарапную каробку! Гэта ж галава, а не гарбуз. Пакуль жывая — не дам! Уставай, сынок, ён, здаецца, сур'ёзна лічыць цябе хворым. *(Да ўрача.)* Нашто яму аперацыя, пакарай мяне бог! Дзіцёнак здаровы! *(Да Зурыко.)* Які ты хворы? Радасць мая, шчасце ты бабусіна!

У р а ч. Іліко! Ларывон! *(Смех.)* Ну дык дай бог здароўя. І хай мінуюць вас усе беды! Шчасця вам і радасці! Вам і вашаму дому! І каб у гэтым доме ніколі хворых не было! *(Перакуліў у рот шклянку чачы.)*

Заслона.

ІНТЭРМЕДЫЯ

Зурыко *(адзін.)* Здаралася ў нас з бабусяй, Іліко і Ларывонам і такое... Такое, пра што потым доўга яшчэ са смехам расказвалі адзін другому людзі... Без ніякай думкі аб будучым, весела і бесклапотна жыў я з роднымі мне бабусяй, Іліко і Ларывонам. І здавалася — дзяцінству майму канца не будзе. А ў нядзелю Ларывон, як і абяцаў, узяў мяне з сабой на паляванне. Разам з намі пабег мой лепшы друг Мурада. *(Свішча.)*

Заслона.

Мурада! *(Свішча.)* Мурада — сядзець! Чакай нас тут!

КАРЦІНА ДРУГАЯ

Узлесак.

Ларывон і сабака Мурада. Ларывон цэліцца. Сабака брэша.

Ларывон. Цішэй! *(Прыцэліўся. Сабака брэша.)* Гэты сабака сапсуе мне паляванне. *(Цэліцца. Сабака зноў брэша.)* Зурыко! *(Уваходзіць Зурыко.)* Скажы ты яму, каб ён памаўчаў!

Зурыко. Мурада, тш-ш!

Ларывон. Направа, Зурыко!

Зурыко. Ды там жа няма зайца.

Ларывон. Ціха ты, гарлапан! Не крычы! І не вучы мяне, як паляваць, сучкін ты сын! Ідзі за мной. Ды асцярожней ты са сваёй пушкай! А то ты яшчэ застрэліш мяне. Я тады табе вушы абарву. *(Мурада брэша.)* Гэты паршывы сабака нас за зайцоў прымае, ці што! Чаго ён скуголіць? Чаго ён хоча? Скажы яму, каб бег наперад!

Зурыко. Мурада, уперад! *(Мурада пазяхае.)*

Ларывон. Ён што, смяецца з нас?

Зурыко. Ён пазяхае. Стаміўся!

Ларывон. А-а, стаміўся! З сіл выбіўся. Можа, і нам адпачыць?

Зурыко. Даўно пара, дзядзя Ларывон.

Ларывон. Адпачнём. *(З мяшка дастаў дзве шклянкі, бутэльку, хлеб, цыбулю.)* Ну? Па першай... *(П'е.)* І-охме! *(Мурада брэша.)* Дзе ты адкапаў гэтага бяздомнага сабаку? Дварак без роду, без племені?

Зурыко. Што значыць — без роду, без племені? Ды я за яго дзве галоўкі сыру мельніку Сімонэ аддаў!

Л а р ы в о н. Купіў пан сучку, а гаўкаць сам будзе. *(Наліваае ў шклянку.)* Па другой! *(П'е.)* В-ах-ме!

З у р ы к о. Тваё здароўе, дзядзя Ларывон! *(П'е.)* Ауф! *(Паўза.)* Прама ў пячонку б'е.

Л а р ы в о н. Натое і чача! *(Брэх. Агляну ўся на Мураду.)* На, Мурада, на! Што гэта ў яго з губой!

З у р ы к о. Учора кукурузную ляпёшку з ачага сцягнуў... Пысай у гарачы прысак ткнуўся.

Л а р ы в о н. Эх, хапуга недапечаны! *(Брэх. Да Мурады.)* Запомні. Красці нехарашо. Чэсна зарабі сабе акраец хлеба, і ён будзе самы салодкі! *(Мурада брэша.)* Не згодзен! Ну, па трэцяй...

З у р ы к о. Будзь здароў, дзядзя Ларывон! Ты самы лепшы чалавек на свеце! Такога, як ты, няма! У цябе самы большы нос, але тваё добрае сэрца яшчэ большае.

Л а р ы в о н. А цяпер слухай, што я пра цябе думаю. Я павінен сказаць табе шчыра: такога чалавека, як ты, зямля яшчэ не раджала. *(Зурыко патупіўся.)* Гэта я табе кажу. Я старэй за цябе на сорак год, але сорак гадоў назад я ж быў такім, як ты?

З у р ы к о. Быў.

Л а р ы в о н. Значыць, сорак гадоў назад я быў тваім равеснікам?

З у р ы к о. Быў.

Л а р ы в о н. Значыць, праз сорак гадоў і ты будзеш маім равеснікам.

З у р ы к о. Буду!

Л а р ы в о н. Тады якая між намі розніца!

З у р ы к о. Ніякай.

Л а р ы в о н. Ты мне друг?

З у р ы к о. Друг.

Л а р ы в о н. На ўсё жыццё?

З у р ы к о. На ўсё жыццё!

Л а р ы в о н. Ты толькі скажы, хто цябе крыўдзіць? Хто? У школе цябе крыўдзяць? Дык я бензінам абалью школу і падпалю яе. Хай гарыць!

З у р ы к о. Хай гарыць! Толькі ніхто мяне не крыўдзіць.

Л а р ы в о н. Ну, тады за наша з табой здароўе, Зурыко!

З у р ы к о. За наша з табой, Ларывон!

Спяваюць.

Калі знаёмы к табе зайшоў,
Цалікауры пастаў на стол.
Калі ты, выпіўшы, нос апусціў,
Ты не мужчына, ты не грузін.

Цалікауры кіпіць у крыві,
Будзем гуляць мы да зары!

Л а р ы в о н. Вып'ем!

З у р ы к о. Вып'ем! *(П'юць.)*

Л а р ы в о н. Ну, а цяпер і падыміць можна...

З у р ы к о. Вазьмі ў мяне папяросы, тытунь стамбульскі.

Л а р ы в о н. Адкуль у цябе папяросы, паршывец?

З у р ы к о. Адзін чалавек падарыў. Спецыяльна для мяне набіваў і прасіў абавязкова і цябе пачаставаць.

Л а р ы в о н. Стамбульскі?

З у р ы к о. Стамбульскі.

Л а р ы в о н. Пакаштуем, паспытаем. Хораша пахне.

З у р ы к о. Стамбульскі.

Абодва закурваюць і, захліпнуўшыся, валяцца на траву. Чхаюць. Сабака брэша. Нарэшце ачухаліся.

Л а р ы в о н. Стамбульскі... Здохнуць можна ад такіх папярос!..

З у р ы к о. Што ў гэтым праклятым тытуні, Ларывон?

Л а р ы в о н. Перац падмешаны! Перац, во што!

Абодва выпілі. Ларывон чхае.

Л а р ы в о н. Паслухай, які прахадзімец, які нягоднік, які мярзотнік падсунуў табе гэтыя папяросы і яшчэ прасіў мяне пачаставаць?

З у р ы к о. Іліко Чыгагідзе...

Л а р ы в о н. Іліко? Дай бог убачыць мне Іліко Чыгагідзе, калі ён насмокчацца гэтага стамбульскага тытуню, і каб паблізу ніводнай жывой душы, апроч мяне, не аказалася.

З у р ы к о. Нічога, дзядзя Ларывон, Іліко мы яшчэ сустрэнем на вузкай дарозе!

Л а р ы в о н. Сустрэнем! Абавязкова! Немінуча сустрэнем!

Мурада залівіста брэша.

Л а р ы в о н. Што? Што там такое, Зурыкела? Заяц?!

З у р ы к о. Дзе? Заяц?

Л а р ы в о н. Не бачыш? Ну-тка, Зурыкела, заходзь зверху, а я — знізу. Мурада, ззаду! Акружай яго! Акружай! *(Выбягае.)*

З у р ы к о. Мурада! За мной!

Зурыко схапіў сабаку і панёс яго. Чуваць галасы.

Г о л а с Л а р ы в о н а. О-го-го-го...

Г о л а с З у р ы к о. Э-ге-ге-ге... Ларывон, не выпусці!

Здвоены стрэл. Віск сабакі. Паўза. Крык Зурыко: «Мурада! Вай-ме! Мурада-а-да!» Уваходзяць панурыя Л а р ы в о н і З у р ы к о.

Л а р ы в о н. Хай будзе яму зямля пухам.

З у р ы к о. Хай будзе...

Л а р ы в о н. Чаму рука мая не адсохла, вочы не асляплі.

З у р ы к о. Што ты, Ларывон. Ты не вінаваты. Ты ж ведаеш сваю стрэльбу. Стралянеш у казла, а пападаеш у асла... Добра яшчэ — у мяне не пацэліў. *(Паўза.)* Вай-ме! Мурада!.. Вай-ме... *(Плача.)*

Л а р ы в о н. Зурыко, хлопчык, не плач, вазьмі сябе ў рукі! Сёння з нашых радоў выбыў наш любімы друг і таварыш Мурада. Светлая памяць аб ім вечна будзе жыць у нашых сэрцах... Вечная памяць нябожчыку, дарагі мой Зурыко! *(П'е.)*

З у р ы к о. Дзякуй, дзядзя Ларывон! Вечная памяць майму Мурадзе.

Паўза.

Л а р ы в о н. Слухай, Зурыко, а ты нікому не раскажаш? На ўсё сяло ганьба будзе, сораму не абярэшся.

З у р ы к о. Што ты, Ларывон? За каго ты мяне лічыш?

Паўза. Здалёк чуваць скавытанне, брэх і выццё сабак.

Л а р ы в о н. Глядзі, Зурыкела. Аплакваць прыйшлі. Усе родзічы збегліся, ды, відаць, падысці саромеюцца.

З у р ы к о *(прыглядаецца)*. Так, гэта мельніка Сімонэ сабака, матка майго Мурады.

Л а р ы в о н *(узрушаны.)* Звар'яцець можна!

З у р ы к о. А ты што думаў? Маці!

Л а р ы в о н. Другі бакал за здароўе блізкіх нябожчыка. Хай гэтай трагічнай стратай і закончацца іх беды і няшчасці. *(П'е.)*

З у р ы к о. Дзякую, Ларывон.

Г о л а с Р а м у л а. Дзядзя Ларывон! Дзядзя Ларывон!

Р а м у л *(прыбягае)*. Дзядзя Ларывон!

Л а р ы в о н. Я тут, сынок. Што здарылася?

Р а м у л. Табе тэлеграма. Табе і Зурыко.

Л а р ы в о н. Тэлеграма? *(Чытае.)* «Малапка. Прахвосту Зурыкела і Ларывону насатаму. Спачуваю вашаму гору з прычыны злачынскага забойства дарагога Мурады. Ра-

зам з вамі горка плачу па нябожчыку. Калі яшчэ раз пойдзеце паляваць на сабак, прашу захапіць і мяне з сабой. Моцна цалую вашы цвёрдыя лбы. Астаюся ў жалобе — ваш друг». Без подпісу.

З у р ы к о. Але почырк яго?

Л а р ы в о н. Хадзі сюды, сынок. Бліжэй, бліжэй, не бойся. *(Схапіў Рамула за вуха.)* Хто табе гэта даў?

Р а м у л. Ён мяне заб'е, калі скажу.

Л а р ы в о н. А калі не скажаш, я цябе заб'ю. Не ўсё роўна? Ну, гавары!

Р а м у л. Ён мне дваццаць капеек даў, каб маўчаў. Як жа я магу сказаць? А-а! Іліко Чыгагідзе!

Л а р ы в о н. Дык, значыць, Іліко? *(Ларывон адпускае Рамула. Той уцякае.)* Божа ўсявышні, хіба справядліва, што Іліко называецца чалавекам, а наш няшчасны Мурада — сабакам? Ну, пачакай, Іліко Чыгагідзе! Не буду я Ларывонам Шавернадзе, калі не адпомшчу табе.

ІНТЭРМЕДЫЯ

З у р ы к о *(адзін)*. Пасля такога палявання на зайца і тэлеграмы Іліко нам з Ларывонам сорамна было паказацца на вуліцу. Увесь калгас упокат ляжаў ад смеху. З таго дня мы з Ларывонам марылі толькі аб адным: як адпомсціць аднавокаму Іліко. Але не было яшчэ чалавека, які б здолеў аб'ягорыць Іліко. Недарма агульны сход і выбраў яго аднагалосна калгасным сторажам. Ён ужо даўно асляп на адно вока. Але вельмі добра бачыў усё другім, здаровым, вокам. У яго быў здаровы погляд на жыццё.

Заслона.

КАРЦІНА ТРЭЦЯЯ

Двор Зурыко.
З у р ы к о сеў на лавачку. Заходзіць І л і к о.

І л і к о. О-о, здароў, дарагі Зурыко!

З у р ы к о. Здароў, дзядзя Іліко!

І л і к о. Зурыкела...

З у р ы к о. Што?

І л і к о. Прашу цябе, схадзі к Ларывону.

З у р ы к о. Чаго?

І л і к о. Ты ж ведаеш, ні ў кога на сяле няма такога

віна, як у нашага дарагога Ларывона. Папрасі ў яго літраў трыццаць, каб ён мне прадаў ці пазычыў.

Зурыко. Папрасі ў бабусі.

Ілiко. На чорта мне яе воцат. Я ж не збіраюся гуркі марынаваць. Ад пляменніка майго з горада пісьмо прыйшло. Хлопец піша: здаю экзамены, тэрмінова прышлі віно.

Зурыко. А навошта яму віно на экзаменах?

Ілiко. Гэтага табе не зразумець, пакуль сам не станеш студэнтам. Прашу цябе, схадзі к Ларывону.

Зурыко. Каму трэба віно? Табе? Табе! Дык ты сам і ідзі!

Ілiко. Вах, Зурыкела! Пачакай... Я перад табой вінаваты... Але не трэба мяне караць, дапамажы мне. Схадзі паnрасі! А то ён пасля той тэлеграмы і знаць мяне не хоча!

Зурыко. Сам папрасі!

Ілiко. Табе ён не адмовіць, ён цябе, ведаеш, як паважае! А калі не дасць...

Зурыко. Што — «калі не дасць».

Ілiко. Тады распытай у яго, дзе закапаны самы вялікі чан цалікауры, і зрабі якую-небудзь мецiну. Я яму такі фокус падстрою, што ўсё сяло лопне ад смеху.

Зурыко. Які фокус? Што за фокус?

Ілiко. Магіла?

Зурыко. Магіла!

Ілiко. Пасля паўночы цалікауры з Ларывонавага чана ф'юць... і... апынецца ў горадзе Тбілісі на вуліцы байкапісца Крылова, дом 4 у вялікіх аптэкарскіх бутлях, што стаяць у ваннай прафесара, які вучыць майго пляменніка...

Зурыко. Ты што? Пры сваім розуме?

Ілiко. Тш-ш... Павер, Зурыкела, мне гэта віно во як *(правёў рукой па шыі)* трэба. Хлопцу дапамагчы. Свае дзеці будуць — зразумееш. Што хочаш прасі — нічога не пашкадую.

Зурыко *(падумаўшы)*. Нічога не пашкадуеш? Аддасі чучала савы, што вісіць над тахтой, і пяць пачак табакі.

Ілiко. Чучала — добра. А навошта табе столькі табакі? Ты сабе лёгкія папсуеш. Глядзі, як у мяне ўжо свіцяцца. Гэта ад курэння. Давай так — чучала без табакі і пораху на пяць зарадаў. Дамовіліся?

Зурыко. Чучала і пораху з гільзамі на дзесяць зарадаў.

Ілiко. На шэсць!

Зурыко. Дзесяць!

І л і к о. Ну, добра, на восем.

З у р ы к о. Дзесяць!

І л і к о. І нашто табе столькі?

З у р ы к о. Хіба гэта многа?

І л і к о. Вельмі многа. Падумай — пораху на дзесяць зарадаў і яшчэ гільзы патрабуеш. А чучала? Такога чучала нават у Тбілісі ў самым галоўным музеі няма!

З у р ы к о. Не хочаш, тады мне нічога не трэба. Пайду і ўсё раскажу Ларывону.

І л і к о. Ну, добра! Згодзен. Як толькі я атрымаю віно, ты атрымаеш чучала, порах з гільзамі на дзевяць зарадаў, як дамовіліся. Ідзі к Ларывону. Толькі запомні, хто здрадзіць Іліко Чыгагідве — той здрадзіць Радзіме!

І л і к о пайшоў. Праз нейкі момант заходзіць Л а р ы в о н.

Л а р ы в о н *(падазрона)*. Што тут рабіў гэты аднавокі чорт?

З у р ы к о. Нічога! Яму пісьмо пляменнік прыслаў.

Л а р ы в о н. І што піша гэты вырадак свайму дзядзьку?

З у р ы к о. Экзамены будзе здаваць...

Л а р ы в о н. Столькі гадоў вучыцца — ніяк экзаменаў здаць не можа.

З у р ы к о. Прышлі, піша, віна. Дзядзя Іліко просіць у цябе літраў трыццаць.

Л а р ы в о н. Віна яму?

З у р ы к о. Ага.

Л а р ы в о н. Трыццаць літраў?

З у р ы к о. Так.

Л а р ы в о н. Атруты яму не трэба?

З у р ы к о. Атруты ён не прасіў.

Л а р ы в о н. Ну, а майго віна яму і не нюхаць. І канец!

З у р ы к о. Яму для хлопчыка, для дзіцяці... каб паднесці экзаменатарам.

Л а р ы в о н. Цікава, на чыё імя тады дыплом выпішуць? На маё ці на яго неданоска?

З у р ы к о. Не ведаю.

Л а р ы в о н. Не ведаеш? Схадзі спытай, а потым ужо прыйдзеш да мяне! Усё! І канец размове! *(Паўза.)*

З у р ы к о. Шкада яго...

Л а р ы в о н. А нас ён пашкадаваў, калі мы ледзь не падушыліся яго стамбульскай табакай з перцам? Калі ён сваю тэлеграму пасылаў, пашкадаваў?

З у р ы к о. Што праўда, то праўда.

Л а р ы в о н. Ну, дык і не прасі! І слухаць не хачу! *(Паўза. Зурыко смяецца.)* Што яшчэ?

З у р ы к о. А ведаеш, што ён сказаў?.. Ён сказаў, калі Ларывон не дасць, каб я тычку паставіў... на тым месцы, дзе ты закапаў самы вялікі чан цалікауры. А сёння, пасля паўночы, з гэтага чана віно... ф'юць...

Л а р ы в о н. Значыць... ф'юць...

З у р ы к о. Ага.

Л а р ы в о н. Сёння, пасля паўночы?

З у р ы к о. Ага! Такі, кажа, яму фокус падстрою, што ўсё сяло ад смеху лопне!

Л а р ы в о н. Віно свісне, а ўсё сяло з мяне смяяцца будзе? Зурыкела! Ты мне друг, і ты мне паможаш! Я табе скажу, што трэба зрабіць! *(Шэпча нешта на вуха Зурыко.)* О!!! Ну, трымайся, Іліко аднавокі!

Заслона.

КАРЦІНА ЧАЦВЕРТАЯ

Двор Ларывона.

З у р ы к о. Апоўначы Іліко і я падкраліся на двор Ларывона, да яго чанаў з віном.

За плятнём паказаліся З у р ы к о і І л і к о, яны лезуць цераз пляцень, Зурыко з шумам падае.

І л і к о. Тш-ш! Каб ты больш не вырас! *(Пералезлі.)* Не! Ён мяне ў магілу загоніць!

З у р ы к о. А чан з цалікауры — вось тут. Самы вялікі. Куды глядзіш? Бачыш — тычка стаіць...

І л і к о. Ну, пачнём! На штурм!.. Адкрывай, Зурыкела!

Іліко і Зурыко адкопваюць чан. Брэх сабак.

І л і к о. Здымай накрыўку! *(Паўза.)* Ды ён жа пусты!

З у р ы к о. Тш-ш-ш! Што ты? Там яшчэ многа! Ты нагніся ды заглянь туды...

І л і к о. Пуста.

З у р ы к о. Ніжэй, ніжэй спусціся!

Іліко лезе ў чан. Зурыко трымае яго за ногі. З-за хаты выходзіць Л а р ы в о н са стрэльбай, ставіць каля дома збан.

Л а р ы в о н. Стой! Хто там? Стой, я сказаў! Застрэлю на месцы! Стой! Хто такія? *(Стрэл.)*

З у р ы к о. Ратуйся! Бяжым!

Адпускае ногі Іліко, і той падае ў чан.

Л а р ы в о н. Стой! А то зараз жа прыкончу абодвух!

З у р ы к о. Гэта я, дзядзя Ларывон... Я! Не страляй!

Л а р ы в о н. А дзе другі? Гавары, шэльма!

З у р ы к о. Не ведаю.

Л а р ы в о н. Гавары, страляць буду! *(Стрэл.)*

З у р ы к о. Не ведаю, дзядзя Ларывон...

Л а р ы в о н. Як гэта не ведаеш, калі вы разам былі? Зараз жа закрый чан!

З у р ы к о. Але, дзядзя Ларывон...

Л а р ы в о н. Зараз жа закрый! Ты адкрываў, ты і закрывай! А не, развітайся з жыццём! *(Апляўуха.)*

З у р ы к о. Добра, добра, я зараз, дзядзя Ларывон!

Паклаў накрыўку і пачынае засыпаць чан зямлёю.

І л і к о *(з чана)*. О, божа літасцівы, пакарай усіх круцялёў і ашуканцаў! Перуном і маланкай разбі галовы Ларывону Шаварнадзе і Зурыко Вашаламідзе за тое, што так абдурылі мяне!

Ларывон апускае дула стрэльбы ў чан.

Л а р ы в о н. Хто там? Прызнавайся! А то мазгаўню размалачу!

І л і к о. Гэта я, Іліко! Іліко — аднавокі! Забяры стрэльбу! Не дай бог заб'еш. Не бяры грэх на душу.

Л а р ы в о н. Не, ты не Іліко — падонак ты! Ты што там згубіў на дне майго чана? А? *(Закрывае чан.)*

І л і к о *(скідае накрыўку)*. Жыўцом пахаваць хочаш, Ларывон! Ты што робіш?!

Л а р ы в о н. Зурыкела, ідзі-тка пакліч сюды ўсё сяло. Няхай усе паглядзяць, які тут у мяне аднавокі барсук сядзіць.

І л і к о. Зурыкела, пачакай! Вах! Ларывон Шаварнадзе! Не рабі з мяне пасмешышча на ўсё сяло! Ну, хопіць! Пажартавалі! *(Спрабуе вылезці з чана.)* Падсоб вылезці!

Л а р ы в о н. Не! Куды?! Лезь назад!

І л і к о. Прадаў ты мяне, Зурыкела! Як паршывую авечку прадаў, а?

З у р ы к о. А калі ты мне стамбульскую табаку з перцам падсунуў, на паляванне тэлеграму пасылаў, нам прыемна было? Цяпер сядзі і задыхайся там.

І л і к о *(спявае.)* Тэлеграма... Тэлеграма... *(Закрылі накрыўку.)*

Л а р ы в о н. Што ён, звар'яцеў?

І л і к о. Выпусці мяне, Ларывон!

Л а р ы в о н. Жывым не выпушчу, я сказаў!

І л і к о *(жаласліва.)* Зурыкела, выручай.

З у р ы к е л а. Ларывон, выпусцім яго, шкада.

Л а р ы в о н. Няхай капітуліруе! Хай палец сагне!

З у р ы к о. Здавайся! Вах! Палец сагні!

І л і к о. Здаюся, здаюся... Вось і палец сагнуў!

Л а р ы в о н. Не! Хай крыкне: «Аслiная я галава!»

З у р ы к о. Тры разы крыкні: «Аслiная я галава!» Згодзен?

І л і к о *(ціха)*. Аслiная я галава.

З у р ы к о. Мацней!

І л і к о. Аслiная я галава!..

Л а р ы в о н. Тры разы!..

І л і к о. Ух-хе-хе! Аслiная я галава! Аслiная я галава! Аслiная я галава! Аслiная я галава!..

Л а р ы в о н. Даволі! Ну, так і быць! Вылазь! Падсоб яму, Зурыко!

Выцягваюць Іліко з чана. Ён увесь запэцканы ў пыл і цвіль.

І л і к о. Аслiная я галава!

Л а р ы в о н. Што, аднавокі чорт, не ўдалося табе абдурыць мяне?

І л і к о. Ох-ох-ох-ме...

Л а р ы в о н. Э-э-э! Чакай, чакай, куды ты? А падзяка твая дзе?

І л і к о. А-а, ну, дзякуй! Вялікае вам дзякуй! Век не забуду!

Л а р ы в о н. На чорта нам твой «дзякуй»? Зурыкела! Падай збанок! Вып'ем! *(Зурыко ўзяў збан, што стаяў каля плятня.)*

І л і к о. Адчапіся ад мяне!

Л а р ы в о н. Не злуйся, мой дарагі Іліко!

Ларывон і Зурыко смяюцца.

І л і к о. Ну што? Ну што тут смешнага?

З у р ы к о. Аслiная я галава! *(Смех.)*

Спяваюць.

Калі знаёмы к табе зайшоў,
Цалікауры пастаў на стол.
Калі ты, выпіўшы, нос апусціў,
Ты не мужчына, ты не грузін.
Цалікауры кіпіць у крыві, } *2 разы*
Будзем гуляць мы да зары. }

Іліко выпіў.

Ну-тка, мой дружа, віна палей,
Ну-тка, заздраўную весялей!
Калі ты, выпіўшы, нос апусціў,
Ты не мужчына, ты не грузін.
Цалікауры кіпіць у крыві,
Будзем гуляць мы, віно піць
да зары. } *2 разы*

Прытанцоўваючы, выходзяць.

Заслона.

ІНТЭРМЕДЫЯ

Зурыко *(адзін)*. У доме Ларывона да трэціх пеўняў звінелі заздраўныя тосты, застольныя песні і звонкія пацалункі. І ўжо калі нагрузіліся па самыя ноздры, мы выкаціліся на вуліцу разам з сонейкам. Сын Ларывона — Кукура і я вялі дзядзю Іліко, перастаўляючы яму ногі рукамі. Хісталіся цераз усю вуліцу ад правага плота да левага. Мы ішлі не з пустымі рукамі. Мы неслі дань служыцелю навукі — цэлы бурдзюк віна для прафесара, які жыве ў горадзе Тбілісі на вуліцы байкапісца Крылова, дом 4...

Гучыць звон.

Аднойчы раніцай маё сяло пакінулі мір, спакой і шчасце... Хаўтурны звон унёс з сабой смех і радасць. У сэрцы нешта абарвалася: сум і жалоба ахінулі маё роднае сяло. І дні сталі падобныя адзін на другога, як кукурузныя ляпёшкі бабусі. Калгас наш апусцеў. Пайшоў на фронт і сын нашага Ларывона — Кукура. І толькі мы — дзеці, жанчыны і старыя — асталіся чакаць. Ох, як марудна цягнуўся час! Доўга ж мы чакалі... Гэта быў 1941 год.

КАРЦІНА ПЯТАЯ

Пакой Зурыко.
На сцэне бабуся і Зурыко. Заходзяць Іліко і Ларывон з лыжамі.

Ларывон. Шчасце дому вашаму! Зурыкела, хадзі сюды. На, вазьмі!

Зурыко. Лыжы? Уй-ме, лыжы, дзядзя Ларывон!

Л а р ы в о н. А ты што, заўтра не думаеш у школу ісці? За ноч па вушы снегу намяце.

З у р ы к о. Лыжы, сапраўдныя лыжы, Іліко!

І л і к о. Ён цэлы дзень майстраваў іх.

З у р ы к о. Дзякуй табе, дзядзя Ларывон! Дзякуй!

Л а р ы в о н. Ну, добра, добра... насі на здароўе.

Старыя прыселі каля ачага. Зурыко ў кутку заняўся лыжамі. Бабуся прыносіць гарэлку і садавіну.

Л а р ы в о н. Нашто ты, Вольга? Не трэба. Лішняе гэта.

Б а б у с я. Бог ты мой, лішняе — дык я занясу назад.

І л і к о. Што ты, што ты? Ён жартуе. Пастаў, Вольга!

Л а р ы в о н *(наіўна)*. Хіба ты п'еш чачу?

І л і к о. У такі холад не тое што чачу — тэрмометр можна праглынуць, абы толькі градусы былі...

Л а р ы в о н. Суровая сёлета зіма. У Грузіі даўно такой не было. Будзем здаровы!

П'юць. Паўза. Сядзяць задуменныя.
«Бабуся Вольга!» — чуваць са двара, і ў пакой заходзіць сельскі агітатар Г е о р г В а ш а к і д з е.

Б а б у с я. О!.. О!..

Г е о р г. Камарджоба! Маё шанаванне, бабуся.

І л і к о. Здароў, агітатар!

Б а б у с я. Сядай да цяпла, сынок! Скідай шынель.

Г е о р г. Ды не, я ненадоўга.

Л а р ы в о н. Скідай, скідай.

Георг распрануўся, падыходзіць к цяплу.

Б а б у с я. Выпі з холаду.

Г е о р г. Мір і шчасце гэтаму дому! Маё шанаванне, бабуся. Будзь здароў, Іліко. Тваё здароўе, Ларывон! Расці, Зурыкела! *(П'е.)* А-у-х-э! Проста агонь!

Л а р ы в о н. Ну што новага? Як там на фронце?

Г е о р г. Наступленне праціўніка затрымалі! Гітлераўскі план бліцкрыгу праваліўся!..

Л а р ы в о н. Э-э-э! Гэта мы яшчэ месяц назад у газетах чыталі. Ты што-небудзь новае скажы!

Г е о р г. Я па важнай справе да вас зайшоў. Слухайце мяне ўважліва.

Л а р ы в о н. Ну, ну, слухаем.

Г е о р г. Таварышы! Наша сацыялістычная Радзіма ў небяспецы. Вераломны вораг сваімі крывавымі лапамі ўчапіўся ў нашу свяшчэнную зямлю! Наша гераічная Чырвоная Армія атакуе брудную фашысцкую зграю!

І л і к о. Пачакай, пачакай! Ну чаму ты з намі гаворыш, як быццам газету чытаеш, няшчасны? Ты ж камуніст, партбілет маеш. Скажы проста — які ў цябе клопат.

Л а р ы в о н. Ну, канечне.

Г е о р г. Ды... разумееце... мы падарункі сабіраем для нашых байцоў. Можа, і вы паможаце, а?

Б а б у с я. Так бы адразу і сказаў, сынок.

Л а р ы в о н. Пачакай, Вольга. А скажы, Георг, якія трэба падарункі?

Г е о р г. Розныя... Садавіна, рукавіцы цёплыя і іншыя рэчы. Сёння ў нас чацвер? Дык вось, у панядзелак цэлы вагон падарункаў ад нашай вёскі пойдзе прама на фронт. Калі што надумаеце, прынясіце сюды. А нашы хлопцы зойдуць да бабусі і забяруць. Ну, бывайце здаровы. *(Георг пайшоў. Паўза.)*

І л і к о. Агітатары агіціруюць. Ну якое ў мяне дабро? Ніякага. Хіба што бурка? Яна там за дзвярыма вісіць. Зурыкела, ну-ка прынясі яе сюды! Што ты на мяне вочы вылупіў? Я сказаў — прынясі! Свет не перавернецца, калі такі стары хрыч, як я, будзе хадзіць без буркі. Я магу і так перазімаваць, ды і вясна ўжо блізка. Я сказаў...

Зурыко выходзіць і прыносіць новую бурку.

І л і к о. Прыйдуць, аддай ім, Вольга.

Л а р ы в о н. Ох-ох-ох! Іліко Чыгагідзе добрай душы чалавек. Бурку падарыў. *(Выходзіць.)*

З у р ы к о. Знаю, куды пайшоў.

Б а б у с я. Куды?

З у р ы к о. Дамоў. У яго новыя боты, для Кукуры купіў. Ён зараз іх прынясе. Вось убачыце — прынясе.

І л і к о. Сёння да мяне паштальён зайшоў. Пахаронную прынёс. Забілі Кукуру. Адзінага сына Ларывона.

Б а б у с я. Што ты мелеш? Вай-ме, як у цябе язык павярнуўся.

І л і к о *(дастаў з кішэні паведамленне і палажыў на тумбачку.)* Хітры паштальён. Не магу, кажа, несці такое паведамленне Ларывону, аддай ты.

Б а б у с я. Вай, Кукура, сыночак! Якое няшчасце! Такі малады! Хай бы ўсе твае беды ды на маю сівую галаву...

І л і к о. Пад Керчу загінуў.

Б а б у с я. О-о-ох! Што будзе з Ларывонам! Што будзе з Ларывонам!

І л і к о. Гэта ўжо сёмы з нашага сяла. Сёмы!

Б а б у с я. О, божа літасціва, за якія грахі ты караеш яго!

І л і к о. А Ларывон чакае. Дні лічыць, калі сын вернецца. А цяпер ніякай надзеі. Дазнаецца: кончыўся яго род.

Б а б у с я. О, божа, божа, пакарай гэтага Гітлера! Пакарай гэтага паскуднага чорнага забойцу! Знішчы ўвесь, увесь род яго да сёмага калена! Нашлі на згубіцеля нашага смерць лютую, каб не засталося пасля яго ні дзяцей, ні ўнукаў, каб вецер развеяў прах семя яго!.. Колькі ж я кляну яго — і як толькі ў ім душа трымаецца! Ой, сыночак, Кукура, сыночак... *(Плача.)*

І л і к о. А што, калі там памыліліся, а ён жывы? І так бывае... А калі не: усё роўна хай бацька чакае сына. Чалавек надзеяй жыве. *(Спаліў паведамленне.)* Глядзі, Зурыкела, не прагаварыся.

Заходзіць Л а р ы в о н, ставіць побач з буркай Іліко новыя боты.

Л а р ы в о н. Не, Іліко аднавокі... Ганьба таму богу, які зрабіў цябе аднавокім! Бурку аддаў! А? Я знаў, што ў цябе добрае сэрца, але я не ведаў, што ў гэтых маленькіх чахлых грудзях... проста чыстае золата! Падымайся, стары! Не тут жа начаваць будзем! *(Заспяваў.)*

Калі знаёмы к табе зайшоў,
Цалікауры пастаў на стол.

С т а р ы я выходзяць.

Б а б у с я. Лажыся, Зурыко, сынок. Заўтра рана ўставаць.

Бабуся корпаецца з пражай.

З у р ы к о *(адзін.)* Доўга, доўга не спала бабуся ў гэтую халодную зімовую ноч... Яна вязала рукавіцы для далёкага незнаёмага ёй салдата, што ваяваў зараз на заснежаных палях Расіі.


ІНТЭРМЕДЫЯ

Тую ноч не спаў Іліко. Тую ноч не спаў і я. У самае сэрца ўдарыла нас вестка аб смерці Кукуры. І толькі Ларывон, наш дарагі вясёлы Ларывон, спаў мірным спакойным сном. Ён не ведаў аб смерці сына. Так, праўду сказаў Іліко,— чалавек жыве надзеяй...

Андрэй Макаёнак у час паездкі па Іспаніі.
1974 год.



У глядзельнай зале.
1978 год.



КАРЦІНА ШОСТАЯ

Школа.

Ідзе ўрок. Вучні пішуць пісьмовую кантрольную работу. Настаўніца ходзіць паміж партамі і дыктуе, заглядаючы ў сшытак.

Настаўніца *(дыктуе)*. ...И где еще в жизни... запятая... увидишь ты красоту такую?.. Знак вопроса. Гогичашвили!.. красоту такую... Вопрос! Гогичашвили!.. Нигде! Знак восклицания!.. Нигде! Восклицание... Небо темнеет по краям... Точка с запятой... Абдаладзе! Абдаладзе!

Абдаладзе. Прашу прабачэння.

Настаўніца. Пиши, пиши, Абдаладзе. *(Паўтарае.)* Небо темнеет по краям — точка с запятой... Дальше... Зноем пышет неподвижный, напоенный ароматом лесов воздух... Точка. Ромул Каланадзе, почему не пишешь?

Рамул. Халодна, Заблона Сілібістраўна!

Настаўніца. Пиши.

Рамул *(бурчыць)*.

Настаўніца. Ромул Каланадзе!

Рамул. Пішу, пішу.

Зурыко. Рамул, генацвале! Чаму так доўга няма званка? Можа, сторож заснуў?

Рамул. Чорт яго ведае. Ніякага ратунку не відаць.

Настаўніца. Зураб Вашаломидзе! Встань!

Зурыко. Стаю.

Настаўніца. Т-и-ш-е! Сядь! Ромул Каланадзе! Встань — повтори последние слова...

Рамул *(няўпэўнена)*. Зноем пишет неподвижный...

Настаўніца. Я сказала — «пышет»! Зноем пышет. Как пишется «пышет»? Каланадзе? *(Маўчанне.)* Я говорю, как пишется «пышет»?

Рамул. Пи-шет.

Настаўніца. Пышет пишется — пышет!

Рамул *(узрадавана)*. I я кажу — «пи-шет»!

Настаўніца. «Пышет» пишется через «ы». Садись. Двойка, Каланадзе.

Рамул. Чаму двойка, Заблона Сілібістраўна?

Настаўніца. Мозги набекрень потому что... Понял? *(Рамул паціснуў плячыма.)* Не понял? Садись. Единица. Теперь понял?

Рамул. Зразумеў.

Настаўніца. Не зря вас на парту отстающих поса-

дили. Диктую дальше! Дальше — «неподвижный, напоенный ароматом лесов воздух»...

Званок. Настаўніца ляскае лінейкай па стале.

На стол! Раз, два! Тетради на стол, сказала!

Вучні здаюць сшыткі і выходзяць з класа. Настаўніца, сабраўшы сшыткі, таксама выходзіць. У класе толькі Зурыко і Мэры. Зурыко бянтэжыцца, падыходзіць да Мэры, ніяк не адважыцца сказаць.

Зурыко. Мэры, ведаеш што...
Мэры. Што, Зурыко?
Зурыко. Мэры... я хацеў сказаць...
Мэры. Ну скажы...

З-за парты выглядвае Рамул, смяецца. Мэры выбягае з класа.

Рамул. Не перашкодзіў?
Зурыко. Каму?
Рамул. Табе. Думаеш, я не бачу, што ты закахаўся?
Зурыко. У каго?
Рамул. У Заблону Сілібістраўну.
Зурыко. Сціхні! Каб табе ўсё жыццё ў дзіравай трубе ляжаць, каб ты памёр на руках у сваёй бабусі!
Рамул. У мяне няма бабусі.
Зурыко. Каб твае дзеці не спраўляліся адзін другога на магілкі вазіць!
Рамул. У мяне няма дзяцей!
Зурыко. Сціхні! Я табе вушы адкручу, язык з коранем вырву!

Ганяюцца адзін за другім.

Рамул. Увесь клас пра гэта ведае.
Зурыко. А вам што?
Рамул. А чаго ты злуешся? Хочаш, я ёй скажу, што ты ў яе закахаўся?
Зурыко. Пайшоў ты к чорту! Трэба будзе — сам скажу.
Рамул. Э-э! Прызнацца ў каханні — гэта табе не ўрок адказаць. Тут без пісьма не абыдзешся.
Зурыко. Якога пісьма?
Рамул. Закаханы павінен напісаць дзяўчыне пісьмо. Што, што, а гэта ўжо я знаю!
Зурыко. А ты што, пісаў ужо?
Рамул. Ох-э! Яшчэ колькі!
Зурыко. І што? Памагло?

Р а м у л. Ох-о! Што ты пытаеш?

З у р ы к о. Слухай, Рамул, навошта мне таіць ад цябе, ты мне брат. Я люблю яе і не ведаю, што рабіць. Выручы мяне!

Р а м у л. Ага, значыць, любіш... Тады — бяруся! Сядай, пішы!

Зурыко дастае паперу.

З у р ы к о. Чакай, чакай...

Р а м у л. Ну, давай хутчэй, а то перапынак кончыцца. *(Дыктуе.)* Дарагая мая, найсаладзейшая ўцеха душы мае! З таго часу, як я ўбачыў цябе першы раз, я прыняў як абсалютную ісціну існаванне нябеснага хараства, я спазнаў апагей душэўных пакут і апафеоз эстэтычнай асалоды...

З у р ы к о. Рамул, адкуль ты словы такія ведаеш?

Р а м у л. Сястры з Тбілісі прыходзілі пісьмы. Адзін студэнт пісаў. А я завучыў на памяць.

З у р ы к о. Ну і што? Сястра выходзіць за яго замуж?

Р а м у л. Хацела. Ды ён таго... звіхнуўся. *(Пакруціў пальцам у лоб.)* Пішы. *(Дыктуе.)* Не магу таіць, што люблю цябе, як сваё жыццё. Я страціў розум і спакой, бо твае вочы, твае бровы, твая талія... А ты не страціў?

З у р ы к о. Страціў.

Р а м у л. Тады пішы: ...талія... жэмчуг тваіх зубоў, каралавыя вусны...

З у р ы к о. Якія?

Р а м у л. Каралавыя... не даюць заснуць мне. Я хачу разам з табой служыць чалавецтву. Я загіну, памру без цябе. І не згодзен з Шэкспірам, калі ён пісаў: «О, жанчына,— нікчэмнасць вам імя!» Ну як?

З у р ы к о. Усё-такі пашанцавала тваёй сястры.

Р а м у л. На гэтым канчаю. Да пабачэння.

З у р ы к о. Падпісаць?

Р а м у л. Не трэба. Сама здагадаецца. Дарагая мая... О, жанчыны,— нікчэмнасць вам імя! Так! Ад гэтага пісьма і камень праслязіцца.

З у р ы к о *(спалохана)*. Рамул! А можа, не трэба?

Р а м у л *(паклаў пісьмо ў партфель Мэры)*. *(Званок.)* Усё бяру на сябе. За ўсё ручаюся.

У клас прыбягаюць в у ч н і. Заходзіць н а с т а ў н і к.

Н а с т а ў н і к. Апчхі! Ох-хо-хо...

Вучні *(хорам)*. Будзьце здаровы, Іраклій Нікандравіч!

Настаўнік. Дзякую. Добры дзень.

Вучні. Добры дзень.

Настаўнік. Сядайце. *(Да Зурыко і Рамула.)* Зноў на парце адстаючых? *(Выклікае вучняў па журналу.)* Абдаладзе!

Вучань. Тут я!

Настаўнік. Вашаламідзе.

Зурыко. Тут я, вучыцель.

Настаўнік. Гогічайнашвілі.

Вучань. Я...

Настаўнік. Гордалідзе!

Вучань. Тут, вучыцель.

Настаўнік. Сядай! Сіхарулідзе.

Мэры. Тут.

Настаўнік *(усміхаецца.)* Сядай, ластаўка. Катрыкадзе!

Рамул *(ускочыў)*. Катрыкадзе захварэў і пайшоў дамоў, а Цэнтрадзе, Бурчуладзе, Карыдзе, Чколія, Нікідзе, і Глоіці пайшлі яго праводзіць.

Настаўнік. Як гэта вы не здагадаліся ўсім класам пайсці?

Рамул. Мы хацелі, ды на ім не хапіла месца. Не было за што ўчапіцца. *(Смех.)*

Настаўнік. Вельмі дасціпна. Каля дошкі ты не такі кемлівы. Сядай. Вашаламідзе! Ва-ша-ла-мі-дзе!

Зурыко *(падскочыў)*. Я тут!

Настаўнік. Ты тут, але гэта ўсё роўна што цябе няма. *(Рамул смяецца.)* Рамук Каланадзе, вон з класа!

Рамул. Там жа холадна.

Настаўнік. Што я сказаў? Вазьмі сваю долю дроў і выбірайся!

Рамул. Калі ласка. *(Выходзіць.)*

Настаўнік. Вашаламідзе, да дошкі! Дык што нам было задана на сёння? *(Клас дружна падказвае.)* Ну, ну, зашыпелі, як гусі. Пачынай, Вашаламідзе!

Зурыко марудзіць, прыслухоўваецца да падказак.

Зурыко. Сода, яе здабыванне і выкарыстанне.

Настаўнік. Так... Раскажы пра соду, яе здабыванне і выкарыстанне ў прамысловасці.

Зурыко. Сода выкарыстоўваецца ў гаспадарцы і прамысловасці. Існуе многа спосабаў выкарыстання соды.

Н а с т а ў н і к. Напрыклад?

З у р ы к о. Напрыклад. Вы ведаеце, Іраклій Нікандравіч, мой дзядзя Іліко бярэ трошкі соды на кончык языка і проста так глытае.

Н а с т а ў н і к. Проста так?

З у р ы к о. Проста так! А Ларывон бярэ адну чайную лыжку соды на стакан вады, размешвае яе і выпівае.

Н а с т а ў н і к. З пахмелля?

З у р ы к о. Ага, з пахмелля, ад пякоткі. А мая бабуся Вольга...

Н а с т а ў н і к. Ну, хопіць, бабуся... шмабуся. Вон з класа!

Г о г і ч а й н а ш в і л і *(услых марыць)*. Шанцуе ж людзям...

Н а с т а ў н і к. Гогічайнашвілі, ты што сказаў?

Г о г і ч а й н а ш в і л і. Я сказаў: «Шанцуе ж людзям».

Н а с т а ў н і к. Гогічайнашвілі, вон з класа!

Г о г і ч а й н а ш в і л і. Калі ласка.

Ц ы н ц а д з е *(ціха)*. А яго за што?

Н а с т а ў н і к. Цынцадзе, што ты сказаў? Вон з класа!

Ц ы н ц а д з е. Калі ласка! *(Выходзіць.)*

Н а с т а ў н і к. Вашаламідзе! Што я сказаў?

З у р ы к о. Я, канечне, магу пайсці, але хто ж тады ў класе застанецца?

Н а с т а ў н і к. Не твой клопат. Хто жыве з ім па-суседску?

М э р ы. Я.

Н а с т а ў н і к. Сядай, ластавачка.

Мэры села. Настаўнік піша. Зурыко корпаецца з дрывамі.

Н а с т а ў н і к. Вашаламідзе! Я што сказаў?

З у р ы к о. Іду, іду.

Н а с т а ў н і к. Сіхарулідзе, занясеш гэту запіску бабусі гэтага нягодніка.

М э р ы. Ён добры хлопчык, Іраклій Нікандравіч.

Н а с т а ў н і к. Я сам ведаю, хто добры, хто благі.

М э р ы *(узяла запіску і паклала яе ў кнігу)*. Да пабачэння, Іраклій Нікандравіч.

Н а с т а ў н і к. Да пабачэння, ластавачка! Варсаладзе! Знайдзі ў падручніку 81 старонку.

В у ч а н ь. Знайшоў.

Н а с т а ў н і к. Чытай.

В у ч а н ь. Вытворчасць сернай кіслаты.

ІНТЭРМЕДЫЯ

Іліко і Ларывон.

Ларывон. Ну, песенька Гітлера спета. Цяпер яму капут. Завяз Гітлер пад Масквой і ні з месца.

Іліко. Ну, а як там з другім фронтам?

Ларывон. А куды ім спяшацца. Ох і хітрая бестыя, гэтая Англія...

Іліко. О-хо-о!

Ларывон. Просіць Амерыку: кінь ты гэты свой Савецкі Саюз, лепей мне памажы.

Іліко. А Амерыка што?

Ларывон. Не твая, кажа, справа. *(Паўза.)* А-а, а яшчэ вось што! Германія гаворыць Турцыі і Японіі: як толькі я дайду да Волгі — вы адразу і ўдарыце.

Іліко. Ох-эх! Нешта мне не падабаюцца паводзіны Турцыі за апошні час.

Ларывон. Ты што, Турцыі не знаеш? Як толькі ўбачыць, што Германію прыціснулі, сама на яе вайной пойдзе.

Іліко. Ды што ты?

Ларывон. Во табе я, во табе Германія. Абрэж мне гэты вус, калі будзе не так.

Іліко. А Японія?

Ларывон. А што Японія? Германія ёй кажа: пачынай вайну, што глядзіш? А Японія ёй: а ты чаго завязла на Волзе? Калі я пачну, мне толькі ў мора адступаць.

Іліко. А Германія на гэта?

Ларывон. Тры разы перадавала па радыё, што Волгу пераплыла. Брэша. Ды хіба Японію абдурыш? Яна таксама — не дура! Не! Песенька Гітлера спета!

Іліко. Ну і хвала богу.

Ларывон. Ясна, як дзень.

КАРЦІНА СЕМАЯ

Пакой Зурыко.

Зурыко *(нечакана)*. Я верш напісаў!

Іліко. А? Што ты напісаў?

Зурыко. Верш.

Ларывон. Ану-ка, зрабі ласку, раскажы.

Іліко. Праўда, раскажы.

Зурыко *(саромеецца.)* Пра любоў.

І л і к о. Пра любоў? Ану-ка, ну-ка!

Л а р ы в о н. Ох-э! Цікава. Раскажы.

І л і к о. Давай, давай, не саромейся. Цяпер ужо ўсё роўна.

Л а р ы в о н. Ну, гавары, гавары, Зурыкела, мы цябе слухаем!

З у р ы к о. Ноч і зоркі, снег і вецер...
Я па вуліцы блукаю...
Як на небе ясны месяц,
Радасць я сваю шукаю.
Свет і цемра ў бітву рвуцца,
А ад шчасця слёзы льюцца.
І не спаў я, і не еў я,
І ад суму ашалеў я...

Л а р ы в о н. Ох-о! Ну, што ты скажаш?

І л і к о. Апошні радок вельмі добры: «І ад суму ашалеў я». Відаць, гэтыя словы проста ад сэрца ідуць.

Л а р ы в о н. Пачакай... Ты сказаў, верш пра любоў. А тут пра любоў ні слова.

І л і к о. Ну як ты не разумееш, саромеецца чалавек!

Л а р ы в о н. Калі верш пра любоў, трэба хоць упамянуць пра гэтую любоў.

З у р ы к о. Чалавеку не спіцца!.. Ён блукае начамі, ашалеў зусім... Што гэта тады, калі не любоў?

Л а р ы в о н. Ну, дарагі мой. Іліко ўсё сваё жыццё, як ненармальны, блукае больш начамі, чым днём... Можа, і ён закаханы? Як ты думаеш?

І л і к о. Эй, ты, стары корч, языку волі не давай! Хлапчук накрэмзаў нейкую чапуху, а я тут пры чым?

Л а р ы в о н. Пастой, пастой. У вершы трэба разабрацца. Спачатку ты гаворыш — ноч, зоркі. Потым — снег і вецер... Гэта як жа? Усё адразу?

І л і к о. Слухай, генацвале, калі табе не спіцца, калі снег і вецер, калі цэлы свет рушыцца, дык чаму ў цябе слёзы льюцца ад шчасця? Чаму ты, дурань, радуешся?

З у р ы к о. А-а-а! Што вы разумееце ў вершах? Цемната!

Іліко і Ларывон смяюцца.

Л а р ы в о н. Я ведаю, калі чалавек пачынае вершы складаць. І са мной, калі я быў такі, як ён, гэта было. Помніш, Іліко? Калі я рускую дзяўчыну пакахаў.

Без яе я жыць не буду!
Застралюся! Дзе патроны?

Ад любві я ўвесь згараю.
Свет нямілы без Матроны!

Іліко. А як жа, помню. Я тады думаў, што ты звіхнуўся. А пасля аказалася — не зусім.

Ларывон. А твая бабуся ведае, што ты пачаў вершы складаць?

Зурыко. Не.

Ларывон. І не кажы ёй, сынок. Ёй і без таго нясоладка жывецца.

Іліко. Нічога, сынок, не бойся! Пішы на здароўе свае вершы, калі ўжо так табе прыспічыла.

Ларывон. Калі дзяўчына, у якую ты закахаўся, такая ж недарэка, як ты, ёй абавязкова спадабаюцца твае вершы.

Іліко. А не спадабаюцца, не бядуй. Значыць, яна не дура.

Абодва рагочуць. З запіскай у руках уваходзіць бабуся.

Бабуся. Цішэй вы! Зурыкела, сынок, колькі гадоў твайму настаўніку па хіміі?

Зурыко. Пяцьдзесят, пяцьдзесят пяць. А што?

Бабуся. У яго тут усе клёпкі цэлыя?

Іліко. З такімі вучнямі, як наш Зурыкела, хіба будуць клёпкі цэлыя?

Бабуся. Ларывон, хрыстом-богам прашу, паглядзі, што ён мне піша?

Ларывон *(доўга чытае пісьмо)*. Хто табе гэта прынёс, Вольга?

Бабуся. Мэры Сіхарулідзе. Суседава дачка. Настаўнік па хіміі, Іраклій Нікандравіч, прасіў мне перадаць.

Ларывон *(чытае)*. «Мая дарагя, найсаладзейшая ўцеха душы мае...»

Іліко. Гэта ён табе піша, Вольга?

Бабуся. Мне, мне.

Ларывон *(чытае)*. «З таго часу, як я ўбачыў цябе першы раз...»

Бабуся. Калі ж гэта ён мяне ўбачыў, пракляты?

Іліко. Кожны дзень у школу ходзіш, а яшчэ пытаеш?

Ларывон *(чытае)*. ...«Я прыняў як абсалютную ісціну існаванне нябеснага хараства, я спазнаў апагей душэўных пакут і апафеоз эстэтычнай асалоды...»

Бабуся. Вось гэтае месца я нешта не разумею.

Ларывон. Эх-э! Вольга, у любві сам чорт не разбя-

рэцца. *(Чытае.)*... «Не магу таіць, што люблю цябе, як сваё жыццё. Я страціў розум і пакой, бо твае вочы...»

Б а б у с я. Вай-ме! Мае вочы, о, божа!

І л і к о. Падумаць толькі, а?

Л а р ы в о н *(чытае).* «...твае бровы, твая талія, жэмчуг тваіх зубоў...»

Б а б у с я. Дзе ў мяне тыя зубы, трасца яму ў бок!

Л а р ы в о н. Так, тут ён хапіў лішняе.

І л і к о. Ці ж можна так чалавека з тропу зводзіць?

Л а р ы в о н *(чытае).* «Каралавыя вусны... не даюць заснуць мне. Я хачу разам з табой служыць чалавецтву. Я загіну, памру без цябе. І не згодзен з Шэкспірам, калі ён пісаў: «О, жанчыны,— нікчэмнасць вам імя!» На гэтым канчаю. Да пабачэння».

І л і к о *(задыхаючыся ад смеху).* Даволі! Хопіць! Прашу богам, хопіць! Не магу больш... Паміраю!..

Л а р ы в о н. Зурыкела! Калі будзеш выдаваць бабусю замуж, не забудзь і нас на вяселле пазваць.

З двара чуваць голас Мэры: «Бабуся Вольга!»

Б а б у с я. Заходзь, дачушка! Што гэта за пісьмо ты прынесла?

М э р ы. Настаўнік перадаў вам запіску. Вось яна. А пісьмо... Я не ведаю, адкуль яно ўзялося. *(Выходзіць.)*

Б а б у с я. О, божа справядлівы, яшчэ адно пісьмо! Ну-ка, Ларывон, прачытай.

Л а р ы в о н. Э-э? А-ха. *(Чытае.)* «Прашу вас прыйсці ў школу...»

Б а б у с я. Спатканне прызначае.

Л а р ы в о н *(чытае).* «...у сувязі з кепскімі паводзінамі вашага ўнука».

Б а б у с я. Ах ты, нягоднік! Лодар паршывы! Што мне, кожны дзень у школу хадзіць, а? Галаву яго тупую адарваць мала! Выбірайся зараз жа з дому на ўсе чатыры бакі. Выбірайся куды хочаш!

І л і к о *(смяецца).* Так яго, Вольга, так яго!

ІНТЭРМЕДЫЯ

З у р ы к о. Быў снег белы, быў вецер, былі зоркі і месячык... і сонца было... і любоў... і многа, многа снегу. Ох, дарэмна смяяўся Іліко, калі казаў: «Кругом снег і вецер, і рушыцца цэлы свет, чаму ты, дурань, радуешся...» Усё

было! І снег і вецер, і зоркі і сонца, і рушыўся цэлы свет, а я быў шчаслівы! Якімі суровымі ні былі тыя ваенныя зімы, але мінуліся і яны... Прыйшла вясна.

КАРЦІНА ВОСЬМАЯ

Узлесак.
Зурыко і Мэры сядзяць на прыгорку.

Зурыко *(чытае).*

Я земной шар
Чуть не весь обошел.
И жизнь хороша!
И жить хорошо!

Мэры. Маякоўскі!

Зурыко. Правільна, Маякоўскі. Цяпер ты.

Мэры. Чтоб дружбу обнаружить, есть три способа у нас:

Не желать разлуки с другом, быть с ним вместе — это раз.
Не жалеть, дарить от сердца, а не только напоказ.
В-третьих, ринуться на помощь издалека в нужный час.

Зурыко. Шата Руставелі. Ану-ка?

Прибежали в избу дети,
Второпях зовут отца:
Папа, папа, наши сети
Притащили мертвеца...

Мэры. Тятя, тятя!..

Зурыко. Гэта ж тое самае.

Врите, врите, бесенята,
Заворчал на них отец...

Мэры. Хопіць, Пушкін!

Зурыко. Ох, уж эти мне ребята,
Вот и будет вам мертвец...

Правільна, Пушкін.

Ларывон. Ты што, ізноў вершы складаеш?

Зурыко. Гэта не я, гэта Пушкін. Мы да экзаменаў рыхтуемся.

Ларывон. А-а! Ну, малайцы. Добры дзень, Мэры.

Мэры. Добры дзень, дзядзя Ларывон.

Ларывон. Самы важны экзамен у жыцці ў вас яшчэ наперадзе. Кумекаеце, пра што я кажу? *(Зурыко і Мэры*

майчаць.) Калі мы вунь той млын збудавалі, сілы ў ракі не хапала кола пакруціць... Мы пракапалі канал — дзве ракі разам злучылі. Вада паднялася! Кола закруцілася! Дзве ракі разам — сіла! Чуеце?..

З у р ы к о. Чуем...

Л а р ы в о н. І ты, дачка, у Тбілісі збіраешся?

М э р ы. Не, дзядзя Ларывон, я тут застаюся.

Л а р ы в о н. Ох-о! Тады ўсё ў парадку. Значыць, ён ад нас далёка не збяжыць.

Усе трое смяюцца. Здалёк чуваць голас: «Дзядзя Ларывон! Дзядзя Ларывон!» Прыбягае Р а м у л, той, што прыносіў тэлеграму ад Іліко.

Р а м у л. Дзядзя Ларывон!

Л а р ы в о н. Я тут, сынок! Што здарылася?

Р а м у л. Дзядзя Ларывон! Вайна скончылася! Зурыкела, Мэры!

Л а р ы в о н. Што ты сказаў?

Р а м у л. Вайна скончылася! Што вы стаіце?

Л а р ы в о н. Падыдзі сюды, сынок. Падыдзі, падыдзі, не бойся... *(Рамул падыходзіць. Ларывон хапае яго за вуха.)* Гэта Іліко аднавокі цябе падаслаў, каб кепікі строіць? Ну, прызнавайся!..

Гучыць звон. Урачыстая мелодыя.

Р а м у л. Чуеце?!

Канец 1-й дзеі.

ДЗЕЯ ДРУГАЯ

ІНТЭРМЕДЫЯ

З у р ы к о. Наша чайная — духан — у асобных выпадках замяняла калгасны клуб. І там пры самай урачыстай абстаноўцы ўручалі нам атэстаты сталасці. З раёна прывезлі музыкантаў... якіх звычайна запрашалі на паніхіды ці хаўтуры. Перад уручэннем атэстатаў аркестр сыграў «Вы жертвою пали...». А калі мне ўручылі атэстат і прачыталі маю характарыстыку, музыканты забылі, што яны не на паніхідзе, і зайгралі «Плач Маро» з оперы «Дaісі». Але схамянуліся і грымнулі туш!..

КАРЦІНА ДЗЕВЯТАЯ

Пакой Зурыко.
У пакоі Іліко і Ларывон гуляюць у карты.

Зурыко *(прыбег)*. Бабуся, бабуся!

Ларывон. Што такое? Зноў адмачыў нейкую штуку?

Зурыко. Я атэстат сталасці прынёс!

Бабуся недаверліва бярэ атэстат у Зурыко, перадае яго Іліко і Ларывону.

Бабуся. Паглядзіце, напраміласць бог, ці праўду ён сказаў! А можа, як летась прывалок чужую пахвальную грамату?

Іліко і Ларывон доўга разглядваюць атэстат з усіх бакоў, правяраюць на святло і вяртаюць яго бабусі.

Іліко. Яго атэстат!

Бабуся. Няўжо праўда?

Іліко. Аказваецца — праўда. Па-першае, бланк атэстата ён нідзе не мог сцягнуць. Другое — пячатка сапраўдная! Трэцяе, на атэстаце з другога боку напісана па-руску, а сам ён зроду не мог бы гэтага зрабіць. Чацвёртае, атэстат напханы толькі тройкамі, ніводнай чацвёркі! Яго атэстат, і не сумнявайцеся!

Бабуся з палёгкай уздыхнула.

Бабуся. Дай табе бог здароўя, Іліко. Мой дарагі Зурыко. Хвала табе, божа! І пячатка... Маленькі мой сыночак!

Ларывон. «Ат-тес-тат зре-лос-ти». Спеласці, значыць. Ды разбі мяне гром, калі ён не зялёны!

Іліко. Нічога, памідоры ў горад вязуць недаспелымі. Па дарозе даспяваюць. Так і з ім.

Ларывон. Зурыкела, на каго ты далей думаеш вучыцца?

Бабуся. І думаць не трэба! Мой унук стане доктарам. Толькі доктарам. Няхай палечыць мяне пад старасць.

Іліко. Табе, Вольга, вельмі хочацца ад яго рукі памерці?

Зурыко. Тады ўжо лепей на гістарычны. У нас самыя высокія пасады гісторыкам даюць.

Іліко. А па-мойму, на суддзю. Напрыклад, наш суддзя... Прыехаў сюды ў парваных галёшах, а цяпер ты яго

бачыў, які стаў! Хромавае паліто, фетравы капялюш і боты бліскучыя...

Б а б у с я. А ці няма такіх курсаў, дзе б гатовых прафесароў выпускалі?

Л а р ы в о н *(узрадавана)*. А як жа, Вольга, ёсць! Такія курсы наш Іліко прайшоў.

І л і к о. Ну і аса! Зноў сваё джала выпусціў.

Л а р ы в о н *(Зурыко)*. А сам ты куды збіраешся, непуцёвы, а?

З у р ы к о. Не ведаю, дзядзя Ларывон... можа, мне ў артысты падацца?

Мёртвая цішыня.

Б а б у с я. Вай-ме! Вай-ме! Мнагажэнцам хочаш быць!

Л а р ы в о н. Што ты яшчэ выдумаеш, няшчасны?

І л і к о. І не заікайся.

Б а б у с я. Барані нас божа! І слухаць не хачу! А цяпер хадзі, Зурыко, я табе падарункі дам... Хадзі! Дачакалася і я гэтага светлага дня. *(Бабуся выводзіць Зурыко ў другі пакой.)*

І л і к о. Ну, стары, вось і выпырхнуў ад нас гэты паршывец.

Л а р ы в о н. Калі без жартачкаў, Іліко, я думаю, на агранома яму трэба вучыцца. Нашаму калгасу аграном трэба.

І л і к о. Ёсць жа у нас аграном!

Л а р ы в о н. Які ён аграном! Пакуль у акадэміі не пабыў, яшчэ нешта ведаў, а як прыехаў з дыпломам — не разбярэ: дзе груша, дзе сліва.

І л і к о. Бадай што, твая праўда, Ларывон... Але як, па-твойму, ён у горад такім галадранцам паедзе? У горадзе ж яму трэба недзе жыць.

Л а р ы в о н. Трэба.

І л і к о. Адзець яго трэба?

Л а р ы в о н. Трэба.

І л і к о. Есці яму трэба?

Л а р ы в о н. Трэба.

І л і к о. А на ўсё гэта «трэба» — грошы трэба. Вось і прыдумай.

Л а р ы в о н. А што тут думаць... Мой Кукура з вайны не вярнуўся, у мяне, апроч гэтага жэўжыка, нікога на свеце няма. Усё аддам, не пашкадую, хай вучыцца.

І л і к о. Глядзі ты, якая шчодрасць у гэтага Ларывона насатага... Не думай, і я тварам у гразь не ўдару.

Л а р ы в о н. Ну добра, добра, Іліко ты мой аднавокі.

Уваходзяць б а б у с я і З у р ы к о. Зурыко ў вялікай каракулевай папасе, шырокіх аксамітных галіфэ, каўказскай рубашцы па самыя калені і вялізных ботах.

Б а б у с я. Во, сынок, насі на здароўе. Каму, як не табе, насіць дзедава дабро. Ніхто ў горадзе не будзе адзеты лепш за яго.

Іліко і Ларывон смяюцца.

І л і к о. Чорт мяне вазьмі! Ды гэта ж выліты віцязь у тыгравай скуры!

КАРЦІНА ДЗЕСЯТАЯ

Каля поезда.
Заходзяць: б а б у с я, З у р ы к о, І л і к о, Л а р ы в о н і М э р ы.

Б а б у с я. Зурыкела, сынок, будзь разумным. Глядзі, каб усё было як след.

Л а р ы в о н. Не забывай есці часнок. Каб не набрацца ў горадзе ўсякай заразы.

Б а б у с я. Як толькі прыедзеш, зараз жа пісьмо напішы. Чуеш?

Л а р ы в о н. Правільна. З гарадскімі не звязвайся, глядзі, а то і часнок не паможа.

І л і к о. Не будзь разявай! У поездзе многа жулікаў. А калі трэба будзе віно... Зразумеў? Не саромейся — пішы!

М э р ы *(развітваецца)*. Вазьмі на памяць.

З у р ы к о. Да хуткага спаткання, Мэры. Помніш Мураду — ён вельмі любіў цябе, вельмі. Ён мне часта гаварыў: Мэры харошая дзяўчынка. Такой, як Мэры, ва ўсім свеце няма. І такіх вачэй, як у Мэры, ні ў кога няма. А якая яна разумная і добрая, Мэры... Мурада вельмі, вельмі любіў цябе, як мяне, нават больш. На мяне ён іншы раз гыркаў, а на цябе — ніколі. Ты ж таксама любіла майго Мураду?

М э р ы. Вельмі любіла, Зурыко.

З у р ы к о. Да спаткання.

Б а б у с я. Не забывай бабусю.

З у р ы к о. Да спаткання, бабуся, Іліко, Ларывон, Мэры!..

КАРЦІНА АДЗІНАЦЦАТАЯ

У вагоне.

На ніжніх паліцах сядзяць: першы пасажыр, пасажыр з гітарай і трэці пасажыр. На адной верхняй паліцы ляжыць — бландзін, на другую паліцу лезе жанчына.

1-шы пасажыр *(жанчыне)*. Прымі нагу!

Шум. Пасажыры штурмуюць вагон. Уваходзіць тоўсты пасажыр з вялікім чамаданам. Зашчаміўся ў дзвярах, кінуў чамадан і пайшоў. Уваходзяць 2-гі пасажыр, Зурыко, пасажыр, Амбако і пасажыр з кнігай.

1-шы пасажыр *(жанчыне)*. Слухай, прымі нагу!

Жанчына. Нічога. У мяне ногі чыстыя.

1-шы пасажыр *(падняўся)*. Ну, тады абедзве на галаву мне пастаў. Што за жыццё? Што за народ? *(Сеў.)*

Купэ перапоўнена, душна, усюды навалены рэчы. Зурыко шукае месца.

3-ці пасажыр *(Зурыко)*. Эй, ты, з часнаком! Няма тут месца, няма...

Дзяўчына паказвае Зурыко на трэцюю паліцу. Зурыко ўладкоўваецца наверсе.

1-шы пасажыр. Якая нахабная моладзь цяпер!

2-гі пасажыр. Ох-хо! Проста дыхаць няма чым. *(Да трэцяга пасажыра.)* Паслухай, адчыні акно, будзь чалавекам!

3-ці пасажыр. Не адчыняецца.

Бландзін. Дыхайце па чарзе! А то да Тбілісі нам гэтага кіслароду не хопіць.

Паўза. Музыка поезда. Поезд ідзе. Пасажыры хістаюцца.

Амбако. Слухайце! Чый гэта чамадан? *(Пхнуў нагой.)* Чый чамадан, прызнавайся? Няма гаспадара? Тады выкіну ў акно!

Тоўсты пасажыр *(спакойна.)* Выкінеш — і сам следам паляціш. Гэты чамадан, разявіўшы раты, ждуць не дачакаюцца ў Тбілісі чацвёра маіх галчанят!

Амбако. Галчаняты вашы, а ногі ў мяне свае. Колькі так сядзець можна? Ногі здранцвелі. Ты чуеш? Забяры — а то выкіну!

Пасажыры падтрымліваюць Амбако.

Пасажыр з кнігай. Пажылы чалавек, яму няёмка так сядзець.

Тоўсты *(Зурыко)*. Слухай, ты, хлопец, прыйдзецца табе ўніз спусціцца...

Зурыко. Мне?

Тоўсты. Табе. Што ты там разлёгся, як князь Баграціён Мухранскі. Там месца для чамаданаў.

Зурыко. А што, ваш чамадан шчаслівей за мяне?

Тоўсты. Зараз жа злезь!

Зурыко. Ого! Не злезу. У мяне дома таксама ёсць чамадан. Я ж яго ў Тбілісі з сабой не цягну. Чамадан павінен пад лаўкай стаяць.

Тоўсты. Ты як са мной гаворыш? У мяне сын такі!

Амбако. А каб твайго сына так праганялі, ты б радаваўся?

Тоўсты. Калі ласка! Хай стаіць у цябе на нагах. Мне не муліць.

Паўза. Музыка поезда. Усе хістаюцца.

Амбако. Не! Я ўжо не магу так сядзець! *(Зурыко.)* Эй, слухай, спускайся зверху!

Зурыко. Не злезу!

Амбако. Як не злезеш? Як не злезеш?.. Бачыш, як сяджу? Злезь, а то праваднiка пазаву.

Зурыко. Заві!

Шум абурэння.

Тоўсты. Праваднік! Праваднік!

Праваднік *(уваходзіць)*. Ціха! *(Канец музыкі. Усе прыціхлі.)* Што такое? Што здарылася?

Усе тлумачаць. Шум.

Праваднік. Ці-ха! *(Усе прыціхлі.)*

Пасажыр з кнігай. Гэты нахабнік залез наверх.

Праваднік. Калі не хапае месца — там сядзець дазваляецца.

Зурыко расшпільвае штаны.

Праваднік. Ты што, хлопец, здурэў?

Зурыко. Білет хачу табе паказаць.

Праваднік. Дык для гэтага трэба пры людзях штаны здымаць? Тут жанчына едзе.

Зурыко. Мне бабуся кішэнь знутры прышыла.

Усе смяюцца.

Праваднік. Не здымай штаны, я веру табе на слова.

Зурыко. Дзякую, дзядзечка!

Праваднік. Зараз перавал праязджаць будзем. *(Выходзіць.)*

Музыка. Паўза. У купэ пачынаюць чыхаць і кашляць. «Будзьце здаровы!» — крыкнуў нехта.

Пасажыр з кнігай *(раскрыў парасон)*. Які скразняк! Чорт ведае што! За што толькі грошы бяруць?

Амбако. Не, гэта нікуды не варта! Пакуль нас не праняла прастуда, пакуль мы не схапілі запаленне лёгкіх і на наш вагон не паставілі чырвонага крыжа, трэба сагрэцца.

Бландзін. Таварышы! У мяне цэлы бачонак віна!

Амбако. Дарагі, давай сюды. Ану-ка стаўце сюды чамадан! А ў мяне чача.

Імправізуюць стол. Амбако ставіць бутыль чачы.

3-ці пасажыр. А ў мяне курыца!

1-шы пасажыр. А ў мяне каўбаса!

Амбако. Прашу к сталу, генацвале!

Пасажыр з кнігай. Гэту катлетку мая цешча згатавала. Прашу вас, паспытайце!

Амбако. І вы... бліжэй, давайце, давайце бліжэй... і вы... і вы...

Усе, апроч тоўстага і Зурыко, каля «стала».

Амбако *(у ролі тамады)*. Та-ак!.. За што вып'ем? За наш поезд!

1-шы пасажыр. За здароўе поезда!

Усе. За поезд.

Усе п'юць. Гітара.

Амбако. Калі на зямлі абсалютна нікога не было,— бог стварыў чалавека. Людзі хадзілі па пустой зямлі голыя і валасатыя, як звяры. Яны ненавідзелі адзін другога. Потым чалавек загаварыў. Працягнуў руку другому чалавеку. І першымі яго словамі было: «Будзь здароў!» Потым выразаў лясы, пабудаваў дамы і пад канец прыдумаў поезд. Мы цяпер едзем на ім і адзін другога вітаем.

Тоўсты *(жартуе)*. Я тут нікога асабіста не вітаў.

Амбако. Такое ўжо выхаванне! *(Смех.)* І так, за добры прывет! За наш поезд.

Пасажыр з кнігай. Як дзіўна... наш поезд?

1-шы пасажыр. Цудоўны тост! За добры прывет!

Усе. За добры прывет!

Усе п'юць. Пачынаюць спяваць.

Парень, богатырь молодой,
За руку красотку ведет.
Он идет с подругой-женой,
А подруга песню поет:
Ты так нежно любишь меня,
Так легко мне рядом идти.
Мы с тобой, защита моя,
Долго, долго будем еще цвести.

Бландзін *(Зурыко)*. Слухай, ты, князь Мухранскі! Ты чаму не п'еш?

Зурыко. Не навучыўся яшчэ.

Бландзін *(падае чарку)*. За добры прывет! За поезд!

Зурыко *(не бярэ)*. Не хачу.

Бландзін. Не п'е. Не хочаш!

Амбако. Слухай, князь Мухранскі, злазь! Ану, сваё слова скажы!

Гоман. Шумавая паўза.

Зурыко *(злез, далучыўся да кампаніі)*. Што тут сказаць?

Амбако. Ну? Скажы сваё слова.

Зурыко. Я, таварышы, першы раз на поездзе еду. Мяне Іліко і Ларывон папярэдзілі: асцерагайся, у поездзе многа ўсякіх жулікаў. Не будзь разявай! Вось, напрыклад, вы, дзядзя, як вас завуць?

Амбако. Амбако.

Зурыко. Як толькі я ўбачыў Амбако, падумаў пра сябе, што за тып? Куды едзе? Чаго? Каму грушы вязе? А вас як зваць?

Тоўсты. Мяне Антонам завуць.

Зурыко. А Антона я за разбойніка прыняў.

Усе смяюцца. Тоўсты падсеў да кампаніі. П'е.

Зурыко. А цяпер што? Няпраўда гэта! *(Падняўся.)* Вы... мяне... Добрага вам здароўя, людзі... *(П'е. Выцірае слёзы.)*

Амбако. Кацо, што з табой?

Зурыко. Нешта ў вока трапіла.

А м б а к о. А хораша ты сказаў, як мудры тамада сказаў!

Усе п'юць. Песня.

Поселилось счастье у них.
В доме и покой и уют.
В колыбели мальчик утих,
А они все песню поют.
Разгорайся, наш огонек,
Ты скорей, родимый, расти.
Мы с тобой, кровинка моя, сынок,
Долго, долго будем цвести, а-а-а...
На-ни-на-нина, на-ни-на.
На-ни-на, родной, на-нина.
Мы с тобой, кровинка-сынок,
Долго, долго будем цвести.

Гучыць гітара. Пасажыры засынаюць, прытуліўшыся дзе хто мог. Паступова песня сціхае. Не спяць толькі Зурыко і Амбако. Зурыко кладзе галаву на плячо Амбако.

А м б а к о. Я трохі апасаюся за тваю ікотку.

З у р ы к о *(кладзе галаву на плячо суседу)*. Я ў Тбілісі еду вучыцца. У мяне атэстат сталасці!

А м б а к о. Толькі штаны расшпільваць не трэба. Я табе і так веру.

З у р ы к о. А ты яго маеш? Не! Ты яшчэ не ведаеш, што такое для маёй бабусі атэстат сталасці.

А м б а к о. Як цябе завуць, сынок?

З у р ы к о. Зурыко. Зурыкела.

А м б а к о. Зурыко? І майго меншага таксама звалі Зурыко, толькі не вярнуўся ён з вайны...

З у р ы к о. А помніш, Ларывон?

А м б а к о. Амбако мяне завуць.

З у р ы к о. Не, цябе завуць Іліко!

А м б а к о. Амбако я, Амбако!

З у р ы к о. А я кажу — ты Іліко! А дзе ты ўзяў другое вока?

А м б а к о. Чорт з табой! Хай буду я Іліко, а калі праспішся, заві мяне Амбако.

З у р ы к о. Помніш, Ларывон, як мы згубілі Мураду...

А м б а к о. Як не помніць? Помню. Харошая такая была Мурада.

З у р ы к о. Помніш, што ты тады сказаў?

А м б а к о. Напомні, сынок, што я тады сказаў.

З у р ы к о. Ты сказаў, не плач, сынок Сурыкела, вазьмі сябе ў рукі. Помніш?

А м б а к о. Так, я тады сказаў: «Вазьмі сябе ў рукі».

З у р ы к о. А табаку Іліко — помніш?

А м б а к о. Як жа можна забыць! Такая араматная табака ў Іліко.

З у р ы к о. Ды не. З перцам табака! З перцам!

А м б а к о. І з перцам таксама добра... Спі, сынок, спі...

Ціхая музыка. Зурыко ўлёгся галавой на калені Амбако.

З у р ы к о. Ты ж ведаеш, Іліко і ты для мяне самыя дарагія людзі на свеце.

А м б а к о. Як я магу не знаць. І мы цябе вельмі любім. Спі, дарагі.

З у р ы к о. А бабуся, відаць, цяпер спіць...

А м б а к о. Не, не спіць... пра цябе думае. Спі!

Музыка мацнее. Шум поезда. Усе хістаюцца.

Заслона.

ІНТЭРМЕДЫЯ

З у р ы к о. Ну, вось я і ў Тбілісі. Вучуся я ў Грузінскім дзяржаўным ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчым інстытуце.

Я вам казаў, што маё сяло самае прыгожае сяло, самае вясёлае на ўсёй Грузіі. І гэта праўда. А Тбілісі — самы прыгожы, самы вясёлы горад на ўсім свеце. Тут вы бачыце толькі куточак горада. Але паверце мне на слова:

Тбилиси — нет в мире большей красоты.
Тбилиси — в стихах и песнях ты! Ты!
Расцветай, цвети под солнцем город-сад! Сад!

Самая шчаслівая пара ў жыцці чалавека — студэнцкія гады. Хто не быў студэнтам, той ніколі не зразумее, якая смачная хлебная скарынка, нацёртая часнаком, не зразумее радасці за тройку, што атрымаў на экзаменах па загадзя выкрадзенаму білету. Хто не быў студэнтам, не ведае цаны другу і болю расстання з ім. А пачуццё ўласнай годнасці! На лекцыі сядзіш, як мыш пад венікам, як маленькая нікчэмнасць, нейкі там Зурыко Вашаламідзе, а як толькі выйдзеш на вуліцы Тбілісі — становішся самай важнай персонай у гэтым цудоўным горадзе — студэнтам сельскагаспадарчага інстытута.

Як я трапіў у інстытут, як здаў уступныя экзамены,

як стаў студэнтам — гэты цуд яшчэ доўга будзе заставацца нераскрытай тайнай. А тое, што я на ўсёй нашай планеце самы таленавіты чалавек сучаснасці і што ні на якім марскім дне не валялася такой жамчужыны, як я,— бабуся мая ведае гэтак жа цвёрда, як тое, што на руцэ ў яе пяць пальцаў, а не шэсць.

КАРЦІНА ДВАНАЦЦАТАЯ

Пакой Зурыко ў Тбілісі.

З у р ы к о. Усявышні божа. Айцец нябесны... Сёння мае імяніны, а я грызу граніт навукі. Няўжо мая бабуся праўду казала, што ты мяне пакараў, даў такі непаваротлівы язык. Трэці раз прадмет здаю — двух слоў звязаць не магу. Заўтра ў дзевяць гадзін раніцы ізноў гэты пракляты экзамен! Калі ты сапраўды ўсемагутны...— выручы! Будзь чалавекам! Не дапусці правалу!

Уваходзіць Л а р ы в о н.

...А то што я скажу Іліко і Ларывону? Як пакажуся на вочы бабусі? Чуеш мяне, божа! Толькі не гавары, калі ласка, як Ларывон, што ў маім узросце ў цябе былі адны пяцёркі. Няпраўда — ніхто табе не паверыць! Старыя заўсёды так гавораць. Можа, і я буду гаварыць так сваім дзецям. Калі ты бог, памажы мне здаць экзамен. Табе ж гэта не цяжка! Колькі троек там у цябе ў запасе для такіх, як я! Дык скінь мне адну троечку! Зрабі падарунак на мае імяніны. Ну што, шкада? Бо-о-жа, ты чуеш мяне, выручы!

Л а р ы в о н. Божа, дапамажы ты яму ўжо! Ці ты не чуеш, як дзіця просіць цябе.

З у р ы к о. Ларывон, дарагі!

Л а р ы в о н. Іліко і твая бабуся прысталі: у хлопца імяніны, завязі яму што-небудзь. Хай радуецца.

З у р ы к о. А як вы там усе?

Л а р ы в о н. Ды нішто сабе! Табе бабуся пісьмо перадае.

З у р ы к о *(чытае).* «Сыночак, ты цяпер вучоны чалавек. Вялікі аўтарытэт у цябе ў Тбілісі. Прыйшло ў школу нашу пісьмо з інстытута. «Каго, пішуць, вы нам прыслалі, дзіва нейкае, другога такога ва ўсім свеце не знайсці!» Малайчына, сынок, знала я, што ты праславіш нашу Грузію. Твая бабуся нічога не пашкадуе, абы ты быў шчаслівы.

Табе хутка дваццаць. Цераз год знайду табе нявесту. Хто ж, як не я, будзе калыхаць твайго сына? А ў Ларывона, сыночак, гора — жаліцца ён на вока. Пакутуе бедны...» Што ў цябе з вокам, Ларывон?

Л а р ы в о н. Не ведаю. Нешта баліць і баліць... Наш доктар сказаў: тэрмінова ў Тбілісі ехаць трэба...

З у р ы к о. Заўтра ж пойдзем к доктару. *(Чытае.)* «...Сабяры прафесараў і дапамажы яму, сынок. І яшчэ навіна: у нашым калгасе новага старшыню выбралі. Рамула Каланідзе, што з табой у адным класе сядзеў. Нядаўна спаткаў ён мяне і кажа: «Калі ж прыедзе наш Зурыкела, ён нам да зарэзу трэба». Паклон табе ад Мэры і ад усіх. Цалую цябе, твая бабуся Вольга». Заўтра ж раненька пойдзем к доктару, Ларывон. Заходзь, дарагі, адпачні з дарогі...

Ларывон выходзіць.

ІНТЭРМЕДЫЯ

З у р ы к о. Цэлую ноч не спаў Ларывон, так балела яго вока. На што цярплівы чалавек, а тут не вытрываў, сам папрасіў выклікаць «хуткую дапамогу». Забралі майго Ларывона, а праз два тыдні, пасля аперацыі, выпісалі яго з бальніцы з адным толькі вокам. Ніяк нельга было аднаго яго адпусціць дадому. Вельмі мутарна было на душы ў Ларывона ад аднае думкі, як яго сустрэне Іліко. Ён жа ўсё жыццё дражніў Іліко аднавокім. Як яны спаткаюцца? Як цяпер ён паглядзіць яму ў твар.

Я ледзь вымаліў у дэкана два дні, каб паехаць разам з Ларывонам.

КАРЦІНА ТРЫНАЦЦАТАЯ

Пакой Зурыко.
У пакоі бабуся, уваходзяць З у р ы к о і Л а р ы в о н.

З у р ы к о. Бабуся! Бабуся!

Б а б у с я. Зурыкела, сынок! Прыехаў! Ну як табе не сорамна, забыў ты сваю бабусю. А божачка, худы які! Як сушаная слiва!

З у р ы к о. Як ты тут, бабуся?

Б а б у с я. Сыночак, Зурыкела! Хлопчык мой прыехаў! Ну, хвала табе божа, скончыў!

З у р ы к о. Што ты, бабуся! Мне яшчэ тры гады вучыцца!

Б а б у с я. Ой-ме! Бедная твая бабуся! Ты што, павінен вучыцца адзін за ўсіх? Што там у цябе за вучыцелі-мучыцелі? Каб іх чорт узяў! Што гэта за іроды! Скажы ім, што ў мяне бабуся хворая, нельга ёй адной так доўга. Можа, тады яны цябе хутчэй навучаць.

З у р ы к о *(смяецца)*. Добра, бабуся, скажу.

Б а б у с я. Звар'яцелі яны! Цэлых тры гады!

Л а р ы в о н. Вольга, а чаму ты са мной не здароўкаешся?

Б а б у с я. Ох-ме! Даруй мне, Ларывон. Праз гэтага жэўжыка я цябе нават і не заўважыла. Ну, як ты, дарагі? Раскажы, як тваё вока. Цяпер не баліць?

Л а р ы в о н. Як яно можа балець? Няма ў мяне вока!

Б а б у с я. Што ты мелеш?! Ты думаеш, я ўжо аслепла, ці што? А гэта што, хіба не вока?

Л а р ы в о н. Такое ж, як у коршуна, што вісіць у Іліко на сцяне. Хіба гэта вока?

Б а б у с я. Вай-ме! А бо-ожачкі... што ты гаворыш, няўжо шкляное?

Л а р ы в о н. Чыстае шкло.

Б а б у с я. Хто б мог падумаць? Ну і што! Галоўнае — ты жывы і здаровы! І мы ўсе тут разам з табой. Ты і адным вокам убачыш болей, чым як іншы двума. Ну, сядай, сядай за стол, Ларывон!

Л а р ы в о н. Ды не, стаміўся я...

Б а б у с я. Нічога, нічога... Пастаў чамадан тут. Зурыкела, памажы. Пасядзім, пагамонім...

Здалёк чуваць голас Іліко: «Вольга!»

З у р ы к о. Іліко ідзе!

Л а р ы в о н. Тут ужо! Прынесла яго...

З у р ы к о *(да бабусі.)* Пра вока яму ні слова.

Л а р ы в о н. Прашу цябе, Вольга. Здзекавацца будзе.

Б а б у с я. Божа барані!

Л а р ы в о н. Не, не такі ўжо дурань Іліко, каб не адрозніць шкляное вока ад жывога.

Б а б у с я. Нічога, нічога, Ларывон, ён жа і сам аднавокі.

Б а б у с я выводзіць Л а р ы в о н а ў суседні пакой. Уваходзіць І л і к о.

І л і к о. Зурыкела!

З у р ы к о. Дзядзя Іліко!

Іліко. О-о-ой-э! Прафесар, маё шанаванне! Ну, як справы? Глядзі ты, якім стаў!

Зурыко. А што? Якім?

Іліко. Як звер! А то ж быў проста цяля! Ах ты, дарагі мой... Думаю, што ўсе тбіліскія прафесары розум страцілі. Вуй-ме! Вусы!.. *(Скубануў Зурыко за вусы.)* Сапраўдныя?

Зурыко. А як жа!

Іліко. Брэшаш, каб ты згарэў! *(Рагочуць, цалуюцца.)* А дзе Ларывон?

Зурыко. Ён тут... у бабусі.

Іліко. Ларывон! Паглядзі на яго.

Уваходзіць Ларывон.

О-хо! Ларывон Шаварнадзе! Падыдзі сюды.

Ларывон. Здароў, Іліко, брат...

Іліко. Здароў, Ларывон. Ніводнага пісьма не прыслаў, як не сорамна! *(Доўга цалуюцца.)* Ну, сядай, расказвай, як там Тбілісі? Што новага *(Да Зурыко.)* Слухай, ты мне гэту... рускую воблу прывёз?

Зурыко. Даруй, забыў.

Іліко. Аб чым ты думаў, сукін сын!

Зурыко. Экзамены, дзядзя Іліко.

Іліко. Ларывон, што ён там у Тбілісі робіць? Ён хоць вучыцца чаму-небудзь?

Ларывон. Кніжкі ў яго руках я нешта не бачыў.

Іліко. Канечне, ён без кніжак усё на памяць ведае. Ну... вып'ем, сябры мае, за ваш прыезд, за дружбу, жывіце, радуйцеся... У вас ністолечкі няма сумлення. Думаў, прыедзеце, навіны мне раскажаце. А вы? Як ваўкі, мяне сустрэлі! Адзін адвярнуўся, другі воблу не прывёз. Хіба сябры так робяць? Ну, ад гэтага насатага я іншага не чакаў. А ты што — шалапут? Сапляк!

Зурыко. Дзядзя Іліко, не крыўдуй. Давай лепей вып'ем.

Іліко. Я так узрадаваўся, што вы прыехалі. Бег, аж спатыкаўся. Дык вы думаеце, я прыйшоў да вас, каб піць гэтую кісляціну?

Ларывон. Знаем, знаем, чаго ты прыйшоў...

Іліко. Ну, скажы, чаго я, па-твойму, прыйшоў, паршывы твой язык?

Ларывон. І-э-ме! Ну што ж, Іліко аднавокі, давай выкладвай. Цяпер я ў тваіх руках! Ну, пачынай, еж мяне, еж мае вантробы!

Іліко. Бог ты мой! Звар'яцеў! Проста ашалеў! Чым ты

яго там апаіў? Залатога чалавека пасылаў к табе ў Тбілісі, а ты мне каго прывёз? Нейкага ненармальнага! К чорту! Нагі маёй тут не будзе!

З у р ы к о. Дзядзя Іліко! Супакойся, не трэба. *(Ціха Ларывону.)* Ён нічога не заўважыў.

Л а р ы в о н. Ты думаеш?

З у р ы к о. Клянуся табе! *(Голасна.)* Давайце вып'ем за наш прыезд, за нашу сустрэчу!

І л і к о. Ох-э! Даўно б так! А то зусім напалохаў аднавокага Іліко. І не шкада вам мяне? Ну за ваш прыезд, за нашу дружбу! Будзем здаровы і шчаслівы, дарагія мае.

Л а р ы в о н. Будзь здароў, Іліко! Будзь здароў, Зурыкела! *(Спявае.)*

Калі прахожы к табе зайшоў,
Цалікауры пастаў на стол!

І л і к о. Не, я табе!

С гор высоких ветер дует,
Значит, осень впереди.
Погоди, тяжелый ветер,—
Хоть немного погоди.

Я еще не очень старый,
Хоть уже не молодой —
Могу выпить литров тридцать,
Хоть совсем уже седой!

П р и п е в:
Наливай вино, и выпьем,
Выпьем, чтоб оно пропало!

Л а р ы в о н. Іліко, дарагі мой, ты ж ведаеш, як я цябе люблю.

І л і к о. Знаю, знаю, Ларывон. Я табе даражэй, чым тваё вока.

Ларывон насцярожыўся.

І л і к о *(спявае.)*

Молоко на вид красивей,
Но вино зато вкусней,
В молоке большая сила,
А вино еще сильней.

Мой Гигола крепкий парень,
Может рельсу он согнуть,

Но совсем как свечка тает,
Если ему подмигнуть.

Прыпев:
Наливай вино, и выпьем,
Выпьем, чтоб оно пропало!

Ларывон ізноў насцярожыўся.

За Ларывона насатага! За Зурыкелу басталковага!

Ларывон. За здароўе, Іліко!

Іліко *(спявае).*

Ох, любовь, ты злая сила,
Что мне делать, как мне жить?
Для тебя готов всегда я
Свою голову сложить.

Если б я на ней женился,
Был гостей бы миллион,
Я б берег ее и нежил,
Как стеклянный медальон!

Прыпев:
Наливай вино, и выпьем,
Выпьем, чтоб оно пропало!

Ларывон паволі падымаецца.

Если б был я помоложе
И на месте был бы глаз,
Был бы самый знаменитый
Я певец на весь Кавказ.

На меня смотрите, люди,
Вот он я во всей красе,
На меня кто косо взглянет,
Тот ослепнет пусть совсем.

Прыпев:
Наливай вино, и выпьем,
Выпьем, чтоб оно пропало!

Усяго вам найлепшага. Стаміўся я крыху. Пайду спаць. Спакойнай ночы. *(Выходзіць.)*

Зурыко. Я што казаў? Нават не заўважыў!

Голас Іліко. Ларывон!

Л а р ы в о н. Што табе, чорт аднавокі?

І л і к о *(вяртаецца ў пакой).* Калі будзеш класціся спаць, не забудзь на ноч сваё новае вока ў кубак з вадой апусціць.

Л а р ы в о н. Што?

І л і к о. Нічога! Ану, падміргні, падміргні мне сваім новым вокам!

Л а р ы в о н. Іліко Чыгагідзе!

І л і к о. Так, так, часцей паўтарай маё імя, а то забудзеш. А наогул табе пашанцавала. Ты ж любіш на паляванне хадзіць. Цяпер табе не трэба зажмурваць другое вока. Страляй сабе на здароўе! Бі сабак! Перабі ўсіх сабак! Глядзі, ніводнага не прапусці!

Л а р ы в о н. Іліко Чыгагідзе, не даводзь мяне да грэху!

І л і к о. Ларывон Шаварнадзе, не падыходзь. А то разаб'ю тваю фару! А потым лаві мяне за хвост!

Б а б у с я. Вы што, здзяцінелі пад старасць? Непуцёвыя!

Ларывон моўчкі сеў. Іліко асцярожна наблізіўся да яго і з апаскай прысеў поруч. Падае Ларывону кісет.

І л і к о. Бяры! Ну, бяры, табе кажуць... *(Абодва закурылі.)* Я ледзь не памёр ад гора, калі пачуў пра тваю бяду. Аслепнуць мне і на другое вока, калі я няпраўду сказаў. Твая бяда — гэта мая бяда. А твая слепата — гэта мая слепата. А ён пакрыўдзіўся, дзівак гэты. Не думаў я, што ты так... Ты ж мяне даўно завеш аднавокім, і я не крыўдую. Кутузаў таксама быў аднавокі і таксама з Ларывонаў, а зямлю наскрозь бачыў. Падумаеш, гора — адно вока. Калі нават і два страцім, і тады не прападзём. Возьмемся за рукі і пойдзем па нашай радзімай зямельцы. Самі не зможам, гэты паршывец павядзе. А ты свой вялікі нос апусціў. Эх ты!..

Л а р ы в о н *(падышоў да хурджына, выняў воблу, падаў Іліко).* На, вазьмі. Гэта вобла руская. З віном і мамалыгай — смаката!

І л і к о. Я так люблю яе.

Л а р ы в о н. Гэта я табе прывёз.

І л і к о. Я ведаў, што ты прывязеш.

Ларывон узяў чамадан і хурджын і ідзе да дзвярэй.

І л і к о. Чакай, стары, нам па дарозе.

Абодва выходзяць.

Б а б у с я *(ім услед)*. О, божа літасцівы, не абыдзі іх сваёй дабратой. Сынок, з'еў бы чаго-небудзь. Нябось прагаладаўся з дарогі.

З у р ы к о. Дзякую, бабуся.

Г о л а с М э р ы. Бабуся Вольга!

Б а б у с я. Хадзі, хадзі сюды, дачушка. *(Зурыко.)* Мэры прыйшла.

У пакой прыбягае М э р ы.

М э р ы. Добры дзень, Зурыко!

З у р ы к о. Добры дзень, Мэры!

М э р ы. Бабуся Вольга, пазычце нам, калі ласка, сіта.

Б а б у с я. Ідзі, вазьмі, ты ж ведаеш, дзе яно вісіць.

Мэры ўзяла сіта.

Б а б у с я. Прысядзь, дачушка. Пасядзіце, пагаманіце, дзеткі...

М э р ы. Я вельмі спяшаюся.

Б а б у с я. Правядзі яе, сынок.

М э р ы. Ну што вы, мяне праводзіць не трэба.

Б а б у с я. Табе не трэба, яму — трэба. Што я сказала? Правядзі яе, Зурыко!

М э р ы. Не, не! Не трэба! *(Выбегла.)*

З у р ы к о. Сіта забыла.

Б а б у с я. Вельмі ёй трэба было гэта сіта. Ты знаеш, як яна цябе чакала? І не сорамна? Ні слова не напісаў ёй з горада. Ну, што ты стаіш, няшчасны? Бяры сіта, бяжы — даганяй! А то як дам па бесталковай тваёй галаве! *(Зурыко выбягае.)* Мэры! Мэры!

Заслона.

ІНТЭРМЕДЫЯ

З у р ы к о *(адзін)*. І я дагнаў яе. Прайшло тры гады. Цяпер я ўжо не які-небудзь Зурыко, а чалавек з вышэйшай адукацыяй. Прайшоў час. Узяўся і я, нарэшце, за розум. Вучыцца пачаў як след. Проста вырас, відаць, дарослым стаў. У маім дыпломе «з адзнакай» чорным па белым напісана, што я, Зураб Уладзіміравіч Вашаламідзе — аграном і што мой дыплом сапраўдны ва ўсіх краях, абласцях і раёнах Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. З удзячнасцю ўспамінаю я сваіх сяброў, настаўнікаў і нашу школу — непрыкметную вясковую школу. І вось я зноў

вярнуўся ў сваё роднае сяло — самае прыгожае ў Грузіі,— і цяпер ужо назаўсёды. Тут мяне чакалі бабуся, Ііко, Ларывон і Мэры.

Схілы гор вакол сяла прыбяру я вінаграднікамі, а ўсё сяло зраблю квітнеючым садам.

КАРЦІНА ЧАТЫРНАЦЦАТАЯ

Дом Зурыко.
Сядзяць Іліко і Ларывон. Бабуся ляжыць хворая. Прыбягае Зурыко.

Зурыко. Вось і я. Добры дзень.

Ларывон *(адводзіць вочы)*. Здароў.

Іліко. Здароў.

Зурыко. Што здарылася?

Ларывон. Учора ёй кепска стала. Думалі, не дажыве да раніцы. Ты тэлеграму атрымаў?

Зурыко. Якую тэлеграму?

Іліко. Мы паслалі. Вельмі яна ўжо слабая была ўчора.

Зурыко. Бабуся!..

Ларывон. Не разбудзі... Яна заснула толькі што...

Бабуся. Ларывон, я праўда чую голас майго хлопчыка ці мне здалося?

Зурыко *(падыходзіць да яе.)* Гэта я, бабуся.

Бабуся. Мой дарагі сыночак. Родны ты мой, прыехаў. Сэрца тваё пачула.

Зурыко. Што ты, бабуся!

Бабуся. А ты што думаў, твая бабуся вечна будзе жыць? Ну што ты трасеш падбародкам, паршывец мой родны? Прыйшоў мой час, сыночак. Не падняцца больш тваёй бабусі.

Ларывон. Што ты, Вольга? Ты яшчэ дзесятак такіх, як мы, перажывеш.

Бабуся. Ларывон Шаварнадзе, спачатку вытры слязу, а потым... жартуй. Інстытут скончыў, сынок?

Зурыко. Скончыў, бабуся. *(Вымае дыплом і падае яго бабусі.)*

Бабуся. Ларывон, прачытай.

Ларывон *(чытае)*. «Прад'яўнік гэтага...»

Бабуся. Чытай мацней.

Ларывон *(чытае)*. «Прад'яўнік гэтага Вашаламідзе Зураб Уладзіміравіч скончыў поўны курс Ордэна Працоў-

нага Чырвонага Сцяга Грузінскага сельскагаспадарчага інстытута па спецыяльнасці агранома па вінаградарстве і садаводстве. Дыплом сапраўдны ва ўсіх краях, абласцях і раёнах Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік».

Б а б у с я. Хвала табе, божа. А цяпер слухай мяне, сыночак... Да заўтра я не дажыву... Я дзякую богу, што ты ў мяне такі... *(Зурыко плача.)* А як ты хацеў? Бабусю, якая цябе карміла, паіла, на той свет адправіць без слёз? Не! Так не бывае, хлопчык мой... Паплач, паплач, сынок. Мёртвая я ўсё роўна нічога не пачую. Ну і даволі... цяпер хопіць... А гэтых двух бачыш, Іліко і Ларывона? Слухайся іх ва ўсім. За тое дабро, што яны для цябе зрабілі, ты ніколі не зможаш ім адплаціць... і не абяцай. Проста любі іх, як яны цябе любяць. Іліко, Ларывон, выйдзіце, калі ласка, пакіньце мяне з маім Зурыко.

Іліко і Ларывон адыходзяць у кут і плачуць.

Вы што там? Дзе ж гэта чулі, каб жывога чалавека аплакваць. Выйдзіце, я сказала! *(Іліко і Ларывон выходзяць.)* А цяпер, сынок, я цябе пацалую. *(Цалуе Зурыко.)* Хлопчык ты мой родны. Зурыкела, дай мне віна. *(Зурыкела падае бабусі віно.)* З песнямі і вяселлем пахавай мяне, сынок. Усе свае справы на зямлі я ўладкавала. Ну, а цяпер ідзі, ідзі, Зурыкела! Пакінь мяне адну. Пагасі лямпу і выйдзі.

ЭПІЛОГ

З у р ы к о. Калі я вярнуўся ў пакой, следам за мной прыйшла Мэры. Прыйшла, каб болей ніколі адсюль не выходзіць. Каб ніколі не пакідаць мяне, Іліко і Ларывона і... Я вазьму да сябе Іліко і Ларывона, і мы зажывём усе разам. Я, Іліко, Ларывон і Мэры. У нас будзе дом, новы сабачка Мурада і дванаццаць чалавек дзяцей. Адзінаццаць хлопчыкаў і адна дачка. І я назаву яе Вольгай. Потым нас будзе ўсё болей, і болей, і болей. І ўвесь свет гэта будзем мы — наша Савецкая Краіна. І мы ніколі не знікнем, і не будзе нам канца.

Заслона.

У. Іванаў

БЛАКАДА

**П'ЕСА
Ў ЧАТЫРОХ ДЗЕЯХ**

ПРАЛОГ

Над каналам калышацца туман, рыпяць уключыны і чуваць песня Рубцова.

Товарищ, товарищ, болят мои раны,
Болят мои раны вглубоке.
Одна заживает, другая нарывает,
А третья во внутреннем боке!
Товарищ, товарищ, вопче погибаю...

Туман паволі радзее, і ўжо відаць недзе ўдалечыні агні порта і вялікае акно скорадрукарні. На акне — цені людзей. Лодка прычальвае, звініць ланцуг, і чуваць неразборлівы голас Рубцова. З перавулка, хістаючыся ад голаду і страху, паказваюцца туманныя спадарожнікі Рубцова: Ададураў, Цюфякін. Туман радзее. Гудзе сірэна. Спадарожнікі Рубцова палохаюцца, спыняюцца. Выходзіць Домна-Разанда Прэкрасная. Яна ў падраных чаравіках, а на галаве ў яе персідская керманшаль. Абняўшы Домну-Разанду за плечы, велічна і нахабна гайдаецца Рубцоў.

Домна-Разанда *(радасна)*. Канец камунізму!

Спадарожнікі кідаюцца да Рубцова. Ён іх спыняе жэстам рукі.

Рубцоў. Хопіць! Апускаю якар! Стоп, машынка! Не паеду я ў Самарскую губернію мяшочнічаць! Не падыходзь, не раздражняй!

Яблачкін. Каму ж ехаць па хлеб, таварыш Рубцоў?

Ададураў. Мы вам і парцьеры, мы вам і мэблю сваю аблупілі.

Цюфякін. Друкарню нашу захапілі; і чуеце, параход яшчэ на наша няшчасце...

Вые сірэна «Дракона».

Рубцоў. Няшчасці вашы для мяне — як леташні снег. *(Падыходзіць да акна.)* Бач, які гоман! Рукамі ма-

хаюць, непакояцца. Пра кранштацкія справы пачулі? Сямён Аладзьін на маім баку, чулі?

А д а д у р а ў *(нясмела)*. Поезд можа пайсці, таварыш Рубцоў.

Ц ю ф я к і н. Нам вельмі галадна. Хлеб трэба.

А д а д у р а ў. У крайнім выпадку я яшчэ прапаную вам залаты гадзіннік з партрэтам жалезнага канцлера Бісмарка.

Р у б ц о ў. Адхлынь! Рэвалюцыянер я ці не рэвалюцыянер? Патрэбны мне камуністы ці не патрэбны? Спраўлюся я з Расіяй без камуністаў.

К і с е л ь *(з мяшэчкам пад пахай выходзіць ціха з дзвярэй друкарні)*. А я, Рубцоў, не што іншае, як вандроўнік пры скорадрукарні «Трох вятроў». Вандроўнік, які спыніўся. У друкарні вэрхал, вандроўніку сумна, Дзяніска Аладзьін ходзіць нібы дамавік, сцібрыць вандроўніку, выходзіць, цяжка, і ўсё ж *(апускае клунак)* я сцібрыў. Рубцоў, літары на кулі бандытам прадасі, адменныя кулі бандытам прадасі, адменныя кулі можна выплавіць з літар.

Р у б ц о ў. А ў друкарні гамоняць, Кісель?

К і с е л ь. Гамоняць, Рубцоў.

Р у б ц о ў. Пра што гамоняць, вандроўная твая душачка?

К і с е л ь. Пачалі сумнявацца, матроскае тваё горлачка!

Р у б ц о ў. Амба! Аб'яўляю: свабодны гандаль, закрываю камунізм, а друкарню, калі са мной не згодзіцца,— я яе ў металалом здаю. Шаланда мая! Бераг мой! Друкарня мая! Пецярбург мой! Я цяпер — пірат!

Ц ю ф я к і н *(Ададураву)*. Калі ён сапраўды пірат, не прывязе ён хлеба.

Р у б ц о ў. Пяць фунтаў хлеба за бервяно, сухое бярвенне, вытрыманае...

Паўза.

Д о м н а - Р а з а н д а. Хто ж палена за пяць фунтаў прадае, рабаўнік? Мне сорамна за цябе. Ты ведаеш, як мне дастаюцца гэтыя пяць фунтаў? Вазьмі два!

Р у б ц о ў. Не таргуйся з піратамі, бяры, пакуль не раскупілі. Табе аддаю за чатыры фунты і адну ноч, Домна-Разан-душка, курва...

К і с е л ь. Дык ты не едзеш у Самарскую, Рубцоў?

Р у б ц о ў. Пяць фунтаў, пяць фунтаў за бервяно. Набліжаецца сырасць, купляйце...

К і с е л ь. Не едзеш? *(Торапка развязвае клунак, вы-*

Андрэй Макаёнак і Янка Брыль.
1978 год.



Андрэй Макаёнак з піянерамі.
1978 год.



мае адтуль матроскую цяльняшку і бушлат, хутка апранаецца і становіцца поруч з Рубцовым.) Пяць фунтаў за бервяно, апроч таго, прадаецца шрыфт, літары, годныя для рыбалавецкіх грузіл і куль.

Цюфякін. Наш жа шрыфт нам жа на кулі прадаюць, мяшэчнік ператвараецца ў пірата, вандроўнік — у рэвалюцыйнага матроса, а ў тумане лямантуе параход. Божа ты мой!

Чуваць шыпенне пары, кароткія свісткі, глухія словы каманды.

Рубцоў. Стой, карабель! Стой, карыта!

Голас Дэлагардзі з туману: «Гэта Пецярбург есць?»

Рубцоў. Вось і прэш ты, курва, на Пецярбург!

Голас Дэлагардзі: «Вы есць на льдзіне?»

Рубцоў. Мы есць на беразе, сукін ты сын!

Голас Дэлагардзі: «Як на беразе? О, механік, ціхі ход назад!»

Рубцоў. Куды ж ты прэшся? Куды? Не даві людзей! Тут бервяно тырчыць з маёй шаланды. Стой!

Чуваць крыкі, трэск дошак, сірэна сціхае. На шаландзе застаецца Рубцоў. Усе іншыя ўцякаюць.

Ну вось і напароўся на кол! Куды цяпер якарам на мяне, аслеп? Не бачыш: чалавек, Рубцоў! Паднімі якар!

Туман знікае. Спачатку відзен іржавы, аблытаны водараслямі, якар, які ўпёрся ў грудзі Рубцову, затым паказваецца ўвесь корпус парахода. На палубе парахода скрынкі з таварамі, на скрынках з біноклем у руках Дэлагардзі, мурзаты, абарваны.

Дэлагардзі *(са страхам глядзіць на Рубцова)*. У параход улезла ваша бервяно, пан?

Рубцоў. А чаму яму не ўлезці?

Кісель *(развязна ідзе на шаланду)*. Наша бервяно ў любое памяшканне ўлезе.

Дэлагардзі *(усё тым жа атарапелым голасам)*. Гэта Пецярбург есць?

Рубцоў *(дзелавіта)*. Адкуль карабель?

Дэлагардзі. О, мы пакуль што з Стакгольма! Мы гандляры. Ваша краіна — загадкавая краіна. Мы прыязджалі сюды многа разоў, і кожны раз яна мела другі выгляд. Ваш лоцман абсалютна п'яны і не цікавіцца рулём, а цікавіцца рэвалюцыяй у Стакгольме. З вашым лоцманам напіўся наш механік і, напіўшыся, стаў цікавіцца рэвалюцыяй у Пецярбурзе. Каманда рэвалюцыйна прапела і

пакінула карабель. І мы апынуліся адны ў тумане. Вы есць прадстаўнік урада?

Рубцоў. Я есць пірат і, акрамя таго, магу агнявыя прамовы гаварыць.

Дэлагардзі *(у здзіўленні)*. О-о-о!.. Ваша краіна — загадкавая краіна.

Тым часам на набярэжную сыходзяцца запалоханыя і галодныя абывацелі з мяшкамі, кошыкамі, каляскамі. Яны баязліва шмыгаюць каля сцен, пазбягаючы сустрэчы з Рубцовым.

Домна-Разанда. Чужаземец! Пачастуй папяроскай. Колькі часу я цябе чакала!

Галасы абывацеляў:

— Тут! Сюды!

— Тут чужаземцы будуць белыя булкі раскідаць?

— Не чуў.

— Уу-у, скнара! А яшчэ інтэлігент!

— Мы будзем ірваць і хапаць булкі, а нас здымаць.

— Для замежнага кіно!

— Галодных і няшчасных жыхароў Пецярбурга!

Дэлагардзі паглядае на абывацеляў з жахам. Слаба адмахваецца рукамі і ад сваіх думак, і ад ашалелых, бадай звар'яцелых людзей.

Дэлагардзі. Пан Гетэерац, чаму вы не выходзіце?

Голас Гетэераца: Я пераапранаюся для прадстаўніцтва.

Галасы абывацеляў:

— Здымайце, калі ласка, хутчэй!

— Здымайце, пакуль увесь народ не збяжыцца!

Будзе таўкатня, запэўняю вас!

— Ім таўкатню цікавей здымаць, але нам будзе балець, чужаземцы. Мы галодныя і хворыя.

— Кідайце, калі ласка, хутчэй белыя булкі!

— Белыя булкі!

— Кідайце хутчэй белыя булкі!

Дэлагардзі. Мы ў блакаду возім і прадаём прадукты харчавання, дзе яго няма. Вось гаспадар карабля «Дракон».

Уваходзіць Гетэерац, у смокінгу і кацялку.

Галасы:

— Навошта тады хваліліся, што будзеце здымаць?

— А для чаго ў вас фатаграфічны апарат?

— Кідайце булкі!

— Булкі! Белыя булкі!

— Дайце нам булкі!

Гетэерац. Мы прыехалі гандляваць, а не раскідаць булкі. Мы не кінаапаратары і не пастары. Мы прывезлі ў Расію харчы, а за яго бяром жалеза, медны і чыгунны лом!

Рубцоў. Маю лом! Ідзі сюды!

Кісель. Ніхто табе такога не падкажа, як Рубцоў! *(Крычыць.)* Рубцоў, ёсць, зроблена, калі ласка!

Рубцоў падыходзіць да Гетэераца. Дэлагардзі абкружылі абывацелі.

Рубцоў. Друкарню купіш? Машыны бярэш?

Гетэерац. Сумленне не дазваляе нам купляць машыны без іх гаспадароў. Мы бяром толькі лом.

Рубцоў. Будзе лом. Ёсць і гаспадары. Бервяно маё? Маё. Выняць яго трэба? Выну. І цесляроў прывяду і механікаў. І наладзяць і друкарню разбяруць. Вось і ўся гаворка. *(Ідзе ў шаланду.)*

Кісель. Хто так з пакупнікамі размаўляе. *(Падыходзіць упрытык да Гетэераца.)* Нашы прапановы — мая, значыць, і Рубцова *(паказвае на былых гаспадароў)*, а гэтыя... так... для фармальнасці. Ты купляеш гэту друкарню як лом?

Гетэерац. Хто ж прадае спраўную друкарню на лом?

Кісель. Калі я гавару, значыць — маю паўнамоцтвы. Мы, можа, табе ўсе Расію на злом здадзім. Не засланяйце мне свет! Дайце мне прастору для перагавораў. Цяпер на Пецярбург імгла напаўзае, і Кранштат, таго і глядзі, скрозь, як Рубцоў, устане. А супраць Кранштата ніхто, апроч камуністаў, не пойдзе. Зразумеў? Грабілаўка і бітвы на вуліцах.

Домна-Разанда. Чужаземцы! Уцякайце, Дзяніска бяжыць!

Галасы:

— Кідайце булкі, пакуль не прыбег Дзяніска!

— Кідайце булкі!

— Дайце нам булкі!

— Падманшчыкі! Чаго стаіцё?

— Навошта абяцалі здымаць?

Рубцоў. Пойдзем, заграніца, скорадрукарню пакажу. На злом. А Дзяніска... Хто такі Дзяніска? Я любому Дзяніску ў морду дам, і заплюсне ён навекі свае вочы!

Д о м н а - Р а з а й д а. Закрый яму вочы, Рубцоў! Спыні Дзяніску! Абрыдлі мне Аладзьіны!..

Р у б ц о ў. І закрыю.

Натоўп шарахаецца. Прыбягае Д з я н і с к а. Натоўп раптам ператварыўся ў маленькую кучку людзей.

Д з я н і с к а. А чаму тут без справы столькі людзей? Параходчыкі, панове параходчыкі! Ёсць у вас дазвол апускаць якар каля нашай скорадрукарні?

К і с е л ь. Чужаземцы наехалі на бервяно з шаланды. Значыцца, у гэтым ёсць сэнс і дазвол, Дзяніс Арцёмавіч.

Д з я н і с к а. Кісель, не вучы! Калі чужаземец — у порт павінен зайсці. Мы друкарню павінны ў ход пусціць, а гэтая заграніца толькі перашкаджае, народ збірае.

Паволі клубіцца туман.

Г а л а с ы *(ціха, цераз усю сцэну):*

Туман! Ізноў туман!

— Фатограф! Здымай, пакуль туман не апусціўся!

— Кідайце булкі!

— Дайце булку, мы хочам есці!

Д з я н і с к а. Учора бочку фарбы сперлі, а сёння гарт, літары...

К і с е л ь. Можа, сам украў, а цяпер плявузгаеш.

Д з я н і с к а. Літары прапалі з зялёнай скрыні. Усю гаспадарку расцягнеце! Кісель, сцерва, і той у матросы падаўся. Скорадрукарня стала. Току няма. Мне ток трэба.

Кісель рагоча.

Д э л а г а р д з і. Мы не можам адчаліць. У нашым караблі бервяно.

Р у б ц о ў. Гэта маё бервяно.

Д з я н і с к а. Сячы бервяно і адыходзь у порт. Мне працаваць трэба. Я камендант скорадрукарні «Трох вятроў», і я ад імя камуны апошні раз пытаюся...

Д э л а г а р д з і. Я ж вам праўду сказаў, пан камендант. Мы ў тумане зайшлі ў канал і натыкнуліся на шаланду.

Р у б ц о ў. Хопіць, пагаварылі. Не чапай маіх знаёмых. Яны з-за граніцы пад маю руку прыехалі.

Д з я н і с к а. А-а, загаварыў!.. То-та вы, абаронцы, па Пецярбурзе клёшыкі распусцілі, а па Кранштаце языкі... Не перашкаджай працаваць! Марш на свой ка-

рабель, клёш! Чужаземцы — у порт! Таварышы рабочыя...

Р у б ц о ў *(перапыняе яго, спакойна абывацелям)*. Чужаземцы пачалі кідаць белыя булкі, грамадзяне!

Натоўп рынуўся, адціснуў Дзяніску, Кісель і Рубцоў іржуць.

Д з я н і с к а. А ты, Кісель, што там робіш у тумане?

Р у б ц о ў. Магілу табе робіць, Дзяніска.

Д з я н і с к а. Ой, зашпаклюю я табе свінцом. Кісель, павандраваў ты па белым свеце... Не варушыся, гад!

Контуры парахода знікаюць у тумане.

К і с е л ь. Бабахні ў туман, Дзяніска, бабахні! У тумане над Пецярбургам матрос. Ён ду-у-мае!

Д з я н і с к а. Зараз бабахну! Падыдзі бліжэй! Станавісь сюды! Разабрацца хачу!

Р у б ц о ў. У Няве разбярэшся, бывай! Няхай жыве Кранштат! Няхай жыве...

Д з я н і с к а. Выходзь!

У тумане стрэл, тупат, перапалох. Параход на нейкі міг асвятляецца агнямі, і пачынае гудзець сірэна.

Д о м н а - Р а з а н д а *(лямантуе)*. Канец камунізму!

Заслона.

ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

Вуліца перад скорадрукарняй «Трох вятроў». Далёкі гул гармат. К у р с а н т ы выкатваюць бліндзіраваную будку для кулямётаў. За вокнамі друкарні гоман.
Курсанты: М я с н о й, Л ы к а ў, П а ў л ю к.

М я с н о й. Каці яе на сярэдзіну вуліцы. *(Падыходзіць да дзвярэй.)* Эй! Тульскія, хто там яшчэ, падмагніце!

З дзвярэй скорадрукарні выходзяць А н д р о н а ў і П а ў л ю к.

А н д р о н а ў *(абураны)*. Таварышы, як жа так: мы будкі супраць кранштатцаў, а ў друкарні рабочыя вырашаюць пытанне: паслаць ім на беспартыйную канферэнцыю ў Кранштат дэлегатаў ці не пасылаць!

М я с н о й. Цішэй! Каці будку!

Андронаў. Маскоўскія курсы, ёсць чуткі, адмовіліся ісці на кранштатцаў, а чырвонаармейцы і зусім. Хай, кажуць, камуністычныя юнкеры ідуць, гэта пра нас так, пра курсантаў...

Паўлюк. Шаснаццатая дывізія, Расія-матухна — разгаворная рака.

Узмацняецца гоман у друкарні. Курсанты слухаюць. Размаўляюць: «А мы будкі... і калючы дрот...»

Андронаў. Толькі адны камуністы ідуць, кажуць, на Краншат.

Мясной. Сціхні! Яны *(паказаў на вокны)* хто? Пралетарыят? Пралетарыят. Ён у зацямненні? У зацямненні. Ён аслабеў? Аслабеў. І загадана нам: зброю не прымяняць супраць яго. Ясна? Страляць мы ў іх не можам. Ціха! З імі трэба ўсё па дамоўленасці. Такое маё палітычнае тлумачэнне. Я ўсё сказаў. Каці будку. Цягні дрот.

Уваходзіць Жыхарка.

Жыхарка *(пахмурны, стомлены)*. Курсанты, чырвоныя юнкеры, супраць каго будка? Супраць каго калючы дрот?

Мясной. Ціха, таварышы, каці!

Жыхарка. Пуцілаўскі завод забастоўку аб'явіў. Неўскі таксама. Маскоўскія курсы адмовіліся выступаць. Чырвоныя курсанты! Супраць каго кулямёты?

Мясной. Ціха! Пераходзь і ты, Жыхарка, у Краншат.

Жыхарка. А ў Кранштаце хто? Афіцэры? К афіцэрам піцерскія рабочыя дэлегатаў паслалі. Як ты думаеш?

Лыкаў. Паўлюк, адкажы яму, нешта мне сумна з ім спрачацца.

Паўлюк. Зіноўеў збяжыць, кранштацкія матросы на Неўскім вылезуць, вось тут і глядзі — афіцэры з'явяцца. Тут як тут.

Мясной. Ціха, чорт вас дзяры! *(Відаць, ён ледзь стрымлівае злосць.)*

Андронаў. А ты, грамадзянін Жыхарка, адыдзі. Ідзі ў памяшканне абурацца, не перашкаджай камуністам працаваць.

Жыхарка не кратаецца.

Мясной *(стрымліваючы злосць)*. Адыдзі!

Жыхарка. Не пайду. Бі мяне, галоднага і ашуканага, бі!

Мясной *(парываецца да яго з паднятым кулаком, але тут жа адступае назад)*. Эх ты! *(Люта.)* Х-харошы ты чалавек! Су... сучкаваты ты... с-с... сноп! Не можам мы біць пралетарыят! А каб хоць кропля была ў цябе буржуйскай крыві, я б з табой с-с... суседзе, пагаманіў...

Андронаў. Камуністы, ціха!

Падыходзіць Ганна Мацвееўна, Вольга, рабочыя. Ганна Мацвееўна — хударлявая строгая жанчына. Яна з усімі гаворыць спакойна, стрымана. Яна добра ведае сапраўднае жыццё, пазнала яго ісціны, але думае, што лепш не раскрываць перад чалавекам гэтыя ісціны. Яна з клункам у руках падыходзіць да ганка скорадрукарні. У дзвярах Вольга.

Ганна. А гарматы грукочуць.

Вольга. Ганна Мацвееўна, праўда, што Арцём з Харкава прыехаў?

Ганна *(спакойна глядзіць на яе і гаворыць задумліва)*. З вакзала толькі што гаварыў. У машыну, кажа, і да вас. Да мяне, значыць, у свой дом, дзеванька.

Вольга. У свой дом?

Жыхарка *(Вользе)*. Чуў я, што ён не мяне, а другіх, маладзейшых, у прыяцелі сабе выбраў. Вольга, ідзі ў друкарню.

Вольга. Мне не сорамна, тата. Ён каго захацеў, таго і выбраў сабе ў прыяцелі. Выбраў і прыяцеляў і ворагаў. *(Ганне Мацвееўне.)* Едзе Арцём Восіпавіч?

Ганна. А чаму ж яму не прыехаць?

Вольга *(падыходзіць да Жыхаркі)*. Я ведаю, тата, табе няёмка будзе сказаць, а ўсё-ткі перадай яму, Арцёму,— хай бы ён лепш спыніўся ў камуністычным інтэрнаце ў «Асторыі».

Жыхарка. І мне, Вольга, і табе гаварыць з ім няёмка. Бачу, бачу... *(Ён ходзіць і нервуецца, нібы прадчувае нешта нядобрае.)* Табе забараняюць пасылаць дэлегатаў у Кранштат. Табе твая партыя, дачка, забараняе...

Вольга. Якая партыя?

Жыхарка *(злосна)*. Арцёмаўская партыя... *(Адвярнуўся.)*

Вольга бярэ яго за плячо і працягвае да яго руку.

Нашто мне твая рука, калі ты сэрца на ганьбу і на смех пусціш. Я не скарджуся, дачка, а са злосцю адмаўляюся ад сяброў, ад друкарні, ад рэвалюцыі... і ад сябе... І Ар-

цём твой — воўк шалёны, хітры, гоніць ён нас... А ты можаш радавацца — ты з партыяй засталася!

В о л ь г а. У мяне ўжо няма партыі, тата. Дзесяць мінут таму была... *(Раскрывае рукі.)* Бачыш?

Ж ы х а р к а. Ну-у...

В о л ь г а. Шматкі... ад партыйнага білета. *(Кідае шматкі на зямлю, пад ногі курсантам.)* Вось што засталося ад маёй партыі. Каго хочаце дэлегатам выбраць?

Ж ы х а р к а. Лук'яна. Назло Арцёму пашлём яго сына ў Кранштат.

В о л ь г а *(усхвалявана)*. Лук'яна?.. Слухай, бацька...

Ж ы х а р к а. Слухаю, дачка.

В о л ь г а. Ты паглядзі на мае ногі. Што на іх?

Ж ы х а р к а. Туфлі на назе.

В о л ь г а. А калі я туфлі надзела? Месяц назад. А да таго — тры гады ў ботах. Пяць фунтаў вагі ў ботах. Па ўсіх франтах. Я простага і вернага кахання хачу, бацька. Зразумеў?

Ж ы х а р к а. Шкада мне цябе, Вольга. Цяжка табе.

В о л ь г а. Вернага кахання і каб душа адпачыла. Лук'ян зараз на Краснай Горцы. А Красная Горка першая будзе страляць па Кранштату... Не дам я вам Лук'яна ў Кранштат. Пасылайце каго хочаце. Не трэба мне ні Кранштат, ні камуністы.

Ж ы х а р к а. Лук'ян хаця і чырвоны камандзір, а наборшчык. Раён выбера, і паедзе твой Лук'ян у Кранштат. Цяжка табе, дачка? І мне не соладка.

В о л ь г а. Абрыдла мне кроў. Загадайце камісару Арцёму вярнуцца назад. *(Выходзіць.)*

Р а б о ч ы *(паказваецца ў дзвярах)*. Перапынак скончыўся. Зараз кандыдатуру абмяркоўваць.

Прыбягае Д з я н і с к а.

Д з я н і с к а. А вы ўсё звоніце тут наконт Кранштата. Я ўсе базары абшнырыў, гарт шукаў. А тут забег у паліграф... выдалі нам шрыфты...

Ж ы х а р к а. Навошта табе, Дзяніска, шрыфты? Што ты гэтым шрыфтам набіраць будзеш?

Д з я н і с к а. Я набяру. Здыхаць буду, а набяру. Я сёння ўвесь дзень бегаў і думаў: жыць трэба ямчэй, каб паміраць з прыемнасцю. Значыць, трэба рабіць, каб лёгкую смерць зарабіць. Вось мы і павінны...

Ж ы х а р к а. Ад голаду, Дзяніска, раней здохнеш, пакуль дачакаешся ёмкага жыцця.

Д з я н і с к а. Я ж не здохну. А калі буду здыхаць, дык гэтым шрыфтам набяру сабе ленту на вянок: «Дарагому і вясёламу Дзянісу Арцёмавічу Аладзыну ад удзячных таварышаў па службе».

Ж ы х а р к а. Блажэнны ён нейкі. Блажэнным толькі ў Расіі жыць. *(Выходзіць.)*

В о л ь г а. Ганна Мацвееўна, дэлегатам у Кранштат хочуць выбраць Лук'яна.

Г а н н а. Няма майго дазволу Лук'яну ехаць. І Арцём Восіпавіч не дазволіць. Душу маю хочаце на пакуты аддаць? Я цябе, Вольга Сяргееўна, разумею.

В о л ь г а *(заўважыла Восіпа)*. Ды гэта ж, здаецца, дзед прыехаў.

Павольна, азіраючыся, уваходзіць В о с і п М і р о н а в і ч.

Г а н н а М а ц в е е ў н а. Гэтага, гэтага з якога краю прынесла? Нам толькі яго і не ставала.

Курсанты з цікавасцю разглядаюць старога.

В о с і п М і р о н а в і ч. Мяне, нявестка, проста з Туркестана. Сем гадоў бадзяўся я па розных краінах. Засумаваў.

Г а н н а. Калі прыехалі, Восіп Міронавіч, то ўжо ідзіце ў хату, адпачніце. А мы Арцёма Восіпавіча чакаем.

В о с і п М і р о н а в і ч. Арцюшку? Даўно я яго не лаяў.

Г а н н а. Ідзіце ў пакоі.

В о с і п М і р о н а в і ч. Пайду, пайду. Усё як і сем гадоў таму. Хіба толькі Кранштат тады не бунтаваў і мяне ў такое дзела не ўблыталі. *(Чытае шыльду.)* Скорадрукарня «Трох вятроў». Прыгожа, нічога не скажаш. *(Курсанту.)* Не асмелілася Савецкая ўлада такую прыгожую назву перамяніць? Гаспадарамі тут раней былі пісьменнікі, паэты. Царства ім нябеснае.

В о л ь г а. Жывыя яны!

В о с і п М і р о н а в і ч. Бач, сволачы, уцалелі! Ну і жывучыя! Скорадрукарня «Трох вятроў». А якіх? Невядома.

Г а н н а. Гаспадары былі, дык працу шанавалі. Восіпу Міронавічу да саракагоддзя работы наборшчыкам...

В о с і п М і р о н а в і ч *(перапыняе)*. Дом дазволілі ў горадзе паставіць, далібог, вунь там. Ды нешта не відно яго. І дом! Глядзець агідна. Аднапавярховы, драўляны. *(З насмешкаю.)* Варта было сорак гадоў працаваць...

Г а н н а. Унукі твае ў доме жывуць, і ты, дзед, будзеш жыць. Я берагу дом.

В о с і п М і р о н а в і ч. Ну і добра! Я вясёлым стаў, проста надзіва. Адпачну. Мне даўно пара адпачыць. Рыбку палаўлю. *(Курсантам.)* У мяне, курсанцікі-рабяткі, тры жонкі было, палюбоўніц у мяне восем было, а колькі дзевак са мной пераспалі — і-і-і самому Ламаносаву не злічыць.

Г а н н а. Знайшоў чым хваліцца на старасці год!

В о с і п М і р о н а в і ч. Я жыць хачу смірна. Мне абрыдла ўжо бадзяцца. А ты, дзеўка, адкуль узялася? Можа, і ты — унучка?

В о л ь г а *(тужліва)*. Я — Вольга, Жыхаркі-друкара дачка.

В о с і п М і р о н а в і ч. Ці не Лук'ян твой хахаль? На мой век любоўных прыгод даволі. Не хачу! Ганна Мацвееўна, ідзі самавар стаў. Я з гераічным сынам маім, Арцёмам, чай піць хачу... Ты, дзеўка, не курыш?

В о л ь г а. Не.

В о с і п М і р о н а в і ч. Што? Парцейная?

В о л ь г а. Не, ужо не парцейная, дзед. З гэтай мінуты.

В о с і п М і р о н а в і ч *(строга)*. Твая справа, твая. Цяпер многія сумняваюцца ў партыі. Цэлы Кранштат нават. Іхняя справа. *(Курсанту Андронаву.)* Дай, курсант, прыкурыць.

В о л ь г а *(рашуча)*. Я табе, Ганна Мацвееўна, скажу проста: я павінна Лук'яна зберагчы пры сабе. Ты яго ўгавары не ехаць у Кранштат. А я табе, Ганна Мацвееўна, адкрыюся і аб Арцёму і аб Лук'яну.

Г а н н а *(з недаверам)*. Любіш Лук'яна?

В о л ь г а. Люблю.

Г а н н а *(спакойна)*. Дзе табе, Вольга, любіць Лук'яна? Душа ў цябе ваенная. У парахавой копаці твая душа, Вольга Сяргееўна.

В о л ь г а *(успыхнула)*. Ты мне не верыш. Дык я табе скажу, па кім я на франтах пакутавала...

Г а н н а *(строга)*. Што ты мне скажаш?

В о л ь г а *(адвярнулася)*. Не ўзяла ты маіх слоў, Ганна Мацвееўна. Ну што ж, крыўдуй на сябе. *(Адыходзіць.)*

В о с і п М і р о н а в і ч *(прыкурыўшы ў курсанта)*. А ты мае грудзі бачыў? Хочаш, от расхінуся, дык ты аслепнеш ад ордэнаў. У мяне іх, можа, шэсць іх, ордэнаў Чырвонага Сцяга і яшчэ іншых.

М я с н о й. Мы і так з пралетарыятам, дзед, ціхія.

Восіп Міронавіч. А ты — ці не Мясной? Ой, Ванька, які з цябе бугай вырас!

Ганна *(поркаецца ў салазках Восіпа Міронавіча)*. Трэба было соль прывезці, а не урук.

Прыбягае Дзяніска.

Дзяніска. Званіў! Бацька зараз прыедзе, Арцём Восіпавіч.

Вольга. Прыедзе, прыедзе. Вось што, Дзяніс...

Дзяніска. Галасаваць зараз пачнуць. Вольга, пойдзем на ячэйку. Нам трэба абмеркаваць. Лук'яна хочуць паслаць.

Вольга. Я не ў партыі ўжо, Дзяніс!

Дзяніска. Ты за Кранштат?

Вольга. Я за сябе!

Дзяніска. Ну і раёнчык! Ну і людзі! Забастоўкі, мітынгі, армія не хоча выступаць супраць Кранштата.

Жыхарка. Вольга, блазнуеш?

Вольга. Гэта вы блазнуеце, тры дні вырашаеце, далучацца вам да кранштатцаў ці не. Згарыце вы ўсе...

Дзяніска. Да ты што? З глузду з'ехала?

Восіп Міронавіч. Дайце перадыхнуць — не бачыце — задыхалася дзеўка.

Вольга. Зараз я за Рубцовым, мала таго, за Сямёнам Аладзьіным пайду. *(Просіць Дзяніску.)* Можа, ты скажаш камісару Арцёму, каб ён у гасцініцу вярнууся. Сорамна яму сюды ехаць!

Дзяніска. Ты што гародзіш? Кацiся... за Рубцовым! Сорамна! Сорамна бацьку са мной жыць?

Восіп Міронавіч. Меркаваў, што ў доблесным Пецярбурзе спакойна адпачну.

Вольга *(бацьку)*. Хадзем у друкарню.

Жыхарка *(вяла)*. Даволі табе пыхаць.

Вольга. А ты патух ужо?

Жыхарка. Шкада мне цябе. Ну, хадзем.

Гудзе машына.

Арцём прыехаў. Прывітаюся.

Вольга. Зразумей ты, не трэба табе сустракацца з Арцёмам.

Прыходзіць Арцём Аладзьін.

Мясной *(ціха)*. Жывей, хлопцы, камісар прыехаў. Ён зараз пагамоніць. Ён ім пакажа, як тры дні бузіць.

Арцём *(імкліва ўсходзіць на ганак. Прыслухоўваецца да гаманы ў друкарні).* Гудуць? Гамоняць? Вось, меншавічкі? А-а, Вольга! Баця! Здаровы! А мне перадавалі, што ў Піцер перакінулі. Ты на якім з'ездзе быў?

Восіп Міронавіч *(пачціва).* У нас не з'езд, а так — нарада. Дзеля гонару мяне больш паказвалі.

Арцём. Скромнічаеш?

Мясной *(таксама пачціва).* На з'ездзе партыі, вядома.

Арцём. З'езд партыі прыняў рэзалюцыю па кранштацкім пытанні... рашыў снарадамі на кранштацкія фарты... *(Прыслухоўваецца.)* Гу-дуць! Фарты бумажныя! І Сямён, кажуць, тут?

Дзяніска. Яшчэ няма, але чакаюць!

Ганна. На чаёк, калі ласка, Арцём Восіпавіч!

Арцём. А, жонка! Ну што ж? Чаёк — добра! А ты ўсё каля дома корпаешся, Ганна?

Ганна. І корпаюся. Берагу. Усё ў доме. Ты ж от харчоў не прывёз.

Восіп Міронавіч. Не да таго яму.

Вольга. Без харчоў цябе, камісар, сустрэнуць не радасна. Міравую рэвалюцыю абяцаеш, а людзям трэба жратва і ціхае жыццё, Арцём Восіпавіч.

Восіп Міронавіч. А я вудачкі захапіў, адпачыць. Рыбкі ў канале налаўлю, юшку якую зварганім.

Арцём *(суха).* Ну, ну, давай, баця! А мне, відаць, пад ільдом давядзецца лавіць. І на вуліцах лавушкі — кулямёты. Булкай пахне, дзед, белай булкай. *(Раптам са злосцю.)* У мяне камуну на белую булку не выменяюць. Меншавіцкі ў вас раён. Дрэнна змагаецеся!

Ганна. Ты, Арцёмка, солі б прывёз.

Арцём. Няма ў Харкаве солі, баба! Ваявалі, мала думалі пра соль.

Вольга. А за вас тут другія думалі, і не мала. Вось і атрымайце Кранштат.

Арцём. Вольга Сяргееўна, нешта ты па-іншаму загаварыла? То-та я гляджу... іду я па нашым завулку, гляджу я на сваю шаблю, дараваную, ганаровую, а яна нібы туманам пакрылася, слязой нібы. Не к дабру гэта. Відаць, на блізкага некага падніму яе. І падніму, не збаюся. Белай булкай з Кранштата пахне. Гляджу я на сваю родную друкарню, а па ёй шыльда: «Скорадрукарня «Трох ветроў». Гэта якіх такіх ветроў, баця? З Кранштата — адзін. Родны братухна Сямён нясе... Другі знутры, ад базараў...

Трэці вецер — блакады. Былыя гаспадары і чужаземныя караблі. І яшчэ — старыя пачуцці: каханне, туга...

Вольга. Гэта ўжо — чацвёрты. А тут — тры вятры.

Арцём *(рэзка)*. Хто на сходзе? Дружкоў я даўно не бачыў. Засумаваў. Добрыя хлопцы, ды цёмныя ў іх мыслі. Жыхарка...

Вольга. Ёсць, як жа. Чакае цябе, ідзі.

Арцём. Магін ёсць?

Вольга. А лепей бы табе павярнуць адсюль.

Арцём. Як твой бацька, Вольга? *(Насцярожана глядзіць на Жыхарку.)*

Вольга. Во ён каля цябе стаіць, пацалуйся. І магу прывесці табе новага дружка, Рубцова. З ім яшчэ пагамані. Хадзем, тата.

Жыхарка. Дай на яго паглядзець.

Арцём *(курсантам)*. Таварышы камуністы, паўтараю: Кранштат галантарэяй таргаваць не будзе. Мы гэтага не ўбачым. Мы пад лёд лепей. Пад лёд!

Мясной. Так точна, таварыш камісар!

Арцём *(узвышае голас)*. Няхай нас гоняць кранштацкія гарматы пад лёд, але матроса Сямёна Аладзьіна з белай булкай...

Ганна. А як жа самавар, Арцём Восіпавіч?

Арцём. Белую булку ім! *(Бяжыць у друкарню.)*

Восіп Міронавіч. Вялікія ў мяне ўнукі і грозныя ў мяне сыны. Пойдзем, бабы, чай піць... з урукам... *(Выходзіць.)*

Вольга. Рубцоў, Рубцоў! Сямён! Сямён! *(Бяжыць па завулку.)*

Дзяніска. Вольга, куды цябе панясло? *(Глядзіць ёй услед.)* Вольга, вярніся! Вярніся ты, пакамечаная твая душа! Эх!..

Уваходзіць Лук'ян. Глядзіць услед Вользе.

Лук'ян. Здароў, брат!

Дзяніска. Ты, Лук'ян, у Пiцер? Красная Горка хіба да Кранштата далучылася?

Лук'ян. Не.

Дзяніска. Тады, брат, адпраўляйся назад.

Лук'ян. Не паеду назад.

Дзяніска. Лукашок, любенькі, едзь назад, каб я не падумаў пра цябе дрэннага.

Лук'ян. Думай пра мяне дрэннае.

Д з я н і с к а. Бацька наш пра цябе што надумае, Лукашок!

Л у к ' я н. Хай думае, што хоча. Не паеду назад. Кранштатцы дэлегатаў да нас прыслалі. Камісар наш дэлегатаў прагнаў. Нам загадана страляць па Кранштаце. Я ў Кранштаце тры гады вучыўся, Дзяніска. Мне там усё родным стала. Смірноў там, Грышка, і Ягораў, Асіпчук, усе там... І дзядзька Сямён Аладзьін таксама там!..

Д з я н і с к а. Лупі па родных, Лук'ян!

Л у к ' я н. Я друкарам раскажу, што гэта правакацыя. Я растлумачу, чаму мы адмаўляемся страляць па Кранштаце.

Д з я н і с к а. Глядзі сам. А я, ведаеш, што табе параю: едзь назад. Не муці! У нас і так вада мутная.

Л у к ' я н. Не паеду я назад. Мы з хлопцамі абмяркуем.

Д з я н і с к а. У друкарні Арцём.

Паўза.

Л у к ' я н. Прыехаў? А дзе Вольга? З ім?

Паўза.

Д з я н і с к а. Прыехаў. Ідзі ў друкарню.

Паўза.

Л у к ' я н. Не пайду я ў друкарню.

Д з я н і с к а. Спалохаўся. З бацькам баішся гаварыць?

Л у к ' я н. Я зараз хацеў бы счэзнуць. Не хачу я бацьку слухаць. Мне трудна яго слухаць.

Д з я н і с к а. Зайздросна?

Л у к ' я н. Не хачу я... аб'едкаў у каханні. Я сваё жыццё за народ таксама ахвяраваць магу. І смялей, як ён. Мне камісар на Краснай Горцы сказаў: «Гайда ў крайнюю батарэю, бі, Лук'ян! Мы табе верым! У цябе бацька — Арцём Аладзьін». А ён за саўнаркомаўскія пайкі, Арцём. Я цябе люблю, Дзяніс, ты другім не перашкаджаеш. *(Сыходзіць з ганка.)*

Д з я н і с к а. А навошта мне перашкаджаць? Кожны дзівак па-свойму робіць.

Уваходзіць А р ц ё м.

А р ц ё м. Здароў, Лук'ян!

Лук'ян маўчыць.

А мне гаварылі, ты з Краснай Горкі Кранштат абстраляў. А можа, здалі Красную Горку? Ці мо на іх бок перайшлі? Ці не з'явіўся ты нас агітаваць? Ідзі ў наборную, прапануй!

Лук'ян. Не пайду!

Арцём. Ідзі, сынок, запрашай, я Чэка зваць не буду. Дрэйфіш?

Лук'ян. Я дрэйфлю? Я?..

Арцём. Ідзі, калі не дрэйфіш, ідзі, пагамані.

Лук'ян. І пайду. Я тваіх слоў не баюся, я сам магу словы гаварыць. Мне дрэйфіць? *(Ускочыў на ганак.)*

Арцём *(адчыняе дзверы)*. Праходзь, сынок. Дзяніс, ты пачакай тут хвілінку. Кранштацкія дэлегаты ідуць.

Прыходзяць Рубцоў, Сямён Аладзьін, за імі ідуць пераапрануты Кісель, потым Вольга. Прыйшлі, маўчаць.

Сямён. Я — рэвалюцыянер, свабодны чалавек і матрос свабоднага Кранштата. Што тут за мура? Курсанты! Далоў камісараў! Рабочыя, далоў лубяншчыкаў з аўтамабіляў! *(Адкрычаўся. Паўза.)*

Арцём *(Рубцову)*. А ты хто такі? Што табе трэба?

Рубцоў. Я за свабодныя Саветы. Без камуністаў. Я прадстаўнік...

Кісель выходзіць з-за яго спіны.

Кісель. Мы прадстаўнікі!..

Сямён *(працягвае руку да дзвярэй)*. Брат! Прапусці!

Арцём *(вымае рэвальвер)*. І ты, Кісель... прадстаўнік? Дык вам хочацца выгнаць мяне на лёд, прадстаўнікі?

Рубцоў. Прапусці!

Арцём. Пачакай хвілінку, Рубцоў.

Вольга *(паказвае на рэвальвер у Арцёма)*. Вось вам лубянскія метады ўгавораў.

Сямён. Думаеш, баюся тваёй кулі?

Арцём. Ведаю, што не баішся. Адыдзі, Сёма! У нас друкарскія клопаты. Ступай на свой карабель.

Сямён. Мой карабель тут. Таварышы! Бі чэкістаў!

Бягуць на Арцёма. Арцём страляе. Сямён упаў як мёртвы.

Восіп Міронавіч *(разгублена, Ганне Мацвееўне)*. Што ж гэта творыцца, Ганна Мацвееўна? Што тут творыцца?

Г а н н а *(атарапела, спалохалася).* Не перашкаджай Арцёму Восіпавічу... гаварыць...

Уваходзіць Л у к ' я н.

Л у к ' я н. Перамог, Арцём Восіпавіч, радуйся. Пастанавілі дэлегата ў Краншат не пасылаць.

А р ц ё м *(хавае рэвальвер).* Увесь раён?

Л у к ' я н. Аднагалосна.

Паўза. З друкарні выходзяць р а б о ч ы я.

А р ц ё м. Правільна! А табе, Рубцоў, што цяпер тут рабіць? Ідзі!

Р у б ц о ў *(Жыхарку).* І ты, Жыхарка, галасаваў супраць мяне?

Ж ы х а р к а. Раён аднагалосна, а я куды супраць раёна...

Р у б ц о ў. Та-ак... *(Вользе.)* Бойкі гэты «жалезны» камісарчык, бойкі!

А р ц ё м. Ну, хопіць! Пагаманілі. Бывай, Рубцоў! *(Паказаў на труп Сямёна.)* Брата хаваць трэба — і мяне судзіць. Бывай!

Р у б ц о ў. А ты б стрэльнуў і ў мяне. Ты пайком заткнуў ім глотку, а мне б таксама — куляй.

Д з я н і с к а. Ідзі, Рубцоў!

Р у б ц о ў. На голадзе, сабака, спекулюеш. Курсантам паёк павялічыў. *(Рабочым.)* Таварышы, Арцём друкарню чужаземцам прадае. Ён прыехаў глядзець друкарню.

Д з я н і с к а. Брэшаш, брэшаш!

Р у б ц о ў. А заўтра камісія прыедзе. Убачыш — ці брахаў я. Праз тры дні чужаземцы друкарню заграбуць...

Д з я н і с к а *(абураны).* Мясной, ты бліжэй, удар!

Мясной б'е Рубцова па твары.

В о л ь г а *(бяжыць у друкарню).* Таварышы, краншатцаў б'юць. Друкарню прадаюць чужаземцам! Арцём брата забіў. Кулямёты супраць вас! Сюды!

Выбягаюць усхваляваныя р а б о ч ы я.

Р а б о ч ы я:

— Каму друкарню?

— Чужаземцам!

— Нас на Краншат, а друкарню на пракорм курсантам.

А р ц ё м. Таварышы! Гэта паклёп!

Вольга. Ён гаварыў: бі, бі Рубцова, курсант!

Дзяніска. Вольга!

Мясной *(разгубіўся)*. Я яму толькі зубы... Ён мне, клёш гэты...

Рубцоў. Так, я клёш, а ты, курсант, пад лёд ідзеш. Ты мне зубы... *(Ледзь прыпаднімаецца.)* Камісары мне зубы. Я магу і без зубоў. Я за свабодныя Саветы! Я за свабодны гандаль! Я магу і без зубоў гаварыць. *(Жыхарку.)* Забаяліся паёк страціць? Сёння ён вас за хлеб купіў, за паёк, а заўтра вас на Краншта, а друкарню — за граніцу. На злом! Усіх вас, к чарцям, у лом! Ён брата прыкончыў, а цяпер чарга за вамі, таварышы!

Убачылі труп Сямёна.

Голас з натоўпу. Далоў Арцёма!

Другі голас. Выбірай дэлегатаў!

Рубцоў *(Жыхарку)*. А ты спалохаўся, што камісар з тваёй дачкой спаць не будзе? Ды не турбуйся, пераспіць. Не пагрэбуе пасля сына. Пасля Лук'яна.

Лук'ян. Цыц, сучка! Што ты гаворыш! Пры чым тут Вольга?

Рубцоў. Пры целе, а можа, і пры душы. Ты на бацьку свайго цыкай, а не на мяне. За мяне тут... таварышы. Верна?

Галасы:

— Верна!..

— Верна!.. Апастылелі!..

Жыхарка *(усхапіўся)*. Таварышы! Камісар нам замарочыў галаву. Трэба паслаць яго да ўсіх д'яблаў і выбраць дэлегатаў у Краншта.

Рубцоў. Таварышы! Жыхарка мае рацыю. Выбірайце Жыхарку дэлегатам. А Лук'ян будзе бацьку пільнаваць.

Арцём. Таварышы! Вы ўжо прынялі рашэнне. Я прашу слова!

Рубцоў. Ніякага табе слова няма! Я цяпер прыдсядацель. Я не даю табе, Арцём Аладзьін, слова! Я за свабодны гандаль! Страляй у мяне! *(Паказвае на плячо.)* Тут у мяне германская куля... *(Стукае ў грудзі.)* Вось тут белагвардзейская. *(Паказвае на скроню.)*. А вось тут твая будзе, камісар. Пуляй! Што? Кішка тонкая! Не асмелішся ты стрэліць у мяне!

Арцём хоча гаварыць, але яму не даюць. Поруч з Рубцовым становіцца Кісель.

Хто за тое, каб пасляць дэлегатаў у Кранштат?

Паднімаюцца рукі.

Жыхарку! Хто за Жыхарку? Хто супраць?

Некалькі чалавек: Ганна, Восіп Міронавіч і Дзяніска падымаюць рукі.

(Глядзіць на іх і рагоча.) Аднагалосна! Пішы мандат! Жыхарка едзе дэлегатам ад рэвалюцыйнага Петраграда. Няхай жыве рэвалюцыйны Кранштат! Далоў народных камісараў! За свабодны гандаль! За...

Галасы: Ура-а!..

Домна-Разанда *(прыбягае)*. А я пазнаёмілася з інастранцамі! Канец камунізму!

Рубцоў. Цыц, курва!..

Заслона.

ДЗЕЯ ДРУГАЯ

Друкарня. У цемнаце можна разлічыць захутаныя ў рагожу машыны. Вялізная люстра звісае са столі. Яна асвятляецца тонкай васковай свечкай. Свечка мігае. Восіп Міронавіч кідае ў печку папяровыя абрэзкі. У глыбіні сцэны відаць шырокая лесвіца па другі паверх, з пляцоўкамі і нізкімі балясамі. На другім паверсе — інтэрнат для рабочых. Там жа расквартараваны і курсанты.

У пачатку дзеі з вуліцы ўсходзяць па гэтай лесвіцы па адным курсанты; яны нясуць белыя халаты. Насустрач спускаецца Жыхарка.

Ганна. Можна на стол збіраць, Арцём Восіпавіч? Печ мы горача натапілі.

Арцём *(холадна)*. Збірай. *(Жыхарку.)* Ідзеш? Даўно я па-харошаму, за чаем, з вамі не гутарыў, а, Сяргей? *(Жыхарка маўчыць.)* Ты, Сяргей, не крыўдуй. Трэба было ўстараніць матроса. Наш раён важны. Друкарня забастуе, могуць і яшчэ заводы далучыцца. Дзе Грушнікаў?

Жыхарка. Грушнікаў сказаў: «Я камісарскі чай піць не пайду».

Арцём *(сумна)*. Аднаму мне, выходзіць, піць чай?

Жыхарка *(зларадна)*. Відаць, аднаму. Нешта ты ў дружбу гуляць пачынаеш, камісар.

Арцём. Адпілі мы чаі з Грушнікавым. *(Задумліва.)* Юсупаў таксама не прыйдзе.

Жыхарка. І Юсупаў.

Арцём. І Магін?

Жыхарка. І Магін.

Арцём. Мала ў мяне сяброў засталося. Адпугнуў. І ты, Жыхарка, са мною чай піць не будзеш?

Жыхарка маўчыць.

Мала ў мяне сяброў. Мала засталося.

Жыхарка. Мала, камісар.

Уваходзіць Лук'ян.

Арцём. Лук'ян, кліч сюды Дзяніску.

Лук'ян *(са злосцю)*. Сам пакліч! Крыкні! Ён і прыйдзе. Ты крычаць умееш. На пяць паверхаў горла хопіць. Мне сорамна на цябе глядзець, шалёны.

Арцём. Ідзі, прывядзі яго сюды. *(Задумліва.)* Мала ў мяне сыноў.

Паўза.

Лук'ян. Мала.

Арцём *(цвёрда, раздзельна)*. Прывядзі, кажу, Дзяніса, Лук'ян!

Лук'ян. Навошта табе Дзяніс?

Вольга. Не вядзі, Лук'ян. Не слухайся!

Лук'ян *(падыходзіць да яе)*. Матрос праўду сказаў? Спала?

Вольга. З Домнай-Разандай і то так не размаўляюць. Абразай сваёй мяне не здзівіш. Пусці!

Лук'ян *(адводзіць яе і таропка гаворыць)*. Зараз курсанты цюкі белых халатаў наверх прынеслі. Маскіровачныя. А я знаю, што ты падумала. Ты думаеш — гэта саваны для камуністаў. Думаеш, што дошак на дамавіны не хапае, дык беспартыйная Расія спускае камуністаў пад лёд, у мора.

Вольга. Ты, здаецца, таксама камуніст, Лук'ян?

Лук'ян. Ты пра Арцёма думаць не можаш — гэта я дарэмна крычаў. Ты і размовы з ім забыла.

Вольга. Забываю.

Лук'ян. Ты ў Кранштат ідзеш таму, што зняверылася ў камунізме. У блакадзе мы жыць не можам больш.

В о л ь г а. Твая праўда. Цяжка жыць у блакадзе.

Л у к ' я н. Ты думаеш, што і Рубцоў — нішто сабе хлопец... у іх, у кранштатцаў, ёсць вера...

В о л ь г а *(зацікаўлена)*. Значыць, ты са мной пойдзеш? *(Глядзіць на Лук'яна задумліва.)* Якая ж цвёрдасць ёсць у цябе, Лук'ян? Хацела б я ведаць.

Л у к ' я н. Гэта я пра цябе і твае думкі.

В о л ь г а. А... толькі пра мае думкі?

Арцём падыходзіць да Лук'яна і нахіляецца да яго.

А р ц ё м. Холадна тут чакаць, Лук'ян Арцёмавіч. *(Лук'ян нехаця выходзіць.)* Чаго ж ты чакаеш, Сяргей Іванавіч? Ідзі ў Кранштат, а то нашы гарматы пачалі крышыць лёд, у палонку трапіш... Ідзі.

Ж ы х а р к а. Што ж ты адказаў на матроскія словы, Арцём Восіпавіч?

А р ц ё м. Прамаўчаў.

Ж ы х а р к а. І часта табе даводзіцца гэтак маўчаць?

А р ц ё м. Рэдка, Сяргей Іванавіч.

Ж ы х а р к а. Вось і еду дэлегатам, Арцём Восіпавіч.

А р ц ё м. Відаць, трэба ехаць.

Ж ы х а р к а. А там, глядзіш, і на лёдзе сустрэнемся, Арцём Восіпавіч.

А р ц ё м. І не разміёмся.

Ж ы х а р к а *(спускаецца з лесвіцы)*. Ты застаешся, Вольга?

В о л ь г а. Я?.. Так. Я даганю цябе.

Ж ы х а р к а. Цяжкі ў цябе характар, Арцём Восіпавіч. Я ніколі не думаў, што прыйдзецца табе сказаць такое... А скажу...

А р ц ё м *(перапыняе)*. Цяжкі, так. Гавары, ну!..

Ж ы х а р к а. Бывай, кажу. Бывай, сабака.

А р ц ё м. Бывай! Па рабочых мы не страляем.

Ж ы х а р к а выходзіць.

В о с і п М і р о н а в і ч *(ніяк не можа зразумець сына, гаворыць павольна)*. Я з прыяцелямі рэдка сварыўся, а тут жа — з маленства. А дзеля цішыні, я мяркую, часам трэба і з прыяцелем разысціся.

А р ц ё м. Ніколі не мірыся, калі пасварыліся, бацяю Ты чаго, Вольга, засталася?

В о л ь г а. Я пакахала Лук'яна, Арцём Восіпавіч.

А р ц ё м. І я нават заўважыў: падоўгу глядзіш ты на яго. Лук'яну каханне трэба, ён слабы. Любі.

В о л ь г а. Ён не слабы. І Лук'ян мяне любіць. А ў цябе сэрца каменнае, ты чалавека раздушыць можаш. Маё каханне для цябе нічога не варта было.

А р ц ё м. Цяпер цяжка зразумець.

В о л ь г а. У мяне ў жыцці асталося адно толькі: Лук'ян.

А р ц ё м. Любі. Не сёння, дык заўтра я паеду. І паеду далёка.

В о л ь г а. Паедзеш? Назаўсёды?

А р ц ё м. На лёд паеду, Вольга. У мяне дарога тая вялікая... ледзяная... па моры. А ты мяне збочыць хочаш. Другою ты стала, Вольга. На мора ты не пойдзеш. Вецер там халодны, і ў шаўковых панчошках ой як цяжка.

В о л ь г а. І Лук'яна ты загубіш. Я яго толькі ўтрымаць магу.

А р ц ё м. Трымай мацней. *(Паўза.)* Любі і трымай.

В о л ь г а. Задушы ты мяне лепей, Арцём.

А р ц ё м. Не, ты толькі паслухай яе, баця. Ёй пяшчотная душа трэба, песенькі разам пець. Рана яшчэ вальсы пець. *(Паказвае на другі паверх.)* Халаты вунь там падрыхтаваны.

В о с і п М і р о н а в і ч. Я пайду, Арцём. Вы без мяне лепей у сваіх справах разбярэцеся.

А р ц ё м. А ты пасядзі, баця. Ты — бацька, і ты павінен бачыць, як твой сын размаўляе. От яна гаворыць: «Забі мяне!»

В о л ь г а. І заб'еш.

А р ц ё м. Табе дужа хочацца знаць — заб'ю ці не заб'ю. Пэўна, жыццём бы заплаціла за такое знаццё. Люблю ці не люблю? А так і не дазнаешся. Пайду. Моўчкі пайду. Не варта было табе вяртацца сюды, Вольга. Запрашалі цябе на Урал, і табе трэба было — узяць боты і ехаць... Хлопцы там свае, моцныя, ведаюць цябе даўно...

В о л ь г а. Ад кахання да цябе, камуніст, думаеш, паеду? На Урал?

А р ц ё м. Лук'ян цябе любіць? Так, як ты хочаш? Не. Лук'ян толькі самога сябе любіць. Вось ён засмуціўся, калі пачуў, што я з табою жыў, а зараз, пэўна, і смутак свой палюбіў, і сябе, гаротнага.

В о л ь г а. Не Дзяніску ж мне любіць?

А р ц ё м. Дзяніску? Дзяніска — мой нашчадак.

В о л ь г а *(насцярожана)*. Нашчадак, Арцём?

А р ц ё м. Дзяніс скора друкарню ў спадчыну возьме, машыны, усё тое, чаго я не паспеў зрабіць.

Вольга. Голыя сцены яму дастануцца.

Арцём *(задумліва)*. Дзянісу трэба каля машыны быць. Восіп Міронавіч машыны любіў, заўсёды да машын вяртаўся. І я любіў гэтыя... *(паказаў рукой навокал.)* Плоць і кроў тут наша. А Дзяніска іх любіць больш, як хто з нас. Я сваю любоў на баявыя машыны перанёс, на кулямёты, на гарматы. З гэтымі машынамі мне цяжка расставацца, а бой ёсць апошні, Вольга.

Вольга. Ці апошні?

Арцём. Для мяне — апошні, Вольга. Разумею.

Вольга. Знаеш, не тое вы друкуеце, што людзям патрэбна. Злосць вы друкуеце, а не любоў.

Арцём. Табе любві хочацца?

Вольга. Хочацца.

Паўза.

Арцём. Паедзем, Вольга, са мною ў «Асторыю». Спаць.

Вольга *(атарапела)*. Ты гэта навошта... ты чаму мне такое гаворыш? Ты мне што такое гаворыш? Лук'ян, Лук'ян! *(Выбягае.)*

Арцём. Чаю, відаць, і праўда — трэба выпіць.

Восіп Міронавіч. Я людзей асуджаць не люблю. Але ты, Арцём, стаў вельмі нехарошы. Я цябе сам судзіць хачу.

Арцём. Судзі.

Восіп Міронавіч адзявае акуляры. Чыкільгае к сыну. Сеў насупраць яго і ўважліва глядзіць сыну ў вочы. Абодва маўчаць.

Восіп Міронавіч. Я от аганьку прыбаўлю ў печы, у жалезнай. Не столькі для цяпла, як для святла.

Арцём не вытрымлівае паядынку вачамі, схіляе галаву, хавае вочы. Потым устае і выходзіць. Уваходзіць Дзяніска. У зялёнай скрыні перабірае гарт.

Дзяніска. Недарма тут Кісель круціцца...

Восіп Міронавіч. Што там у цябе ў скрынках?

Дзяніска. Снарады. Літары. *(Пераходзіць да машын.)* Такая машына. На такой машыне колькі каляндароў можна выпусціць! Або кніжкі, падручнікі. Па хіміі, напрыклад, запушчу... я падручнік. Хімія ёсць навука, якая вывучае... *(Сіліцца прыгадаць, што ж вывучае хімія.)* Металы вывучае, вывучае... машыны розныя...

Восіп Міронавіч. Ломіць Вольга Арцёмаву сілу, а ці зломіць?

Дзяніска. От каб такую машыну пусціць, яна б табе цэлае вяселле замяніла б. Грукату колькі, песня! Або геаграфічныя карты друкаваць. Тут табе Амерыку запусціць зялёнай фарбай, а Расію — аранжавай, ды ў аранжавую капнуць малінавую, а гарады чорнымі кружочкамі, а ад кружочкаў — чыгуначныя дарогі. А якім бы колерам чыгуначныя дарогі?

Восіп Міронавіч *(нібы прачнуўся.)* Што ж гэта я? Сяджу і маўчу. *(З'едліва.)* Ля печкі сяджу. Слухаю. Што ж, мне і сказаць няма чаго? Я сорак гадоў працаваў. А цяпер ля печкі? Так жыць нельга, Восіп Міронавіч! Так ні за грош прападзеш! *(Злуе, кідае ў печку абрыўкі паперы.)*

Дзяніска. А машыны стаяць, іржавеюць. Дах цячэ. Во, ізноў капае на гэту машыну. І тут іржа есці пачала. *(Выцірае анучай.)*

На парозе з'яўляецца Мясной.

Мяне згубіце, а машыны я вам не дам губіць. Здохну каля іх, але Рубцову іх...

Мясной. Ты чаго тут раскіпеўся? Дзе тут Арцём Аладзьін?

Восіп Міронавіч. Навошта табе Арцём Аладзьін? Я бацька яго. Я магу за яго адказваць.

Мясной. Адказваць не можаш. Яму пакет са штаба. Прызначаюць яго к нам, тульскім курсантам, камісарам нібыта. Дэлегаты з'езда партыі кожную часць суправаджаюць.

Восіп Міронавіч. Калі такое прызначэнне выйшла?

Мясной. Я пакуль што... Але чуткі такія ходзяць.

Восіп Міронавіч. Ну, чуткі розныя могуць быць. Ідзі цераз двор на агеньчык, дома Арцём Аладзьін. Ідзі. І я хутка туды прыйду. Так і скажы!

Мясной. Слухаю! *(Выходзіць.)*

Восіп Міронавіч. Вось так! *(Самому сабе.)* Пагрэўся, і даволі. *(Выходзіць.)*

На лесвіцы паказваюцца Лук'ян і Вольга.

Лук'ян *(з адчаем).* Я іду ў Кранштат. Вольга, вядзі мяне да Рубцова.

Вольга. Ну, ідзі к Рубцову!

Лук'ян. Ты, Дзяніс, не слухай бацькі. Ён насміхаецца з мяне. І з цябе насміхаецца.

Дзяніска. Няхай! Ён — бацька!

Вольга. Арцём мне сказаў...

Лук'ян. Мы павінны гаварыць Арцёму, а не ён нам. Я скажу Арцёму. Я ведаю, што яму сказаць.

Арцём *(уваходзячы.)* Ану, паслухаю, што ты скажаш Арцёму, сынок. *(Мясному.)* Дай сюды пакет! *(Бярэ пакет.)* Лук'ян, ты прывёў Дзяніса? Прывёў, пытаюся, Дзяніса? *(Уважліва прыглядаецца да Дзяніса, той адвярнуўся.)*

Лук'ян. Не бачыш? Прывёў.

Арцём. Прывёў? Добра. Мне трэба Дзяніс. І не па сардэчных справах, а пра справах камуны. *(Глядзіць на гадзіннік.)* У дзевяць сорак адыходзіць поезд на Араніенбаўм, да Краснай Горкі. Мясной, правядзі камандзіра Аладзьіна Лук'яна да поезда.

Лук'ян. Я не паеду! Я страляць па сваіх не буду!!!

Арцём. Дзяніс, мне прыслалі паперу. Тут падрабязна распісана, у якім парадку будуць выступаць дружыны рабочых на абарону Петраграда. Набяры і надрукуй восем тысяч экземпляраў. Заўтра вечарам за імі прыедуць. Наша друкарня не бастуе. Мы працуем, Дзяніс Аладзьін.

Дзяніска. Машыны замерзлі. Току няма. Я колькі разоў прасіў падключыць нас да гарадской сеці. *(Са злосцю.)* Не падключылі.

Арцём. Добра, я папрашу сёння ўключыць друкарню ў ток. Магчыма, к абеду заўтра паспееш надрукаваць, таварыш! *(Рэзка.)* Наборы павінны быць гатовыя, машыны змазаны і фарба разагрэта, таварышы!

Дзяніска. Калі і дадуць ток, усё роўна няма каму працаваць. Ты пасварыўся з сябрамі — з Глушнікавым, Жыхаркам... Няма каму ля машын стаць. Як мне рабіць? Шрыфты прывёз, а не разбіраюць.

Арцём. Гэта твой клопат. Заўтра, к абеду... Не, раніцай прыйдуць за адозвай... Лук'ян! Ты яшчэ тут?

Лук'ян. Я не паеду! Астаюся!

Арцём *(усім)*. Я сёння іду на Кранштат з тульскімі курсантамі.

Лук'ян *(здзіўлены)*. Баця... Ты ў суд павінен ісці.

Арцём. Калі вярнуся. А ты аставайся. Бывай, Вольга. Не ўдалося мне паспаць з табою. Абяцаў я табе. Прыйду — выспімся ўволю.

Вольга. Арцём Восіпавіч, калі я давала згоду з табою спаць?!

Арцём. А хіба не згодна? Тады мне, відаць, пачулася. Даруй, Вольга. Моцна ты любіш Лук'яна, я бачу. Ну, адпачывайце, разам аставайцеся!

Вольга. Ён хлусіць, Лук'ян. Я з ім і не гаварыла... Ён заўсёды маніць, Лук'ян. Ён ад гонару, ад гордасці! Ён бачыў, што я цябе люблю.

Дзяніска *(разглядае арыгінал)*. Ды тут не дзесяць слоў, а пяць старонак. Хто іх будзе набіраць?

Лук'ян. Ты мяне асіліць хочаш. Ты ў мяне, бацька, дзяўчыну вырваў, ты мне свае аб'едкі падсунуў. І ў вайне аб'едкі!

Арцём. Падсунуў.

Лук'ян. Ну, я пайду! Я табе, Арцём, пакажу сваю смеласць.

Вольга. Лук'ян! Ты зараз забудзь сваю гордасць. Ты ідзі са мною, Лук'ян. Я цябе прашу, Лук'ян. Усё роўна ты не адважышся па сваіх страляць, Лук'ян!

Лук'ян. Я і ў цябе цяпер страляць магу, баця! Не толькі па Кранштаце. Я ў цябе...

Арцём. Страляй, калі загадаюць.

Лук'ян. Пабачу я яшчэ, хто з нас смялейшым акажацца!

Арцём. Ну-ну! Мясной, правОдзь камандзіра.

Вольга. Лук'ян! Хлусіў ён пра мяне, нагаварыў!

Лук'ян з Мясным выбягаюць.
Усе прыселі перад дарогай.

Арцём *(выглядвае за дзверы)*. Адліга. Вецер. Харaство. І чужаземцы. Праход вартуюць. Трэці вечар ліхтар гайдае. Ну што ж, вартуйце. Нява паднімаецца.

Вольга *(абяссіленая)*. Арцём Восіпавіч, ты няхораша зрабіў.

Арцём. Вецер мацнее. Добры вецер, цёплы, у твар. А на душы магільны холад. У такі вецер па лёдзе ісці цяжка.

Вольга. Ты абышоўся з ім подла, Арцём Восіпавіч.

Арцём. Паперу для адозвы вазьмі сінюю, Дзяніс. Заўтра сонца ўзыдзе вясновае. На сонцы сіні колер далёка відзён. Расклеюць іх на заводах...

Вольга. Скажы свайму бацьку, Дзяніс, што ён падлюга.

Арцём. Бывай, Дзяніс. Маці? Што ёй сказаць? Яна

дом зберагчы павінна. Калі выберу час заскочыць развітацца — прыйду. А дзед наш дзе? Дзе дзед?

Вольга. І твой бацька скажа: ты падлюга, Арцём. Што ж ты маўчыш, Дзяніс? Скажы бацьку, Арцёму Восіпавічу.

Арцём. Ну, скажы, Дзяніс!

Вольга. Гавары, Дзяніс!

Дзяніс маўчыць. Паўза. Арцём надзявае шапку. Глядзіць на сына і ўсміхаецца.

Арцём. Дык я скажу, каб уключылі ток, Дзяніс.

Дзяніска. Скажы, хай уключаць, Арцём.

Арцём. Бывай, сынок!

Дзяніска. Бывай, баця!

Арцём пайшоў. Вольга стаіць каля дзвярэй, глядзіць у цемнату, затым рашучым крокам выходзіць праз другія дзверы.

Каго ж пазваць з наборшчыкаў? *(Чытае арыгінал.)* «Рабочыя і работніцы Петраграда! Міжнародныя бандыты, азлобленыя падбухторшчыкі цёмных мас»... Вельмі доўга, але складна. *(Крычыць.)* Грушнікаў! Да рэала! Арыгінал атрымалі!

ДЗЕЯ ТРЭЦЯЯ

Базар на набярэжнай. Унізе — шаланда, з яе тырчыць бервяно, за шаландай відаць борт парахода «Дракон». Вышэй — каменная лесвіца, яшчэ вышэй — руіны дамоў.

На бервяне ў акружэнні самавараў, блакітных шынялёў, дываноў, парцьераў усеўся Рубцоў з сякерай ў руках. Кісель з музейным мушкетам у руках тут жа, поруч. Натоўп спрабуе праравацца з лесвіцы на шаланду.

Стары з Будай *(Рубцову).* Грамадзянін, а вось прадаецца статуя Буды. Многа золата на кантах і іншых месцах.

Рубцоў. Партсігара залатога няма?

Абывацель у сурдуце. Я магу вам прапанаваць, пан Рубцоў, кушэтку з чырвонага дрэва.

Рубцоў. Чаго?

Абывацель у сурдуце. Кушэтку. Ну... іначай — канапу.

Р у б ц о ў. Я хачу партсігар.

Ч а л а в е к з ц ы л і н д р а м і в а з а й. Фарфор Напалеона прапаную, рэдкія талеркі, вялізныя місы.

Ж а н ч ы н а з в е е р а м. Веер прэзідэнта Рузвельта.

Р у б ц о ў. Праходзь! *(Цераз галовы абываценяў паказвае пальцам у натоўп.)* А ў цябе што?

С т а р э н ь к а я. Брусельскія карункі. Карункі «Дзюшэс». *(Трасе ахапкам карункаў, у роспачы.)* Фунт карункаў за паўфунта сыру.

Р у б ц о ў. Чаго?

С т а р э н ь к а я. Сыру, грамадзянін.

Р у б ц о ў. А какаву не хочаш, фря? Праходзь!

З'яўляецца Д э л а г а р д з і.

Д э л а г а р д з і *(у адчаі)*. Грамадзянін Рубцоў, вада ў канале прыбывае.

Г а л а с ы н а б а з а р ы:

— Вы чуеце — прыбывае вада?

— У нас ужо затапіла падвалы!

— Кажуць, навадненне...

— Вы чуеце, вецер?

Вецер даносіць далёкія гукі маршу.

Д э л а г а р д з і. Грамадзянін Рубцоў, вецер гоніць ваду.

Р у б ц о ў. Лухта. На моры яшчэ лёд.

Уваходзіць Г е т э е р а ц.

Г е т э е р а ц *(рэзка)*. Вада ідзе, неабходна адрэзаць бервяно, пан штурман!

Р у б ц о ў. Мне няма калі. А для чаго мне бервянопіліць?

Д э л а г а р д з і. Мы патонем! Вы абяцалі абрэзаць бервяно, прывесці людзей адрамантаваць параход. А вы гандлюеце.

Г е т э е р а ц. Неабходна сёння пагрузіць друкарню.

Р у б ц о ў *(паказвае пальцам цераз натоўп)*. А ў цябе што там за клубкі? Часам не сінія ніткі?

А б ы в а ц е л ь з п а п у г а е м. Гэта рэдкая дзіковінка. Афрыканскі папугай, так званы...

Р у б ц о ў *(адвярнуўся)*. Не патрабуецца...

Д э л а г а р д з і. Вы атрымалі ад нас кансервы, Рубцоў!

Р у б ц о ў *(агрызаецца)*. Ну, атрымаў! Што ты мяне папракаеш кансервамі? Ты абяцаў паўтараста банак, а

даў дзесяць. Вось і атрымай работы роўна на дзесяць бляшанак.

Д э л а г а р д з і *(у натоўп)*. Грамадзяне, ці не стане хто-небудзь да помпаў? Вада наступае!

Натоўп шарахаецца.

Г а л а с ы з н а т о ў п у:
— Навадненне! Навадненне!
— Гэта краншτатцы разбілі гарматамі лёд!

Б а б у л ь к а. Краншτатцы наступаюць! На слупах расклеены афішы — камуністы рашылі, перад тым як уцячы, наладзіць варфаламееўскую ноч...

С т а р ы з Б у д а й. Грамадзянін Рубцоў, мне неабходна прадаць Буду і пастарацца выехаць да варфаламееўскай ночы...

Р у б ц о ў. Прадасі яшчэ, паспееш!

А б ы в а ц е л ь. Яны прыслалі жалезнага камісара з курсантамі! Ён разганяе базары і рыхтуе...

Г а л а с ы:
— На які дзень прызначана варфаламееўская ноч?
— На сёння!
— А вакол Пецярбурга выступае вада...
— Вунь, глядзіце! Глядзіце!

Усе глядзяць за поручні лесвіцы.

— Ды гэта лужына!
— Не! Гэта навадненне!

Р у б ц о ў. Слухайце, лярвы! Стаўлю надзейны плыт з найлепшых бярвенняў — за залаты партсігар! Ну, распакоўвайце куфры!

Прыбягае В о л ь г а.

В о л ь г а. Бомбу яшчэ не прынеслі?

Р у б ц о ў. Паслаў. Апасля.

В о л ь г а. Рубцоў, бомба не трэба. Друкарню ў лом чужаземцам здаваць не трэба.

Р у б ц о ў. Та-ак.

В о л ь г а. І як толькі мог бацька перабрацца сюды з Краншτата?

Р у б ц о ў. Праз маё пасрэдніцтва ўсё можна.

В о л ь г а. Не давай Жыхарку бомбу. Я ўсю ноч бадзялася па вуліцах і думала, думала. На Краншτат ідуць усё новыя і новыя часці.

Р у б ц о ў. Цяпер думаць позна. Трэба дзейнічаць. Як

толькі апошнія субчыкі са Смольнага змыюцца, курсанцікаў апошніх на лёд выпусцяць, піцерскія казармы апусцеюць — ну, тут я і выкачуся. Грамадзяне за мяне, базар за мяне... Жыхарка за мяне, а хто супраць мяне? Помнікі хіба на праспектах супраць мяне? Дык і помнікі звергну!

Вольга. А друкарню падключаюць у электрычную сетку!

Рубцоў. Чорта лысага падключаць. Гэта я вас падключаю ў такую сетку... *(Падзывае пальцам Кісяля.)* Кісель, цягні сюды бомбу. Ды пранюхай, дзе тут бліжэйшы гараж — на выпадак чаго нам трэба захапіць спраўную машыну.

Вольга *(вельмі здзіўленая)*. Рубцоў, ды ты ж дурны і пусты! І ты, напэўна, нават не з Кранштата?

Рубцоў. Прызнаюся, што Сямён Аладзьін быў прагрэсіўнейшы за мяне.

Галасы з базару:

— Міліцыя!

— Не, гэта жалезны камісар!

— Жалезны камісар на варфаламееўскую ноч!

— Курсанты!

— Курсанты з жалезным камісарам!

Чуваць музыка. Натоўп разбягаецца.

— Не, гэта курсанты на лёд!

— Павярнулі!

Натоўп ізноў збіраецца.

Жанчына з веерам *(Рубцову)*. Можа, купіце страусавы веер? Гэты веер некалі належаў прэзідэнту Рузвельту, славутаму калекцыянеру...

Рубцоў. Не, мне ён без патрэбы. Мне партсігар...

Уваходзіць Восіп Міронавіч.

Восіп Міронавіч. Здароў, матросік!

Рубцоў. Здароў, вандроўнік!

Восіп Міронавіч. Быў некалі вандроўнікам, а цяпер я — Восіп Аладзьін. Ты мяне да Арцёма правядзі.

Вольга. Яны хочуць прадаць друкарню на лом. А Жыхарка прыехаў кінуць бомбу ў Арцёма! А мне не трэба змоў, я сама, адна спраўлюся!

Рубцоў *(хапае Вольгу)*. А ты, дзеўка, ты не будзь правакатарам. Парадачак наводзіць... А то я цябе і пры

народзе ўгробіць магу з мілай душой. Заткніся! Кісель! Падавай!

На грузавіку Ж ы х а р к а.

Ж ы х а р к а *(з грузавіка)*. Грамадзяне! Камісары ўцякаюць! Троцкі ўцёк, Зіноўеў ужо ў Маскве! «Асторыя» апусцела. Схадзіце праверце. Таварышы! Хто за свабодныя Саветы без камуністаў, хто за свабодны гандаль?

Р у б ц о ў. Эй, вы! Паглядзіце на сябе, як вы гандлюеце, што мышэй, вас ганяюць. Няхай жывуць свабодныя Саветы!

Паказваецца К і с е л ь.

Г а л а с ы:

— Сапраўды ж — нас ганяюць...

— Далоў міліцыю!

— Свабодны гандаль!

Р у б ц о ў *(Кісялю, паказваючы на Жыхарку)*. Перадай!

Б а б у л ь к а. Нам белых булак, белых булак трэба.

Ж ы х а р к а. Таварышы, зараз да нас далучацца заводы, раёны...

З'яўляецца Л у к ' я н з матацыклам.

Р у б ц о ў *(да Кісяля)*. Давай, калі загадваюць!

Кісель перадае пакунак Жыхарку.

Л у к ' я н. Праўда, што Арцём Восіпавіч у Харкаў збег? Спалохаўся, уцёк?

В о с і п М і р о н а в і ч. Лук'ян, ты іх не слухай!

В о л ь г а *(Лук'яну)*. Ён ідзе ў Краншатат. Ты ўцёк з Краснай Горкі?

Л у к ' я н. Ой, во! *(Восіпу Міронавічу.)* Дзядуня! А мая душа аказалася мацнейшай за арцёмаўскую душу. У мяне храбрасці болей. Я стаяў адзін, і я сказаў хлопцам з Краснай Горкі... *(Крычыць.)* Ты слухай. Я ім скажу... Усе вы баязліўцы, трапло!

Г а л а с ы з н а т о ў п у:

— Варфаламееўская ноч!

— Пачынаецца варфаламееўская ноч!

— Камісар!

— Ідзе жалезны камісар з курсантамі!

— Панове, панове, а як жа мой Буда?

Марш мацнее. Тупат конніцы. Свіст. За поручнямі лесвіцы відаць

nikі курсантаў. Базар сціхае, музыка таксама. На лесвіцы з'яўляецца Арцём і за ім некалькі курсантаў у белых халатах. На шаландзе Жыхарка і Рубцоў.

Жыхарка. Атрымай сваё, камісар! *(Кідае пакунак.)*
Вольга. Бомба!

Натоўп шарахаецца. Паўза. Арцём падымае пакунак. Лук'ян, выхапіўшы рэвальвер, бяжыць да Жыхаркі.

Лук'ян. Арцём! Баця! Што з ім рабіць?

Арцём. Не чапай яго, Лук'ян. Ён гэтую бомбу ў сябе кінуў. *(Курсантам.)* Камуністы! Курсанты! Не зважаючы на ўсякія крыўды, грубасці, зброю не прымяняць! *(Спускаецца з лесвіцы, ідзе да Жыхаркі, а той хоча схавацца за бярвеннем.)* А ты, Жыхарка, не хавайся, я цябе не арыштую і страляць у цябе не буду. На лёдзе ты хацеў са мной сустрэцца?

Жыхарка. І сустрэў бы! Стаўляй да сценкі, пара!

Арцём *(з ціхай злосцю)*. Ану, згінь з маіх вачэй! Пайшоў вон з рыззём! *(Паказаў на руіны.)* Хавайся ў руіны, калі сам з руіны ператварыўся.

Жыхарка знікае. Рубцоў хаваецца.

Арцём. Матацыклет, сынок, прадаеш? А ты, Вольга, чым гандлявала, можа, Лук'янам?

Лук'ян. Ты на лёд, баця?

Арцём. На лёд, сынок, на лёд ідзём, на Кранштат паміраць. Павінны ж тыя, там за лёдам, кранштацкія, зразумець, за што мы ідзём на льды... і паміраем. Зразумеюць, сынок, а?

Лук'ян. Я табе свае слова скажу і распараджэнне перадам.

Арцём. Пачакай, паспееш. Дэлегатаў прывезлі з Дзесятага з'езда партыі, з Масквы. Цывільных многа, слабенькія, у акулярах. Даручылі цывільным весці курсантаў. А з фартоў матросы. *(Чуваць стрэлы.)* Чуеш, гэта з Кранштата ў дэлегатаў, у лёд, а ад снарадаў — пелькі... А дэлегаты так і коцяцца ў палонку, ды пад лёд... ды і канец! Захар Захаравіч, прыяцель мой з Харкава, аматар піва, мірны чалавек, і ў сне ніколі не бачылася яму, каб вадзіць салдатаў на фарты крэпасці з лёду браць, а павёў. І бярэ! І возьме! А можа, пад лёдам ужо. *(Паўза. Глядзіць на Лук'яна.)* А ты, Лук'ян, ізноў Краснай Горцы здрадзіў? Уцёк?

Лук'ян. Я не ўцякаў.

Вольга. Ты збіраешся перабегчы ў Кранштат, Лук'ян?

Лук'ян *(не павярнуўся да Вольгі, а выструніўся перад бацькам)*. Я, Вольга, не даваў табе згоды ісці ў Кранштат. Я прыехаў з Краснай Горкі таму, што маю прызначэнне на Тульскія курсы да Арцёма.

Вольга. Значыць, не па майму слову прыехаў, Лук'ян?

Арцём. І я такі загад атрымаў, Лук'ян. *(Паўза.)* Ты, Вольга, харошая, але Лук'яна табе лепей і не затрымліваць, шкодная ты для яго. Слабая ты, прытамілася.

Вольга *(Восіпу Міронавічу)*. Я праз яго друкарню пакінула! Я жыццё сваё рассыпала, як шрыфт. І душа ў мяне, як збітая літара, сляпы шрыфт... У пельку галавой, ці што?

Восіп Міронавіч трымае яе за рукі.

Восіп Міронавіч *(Арцёму)*. А яна і праўда скочыць можа і памерці. Як вы чалавека слухаеце? Хіба так трэба чалавека і яго пакуты слухаць? О, божа!..

Арцём. А ты рашай, Вольга. Чаго тут доўга мучыцца? Бывай, бацька!

Восіп Міронавіч *(разгубіўся)*. Ты гэта з Лук'янам, значыць... Ты гэта куды?

Арцём. Паміраць, тата. Даруй, калі крыўдзіў чым.

Восіп Міронавіч. Ты такія размовы кінь... Страху ў цябе няма перад бацькам. *(Усё зразумеў, адчуў, што не тыя словы цяпер гаворыць, і ўсміхнуўся.)* Не магу я цябе судзіць. Праўда твая, Арцём. *(Курсантам.)* Салдацікі, рабяткі, курсанты, ды ён жа ідзе з вамі...

Паўлюк *(скрозь слёзы)*. Сам я вясковец... і таксама...

Андронаў. Не можам мы супраць пралетарыяту...

Арцём. Тульскі баец! Не хныкаць!!

Восіп Міронавіч. Курсанцікі!.. Ці многа мне ўцехі трэба на зямлі! У цемры жыве народ. Для чалавека галоўнае — яснасць мець у душы. Хоць маленькую, але яснасць.

Арцём. Лук'ян! У строй! Я сына вяду ў бой. А трэба будзе — я і Дзяніса ахвярую.

Восіп Міронавіч. Чыгунны ў цябе розум. Дзяніса не чапай, не чапай, кажу!

Арцём. Дзяніс будзе чакаць да старасці, сто гадоў будзе чакаць, аж пакуль камісар, такі ж, як я, пройдзе па

Еўропе і па Азіі. Мне цесна ў Расіі, і, здаецца, не стрывае маё сэрца — чакаць! Гарыць у мяне сэрца, да бою гарыць... Я сваё сэрца краштацкім ільдом нясу схаладзіць. Дзяніса вам пакідаю. І шаблю мне хочацца вам пакінуць. *(Глядзіць на шаблю.)* Не шкада шаблю пакідаць. Курсанты, налева кругом!..

Курсанты пайшлі.

Вольга *(бяжыць за Арцёмам)*. Арцём, пастой!

Арцём. Надумалася?

Вольга. Не, ты паслухай! *(Вельмі шчыра.)* Я цябе любіла, Арцём, і нікога так любіць не буду. Цяпер бачу — твая душа лепшая за маю, выдуманую, твая сапраўдная. Многа гора ты мне прынёс, ды і я табе, відаць, яшчэ больш. Дык вось, я табе зараз скажу: проста і апошні раз — не злуй на мяне і развітайся са мной без злосці. *(Падае яму руку.)* Бывай і даруй! Я забыла, што ідзе рэвалюцыя. Загадай мне чакаць цябе.

Арцём. Бывай, Вольга. Дзякуй табе за спакой. *(Цалуе яе ў лоб.)* Бывай, тата!

Вольга *(падае руку Лук'яну)*. І ты не злуйся, Лук'ян! Бывай!

Лук'ян *(адвярнуўся, не падаўшы рукі)*. Бывай!

Падае снег. Арцём выходзіць. Яна махае яму рукой і павольна ідзе следам за курсантам. Гарніст. Марш. Тупат сціхае.

Рубцоў *(вылезшы, да Кісяля)*. Вось як вучыся гаварыць! А ты якую мне бомбу прынёс?

Кісель *(здзіўлена)*. Якую бомбу? Масла сметанковае табе прынёс. Па тваймУ заказу.

Рубцоў. Я табе загадваў бомбу прынесці!

Кісель. Не прадавалі бомбаў.

Рубцоў. Трапло! Канспіратыўнай мовы не разумееш. Але я ўсё роўна праврвуся! Цяпер, Кісель, вядзі справу да канца!

Кісель. Мне малая справа.

Рубцоў. Апошніх курсантаў павялі. Арцём на лёд пайшоў. Пойдзем і ў першую чаргу скорадрукарню ліквідуем, арцёмаўскае гняздо.

Кісель *(паслухмяна)*. Ліквідаваць, можна і ліквідаваць. Пачалі з шаланды, а кончым, відаць, Ісакаўскім саборам.

Выходзяць.

С т а р ы з Б у д а й *(выкатвае Буду на калясцы).* Варфаламееўская ноч, грамадзяне, пачынаецца, пэўна, не з гэтага базару. Скарыстайце выпадак, купіце за бясцэнак бронзавую статую Буды.

Натоўп ізноў пачынае запаўняць набярэжную.

Г а л а с ы:
— А можа, яны пайшлі акружаць базар?
— А можа, яны ловяць нас?
— Хто нас ловіць?
— Жалезны камісар.
— Гэтага старога тут пакінулі, каб ён пералавіў нас...

С т а р ы з Б у д а й. А калі паціху ды цераз руіны — дамоў? Я ж казаў, што будзе варфаламееўская ноч. За бясцэнак прадаецца статуя Буды. Колькі золата на кантах і на іншых месцах. Можа, купіце, грамадзяне? Прадаю за бясцэнак.

Заслона.

ДЗЕЯ ЧАЦВЁРТАЯ

Друкарня. Ноч. Цёмна. Чуваць гул кананады. Каля акон на чамаданах сядзяць ч у ж а з е м ц ы з затануўшага карабля «Дракон». Каля іх сумны Р у б ц о ў. Н е к а л ь к і к у р с а н т а ў спускаюцца па лесвіцы. Рабочыя насустрач ім нясуць плахі. М а г і н, К р у ш н і к а ў і В о л ь г а корпаюцца каля наборнай дошкі. Д з я н і с к а стаіць каля машыны недалёка ад Рубцова. Ж ы х а р к а з вінтоўкай каля машыны.

Г е т э е р а ц *(Рубцову паказвае на рабочых).* Гэта па вашай віне яны расцягваюць дошкі з майго карабля.

Д э л а г а р д з і. Ваша краіна — цяжкая ёсць краіна.

Г е т э е р а ц. Затапілі мой параход. Маім параходам паляць у печы, і ніхто не саграваецца.

Р у б ц о ў *(сумна, не верачы ў свае словы).* Дайце мне маё слова сказаць рабочым раёна. Я цяпер рэвалюцыянер. У мяне таксама маёмасць патанула разам з шаландай. Я цяпер свабодны!

В о л ь г а. Даволі трапацца, Рубцоў. Прыйдзе Арцём, літасць вымалім перад рэвалюцыяй.

Р у б ц о ў. Гэта я? Літасць? Не, ты пазвані ў камендатуру, хай мне пропуск па горадзе выдадуць. Што мне тут — глядзець, як Дзяніска набірае? Ды як вы яму памагаеце? *(Насмешліва.)* Наборшчыкі! Друкаваць будзеце. А ток ёсць? Як пусціце машыны? Уручную будзеце круціць машыны?

В о л ь г а. Будзем!

Д з я н і с к а *(са злосцю).* Сядзі ціха, Рубцоў, пакуль я цябе патрулям не здаў! *(Пазірае на гадзіннік.)* Праз пяць мінут ток дадуць. Праз пяць мінут падключаць у сетку. *(Вользе.)* Ты пазвані, падгані іх, а ты, Рубцоў, пасядзі, палюбуйся.

Вольга падыходзіць да тэлефона.

Р у б ц о ў. Мне надакучыла любавацца дурнямі.

В о л ь г а. Змоўкні, Рубцоў!

Р у б ц о ў. Ой, якая цвёрдая! Ой, якая моцная! Ты яшчэ загадай свайму бацьку расстраляць мяне... Бачу, баец вінтоўку трымае. Цьфу! От зараз базар уварвецца, от зараз беспартыйная Расія прыпрэ!

Ж ы х а р к а. Набіраць перашкаджаеш.

Р у б ц о ў. Ну, прыстрэль мяне, калі перашкаджаю.

В о л ь г а *(па тэлефоне).* Група А... Дваццаць чатыры восемдзесят шэсць. Алё! Алё!

Р у б ц о ў. Крычы, крычы! І з электрастанцыі камісары паўцякалі. Маўчаць там? Крычы мацней! Святла захацелася, Арцёма сустракаць пры святле. Кранштатцы вам дадуць святла!

Д з я н і с к а. Цыц-ц! Замацавалі раму?

М а г і н. Замацавалі.

Д з я н і с к а. Апускай набор у машыну.

М а г і н. Ды навошта апускаць, калі... святла...

Д я н і с к а *(бяжыць па лесвіцы).* Я кажу, будзе святло!

Р у б ц о ў. Досвітак будзе, а не святло.

Д з я н і с к а *(крычыць).* Жыхарка, хадзі сюды!

Ж ы х а р к а *(падыходзіць да машыны).* Я пастаўлю набор. *(Апускае набор у машыну.)* Ну!.. Вольга будзе накладваць!

Д з я н і с к а *(падбягае да тэлефона).* Ток зараз будзе. Ало! Група А... Дваццаць чатыры восемдзесят шэсць! Ало! *(Збянтэжана азіраецца.)* Бач, тэлефон сапсаваўся, маўчыць. Ток зараз будзе!

Уваходзяць Г а н н а і В о с і п М і р о н а в і ч.

Ганна. Ад Арцёма Восіпавіча вестак няма?

Дзяніска. Зараз, мама, будуць весткі.

Рубцоў. Світае. Ноч кароткая. *(Глядзіць у акно.)* Хутка рэвалюцыйнаму грамадзяніну і народу можна будзе паказацца. А вунь і Кісель народ вядзе.

Восіп Міронавіч ля акна.

Восіп Міронавіч. А гарматы грукочуць, усё грукочуць...

Кісель. Заблытаўся ў тумане Піцер наш... Ты, заграніца! Наабяцалі? Гані манету! А не, дык пусцім вас у туман... А так усё ж такі да лому будзеце прымацаваны і пражывеце...

Гетэерац. У нас няма грошай.

Дэлагардзі. Як хораша жыць на радзіме!

Домна-Разанда. Каго грабіце?! *(Рубцову.)* Мяне грабіце! Мне абяцалі выезд. А вы ізноў на булыжнік мяне паложыце.

Дзяніска *(па тэлефоне)*. Начальніка... начальніка... Камісара электрастанцыі. Мне абяцалі... Ало! Ало!

Рубцоў. Сяджу я, маўчу я, і ўсё па майму прадказанню выходзіць. Горад ашалеў, камісары драпаюць, ільды расступаюцца.

Дзяніска *(у трывозе)*. Вольга, можа, і на самай справе ў лом здадуць?

Вольга. Пачакаем Арцёма, Дзяніска...

Рубцоў. Скарыся, як твой дзед скарыўся. Сціхні. Друкуй, што я табе дыктаваць буду!

Восіп Міронавіч. Мяне ў лом здаваць? Мяне? Ды дзе ж у вас сапраўдныя душы? Як мне на вас глядзець?

На вуліцы аўтамабільны гудок. Расчыняюцца дзверы, і ўбягае Лук'ян з крывавай павязкай на галаве, з арцёмаўскай шабляй у руках.

Лук'ян. Э, і цяпер скажаце, што я ўцёк! Уся наша рота а-а-ах! *(паказвае рукамі ўзрыў)* — і пад лёд. Лыкаў, сюды! Лыкаў!

На лесвіцы паказваецца курсант Лыкаў.

Лыкаў, па загаду...

Лыкаў. Арцёма Восіпавіча...

Лук'ян. Не перапыняць камандзіра! Я цяпер — ка-

мандзір! Смірна-а! *(Размахвае шабляй.)* Вось загад! Мяне на месца Арцёма!

Г а н н а. А Арцём Восіпавіч... дзе ён, Лук'ян?

Л у к ' я н. Мяне замест Арцёма. Я загадваю. Сабраць усіх, увесь рэзерв! На вакзал, зараз жа на грузавікі!

Л ы к а ў. Слухаю! *(Выходзіць.)*

Пакуль будзе ісці наступная сцэна, па лесвіцы спускаюцца і не спяшаючыся выходзяць праз дзверы к у р с а н т ы.

Л у к ' я н. Усіх выганяй! Рабочыя дружыны выганяй! Адозвы, Дзяніска... Парадак выхаду рабочых атрадаў... Дзе? Надрукавалі?

Г а н н а *(ад сполаху павысіла голас)*. Ты што ж гэта Арцёмавым голасам загаварыў, Лук'ян? Дзе ж Арцём... Восіпавіч?

В о с і п М і р о н а в і ч. А з Арцёмам што... унучак? Калі ён прыйдзе?

Л у к ' я н. Во-о... шаблю выкінуў!

Паўза.

В о л ь г а *(з жахам)*. Дзе Арцём?!.

Л у к ' я н *(толькі цяпер зразумеў жахлівасць усяго, што здарылася, апускаецца на табурэт і прыпамінае)*. Ідзе ён па лёдзе і ўвесь час на мяне азіраецца... *(Раўніва ўскрыкнуў.)* Думаў, напэўна, адстаю! А мае боты коўзаюцца... У яго боты з падкоўкамі былі...

Г а н н а *(схапіла загрудкі Лук'яна і крычыць яму ў твар)*. Як «былі»? Арцём... Восіпавіч...

Л у к ' я н *(не слухае)*. Снарады — у лёд... у лёд... Палонкі... А ў палонцы абозы, гарматы, людзі... А з берага яшчэ ідуць, абыходзяць палонкі... А снарады з Кранштата... Арцём ідзе, азіраецца. А потым як *(паказвае рукамі выбух)*, як уу-у-х-х-хне! І Арцём...

Г а н н а. Пад лёд!

Л у к ' я н. Пад лёд, мам, пад лёд. Вынырнуў. Рукі на льдзіне коўзаюцца. Падняў ён рукі, і ў руках шашка. Так ён мне без слоў пад ногі шашку выкінуў.

В о л ь г а *(прыхінулася да машыны)*. Памёр Арцём, тата! Ніякіх слоў мне ад яго не пачуць і думак яго ніколі не спазнаць. *(Плача.)*

Ж ы х а р к а. Верны быў народу чалавек... Так і загінуў... *(Перахрысціўся.)*

В о с і п М і р о н а в і ч. Памёр Арцём Восіпавіч. *(Падыходзіць да Лук'яна, падымае шаблю і глядзіць на яе.)*

Строгі быў чалавек Арцём і ласкавы быў сын. Ганаровай смерцю памёр. Дзяніс, ідзі сюды, Дзяніска, падыдзі да мяне... *(Дзяніска падыходзіць да дзеда.)* Я вось думаў, нельга цябе пускаць, Дзяніска, на лёд. А выходзіць... Дастань мне, Дзяніс, з кашаля маўзер. *(Лук'яну, цвёрдым, памаладзелым голасам.)* Аб'яві тульскім... Восіп Міронавіч Аладзьін і ўнук яго Дзяніска на лёд пайшлі!

Л у к ' я н *(выструніўся)*. Слухаю, дзед.

Паступова, спачатку аранжавым святлом, а потым — белым, разгараюцца лямпачкі люстры. На лесвіцы з'яўляецца ж а н ч ы н а з заспанымі вачыма. Са здзіўленнем яна крычыць: «А ў калідоры святло загарэлася». Але жанчыну ніхто не слухае. Па лесвіцы ў друкарню спускаюцца р а б о ч ы я, сонныя, расхлістаныя. З падвала паказваецца м а н ц ё р, запэцканы, брудны. Ён збянтэжаны, усміхаецца. Люстра ззяе яркім святлом. Людзі стаяць нерухома. Ж ы х а р к а падымаецца на прыступку друкарскай машыны.

В о с і п М і р о н а в і ч. Давай халаты і шынялі. Развітайся з маці, Дзяніс. *(Ганне.)* Бывай, нявестка, так і не адпачыў у цябе...

Г а н н а. Каму ж берагла свой дом, Восіп Міронавіч? Куды ты зводзіш Дзяніску? Дом жа мой пусты...

В о с і п М і р о н а в і ч. Відаць, і быць яму пустым, нявестка.

Г а н н а. Міма пустых акон хадзіць мне, Восіп Міронавіч. Арцём Восіпавіч учора праз сенцы ішоў. Цёмна было. Спатыкнуўся ён і кажа: ступенькі прыбраць трэба, чаго добрага і галаву зломіш. Печ, кажа, дыміць, замазаць трэба. Я і ступенькі прыбрала, і печ замазала, а для каго? Дзяніс, адступаюся я, не трэба мне дом!

Д з я н і с к а. Як жа табе не трэба дом, мама?

Л у к ' я н. Мам, мы вернемся і тады...

Г а н н а. Не патрэбен вам мой дом, не ў яго вы вернецеся. Аднаму Арцёму Восіпавічу верыла. А ён цела сваё пад ільдом схаваў. Нават мёртвым не захацеў ляжаць у сваім доме. Ці ж вам, дзеткі, вярнуцца дадому? Другія ў вас будуць дамы. Іншая любоў. Не ў доме была мая праўда, памылілася я.

Ж ы х а р к а *(падыходзіць да машыны)*. Выстукаць набор, ці што?

Д з я н і с к а. Выстукай!

Жыхарка друкуе.

Л у к ' я н *(падыходзіць да Вольгі)*. Я ў сабе, Вольга, шмат цяпер сілы адчуваю. Я ўсё бацьку дараваў. *(Падае Вользе руку.)* Гордасць у мяне вялікая, а ўсё ж...

В о л ь г а *(пацiскае яму руку).* Я руку табе, Лук'ян, падаю, каб развiтацца. Пустая мая рука. Горшая за тваю. Не быць iм разам, Лук'ян, гэтым рукам. Арцём маёй душой валодаў i — целам. Паўгадзiны назад сядзела я цiхамiрная, як Ганна Мацвееўна, i думала: буду Арцёма чакаць. Доўгiя гады чакаць. Дом, можа, збудую i чакаць буду. Зразумее ён маё каханне. *(У скрусе махнула рукой.)* Трэба iзноў боты шукаць... салдацкiя... *(Iдзе па лесвiцы.)*

В о с i п М i р о н а в i ч. Час табе на лёд, Лук'ян. Горача табе тут, супакоiцца трэба.

Л у к ' я н. Я iду. Дзянiс, ты гатовы?

Д з я н i с к а. Так, я даўно гатоў. Толькi пяць хвiлiнак, толькi пяць мiнутак пачакай. Пускай.

Ж ы х а р к а. Зараз фарбу накатаю... Валiкi прымерзлi, не пойдзе!

Д з я н i с к а. Пойдзе! Друкуй замерзлымi валiкамi. Уключай!

Ж ы х а р к а. Я ўключу. Але за паломку — ты ў адказе.

Д з я н i с к а. Адкажу!

Лук'ян зрываецца з месца, бяжыць да Дзянiскi.

Л у к ' я н. Ты мяне пад суд падводзiш, як баязлiўца. Пайшлi!

Д з я н i с к а. Пяць мiнут... пяць мiнут. Зараз паперу ў машыну пакладуць. Жыхарка! Кладзi!

Вольга з ботамi ў руках i з клункам спускаецца ўнiз па лесвiцы. Яна глядзiць з сумам, як бацька яе корпаецца каля машыны.

Ж ы х а р к а. Вольга, палажы торбу. Станавiся да машыны, накладвай!

Д з я н i с. Якую табе вiну i перад кiм загладжваць?

В о л ь г а. Паеду на Урал. Русь вялiкая. *(Iдзе да выхаду.)*

Д з я н i с к а. Ану, круцi махавiк, круцi! Пайшла!!. Чэснае слова, пайшла!

Ж ы х а р к а. I праўда, пайшла, курва!

Г а л а с ы:

— Зрушылася.

— Пай-ай-шла!

Некалькi рук пачынаюць круцiць махавiк, ён скрануўся i паволi пачынае круцiцца. Дзянiска астаецца адзiн каля махавога кола. Ён свiшча, скача, рукамi паказвае, як круцiцца кола. Махавiк круцiцца ўсё хутчэй i хутчэй пры абсалютнай цiшынi.

Д з я н і с к а. Ну, гавары цяпер, Рубцоў! Цяпер я табе дазваляю сказаць слова, збітая ты літара!..

Р у б ц о ў. Я магу сказаць! Я сказаць не збаюся. Мне яшчэ апошняе слова Кранштат прадаставіць. А зараз... *(Збянтэжана азіраецца, паказваючы на Дзяніску.)* Тут ворагі... *(На чужаземцаў.)* Тут дурні... Каму мне гаварыць? Я пайду! Кісель!

К і с е л ь. І ідзі. Людзей мог дурыць, на злачынства мог падбіваць, цяпер сядзі і рві на сабе валасы. А я даўно хацеў ад цябе адхіснуцца... Я вандроўнік... мая справа ціхая...

Рогат. Кісель заўважае камісію ВСНГ і збянтэжаны адыходзіць у кут. Рубцоў не кратаецца з месца.

Д з я н і с к а. Прыйшлі! Вось вам і лом, любуйцеся і рыдайце, убрыкні вас камар!

В о с і п М і р о н а в і ч. Правільна дзейнічаў! Як мы і марылі! А цяпер, Дзяніска, рушым!

Д з я н і с к а. Цяпер магу. *(Ды Жыхаркі.)* Шпар хутчэй, гэта нам замест маршу! Шчасліва!..

Машына пачынае з грукатам друкаваць. Галасы рабочых, якія праходзяць. Дзяніска і Восіп Міронавіч ідуць да дзвярэй. Дзверы шырока расчынены. За сцэнай чуваць марш курсантаў.

Г а л а с ы:
— Тульскія!
— Іхняя песня!..

Марш гучней і бліжэй. У дзвярах вырастае М я с н о й, абшарпаны, растрапаны, але радасны, за ім к у р с а н т.

М я с н о й. Ціха! Цішэй!.. Грамадзяне... Расійскія! Кранштат...

Д з я н і с к а *(закрывае рот Мясному)*. Машына, Жыхарка, стой! Вымай раму, і ўстаўляйце туды...

Ж ы х а р к а. Куды? У які абзац?

Д з я н і с к а. Куды папала. Самым вялікім шрыфтам. Баця, Арцём Восіпавіч!.. Кранштат наш! Рэвалюцыя перамагла.

Канец.

А. Карняйчук

ПАМЯЦЬ СЭРЦА

ДРАМА
Ў ДЗВЮХ ДЗЕЯХ

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ:

Кацярына Міхайлаўна.
Галіна Раманаўна.
Антон.
Кірыла Сяргеевіч.
Капітан.
Генерал.
Антоніо Тэрачыні.
Рая.
Мікола.
Юры.
Наташа.
Арыся.
Іван.
Вольга.
Варвара.
П'яненькі мужчына.
1-шы шахматыст.
2-гі шахматыст.
Афіцыянткі.

ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

КАРЦІНА ПЕРШАЯ

У Кіеве на Русанаўцы жыве Кацярына Міхайлаўна. Праз шырокае акно і адкрыты балкон відаць высокі правы бераг Дняпра, на якім сярод сакавітай зелені зззяе золатам старажытная Лаўра. У пакоі Галіна Раманаўна і Кірыла Сяргеевіч. Галіна вяжа світэр. У Кірылы ў руках — гармонік-канцэрціна. Нешта іграе, потым спыніўся.

Кірыла. Галіна Раманаўна, а будзе ўсё вось як: выйдзе дзяўчына красы выключнай і чароўным голасам абвесціць: зараз перад вамі выступіць наш шаноўны госць, заслужаны артыст эстрады Кірыла Сяргеевіч... Я ўстаю, павольна іду між столікаў, лёгка кланяючыся, выходжу на эстраду, цалую ручку дзяўчыне і падымаю руку, каб спыніць мажлівыя воплескі. Потым усхвалявана звяртаюся: дарагія юныя сябры! Я шчаслівы, што вы запрасілі мяне на адкрыццё вашага кафэ. Вы чакаеце ад старога артыста вясёлых песень? Вы не памыліліся! Яны будуць! Дазвольце пачаць песняй вечна маладога Беранжэ. Прашу ўвагі і ласкі!

Іграе і спявае.

О, Божа! Зноў перад мною
Красунь барвісты першацвет.
(Яны як сонейка вясною!)
А я... што зробіш? Я ўжо дзед.
Пужаю шчыра іх гадамі,
Не верацьх, не, што сэрцам згас.
Я мудры стаў — ці мне ўжо з вамі?
Дзяўчаты, вам дадому час!
Засведчыць Зоя, ваша маці,
Ох, чараўніца на той час!

Ці давялось мяне чакаці,
Калі спатканне прызначаў?

Зазваніў тэлефон, Кірыла спыніўся. Галіна падняла трубку і апусціла.

Г а л і н а. Працягвайце! Цудоўна!
К і р ы л а *(нахіліўся, працягвае спяваць)*.
Хто ў меру любіць — любіць мала —
Дэвіз прыдумала для нас.
І вам на гэта завяшчала...
Дзяўчаткі, ужо дадому час!
Ідзіце, клопату вам мала!
Агонь кахання — то не жарт.
І чур! Каб іскарка не ўпала
Мне ў сівізну, бо той пажар
Не патушыць ужо рукамі,
Бо ў сэрцы порах, а не газ!
Агонь прыхоўвайце рукамі!
Дзяўчаткі, вам дадому час!

Зноў звоніць тэлефон. Кірыла спыніўся.

Г а л і н а. Шпурніце яго за акно і спявайце далей. «Хто ў меру любіць — любіць мала!» Бліскуча!

К і р ы л а. Дарагая Галіна Раманаўна! *(Цалуе ёй руку.)* Ніколі не забуду ваша шчырае захапленне.

З Дняпра чуваць музыка, а потым магутны гудок сірэны.

Г а л і н а. «Тарас Шаўчэнка» на Херсон пайшоў.

К і р ы л а *(паглядзеў на гадзіннік)*. Дакладна. *(Паўза.)* Вам сардэчнае прывітанне ад майго друга Сяргея Пятровіча. Пісьмо атрымаў.

Г а л і н а. Дзякую. Як яго здароўе?

К і р ы л а. Дазвольце прачытаць? *(Вымае пісьмо.)*

Г а л і н а. Прашу.

К і р ы л а *(чытае)*. «Дарагі Кіруша, перадай маё сардэчнае шчырае прывітанне Галіне Раманаўне. Справы мае горш, як у шведа пад Палтавай. Начамі не сплю, усё кашляю. У нас яшчэ холадна, вятры. Сын хацеў паслаць мяне на поўдзень, але дактары не дазваляюць. Кажуць, што я нетранспартабельны. Божа, якое непрыгожае слова! Баюся я, Кіруша, што доўга не працягну. Як толькі атрымаеш тэлеграму, што твой друг паляцеў у космас на стыкоўку з анеламі, то вельмі прашу цябе: апраніся ў нашу першую тэатральную робу і прыгадай нашы першыя купле-

ты... Апошні месяц я штодня чую твой голас. Усё часцей ты з'яўляешся перада мной. Цяжка пісаць, стаміўся. Абдымаю. Твой Пат — Сярога. Вуаля!» *(Кладзе пісьмо ў кішэню.)* Вуаля... Вуаля, Пат, дружа мой...

Г а л і н а. Кірыла Сяргеевіч, гэты світэр будзе вельмі цёплы. Дні за тры я яго закончу. Пашлём яму.

К і р ы л а. Вы ж Антону вяжаце.

Г а л і н а. Пашлём Вуаля?

К і р ы л а. Вуаля! Ад усяе душы дзякую! Во ўзрадуецца Сяргей! Усё жыццё я працаваў з ім. Пачыналі ў цырку. Ён — Пат, а я — Паташон. Мы такое выраблялі, што не толькі гледачы, а нават сланы, тыгры, мядзведзі рагаталі. А потым перайшлі на эстраду. Спачатку пра нас пісалі во такімі малюсенькімі літарамі ў самым канцы афішы, а праз які год — на ўсю афішу — г у м а р!!! Тры клічнікі. «Кірыла Ох і Сяргей Ах! Музычныя эксцэнтрыкі. Куплеты на злобу дня!» Заўсёды перааншлагі, і якія! А потым прыйшла вайна... І мы ў шынялях... У якіх толькі ўмовах выступалі. Паверце мне, няма нічога больш святога, як усмешка салдата ў кароткі перапынак паміж пеклам і смерцю.

З Дняпра чуваць тры кароткія сірэны.

Г а л і н а. «Гогаль» вяртаецца дадому.

К і р ы л а. Другі год я запрашаю вас праехаць на ім да Херсона.

Г а л і н а. Праедзем. Сёлета — абавязкова! Капітан мяне таксама запрашаў. Вось утраіх і паедзем.

К і р ы л а. А... Ясна.

Г а л і н а. Што?

К і р ы л а. Я ўтаплю капітана.

Г а л і н а. Не выйдзе. Яго за вайну двойчы тапілі.

К і р ы л а. Што вы, Галіна Раманаўна, я яго збіраюся ўтапіць у піве.

Г а л і н а. Давядзецца вам у мяне грошы пазычаць, бо вашай пенсіі не хопіць.

К і р ы л а. Але, капітан яшчэ добра можа ўзяць.

Уваходзіць К а ц я р ы н а М і х а й л а ў н а, кладзе пакункі на стол.

К а ц я р ы н а *(усхвалявана)*. Мама, а дзе Антон?

Г а л і н а. Званіў, яго дырэктар штосьці выклікаў.

К а ц я р ы н а. Даруйце, Кірыла Сяргеевіч, я з вамі не павіталася.

К і р ы л а. Гэта вам здалося. Я не паспеў адказаць. Дзень добры, Кацярына Міхайлаўна!

К а ц я р ы н а. Дзень добры! *(Аглядае пакой, падышла да вялікай фатаграфіі сына, разглядае.)*

Г а л і н а. Што з табою?

К а ц я р ы н а *(правяла рукою па фота, здымае са сцяны, ідзе да стала, села, доўга прыглядаецца да фота, павесіла картку на ранейшае месца. Падышла да люстэрка).* Божа мой! На каго я стала падобная! *(Расплятае касу.)*

К і р ы л а. Вы чароўна выглядаеце.

К а ц я р ы н а. Я бачу, бачу... Чорт! *(Зноў закручвае касу.)* Трэба ў цырульню ісці. *(Глядзіць на гадзіннік.)* Так мала часу. А дзе Антон?

Г а л і н а. Я ж казала: дырэктар яго выклікаў.

К а ц я р ы н а. Так, так... Прабач, мама, у мяне ў галаве зараз такое... А восьмай гадзіне сёння з Масквы самалётам прылятае да нас...

Г а л і н а. Васіль Іванавіч?

К а ц я р ы н а. Не. Прылятае Антоніо Тэрачыні.

Г а л і н а. Антоніо...

К а ц я р ы н а. Ён, мама.

Г а л і н а. Як жа ён дазнаўся, дзе ты жывеш?

К а ц я р ы н а. Мяне папярэдзілі дзве гадзіны назад. Антоніо прыляцеў з Італіі ў складзе нейкай дэлегацыі.

Г а л і н а. Прылятае ў восем, з аэрадрома гадзіна. Будзе ў дзевяць. Трэба прыдумаць, што прыгатаваць на вячэру.

К а ц я р ы н а. Трэба... Кірыла Сяргеевіч, вы не зможаце пазычыць мне рублёў сорак? У панядзелак палучка, і я вам адразу вярну.

К і р ы л а. З радасцю. Зараз. *(Выходзіць.)*

Г а л і н а. Што ж будзе?

К а ц я р ы н а. Што будзе, тое будзе.

Г а л і н а. А калі ён...

К а ц я р ы н а. Не турбуйцеся. Легенда астанецца ў сіле.

Г а л і н а. Баюся я за цябе. А калі ты не вытрымаеш?

К а ц я р ы н а. Не чакала такога ад цябе. Ты мой характар добра ведаеш.

Г а л і н а. Ведаю, але ёсць такія хвіліны, калі выбухаюць пачуцці, і тады воля — бяссільная.

К а ц я р ы н а. Са мною такога не бывала. Чаго ты так глядзіш на мяне? Не бывала!

Г а л і н а. Ты забыла... забыла.

К а ц я р ы н а. Мама!

Уваходзіць К і р ы л а.

К і р ы л а. Прашу! *(Кладзе грошы на стол.)* Дзесяць, дваццаць пяць, трыццаць. *(Далей лічыць дробнымі, нават медзякамі.)* Трыццаць адзін, трыццаць два... Трыццаць два рублі і трыццаць капеек. На жаль, больш няма.

К а ц я р ы н а. Вялікае дзякуй! Пакіньце дзесятку сабе, вы ж без грошай засталіся.

К і р ы л а. Не, не, што вы? У вас такі госць, сеньёр... як яго?

К а ц я р ы н а. Антоніо Тэрачыні.

К і р ы л а. Яго трэба прыняць на вышэйшым узроўні. Тут справа гонару, і не толькі ваша, а і мая, вашага суседа і друга, і нават нашай рэспублікі! Аба мне не турбуйцеся. Я ў капітана пазычу.

К а ц я р ы н а. Калі так, то яшчэ раз дзякую. Мама, а колькі ў вас?

Г а л і н а. Трохі знайду.

К а ц я р ы н а. Добра. Я зараз пераапрануся і паеду да цырульніка. Кірыла Сяргеевіч, мабыць, без вашай дапамогі не абыдземся. Не адмовіце?

К і р ы л а. З радасцю дапамагу.

К а ц я р ы н а. А зараз, калі ласка, дапамажыце пераставіць тахту во сюды. А стол паставім тут...

Г а л і н а. Навошта?

К а ц я р ы н а. Так будзе лепей... Прасторней.

К і р ы л а. Раз-два, узялі!

Кацярына падыходзіць да тахты. Зазваніў тэлефон.

Г а л і н а. Слухаю... Дзень добры... Зараз... *(Кацярыне.)* Цябе з райкома камсамола.

К а ц я р ы н а *(узяла трубку)*. Слухаю... І я вас вітаю. Усё, што вам абяцала, зрабіла. Дамовілася, параход будзе вялікі. Возьме ўсіх піянераў... Дзякую за запрашэнне, але, на жаль, я паехаць не магу... Не... Што вы, гэта ж мой абавязак, я ж ваш дэпутат. Бывайце здаровы...

Г а л і н а. Куды ехаць?

К а ц я р ы н а *(перастаўляе мэблю)*. Паслязаўтра — дзень піянераў. Едуць у Трыполле, да помніка героям Трыпольскай трагедыі, потым у Канеў, на магілу Тараса Шаўчэнкі пакладуць вянкі, будуць чытаць вершы вялікага Тараса, песні спяваць, а ўвечары распаляць касцёр каля магілы Гайдара...

Г а л і н а. Я люблю гэтае свята. Дзеці, як званочкі. Дзень самых добрых усмешак.

К і р ы л а. Калі я выступаю перад званочкамі, яны смяюцца, а я хвалююся да слёз.

К а ц я р ы н а. Мама, на хвіліну, выбачайце... *(Ідзе ў другі пакой, за ёю — Галіна.)*

К і р ы л а. Антоніо Тэрачыні з Італіі. *(Развёў рукамі.)* Сеньёр Антоніо! О, санта Марыя! Грацыя, грандыёзо! *(Паказвае на сябе.)* Сеньёр Кірыло, артысто, гумор, грандыёзо!

Заплюшчыў вочы, развёў рукі, і калі прыбягае Р а я, то трапляе ў абдымкі да Кірылы.

Грандыёзо! Санта Марыя!

Р а я. Што з вамі?

К і р ы л а. Я рэпетырую. Як добра, што вы прыйшлі, Рая.

Р а я. Антон дома?

К і р ы л а. На жаль, няма.

Р а я. Ён мне так трэба...

К і р ы л а. Сядайце...

Р а я. Не магу. Не магу сядзець, не магу стаяць. Скажыце, калі вы вельмі раззлаваны, як вы зрываеце злосць?

К і р ы л а. Я? Стаю на галаве па сістэме ёгаў. Паспрабуйце, вельмі памагае.

Р а я. Жартуеце. Я толькі што пасварылася з бацькамі. Я ім сказала ведаеце што?

К і р ы л а. Не.

Р а я. Я ім сказала — годзе! Разумееце, годзе! *(Ударыла кулаком па стале.)*

К і р ы л а. Хвілінку. *(Забраў са стала пакункі.)*

Р а я. І калі б яны ў тую хвіліну вымавілі хоць адно слова, я б перакуліла стол, я б разграміла ўсё ў хаце *(упала крэсла)*. Не верыце?

К і р ы л а. Веру. *(Падняў крэсла. З дзвярэй выглянула Галіна.)*

Г а л і н а. А, гэта ты, Рая?

Р а я. Добры дзень.

Г а л і н а. Дзень добры... *(Знікае.)*

Р а я. Зноў пачаліся ўгаворы... Што Антон мне не пара, што, я такой выключнай красы дурэпа, на якой можа ажаніцца не які-небудзь трудзяга-валет, а якой хочаш масці дачны туз! З машынай! І хто так гаворыць? Хто-о? Мае бацькі! Арыстакраты з Гнідаўкі. Так, так! Нарадзілі-

ся яны ў сяле Гнідаўка, а потым перайменавалі нашу Гнідаўку на Капусцянку. І адкуль у іх такія погляды? Адкуль?

К і р ы л а. Та-а-ак... Гнідаўскія арыстакраты... *(Смяецца.)* Гнідаўскія! Ох, і здорава! А кажуць, дзеці не разумеюць бацькоў.

Уваходзіць К а ц я р ы н а. На ёй лёгкае элегантнае плацце, у руках маленькая сумачка. Следам — Г а л і н а.

Р а я. О! *(Аглядае Кацярыну.)* О! Якое шыкоўнае плацце!

К і р ы л а. Грандыёзна! Прыма! *(Аж заспяваў.)*

Г а л і н а. Наша «Дарнічанка». Далікатна і ярка. Сама такую красу вырабляеш, а насіць не хочаш. Напішу твайму дырэктару.

К а ц я р ы н а. Яно ж кароткае. Так сапсавала краўчыха. Я ж не дзяўчына.

Р а я. Гэта кароткае?! Падзівіцеся на маё. *(Прайшлася.)* Ды ў вас сучаснае вячэрняе плацце. Бляск!

К а ц я р ы н а. Ды ну вас! *(Звоніць тэлефон. Кацярына бярэ трубку.)* Слухаю. Гэта ты, Антон? Дрэнна чуваць. З аўтамата? Так. Цяпер чую. Так, паўтары, так... І ты даў згоду? Чаму ж ты ў мяне не спытаўся? Ты разумееш? Так, так... Рая ў нас. Добра. Добра. Зараз. Рая, цябе. *(Падала трубку, адышла.)*

Р а я. Я, Антон. Так. Каля метро? «Палтава»? І я цябе моцна, моцна. *(Паклала трубку.)* Антон разам са сваёй брыгадай запрасілі мяне ў рэстаран «Палтава»!

К і р ы л а. Гэта недзе каля аэрадрома, у лесе. Кіламетраў трыццаць ехаць.

Р а я. Я там ніколі не была. Кажуць, там цудоўны аркестр. Патанцуем! Там-там, та-там... *(Прытанцоўваючы, цалуе Кацярыну, потым Галіну, паслала рукою пацалунак Кірылу і, прыпяваючы, выходзіць.)*

Г а л і н а. Ты нешта збялела. Я табе дам кардыявалену.

К а ц я р ы н а. Мама, нічога мне не дапаможа. Я сёння звар'яцею. За адзін дзень столькі... Прыезд Антоніо, сын даў згоду... Паслязаўтра... *(Махнула рукой.)*

Г а л і н а. Што?

К а ц я р ы н а. Едзе за мяжу. У Індыю са сваёй брыгадай. На два гады...

Вялікая паўза.

К і р ы л а. У Індыю? Як я ім зайздрошчу! Індыя!..

Дэлі, Калькута, Бамбей, сёмы цуд свету — маўзалей Тадж-Махал, а Радж Капур, а якія песні!.. *(Напявае індыйскую песню.)*

Г а л і н а. Вы там былі?

К і р ы л а. Амаль. Я бачыў у кіно і чытаў.

Г а л і н а. А як жа Рая? Што ён ёй скажа?

К а ц я р ы н а. Тое, што і я табе ў сорак трэцім сказала. Не забыла?

Г а л і н а. Не забыла.

К і р ы л а. Люблю неспакойнае ленінскае племя. Эх, скінуць бы гадкоў... Не будзем удакладняць — колькі...

Звоніць тэлефон.

Г а л і н а. Алё! Слухаю. Хто гаворыць? Выбаршчык? Зараз. Цябе, Каця.

К а ц я р ы н а. Слухаю. Добры дзень. Ізноў вы? Не. Выбачайце, я дома не прымаю. Разумею, але не магу. Прыходзьце ў райвыканком пятага а сёмай гадзіне вечара. Раней не магу. Што? Разумею больш, як вы, што дэпутат — слуга народу, але не ваш асабісты. *(Паклала трубку.)* От паскуда, тэрарызуе ўсіх суседзяў па кватэры, піша брудныя заявы і яшчэ мне мараль чытае.

К і р ы л а. Такіх трэба дустам пасыпаць.

К а ц я р ы н а *(глянула на гадзіннік)*. Мне час. А вы гаспадарце. На вас уся надзея.

К і р ы л а. Не турбуйцеся. Павяжу ваш фартух і буду такім памочнікам...

К а ц я р ы н а. Дзякую, Кірыла Сяргеевіч. Купіце віна натуральнага, чырвонага. Антоніо вельмі любіць чырвонае... Ну, і ўсё, я пайшла.

Г а л і н а. Чакай. *(Падыходзіць да дачкі.)* Кацюша... *(Правяла рукою па яе плячы.)* Шчасця табе...

К а ц я р ы н а кіўнула галавою, выходзіць.

К і р ы л а. Так... Санта Марыя.

Г а л і н а. Так у нас заўжды. Ці ёсць людзі, якія жывуць спакойна, ціха?

К і р ы л а. Ёсць. Наш друг капітан.

Г а л і н а. Што вы! У час вайны...

К і р ы л а. Калі гэта было! Цяпер яго нішто не хвалюе. Жыве, як варэнік у смятане.

Г а л і н а. Во каб ён пачуў, як вы яго...

Г о л а с к а п і т а н а. Чую.

Паўза. Уваходзіць к а п і т а н. У руках у яго пакунак і чамадан.

Капітан. Паўтары, камедыянт, хто я такі?!

Кірыла. Грацыа, сеньёр капітан. Якім чынам вы праніклі так непрыкметна?

Капітан. Дзверы былі незамкнёныя. Ты мяне двойчы абразіў. За гэта панясеш суровую кару. Дзень добры!

Галіна. Дзень добры! Ехаць куды збіраецеся?

Капітан. Прыехаў. *(Да Кірылы.)* Дазволь паставіць у цябе чамадан, бо ў маёй новай каюце могуць свіснуць.

Галіна. Як у новай?

Капітан. Раскажу. *(Да Кірылы.)* Можна?

Кірыла. Прашу. *(Бярэ чамадан.)* Ды ён жа парожні.

Капітан. Там мая парадная роба, ордэны і фатаграфіі.

Кірыла. Зараз вярнуся. *(Выходзіць.)*

Капітан. А гэта я вам прынёс. *(Разгортвае пакунак і ставіць на стол мадэль карабля.)* Пазнаеце?

Галіна. Ваш.

Капітан. І брата вашага Міколы. У сорак шостым вы прыязджалі да нас.

Галіна. Дваццаць пятага мая.

Капітан. Гэта — каюта вашага брата.

Галіна. Тут мы абедалі, а потым вы запрасілі мяне да сябе. *(Павярнула мадэль.)* Тут ваша каюта.

Капітан. Яна. Не забылі?

Паўза. Галіна глядзіць мадэль. Уваходзіць Кірыла.

Кірыла. Усё ў парадку! *(Глядзіць на мадэль.)* «Дзясна». Прыгожы. Твой?

Капітан. Мой.

Кірыла. А дзе ён цяпер?

Капітан. Ходзіць, як і хадзіў, па ўсіх морах і акіянах. Які толькі груз не возіць, трудзяга. Дваццаць гадоў я хадзіў на ім... Зберажыце яго, Галіна Раманаўна.

Галіна. Зберагу. *(Узяла мадэль, разглядае яе.)* А праўду кажуць, нішто так не хвалюе, як успаміны.

Паўза. Галіна панесла мадэль у свой пакой.

Кірыла. Што здарылася, Максім?

Капітан. Заштарміла так... *(Набівае тытунём люльку. Уваходзіць Галіна.)* Сястрына дачка выйшла замуж, прыняла такога інтэлігентнага хлюста, як і сама. Ну і пачалося... Ты мяне назваў варэнікам, а яны празвалі ста-

рым грыбам. Пенсіённы грыб, ды яшчэ і без смятаны. Ты разумееш, якая гэта абраза — пенсіённы грыб без смятаны.

К і р ы л а. А сястра што?

К а п і т а н. Сястра? Дачка ў рабыню яе ператварыла. Цярпеў я, цярпеў і... кінуў іх. У кожнага чалавека ёсць свае ракушкі. Але людзі — як караблі. Калі хочаш, каб над галавою лунаў сцяг, чысці дно ад ракушак. А ёсць такія, што з асалодаю абрастаюць ракушачнікам. Такія з часам становяцца маленькімі зайздроснікамі, скнарамі. Такімі якраз і сталі мае родзічы. Яны рашылі ператварыць мяне ў свайго штурхача. Прымушалі апранаць парадную форму, вадзілі мяне ў розныя ўстановы: гэта наш дзядзя, заслужаны капітан далёкага плавання, кавалер дзесяці ордэнаў... І я спачатку, як заслужаны дурань, не разбіраўся. А яны стараліся як ямчэй прымасціцца на маёй шыі і ўжо нахабна пачалі вымагаць, каб я сваім аўтарытэтам дапамагаў ім у іх паскудных справах. І вот, аднойчы вечарам я гукнуў іх на палубу і зрабіў вялікі аўрал. Сказаў ім, што пра іх думаю, і аддаў канцы.

Г а л і н а. Як? Кватэра ж ваша?

К а п і т а н. Мая, але давялося падняць якар.

К і р ы л а. А дзе ж ты цяпер жывеш?

К а п і т а н. Недалёка ад вас, за мостам, на вадзе. Купіў стары драўляны шлюп, адрамантаваў. Кабіна добрая. Маторчык — Л-12, пяць міль за гадзіну. Перафарбаваў. Так што — прашу ў госці. На беразе вялікі ясакар і каля яго прышвартаваны мой шлюп. Белы, нібы лебедзь, а на носе надпіс у ваш гонар — «Галіна».

Г а л і н а. Праўда?

К а п і т а н. Так. Жыву, як кароль!

Г а л і н а. А хто ж вам варыць, бялізну мые?

К а п і т а н. Дарагая Галіна Раманаўна! Няма на свеце такой прачкі і такога кока, як мы — маракі.

Г а л і н а. А зімою што будзе?

К а п і т а н. Да зімы пяць месяцаў, а потым шлюп выцягну на бераг, найму дзе-небудзь пакойчык, а вясною зноў на ваду! Я і рад, што так здарылася. Не спачувайце мне, а наадварот — павіншуйце старога капітана з наваселлем. Увесь дзень на свежым паветры, і кожнага ранку я сустракаю першы праменьчык сонца... Краса непаўторная. Усё замаўкае... Мабыць, у космасе такая цішыня... І ў тую хвіліну я гляджу на свет вачыма дзіцяці. Так было на моры, так і на Дняпры.

К і р ы л а. Прырода мае магічную красу, гэта праўда.

Г а л і н а. Калі глядзець на яе вачыма дзіцяці. Не кожнаму дадзена такое вялікае шчасце.

К і р ы л а. Чаму?

Г а л і н а. Нямала і такіх людзей, якія любяць глядзець... у гаршкі суседа, а галаву падымаюць к небу толькі тады, як бушуе навальніца. На жаль, так. *(Зазваніў тэлефон.)* Слухаю. Антон не прыходзіў. Добра, Каця, купім «Аксаміт Украіны». Добра.

К а п і т а н. Прывітанне ад мяне.

Г а л і н а. У нас Максім Максімавіч. Табе прывітанне. Зараз. Вас просіць.

К а п і т а н *(узяў трубку).* Дзень добры, Кацярына Міхайлаўна! Дзякую! Дзе прападаў? Пераязджаў на новую кватэру. Чаму? Раскажу. Вясёлая гісторыя. Абавязкова буду пры поўнай форме. Дзякую! *(Паклаў трубку.)* Меў гонар атрымаць запрашэнне на вячэру. Чакайце, чакайце, а ці не дзень нараджэння ў Кацярыны Міхайлаўны.

Г а л і н а. Не. Прыязджае да нас знаёмы з Італіі.

К а п і т а н. О, праспяваем «Бандэра росса».

К і р ы л а. «Бандэра росса»... *(Спявае на італьянскай мове разам з капітанам першы куплет. А калі яны закончылі, заспявала Галіна.)*

Г а л і н а. «Ідзі наперад, народ! На бой крывавы!» Мы таксама яе спявалі ў генерала Каўпака.

К і р ы л а. Вы былі...

Г а л і н а. Разведчыцай, разам з дачкой. Каці не пашанцавала. Пайшла ў горад на сувязь і трапіла ў аблаву. Вывезлі яе ў Германію. Думала — канец, не пабачымся болей. Але, на шчасце... *(Ціха заспявала.)* «Чырвоны воін пераможа ўсіх...» «Бандэра росса, бандэра росса». *(Выходзіць на кухню.)*

К а п і т а н. Ты ведаў?

К і р ы л а. Не, о, мадонна!

К а п і т а н. Мадонна! Ізноў мы селі на мель, на рыфы, як сляпыя. Ну, я — салёны гурок з дублёнай скураю, не адчуў, а ты, артыст, мастак, душа твая тонкая... Штодня тут круцішся, як... І не знаеш, што перажыла Галіна Раманаўна і зберагла мора, акіян дабраты душэўнай для цябе, для мяне, для ўсіх. Скажы, хто мы цяпер такія? Хто?

К і р ы л а. Хто? М-м... М-м...

Уваходзіць Г а л і н а ў фартуху.

Г а л і н а. Прашу вас, кавалеры, дапамажыце скласці

спіс пакупак. Госць замежны. Я не ведаю, што яны любяць.

Капітан. Італьянцы любяць спагеці.

Галіна. А што гэта такое?

Кірыла. Гэта доўгія макароны, іх нацыянальная страва. Я ў цырку працаваў з італьянцамі. Знаю. Дык, значыць, запісваем. Да макаронаў патрэбен сыр. Накрышым і туды — масла паўкіло...

Капітан. У мяне каля чоўна на кукане судак ходзіць кілаграмы на два.

Кірыла. Цудоўна! Судак па-польску. Шкада, што не заўтра прыязджае сеньёр Антоніо, я б яму налавіў зялёных красунь, што спяваюць: ква, ква...

Галіна. Ну, што вы!

Капітан. Далікатэс, далікатэс!

Кірыла. Нашпігаваць часначком... язык можна пракаўтнуць.

Галіна. Пішыце — бараніны тры кіло.

Кірыла *(піша і гаворыць)*. Бараніны, сеньёр, перац, Антоніо, часнок, мы вас, яйкі з маянэзам, сеньёр, прымаем, каўбаса ўкраінская, на самым, гарэлка з перцам, высокім узроўні, віно «Аксаміт». Фініта?

Капітан. Фініта.

Галіна *(ціха)*. Антоніо Тэрачыні...

Кірыла. Скажыце, Галіна Раманаўна, а хто гэты сеньёр Антоніо?

Галіна. Хто? *(Паўза.)* Я яго не ведаю... Не знаю...

З Дняпра чуваць трывожныя гудкі парахода.

Заслона.

КАРЦІНА ДРУГАЯ

Непадалёку ад аўтатрасы, у лесе рэстаран «Палтава». На адкрытай пляцоўцы дубовыя сталы, лавы. У глыбіні сцэны — калодзежны журавель. Збоку — плецены з лазы плот, а далей віднеецца будынак рэстарана — сялянская хата з саламянай страхой. Туды ўваходзяць і выходзяць госці, афіцыянткі ў нацыянальных убраннях. З рэстарана чуваць музыка. З боку тэрасы часам даносіцца шум праезджых машын.

За сталом сядзяць Мікола, Юрка з жонкаю Наталкай, Іван з Арысяю, якія доўга глядзяць адно аднаму ў вочы, трымаюцца за рукі і ні на кога не звяртаюць увагі.

За другім сталом двое гуляюць у шахматы. Трошкі далей сядзіць адзінокі падвыпіты чалавек. На галаве ў яго мяккі капялюш. На пляцоўцы танцуюць Рая з Антонам.

М і к о л а. Не, хлопцы, усё гэта не так проста. Рая нарачоная, усе пра гэта знаюць, і раптам Антон едзе на два гады. Вы не ведаеце, які характар у Раі?

Н а т а л к а. Калі любіць, то ўсё вытрымае. І чаго Антон цягне? Сказаў бы ёй.

М і к о л а. Ён хвалюецца.

Н а т а л к а. Глянь, як смяецца Рая. Шчаслівая... Не ведае, што сёння...

М і к о л а. Іспыты на сталасць.

Н а т а л к а. Ох, і чэрці лысыя вы, мужчыны! Колькі мы церпім праз вас...

Ю р к а. Прыгожа Рая танцуе, вельмі хораша танцуе.

Н а т а л к а. Нічога асаблівага не бачу. Антон — гэта клас! Паглядзі, як ён яе трымае! Люблю з ім танцаваць. Ён так лёгка вядзе...

Ю р к а. А я з ёю. Рая так лёгка ідзе...

Н а т а л к а. Лёгка? Калі ты з ёю танцаваў?

Ю р к а. Яшчэ да нашага вяселля.

Н а т а л к а. Э-э, галубок! Час ужо і забываць! Чуеш?

М і к о л а. Ох, і раўнівая ты, Наталля!

Ю р к а. Каб ты ведаў, Мікола, якое ціхае і спакойнае ў мяне жыццё... Ад лагоднага характару Наташы, бывае, выйду на балкон, гляджу на зоркі і у-у-у *(завывае)*.

М і к о л а. Ох і здарава! Ану, яшчэ.

Н а т а л к а. Паспрабуй!

Ю р к а *(цалуе Наташу)*. Усё, усё, мая ненаглядная. *(Спявае.)*

Ты мая радасць, ты маё гора...

Н а т а л к а. Скажы, Мікола, Атэла — пазітыўны вобраз ці негатыўны?

М і к о л а. Пазітыўны.

Н а т а ш а. Калі я дазнаюся, што ты... Глядзі мне ў вочы, што ты там з якой-небудзь азіяткай... Я цябе, мой любы, пазітыўна задушу.

М і к о л а. Атэла меў афрыканскі тэмперамент.

Н а т а л к а. Украінскі, галубок, страшнейшы за афрыканскі. Ці, можа, не верыш?

Ю р к а. Веру, веру!

М і к о л а. Супакойся, Наталка. Мы едзем у краіну са строгай мараллю. Ды такая спёка... Спяць на цыноўках голенькія, дыхаць няма чым...

А р ы с я. Ох...

І в а н. Ах...

Наталка. Ды не стагніце вы так жаласна.

Арыся. Мы не стогнем, мы так размаўляем.

Іван. Арыся... Арыся...

Арыся. Што, што, Ваня?

Іван. Ах...

Арыся. Ох...

Мікола. Душэўна развітваюцца. Ох...

Юрка. А ты...

Наталка. Маўчы! Хіба не адчуваеш, што тут у мяне? Але я не люблю пры людзях.

Мікола. Цікава, як будзе Рая з Антонам развітвацца.

Наталка. Давядзецца яму штодня пісьмы пісаць нарачонай. Толькі ці дапаможа гэта?..

Юрка. Наталка.

Наталка. Пажывём, пабачым...

Юрка. Няўжо ён пры нас ёй скажа?

Мікола. Пры людзях лягчэй. Нам трэба дапамагчы Антону.

Наталка. Антон — арол, сам справіцца.

Юрка. Любоў не такія крыллі звязвала.

Наталка. Што?

Юрка. Факт. Хто маё крылле падрэзаў?

Наталка. Не загібай, пеўнічак ты мой. Лепей налі ўсім.

Юрка. Лепей паклюй салацік, курачка мая залатая.

Наталка. Рабі, што я сказала!

Юрка налівае ўсім. Да стала падыходзіць п'янаваты чалавек у капелюшы.

Чалавек. Выбачайце, вы не дэлегацыя?

Мікола. А што?

Чалавек *(пакутліва)*. Ад самай раніцы чакаю. Дамовіліся, што тут сустрэнемся...

Мікола. А вы хто будзеце?

Чалавек. Я з му... з му... з муністэрства.

Юрка. З якога?

Чалавек. Гэта... не важна... Дык не дэлегацыя?

Мікола. Не.

Чалавек. Пардон. *(Пайшоў да свайго століка. Налівае чарку, нюхае гурок.)*

Мікола. Добра ўзяў.

Арыся. Ох...

Іван. Ах...

Наталка. Зноў? Ды вы ўжо цалуйцеся, ці што, толькі не стагніце.

Мікола пачаў песню, усе яго падтрымліваюць. Антон памахаў ім рукою, працягвае танцаваць з Раяй.

Арыся. На два гады, ох!..

Іван. На два гады, ах!.. *(Абняў Арысю, пацалаваў яе ў шчаку.)*

Наталка. Ды пацалуй ты яго, Арыся, во так!

Абняла Юрку і пацалавала яго ў вусны.

Юрка. Ой, ой... *(Наталка доўга яго цалуе.)*

1-шы шахматыст *(загледзеўся на іх, аж засвістаў.)*

2-гі шахматыст. Шах!

1-шы шахматыст. Чакай.

2-гі шахматыст. Мат!

Музыка сціхла. Антон і Рая хуценька выходзяць.

Антон. Не сумуйце, братачкі, мы зараз вернемся.

Наталка. Куды гэта яны?

Мікола. Думаю, зараз Антон скажа Раі ўсё...

Юрка. Наталачка, няўжо ты так пастарэла? Няўжо ты забыла, як мы бегалі праветрывацца?

Наталка *(усміхаецца)*. Ты хуліган.

Юрка *(да Міколы)*. Бачыў? Успомніла курачка, як была кураняткам.

Наталка. Змоўкні! Антон не такі, як ты, нахабнік.

Юрка. Але Рая такая, як ты... была...

Наталка. Я была?

Мікола. Была, была, Наталачка...

Юрка. Чула? Мікола аб'ектыўна гаворыць.

Наталка. Аб'ектыўна? Такі ж разбойнік, як і ты.

Юрка. Ах, вось яно што! Утаіла ад мяне?

Мікола. Я яе некалі адзін раз пацалаваў, а яна мяне два разы правяла далікатна так па шчоках...

Юрка. Руку, дружа! Тое ж самае было і са мной, калі я першы раз пацалаваў яе... Бывай здарова, Наталка, каралева ты мая!

Мікола. Бывай здарова, наша каралева.

Юрка і Мікола чокаюцца з Наталкай.

Арыся. Ох...

Іван. Ах...

Наталка заспявала вясёлую жартоўную песню. Хлопцы падтрымліваюць. Другі куплет зачынае басам 2-гі шахматыст.

Н а т а л к а. Вось гэта падтрымаў!..

Спяваюць усе. Падыходзіць чалавек у капелюшы.

Ч а л а в е к *(зацягнуўшы песню так, што ўсе змоўклі)*. Люблю гэтую песню. Ой, як люблю... Выбачайце, вы не дэлегацыя?

М і к о л а. А вы хто будзеце?

Ч а л а в е к. Я, я з му... му... муністэрства. Пратакол! Пратакол — самае галоўнае для чужаземца. Пратакол, рашэнне, гарэлка, ікра, факт!

М і к о л а. А хто ваш міністр?

Ч а л а в е к. Гэта не так важна. Я сустракаю... Дык вы — не дэлегацыя?

М і к о л а. Не.

Ч а л а в е к. Бонжур, ауфідэрзеен, гуд бай! *(Адышоў.)*

Да стала падыходзяць А н т о н і Р а я.

Н а т а л к а. Антон! Купі Раі такую памаду, каб слядоў не пакідала.

Уваходзяць д з в е а ф і ц ы я н т к і. Яны ставяць пляшку віна і чаркі на стол шахматыстаў, дзве бутэлькі шампанскага на стол Антона. Выходзяць.

Р а я. Мне здаецца, што ў мяне сёння найшчаслівейшы дзень. Толькі не ведаю чаму, калі прыходзіць шчасце, разам з ім у душу запаўзае трывога. Ці бывае так у вас?

Н а т а л к а. Бывае.

Р а я. Чаму гэта так?

М і к о л а. Баімся згубіць шчасце, таму і хвалюемся.

А н т о н. За хвалюючае шчасце, Рая! *(Чокнуўся з ёю.)*

Н а т а л к а. Горка!

Ю р к а і М і к о л а. Горка!

А р ы с я. Ох...

І в а н. Ах...

А н т о н. Арыся, Ваня, што з вамі?

А р ы с я. Мы так...

І в а н. Развітваемся.

А р ы с я. Два гады, Ваня, ох!

Н а т а л к а *(да Юркі)*. Каб ты мне кожны тыдзень лісты прысылаў, і не кароценькія, а па паўметра.

М і к о л а. На пальмавых лістах пісаць будзеш.

Р а я *(да Антона)*. Куды яны збіраюцца?

Антон. У далёкі шлях мая брыгада паслязаўтра адпраўляецца...

Мікола. У краіну казачных цудаў... *(Спявае.)* «Не счесть алмазов в каменных пещерах...»

Рая. У Індыю?

Мікола. Так. Вялікая краіна, вялікі народ.

Юрка. Колькі крыві ён праліў за сваю свабоду.

Мікола. Без барацьбы, без крыві свабода не прыходзіць. Прыгадайце наш народ.

Антон. А калі воля прыходзіць лёгка, яе не шануюць і нават хутка забываюць тых, хто крывёю сваёю дапамагаў вырвацца з няволі.

Наталка. Скажу вам, хлопцы, дужа вы добрыя. Усіх, хто крыкне: «дружба, дружба», адразу братамі называем, а ёсць і такія правіцелі: мы іх моцна абдымалі, а яны глыбей запускалі рукі ў наша дабро, а цяпер яшчэ і зневажаюць нас, лаюць, ды як!..

Антон. І ўсё-такі, Наташа, ніводная дзяржава ў гісторыі не мела столькі сапраўдных, шчырых, чэсных, баявых сяброў, як наша. Пра гэта марыў Уладзімір Ільіч, і яго мара збылася поўнасцю. Я веру, што б там ні рабілі правіцелі, народы з намі!

Наталка. Усё гэта так, але...

Юрка. І чаго ты завялася? Але, але... Гэта справа высокай палітыкі. Гэта табе не боршч зварыць.

Наталка. А чаму ты так зняважліва пра боршч гаворыш? А па-мойму, найвышэйшая палітыка робіцца для таго, каб у кожнай хаце кожны дзень быў добры боршч.

Антон. І каўбаса, і чарка. *(Смяецца.)*

Наталка. А што? Чаму ты смяешся? Яшчэ не раз ты паплачаш у Індыі, Антон, успамінаючы наш украінскі боршч.

Рая. Антон!.. *(Вялікая паўза.)*

1-шы шахматыст. Шах!

2-гі шахматыст. Асцярожна! Тут каралева.

Рая. Едзеш?

Антон кіўнуў галавою.

Рая. Не, ты жартуеш.

Мікола. Антон — наш брыгадзір.

Рая. Дзякую, што напомніў.

Антон. Для нас вялікі гонар, дый для цябе...

Рая. Што для мяне?

Антон. Гонар! Сярод тысяч зваршчыкаў даручаюць гэтую справу твайму Антону і яго сябрам. Над прорвамі ў гарах будзем варыць сталёвыя аркі дружбы.

Рая. А як жа я?

Антон. Заўтра да мяне перасялішся жыць. Будзеце разам чакаць мяне.

Наталка. Разам будзем чакаць нашых арлоў.

Арыся. Ох...

Іван. Не стагні.

Мікола. Два гады праляцяць...

Юрка. І не заўважыш, Рая.

Рая ўстала, глядзіць на Антона.

Рая. Гэта ўсё, што ты хацеў мне сказаць?

Антон. Рая, зразумей...

Рая. Скажы чэсна, ты мог адмовіцца?

Антон. Мог.

Рая. Дык чаму ты гэтага не зрабіў?

Антон. Зразумей. Гэта наш абавязак, справа гонару — майго, іх, бацькаўшчыны.

Рая. Не хавайся за гучныя словы! Не выкручвайся!

Мікола. Лягчэй, Рая! Гэта не толькі гучныя словы. Гэта праўда. Толькі брахня бывае гучнаю, крыклівaю. Як ты магла? Ты ж не фіфа патлатая, а трудзяга.

Рая. А як, Антон, усе вы маглі ўтаіць, скрыць ад мяне? Хіба ты не знаў, калі прызначаў вяселле? А цяпер... Што я скажу таварышкам сваім, навучы мяне, як глядзець ім у вочы, як збрахаць, як выкручвацца? Пра які гонар я мушу гаварыць? Навучы!

Антон. Я ведаў, але не быў упэўнены, што нас зацвердзяць. Толькі сёння прыйшла тэлеграма, паслязаўтра трэба быць у Маскве, і ў той жа дзень вылятаем далей. Скажыце ёй, хлопцы.

Юрка. Мы далі згоду яшчэ ў мінулым годзе. У такой справе наогул не паложана трапацца. Відаць, доўга зацвярджалі праект. Я нават забыў пра гэта. Клянуся табе здароўем сына, Рая.

Наталка. Сына не чапай! Сёння сказаў, праўда. Ты думаеш, Рая, мне лёгка? Але я ведаю, калі любіш, трэба чакаць. Чакаць, чорт пабяры! Чакаць! Можа, у гэтым вялікая і галоўная краса жыцця.

Рая. Што скажуць пра мяне, калі я во такою буду хадзіць? Пагуляла, а жанішок махнуў... на два гады... Я ж не жонка табе.

Антон. Я не ведаў... Рая! *(Хоча абняць Раю.)*

Рая *(адштурхнула яго).* Шчаслівай дарогі вам усім... А я... *(Хутка выходзіць.)* Шчаслівай дарогі!

Грае музыка.

Антон. Хлопцы... Сябры... *(Крыкнуў.)* Рая! *(Пабег услед за ёю.)*

2-гі шахматыст. Шах... Яшчэ раз шах...

Падыходзіць п'янаваты чалавек.

Чалавек. Вы не дэлегацыя? Я з му... му...

Мікола. Ідзі ты му... да... чорта лысага.

Чалавек. Ясна. Гуд бай! *(Выходзіць.)*

2-гі шахматыст. Яшчэ раз шах... і, здаецца, мат...

Музыка іграе мацней.

Заслона.

КАРЦІНА ТРЭЦЯЯ

Кватэра Кацярыны Міхайлаўны. Вечар. Скрозь вокны і адчыненыя дзверы балкона відаць ззянне агнёў вячэрняга Кіева. Пражэктарамі асветлены залатыя купалы Лаўры і недалёка ад іх абеліск Вечнай Славы.

Кірыла расстаўляе на століку бакалы.

Галіна. Якое віно вы купілі?

Кірыла. Венгерскі вермут. Спачатку будзе аперытыў. Кожнаму нальём вермуту. Хвілін трыццаць на размову, а потым ужо за стол. Так паложана.

Галіна. Без закускі?

Кірыла. Не паложана.

Галіна. У нас лепей. Прыйшлі госці, адразу за стол. А гэты каператыў мне не падабаецца.

Кірыла. Выбачайце, але не каператыў, а аперытыў.

Галіна. Оператыў...

Кірыла. Можна і так... Здаецца, усё... Я пайду пераапрануся.

Галіна. Дзякую вам ад усяго сэрца.

Кірыла. Што вы, Галіна Раманаўна. Я шчаслівы, што магу вам дапамагчы. Вуаля!

Узрушаны, уваходзіць Антон.

Кірыла. Сеньёр Антоніо, грацыя!

Антон. Грацыя, грацыя.

Кірыла выходзіць. Антон набірае нумар тэлефона, але, відаць, ніхто не адказвае. Кінуў трубку.

Антон. А, чорт! *(Заўважыў столік з бакаламі.)* Што гэта?

Галіна. Як добра, што ты прыйшоў...

Антон *(перапыняе)*. Дзе мама?

Галіна. Паехала на аэрадром сустракаць... прыяцеля...

Антон зноў набірае нумар тэлефона.

Галіна. А чаму ты не пытаеш, каго маці сустракае?

Антон *(паклаў трубку)*. Мне ніхто не званіў?

Галіна. Не.

Антон сеў у крэсла, закурыў.

Галіна. Антоша... Каця паехала сустракаць свайго друга.

Антон. Я чуў, чуў...

Галіна. Што з табою?

Антон. Бабуня, ні пра што не пытай мяне сёння.

Галіна. А я магу гаварыць?

Антон. Бабуня!

Галіна. Усё. З Італіі прыязджае прыяцель Каці, з якім яна была ў падпольнай арганізацыі на нямецкім заводзе... Яны хутка будуць тут. Усё. Прабач. *(Выходзіць на кухню.)*

Антон. Бабуня, чакай. У мяне... такога яшчэ не было... Упершыню я не ведаю, што рабіць.

Галіна. А запытаць можна?

Антон. Сам скажу, сам...

Галіна. Рая.

Антон. Адкуль ты ведаеш?

Галіна. У твае гады толькі любоў можа так усхваляваць. Упершыню я цябе бачу такім.

Антон. Заўтра я з хлопцамі выязджаю... Сказаў пра гэта Раі, а яна...

Галіна. Разумею. У Раі характар круты. Дзяўчына гордая. За гэта я яе і люблю.

Антон. Гордая? Якая ж гэта гордасць? Яна ведае, як я яе люблю, ведае, што для мяне яна... Але я не магу зразумець, няўжо толькі ў даўнія часы любімая магла чакаць любоў сваю і нават ісці на смерць. Няўжо мы сталі

такімі дробязнымі, глухімі, халоднымі? Для чаго тады жыць? Для чаго? Скажы! У цябе было вялікае жыццё, можа чалавек жыць без кахання? Праз самалюбства, баючыся, што нехта скажа подлае слова, не так паглядзіць, знішчыць у сабе найпрыгажэйшыя, найсвятлейшыя пачуцці, разбіць мары і жыць, як папугай...

Галіна. Рая не такая!

Антон. Дык чаму ж яна ў адно імгненне абарвала ўсё, што было між намі?

Галіна. Ёй вельмі цяжка... Я не хацела табе гаварыць, але я заўважыла — Рая чакае дзіця.

Антон. Яна сёння сказала мне. Я так узрадаваўся, прасіў яе пераехаць да нас, чакаць мяне тут, у нас.

Галіна. І добра зрабіў. Ты ж ведаеш, якія ў яе бацькі. Маці падобна на індычку, а бацька на дзікага вепра. Ёй там заставацца нельга. Я і Кацярына, мы пагаворым з ёю, толькі маме сёння не гавары пра гэта ні слова.

Антон. Чаму?

Галіна. Ні слова. Прашу цябе, Антон.

Антон. Добра. *(Тэлефонны званок.)* Так, так, Мікола. Дзе ты яе бачыў? Так, зараз бягу. *(Паклаў трубку.)*

Галіна. Антон! Помні, Раю хваляваць нельга.

Антон. Бабуня! *(Абняў Галіну, пацалаваў, выбег.)*

Галіна. О, юнацтва! Якое ты ўсхваляванае, прыгожае і... неразумнае... *(Падышла да століка, узяла пляшку віна, разглядае.)* Каператыў... Не, оператыў...

Чуваць званок у калідоры. Галіна выходзіць. Праз хвіліну ўваходзяць Антоніо з чамаданам, Кацярына і Галіна.

Кацярына. Гэта мая мама, Галіна Раманаўна.

Антоніо *(цалуе Галіне руку)*. Антоніо Тэрачыні.

Галіна. Вельмі прыемна. Дачка расказвала мне пра вас.

Антоніо. І я вельмі рады. Кацярына гаварыла мне пра вас.

Кацярына. Антоніо, прашу сюды. *(Ідзе ў другі пакой, а праз хвіліну вяртаецца.)*

Галіна. Навошта ты косы абрэзала.

Кацярына. Не пытай, а што — пагана?

Галіна. Як табе сказаць?.. Такая маладзічка... Не пазнаць... Як прычоска мяняе аблічча. Не, добра.

Кацярына. Дзякую, мама.

Галіна. Надоўга?

Кацярына. Заўтра паляціць. Антон не прыходзіў?

Галіна. Не... Я пайду на кухню, бо там прыгарыць.

Кацярына. Ідзі і не хвалюйся.

Галіна выходзіць. Уваходзіць Антоніо. Ен пераапрануў пінжак і памяняў гальштук.

Антоніо *(ціха, усхвалявана)*. Катарына... *(Падышоў.)* Катарына...

Кацярына. Антоніо... сядай. Не думала, што сустрэнемся.

Антоніо. А я думаў. Я шукаў цябе.

Кацярына. Дай сігарэту. *(Антоніо дае закурыць.)* А ты?

Антоніо. Так, так. *(Закурвае.)*

Кацярына. Ты змяніўся...

Антоніо. Стары стаў.

Кацярына. Такі ж прыгожы...

Антоніо. А ты, Катарына...

Кацярына. Не трэба, Антоніо. Давай памаўчым і паглядзім адзін аднаму ў вочы.

Антоніо кіўнуў галавой, што згодзен. Чуваць гудкі парахода. Здалёк далятае музыка.

Антоніо *(ціха)*. Катарына, не магу маўчаць, не магу... Я люблю цябе, Катарына.

Кацярына. Прашу цябе, Антоніо, не трэба. Раскажы, як ты жыў усе гэтыя гады?

Антоніо. О... Санта Марыя! Усё было — і радасць, і гора... Больш гора... Праз пяць гадоў, як мы развіталіся, я ажаніўся.

Кацярына. Дзеці ёсць?

Антоніо. Не... З жонкай ты разлучыла мяне.

Кацярына. Я?

Антоніо. Яна не магла ўвайсці ў маё сэрца... Ты, Катарына, не пусціла.

Кацярына. Антоніо, я прасіла цябе.

Антоніо. Добра... А ты замужам?

Кацярына. Была, але муж памёр. Астаўся сын Антон. Вунь яго фатаграфія.

Антоніо падышоў да сцяны.

Антоніо. Катарына... *(Зняў фота і ідзе да Катарыны.)* Катарына.

Кацярына *(забрала фота, павесіла на ранейшае месца, павярнулася.)* Не... Не! Ты памыляешся.

А н т о н і о. Катарына...

К а ц я р ы н а. Не. *(Закрыла фота спіной.)* Антоніо, прашу цябе. Антоніо. Фініта.

Антоніо адышоў да балкона, глядзіць на Кіеў. Да яго падыходзіць Кацярына, правяла рукою па плячы.

К а ц я р ы н а. Прыгожы Кіеў вечарам.

А н т о н і о. Я нічога не бачу.

Кацярына ціха заспявала народную італьянскую песню.

А н т о н і о. Не забыла?

К а ц я р ы н а. Не забыла. І не забыла, як ты мяне вучыў абыходзіцца з магнітнай мінай. *(Антоніо кіўнуў галавой.)* Мне часта сніцца... Прачынаюся з крыкам — Антоніо!

А н т о н і о *(павярнуўшыся)*. Катарына, я ўжо бачу. Бачу.

Званок у калідоры.

К а ц я р ы н а. Антоніо, я запрасіла нашых сяброў на вячэру. Гэта яны.

Антоніо кіўнуў галавой. К а ц я р ы н а пайшла ў калідор, Антоніо падышоў да сцяны і ўважліва разглядае фота. Чуваць галасы. Уваходзіць К а ц я р ы н а, за ёю ў парадпай форме к а п і т а н і ў светлым касцюме К і р ы л а. У капітана на пінжаку ордэнскія калодкі. Госці спыніліся каля дзвярэй.

К а ц я р ы н а. Мой друг — Антоніо Тэрачыні. *(Антоніо пакланіўся.)* Нашы сябры: капітан Максім Максімавіч, заслужаны артыст Кірыла Сяргеевіч. *(Капітан і Кірыла таксама пакланіліся.)* Прашу, сядайце. *(Уваходзіць Галіна.)* Мама, сядай тут. *(Пасадзіла Галіну, Кацярына падала ўсім бакалы, іх напоўніла.)* За нашага госця, майго баявога таварыша, друга, з якім я на нямецкім заводзе, на фашысцкай катарзе змагалася ў адной падпольнай групе, за Антоніо Тэрачыні!

У с е. Ваша здароўе!

К і р ы л а. Сеньёр Антоніо, салюто!

Усе селі. Паўза.

Г а л і н а. Якое ў вас надвор'е ў Італіі?

А н т о н і о. Так, як і ў вас. Трохі, можа, сонца больш.

К і р ы л а. Вы добра ведаеце нашу мову.

А н т о н і о. Катарына вучыла... А потым сам.

Паўза.

Г а л і н а. А дажджы ў вас ідуць?

А н т о н і о. Дажджу няма.

Г а л і н а. А як з ураджаем? Якія віды?

А н т о н і о. Не ведаю. Я жыву ў горадзе.

Паўза.

К а п і т а н. Ці будзе ваша футбольная зборная гуляць сёлета з нашай?

А н т о н і о. Не знаю...

Паўза.

К і р ы л а *(адкашляўся)*. Выбачайце, сеньёр, а як адчувае сябе папа рымскі? Як яго здароўе?

А н т о н і о. О, вы католік?

К і р ы л а. Крый божа, я праваслаўны атэіст!

А н т о н і о. А... Я з папай не сустракаюся. Стары чалавек, мабыць, кашляе. *(Смяецца.)*

Усе смяюцца.

К а п і т а н. А як вы, выбачайце, трапілі на нямецкі завод? Італія была з фашыстамі.

А н т о н і о. Не, не, Італія не хацела, то дучэ Мусаліні. Італьянскія фашысты былі з Гітлерам, а Італія — гэта мы *(паказаў на сябе)*. Я сядзеў у турме, а потым нас вывезлі на нямецкі ваенны завод, там я і спаткаўся з сеньёрай Катарынай.

К і р ы л а. Вы камуніст?

А н т о н і о. Сацыяліст.

К а п і т а н. Левы ці правы.

А н т о н і о. Не левы і не правы. Я ў цэнтры... Мы хістаемся як у гадзінніку *(паказвае)*.

К а ц я р ы н а. Маятнік.

А н т о н і о *(смяецца)*. Маятнік, так. Наша група цэнтр. Там-там *(паказвае ўлева)*, там-там *(паказвае ўправа)*.

К а п і т а н. А вы больш куды — там-там улева ці там-там управа?

А н т о н і о. Я там-там улева. Я цяпер мэр горада. Мяне на выбарах падтрымалі камуністы.

К а ц я р ы н а. О, дык вы цяпер, сеньёр Тэрачыні, мэр горада? Віншую! А мы сустракалі вас без музыкі і прамоў.

Антоніо. Грацыя! Але я, Катарына, камрад, а не сеньёр.

Кірыла. А ваш горад вялікі?

Антоніо. Крыху меншы за Кіеў. Колькі ў вас насельніцтва?

Кірыла. Больш як паўтара мільёна.

Антоніо. А ў маім горадзе ў мінулым годзе было больш як дзесяць тысяч, а сёлета дзевяць сто...

Галіна. Столькі памерлі за год?

Антоніо. Не. Сёлета вясной больш тысячы выехалі ў Аўстралію, ФРГ, Канаду, Амерыку. У нас увесь час беспрацоўе...

Галіна. Назаўсёды паехалі?!

Антоніо. Так.

Кацярына *(да Кірылы.)* Налівайце.

Кірыла. З прыемнасцю. *(Налівае ўсім.)*

Галіна *(Кацярыне)*. А калі за стол?

Кацярына. Як прыедзе Антон.

Галіна. А калі ён...

Кацярына. Пачакаем...

Антоніо. Добры вермут.

Кірыла. Венгерскі.

Антоніо. У іх вельмі добрае чырвонае віно. Называецца, забыў... А... карова....

Капітан. Бык, бычыная кроў.

Антоніо. О, о! Можна?

Капітан. Просім, калі ласка.

Антоніо. За камрад Катарына. Ты адважны друг. У цяжкія гадзіны барацьбы ў падполлі супраць фашыстаў Катарына была проста мужчына. Ніколі не была песіміст... Усім нам маладая савецкая сеньярыта была... была *(да Кацярыны гаворыць па-італьянску «прыклад»)*.

Кацярына. Не трэба, Антоніо.

Капітан. Прыклад.

Антоніо. О, прыклад! Катарына — вялікае, гарачае сэрца. Ты вельмі, вельмі... прыгожы чалавек!

Усе. За ваша здароўе! *(Чокаюцца.)*

Кацярына. Дзякую, дзякую.

Кірыла ідзе ў другі пакой і хутка вяртаецца з гітарай. Пачынае спяваць без слоў італьянскую народную песню.

Антоніо. Вы знаеце? О, сеньёр артысто... *(Спявае.)*

Кірыла *(пасля таго як Антоніо скончыў)*. Бравісімо! *(Усе апладзіруюць.)*

Галіна. Слоў не разумею, але, напэўна, пра каханне.

Антоніо. Гэта вас сеньёра Катарына навучыла?

Кірыла. Так.

Антоніо. Я вельмі рад, што не забыла.

Кацярына. А ты помніш, калі першы раз ты праспяваў яе мне?

Антоніо. Помню. То быў вялікі дзень нашага жыцця. Я раскажу, дазволь? *(Кацярына кіўнула галавой.)* У нас была вельмі важная аперацыя, трэба было ўзарваць склад с фаўстснарадамі. Я да гэтага часу не разумею — чаму ў той аперацыі самую цяжкую работу даручыў наш кіраўнік табе, Катарына? Ты вельмі прасіла яго?

Кацярына. Прасіла. А галоўнае — пераканала яго, што я павінна пайсці з магнітнымі мінамі.

Антоніо. Не паслаў нас, мужчын, а цябе... Які суровы, жорсткі быў час...

Кацярына. Ён правільна зрабіў. Ты ведаеш, самыя храбрыя людзі, калі ідуць на аперацыю, думаюць, што вернуцца жывымі. Гэта ж нармальна. У рашаючую хвіліну інстынкт самазахавання пачынае дзейнічаць з вялікай сілай. Тады чалавек можа зрабіць памылку. А памылкі не магло быць. Я ішла на смерць. Так вырашыла. Таму ўсё рабіла спакойна і дакладна. Зняла кінжалам аднаго вартавога, потым другога, магнітныя міны прыладзіла якраз так, як ты вучыў мяне, і вярнулася да цябе.

Антоніо. На смерць... Вы, камуністы, асаблівыя людзі.

Кацярына. Я тады не была камуністкай.

Антоніо. Як? А мы ўсе лічылі цябе...

Капітан. Народ наш такі. І камуністы, і беспартыйныя грудзьмі ішлі на амбразуры... Таранілі самалёты.

Антоніо. У нас многа пісалі: славянская душа — гэта вялікая таямніца.

Кацярына. А ты верыш у гэта?

Антоніо. Так.

Кацярына. Гэта выдумкі, Антоніо. На амбразуры ішлі не толькі славяне, а і сыны ўсіх народаў нашай краіны. У нас вера не рэлігійная, не містычная, а моцная, як жыццё. Яна дае нам сілу смела глядзець смерці ў вочы. Гэтую веру даў нам Ленін.

Антоніо. Ленін... Ленін... А вы знаеце, што я крыху асабіста знаёмы з Леніным?

Капітан. Як?

Антоніо. Мой дзед працаваў афіцыянтам у адным

кафэ ў Жэневе. У тое кафэ вечарамі часта заходзіў Ленін... з сеньёрай...

К а ц я р ы н а. Крупскай.

А н т о н і о. Так, так. Дзед мой заўсёды падаваў ім каву і меў шчасце размаўляць з Леніным і нават спяваў яму нашы народныя песні. Дзед вельмі хораша спяваў. Ён расказваў, што Ленін больш за ўсё любіў слухаць нашу народную песню пра Гарыбальдзі. Дзед часта і многа расказваў пра гэта, і мне здаецца, што я сам спяваў і падаваў Леніну каву. Дзед заўсёды свой расказ заканчваў так — ён гаварыў урачыста: «Сеньёры! Усе Гарыбальдзі свету разам — гэта Ленін!»

К а п і т а н. Вып'ем за вашага разумнага дзеда!

А н т о н і о. Грацыя! *(П'юць.)* А скажыце, чаму зараз у нас і ў іншых краінах Захаду не толькі сярод сацыялістаў, а і сярод камуністаў столькі з'явілася тэарэтыкаў, якія крытыкуюць вашу партыю і нават лічаць састарэлымі некаторыя ленінскія ідэі? Вы ведаеце пра гэта?

К а п і т а н. Знаем. У тых людзей або непамернае самалюбства, або яны наогул нічога не цямяць. Нас пяцьдзесят год не толькі крытыкуюць, але і лаюць люта, нахабна... І не стамляецца свалата. А карабель наш ідзе.

К а ц я р ы н а. На Захадзе стала модным вучыць нас, як трэба жыць. Ні сораму, ні сумлення няма ў іх.

А н т о н і о. Які свет настаў. Прайшло столькі гадоў, і на першым нашым спатканні, Катарына, пра што гаворым? Ці не здаецца вам, што скора ўсе мы звар'яцеем ад палітыкі?

К а ц я р ы н а. Не думаю, Антоніо. Жыццё такое. Ад яе не ўцячэш і нідзе не схаваешся.

А н т о н і о. У нас шмат хто жыве зусім апалітычна.

К а ц я р ы н а *(усміхнулася)*. Гэта таксама палітыка.

Уваходзіць А н т о н, пакланіўся. Антоніо ўстаў.

К а ц я р ы н а. Пазнаёмся, мой друг Антоніо Тэрачыні, а гэта мой сын Антон.

А н т о н і о *(усхваляваны)*. Антоніо. *(Ідзе да Антона.)*

А н т о н *(падае руку)*. Антон.

К а ц я р ы н а *(паспешліва ўзяла пад руку Антоніо)*. Прашу да стала. Прашу ўсіх.

А н т о н. Бабуня, мне ніхто не званіў?

Г а л і н а. Не. *(Ціха.)* Знайшоў?

А н т о н. Не.

К а ц я р ы н а. Сядай, Антон.

Усе сядаюць.

А н т о н. Мама, на хвілінку.

К а ц я р ы н а *(падыходзіць да сына)*. Што, сынок?

А н т о н. Прабач... Я... мне трэба пайсці, у мяне неадкладная справа.

К а ц я р ы н а. Хоць паўгадзінкі пабудзь з намі. Няёмка.

А н т о н. Не магу.

К а ц я р ы н а. Антон, прашу цябе, хоць трошкі. Хадзем.

А н т о н. Добра. *(Ідзе да стала.)*

К а ц я р ы н а. Прашу ўсіх наліць.

К і р ы л а. Ужо зроблена.

К а п і т а н. Чакаем вашай каманды. Ваш тост.

Кацярына ўстала.

А н т о н і о. Скажыце, Антоніо, колькі вам гадоў?

А н т о н. Дваццаць тры.

А н т о н і о *(глядзіць на Кацярыну)*. Катарына...

Кацярына рэзка павярнулася да яго, зваліўся бакал.

К і р ы л а. Гэта на шчасце.

У с е. На шчасце! На шчасце!

Заслона.

ДЗЕЯ ДРУГАЯ

КАРЦІНА ЧАЦВЕРТАЯ

Ноч. Помнік Славы ў Кіеве. Здалёк віднеецца асветлены пражэктарамі высокі абеліск, каля абеліска гарыць Вечны агонь. За абеліскам залатыя купалы Лаўры. Ад абеліска алея. На садовай лаўцы сядзіць В а р в а р а С ц я п а н а ў н а ў белым фартуху і з мятлой у руках. Па алеі ідзе да яе В о л ь г а П я т р о ў н а, яна таксама з мятлой.

В а р в а р а. Закончыла?

В о л ь г а. Усё. *(Садзіцца.)*

В а р в а р а. Стамілася?

В о л ь г а. Трохі. А ты?

Варвара. Стамілася. На той алеі зноў рамонт, панакідалі...

Вольга. Дзіўна, работу скончылі, а дамоў не хочацца ісці.

Варвара. Так. Які прыгажун — Кіеў наш, але гэта месцейка найлепшае. Нідзе такога няма.

Вольга. Няма. Вечная краса... Якая ўрачыстая яна... Дзякуй мудрым людзям, што збудавалі помнік на гэтай гары каля Лаўры.

Варвара. Я не раз думаю... От мы ў парку працавалі, на Уладзімірскай гары. Таксама — недзе ўнізе Дняпро, магутныя дрэвы алеі, князь Уладзімір з крыжам. Краса вялікая, але на душы ніколі не было такога, як тут. Там махаеш мятлой, і ўсё.

Вольга. І не раўняй. Тут у нас самая адказная праца. Чысціня павінна быць, як у храме, бо сюды прыходзяць з адкрытаю душой і чыстым сэрцам.

Варвара. Учора сюды прыйшла цэлая зграя барадатых і патлатых з дзяўчатамі. Памятаеш, што яны вырабляюць каля князя Уладзіміра? Глядзець сорамна, а тут... Сталі каля Вечнага агню, схілілі галовы, і як палілася музыка — хор «Стэпам, стэпам...», так і змяніліся іх аблічча, сталі, ну, як святыя на старых іконах.

Вольга. А стары генерал яшчэ стаіць каля абеліска?

Варвара. Штодня прыходзіць, сардэчны.

Вольга. Двойчы герой. Кожнага вечара пры любым надвор'і прыходзіць сюды.

Варвара. Салдатаў сваіх успамінае.

Вольга. Ты прыкмеціла, ён заўжды нешта шэпча.

Варвара. Мабыць, з імі размаўляе, таму толькі ўначы і прыходзіць, калі нікога няма.

Вольга. А можа, сын яго тут ляжыць?

Варвара. А я ў яго спытаю.

Вольга. А мо няёмка?

Варвара. А чаму?

Падыходзяць Кацярына і Антоніо. У руках у іх кветкі.

Варвара. Выбачайце, каторая гадзіна?

Кацярына. Адзінаццаць. *(Ідуць да абеліска.)*

Варвара. Дзякую.

Вольга. Бачыла, якія ў іх аблічча?

Варвара. Відаць, таксама перажылі.

Вольга. Скажы, Вара, ці ёсць людзі, якія жывуць і нічога не перажываюць?

Варвара. Ёсць. Але такія толькі называюцца людзьмі, а папраўдзе... *(Махнула рукой.)*

Вольга. Што?

Варвара. Субчыкі, жэўжыкі, паразіты, і жывуць шыкарна, падлюкі.

Вольга. Адкуль жа яны бяруцца?

Варвара. Адкуль? А ты падумай, адкуль бяруцца прусакі, тараканы, моль і ўсякая нечысць? У шчылінах заводзяцца. Мабыць, у нашых законах яшчэ замнога шчылін гэтых, вось яны і лезуць з іх.

Вольга. А якія б добрыя законы ні былі б, нішто не дапаможа, калі няма *(падняла мятлу)* — добрай мятлы. Даручылі б нам *(патрэсла мятлой)*.

Варвара. Цішэй, генерал ідзе.

Варвара і Вольга глядзяць у бок абеліска. На алеі з'яўляецца стары генерал. На грудзях дзве Зоркі Героя і шмат радкоў ордэнскіх планак. У руцэ ў яго шапка. Ідзе павольна. Павярнуўся, хвіліну паглядзеў на абеліск, потым падышоў бліжэй. Варвара і Вольга ўсталі.

Генерал. Добры вечар!

Варвара і Вольга. Добры вечар, таварыш генерал!

Генерал. Вялікае дзякуй вам, вялікае дзякуй.

Варвара. За што?

Генерал. За вашу чэсную працу.

Вольга. Інакш і быць не можа, тут месца такое.

Генерал. Святое, святое месца.

Варвара. Даруйце, таварыш генерал, можна ў вас запытаць?

Генерал. Можна.

Варвара. Кожны вечар вы сюды прыходзіце. Ці не сын або друг ваш тут ляжыць.

Генерал. Усе яны мае баявыя сябры, мае сыны... *(Паўза.)* Усе. *(Вялікая паўза. Надзявае шапку.)* Бывайце здаровы. *(Казырнуў.)*

Вольга і Варвара. Бывайце здаровы, таварыш генерал.

Праводзяць яго вачамі.

Варвара *(усхвалявана)*. Так мне хацелася яго пацалаваць, ды пабаялася. Падумай, Вольга, колькі людзей сюды прыходзяць, а ніхто не сказаў нам: «За вашу чэсную працу дзякуй».

В о л ь г а. А я стаяла перад ім, як некалі на фронце перад нашым лейтэнантам... Строгі быў. Нават калі распякаў, такі быў прыгожы! Трымчу перад ім, а ў душы...

В а р в а р а. Ану, Вольга, зброю на пля-чо! Пайшлі да мяне вячэраць.

В а р в а р а і В о л ь г а ўзялі мётлы па плечы і горда ідуць.

Чарнявы быў?

В о л ь г а. Кудры, як золата. Калі гэта было, а сорамна прызнацца, сніцца мне лейтэнант. *(Выходзяць.)*

З Дняпра чуваць трывожная сірэна парахода. К а ц я р ы н а і А н т о н і о вяртаюцца ад абеліска.

К а ц я р ы н а. Паседзімо тут.

Антоніо кіўнуў галавой. Сядаюць. Паўза.

А н т о н і о. У нас, у Італіі, многа помнікаў розных эпох, але такога ў нас няма. Мне цяжка гаварыць... Я так усхваляваны, Катарына...

К а ц я р ы н а. І я кожны раз, калі прыходжу сюды, ледзьве стрымліваю сябе... *(Паўза.)* Помнік Славы і вялікага гора народнага... Мільёны ў зямельцы, а колькі загінула ад голаду... У розных ярах ды рвах на Украіне і да гэтага часу дажджы вымываюць людскія костачкі. І пасля такіх ахвяр на нас нацэльваюць зноў, і не простую, а атамную зброю.

А н т о н і о. Праўду пішуць у нас пісьменнікі: чалавек бяссільны, не можа адолець Молаха вайны. Спрадвеку змагаецца, а што? І гэта не песімізм, гэта праўда.

К а ц я р ы н а. Не, гэта здрада. Цынічная і бессаромная.

А н т о н і о. Іх можна лаяць, але факты, факты! Тэрмаядзерных бомбаў, ракет зараз столькі, што можна чатыры разы знішчыць усё жывое на нашай планеце. Пра гэта пішуць вялікія вучоныя фізікі, а яны добра дасведчаныя. Мы яшчэ не знаем, якія бактэрыі выводзяцца ў звышсакрэтных лабараторыях Амерыкі, але тое, што пранікае ў прэсу, яшчэ горш за атамную зброю. Свет звар'яцеў, няўжо ты не бачыш гэтага? Катарына?

К а ц я р ы н а. Там-там управа, там-там улева.

А н т о н і о. Не разумею цябе.

К а ц я р ы н а. Я думаю, хутчэй трэба стаць на калені перад імперыялістамі, падняць рукі ўгару, маліць іх, злітуйцеся над намі, бяссільнымі, мы вашы вечныя рабы.

А н т о н і о. Я так не думаю. Ты мяне не зразумела.

К а ц я р ы н а. Веру, веру, што так не думаеш, але ты не заўважаеш, як у душы ў цябе там-там, там-там, трохі ўлева, трохі ўправа. *(Усміхнулася.)*

А н т о н і о. А што зробіш, калі ўсё не так проста. Гадзіннік нашай Еўропы заводзяць не дома, а за акіянам. Гэта вялікая трагедыя, і не толькі наша.

К а ц я р ы н а. Разумею... Скажы, Антоніо, як ты адшукаў мяне.

А н т о н і о. О, гэта цэлая эпапея. Колькі гадоў я звяртаўся да вашага амбасада...

К а ц я р ы н а. Пасольства.

А н т о н і о. Пасольства. Пісаў ім, пісаў, але не мог чаго-небудзь даведацца. А сёлета прыехала ў наш горад дэлегацыя савецкіх журналістаў. Я прымаў іх у мэрыі. Сярод іх быў адзін з Кіева. Васіль...

К а ц я р ы н а. Марозка.

А н т о н і о. Я папрасіў яго...

К а ц я р ы н а. Ён знайшоў мяне, перадаў тваё пісьмо.

А н т о н і о. І ён мне напісаў, а ты — ні слова. Чаму? *(Паўза)*. Катарына?

К а ц я р ы н а. Я вельмі хацела, колькі напісала я табе лістоў! Напішу, прачытаю — парву... Не магла...

А н т о н і о. Ты сапраўды рада, што я знайшоў цябе?

К а ц я р ы н а. Рада, чэсна, вельмі рада, Антоніо.

А н т о н і о. Заўтра раніцой я вылятаю ў Маскву, а на другі дзень разам з дэлегацыяй нашых мэраў — у Італію...

К а ц я р ы н а. Хадзем.

А н т о н і о. Катарына... Антон мой сын, мой? Гэта праўда?

Паўза.

К а ц я р ы н а *(ціха)*. Праўда.

А н т о н і о. Чаму ты не хацела сказаць?

К а ц я р ы н а. Антон не павінен ведаць, што ты яго бацька. Не павінен, бо...

А н т о н і о. Хіба я не варты павагі чалавек?

К а ц я р ы н а. Антоніо... Не тое, не тое... Божа мой, як табе растлумачыць, каб ты зразумеў...

А н т о н і о. Я павінен ведаць чаму.

К а ц я р ы н а. Калі я вярнулася тады адтуль, мяне правяралі нашы... У лагеры я нарадзіла сына... Чаго я толькі не перажыла... Ад каго сын, пыталіся ў мяне. І я сказала: «Ад нашага кіраўніка».

А н т о н і о. Сяржанта Колі?

Кацярына. Так... У той аперацыі ён загінуў. Сын верыць, што палонны сяржант Мікола Чабан, падпольшчык — яго бацька, які загінуў як герой.

Антоніо. Чаму ты не сказала праўду вашым?

Заспяваў салавей.

Кацярына. То быў такі час, Антоніо. Я не магла даказаць, што дзіця ад цябе, добрага, чэснага друга, а не якога-небудзь фашыста.

Антоніо. Яны маглі мяне знайсці.

Зноў заспяваў салавей.

Кацярына. Антоніо, Антоніо, хто тады цябе шукаў бы? Такіх, як я,— тысячы вярнуліся з няволі. І сярод іх былі і шлюхі, і здрадніцы, якія ўцякалі з немцамі, а потым прыкінуліся, што іх вывезлі пад прымусамі...

Антоніо. Колькі ты адпакутавала!.. Я прасіў цябе паехаць са мной у Італію. Усё было б інакш... У цябе, у мяне... Ты ж любіла мяне.

Кацярына. Любіла.

Антоніо. Чаму ж не паехала?

Кацярына. Чаму? *(Заспявау салавей.)* Чуеш? Гэта салавей... Маленькая пташка. Але і яна скрозь буры і навальніцы, цераз моры і горы ляціць да роднага гнязда... А калі і гняздо зруйнавана... Хіба можна... Не... Я не магла... Ты павінен зразумець... *(Паўза.)* Антоніо, дай слова *(паўза)* таварыша, друга... *(Паўза.)* Не гавары Антону... Я разумею, як цяжка табе, але так трэба...

Антоніо. Ты патрабуеш ад мяне... Ты разумееш, не... Смешны Антоніо, праўда? Забыў простую ісціну, гады выветрываюць не толькі скалы, але і сэрцы.

Кацярына. Антоніо... *(Глядзіць на яго. Вялікая паўза.)* Гады выветрываюць, руйнуюць, але сапраўднага кахання ні гады, ні буры, ні навальніцы, ніякая сіла не можа адолець. Я чакала цябе, я верыла, я зберагла ўсё, я люблю цябе, люблю. *(Паўза.)*

Антоніо. Каця! Сеньёрыта Каця, даруй, даруй!

Паўза. Кацярына правяла рукой па яго галаве.

Я вельмі пастарэў?

Кацярына. Не, Антоніо.

Антоніо. Ты другі раз зрабіла мяне шчаслівейшым чалавекам на свеце. Грацыа, грацыа, Катарына! *(Паўза.)* Дазволь яшчэ раз прыехаць да цябе.

Кацярына. Прыязджай. Буду чакаць.

Чуваць музыка і спевы ад абеліска.

Антоніо. Што гэта?

Кацярына. Устань, Антоніо, гэта наш рэквіем.

Антоніо ўстаў. Гучыць рэквіем «Стэпам, стэпам...». Стаяць Кацярына і Антоніо.

Антоніо. Каб ты ведала, што зараз у маім сэрцы. *(Яшчэ мацней загучаў рэквіем.)* Катарына!..

Заслона.

КАРЦІНА ПЯТАЯ

Ноч. У блакітным ззянні кватэра Кацярыны Міхайлаўны. Скрозь расчынены балкон і вокны відаць, як удалечыні мігцяць агні высокага берага. І кароткія гудкі барж каля мастоў, і звон гітары, і песня закаханых не парушаюць цішыні, а робяць яе яшчэ больш мігатліваю і ласкавай...

З свайго пакоя выйшаў **Антон.** Ён у майцы і трусах. Падыходзіць да балкона, слухае песню і звон гітары, і калі заціхла песня, ледзь-ледзь чуваць гітара. Антон падыходзіць да тэлефона, здымае трубку, хацеў набраць нумар, але перадумаў. Паклаў трубку, падышоў да стала, засвяціў невялічкую лямпачку, узяў паперу, ручку і пачаў пісаць.

Антон *(піша і некаторыя фразы гаворыць шэптам).* Не, ты, Рая, не разумееш. Я чытаў разумную кнігу, дзе было сказана: ва ўсе гістарычныя эпохі людзі па-рознаму вызначалі самае высокае: не *(перакрэсліў, піша)*, самае глыбокае пачуццё — каханне, але аснова была і астанецца адна — вернасць! *(Узняў галаву.)* Там нешта было сказана пра ахвяру. Здаецца, так. *(Піша.)* Сапраўднае, страснае каханне патрабуе ахвяры. *(Узняў галаву, гаворыць.)* Прыгожа! Каханне патрабуе ахвяры. Падкрэслім. Чытай, Рая, і думай, думай. А чаму ахвяры? Чаму? Так было здаўна, а цяпер у нас... Калі ты чэсна кахаеш, калі ты не падонак, свіння, то хто табе можа перашкодзіць? Хто? Не, такая далікатная фраза ні к чаму. Напішам так. *(Піша і гаворыць.)* Райка, птушка, крылца маё, жыццё маё, не можа быць сапраўднага кахання без барацьбы за друга, без веры каханаму. Гэта... Гэта... *(Зноў чуваць гітара і песня.)* Як сказаць, каб дайшло? *(Адбівае гарадскі гадзіннік.)* Чатыры гадзіны. Хутка світанне, а яны яшчэ

бадзяюцца і дзяруць глоткі. *(Слухае песню.)* Пра каханне спяваюць, дзівакі. Эх, вось так і я хадзіў бы з табой, Рая, да світання і спяваў бы табе... Чаму, чаму, ты, Рая?.. *(Заціхла песня, скончылася. Антон павяртаецца да стала, піша, а потым гаворыць.)* Гэта... Найвялікшае, найпрыгажэйшае, непаўторнае пачуццё, якое і ёсць — жыццё. *(Узняў галаву.)* Ці правільна гэта? *(Чуваць гудкі барж каля моста.)* Верна! Так, Рая, гэта так... Калі чалавек знянацку, пад уплывам выбуху, хай сабе самых бурных пачуццяў, разрывае, знішчае веру ў друга, каханага, тады ён, даруй мне, можа ў цяжкую хвіліну... Так, так, не перапыняй, дай сказаць, можа здрадзіць не толькі дружбе, каханню... Усё, ідзі... Фу, які дурань! Божа мой, здаецца, я звар'яцеў. Як я мог падумаць такое! Яе выклікаю на суд, а сам, сам што думаю, гавару?.. Даруй, даруй, Рая.

Звініць гітара і песня. Вялікая паўза. Антон разрывае пісьмо. З пакоя Антона выходзіць у піжаме Антоніо.

Антон. Выбачайце, я разбудзіў вас?

Антоніо. Не, я не спаў.

Антон. Чаму?

Антоніо. А чаму вы не спіцё? Я чуў, як вы варочаліся ў пасцелі і нават стагналі.

Антон. Калі так свеціць месяц, я не магу спаць.

Антоніо. Разумею. Я таксама ў маладосці такімі начамі ніколі не спаў... Я быў там... Хораша спяваюць, як у нас у Італіі. Да світання звіняць гітары, мандаліны... Спяваюць пра каханне. *(Слухае.)* Прыгожа спяваюць. У вас няма дзяўчыны?

Антон. Ёсць.

Антоніо. Яна хворая?

Антон. Не.

Антоніо. Дык чаму ж вы дома?

Антон. У мяне з ёю...

Антоніо. Разумею. Гэта бывае. Вы дазволіце даць вам параду? Можна?

Антон. Прашу.

Антоніо. Бярыце гітару. У мяне не кепскі голас. Пойдзем разам і будзем спяваць пад балконам вашай дзяўчыны. Вы будзеце ўторыць мне без слоў. Яна выйдзе, яна не зможа не выйсці. Я знаю такія нашы песні, што нават бабулькі ўскокваюць з пасцелі і стогнуць ад асалоды і ўспамінаў. І няма такой дзяўчыны, жанчыны на свеце, апроч глухіх, вядома, якія б вытрымалі гэту хвалюючую,

прыгожую спакусу... У нас калі хто не ўмее спяваць, то просіць друга або наймае голас. Мне было чатырнаццаць год, і я падзарабляў — спяваў за безгалосых закаханых.

Антон. І вы зараз пайшлі б са мной?

Антоніо. Іду пераапрануся.

Антон. Чакайце.

Антоніо. Не траціце часу, хутка світанне, адзявайцеся!

Антон. Вы... вы, сеньёр Антоніо, вы сапраўдны таварыш. Дазвольце вас абняць. *(Абдымае Антоніо, а той моцна прытуляе Антона да сваіх грудзей. З свайго пакоя выходзіць Кацярына ў халаце. Яна спынілася каля дзвярэй. Яе не заўважаюць.)*

Антоніо *(усхвалявана)*. Я хачу вельмі... вельмі хачу, каб ваша каханне было шчаслівым. Каб вы ніколі не разарвалі, не страцілі свайго кахання, каб вы...

Антон. Дзякую. Я хачу вам сказаць...

Кацярына. Чаму вы не спіцё?

Антоніо. О, выбачайце, мы разбудзілі вас, сеньёра?

Кацярына. Я не спала... Не магу.

Антоніо. Мы таксама не можам. Сігарэту? *(Дае Кацярыне, Антону. Усе закурылі.)*

Кацярына. Закаханыя не спяць, чуеце, як спяваюць?

Антоніо. Мы таксама не спім, мы таксама закаханыя.

Антон. Толькі не спяваем.

Антоніо. О! Гэта можна! *(Пабег у пакой Антона і вынес гітару.)*

Кацярына. Прабач, Антоніо, мама спіць.

Антоніо. А...

Уваходзіць у халаце Галіна.

Галіна. Не сплю і я. І я закаханая. Так, так. Спявайце, калі ласка, спявайце.

Антон. Заспявайце нам тую песню, якую вы спявалі начамі сваёй дзяўчыне, калі ўпершыню пакахалі.

Кацярына. Суседзі спяць. Ва ўсіх адчынены вокны, балконы...

Антон. Можна ціха. Заспявайце, прашу вас.

Галіна. Так, так, так.

Кацярына. Мама!..

Галіна. Ціхенька, ціхенька.

Антоніо. Катарына не хоча, я не буду спяваць. *(Глядзіць на Кацярыну.)*

Кацярына. Спявай, спявай, Антоніо, толькі ціха.

Антоніо. Гэтую песню я заўсёды спяваю ціха.

Кацярына. Спявай, прашу цябе.

Антоніо перабірае струны і паціху пачынае спяваць сумную італьянскую песню пра каханне. Кацярына, Антон, Галіна з хваляваннем слухаюць. Непрыкметна да песні далучаецца Кацярына... усё галасней спявае Антоніо. Не скончыўшы песню, ён спыняецца. Вялікая паўза.

Антоніо *(ціха, узрушана)*. О, мадонна!

Кацярына. Ты словы забыў, Антоніо?

Антоніо. Нічога я не забыў. Я... я прыгадаў... Успомніў.

Кацярына. Паглядзіце, як палымнее ўжо неба!

Антон. Я разумею вас. Вы ўспомнілі сваю дзяўчыну. Напэўна, яна вам прынесла нямала гора. А можа, я памыляюся?

Антоніо. Не, не! Яна прынесла мне вялікае шчасце, такое шчасце... Але жыццё было цяжкае, яно нас разлучыла, але я захоўваю ў сваім сэрцы...

Вялікая паўза.

Антон. І ў мяне зараз... Не ведаю, што будзе.

Антоніо. Ніхто ніколі не можа знаць, што будзе, але што б там ні было, што б дзяўчына ні зрабіла, беражыце... Вельмі, вельмі беражыце сваё каханне. На ўсё жыццё.

Кацярына. Глядзіце, глядзіце, ужо світае. *(Але ніхто не павярнуўся. Кацярына стаіць каля балкона, глядзіць на неба. Павеяў ветрык, паварушыў яе валасы. Кацярына адкінула паску і рэзка павярнулася.)* Чаму вы змоўклі?

Галіна *(ціха)*. Каця!..

Кацярына *(рэзка)*. Ты паглядзі, што робіцца на небе!

Антон. Мама, што з табою?

Усе пазіраюць на Кацярыну. Яшчэ ярчэй стала ружовае неба. Зайграў першы прамень на абеліску, на залатых купалах Лаўры.

Галіна. Вось і першыя промні зайгралі. Як хораша! Усім, усім павінна быць хораша. Я зараз згатую снеданне, зараз, зараз... *(Выходзіць.)*

Заслона.

КАРЦІНА ШОСТАЯ

Кватэра Кацярыны Міхайлаўны. У пакоі Галіна і капітан. Галіна вяжа світэр, капітан рамантуе прас, напяваючы песню. З вуліцы чуваць піянерская труба, барабаны і шум дзіцячых галасоў. Капітан падышоў да балкона, выглядае на вуліцу. Зазвінела піянерская песня. Капітан усміхнуўся і заспяваў.

Г а л і н а. Сёння дзень піянераў — свята.

К а п і т а н. А куды гэта яны маршыруюць?

Г а л і н а. На плошчу. Там збор, а потым усе ў порт, паедуць у Канеў...

Капітан спявае пaціху піянерскую песню і рамантуе прас.

Г а л і н а. А вы сёння, капітан, нейкі асаблівы.

К а п і т а н. Ды ну?

Г а л і н а. Песенькі спяваеце і ўвесь час усміхаецеся. Каму вы так усміхаецеся, капітан?

К а п і т а н. Мору.

Г а л і н а. Не разумею.

К а п і т а н. Сёння мяне выклікалі ў гарком партыі да апарата ВЧ, ёсць такі асобы тэлефон.

Г а л і н а. Ведаю.

К а п і т а н. Сакратар гаркома прыняў мяне добра. Спачатку, праўда, пакрытыкаваў, што раней не прадставіўся. Я папрасіў прабачэння, сказаў, што палічыў непатрэбным займаць яго дарагі час. Спраў у мяне не было такіх, каб... А ён: «А ў мяне да вас, Максім Максімавіч, ёсць. Вось апарат ВЧ, вас шукае начальнік параходства. Зараз пазвонім». І праз некалькі хвілін я пачуў вялікую музыку.

Г а л і н а. Музыку.

К а п і т а н. Гэта мы, капітаны, так называем магутны голас нашага дзеда — начальніка параходства. Ён чалавек таленавіты, вялікай культуры, з матросаў, а на такую вышыню ўзняўся. Але з капітанамі размаўляе такімі словамі, што нават грузчыкі яму зайздросцяць.

Г а л і н а. І вы церпіце?

К а п і т а н. Што вы! Гэта вялікая і самая прыгожая музыка. Не дай бог, каб загаварыў далікатна. Тады канец. Толькі я павітаўся са старым, а ён як загрыміць: «Стары цюлень! Ляжыш на беразе дагары... *(кашлянуў)* хвастом!» Ну, і пайшла музыка... Тэлефон спраўны, усё чуваць, сакратар аж на стол лёг ад смеху. А я: «Так точна. Так точна»... І чакаю, пакуль хрыпата з'явіцца. Нарэшце

чую: «Ты разумееш, Максім, В'етнаму трэба даставіць асобы груз, цацкі, разумееш?» — «Так точна!» — адказваю. І застагнаў дзед: «Праз вас, чарцей, зусім голас страчу,— і як загрыміць,— Пятро Гайдабурга, д'ябал, у бальніцу лёг на аперацыю. Казаў жа яму — не пі віскі, а пі нашу. Язва адкрылася... Павядзеш яго пасудзіну. Быць на капітанскім мосціку дваццатага роўна ў восем нуль-нуль. Зразумеў?» — «Ёсць!» — адказваю.

Г а л і н а. В'етнам...

К а п і т а н. Я хадзіў туды. Неаднойчы вазіў туды сталёвыя цацкі, абсталяванне для шпіталяў і іншыя падарункі. Цікавы рэйс, адказны!

Г а л і н а. Сёння пятнаццатае. Праз чатыры дні ад'язджаеце...

К а п і т а н. Заўтра вылятаю ў Адэсу. Спраў шмат.

Г а л і н а. Антон і вы ад'язджаеце...

Капітан уключыў прас у разетку, паставіў яго на стол.

К а п і т а н. З вас магарыч, Галіна Раманаўна. Дыхае.

Г а л і н а. Магарыч будзе. Вернуцца нашы з вакзала, пастаўлю налівачку. На два гады... Буду сумаваць без Антона...

К а п і т а н. Добры хлапчына! Правільна зрабіў. Мне было пятнаццаць гадоў, як я пайшоў палубу драіць. Калі юнак не марыць пабачыць свет, ён ужо дзядок.

Г а л і н а. У пятнаццаць гадкоў...

К а п і т а н. Усё маё жыццё прайшло на моры.

Г а л і н а. Прайшло? Што вы! Вы яшчэ...

К а п і т а н. Які?

Г а л і н а. Я спадзяюся на вашым вяселлі пагуляць.

К а п і т а н. Жартуеце.

Г а л і н а. Ні кропелькі. У нашым доме жыве адзін мастак. Яму шэсцьдзесят пяць. Ажаніўся. Не ведаю, як ён малюе, а... такая дзяўчына ў іх нарадзілася! Карцінка! А вам жа ўсяго толькі шэсцьдзесят тры.

К а п і т а н. Э-э, выбачайце! Шэсцьдзесят два і тры месяцы.

Г а л і н а. Тым лепш. І як вы маглі жыць халасцяком? Яшчэ можна зразумець Кірылу Сяргеевіча, ён артыст-гумарыст, усё жыццё смяшыў людзей і не заўважыў, як восень падкралася. Але і яму не позна.

К а п і т а н. Такая наша доля маракоў далёкага плавання. Тры, чатыры разы за год прыходзіш у свой порт на некалькі дзён... Бачыў я такія драмы!..

Г а л і н а. І вы спалохаліся?
К а п і т а н. Ды як вам сказаць...
Г а л і н а. Не трэба. Не думала, што вы такі.
К а п і т а н. У маладосці я два разы так апёкся...
Г а л і н а. Аж два разы. Бедненькі!
К а п і т а н. Не смейцеся!
Г а л і н а. Я вам пашукаю вясёлую, разумную, з добрым сэрцам удавіцу. І каб юшку ўмела згатаваць. Возьмеце яе на свой шлюп і паплывеце з ёю аж да мора.
К а п і т а н. А можа, не трэба шукаць?
Г а л і н а. Чаму?
К а п і т а н. Пакуль знойдзеце, а раптам яна не падыдзе, а час ляціць...
Г а л і н а. Чаму вы змоўклі, капітан?
К а п і т а н. Калі вы прыязджалі на наш карабель да брата, гэта было...
Г а л і н а. Чвэрць стагоддзя назад.
К а п і т а н. Ды што вы! Усяго дваццаць тры гады.
Г а л і н а. Выбачайце за маю вялікую памылку. А вы тады падпаілі мяне і такое нагаварылі... А я і...
К а п і т а н. У мяне і зараз душа...
Г а л і н а. Гарыць?
К а п і т а н. Гарыць!
Г а л і н а. Гарыць... Божа мой, любы мой капітан! Выцягніце штэпсель!

Капітан хуценька выцягнуў штэпсель. Галіна падняла прас.

Г а л і н а. Капітан, капітан...
К а п і т а н. Загарэлася?
Г а л і н а. Згарэла...
К а п і т а н. Даруйце! Які я стаў няўважлівы. Вось яна — старасць.
Г а л і н а. Вы такім былі заўжды. Гэта я заўважыла яшчэ тады, калі была ў гасцях на вашым параходзе.
К а п і т а н. Няўжо?
Г а л і н а. Так, так, капітан.

Уваходзіць К і р ы л а.

К і р ы л а. Дарагая Галіна Раманаўна! Маю даручэнне — пацалаваць вас.
Г а л і н а. Антон...
К і р ы л а. Ён! Дазвольце вашу ручку. *(Цалуе ёй руку.)*

Г а л і н а. Расказвайце, толькі ўсё, усе дэталі. Прыехалі на вакзал...

К і р ы л а. Шчасліва выйшлі на перон, а там народу!

Г а л і н а. Прыйшлі праводзіць нашых хлопцаў?

К і р ы л а. Не толькі. Але каля дзесятага вагона сабралася многа моладзі.

Г а л і н а. Вы падыходзіце...

К і р ы л а. Падыходзім, усе крыкнулі: «Ура, ура брыгадзіру!» Схапілі Антона і давай падкідваць яго.

Г а л і н а. О, бог ты мой! І высока кідалі?

К і р ы л а. Высока і доўга. Ён ледзь вырваўся з іх рук. А кветак прынеслі Антону і яго брыгадзе!..

Г а л і н а. А музыка была?

К і р ы л а. Аркестр! Дзесяць гітар і пяць спідол! Крыкі, спевы, пацалункі... Такіх вясёлых, шумлівых праводзін я яшчэ не бачыў. І ў цэнтры наш Антон!

Г а л і н а. Яго любяць. І брыгадзір, і сакратар камсамола, і ў футболе гэты... як яго... цэнтр. А як ён трымаўся, калі развітваўся з мамай?

К і р ы л а. Расхваляваўся да слёз. І мяне тройчы пацалаваў...

Г а л і н а. А Рая была?

К і р ы л а. Калі поезд рушыў, тады яна прыбегла на перон.

Г а л і н а. Антон яе ўбачыў?

К і р ы л а. Яна так крыкнула «Антон!», што ён пачуў. І таксама крыкнуў: «Рая!» Потым яшчэ нешта крычаў, мабыць — «чакай мяне!». Да Раі падышла Кацярына Міхайлаўна, і яны пайшлі разам. Я зразумеў, што я там — лішні, і хуценька сюды, каб расказаць вам пра ўсё, пра ўсё... як было.

Г а л і н а. Дзякую. А зараз я сабяру на стол, і будзем усе вячэраць. А вы яшчэ раз раскажыце ўсё спачатку.

К і р ы л а. З вялікім задавальненнем.

К а п і т а н. Кіруша, у мяне да цябе вялікая справа. *(Тонам свайго начальніка.)* Досыць табе, стары цюлень, хвастом біць па беразе! Прымай заўтра маю пасудзіну! Быць на палубе майго шлюпа роўна ў восем нуль-нуль!

К і р ы л а. Што?

К а п і т а н. Маўчаць, калі стары гаворыць! Заўтра я аддаю канцы. Лячу ў Адэсу прымаць карабель. Сорак тысяч тон. Ты разумееш? *(Абняў Кірылу.)* Я зноў — капітан, сто тысяч салёных, марынаваных, капчоных чарцей!

К і р ы л а. Віншую, дружа, віншую! Ура! Так, у гонар гэтага хвалюючага выпадку я зараз прынясу з свайго загашніка пляшку пярцовачкі. Вы дазваляеце, Галіна Раманаўна?

Г а л і н а. Сам бог загадаў!

К і р ы л а. Бягу! *(Выходзіць.)*

Г а л і н а. Зараз прыгатую селядца, звару бульбачкі. Скора Каця прыйдзе. Шкадую, што сама не змагла паехаць на вакзал.

К а п і т а н. А чаму вы не паехалі?

Г а л і н а. З Масквы павінен пазваніць Антоніо. Мяне Каця пакінула вартаваць тэлефон.

К а п і т а н. Званіў.

Г а л і н а. Не.

К а п і т а н. Добры дзядзька — гэты італьянец. Шкада, што маятнік.

Г а л і н а. Дужа добры... Каб не ён, загінула б Каця. Месяц хаваліся ўдваіх пасля выбуху, аж пакуль не прыйшлі амерыканцы...

К а п і т а н. Шкада, што так хутка паехаў. Хацеў яшчэ з ім пагутарыць.

Г а л і н а. Спяшаўся... Вельмі спяшаўся. А можа, і к лепшаму, што паехаў... Каця хвалявалася, усё-такі...

К а п і т а н. Разумею... Такая сустрэча штарміць чалавека.

Г а л і н а. Падабаецца вам мая работа? *(Паказвае світэр.)*

К а п і т а н. Вельмі. Каму гэта вы?

Г а л і н а. Другу Кірылы Сяргеевіча. На поўначы жыве, хворы. Усё жыццё яны разам смяшылі. Кірыла быў Паташонам, а друг яго — Патам. Летась... не, пазалетась прыязджаў. Мы думалі, што жываты парвём ад іх куплетаў. Пат во такія вусы пачапіў. Абодва апраналіся ў такія смешныя касцюмы, на галаве капелюшы, а на нагах пантофлі па паўметра. Абое ігралі на маленькіх гармоніках.

К а п і т а н. Я некалі ў кіно бачыў Пата і Паташона. І праўда — памерці можна ад смеху.

Уваходзіць К і р ы л а. Ён у касцюме Паташона. У адной руцэ гармонік, а ў другой — тэлеграма.

К а п і т а н. О!

Г а л і н а *(крыкнула)*. Што?!

К і р ы л а *(паказвае тэлеграму)*. Пат памёр...

Вялікая паўза.

Г а л і н а. А я світэр яму.

К а п і т а н. Супакойся, Кіруша. *(Ціха.)* Што ты так?..

К і р ы л а. Ён прасіў... Я выконваю яго апошняе пажаданне. *(Зайграў на гармоніку, на абліччы з'явілася ўсмешка, і ён пачаў тонам Паташона.)* Дарагія гледачы! Мой друг трошкі спазніўся... Але ён скора, во-во будзе. Ён заўсёды будзе з намі, як усмешка, як смех радасці, без якога нельга ні жыць, ні працаваць, ні кахаць, ні змагацца, ні перамагаць... Ён прасіў мяне праспяваць наш першы куплет. Я буду спяваць і за Пата і за сябе... Дык вось, мы пачынаем. Спявае Пат! *(Кірыла спявае куплеты Пата.)* А цяпер спяваю я. *(Паташон спявае.)* Даруйце, я... я... не магу... *(Схіліў галаву, іграючы, выходзіць.)*

К а п і т а н выходзіць следам за Кірылам. Галіна павольна згортвае світэр. Уваходзіць К а ц я р ы н а. Яна зняла плашч, кінула яго, падыходзіць да Галіны, глядзіць ёй у твар, выцірае маці слёзы.

К а ц я р ы н а. Хоць ты ўжо трымайся, мама. Чуеш?

Г а л і н а. Два гады хутка праляцяць... З Масквы не званілі...

К а ц я р ы н а. За адзін дзень столькі...

Г а л і н а. Каця... Кацюша...

К а ц я р ы н а. Не бойся, мама, я вытрымаю... Вытрымаю. А табе нельга хвалявацца, чуеш? Бачыш, я ўжо ўзяла сябе ў рукі. Не плач, чуеш, мы ж з табой салдаты... Усё жыццё салдаты... Ты сама так навучыла мяне. Усё жыццё, мама.

Здалёк чуецца духавы аркестр. Уваходзіць к а п і т а н.

К а п і т а н. Ці няма ў вас якіх-небудзь кропель. У Кірылы сэрца...

Г а л і н а. Зараз. *(Прынесла пляшачку з лекамі.)* Хадзем. Каця, я на хвілiначку, я зараз.

К а ц я р ы н а. Ідзі... Ідзі...

Чуваць трывожныя гудкі параходаў. Нерухома стаіць Кацярына. Уваходзіць Р а я з чамаданам. Спынілася каля дзвярэй, Кацярына яе не бачыць.

К а ц я р ы н а. Усё жыццё... Усё жыццё...

Рая ціха апусцілася на крэсла. Усё бліжэй іграе аркестр вясенні марш. Гучыць хор піянераў. Кацярына падыходзіць да балкона.

Канец.

КАМЕНТАРЫІ

У чацвёрты том Збору твораў Андрэя Макаёнка ўвайшлі аднаактовыя п'есы, драма «Узыходы шчасця», а таксама некаторыя пераклады. Па сведчанні самога драматурга, усе яго аднаактовыя п'есы ставіліся калектывамі мастацкай самадзейнасці, аднак канкрэтных звестак пра гэтыя пастаноўкі не захавалася. Друкуюцца ўсе выяўленыя аднаактоўкі А. Макаёнка, але не ўсе з напісаных ім: частка згарэла пры пажары на дачы. Таксама далёка не поўна прадстаўлены пераклады: лімітаванасць аб'ёму выдання не дазволіла ўключыць у яго пераклады п'ес «Жаніхі» А. Такоева, «Прага застаецца маёй» А. Буракоўскага, «Персанальная справа» А. Штэйна, «Дабракі» Л. Зорына, «Трэцяе жаданне» А. Блажака, «Гаспадар» І. Собалева, «Чацвёрты» К. Сіманава, «Антэі» і «За Сібір'ю сонца ўсходзіць» М. Заруднага, «Свой востраў» Р. Каўгвера і многія іншыя. Не друкуецца таксама пераклад (разам з П. Ізохам) рамана азербайджанскага пісьменніка Мірзы Ібрагімава «Настане дзень». Пры выбары перакладаў для гэтага выдання ўлічвалася не толькі мастацкая вартасць арыгіналаў, перакладчыцкае майстэрства А. Макаёнка, але і той рэзананс, які атрымала перакладзеная п'еса на беларускай сцэне.

ДОБРА, КАЛІ ДОБРА КАНЧАЕЦЦА (с. 7)

П'еса напісана ў 1945 годзе. Публікавалася толькі аднойчы — у газеце «Чырвоная змена» (1946, 13 ліпеня). Гэта першы твор пісьменніка, які трапіў у друк. Задума п'есы нарадзілася пад уздзеяннем, з аднаго боку, непераадольнага жадання тварыць, якое валодала А. Макаёнкам яшчэ ў дзяцінстве-малалецтве, а да сярэдзіны 40-х гадоў акрэслілася ў жыццёвую праграму, і непасрэднага сацыяльнага заказу часу — з другога. Справа ў тым, што, працуючы ў 1945 годзе сакратаром Гродзенскага гаркома камсамола, будучы драматург сутыкнуўся з праблемай барацьбы супраць залішняга ўплыву царквы на свядомасць моладзі. Адным з дзейсных сродкаў для дасягнення мэты, лічылі ў гаркоме, можа стаць мастацкая самадзейнасць. Але ж адсутнасць у апусцелых за гады вайны бібліятэках сцэнарыяў для літмантажоў, песеннікаў, драматургічных тэкстаў зводзіла на нішто самыя найлепшыя намеры. Даводзілася змагацца з дэфіцытам уласнымі сіламі. У выніку — п'еса была напісана і адразу ж трапіла на самадзейную сцэну.

І ў цэлым яе лёс можна лічыць шчаслівым. Па-першае, яна стала першай драматургічнай публікацыяй А. Макаёнка. А па-другое, атрымала дастаткова высокае для твора-дэбютанта грамадскае прызнанне. «Калегі па працы параілі паслаць гэту аднаактоўку на конкурс, які толькі што аб'явіла Упраўленне па справах мастацтва пры СНК БССР... П'еса спадабалася журы, што матэрыялізавалася ў дыпломе лаўрэата і грашовай прэміі. Атрымліваць яе прыязджаў ужо з Магілёва, дзе да гэтага часу працаваў загадчыкам парткабінета» («Неман», 1979, № 2, с. 164). У некаторых даведніках сустракаецца іншы варыянт назвы п'есы — «Добра, што добра канчаецца». Пад такой першапачатковай назвай яна ставілася самадзейнымі калектывамі. У «Чырвонай змене» назву ўдакладнілі. Датуецца годам апублікавання.

ПЕРАД СУСТРЭЧАЙ (с. 17)

Камедыя напісана ў лютым 1950 года таксама на конкурс (гл. каментарыі да п'есы «Жыццё патрабуе»). Яна была ацэнена журы больш высока і атрымала першую прэмію. Упершыню надрукавана ў зборніку «На сонечных сцежках. Творчасць маладых». Кн. 1. Мн., 1950, а таксама ў кнізе «Перад сустрэчай. Жыццё патрабуе». Мн., 1951. Датуецца 1950 годам. Друкуецца па выданні 1951 года.

ПЕРШАЕ ПЫТАННЕ (с. 32)

П'еса напісана ў сакавіку 1950 года. Школьная тэматыка, якая пакладзена ў аснову «Першага пытання», больш не сустракалася ў творчасці драматурга. Упершыню п'еса надрукавана ў часопісе «Бярозка» (1950, № 9). Публікавалася таксама ў кнігах: «Школьны тэатр. Зборнік п'ес». Мн., 1952 і «Бярозка», Мн., 1984. Друкуецца па выданні 1952 года. Ва ўсіх даведніках дата напісання твора прыводзілася недакладна — 1952 год. Аўтарская паметка на адным з чарнавых накідаў дазваляе датаваць напісанне п'есы зусім пэўна — сакавік 1950 года.

АКСЕНІНА ЦЯЛУШКА (с. 40)

П'еса напісана ў лютым 1951 года. Яна завяршала цыкл твораў («Выйгрыш», «Узыходы шчасця», «Жыццё патрабуе», «Перад сустрэчай»), у якіх асэнсаванне сельскай рэчаіснасці рэалізоўвалася драматургам у аб'ектывізавана-ілюстрацыйных формах, калі жыццёвыя праблемы часцей толькі называліся, канстатаваліся. Вядома, скіраваць грамадскую ўвагу на пэўную актуальную праблему, вырашэнне якой мела неадкладнае значэнне, таксама вельмі важна для кожнага літаратара, але з гэтай задачай не менш паспяхова можа справіцца і газетчык. Місія пісьменніка больш складаная: яму неабходна не проста ўскрываць глыбінную сутнасць жыццёвых праблем, тлумачыць іх дэтэрмінацыю, але выяўляць іх філасофска-эстэтычную падаснову. А такое выяўленне немагчыма без пранікнення ў мепавіта чалавечы змест падзей і, вядома, без непрыкрытай праўдзівасці іх паказу. Гэтыя патрабаванні драматург паклаў у аснову пры стварэнні сатырычнай камедыі «Выбачайце, калі ласка», якая прынесла яму ўсеагульную вядо-

масць. Такім чынам, п'есы «Выйгрыш», «Узыходы шчасця», «Жыццё патрабуе», «Перад сустрэчай» і «Аксеніна цялушка» сталі тымі творчымі прыступкамі, па якіх А. Макаёнак узняўся да сапраўдных вышынь мастацкага асэнсавання надзённых праблем рэчаіснасці.

Упершыню «Аксеніна цялушка» надрукавана ў часопісе «Вожык» (1951, № 6), публікавалася таксама ў другім томе двухтомнага выдання выбраных твораў А. Макаёнка, які выйшаў у выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў 1980 годзе, адкуль і перадрукоўваецца. Датуецца 1951 годам.

ЖЫЦЦЁ ПАТРАБУЕ (с. 47)

П'еса напісана ў студзені 1950 года спецыяльна на конкурс, які абвясцілі Міністэрства культуры БССР і Рэспубліканскі Дом народнай творчасці з мэтай стварэння сучаснага рэпертуару для мастацкай самадзейнасці. Журы адзначыла яе другой прэміяй. Упершыню драма надрукавана ў зборніку «На сонечных сцежках. Творчасць маладых». Кн. 1. Мн., 1950. Публікавалася таксама ў кнізе А. Макаёнка «Перад сустрэчай. Жыццё патрабуе». Мн., 1951. Датуецца 1950 годам. Друкуецца па выданні 1951 года.

КРЫМІНАЛЬНАЯ СПРАВА (с. 58)

Камедыя напісана ў снежні 1951 года. Гэта першы драматургічны твор А. Макаёнка, які асэнсоўвае міжнародную тэматыку. Упершыню п'еса надрукавана ў газеце «Літаратура і мастацтва» (1951, 8 снежня). Публікавалася таксама ў кнігах «Самадзейны тэатр. Зборнік аднаактовых п'ес для гурткоў мастацкай самадзейнасці». Мн., 1952 і «Размова па шчырасці. Зборнік гумару і сатыры». Мн., 1954. Друкуецца па: «Макаёнак Андрэй. Выбраныя творы ў двух тамах. Т. 2». Мн., 1980. Датуецца годам першай публікацыі.

НА ШЫРОКІЯ ПРАСТОРЫ (с. 64)

Сатырычныя сцэны «На шырокія прасторы» напісаны летам 1958 года. Напісанне п'есы з'явілася своеасаблівым завяршэннем вуснай палемікі з крытыкам Я. Герцовічам, які ў пагромна-аглабельным стылі разнёс спачатку апавяданне А. Кулакоўскага «Сад», а потым у рэцэнзіі «Чорнымі фарбамі» («Літаратура і мастацтва», 1958, 21 чэрвеня) жорстка раскрытыкаваў яго ж аповесць «Дабрасельцы», беспадстаўна абвінаваціўшы яе аўтара ў апалітычнасці і іншых грахах. А. Макаёнак, які сам дасканала ведаў жыццёвыя праблемы, добра ўсведамляў турботы, беды і штодзённыя клопаты простага чалавека-працаўніка, не мог не заўважыць, што пазіцыя крытыка не проста кан'юнктурная. Зацятаму апаненту А. Кулакоўскага бракавала звычайнай прафесіянальнай добрасумленнасці, якая вымагала аб'ектыўнай ацэнкі з'яў рэчаіснасці, шырыні погляду на жыццё. На шырокія прасторы праўдзівага адлюстравання і асэнсавання надзённых праблем сучаснасці заклікаў сваім творам драматург, пратэстуючы супраць звужаных, кабінетных поглядаў на факты жыцця і літаратуры. П'еса нідзе не друкавалася. Публікуецца па машынапісе твора, які захоўваецца ў архіве пісьменніка. Датуецца 1958 годам.

УЗЫХОДЫ ШЧАСЦЯ (с. 76)

Драма напісана ў 1947 годзе. У наступным годзе на рэспубліканскім конкурсе атрымала другую прэмію. П'еса друкуецца ўпершыню. На сцэнах прафесіянальных тэатраў яна не ставілася, пра пастаноўкі калектывамі тэатральнай мастацкай самадзейнасці звесткі таксама адсутнічаюць. А. Макаёнку неаднойчы задавалі пытанне, чаму ён нават не спрабаваў ні надрукаваць, ні паставіць п'есу, якая была адзначана дастаткова высока на ўзроўні рэспубліканскага конкурсу. Сутнасць адказаў звычайна зводзілася да таго, што халодныя адносіны да ўласнага дзецішча ў драматурга склаліся пад уздзеяннем высокай патрабавальнасці да сваёй творчасці: сініцай у руках задавальняецца слабы, моцны ж паспрабуе пагнацца за жураўлём удачы — у якіх бы высях ён ні лунаў. Чым вышэй, тым лепш. Калі паспрабаваць параўнаць «Узыходы шчасця» з «Выйгрышам», то ў больш выйгрышным святле прадстане першая з іх. Хоць п'еса і напісана амаль аднačасова, але рост прафесійнага майстэрства відавочны. Па-першае, стаў больш высокім узровень асэнсавання жыццёвых праблем, якія пакладзены ў аснову сюжэтных повязей твора. Па-другое, стаў больш разнастайным арсенал мастацкіх сродкаў драматурга, што вельмі плённа адбілася на глыбіні псіхалагічнай характарыстыкі персанажаў. Аднак сам драматург не лічыў, што дасягнуў у сваім творы таго ўзроўню жыццёвай і мастацкай праўды, які даваў яму права ісці з ім да чытача і гледача. П'еса друкуецца па машынапіснай копіі, якая захоўваецца ў Дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва БССР (ф. 78, в. 1, адз. зах. 14). На тытульным лісце ёсць жанравае ўдакладненне — вясковыя сцэны. Удакладняецца і дата напісання сакавік — май 1947 г.

ВЕЧНАЯ КРЫНІЦА (с. 139)

Зорын Дзмітрый Іванавіч нарадзіўся 18 жніўня 1905 года ў вёсцы Кузьменкаўская, зараз Кінель Чаркаскага раёна Куйбышаўскай вобласці. Аўтар раманаў «Пералом» (1931) і «Руская зямля» (1966), п'ес «Вяртанне Тараса» (1948), «Партрэт дзяўчыны» (1969) і іншых твораў.

Памёр Д. Зорын 25 лістапада 1967 года.

П'еса «Вечная крыніца» напісана ў 1957 годзе і разам з драмай «Вясенні гром» (1961) склала сцэнічную дылогію, прысвечаную паказу лёсу сялянства ў савецкі час. Увагу А. Макаёнка, які прыкладна з сярэдзіны 50-х гадоў марыў звярнуцца да ленініяны, п'еса прыцягнула менавіта сваёй нетрывіяльнасцю, арыгінальнасцю раскрыцця вобраза У. І. Леніна, а таксама неабыякавасцю аўтарскай пазіцыі ў асэнсаванні адносін селяніна да зямлі. П'еса ставілася многімі тэатрамі Савецкага Саюза. Прэм'ера ў тэатры імя Янкі Купалы адбылася 19 лютага 1957 года. Ставіў спектакль рэжысёр К. Саннікаў, мастацкае афармленне А. Мацвеева, музыка Д. Камінскага. Ролі выконвалі: У. І. Ленін — П. Малчанаў, Марцін Крутаяраў — І. Шаціла, Васіліса — А. Рынковіч, Волечка — Л. Фурманава, Гарасыч — П. Пекур, Плакун — Б. Краўцоў, Марфа Плаксіха — С. Станюта, Камолаў — П. Іваноў, Мікітка — С. Хацкевіч, Сенька Рэшка — Т. Кін-Камінскі, Панфёр — Э. Шапко, Варвара — Г. Макарава, Захар — В. Гаратаў, Анісся — Н. Гейц, Сазонава — М. Зінкевіч.

Спектакль зацікаўлена абмяркоўваўся ў тэатральным асяроддзі. Некалькі рэцэнзій з'явілася ў перыядычным друку. Водгукі ў цэлым былі прыхільныя, хоць не заўсёды аднадушныя.

«Гэты спектакль,— пісаў, напрыклад, А. Сабалеўскі,— думаецца, мае прынцыповае значэнне. І не толькі таму, што ў ім увасабляецца вобраз Уладзіміра Ільіча Леніна...

Ленін і народ, народ і Ленін — вось галоўная накіраванасць «Вечнай крыніцы», яе публіцыстычная страснасць. Не, Ленін не гаворыць пад бурныя апладысменты адны толькі прамовы, складзеныя ў асноўным з цытат яго твораў. Часта наведваючы вёску, ён уважліва да ўсяго прыглядаецца, вывучае, запісвае. Тут жа, на канкрэтных прыкладах, непасрэдна на месцы ўзнікаюць пытанні, на якія трэба неадкладна даваць адказ. Ленін увесь час асэнсоўвае, робіць абагульненні і прымае рашэнні, якія падказвае само жыццё, інтарэсы народа, інтарэсы ўсёй краіны.

Ленін у спектаклі знаходзіцца не як пасіўны, бясстрасны назіральнік таго, што адбываецца на вёсцы, не стаіць дзесьці збоку, каб затым некалькімі распараджэннямі спыніць усе непаразуменні, няправільныя ўчынкі людзей, адразу паставіць усіх на правільны шлях, як гэта паказалі б пры падобных акалічнасцях у «Залпе Аўроры». Ленін у «Вечнай крыніцы» паказаны не над народам, ён паказаны з народам.

І п'еса Д. Зорына, і спектакль рэжысёра К. Саннікава (рэжысёр-асістэнт Г. Уладамірская) палемізуюць з тым, што калісьці нават прымалася за норму» («Літаратура і мастацтва», 1957, 5 кастрычніка).

Драматург Я. Рамановіч не лічыў спектакль купалаўцаў буйнай падзеяй у жыцці тэатральнага мастацтва нашай рэспублікі, але таксама адзначаў неардынарнасць трактоўкі ў ім і падзей, і вобразаў.

«У гэтай своеасаблівай і глыбока праўдзівай п'есе шмат герояў і шмат лёсаў, якія праходзяць перад вачыма гледача. Тут і складанае перапляценне жыццёвых абставін у жонкі Марціна — Васілісы, пакутлівае рашэнне пытання — з кім ісці? — у серадняка Гарасыча, крушэнне заганных метадаў кіраўніцтва губпрадкамісара Камолава і, нарэшце, паражэнне «непагрэшнага святога», вясковага міраеда, хапугі Пятра Іванавіча Плакуна.

І ўсё ж пры такой вялікай колькасці галоўных герояў цэнтральнае месца ў п'есе аддадзена Уладзіміру Ільічу Леніну. Вобраз У. І. Леніна — душа п'есы, яе рухаючая сіла. Ён чэрпае мудрасць з вечнай крыніцы — народа. Чуйна прыслухоўваючыся да яго голасу, ён і сам шчодра дае людзям чыстую думку, добрую параду і жывое слова праўды. Народ верыць Леніну, верыць партыі і ідзе следам за імі па новых шляхах жыцця да светлай зары камунізму» («Советская Белоруссия», 1957, 6 кастрычніка).

Высока ацэньвалася акцёрскае майстэрства П. Малчанава, які ўвасобіў вобраз У. І. Леніна. Артыст здолеў адшукаць незаштампаваныя прыёмы і сродкі раскрыцця гэтага вобраза, таму ўспрымаўся гледачом вельмі прыхільна. Зрэшты, рэцэнзент А. Шаўня быў настроены больш крытычна. «Выканаўцу ўдалося глыбока і дакладна,— пісаў ён,— паказаць выдатныя ленінскія рысы — яго энергію, прастату і сціпласць, яго ўменне рашаць самыя складаныя дзяржаўныя пытанні разам з народам, у інтарэсах народа, раячыся з ім. Праўда, у асобных сцэнах (напрыклад, у першым і трэцім актах) вобраз не выглядае дастаткова буйным, значным,

артысту не ўдаецца паказаць маштабнасць, рух ленінскай думкі...
Нельга не адзначыць і асобныя акцёрскія пралікі П. Малчанава, у прыватнасці тое, што іншы раз артыст абмяжоўваецца перадачай чыста знешняга падабенства» («Знамя юности», 1957, 1 кастрычніка).

Спектакль «Вечная крыніца» з'явіўся прыкметнай старонкай у гісторыі распрацоўкі на беларускай сцэне вобраза У. І. Леніна.

П'еса друкуецца па машынапіснай копіі, якая знаходзіцца ў Дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва БССР (ф. 132, в. 1, адз. зах. 123).

Я, БАБУСЯ, ІЛІКО І ЛАРЫВОН (с. 204)

Думбадзе Надар Уладзіміравіч нарадзіўся 14 ліпеня 1928 года ў Тбілісі. Аўтар раманаў «Я бачу сонца» (1960), «Сонечная ноч» (1967), «Не хвалюйся, мама!» (1971) і іншых твораў. Аповесць «Я, бабуся, Іліко і Ларывон» (1960) прынесла пісьменніку ўсесаюзную вядомасць. Спачатку яна была інсцэніравана, а потым зацікавіла і кінематаграфістаў.

Памёр Н. Думбадзе 14 верасня 1984 года.

Лордкіпанідзе Грыгорый Давідавіч нарадзіўся 19 кастрычніка 1927 года. Працаваў рэжысёрам у грузінскіх тэатрах. У 1960 годзе дапамог Н. Думбадзе інсцэніраваць аповесць «Я, бабуся, Іліко і Ларывон», а ў 1961 годзе — раман «Я бачу сонца».

Прэм'ера спектакля «Я, бабуся, Іліко і Ларывон» на сцэне тэатра імя Янкі Купалы адбылася 8 сакавіка 1965 года. Паставіў спектакль рэжысёр Р. Агамірзян, мастацкае афармленне здзейсніў А. Грыгар'янц, музыку напісаў Р. Лагідзе. Ролі выконвалі: Зурыко — А. Мілаванаў, Г. Аўсяннікаў, бабуся — С. Станюта, Іліко — П. Кармунін, Ларывон — У. Дзядзюшка, П. Пекур, Мэры — І. Дашкоўская, Л. Давідовіч, сельскі ўрач — А. Бараноўскі, агітатар — В. Белахвосцік, Р. Шмыроў, настаўніца — М. Зінкевіч, Г. Арлова, настаўнік — З. Стома, М. Федароўскі, Рамул — Г. Аўсяннікаў, А. Мілаванаў, Амбако — П. Пекур, С. Хацкевіч, незадаволены — М. Струсевіч, пасажыр з кнігай — Т. Кін-Камінскі, бландзін — Л. Казлоўскі, Р. Шмыроў, пасажыр з курыцай — У. Кудрэвіч, пасажыр у гадах — Ю. Шумакоў, дзяўчына — А. Доўгая, праваднік — А. Казачок.

Поспех спектакля ў гледачоў быў надзвычайны. Не дзіўна, што на абмеркаваннях спектакль называлі святам мастацтва, яркай падзеяй у тэатральным жыцці рэспублікі. Праўда, тэатразнаўца Тамара Бушко ў рэцэнзіі «Пасля воплескаў на прэм'еры» зрабіла шмат крытычных заўваг. Асабліва ў адрас рэжысёра Р. Агамірзяна, які амаль цалкам прадубліраваў пастановачны малюнак спектакля Ленінградскага драматычнага тэатра імя М. Горкага на купалаўскай сцэне. Але і яна вымушана была прызнаць, што спектакль тэатра імя Янкі Купалы — з'ява далёка неардынарная.

«Вялікая сіла ў тэатры,— пісала яна,— вера ў прапанаваныя акалічнасці. А калі яна бязмежная і шчырая, дапоўнена любасцю да людзей, што насяляюць п'есу, ахоплівае ў адзіным парыве ўсіх — ад рэжысёра да выканаўцаў эпізадычных роляў, якія даверыліся рэжысёру, такая вера здольна рабіць цуды. Сведкамі такога цуду, у аснове якога ляжыць шчырая падтрымка і ўзаемнае ўзбагачэнне ў творчым працэсе, мы і з'яўляемся, прысутні-

чаючы ў зале тэатра, калі ідзе гэты спектакль. Р. Агамірзян здолеў захапіць сваёй задумай, сваім яркім і цікавым бачаннем будучага спектакля калектыў купалаўцаў і аб'яднаць іх намаганні. У выніку і з'явіўся гэты яркі, крапальны сваёй шчырасцю і чалавечнасцю сцэнічны твор, у якім арганічна жыве пераважная большасць выканаўцаў. У адзіным імкненні злучыліся захопленасць і вынаходлівасць рэжысёра, талент і прага акцёраў да сапраўды творчай, цікавай працы. А калі да гэтага дадаць лаканічнае, але вельмі выразнае афармленне мастака А. Грыгар'янца і выдатную музыку кампазітара Р. Лагідзе, якая дапамагае стварэнню вобраза і атмасферы грузінскай вёсачкі «найлепшай у свеце», то няма нічога дзіўнага ў тым, што спектакль ад сустрэчы са спагадлівым гледачом заіскрыўся ўсімі фарбамі. А на сцэне зажылі сваім звычайным, будзённым, але такім непаўторным жыццём людзі, блізкія нам сваімі марамі, думкамі, жаданнямі («Літаратура і мастацтва», 1965, 22 чэрвеня).

Пераклад п'есы А. Макаёнак ажыццяўляў з рускай мовы (варыянт Ленінградскага драматычнага тэатра імя М. Горкага), але з выкарыстаннем падрадкоўніка. У некаторых складаных выпадках, асабліва пры перакладзе фразеалагізмаў, драматург заклікаў на дапамогу знаўцаў грузінскай мовы. Так што ў поспеху спектакля ёсць непасрэдная заслуга і перакладчыка.

П'еса друкуецца па яе машынапіснай копіі, якая знаходзіцца ў Дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва БССР (ф. 126, в. 3, адз. зах. 105).

БЛАКАДА (с. 255)

Іванаў Усевалад Вячаслававіч нарадзіўся ў пасёлку Лябяж'е Паўладарскага ўезда Сяміпалацінскай губерні 24 лютага 1895 года. Аўтар раманаў «Прыгоды факіра» (1935), «Пархоменка» (1939), «Пры ўзяцці Берліна» (1946), «Мы ідзём у Індыю» (1960), аповесцей «Партызаны» (1921), «Бранялоезд 14—69» (1922), «Асабняк» (1928), «Хабу» (1925), «Гібель Жалезнай» (1928), «Падарожжа ў краіну, якой няма» (1930) і іншых твораў.

Памёр Ус. Іванаў 15 жніўня 1963 года.

Творы выдатнага рускага пісьменніка Ус. Іванава на беларускую мову перакладаліся неаднаразова. Яшчэ да вайны выйшлі з друку аповесць «Бронецягнік № 14—69» (Мн., 1933, пераклад М. Стагановіч), раман «Пархоменка» (Мн., 1941, пераклад В. Макоўскай), драма «Бранялоезд 14—69» (Мн., 1936, пераклад К. Крапівы). П'есу «Блакада» А. Макаёнак пераклаў у 1967 годзе па просьбе тэатра імя Янкі Купалы, які вырашыў паставіць яе да 50-годдзя Вялікага Кастрычніка. Чым жа прыцягнула п'еса перакладчыцкую ўвагу А. Макаёнка? Напісаная ў 1928 годзе, «Блакада» і ў другой палавіне 60-х гадоў уражвала надзвычайнай складанасцю паказу падзей грамадзянскай вайны, арыгінальнасцю псіхалагічнай характарыстыкі персанажаў. Бадай што ні ў адной з савецкіх п'ес усіх часоў не было такіх пранізліва-эмацыянальных трагічных сцэн, якія мацней уражвалі б сваёй амбівалентнай алагічнасцю. Зрэшты, знешні алагізм паводзін герояў (стрэл камісара Арцёма Аладзьіна ў брата Сямёна, яго дастаткова цынічныя «заляцанні» да Вольгі) абумоўлены глыбіннай дэтэрмінантай, найвышэйшай неабходнасцю выратавання заваёў рэвалюцыі. А. Макаёнку імпанавала не толькі тое, што ў п'есе дзейнічаюць такія

«непрычэсаныя» нарматывізмам, неіканапісныя бальшавікі-камісары, імпазантныя прадстаўнікі розных сацыяльных груп грамадства, але і сам спосаб уключэння герояў у дзею — з амаль фатаграфічнай дасканаласцю, з поўнай адсутнасцю аўтарскага дыктату ў дачыненні да волевыяўлення персанажаў.

Прэм'ера спектакля ў тэатры імя Янкі Купалы адбылася 25 кастрычніка 1965 года. Ставіў яго рэжысёр Б. Эрын, афармляў мастак А. Грыгар'янц, музыку напісаў С. Картэс. Ролі выконвалі: Восіп Аладзьін — П. Кармунін, Л. Рахленка, Арцём Аладзьін — І. Шаціла, Ганна Мацвееўна — Р. Кашэльнікава, А. Рынковіч, Сямён Аладзьін — П. Пекур, С. Хацкевіч, Лук'ян Аладзьін — В. Тарасаў, М. Яроменка, Дзяніска Аладзьін — Г. Гарбук, Сяргей Жыхарка — З. Стома, С. Хацкевіч, Вольга Жыхарка — Л. Давідовіч, М. Захарэвіч, Кісель — П. Кармунін, А. Мілаванаў, Рубцоў — Б. Уладамірскі, Р. Філіпаў, Домна-Разанда — Г. Арлова, З. Браварская, Гетэерац — С. Бірыла, П. Пекур, Дэлагардзі — М. Федароўскі, Ю. Шумакоў, Ададураў — П. Дубашынскі, Цюфякін — Т. Кін-Камінскі, Яблычкаў — У. Кудрэвіч, Мясной — В. Белахвосцік, А. Луцэвіч, Андронаў — У. Рагаўцоў, Лыкаў — Г. Аўсяннікаў, Паўлюк — А. Казінін.

На жаль, малады рэжысёр Б. Эрын не здолеў перавесці на мову сцэны ўсё сэнсава-мастацкае багацце п'есы. Поліфанізм пісьменніцкага бачання жыццёвых калізій у спектаклі, вядома, адчуваўся, але тэатр усё ж не здолеў узняцца да ўзроўню асэнсавання Ус. Іванавым падзей рэвалюцыйных гадоў. Пагнаўшыся за паказам каларытнасці сітуацый і персанажаў, акцёры не змаглі выявіць каларыт самой эпохі. Зрэшты, водгукі на спектакль былі ў асноўным прыязныя. Тэатразнаўца Бур'ян у рэцэнзіі «У пошуках уласнага слова» пісаў: «Гэты шалёны вір падзей, сутычак, дзе праўдападобнасць увесь час пераплятаецца з нястрыманай аўтарскай фантазіяй, іграецца ў спектаклі сакавіта і нават з захапленнем. Умела згушчае фарбы З. Браварская, малюючы чалавечую нікчэмнасць Домны-Разанды; жаночая прага глынуць бязвоблачнага шчасця стала дынамікай Л. Давідовіч у ролі Вольгі Жыхаркі; нахабнікам шырокага маштабу паказвае матроса Рубцова Р. Філіпаў; еўрапейскім місіянерам, першай якасцю якога абавязкова бывае вытрымка, стаў С. Бірыла — Гетэерац; адпаведна аўтарскай характарыстыцы мітуслівае і хціва мяняе палітычныя пазіцыі і касцюмы нехта Кісель, створаны П. Кармуніным па законах трапнага сцэнічнага гратэску... Майстэрства акцёраў, што ўвасабляюць на сцэне і лагер контррэвалюцыі і, умоўна кажучы, тых, хто пахіснуўся, дапамагае яшчэ лепш убачыць, як клапаціўся Ус. Іванаў, каб выступіць супроць схемы. Аслеплены натоўп выпадкова аб'яднаных супроць камуністаў людзей выглядае шматлікім і напорыстым, бо складаецца з індывідуумаў, гатовых да выбуху ад розных прычын, нават самых дробязных. Натоўп пануе на сцэне, мабыць, нават крыху больш крыклівa, чым гэта прадугледжана п'есай. Да таго ж гэтыя эпізоды свабодна і маляўніча мізансцэнтраваны Б. Эрыным і пакідаюць моцнае ўражанне як відовішча» («Літаратура і мастацтва», 1967, 21 лістапада).

П'еса друкуецца па яе машынапіснай копіі, якая знаходзіцца ў Дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва БССР (ф. 126, в. 3, адз. зах. 113).

ПАМЯЦЬ СЭРЦА (с. 297)

Карняйчук Аляксандр Еўдакімавіч нарадзіўся 25 мая 1905 года на станцыі Хрысцінаўка Чаркаскай вобласці. Аўтар п'ес «На грані» (1923), «Гібель эскадры» (1933), «Платон Крэчат» (1934), «Праўда» (1937), «Багдан Хмяльніцкі» (1939), «У стэпах Украіны» (1941), «Партызаны ў стэпах Украіны» (1941), «Фронт» (1942), «Місія містэра Перкіна ў краіну бальшавікоў» (1944), «Макар Дубрава» (1948), «Крылы» (1954), «Чаму ўсміхаліся зоры» (1957) і іншых. Памёр А. Карняйчук 14 мая 1972 года.

Творы А. Карнейчука шырока перакладаліся на беларускую мову і ставіліся на сцэнах нашых тэатраў. У тэатры імя Янкі Купалы: «Платон Крэчат» (1936), «У стэпах Украіны» (1941), «Фронт» (1942), «Калінавы гай» (1950), «Макар Дубрава» (1952), «Крылы» (1955); у тэатры імя Якуба Коласа: «Гібель эскадры» (1935), «Фронт» (1942), «Калінавы гай» (1950), «Платон Крэчат» (1956).

Драма «Памяць сэрца» напісана ў 1969 годзе. Цікавасць да яе шматлікія тэатры Савецкага Саюза праявілі вельмі аператыўна — яшчэ да публікацыі на рускай мове ў часопісе «Театральная жизнь» (1970, № 13). Праўда, адной з найлепшых атрымалася яе пастаноўка ў Кіеўскім тэатры імя І. Франко, за якую ў 1971 годзе А. Карнейчуку, рэжысёру Д. Аляксідзе, артыстам Ю. Ткачэнка, Я. Панамарэнка, П. Куманчанка, М. Задняпроўскаму, В. Дальскаму была прысуджана Дзяржаўная прэмія Украінскай ССР імя Т. Шаўчэнкі.

А. Макаёнак, з якім А. Карнейчука звязвалі цёплыя сяброўскія адносіны, пераклаў «Памяць сэрца» ў пачатку 1970 года. Пераклад зроблены з часопіснай публікацыі («Вітчизна, 1970, № 1). Прэм'ера спектакля «Памяць сэрца» адбылася 13 мая 1970 года. Пастаноўку п'есы ажыццявіў рэжысёр Б. Луцэнка, афармляў спектакль мастак Б. Герлаван, музыку напісаў М. Качан. Ролі выконвалі: Кацярына Міхайлаўна — М. Захарэвіч, Галіна Раманаўна — Г. Макарава, С. Станюта, Антон — А. Дзянісаў, Кірыла Сяргеевіч — П. Кармунін, Б. Уладамірскі, капітан — П. Пекур; генерал — У. Дзядзюшка, І. Шаціла, Антоніо Тэрачыні — Г. Гарбук, В. Тарасаў, Рая — Т. Кротава, Мікола — М. Казінін, Юрка — А. Памазан, Наташа — Р. Дамброўская, С. Нікіпелава, Арыся — З. Зубкова, Іван — В. Анісенка, Вольга — Н. Гейц, Р. Кашэльнікава, Варвара — М. Бялінская, Л. Шынко, п'яненькі мужчына — А. Луцэвіч, першы шахматыст — У. Кудрэвіч, другі шахматыст — У. Рагаўцоў, Пат — У. Рагаўцоў, Паташон — Г. Аўсяннікаў.

Спектакль «Памяць сэрца» хоць і не стаў вяршынным дасягненнем на творчым шляху купалаўцаў, аднак адразу ж заваяваў сімпатыі гледачоў. Перыядычны друк адгукнуўся шэрагам прыязных рэцэнзій. У адной з іх пісьменнік Р. Няхай, высока ацаніўшы ігру амаль усіх акцёраў, пісаў:

«Беларускі тэатр здавён сябруе з Аляксандрам Карнейчуком — амаль усе п'есы гэтага драматурга ставіліся на нашай сцэне. Сярод многіх якасцей яго твораў ёсць і тое, што называюць адчуваннем тэатра...

Лепшыя выканаўцы роляў і найбольш удалыя пастановачныя эпізоды ў спектаклі купалаўцаў «Памяць сэрца» яшчэ раз пацвердзілі гэта — іграць А. Карнейчука цікава і карысна тэатру. Цікава, бо аўтар дае багатую спажыву для роздуму і хвалявання акцёра-мастака, а карысна тым, што ў арганічнай жыццёвай праўдзе

паводзін герояў раскрываюцца радасці і трывогі сучаснай рэчаіснасці... Тэатр разумна зрабіў, калі з даверам паставіўся да п'есы і па-свойму, па-купалаўску, даў рэалістычнае ўвасабленне тэм і вобразаў А. Карнейчука, не пазбягаючы такой натуральнай у яго і абгрунтаванай манеры пісьма, дзе амаль што меладрама пераходзіць у вострасатырычную сцэну, а драматызм пачуццяў змяняецца гумарам па-народнаму маляўнічых эпізодаў. Рэжысёр намагаўся даць гэтаму арганічнае адзінства, і часцей за ўсё ён дасягае мэты. Спектакль глядзіцца як цэласны расказ аб жыцці, як мастацкі роздум аб перажытым людзьмі ў вайну і ў мірныя дні («Літаратура і мастацтва», 1970, 5 чэрвеня).

П'еса друкуецца па машынапіснай яе копіі, якая знаходзіцца ў Дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва БССР (ф. 126, в. 3, адз. зах. 124).

Сцяпан Лаўшук

ЗМЕСТ

П'ЕСЫ

Добра, калі добра канчаецца. *Камедыя ў адной дзеі* 7
Перад сустрэчай. *Камедыя ў адной дзеі* 17
Першае пытанне. *П'еса ў адной дзеі* 32
Аксеніна цялушка. *Аднаактовая п'еса* 40
Жыццё патрабуе. *Будні сакратара райкома* . . 47
Крымінальная справа. *Аднаактовая п'еса* 58
На шырокія прасторы. *Сцэны* 64
Узыходы шчасця. *Драма ў шасці карцінах* . . . 76

ПЕРАКЛАДЫ

Д. Зорын. Вечная крыніца. *Народная драма ў чатырох актах* 139
Н. Думбадзе, Г. Лордкіпанідзе. Я, бабуся, Іліко і Ларывон. *Лірычная камедыя ў дзвюх дзеях* 204
У. Іванаў. Блакада. *П'еса ў чатырох дзеях* 255
А. Карняйчук. Памяць сэрца. *Драма ў дзвюх дзеях* 297
Каментарыі 341

Макаёнак А.
М 15 Збор твораў. У 5 т. Т. 4. П'есы. Пераклады. /Уклад. і камент. С. С. Лаўшука.— Мн.: Маст. літ., 1989.—351 с., [4] л. іл.
ISBN 5-340-00301-9.
Макаенок А. Собрание сочинений. Т. 4. Пьесы. Переводы.
У чацвёрты том Збору твораў Андрэя Макаёнка ўвайшлі аднаактовыя п'есы, драма ў чатырох дзеях «Узыходы шчасця», а таксама пераклады.
ББК 84Бел7
М $\frac{4702120203-130}{М302(03)-89}$ 96—89

*

Литературно-художественное издание

Макаенок Андрей Егорович

СОБРАНИЕ СОЧИНЕНИЙ
В ПЯТИ ТОМАХ

Том 4

Пьесы. Переводы

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Літаратурна-мастацкае выданне

Макаёнак Андрэй Ягоравіч

ЗБОР ТВОРАЎ
У ПЯЦІ ТАМАХ

Том 4

П'есы. Пераклады

Рэдактар *М. І. Котаў.* Мастак *Ю. М. Цюрын.* Мастацкі рэдактар *Л. Я. Прагін.* Тэхнічны рэдактар *Т. М. Сокал.* Карэктар *Л. Т. Калюжная.*

ІБ № 2701
Здадзена ў набор 11.11.88. Падп. да друку 17.05.89. Фармат 84×108$^1/_{32}$. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 18,48+0,42 укл. Ум. фарб.-адб. 19,32. Ул.-выд. арк. 18,87. Тыраж 7000 экз. Зак. 1971.
Цана 1 р. 60 к.
Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.
Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.